Генадзь Сагановіч

# Грунвальд у беларускай гісторыі

## Спроба разбору палітычнага міфа



Бібліятэка часопіса
“Беларускі Гістарычны Агляд”

Генадзь Сагановіч

# Грунвальд у беларускай гісторыі

## Спроба разбору палітычнага міфа

Мінск
«Медысонт»
2015

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
С13

Серыя заснавана ў 1999 годзе

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт дэпартамента гісторыі ЕГУ
*Юрась Бачышча*;
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт дэпартамента гісторыі ЕГУ
*Андрэй Чарнякевіч*.

У афармленні вокладкі выкарыстана карціна
Гаўрылы Вашчанкі «Грунвальдская бітва» (1985).

**Сагановіч, Г.**

С13 Грунвальд у беларускай гісторыі: Спроба разбору палітычнага міфа / Генадзь Сагановіч. — Мінск : Медысонт, 2015. — 416 с. — (Бібліятэка часопіса "Беларускі Гістарычны Агляд"). — Папярэд. выд.: Вільнюс : выдавецтва Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, 2015. — 320 с.
ISBN 978-985-7136-02-5.

Кніга прысвечана бітве пад Грунвальдам як факту грамадскай свядомасці – яе "пасмяротнаму жыццю" ў гістарычнай думцы і сацыяльнай памяці Беларусі. Аўтар паспрабаваў выявіць шляхі і абставіны пашырэння ўстойлівых перакананняў пра бітву 1410 г., а таксама паказаць іх ідэалагічны змест і грамадска-палітычнае прызначэнне.

Для шырокага кола чытачоў, студэнтаў і выкладчыкаў устаноў адукацыі гістарычнага профілю.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-7136-02-5**

© Сагановіч Г., 2015
© Афармленне. ТАА «Медысонт», 2015

*Прысвячаю*
*светлай памяці бацькоў –*
*Мікалая Астапавіча і*
*Зосі Мікалаеўны*
*Сагановічаў*

# Змест

**Прадмова** . . . . . 9

**Уводзіны** . . . . . 11

1 Тэма, праблема, задачы . . . . . 11
2 Метадалагічныя пазіцыі . . . . . 12
3 Стан даследаванасці і крыніцы . . . . . 15
4 Пра структуру кнігі . . . . . 19

**1 Гісторыя і міф: тэарэтычныя падставы працы**

1.1 Уступныя развагі пра міф . . . . . 21
1.2 Міфы ў гістарыяграфіі . . . . . 26
1.3 Паняцце палітычнага міфа . . . . . 33
1.3.1 Азначэнне, формы і змест . . . . . 33
1.3.2 Функцыі палітычнага міфа . . . . . 41
1.3.3 Міф і памяць . . . . . 46
1.3.4 Міф і стэрэатып . . . . . 52

**2 Памяць і забыццё Грунвальда да эпохі нацыяналізмаў**

2.1 Старапольская традыцыя ўшанавання перамогі . . . . . 57
2.2 Успрыманне бітвы 1410 г. у Прусіі . . . . . 65
2.3 Успаміны пра бітву і яе забыццё на землях ВКЛ . . . . . 67

**3 Сярэднявечная бітва ў германа-славянскім супрацьстаянні**

3.1 Актуалізацыя памяці пра Тэўтонскі ордэн у Нямеччыне . . . . . 77
3.2 Нараджэнне польскага культу Грунвальда . . . . . 87
3.3 Панславісцкая легенда пра нямецкую небяспеку ў Расіі . . . . . 96

**4 Вобразы Грунвальда на беларускіх землях царскай імперыі**

4.1 Антынямецкі дыскурс прадстаўнікоў заходнерусізму . . . 111
4.2 Тэма барацьбы з Ордэнам у ліцвінскім / краёвым гісторыяпісанні . . . . . 122
4.3 Грунвальд і пачаткі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі . . . . . 127

**5 Выкарыстанне гісторыі ў польска-нямецкім канфлікце XX ст.**

5.1 Услаўленне тэўтонскіх рыцараў у III Райху . . . . . 135
5.2 Новая манументалізацыя Грунвальда ў Польшчы . . . . . 141
5.3 Шляхі дэміфалагізацыі сярэднявечнай бітвы . . . . . 150

**6 Канструяванне савецкага вобраза Грунвальда**
6.1 Ад крытыкі "вялікадзяржаўных легенд" да новаімперскай ідэалогіі . . . 163
6.2 Вяртанне тэзіса пра "шматвяковы нямецкі націск" . . . 169
6.3 Метамарфозы дзяржаўнай прапаганды (1939–1941) . . . 179
6.4 Грунвальд у дыскурсе абарончай вайны . . . 182
6.5 Спробы панславісцкай стылізацыі . . . 192
6.6 Грунвальд на варце сацыялізму . . . 198

**7 Грунвальд у беларускім гісторыяпісанні да 1939–41 г.**
7.1 Грунвальд і нацыянальная гістарыяграфія савецкай Беларусі . . . 218
7.2 Погляды гісторыкаў-марксістаў на барацьбу з Ордэнам . . . 225
7.3 Памяць пра бітву ў гістарычнай думцы Заходняй Беларусі . . . 232

**8 Афіцыйная і грамадская памяць пра бітву ў БССР да 1990 г.**
8.1 Вызначэнне вобраза Грунвальда ў акадэмічнай гісторыі . . . 243
8.2 Навуковыя даследаванні агрэсіі нямецкіх рыцараў . . . 253
8.3 Тэма крыжаносцаў у гістарычнай адукацыі і асвеце . . . 261
8.4 Услаўленне перамогі ў публіцыстыцы і белетрыстыцы . . . 266

**9 Міф выратавальнай бітвы ў суверэннай Беларусі**
9.1 Першыя святкаванні Грунвальда і спробы ўвядзення традыцыі . . . 279
9.2 Грунвальд у нацыянальнай канцэпцыі гісторыі . . . 291
9.3 Месца бітвы ў афіцыйным гісторыяпісанні з сярэдзіны 1990-х г. . . . 306
9.4 600-гадовы юбілей Грунвальда як патрыятычны кансэнсус . . . 317

**Падсумаванне** . . . 331

Літаратура . . . 343
Прынятыя скарачэнні . . . 343
Крыніцы . . . 344
1 Рукапісы . . . 344
2 Газетныя артыкулы . . . 344
3 Кніжныя і часопісныя публікацыі . . . 346
Даследаванні . . . 366

Summary . . . 395
Ілюстрацыйны дадатак . . . 400
Імянны паказальнік . . . 408

# Прадмова

Гісторыя Нямецкага ордэна і яго адносін з Вялікім Княствам Літоўскім цікавіла мяне ўжо амаль два дзесяцігоддзі. Важнае месца ў гэтай тэме займала, вядома ж, і Грунвальдская бітва, вывучэнню якой меркавалася прысвяціць асобную манаграфію. Аднак жыццёвыя абставіны абумовілі ўсё так, што замест рознабаковага даследавання самой баталіі, якое так і засталося незавершаным, чытач трымае ў руках кнігу пра яе "пасмяротнае жыццё" ў нашых уяўленнях.

Ідэя гэтага даследавання першапачаткова нарадзілася ў апошнія гады маёй працы ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, тагачасны дырэктар якой наўпрост сказаў, што шансы на абарону доктарскай дысертацыі па тэме Нямецкага ордэна ў мяне могуць з'явіцца толькі ў тым выпадку, калі яна будзе сцвярджаць ідэю славянскай салідарнасці ў барацьбе з нямецкімі захопнікамі. Падобныя стэрэатыпы і залежнасць успрымання Нямецкага ордэна ў грамадстве – у тым ліку сярод гісторыкаў – ад ідэалогіі савецкай эпохі неаднаразова даводзілася заўважаць і ў размовах з калегамі. А ўражанні ад святкавання 600-гадовага юбілею Грунвальдскай перамогі ў Беларусі канчаткова пераканалі мяне ў актуальнасці тэматызацыі гэтай бітвы як канструкта грамадскай свядомасці, ці – як міфа. Праўда, узяцца за працу атрымалася не адразу: кніга была напісана ў Мінску паміж летам 2014 і восенню 2015 г.

Аўтар адчувае прыемны абавязак падзякаваць добрым людзям і ўстановам, падтрымка якіх дазволіла мне выканаць задуманую працу. Найперш гэта славістка Моніка Банкоўскі, якая здавён стала дапамагала мне з Цэнтральнай бібліятэкі Цюрыха, не пакінуўшы без увагі ніводнай маёй просьбы. Без тых кніг і адбіткаў, якія яна год за годам высылала, без яе шматлікіх біблія- і біяграфічных даведак мне, вядома ж, не ўдалося б гэтага зрабіць. У пошуку патрэбных выданняў я заўжды мог разлічваць і на дапамогу Лявона Юрэвіча з Нью-Ёрка, таксама прафесійнага бібліятэкара. Азнаёміцца з новымі тэарэтычнымі падыходамі ў гуманітарных навуках мне дазволіла стыпендыя Інстытута Гердэра ў Марбургу (2009) – уста-

новы, якая стварае найлепшыя ўмовы для даследчыцкай працы. Яшчэ больш плённай была падтрымка Нямецкай Службы Акадэмічнага Абмену (DAAD), дзякуючы якой я правёў двухмесячныя штудыі ў нямецкіх бібліятэках у 2011 г. Але самым карысным для падрыхтоўкі гэтай кнігі аказаўся доступ да багатых збораў сучаснай літаратуры па сацыяльна-гуманітарных даследаваннях, які адкрывала мне бібліятэка Гісэнскага ўніверсітэта Юстуса Лібіга пад час выкладчыцкай працы ў названай установе ў 2013/14 г. Побыт у Гісэне стаў для мяне важным этапам асэнсавання новых кантэкстаў і прафесійнага сталення, за які я найбольш абавязаны нямецкім калегам праф. Томасу М. Бону і праф. Гансу-Юргену Бёмельбургу. У гэтай сувязі словы прызнання хацеў бы выказаць таксама на адрас праф. Робэрта Трабы (Берлін) і праф. Альвідаса Нікжантайціса (Вільня), публікацыі якіх дапамаглі мне адысці ад зададзенасцяў традыцыйнай гістарыяграфіі і паглядзець на гісторыю не як на паслядоўнасць падзей у іх прычынна-выніковай сувязі, а як на актыўны грамадскі працэс прыпісвання мінуламу пэўных сэнсаў. Акрамя замежных калег, якія спрыялі маёй працы (некаторыя – магчыма, нават не ўсведамляючы гэтага), я павінен аддзячыць Юрасю Бачышчу і Андрэю Чарнякевічу з дэпартамента гісторыі ЕГУ, калегам па цэху, якія ўзялі на сябе клопат рэцэнзентаў і, прачытаўшы рукапіс, выказалі вартыя заўвагі. Урэшце хачу з прыемнасцю падзякаваць усім маім родным за разуменне і цярпенне, за ўсебаковае спрыянне і тую атмасферу, якая настройвала на працу.

Выказваючы прызнанне ўсім, хто так ці інакш спрычыніўся да з'яўлення кнігі, аўтар гэтых радкоў бярэ на сябе ўсю адказнасць за дакладнасць выкладзеных фактаў і рэлевантнасць прыведзеных інтэрпрэтацый. Я далёкі ад аб'ектывісцкай гардыні і добра разумею, што мая праца – гэта толькі адна з магчымых перспектыў прачытання міфа Грунвальдскай бітвы, толькі адзін са спосабаў яго разумення. Прапанаваць жа яе чытачам мяне спакусіла спадзяванне на тое, што кніга можа выклікаць крытычную рэфлексію і ўжо гэтым паслужыць на карысць беларускай гістарыяграфіі.

*Мінск, 25 кастрычніка 2015 г.*

# Уводзіны

*Цяперашняе ёсць момантам,*
*які кіруе ўсімі мінулымі падзеямі*
*і дамінуе над іх значэннямі.*

Ганс Келнэр[1]

## 1 Тэма, праблема, задачы

Гэтая кніга – пра Грунвальдскую бітву, але не ў сэнсе даследавання з мэтай даведацца "як было на самай справе". Яна пра цікавасць да самой падзеі і яе ўспрыманне ў публічным жыцці Беларусі, пра калектыўную памяць аб ёй, якая, узнікшы каля стагоддзя назад, то прытухала і цалкам гублялася, то абуджалася і нават выявілася ў маштабных публічных святкаваннях, як у 2010 г., каб потым зноў аціхнуць. І пра значэнні той далёкай перамогі, якія для кожнай эпохі разумеліся па-рознаму. Калі ў 1910 г., нагадваючы пра бітву ў сувязі з юбілеем, беларускі гісторык бачыў у ёй падзею, што ліквідавала тую пагрозу, з-за якой Польшча і ВКЛ злучаліся персанальнай уніяй, то ў 1960 г. Грунвальд успамінаўся ў Мінску як сімвал адзінства сацыялістычных народаў у барацьбе з заходнім агрэсарам, а яшчэ праз пару пакаленняў – як бітва, што ратавала ад знішчэння беларускі народ. Уражвальныя пераацэнкі аднюй і той жа падзеі! Не менш паказальна і тое, што калі для гісторыі БССР даўняя сеча ў далёкай Прусіі заставалася маргінальнай, то ў суверэннай Беларусі яе адразу сталі называць адной з галоўных падзей беларускай гісторыі. Чаму? Усё гэта патрабуе вывучэння і тлумачэння.

Такім чынам, прадметам даследавання будзе бітва пад Грунвальдам не як гістарычны факт, а як факт грамадскага жыцця – ва ўяўленнях і мысленні, аб'ектывізаваных у тэкстах, выявах

[1] Цыт. па: Доманска Э. Философия истории после постмодернизма. Москва, 2010. С. 98.

і рытуалах, іншымі словамі, у шырока разуметай сацыяльнай памяці. Як вядома, вобразы мінулага мяняюцца з кожнай новай эпохай, і ўяўленні пра Грунвальдскую бітву таксама не перадаваліся з пакалення ў пакаленне нязменнымі, аднак пакуль не высветлена, што прадвызначала іх зменлівасць або трываласць. У гэтай працы мы паспрабуем выявіць абставіны з'яўлення публічнай цікавасці да славутай падзеі, асноўныя тыпы ацэначнага тлумачэння бітвы і іх прызначэнне, а таксама матывы і спосабы пашырэння пэўных інтэрпрэтацыйных схем у беларускім грамадстве – у навуковым і публічным дыскурсе пра мінулае. За рабочую гіпотэзу даследавання бярэцца дапушчэнне, што ўяўленні пра бітву пад Грунвальдам і яе ацэнкі ў Беларусі канструяваліся пераважна з ужо наяўных інтэрпрэтацыйных узораў, змяняючыся не ў залежнасці ад развіцця навуковых даследаванняў, а ў адпаведнасці з ідэалагічным фонам і патрэбамі ўмацавання пэўнай версіі мінулага як асновы той або іншай калектыўнай ідэнтычнасці.

## 2 Метадалагічныя пазіцыі

З метадалагічнага пункту гледжання праца носіць інтэрдысцыплінарны характар. Аўтар паспрабаваў спалучыць інструментарый гісторыі гістарыяграфіі з тэарэтычнымі падыходамі культурнай гісторыі і сацыяльна-гуманітарных даследаванняў, звязаных з паняццем калектыўнай памяці.

Сярод асноўных фактараў, якія дэтэрмінуюць "акт" гісторыяпісання, гісторыя гістарыяграфіі разглядае не толькі сацыяльна-палітычныя і эканамічныя ўмовы творчасці гісторыка, але і гістарыяграфічную традыцыю з узорамі апісанняў і тлумачэнняў[2]. У свой час яшчэ Павел Мілюкоў адзначаў, што не толькі папулярна-гістарычны, але і навуковы дыскурс "складваецца з цэлага шэрагу разначасавых напластаванняў, гісторыю і паходжанне якіх мы не заўсёды помнім". Гістарычная літаратура кожнай эпохі ставіць да мінулага свае пытанні, якімі і вызначаюцца даваныя ёю адказы, і потым, калі эпоха мяняецца, пытанні забываюцца, але "адка-

[2] Jaeck H.-P. Die Erklärung historiografischer Texte als Ausgangspunkt einer "Strategie" der Historiographiegeschichte // Geschichtsdiskurs. Bd. 1: Grundlagen und Methoden der Historiographiegeschichte. Hg. von W. Küttler, J. Rüsen, E. Schulin. Frankfurt a. M., 1993. S. 340.

зы, дадзеныя на іх, працягваюць цыркуляваць у навуковым звароце"[3]. Іншымі словамі, гістарычная думка – гэта напластаванні розных "слаёў" разумення мінулага, пра якія ўжо ніхто не памятае, таму для адэкватнага "прачытання" кожнага твора гістарычнай літаратуры важна ўлічваць акалічнасці яго напісання і "знайсці той пункт гледжання, з якога гэты прадукт быў створаны".

Уплыў актуальнага кантэксту на погляды гісторыка, на яго прынцыпы адбору фактаў і інтэрпрэтацыі ў гісторыяпісанні яшчэ больш выразна акцэнтаваў адзін са стваральнікаў сацыялогіі ведаў нямецкі вучоны Карл Мангайм, які падкрэсліў, што гістарыяграфія можа больш сказаць пра гісторыкаў, чым пра само мінулае. Бо кожнае выказванне пра мінулае залежыць ад філасофска-гістарычнага фону эпохі і канкрэтных культурных інтэнцый. "Не ўдалося б выказаць такога меркавання пра мінулае, у змесце якога не была б адлюстравана гістарычна-філасофская абумоўленасць прадмета ўвагі", таму, калі разглядаць любы гістарычны твор, то знаўца гістарыяграфіі "зможа сказаць пра эпоху, месца і канкрэтную культурную псіхіку, у якіх узнікла дадзенае апісанне"[4]. На непазбежную залежнасць разумення гісторыі ад нашых надзённых патрэбаў указваў і нямецкі філосаф Эрнэст Касірэр, па словах якога "гістарычнае пазнанне прапануе адказ на цалкам канкрэтныя пытанні, адказ, які павінна даваць мінулае, але пытанні ставіць і дыктуе цяперашняе..."[5].

Блізкае разуменне сутнасці гістарычных ведаў і спосабаў іх рэпрэзентацыі характарызуе цяпер канцэптуальныя падыходы культурнай гісторыі. З яе перспектывы прызнаецца, што ўспрыманне свету і самасвядомасць аўтара любога апісання мінулага прадвызначаюць як выбар аб'екта, так і спосаб гэтага апісання. Іншымі словамі, і тое, як гісторыкі пішуць пра мінулае, і абіраныя імі аспекты (бітвы, рэлігійнае жыццё, культура, гаспадар-

[3] Милюков П. Главные течения русской исторической мысли. Т. 1. Москва, 1897. С. 2. Пар.: Бон Т. М. Русская историческая наука /1880 г. – 1905 г. / Павел Николаевич Милюков и Московская школа. С.-Петербург, 2005. С. 136.

[4] Mannheim K. Historismus // Archiv für Sozialwissenschaft und Sozialpolitik. Bd. 52. Hg. von E. Lederer. Tübingen, 1924. S. 22, 24. Пар.: Krasuski J. Wyznaczniki biegu historii. Wrocław, 2008. S. 13, 28.

[5] Cassirer E. Versuch über den Menschen: Einführung in eine Philosophie der Kultur. Frankfurt a. M., 1992. S. 273.

ка і інш.) – усё гэта залежыць ад месца, часу і поглядаў, характэрных для групы, да якой яны належаць[6].

Сучасныя міждысцыплінарныя даследаванні, аб'яднаныя вакол "парадыгмы памяці", разглядаюць гісторыю як калектыўную (сацыяльную) памяць, што пастаянна змяняецца. Згодна з іх падыходам, памяць утвараюць вобразы мінулага як сацыяльныя канструкцыі, – яны не дадзены анталагічна, а ўзнікаюць з перспектывы інтарэсаў пэўных сацыяльных груп. Уведзены Янам Асманам канцэпт "культурнай памяці" азначае актыўны працэс ажыўлення мінулага ва ўспамінах і няспыннае наданне яму сэнсаў[7].

Контуры названых падыходаў, якія вызваляюць ад анталагізацыі "гістарычных фактаў" і дазваляюць выяўляць функцыі, здавалася б, нязменных феноменаў грамадска-культурнага жыцця, вызначылі агульную метадалагічную аснову выкананай працы. Уяўленні пра бітву пад Грунвальдам і яе значэнне, што пашыраліся ў беларускім грамадстве, разглядаюцца як міфічны аповед з перспектывы канцэпту "культурнай памяці", якая трансфармуе гісторыю ў міф. Дакладней, паняцце міфа і шэрагу звязаных з ім канцэптаў, такіх, як "месцы памяці" (*lieux de mémoire*), "гістарычная палітыка", калектыўная ідэнтычнасць і іншыя, апісваюцца ў асобным тэарэтычным раздзеле. Сам тэрмін "міф" выкарыстоўваецца ў кнізе без характэрных для традыцыйнай гістарыяграфіі пейаратыўных канатацый, а нейтральна, адпаведна культурнай гісторыі і канцэпцыі культурнай памяці – як азначэнне аповеду пра мінулае, прызначанага для ўмацавання групавой ідэнтычнасці. Даследаванні памяці не задаюцца пытаннем аб праўдзівасці ці недакладнасці тых ці іншых уяўленняў пра мінулае, а цікавяцца прычынамі ўтварэння, падтрымкі ці зменаў пэўных вобразаў гістарычных падзей і асобаў. У гэтым сэнсе і мэта дадзенай працы не столькі ў крытыцы, колькі ў дэканструкцыі, разборы – вызначэнні ідэалагічнага зместу тыповых уяўленняў пра бітву 1410 г.

[6] Burke P. Varieties of Cultural History. Ithaca, New York, 1997. P. 43–59; Daniel U. Kompendium Kulturgeschichte: Theorien, Praxis, Schlüsselwörter. Frankfurt a. M., 2004. S. 17–19.

[7] Assmann J. Das kulturelle Gedächtnis. Schrift, Erinnerung und politische Identität in frühen Hochkulturen. München, 1997. Пар.: Traba R. Przeszłość w teraźniejszości. Polskie spory o historię na początku XXI w. Poznań, 2009. S. 14–15, 230–231.

## 3 Стан даследаванасці і крыніцы

Дэканструкцыя ўласных міфаў і даследаванні памяці, якія ў апошнія дзесяцігоддзі перажывалі сапраўдны бум у заходняй навуцы[8], паступова становяцца нормай і для гістарыяграфій Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Калі пасля 1989 г. у дзяржавах былога сацыялістычнага блока хваля разбору гістарычных міфаў была абумоўлена імкненнем пераадолець ідэалагізаванасць гістарыяграфій папярэдняй эпохі[9], то потым гэты працэс абумовіла новае разуменне прыроды гісторыяпісання і збліжэнне гісторыі з памяццю. З суседніх дзяржаў асабліва паспяхова працы над вывучэннем памяці развіваюцца ў Польшчы. Каб не ўдавацца ў пералік адпаведных пазіцый, можна ўказаць на нядаўняе выданне збору падставовых тэрмінаў, які акумуляваў плён падобных даследаванняў, што праводзяцца там не першае дзесяцігоддзе[10].

У айчыннай гуманітарыстыцы даследаванні памяці пакуль не знайшлі прыхільнікаў, а феномен міфа на тэарэтычным узроўні тэматызаваўся толькі з перспектывы сацыяльна-палітычных навук. Сярод манаграфічных прац тут трэба назваць даследаванне Тамары Алпеевай, якая выдзеліла катэгорыю палітычнага міфа[11], разглядаючы яго ў радыкальна рацыяналістычнай трактоўцы як з'яву таталітарных рэжымаў, а таксама кнігу Генадзя Коршунава[12], які займаўся міфам у кантэксце сацыяльнай міфалогіі, не аддзяляючы, аднак, класічных міфаў ад сучасных. Апошнім часам канцэпты гістарычнай памяці і міфа

[8] Пар.: Васильев А. Г. Современные *memory studies* и трансформация классического наследия // Диалоги со временем. Память о прошлом в контексте истории. Москва, 2008. С. 19–49.

[9] Як паказальны прыклад гл.: Mity i stereotypy w dziejach Polski. Red. J. Tazbir. Warszawa, 1991. Пра ўзоры гістарычнага рэвізіянізму ў Чэхіі гл.: Маркава А. Гістарычная свядомасць як прадмет самарэфлексіі ў чэшскай гістарыяграфіі // БГА. Т. 19 (2012). С. 188–189.

[10] Modi memorandi. Leksykon kultury pamięci. Red. M. Saryusz-Wolska, R. Traba, współpr. J. Kalicka. Warszawa, 2014. У Нямеччыне міждысцыплінарны дапаможнік па гістарычнай памяці выйшаў значна раней. Гл.: Gudehus Ch., Eichenberg A., Welzer H. (Hg.) Gedächtnis und Erinnerung. Ein interdisziplinäres Handbuch. Stuttgart – Weimar, 2010.

[11] Алпеева Т. М. Социальный миф: сущность, структура, функции. Минск, 1992. С. 125–143.

[12] Коршунов Г. П. Место и роль социальной мифологии в структуре массового сознания. Минск, 2006.

сталі выкарыстоўвацца айчыннымі сацыёлагамі ў даследаванні беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці[13]. Гістарычная ж навука Беларусі не выявіла зацікаўленасці ў новых падыходах, якія дапускаюць сканструяванасць вобразаў мінулага і феномен міфалагізацыі ў самой гістарыяграфіі. Яна застаецца тыпова традыцыйнай, далёкай ад патрэбаў крытычнага аналізу суб'ектыўных установак і ацэнак, якімі насычаны адносіны беларусаў з суседзямі. Хоць сярод гістарычных выданняў апошніх дзесяцігоддзяў з'яўляліся публікацыі са словам *міф* у назве, аднак сучасныя тэарэтычныя падыходы даследавання міфа як формы сацыяльнай памяці ў іх не выкарыстоўваліся. Сутнасць такіх выданняў магла зводзіцца да агульных разваг і каталагізацыі міфаў гісторыі Беларусі[14] або нават да выкарыстання слова *міф* у якасці кляйма пры шальмаванні ідэалагічных апанентаў па цэху, крытыкаваных з пазіцый ведання "рэальных фактаў"[15].

Адносна памяці пра Грунвальдскую бітву трэба адзначыць, што ў нямецкай, польскай і літоўскай гістарыяграфіях пасля піянерскіх даследаванняў Свэна Экдаля напісана нямала сур'ёзных прац па дэміфалагізацыі яе нацыянальных вобразаў і выяўленні ідэалагічнага зместу грунвальдскай сімволікі[16]. Аднак у фокусе такіх даследаванняў было месца

[13] Ластовский А. Историческая память как фактор укрепления белорусской национальной идентичности // Социологический альманах. №1. Минск, 2010. С. 187–195; Ластоўскі А., Яфімава Н. Вытокі нацыянальнай дзяржаўнасці ў беларускай гістарычнай памяці // Arche. 2013. № 2. С. 411–448.

[14] Грыцкевіч В. Гісторыя і міфы. Мінск, 2000.

[15] Марзалюк І. Міфы "адраджэнскай" гістарыяграфіі Беларусі. Магілёў, 2009.

[16] Не пералічваючы ўсіх, назавем толькі найважнейшыя і новыя пазіцыі: Ekdahl S. Tannenberg / Grunwald – ein politisches Symbol in Deutschland und Polen // Deutscher Orden 1190–1990. Hg. von U. Arnold. Lüneburg, 1997. S. 241–302; idem, The Battle of Grunwald / Tannenberg ... P. 9–25 (гл. таксама інш. публікацыі С. Экдаля ў спісе літаратуры); Schenk F. B. Tannenberg / Grunwald // Deutsche Erinnerungsorte. Hg. von François E. und H. Schulze. Bd. I. München, 2001. S. 438–454; Traba R. Konstruowanie pamięci. Analiza semantyczna polskich obchodów rocznic grunwaldzkich // idem, Historia – przestrzeń dialogu. Warszawa, 2006. S. 206–225; Nikžentaitis A. Internationales Gedenken an die Schlacht bei Tannenberg // Tannenberg-Grunwald-Žalgiris 1410: Krieg und Frieden im Späten Mittelalter / Hg. von W. Paravicini, R. Petrauskas, G. Vercamer. Wiesbaden, 2011. S. 321–328; Nikžentaitis A., Mikailienė Ž. Litewski Žalgiris, polski Grunwald:

Грунвальда ў грамадскай свядомасці сваіх дзяржаў, часам – у параўнаўчай польска-нямецкай ці польска-літоўскай перспектыве, а беларускі аспект "пасмяротнага жыцця" Грунвальдскай бітвы са зразумелых прычын заставаўся звычайна па-за ўвагай[17]. У самой жа Беларусі пакуль не было сур'ёзных прац аналагічнага тыпу, прысвечаных аналізу феномена грунвальдскага міфа на беларускім матэрыяле[18].

Крыніцамі для даследавання паслужылі выданні навуковай гістарыяграфіі, навучальная літаратура і гістарычная публіцыстыка (пераважна часопісныя і газетныя артыкулы). Для эпохі савецкай Беларусі найбольшая ўвага аддадзена аналізу афіцыйных версій гісторыі, паколькі, як вядома, да перабудовы неаспрэчную манаполію на тлумачэнне мінулага ўтрымлівала за сабой дзяржава. Каштоўны матэрыял уяўляюць з сябе таксама падручнікі і дапаможнікі па айчыннай гісторыі. Паколькі ў Беларусі яны пішуцца, як правіла, гісторыкамі-навукоўцамі, а не дыдактамі, то выданні такога кшталту адлюстроўваюць адначасова і развіццё гістарыяграфіі, і палітыку дзяржавы па фармаванні пажаданых вобразаў мінулага. Як важны корпус тэкстаў, даступных шырэйшай аўдыторыі і здольных выклікаць большае ўздзеянне на чытача, разглядаецца і корпус гістарычнай публіцыстыкі. Пагатоў спецыфікай познесавецкай і постсавецкай Беларусі было тое, што ў публічным успрыманні мінулага ў Беларусі не адчуваўся падзел на публікацыі акадэмічнай гістарыяграфіі і папулярызатарскія выданні. Самым жа эфектыўным уплывам на масавую свядомасць валодае, як вядома, мастацкая літарату-

dwa toposy narodowe w kontekście analizy porównawczej // ZH. T. 75 (2010). S. 7–19; Petrauskas R., Staliūnas D. Die drei Namen der Schlacht. Erinnerungsketten um Tannenberg / Grunwald / Žalgiris // Verflochtene Erinnerungen: Polen und seine Nachbarn im 19. und 20. Jahrhundert. Hg. von M. Aust, K. Ruchniewicz und S. Troebst. Köln, 2009. S. 119–136; Petrauskas R. Grunwaldu życie pośmiertne od XV do XX w. w historiografii i tradycji litewskeij, białoruskiej i sowieckiej // Wojna, pamięć, tożsamość. O bitwach i mitach bitewnych. Pod red. J. M. Piskorskiego. Warszawa, 2012. S. 147–164.

17 Беларускі варыянт памяці пра Грунвальд усё ж закранаўся. Гл.: Petrauskas R. Grunwaldu życie pośmiertne od XV do XX w. w historiografii i tradycji litewskeij, białoruskiej i sowieckiej. S. 155–156.

18 Папярэдняй спробай раскрыць ідэалагічны змест беларускіх вобразаў Грунвальда быў артыкул аўтара гэтых радкоў. Гл.: Танэнберг / Грунвальд / Дуброўна 1410: сімвалізацыя бітвы ў Беларусі // БГА. Т. 17 (2010). С. 89–116.

ра, таму ў даследаванні не засталіся без увагі і рэлевантныя творы беларускай белетрыстыкі.

Эмпірычны матэрыял, датычны памяці пра Грунвальдскую бітву ў Беларусі, аналізуецца пасля разгляду шырокага палітычнага кантэксту актуалізацыі зваротаў да гісторыі Тэўтонскага ордэна, у якім высвятляюцца абставіны і матывы фармавання ідэалагічных канцэптаў Грунвальда. Такі падыход уяўляецца апраўданым, паколькі ідэі і канцэпты нельга разглядаць ізалявана, без уліку узаемаўплываў і сувязяў, якімі характарызуецца сфера інтэлектуальнага жыцця. Агульнапрынятыя для пэўнага часу вобразы мінулага наўрад ці можна ідэнтыфікаваць і адэкватна апісаць як феномены сацыяльнай памяці ў адрыве ад шырокага кантэксту ўмоў і абставін, пры якіх яны станавіліся папулярнымі і палітычна ўплывовымі. На важнасць шырокага кантэксту для разумення кожнай нацыянальнай гісторыі ўказваў выдатны польскі гісторык Антоні Моньчак, які падкрэсліў, што без ведання поглядаў, якія цыркулявалі ў гістарыяграфіі суседзяў, без уяўлення пра асноўныя гістарычныя школы Еўропы немагчыма добра зразумець і айчыннае мінулае[19]. Падобны прынцып па-свойму актуальны і для абыходжання з гістарыяграфіяй БССР, падыходы і канцэпцыі якой можна адэкватна ацаніць толькі ў кантэксце той гістарычнай ідэалогіі, якая праводзілася Масквой. Савецкая традыцыя ў многім прадвызначыла і аблічча гісторыяпісання ў Рэспубліцы Беларусь. Гістарычная навука суверэннай беларускай дзяржавы не сышла з нябёсаў. Хоць яна не была простым працягам савецкай, нельга недаацэньваць тую пераемнасць з ранейшымі практыкамі, якую забяспечвалі сістэма падрыхтоўкі акадэмічных кадраў, прыналежнасць кіроўных пасад тым, хто зрабіў кар'еру ў савецкай Беларусі, а таксама свядомая арыентацыя часткі гісторыкаў на ідэалогію савецкага гісторыяпісання. Апынуўшыся ў другой палове 1990-х г. ізаляванай ад цэнтраў еўрапейскай навукі, беларуская гістарыяграфія так і не пераадолела традыцыйнай заідэалагізаванасці і не перажыла канцэптуальнай мадэрнізацыі.

[19] Mączak A. (Red.) Historia Europy. Wrocław, 1997; Zasztowt L. Europa Środkowo-Wschodnia a Rosja XIX–XX wieku: W kręgu edukacji i polityki. Warszawa, 2007. S. 27.

## 4 Пра структуру кнігі

Застаецца патлумачыць структуру працы. У першым раздзеле чытач знойдзе апісанне падыходаў сучасных сацыяльна-гуманітарных навук да феномена міфічнага, а таксама канцэптуалізацыю паняцця палітычнага міфа, з перспектывы якога праводзіцца даследаванне. Там жа раскрываюцца звязаныя з міфам паняцці памяці, стэрэатыпа і калектыўнай ідэнтычнасці. У 2-м раздзеле разглядаюцца прыклады і практыкі дамадэрнага выкарыстання памяці пра Грунвальдскую бітву на землях дзяржаў, эліты якіх адстойвалі ў тым сутыкненні свае інтарэсы. Раздзелы 3 і 4 тэматызуюць прычыны і формы актуалізацыі памяці пра сярэднявечную бітву ў кантэксце нацыянальных канфліктаў доўгага XIX стагоддзя, а таксама вызначаюць асноўныя гістарыяграфічныя стэрэатыпы, што сталі каркасам міфізацыі Грунвальда. Важнасць гэтых раздзелаў палягае ў раскрыцці генезісу стэрэатыпа "Дранг нах Остэн", народжанага германаславянскім антаганізмам – ключавога канцэпту для разумення далейшых канструкцый сімвалічнасці Грунвальдскай бітвы ў таталітарных ідэалогіях XX ст. Практыкам ідэалагічнай інструменталізацыі бітвы ў Нямеччыне пры нацыянал-сацыялістах, а таксама ў Польшчы і СССР пасля пачатку II сусветнай вайны прысвечаны раздзелы 5 і 6. Як эфектыўны інструмент антынямецкай прапаганды, "Дранг нах Остэн" уяўляецца істотным і для ідэнтыфікацыі кананізаванага савецкага вобраза Грунвальда[20], якому аддадзена шмат месца з увагі на тое, што ён дэтэрмінаваў фармаванне афіцыйнай памяці пра бітву ў БССР.

Уласна беларускай памяці пра Грунвальд і прысваенню бітве тых ці іншых значэнняў беларускімі элітамі міжваеннага перыяду, пасляваеннай БССР і суверэннай Беларусі прысвечаны адпаведна раздзелы 7, 8 і 9. Яны ўтвараюць самую аб'ёмную і найбольш абгрунтаваную эмпірычна частку даследавання. Аналіз сабранага матэрыялу вытрыманы ў асноў-

[20] Вядучы савецкі славіст У. Каралюк называў Грунвальдскую бітву найважнейшай вяхой «адпору германскага "націску на Усход"», а "Дранг нах Остэн" лічыў "несумненным гістарычным фактам". Гл.: Королюк В. Д. Вступительная статья // Германская экспансия в Центральной и Восточной Европе: Сб. ст. по истории так называемого "Дранга нах Остен". Москва, 1965. С. 7, 15.

ным у храналагічным парадку, мэтазгоднасць чаго абумоўлена тым, што разбор падобных міфаў рацыянальна звязваць з паслядоўнымі этапамі іх фармавання, пачынаючы з генезісу. Дамінаванне апісальнай формы і частага цытавання крыніц абумоўлена імкненнем даць чытачу магчымасць большага адчування матэрыялу, а таксама паказаць імаверныя сувязі і залежнасці паміж узорамі інтэрпрэтацый і ацэнак Грунвальда ў прэзентацыях розных эпох.

У заключным раздзеле, рэкампенсуючы вынікі ўсёй працы, аўтар дзеліцца агульнымі назіраннямі і развагамі наконт сімвалічнага зместу святкаванняў юбілею Грунвальда ў 2010 г., параўноўваючы ўрачыстасці ў Беларусі і ў Польшчы.

Поўнае бібліяграфічнае апісанне выкарыстаных выданняў даецца ў спісе літаратуры, а ў падрадковых спасылках ужываецца звычайна іх скарочаная назва.

Раздзел 1

# Гісторыя і міф: тэарэтычныя падставы працы

## 1.1 Уступныя развагі пра міф

*Міфы з'ядноўваюць, падпарадкоўваюць, натхняюць, праз іх захоўваюцца грамадствы і робяцца рэвалюцыі.*

Мікалай Бярдзяеў[1]

Усялякая размова пра міфы ў гісторыі выклікае, як правіла, устойлівую асацыяцыю супрацьпастаўлення праўды і няпраўды. Аднак першапачаткова такой апазіцыі, звязанай з міфам, не існавала. Традыцыя крытычнага ўспрымання міфа была закладзена грэцкай філасофіяй, у якой на мяжы III і IV ст. да н. э. яго пачалі разумець як нешта процілеглае *логасу*, г. зн. праўдзе і рацыянальнасці[2]. Ужо для такіх гісторыкаў, як Фукідыд і Палібій, міфы сталі "байкамі", фікцыяй, а пісанне гісторыі лічылася пошукам праўды пра мінулае[3]. Не баючыся перабольшання, можна сказаць, што і сёння для абсалютнай большыні тых, хто займаецца гісторыяй прафесійна і кіруецца традыцыйнай канцэпцыяй праўды[4], як, відаць, і для многіх гісторыкаўаматараў, міф і гістарычная навука – рэчы ўзаемавыключаль-

[1] Бердяев Н. А. Царство Духа и царство Кесаря. Москва, 1995. С. 237.

[2] Overing J. The Role of Myth: an Anthropological Perspective, or "The Reality of the Really Made-up" // Myth and Nationhood. Ed. by G. Hosking and G. Schöpflin. London, 1997. P. 1–2.

[3] Напрыклад, Фукідыд, калі пісаў свой твор, то не давяраў "баснаслоўным гісторыям" і лічыў неабходнай "грунтоўную праверку" расказаных яму звестак. Гл.: Фукидид. История / пер. и прим. Г. А. Стратановского. Москва, 1999. С. 16–17.

[4] У класічным азначэнні, выказаным яшчэ Арыстоцелем і сфармуляваным Тамашом Аквінскім, праўдай лічыцца адпаведнасць паміж дум-

ныя. У гэтым няма нічога дзіўнага, бо ператварэнне гісторыі ў навуку традыцыйна звязвалася з пераадольваннем міфаў. Невыпадкова працэс станаўлення гістарычнай дысцыпліны і ў савецкай гістарыяграфічнай традыцыі, у якой адбылося прафесійнае сталенне нашага пакалення гісторыкаў, сімвалічна вызначаўся як шлях "ад міфа да навукі"[5].

Адпаведна традыцыям асветніцтва міф застаецца антытэзай рэальнасці і атаесамляецца з данавуковай эпохай у самым шырокім публічным дыскурсе. Да параўнальна нядаўняга часу міфічнае ўспрыманне свету лічылася ўласцівасцю прымітыўных людзей, характарыстыкай традыцыйных грамадстваў, тады як сучаснае грамадства ўспрымалася як іх апазіцыя. Маўляў, народы заходняй цывілізацыі вызначае схільнасць да рацыянальнага мыслення і дэканструкцыі міфаў. Напрыклад, амерыканскі філосаф Бэроўз Данэм пісаў пасля вайны з уласцівым для той эпохі аптымізмам, што міфы "як аб'ект веры не даюць ніякай карысці тым, хто ў іх верыць", і што яны толькі шкодзяць развіццю чалавецтва, якому "неабходны веды, а не міфы"[6].

Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст., калі ў выніку крызісу класічнай эпістэмалогіі хвалепадобна ўзрасла навуковая цікавасць да гэтага феномена, стаўленне да міфа пачало мяняцца. Як выявілі спецыяльныя даследаванні, арганізацыяй светапогляду сучасныя людзі мала адрозніваюцца ад сваіх старажытных продкаў: стэрэатыпы і міфы працягваюць выконваць найважнейшыя функцыі ў публічнай сферы[7]. Хоць сучасны свет і рацыянальны, міфічная свядомасць чалавека (структуры міфічнага мыслення) застаецца актыўнай. Класічным даследаваннем актуальнасці міфаў у сучасным грамадстве лічыцца эсэ Лешка Калакоўскага "Прысутнасць міфа"[8], у якім польска-англійскі філосаф выступіў з тэзай пра міфічны характар значнай часткі культуры і антрапалагічна патлумачыў схільнасць людзей да міфаў. Ён паказаў, што як бы хто ні імкнуўся да чы-

кай і рэальнай рэччу: *Veritas est adequatio rei et intellectus* (Т. Аквінскі). Пар.: Вальверде К. Философская антропология. Москва, 2000. С. 230.

5 Ерофеев Н. А. Что такое история. Москва, 1976. С. 4–36.

6 Данэм Б. Человек против мифов. Москва, 1961. С. 31.

7 Пар.: Hennig K. Złudzenia i mity potęgi władzy // Mity historyczno-polityczne, wyobrażenia zbiorowe, polityka historyczna. Studia i materiały. T. 1. Pod red. E. Ponczka, A. Sepkowskiego. Toruń 2010. S. 30–31.

8 Kołakowski L. The Presence of Myth. Chicago, 1990. Аўтар справядліва ўказваў і на міфічныя аспекты навуковага пазнання.

ста рацыянальнага мыслення, заўсёды будзе заставацца рэзервуар міфічных уяўленняў, якія дапамагаюць чалавеку знаходзіць жыццёвыя сэнсы.

Пра натуральную патрэбу самога грамадства ў міфах і тыя функцыі, якія яны выконваюць у жыцці людзей і цэлых народаў, даўно з розных перспектыў гаварылася ў навуковай літаратуры. “Народы не могуць існаваць без міфаў, без міфаў не можа існаваць улада і кіраваць чалавечым грамадствам”, – саркастычна выказаўся ў свой час расійскі філосаф Мікалай Бярдзяеў, які называў міфы “сацыяльна карыснай фікцыяй” і супрацьпастаўляў іх праўдзе[9]. Пра тое, што ніякая арганізаваная супольнасць не можа існаваць без стварэння для самой сябе міфічнай прасторы, пісаў сусветна вядомы гісторык рэлігіі Мірча Эліядэ, па сцвярджэнні якога міф наогул трэба лічыць антрапалагічнай канстантай[10].

У цяперашнім грамадстве міфалагізацыя выконвае асаблівую ролю пры звароце людзей да мінулага. Вядома, што як індывід, так і групы людзей непазбежна ідэнтыфікуць сябе з гісторыяй, прычым гістарычная ідэнтыфікацыя заўжды адбываецца на аснове міфалагізаванага мыслення. Для шырокай публікі гісторыя існуе толькі ў міфалагізаванай іпастасі. Мінулая рэальнасць, адлюстраваная міфамі, утрымлівае больш сэнсаў і эмацыйна бліжэйшая да цяперашняга жыцця, чым яе рацыяналізаваная гісторыкамі форма. Па вялікім рахунку гісторыя і становіцца часткай сучаснасці дзякуючы падобнай міфалагізаванай ідэнтыфікацыі[11]. Міфы робяць зразумелай людзям сутнасць мінулага і сучаснага, звязваючы іх як дзве сферы адной рэальнасці, – яны быццам злучаюць у адно экзістэнцыйныя часткі мінулага і цяперашняга жыццёвага свету[12]. У гэтай сувязі цалкам справядліва задавацца пытаннем, ці можа мысленне людзей наогул вызваліцца ад міфаў. У дадатак неабходна ўлічваць, што ў сучасным свеце патрэба ў адзначаным уздзеянні міфаў толькі ўзрастае, паколькі ў выніку страты даверу

[9] Бердяев Н. А. Царство Духа и царство Кесаря. С. 237.

[10] Гл.: Eliade M. Mify, sny, misteria. Warszawa, 1994. S. 22; Элиаде М. Аспекты мифа. Москва, 2001. С. 202.

[11] Пар.: Jamme C. Geschichten und Geschichte. Mythos in mythenloser Gesellschaft. Erlangen – Jena, 1997. S. 24.

[12] Пар.: Cruz L., Frijhoff W. (Eds.). Myth in history, history in myth. Leiden – Boston, 2009. P. 7; Schmale W. Scheitert Europa an seinem Mythendefizit? // Geschichte als Argument / 41. Deutscher Historikertag in München. S. 31.

да вялікіх наратываў не засталося ранейшых арыентацыйных дамінантаў, якія ўтваралі ў грамадстве адчуванне стабільнасці, а з'яўленне мноства ідэнтыфікацыйных стратэгій замест агульнай гістарычнай памяці вядзе да ўсё большай фрагментацыі і вакууму калектыўнага адчування[13].

Вось жа, нягледзячы на сапраўдны бум цікавасці да названага феномена, якая спарадзіла вялікую колькасць адпаведных выданняў, сам міф у літаратуры часта разумеецца зусім па-рознаму. Адзінага азначэння міфа, якое ахапляла б усе яго тыпы і функцыі ў архаічных і традыцыйных грамадствах, у гуманітарных навуках наогул няма, як не існуе і адной тэорыі. У якасці асноўных арыентацыйных тэорый пра міф служаць вучэнні нямецкага філосафа Эрнэста Касірэра, брытанскага антраполага Браніслава Маліноўскага, французскага этнолага Клода Леві-Строса, а таксама ўжо цытаванага Мірчы Эліядэ і французскага семіётыка Ралана Барта. Як высвятляецца, усе яны разглядалі названы феномен з розных перспектыў. Амерыканскі гісторык рэлігій Іван Стрэнскі пасля іх аналізу адзначыў, што ў тэорыі Б. Маліноўскага, як і Э. Касірэра, па сутнасці "прапісана" толькі пэўнае абыходжанне з міфам і не ўлічана, што існуе больш чым адзін клас феноменаў, якія можна называць міфамі[14]. Першы як функцыяналіст звязаў міф з магіяй і акцэнтаваў яго сацыяльна-псіхалагічныя функцыі ў жыцці архаічнага грамадства[15]. Э. Касірэр тлумачыў міф як вынік функцыявання міфічнай свядомасці, ці як спецыфічны від сімвалічнай экспрэсіі. У сваю чаргу М. Эліядэ наогул не даваў нідзе яснага азначэння таго, што трэба лічыць міфам. З аналізу яго прац І. Стрэнскі вызначыў некалькі асноўных пунктаў, якія характарызуюць сутнасць разумення румынскім тэарэтыкам названага феномена. Міфы ў М. Эліядэ – гэта аповеды пра паходжанне і сакральныя пачаткі, якія забяспечваюць людзей экзістэнцыйнымі арыентацыямі і задавальняюць іх сутнасныя патрэбы знаходзіць сваё анталагічнае месца ва ўніверсуме[16]. У адрозненне ад апошняга, К. Леві-Строс верыў у аўтаномнасць і секуляр-

[13] Пар.: Jamme Ch. Geschichten und Geschichte. S. 17–20, 27.

[14] Strenski I. Four Theories of Myth in Twentieth-Century History: Cassirer, Eliade, Lévi-Strauss and Malinowski. Basingstoke, 1987. P. 68.

[15] З даступных у перакладзе яго прац гл. даследаванне пра магію туземцаў Трабрыянскіх выспаў каля Новай Гвінеі: Малиновский Б. Избранное: аргонавты западной части Тихого океана. Москва, 2004.

[16] Strenski I. Four Theories of Myth. P. 72.

насць міфа, звязваючы яго з натуральнай тэлеалогіяй чалавечага розуму. Адпаведна яго тэорыі, міф не адкрывае рэлігійнай праўды і не выяўляе звышнатуральнай сілы; гэта асаблівы спосаб бачання свету, адказам на які з'яўляецца адпаведны рытуал[17]. У разуменні французскага этнолага найбольшае падабенства з міфамі архаічных грамадстваў мае палітычная ідэалогія нашага часу.

Калі працы названых вышэй тэарэтыкаў мелі справу пераважна з міфамі традыцыйных грамадстваў і феноменам міфалагізацый гісторыі, то Ралан Барт прапанаваў тэарэтычную аснову для разгляду такіх феноменаў, міфалагічнасць якіх усведамляецца толькі на падставе іх уздзеяння. Для гэтага ён выкарыстаў семіялогію як навуковы спосаб інтэрпрэтацыі масавай культуры[18]. Семіялогія пастулюе, што рэальнасць можа быць сканструяванай і зразумелай чалавеку толькі дзякуючы сістэме значэнняў, якія ніколі не бываюць нейтральнымі, а заўсёды звязаныя з пэўнымі інтарэсамі і мэтамі. Паводле Р. Барта, міф – гэта "слова, выказванне", аднак не любое, дадае ён, а толькі тое, якое трапляе ў "асаблівыя ўмовы" і пакрываецца дыскурсам; гэта "камунікацыйная сістэма", "спосаб азначвання". У гэтым сэнсе "любыя прадметы могуць стаць паведамленнем, калі яны што-небудзь значаць"[19], г. зн. у міф можа ператварацца што заўгодна. Чытач успрымае міф у якасці звычайнага паведамлення, як сістэму фактаў, хоць значэнне міфа, у адрозненне ад моўнага знака, заўжды матываванае, – міфаў наогул не бывае "без матываванай формы"[20].

Асноўную ўласцівасць міфа Р. Барт звязваў з "узвядзеннем гістарычна пераходных фактаў у ранг вечных", пазбаўленнем складанага гістарычнага свету ўсялякай гістарычнасці і ператварэннем яго ў "гарманічную карціну нязменных сутнасцяў"[21]. Тады дэміфалагізацыя раўназначная "разувекавечванню", пацвярджэнню зменлівасці і рухомасці свету. Тэорыя Р. Барта, у святле якой традыцыйнае трактаванне міфа праз апазіцыю

[17] Гл.: Леви-Строс К. Мифологики / пер. с. фр. Т. 1–3. Москва – С.-Петербург, 1999–2000; Strenski I. Four Theories of Myth. P. 158, 165.

[18] Пар.: Strinati D. An introduction to theories of popular culture. London, New York, 2000. P. 112–119.

[19] Барт Р. Миф сегодня // ён жа. Избранные работы: Семиотика. Поэтика. Москва, 1994. С. 72–74.

[20] Тамсама. С. 86, 92, 98.

[21] Тамсама. С. 110–111, 121.

"праўда – фікцыя" больш не можа задавальняць навукоўцаў, стала канцэптуальнай асновай для даследавання таго, што можна назваць "уладай міфаў"[22].

Няма патрэбы ўдавацца ў розныя дэфініцыі міфа, якія выкарыстоўваюцца ў спецыяльнай літаратуры. Яны істотна залежаць ад асаблівасцяў навукова-культурнага заплечча аўтараў, іх грамадска-палітычнай пазіцыі і даследчыцкай перспектывы. Спашлемся на выснову цытаванага вышэй І. Стрэнскага, які сцвярджае, што нейкіх агульнапрынятых палажэнняў наконт міфа і адзінага азначэння проста не існуе[23]. Канстатаваўшы, што міф ёсць спецыфічнай формай свядомасці, ад якой людзі не могуць пазбаўляцца, разгледзім цяпер узаемаадносіны міфа з гістарычнай навукай.

## 1.2 Міфы ў гістарыяграфіі

> *...Міфалагізацыя мыслення ёсць неад'емным атрыбутам... гістарычнага даследавання і пісання.*
>
> Ежы Тапольскі[24]

Як адзначалася ў пачатку папярэдняга параграфа, навуковая гісторыя паўставала з пошуку праўды – у выкрываннi міфаў як "баек" і замене іх праўдзівымі рэканструкцыямі мінулага. Размежаванне гісторыі і нявартых даверу легендаў і міфаў лічылася рацыянальнай асновай самой гістарычнай навукі. Праўда, на практыцы нават у часы росквіту пазітывісцкай гістарыяграфіі падобнае адмежаванне навукі ад міфалагізацый аказалася праблематычным. Прафесійныя гісторыкі і ў XIX, і ў XX ст.

[22] Пар.: Völker-Rasor A. Mythos. Vom neuen Arbeiten mit einem alten Begriff // MythenMächte – Mythen als Argument / Hg. von A. Völker-Rasor, W. Schmale. Berlin, 1998. S. 21, 30.
[23] Strenski I. Four Theories of Myth. P. 194–195.
[24] Topolski J. Historiografia jako tworzenie mitów i walka z nimi // Ideologie, poglądy, mity w dziejach Polski i Europy XIX i XX wieku. Studia historyczne. Pod red. J. Topolskiego, W. Molika i K. Makowskiego. Poznań, 1991. S. 253.

часта не заўважалі мяжы паміж выкрываннем старых міфаў і стварэннем новых. У век нацыяналізмаў яны атрымлівалі навуковую легітымацыю дзякуючы выкрыванню ранейшых гістарычных міфаў, у той час як самі ж актыўна ўдзельнічалі ў нараджэнні новых, нацыянальных міфалогій. Аб практыцы свядомага і несвядомага дачынення традыцыйнай гістарыяграфіі да стварэння міфаў ужо шмат напісана[25], тым не менш гістарычная навука і сёння схільная па-ранейшаму прэзентаваць сябе як абвяржэнне міфаў. Такая пазіцыя дамінуе нават сярод гісторыкаў Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропы[26], не гаворачы пра айчынную гуманітарыстыку[27].

Між тым з апошняй трэці XX ст., калі была адкрыта літаратурная прырода гістарычнага наратыву, традыцыйныя ўяўленні пра гістарыяграфію і міф як з'явы ўзаемавыключальныя, звязаныя антаганістычнымі адносінамі, паслядоўна пераглядаюцца. Гэта можна звязваць як з разуменнем абумоўленасці гістарычных ведаў іх наратыўнай арганізацыяй, так і з выяўленнем спецыфічнай залежнасці гістарыяграфіі ад грамадскіх запатрабаванняў, якая стала цяпер больш відавочнай. Удакладнім, што

[25] Пра служэнне гістарыяграфіі інтарэсам нацыянальнай дзяржавы ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе гл.: Niderhauser E. Problèmes de la conscience historique dans les mouvements de renaissance nationale en Europe Orientale // Acta Historica Academiae Hungaricae. Vol. 18 (1972). Nr.1. P. 39–71; Geschichtliche Mythen in den Literaturen und Kulturen Ostmittels- und Südosteuropas. Hg. von E. Behring, L. Richter, W. F. Schwarz. Stuttgart, 1999; Bak J. Die Mediävisierung der Politik in Ungarn im 19. und 20. Jahrhundert // Umkämpfte Vergangenheit. Hg. von P. Bock und E. Wolfrum. Göttingen, 1999. S. 103–113; Пра інструменталізацыю гісторыі ў рэспубліках Закаўказзя гл.: Шнирельман В. А. Войны памяти. Мифы, идентичность и политика в Закавказье. Москва, 2003.

[26] Прывядзем толькі некалькі прыкладаў: Momigliano A. The Classical Foundations of Modern Historiography. Berkeley, Los Angeles, Oxford, 1990; Trevor-Roper H. The Invention of Scotland. Myth and History. Yale University Press, 2008; Suchodolski S., Ostapowicz D. Obalenie mitów i stereotypów. Od Jana III Sobieskiego do Tadeusza Kościuszki. Warszawa, 2008.

[27] Пар.: Спірыдонаў М. Міфы – яшчэ не гісторыя // Навіны Беларускай акадэміі. 1992. № 37–38; Касцюк М. П. Нацыянальная канцэпцыя гісторыі: асноўныя падыходы // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы): Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Мінск, 3–5 лютага 1993 г. Ч. 1. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994. С. 5; Грыцкевіч В. Гісторыя і міфы. Мінск, 2000.

размова вядзецца не толькі пра нацыянальную гістарыяграфію ці любы тып т. зв. "афірматыўнага" гісторыяпісання, г. зн. такога, што ставіць мэтай "сцвердзіць і ўзнесці пэўную традыцыю ці групу, чыю гісторыю і вопыт яна вывучае"[28]. Такая па сутнасці дыдактычная гістарыяграфія па вызначэнні асуджана на міфы як загадзя зададзенае тлумачэнне мінулага[29]. Аднак і крытычная гістарычная навука, якая стаіць у апазіцыі да традыцыйнай гістарыяграфіі, не можа быць застрахаваная ад прадукавання няпраўдзівых ведаў і не валодае імунітэтам ад міфатворчасці.

Праблему міфалагізацыі ў гістарыяграфіі адным з першых ва Усходняй Еўропе спецыяльна тэматызаваў польскі тэарэтык гісторыі Ежы Тапольскі. Ён належаў да нямногіх вучоных, якія не падзялялі перакананняў аб выразнай мяжы, што аддзяляе міф ад логасу, і даўно падкрэсліваў, што "міф неадлучны ад навукі", у якой як на ўзроўні фактаграфіі, так і ў тэорыі адбываюцца пастаянныя працэсы міфалагізацыі[30]. Разглядаючы гістарыяграфічныя (або наратыўныя) міфы, Е. Тапольскі ўказваў, што імі можна лічыць выказванні пра свет, "якія стыхійна атрымалі або якім быў нададзены (грамадскімі ці палітычнымі сіламі) статус фактаграфічнай ці сімвалічнай не верыфікаванай праўды… у большай ці меншай ступені сакралізаванай"[31]. Згаданая сакралізацыя (неабавязкова рэлігійная), безумоўнае ўспрыманне на веру акурат і характарызуе міфы як архаічныя, так і сучасныя, адрозніваючы іх ад звычайных баек і легендаў.

Удакладнім, што з гістарыяграфічнымі міфамі не трэба звязваць проста няпраўдзівыя і неабгрунтаваныя выказванні пра

[28] Мегилл А. Историческая эпистемология. Москва, 2009. С. 99.

[29] Нагадаем, што па тэорыі Я. Асмана, кожную заснавальную (*fundierende*) гісторыю можна называць міфам, незалежна ад таго, фіктыўная яна ці не. Гл.: Assmann J. Das kulturelle Gedächtnis. Schrift, Erinnerung und politische Identität in frühen Hochkulturen. München, 1997. S. 75–77.

[30] Topolski J. Historiografia jako tworzenie mitów i walka z nimi // Ideologie, poglądy, mity w dziejach Polski i Europy XIX i XX wieku. Studia historyczne. Pod red. J. Topolskiego, W. Molika i K. Makowskiego. Poznań, 1991. S. 244–245; idem, Rzecz o socjologii wiedzy historycznej: mity fundamentalne w pisaniu historii // PH. 1994. Nr. 5. S. 27–36; idem, Mity a problem prawdy historycznej // Historia, mity, interpretacje. Pod red. A. Barszczewskiej-Krupy. Łódź, 1996. S. 15–27; idem, Historiographische Mythen. Eine methodologische Einführung // Mythen in Geschichte und Geschichtsschreibung aus polnischer und deutscher Sicht / Hg. von A. von Saldern. Münster, 1996. S. 28–34.

[31] Topolski J. Historiografia jako tworzenie mitów i walka z nimi. S. 244.

мінулае. Няма падстаў лічыць імі звычайныя недакладнасці і сцвярджэнні, якія пярэчаць эмпірычным фактам, – іх дастаткова ў навуковых працах, але ўсе яны выпраўляюцца шляхам верыфікацыі і крытыкі[32]. Гістарыяграфічныя міфы ўзнікаюць там, дзе вядзецца пра важныя падзеі ці з'явы. Пэўныя сцвярджэнні пра мінулае, хоць яны не пацверджаны неабходнымі крыніцамі ці навуковымі даследаваннямі, а заснаваны на легендарнай традыцыі, могуць пашырацца і цыркуляваць у гістарыяграфіі. Такія няпраўдзівыя "веды", калі яны касцянеюць у сваёй дэфармацыі, "нерухомеюць" і становяцца догмамі, – набываюць асаблівы статус як нешта агульнапрынятае, ператвараюцца ў міфы. Галоўнымі ж фактарамі, якія спрыяюць з'яўленню гістарыяграфічных міфаў, Е. Тапольскі называў псіхалогію самой навуковай творчасці (інэртнасць і прывязанасць да ўласных перакананняў), залежнасць ад грамадскіх запатрабаванняў, ідэалагічныя перакананні і цэнзуру[33].

Узорам міфа, выпрадукаванага самой гістарычнай навукай, цяпер лічыцца міф абсалютызму, якім аказаліся яшчэ нядаўна агульнапрынятыя ўяўленні пра развіццё заходнееўрапейскай манархіі ранняга Новага часу. Доўгі час гісторыкі Англіі і Францыі памылкова прызнавалі існаванне адрозненняў паміж французскімі "абсалютнымі" манархамі, якія манапалізавалі ўладу, і англійскімі "абмежаванымі" каралямі, што падзялялі яе з палітычнай нацыяй. У сённяшняй гістарычнай навуцы прызнаецца, што большасць манархаў з'яўляліся адначасова і "абсалютнымі", і "абмежаванымі"[34]. Паказальны прыклад іншага падобнага міфа, несвядома створанага высокакваліфікаванымі спецыялістамі, можа прапанаваць нядаўняя практыка англійскай гістарыяграфіі. Так, даследуючы ранніх англійскіх метадыстаў (рээнтараў), група пракамуністычна арыентаваных гісторыкаў інтэрпрэтавала ролю і значэнне падзей і асоб павод-

[32] Да скрупулёзнай працы з крыніцамі і самакрытычнасці даследчыка як магчымасці ствараць праўдзівыя апісанні мінулага і пасля сітуацыі постмадэрну апелявалі вядомыя гісторыкі. Гл.: Evans R. J. In Defence of History. London, 1997. P. 220; Rosman M. Jak pisać historię żydowską? Wrocław, 2011. S. 24, 28.

[33] Topolski J. Historiographische Mythen. S. 28, 30; idem, Historiografia jako tworzenie mitów i walka z nimi. S. 244–245, 247.

[34] Пар.: Henshall N. The Myth of Absolutism. London, 1992. Рускамоўная версія: Хеншелл Н. Миф абсолютизма: Перемены и преемственность в развитии западноевропейской монархии раннего Нового времени. С.-Петербург, 2003.

ле сваіх ідэалагічных установак[35]. У выніку, як паказаў у аналізе іх падыходаў Джэймс Дэйвіс[36], з'явіўся міфалагізаваны вобраз сапраўдных рэвалюцыянераў XVII ст.

Вядома, задача гістарычнай навукі палягае ў пастаяннай верыфікацыі і абвяржэнні агульнапрынятых, "сакралізаваных" версій. Аднак сёння і ў самой гістарыяграфіі ўсё часцей прызнаецца, што абвяргаючы памылковыя версіі тлумачэння мінулага, аддзяляючы факты ад міфаў, даследчыкі атрымліваюць "новую гісторыю, якая імкнецца стаць новым міфам"[37]. Па словах цытаванага польскага вучонага, барацьба з міфамі ў гістарыяграфіі – з'ява перманентная, і яна не можа скончыцца, бо міфалагізацыя мыслення ўласціва самой навуковай працы гісторыкаў[38].

Дыскусіі канца XX ст. пра сутнасць гістарычнага пазнання, выкліканыя галоўным чынам тэорыяй т. зв. "лінгвістычнага павароту"[39], выявілі ўсю складанасць узаемаадносін рацыянальнага і міфалагічнага ў гістарыяграфіі. Паказаўшы невыразнасць мяжы паміж наратывамі гістарычным і літаратурным, яны прымусілі гісторыкаў пагадзіцца з абмежаванасцю і адноснасцю іх ведаў. Сучаснай навуковай гістарыяграфіі, пазбаўленай ранейшых прэтэнзій на валоданне поўнай гістарычнай праўдай, даводзіцца прызнаваць, што любыя выказванні

[35] Як найбольш характэрны прыклад даследавання з такой ідэалагічнай залежнасцю гл.: Hill Ch. The World Turned Upside Down. Radical Ideas during the English revolution. London, 1991.

[36] Davis J. Fear, Myth and History. The Ranters and the Historians. Cambridge, 2002. P. 94–125. Пар.: Флад К. Политический миф. С. 52, 54–56.

[37] Пар.: История и память. Историческая культура Европы до начала Нового времени / под ред. Л. П. Репиной. Москва, 2006. С. 41. Арон Гурэвіч таксама лічыў наіўным уяўленне, быццам гістарычныя веды могуць пазбавіцца міфатворчасці ці ўплыву міфаў, а выйсце бачыў "у нястомнай самарэфлексіі гісторыка" і эпістэмалагічным самакантролі на ўсіх этапах працы даследчыка. Гл.: Гуревич А. Историческая наука и научное мифотворчество (Критические заметки) // ён жа. История – нескончаемый спор. Медиевистика и скандинавистика: статьи разных лет. Москва, 2005. С. 548.

[38] Topolski J. Historiographische Mythen. S. 29.

[39] Для агульнага агляду праблемы гл.: Hanisch Et. Die linguistische Wende. Geschichtswissenschaft und Literatur // Kulturgeschichte Heute / Hg. von W. Hardtwig und H.-U. Wehler. Göttingen, 1996. S. 212–230; Кукарцева М. А. Лингвистический поворот в историописании: эволюция, сущность и основные принципы // ВФ. 2006. № 4. С. 44–55.

пра мінулае прэтэндуюць толькі на гіпатэтычную аб'ектыўнасць і праўдзівасць і застаюцца адкрытымі для крытыкі. Невыпадкова яе цяпер вобразна параўноўваюць з кругазваротам дэканструкцыі і новай канструкцыі міфаў. Сваёй аналітычнай працай гісторыкі спрыяюць дэканструкцыі міфаў, а калі займаюцца сінтэзам, то несвядома далучаюцца да міфатворцаў[40].

Калі адрозненне гісторыі ад міфа аказваецца такім цяжкавызначальным і калі толькі сімвалічная мяжа аддзяляе навуковую гісторыю ад гістарычнай прапаганды, то гісторыку важна ўсведамляць уласную адказнасць за свае тэксты. Вядомыя тэарэтыкі гістарычнай навукі заклікаюць акадэмічных гісторыкаў па-ранейшаму рыгарыстычна выконваць свой прафесійны абавязак. Напрыклад, больш "асэнсоўваць ды ўмацоўваць кагнітыўныя стратэгіі, якія адказваюць за аб'ектыўнасць і праўдзівасць" гістарычных ведаў, раіць Ёрн Рузен, да "змагання супраць інструменталізацыі гісторыі" заклікае Георг Ігерс[41], з гістарыяграфіяй, незалежнай ад этычных схільнасцяў і палітычных арыентацый даследчыка, звязвае максімалісцкі ідэал гісторыка і Алан Мэгіл[42].

Аднак гэта сапраўды толькі ідэал. Адным з ключавых фактараў, якія ўскладняюць гісторыкам адмежаванне крытычна-навуковай пазіцыі ад міфалагізацыі, з'яўляецца грамадская абумоўленасць гістарычнай навукі. Гістарыяграфія залежыць ад чаканняў грамадства, у якім яна функцыянуе, прасцей кажучы – яна вымушана лічыцца з публічным запатрабаваннем на міфы, бо папулярнасць гістарычным працам забяспечвае зусім не іх навуковая аб'ектыўнасць. Няма падстаў разлічваць на тое, што ў сучасным грамадстве павінна ўзрастаць запатрабаванне на больш навуковыя гістарычныя веды, – само падобнае дапушчэнне цяпер выглядае ілюзіяй гісторыкаў. Як нядаўна заключыў нямецкі даследчык Вольфганг Вэбэр, ніякай падобнай заканамернасці не існуе[43]. У гэтым кантэксце гістарычны міф як найбольш эфектыўны сродак абуджэння і падтрымкі шырокай цікавасці да мінулага з'яўляецца адной з перадумоў грамадскага запатрабавання на сам акадэмічны

[40] Völker-Rasor A. Mythos. Vom neuen Arbeiten mit einem alten Begriff. S. 30–31.
[41] Доманска Э. Философия истории после постмодернизма. С. 164, 218.
[42] Мегилл А. Историческая эпистемология. С. 89.
[43] Weber W. Historiographie und Mythographie. S. 72–73; idem, Mythos und Historiographie. S. 27.

занятак гісторыяй. Так сучасная гістарыяграфія апынаецца перад дылемай, якая вынікае з прэтэнзіі гісторыі на навуковую аб'ектыўнасць, з аднаго боку, і яе грамадскай абумоўленасці, з другога. Зразумела, задача гісторыі як навукі – праз дэканструкцыю крытыкаваць і выкрываць гістарычныя міфы. Але ў яе ж інтарэсах захоўваць мабілізацыйную сілу гістарычных міфаў, што выклікаюць цікавасць самай шырокай публікі да мінулага[44].

Свядомае фальшаванне і маніпуляцыі гісторыяй не будзем браць пад увагу як занятак, непрымальны для прафесійнай этыкі акадэмічных гісторыкаў. Нас цікавіць катэгорыя тых гістарычных міфаў, якія можна лічыць прадуктам грамадскіх запатрабаванняў ці якія былі абумоўлены ідэалагічнымі перакананнямі, палітычнай сітуацыяй, цэнзурай і да т. п. Асабліва шмат прыкладаў падобных міфалагізацый можна знайсці ў гісторыяпісанні дзяржаў Усходняй Еўропы, што набылі суверэнітэт пасля знікнення сацыялістычнага блока і распаду СССР, дзе яны служылі абароне самастойнасці, умацаванню ідэнтычнасці і нацыянальнай цэласнасці. Спачатку пажаданыя вобразы мінулага нараджаюцца ў шырокай грамадскасці, якая задае і самую канву інтэрпрэтацый, а затым іх прымаюць гісторыкі. Або, што больш тыпова для краін Усходняй Еўропы, патрэбныя гістарычныя версіі зверху спускаюцца палітычнымі ўладамі, пашыраюцца праз гістарычную адукацыю, масмедыі і замацоўваюцца пры дапамозе цэнзуры. Такім шляхам міфалагізаваная версія гісторыі, народжаная палітычным ці грамадска-культурным жыццём, пускае карані ў гістарыяграфіі і можа авалодваць свядомасцю нават самых высокапрафесійных гісторыкаў.

У найноўшай гісторыі Беларусі адной з паказальных міфалагізацый, узоры якой з грамадска-палітычнага жыцця былі перанесены ў гістарыяграфію, можна лічыць міф Грунвальдскай бітвы 1410 г. Аналіз звязанага з гэтай міфалагізацыяй комплексу гістарыяграфічных тэкстаў і гістарычнай публіцыстыкі ўяўляецца мэтазгодным правесці з перспектывы тэорыі палітычнага міфа, паняцце якога паспрабуем раскрыць у наступным параграфе.

[44] У дыскусіях нават ставілася пытанне, ці нельга прызнаць пазітыўнай ролю міфа ў гістарыяграфіі за стымуляцыю пазнання і сімвалізацыю гісторыі. Weber W. Mythos und Historiographie. S. 27–29.

## 1.3 Паняцце палітычнага міфа

*Новыя палітычныя міфы... гэта штучныя рэчы, сфабрыкаваныя вельмі кваліфікаванымі і вынаходлівымі майстрамі.*

Эрнэст Касірэр[45]

### 1.3.1 Азначэнне, формы і змест

Адразу адзначым, што палітычныя міфы як з'яву сучаснага грамадска-палітычнага жыцця нельга ставіць у адзін шэраг з класічнымі міфамі старажытных грамадстваў[46]. Сучасныя міфы не могуць атаесамляцца з "натуральнымі", архаічнымі, ужо з-за таго, што іх раздзяліла эпоха Асветніцтва. Яны тычацца гістарычнага часу, а не абсалютнага ("часу пачаткаў"), якім займаецца міфалогія архаічных грамадстваў. Інакш кажучы, пазбаўленыя эсхаталагічнай перспектывы, такія міфы паведамляюць пра людзей і падзеі, якія былі ў сапраўднасці. І нават калі з іх інфармацыяй не выпадае згаджацца, то яны зусім не фікцыя. Як больш істотнае ў даследаваннях адзначаецца структурна-функцыйнае адрозненне сучаснага міфа ад архаічнага. Нягледзячы на тое, што абодва належаць да грамадскай свядомасці, а міфічнае мысленне і ўспрыманне захоўваюць тыя ж асаблівасці, адзначаныя ў свой час Э. Касірэрам[47], іх рэалізацыя ў архаічных грамадствах і цяпер адбываецца па-рознаму. Калі архаічны міф не мог функцыяна-

[45] Cassirer E. The Myth of the State. Yale University Press, 1961. P. 282.

[46] Пар. адрозненне сучасных міфаў ад архаічных: Weber W. Historiographie und Mythographie. Oder: Wie kann und soll der Historiker mit Mythen umgehen? C. 71–72. Паводле Штэфана Гута палітычна-гістарычныя міфы сведчаць пра палітычную эру і яе сутнасці. Гл.: Guth S. Mythen und Stereotypen der deutsch-polnischen Beziehungsgeschichte in der Zwieschenkriegszeit // Politische Mythen im 19. und 20. Jahrhundert im Mittel- und Osteuropa. Hg. von H. Hein-Kircher und H. H. Hahn. Marburg, 2006. S. 208. Клод Леві-Строс адзначаў, што міфы нашага часу нараджаюцца "як ідэалогіі або палітычныя міфы". Цыт. па: Strenski I. Four Theories of Myth in Twentieth-Century History. P. 132.

[47] Cassirer E. Symbol i język / przeł. i wstęp B. Andrzejewski. Poznań, 2004. S. 114–115 і наст.; Кассирер Э. Философия символических форм. Т. 2. Мифологическое мышление. Москва, 2011. С. 43–75, 76–86.

ваць без фабулы з пэўнай структурай і ўвасабляў адзінства акрэсленага зместу, структуры, мовы і функцыі, то ў сучасным гэтага адзінства не патрабуецца, у ім фабула ўжо не настолькі важная для сцвярджэння галоўнай ідэі[48].

Само азначэнне "палітычны міф" досыць умоўнае, бо ён не ўтварае нейкага асобнага віду ці групы сучасных міфаў[49]. Невыпадкова спробы аддзяліць палітычныя міфы ад гістарычных не так даўно спецыяльна дыскутаваліся польскімі навукоўцамі[50]. Правядзенне падобнай мяжы сапраўды цяжка назваць канструктыўным, бо ўсе сучасныя міфы так ці інакш тычацца гісторыі, і ў той жа час усе яны могуць мець палітычны сэнс. Згаданая дыскусія сярод іншага паказала, што і выдзяленне ў асобную катэгорыю міфаў гістарычных выклікае тыя ж пытанні[51]. Тым не менш у сучасных даследаваннях прынята выдзяляць палітычныя міфы

[48] Bernat T. Mit polityczny. Warszawa, 1989. S. 25–27, 32–33; Szacka B. Mity a rzeczywistość społeczeństw nowoczesnych. S. 492; Пар.: Jabłońska-Bonca J. Z problematyki mitów prawnych // AUW. Nr. 1772. Prawo CCXLIV. Wrocław 1995. S. 57.

[49] Можна лічыць сімптаматычным тое, што ў літаратуры іх часам называюць гістарычна-палітычнымі ці гістарычнымі. Пар.: Hübinger G. Geschichtsmythen in "völkischer" Bewegung und "konservativer Revolution" // Dimension der Historik. Geschichtstheorie, Wissenschaftsgeschichte und Geschichtskultur heute. Jörn Rüsen zum 60. Geburtstag. Hg. von H. W. Blanke, F. Jaeger und T. Sandkühler. Köln [u.a.]: Böhlau, 1998. S. 95–103; François E., Schulze H. Das emotionale Fundament der Nationen // Mythen der Nationen. Ein europäisches Ponorama. Hg. von M. Flacke. München – Berlin, 1998. S. 18; Guth S. Mythen und Stereotypen der deutsch-polnischen Beziehungsgeschichte in der Zwieschenkriegszeit. S. 207–224.

[50] Гл.: Filipowicz S. Mit i spektakl władzy. Warszawa 1988. S. 79; Bernat T. Mit polityczny. S. 6–8; Markiewicz G. Rozważania wstępne nad pojęciem mitu historycznego // Polskie mity polityczne XIX i XX wieku. Pod red. W. Wrzesińskiego. Wrocław, 1994. S. 23–28.

[51] Markiewicz G. Rozważania wstępne nad pojęciem mitu historycznego. S. 25–26. Наогул, няма нічога больш гістарычнага, чым міф (Détienne M. Mythologies // Dictionnaire des Sciences Historiques. Paris 1986. P. 484). Яскравыя прыклады таго, як гістарычныя міфы выступаюць у іпастасі палітычных, разглядаюцца ў артыкуле венгерскага медыявіста Янаша Бака. Гл.: Bak J. M. Über einige Geschichtsmythen in Ungarn: vom Mittelalter bis zum Gegenwart // Politische Mythen im 19. und 20. Jahrhundert im Mittel- und Osteuropa. Hg. von H. Hein-Kircher und H. H. Hahn. Marburg, 2006. S. 147–155. Беларуская даследчыца Т. Алпеева палічыла правамерным выдзеліць палітычныя міфы ў "адносна самастойны від ідэалагічных міфаў", хоць прызнае, што ў іх выкарыстоўваецца гісторыя. Гл.: Алпеева Т. М. Социальный миф: сущность, структура, функции. Минск, 1992. С. 125, 132.

на падставе выкарыстання міфічных формаў у сферы палітычнага жыцця[52]. Такі падыход уяўляецца навукова правамерным і аперацыйна мэтазгодным таксама для дадзенай працы.

Хоць сам тэрмін "палітычны міф" шырока выкарыстоўваецца як палітолагамі, сацыёлагамі, так і гісторыкамі, адной агульнапрынятай дэфініцыі не існуе. У спецыяльнай літаратуры, аднак, вызначыліся досыць блізкія падыходы да разумення гэтага феномена. Палітычны міф з улікам яго асноўнай формы вызначаюць як "ідэалагічна маркіраваны наратыў, што прэтэндуе на статус праўдзівай падачы пэўных падзей мінулага, цяперашняга або прадказальнага будучага і які ўспрымаецца сацыяльнай групай як у асноўных рысах правільны"[53]. Феномен калектыўнай веры падкрэслівае ў палітычным міфе і амерыканскі палітолаг Мюрэй Эдэльман, для якога гэта найперш "перакананне, што раздзяляецца вялікай групай людзей і не ставіцца пад сумнеў"[54]. Больш адпаведнымі нам уяўляюцца дзве сэнсава блізкія дэфініцыі нямецкіх даследчыкаў з Марбурга. Паводле адной гэта «эмацыйна афарбаваны аповед, што "міфічна прачытвае" пэўныя гістарычныя падзеі і праз гэта інтэрпрэтуе рэчаіснасць не адпаведна фактам, а селектыўна і стэрэатыпна, прыдаючы ёй такім чынам падабенства гістарычнасці»[55]. Паводле другой, сфармуляванай палітолагам Андрэасам Дзёрнэрам, гэта "аповед пра падзеі мінулага, які надае ім асаблівае значэнне для сучаснага і такім чынам уздымае аўтарытэт тых, хто панаваў у тагачасным грамадстве"[56].

У тэорыі палітычнага міфа паслядоўна падкрэсліваецца важнасць прынцыпу калектыўнай веры. З аднаго боку, такія міфы выконваюць ролю майстар-наратыву для сваёй групы[57], а з дру-

[52] Speth R. Nation und Revolution. S. 115; Пар.: Hoegen J. Der Held von Tannenberg: Genese und Funktion des Hindenburg-Mythos. Köln, 2007. S. 11.

[53] Flood Ch. Political Myth. P. 44.

[54] Edelman M. J. Politik als Ritual: die symbolische Funktion staatlicher Institutionen und politischen Handelns. Frankfurt a. M., 1990. S. 110.

[55] Hein-Kircher H. Überlegungen zu einer Typologisierung von politischen Mythen aus historischer Sicht – ein Versuch // Politische Mythen im 19. und 20. Jahrhundert im Mittel- und Osteuropa. S. 408.

[56] Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. Der Hermannmythos: zur Entstehung Nationalbewußtseins der Deutschen. Reinbek bei Hamburg, 1996. S. 23.

[57] Hein-Kircher H. Überlegungen zum Verhältnis von "Erinnerungsorten" und politischen Mythen. Eine Annäherung an zwei Modebegriffe // Erinnerungsorte, Mythen und Stereotypen in Europa / Miejsca pamęci, mity i stereotypy w Europie. Hg. von H. Hein-Kircher, J. Suchoples, H. H. Hahn. Wrocław, 2008. S. 20.

гога бясспрэчны прыкладны характар аповедаў такога тыпу, іх функцыяванне ў якасці палітычнага аргумента[58]. Называючы палітычны міф "аповедам палітычнай супольнасці", Генры Т'юдор адзначаў, што гэта можа быць гісторыя групы людзей, якія самі не ўтвараюць палітычнай супольнасці і не актыўныя палітычна, але гэта заўсёды "міф пэўнай групы", і хоць у ім фігуруюць індывіды, пратаганістамі палітычнага міфа з'яўляюцца плямёны, нацыі, расы, класы і да т. п.[59].

Палітычныя міфы могуць як узнікаць стыхійна, так і прадукавацца мэтанакіравана. Узнікаюць яны звычайна шляхам адпаведнай міфізацыі[60] гістарычных падзей і асобаў, як рэакцыя пэўнай групы на рэчаіснасць. У літаратуры прадмета часта акцэнтуецца ўвага на канструктывісцкай прыродзе сучасных міфаў[61]. Аднак, як ужо адзначалася ў некаторых даследаваннях, трэба ўлічваць, што "вынаходства" міфаў і ўвядзенне іх "зверху" можа мець сэнс толькі пры ўмове, што яны не пярэчаць традыцыі і ад пачатку ўяўляюцца "натуральнымі" і "маральнымі"[62], так што зусім адвольна яны не ўтвараюцца. Тое ж, наколькі паспяхова ўвойдзе новы міф у публічную камунікацыю, залежыць ад рэзанансу, які ён можа выклікаць у грамадстве, ад кагнітыўных, эмацыйных і эстэтычных чаканняў апошняга[63].

Як заўважалася вышэй, палітычны міф характарызуецца найперш наратыўнай формай (хоць уздзейнічае таксама праз рытуалы і выявы) – усе яго элементы ўпарадкоўваюцца ва-

[58] Speth R. Nation und Revolution. S. 117; Tudor H. Political Myth. P. 138.

[59] Tudor H. Political Myth. P. 139.

[60] Факт грамадскага існавання міфа як фактару структуравання свядомасці і ўплыву на паводзіны неабходна адрозніваць ад "міфалагізацыі" рэчаіснасці ў літаратурным творы.

[61] Класічным варыянтам такога разумення міфаў можна лічыць канцэпцыю Ж. Сарэля. Пар.: Сорель Ж. Размышления о насилии. Москва, 1907. Пра тое, што стварэнне міфаў можа быць мэтанакіраваным, а палітыкі могуць выкарыстоўваць іх інструментарна, відаць, адным з першых пісаў Э. Касірэр (Cassirer E. The Myth of the State. New Haven, 1946. S. 50, 281, 287). У сучасных даследаваннях на гэтым таксама акцэнтуецца ўвага, як прыклад гл.: Алпеева Т. М. Социальный миф. С. 140; Dojnik J. Mity narodowe a myślenie polityczne // Mity historyczno-polityczne, wyobrażenia zbiorowe, polityka historyczna. Studia i materiały. T. 1. Pod red. E. Ponczka, A. Sepkowskiego. Toruń 2010. S. 44.

[62] Schöpflin G. The functions of myth and a taxonomy of myths. P. 26.

[63] Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 61; Lorenz C. Przekraczanie granic. S. 213–215.

кол “наратыўнай восі”. У працэсе міфізацыі выкарыстоўваецца такая апавядальная стратэгія, пры якой асобныя моманты прыўзносяцца, а гістарычныя асобы, здарэнні і падзеі лінейна злучаюцца такім чынам, што ўзнікае ўражанне іх натуральнай сэнсавай узаемасувязі, і яны становяцца знакавай формай пэўнай сімвалічнай структуры, прыдатнай для практычнага прымянення. Гэта своеасаблівы працэс тлумачэння, калі людзі ў нейкай асобе ці падзеі могуць угледзець патэнцыйную сімвалічнасць, якая дазваляе выражаць іх разуменне рэальнасці[64].

Разам з наратыўнасцю міфу ўласціва сімвалічнасць. Міф і сімвал, хоць яны не тоесныя, звычайна выступаюць у цеснай сувязі. Сімвал, калі ён аўтаматычна выклікае ў пэўнай групы асацыяцыю з іх міфам, называюць “сціснутай формай” міфа[65]. Напрыклад, сімвал Бастыліі адразу прадугледжвае наратыўнае разгортванне яе штурму, а свастыка ўказвае на міф нацыянал-сацыялісцкага “новага парадку”. Як феномен сімвалічнага характару міф па прыродзе шматзначны – у розныя эпохі і ў розных кантэкстах яго значэнне можа змяняцца. Але, хоць прыдатнасць міфа да новых абставін захоўваецца, змена яго значэнняў не адкрытая. Яна стрымліваецца манаполіяй на тлумачэнні, таму магчымасці новай актуалізацыі міфа залежаць не толькі ад грамадскіх запатрабаванняў, але і ад той улады, якая кантралюе публічную прастору[66].

Нягледзячы на тое, што міфізацыя блізкая да ідэалогіі і пры функцыянальным падыходзе іх цяжка адрозніць, палітычны міф неправамерна разглядаць як ідэнтычны ёй феномен[67]. Ідэалагічныя канструкцыі ўсё ж звязаны з інтарэсамі групы і сацыяльна лакалізаваныя, тады як канцэпт міфа флексібельны: міф не зарыентаваны ад пачатку на дамінаванне і ўладу (хоць можа весці

[64] Speth R. Nation und Revolution. S. 118, 120; Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 48.

[65] Schöpflin G. The functions of myth and a taxonomy of myths. P. 20; Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 48; Hoegen J. Der Held von Tannenberg. S. 9.

[66] Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 45.

[67] Пар.: Wülfing W., Bruns K., Parr R. (Hg.). Historische Mythologie der Deutschen 1798–1918. München, 1991. S. 10; Cruz L., Frijhoff W. (Eds.). Myth in history, history in myth. Leiden – Boston, 2009. P. 11–12. Як прыклады атаесамлення міфаў з ідэалогіяй у сучаснай літаратуры прадмета гл.: Флад К. Политический миф. С. 15 і наст.; Алпеева Т. М. Социальный миф. С. 17, 95, 126, 129. Сярод тэарэтыкаў абодва феномены амаль не адрознівалі К. Леві-Строс і Р. Барт.

да іх), яго характарызуе шматзначнасць і эмацыйна-афектыўны патэнцыял уздзеяння[68]. І структурна іх можна размежаваць як адрозныя формы свядомасці. Ідэалогія ўсё ж дае шанс рэфлексіі і дыскусіі над яе пастулатамі, тады як міф з-за свайго моцнага эмацыйнага кампанента выключае ўсялякія дыскусіі[69]. Дзякуючы згаданаму патэнцыялу ўздзеяння міф, хоць ён па сваёй сутнасці фіктыўны, здольны змяняць і фармаваць палітычную рэальнасць. Невыпадкова нярэдка гаворыцца аб "праўдзе" міфаў, хоць у такіх выпадках маецца на ўвазе, вядома ж, "праўда веры", а не дыскурс навуковага статусу[70].

Для існавання палітычных міфаў патрабуецца іх медыйная матэрыялізацыя – візуальная і пісьмовая. У еўрапейскай гісторыі асаблівую ролю ў кшталтаванні гэтага феномена выконвала выяўленчае мастацтва – дастаткова згадаць алегорыі ўладароў ранняга Новага часу[71], манументальныя карціны ўслаўлення Французскай рэвалюцыі[72] або сервільнае мастацтва таталітарных рэжымаў[73]. У пісьмовых медыях наймацнейшая традыцыя стварэння міфаў належыць мастацкай літаратуры, незалежна ад таго, ці гэта кананічныя творы высокай класікі, ці папулярная літаратура або авангард. Таленавіты твор можа настолькі дасканала перадаць патрэбныя ідэі ў мастацкіх формах, што яго вобразы робяцца ўзорам адпаведнага міфа. Асабліва спрыяльную прастору ўспрымання сімвалічнага прапануе тэатр. Тэатральныя пастаноўкі ствараюць магчымасць рытуалізаванага перажывання міфічнага сэнсу ў святочнай, амаль сакральнай атмасферы, у спалучэнні з якой эстэтычнасць міфічных канструкцый выклікае надзвычай глыбокае ўздзеянне[74]. Падобны ўплыў на гледача аказвае мастацкі фільм. Можна сказаць, выяў-

[68] Speth R. Nation und Revolution. S. 13, 112–115; Hoegen J. Der Held von Tannenberg. S. 20.

[69] Пар.: Bernat T. Mit polityczny. S. 305–306.

[70] Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 44.

[71] Пар.: Chrościcki J. A. Sztuka i polityka. Funkcje propagandowe sztuki w epoce Wazów 1587–1668. Warszawa, 1983.

[72] Пар.: Ian G., Robin S. (ed.) Symbols, myths and images of the French Revolution. Regina, 1998.

[73] Гл.: Голомшток И. Н. Тоталитарное искусство. Москва, 1994; Damus M. Sozialistischer Realismus und Kunst im Nationalsozialismus. Frankfurt a. M., 1981. Пар.: Nille N. Politik in Bildern. Visuelle Strategien zur Mythenbildung im frühen sowjetischen Plakat // Politische Mythen im 19. und 20. Jahrhundert im Mittel- und Osteuropa. S. 81–105.

[74] Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 50–51, 54–55.

ленчае мастацтва і літаратура з тэатрам і кіно, а таксама публіцыстыка – гэта сродкі не толькі фармулявання міфаў, але і іх распаўсюду, таму ім справядліва прыпісваецца міфагенны характар[75]. У наш час галоўнымі сродкамі перадачы міфічнай інфармацыі становяцца медыі з найбольшай публічнай аўдыторыяй – тэлебачанне і электронныя масмедыі, якія рэвалюцыйна павялічылі магчымасці распаўсюду і ўплываў палітычнага міфаўтварэння. Важнай сферай афармлення і замацавання міфаў у свядомасці новых пакаленняў з'яўляецца дзяржаўная сістэма адукацыі – школы і ўніверсітэты, дзе асобная ўвага аддаецца тлумачэнню мінулага пры кананізацыі адных асобаў і гістарычных сюжэтаў і стыгматызацыі або выдаленні з гістарычнай сцэны іншых. У шырокай грамадскай свядомасці міфы замацоўваюцца праз рознага роду прапагандысцкія кампаніі і адмысловыя мерапрыемствы камемарацыйнага характару – дні памяці і звязаныя з імі рытуалы, праз аб'ектывацыю ў помніках, манетах і марках, праз назвы вуліц і населеных пунктаў, і інш. Асаблівую ролю пры гэтым выконваюць помнікі як палітычныя сімвалы, што візуалізуюць міф і сканцэнтравана фіксуюць важную для грамадства гісторыю[76]. Па сутнасці, помнік творыць лінію традыцыі, звязваючы ў адзіны кантэкст мінулае з сучаснасцю і праектуючы яе на будучае, праз што легітымуецца існы лад. Як частка афіцыйнай памяці, ён наўпрост служыць утварэнню палітычнага міфа. Невыпадкова ў выніку заняпаду пэўнага ладу імкненне выцесніць з памяці звязаныя з ім ідэалы і каштоўнасці выяўляецца ў звяржэнні яго помнікаў[77].

Паводле тэматычнага зместу палітычныя міфы прынята ўмоўна раздзяляць на чатыры вялікія групы – міфы асобаў, міфы падзей, міфы прастораў ці тэрыторый і міфы часу[78]. Не пералічваючы многіх міфаў, што прадстаўляюць кожную з гэтых груп, згадаем толькі найбольш яркія іх прыклады, якія ўжо атрымалі ўвагу даследчыкаў. Гэта адпаведна міф Паўля фон Гіндэнбурга ў Нямеччынне[79] або міф Юзафа Пілсудскага

[75] Bernat T. Mit polityczny. S. 108.
[76] Пар.: Hein-Kircher H. Überlegungen zu einer Typologisierung… S. 415–416, 418.
[77] Greßhake F. *Damnatio memoriae*. Ein Theorienentwurf zum Denkmalsturz. München, 2010. S. 64–66.
[78] Hein-Kircher H. Überlegungen zu einer Typologisierung… S. 411–414.
[79] Hoegen J. Der Held von Tannenberg: Genese und Funktion des Hindenburg-Mythos. Köln, 2007.

ў Польшчы[80], міф Французскай рэвалюцыі, што ўкараніўся і ў навуковай гістарыяграфіі[81], ці міф Сталінградскай бітвы[82], што і пасля СССР жывы на постсавецкай прасторы, міф "Крэсаў" у паваеннай Польшчы[83] ці міф Галіцыі, і ўрэшце міф "залатога веку", які можа мець самы розны сэнс, але без яго не абыходзіцца ніводная нацыя[84].

Найчасцей у рэпертуар палітычных міфаў уваходзяць героі, подзвігі і дасягненні пэўнай палітычнай супольнасці – усё тое, што ўяўляецца важным і карысным для яе ўмацавання. Асаблівай прывабнасцю і сілай уздзеяння валодаюць міфы бітваў, якія найлепш адпавядаюць патрэбам калектыўнага (нацыянальнага) самасцвярджэння. У гэтам сэнсе важнымі для нацыянальнай кансалідацыі могуць быць не толькі пераможныя, але і прайграныя бітвы, як, напрыклад, бітва на Косавым полі для сербаў[85]. Параза можа трансфармавацца ў памяць пра пакуты, якія народу давялося цярпець ад ворагаў, і таксама служыць умацаванню яго адзінства. Паказальна, што, як прадэманстраваў аналіз падобных міфалагізацый бітваў еўрапейскай гісторыі XVIII–XX ст., усе яны падлягаюць бесперапыннаму пераасэнсаванню, пастаянным зменам тлумачэння адных і тых жа

[80] Hauser P. Mit Józefa Piłsudskiego. Narodziny i trwanie legendy // Dzieje polityczne, kultura, biografistyka. Studia z historii XIX i XX wieku ofiarowane prof. Z. Dworeckiemu. Red. P. Matusik, L. Trzeciakowski. Poznań, 2002. S. 181–190.

[81] Gary K. (ed.) The French Revolution: Recent Debates and New Controversies. London – New York, 1989.

[82] Самсонов А. Сталинградская битва. 4-е изд. Москва, 1989; Wette W. (Hg.). Stalingrad: Mythos und Wirklichkeit einer Schlacht. 5. Aufl. Frankfurt a. M., 2012.

[83] Пар.: Beauvois D. Mit "Kresów Wschodnich", czyli jak mu położyć koniec // Polskie mity polityczne XIX i XX wieku. Wrocław, 1994. S. 93–105; Benecke W. Die Kresy – ein Mythos der polnischen Geschichte // Politische Mythen im 19. und 20. Jahrhundert im Mittel- und Osteuropa. S. 257–266. Апісанне сутнасці міфаў прасторы гл.: Hein-Kircher H. Überlegungen zur Ausprägung und Funktion von Raummythen // Deutschlands östliche Nachbarschaften. Eine Sammlung von historischen Essays für Hans Henning Hahn. Hg. von E. Dmitrów und T. Weger, Frankfurt a. M., 2009. S. 105–119.

[84] Smith A. The "Golden Age" and National Renewal // Myths and Nationhood. London, 1997. P. 42–48, 52–55.

[85] Пар.: Emmert T. A. Serbian Golgotha: Kosovo, 1389, New York, 1990; Šuica M. The Image of the Battle of Kosovo (1389) Today: a Historic Event, a Moral Pattern, or the Tool of Political Manipulation // The Uses of the Middle Ages in Modern European States: History, Nationhood and the Search for Origins / ed. by R. J. Evans, G. P. Marchal. New York, 2011. P. 152–174.

падзей[86]. Падзеі, што сімвалізавалі пераломныя вехі гісторыі, у новых умовах мяняюць свой сэнс ці наогул страчваюць былую значнасць. Напрыклад, міф Французскай рэвалюцыі пасля Парыжскай камуны (1870) страціў сваю моц, бо настолькі змяніліся абставіны – памёрлі апошнія сведкі рэвалюцыйных падзей 1789–1794 г., і з усталяваннем інстытутаў III Рэспублікі лічылася цалкам выкананай праграма I Рэспублікі[87].

### 1.3.2 Функцыі палітычнага міфа

Уяўленне пра феномен палітычнага міфа не будзе поўным без высвятлення яго функцыянальнай сутнасці ці таго, якімі спосабамі ён уздзейнічае на грамадства і як успрымаецца людзьмі. Сярод асноўных функцый палітычнага міфа, апісаных у спецыяльнай літаратуры, можна вылучыць тры галоўныя – сэнсаўтваральную, інтэграцыйную і легітымацыйную[88].

Утварэнне *сэнсаў* і *сімвалаў* вынікае найперш са злучэння ў міфе цяперашняга з мінулым, з сацыяльнага ўпарадкавання навакольнага свету і стандартызацыі ведаў[89]. Цытаваны вышэй Андрэас Дзёрнэр называе міфы найважнейшымі грамадскімі "генератарамі" сэнсаў, якія "не толькі робяць палітычную рэальнасць успрымальнай, але і забяспечваюць яе праўдападобнасцю"[90]. Само сэнсаўтварэнне ў міфалагічным наратыве забяспечваецца паслядоўнай рэдукцыяй складанасці жыццёвай рэальнасці. Гэтаму спрыяюць асаблівасці міфічнай формы свядомасці, адзначаныя Э. Касірэрам[91], – такія, як нераздзяленне паміж цэлым і часткамі, паміж прадметам і яго атрыбутамі, атаесамленне прычыннасці з часавай звязанасцю,

[86] Kroener B. R. Kriegerische Gewalt und militärische Präsenz in der Neuzeit. Ausgewälte Schriften. Hg. von R. Pröve und B. Troß. Padeborn et a., 2008. S. 297.

[87] Mitzman A. B. Vom historischen Bewußtsein zur mythischen Erinnerung // Rüsen J., Jürgen S. (Hg.). Die dunkle Spur der Vergangenheit. Psychoanalytische Zugänge zum Geschichtsbewußtsein. Erinnerung, Geschichte, Identität 2. Frankfurt a. M., 1998. S. 402–403.

[88] Пар.: Schöpflin G. The functions of myth and a taxonomy of myths. P. 23–28; Bizuel Y. Theorien der politischen Mythen und Rituale. S. 21–32; Hein-Kircher H. Überlegungen zu einer Typologisierung… S. 420–423.

[89] Schöpflin G. The functions of myth and a taxonomy of myths. P. 20, 23.

[90] Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 53.

[91] Гл.: Кассирер Э. Мифологическое мышление. С. 43–75, 76–86.

ацэньванне па мадэлі "дабро" / "зло" і да т. п. Разнастайнасць свету і палітычнай рэальнасці, якая вызначае сэнсавую перспектыву, пераводзіцца ва ўпарадкаваную структуру дзякуючы простай схеме ўспрымання, для якой тыповым з'яўляецца прынцып дыхатаміі – прасторавай (унутраны – знешні), часавай ("перад" і "пасля") і сацыяльнай ("мы" і "яны"). Гэтым дасягаецца своеасаблівая рацыяналізацыя рэальнасці: незразумелае і складанае тлумачыцца праз яснае і вядомае, а падзеі асвятляюцца выбарачным спосабам, пры якім адно акцэнтуецца, іншае замоўчваецца, і ўсяму надаюцца адпаведныя сэнсы[92].

Як "генератар сэнсаў", датычных важнай для калектыву сапраўднасці, палітычны міф прынцыпова адрозніваецца гэтай функцыйнай уласцівасцю ад казак і легендаў, якія падпарадкуюцца іншай прагматыцы: яны не развіваюць калектыўнага палітычнага ўздзеяння, абмяжоўваючыся сферай прыватнага дыскурсу і фантазій[93].

*Інтэграцыйная* функцыя палітычнага міфа выяўляецца ў тым, што ён стварае эмацыйныя сувязі і адчуванне стабільнай прыналежнасці да адной групы ў зусім розных людзей, на аснове чаго і адбываецца інтэграцыя палітычнай супольнасці. Членам пэўнай сацыяльнай групы ён дазваляе ўспрымаць сябе як адну супольнасць, сфармаваную гістарычна і здатную да дзейнасці. Канструяванне такога ўяўленага адзінства праз міфы аблягчаецца тым, што станаўленне і самаразуменне калектыву яны зводзяць да простых і наглядных апісанняў[94]. Палітычная супольнасць ці група атрымлівае ясныя сэнсавыя стратэгіі для тлумачэння складанай рэчаіснасці, а становішча індывіда ў выніку спрашчаецца, паколькі ён атрымлівае гатовыя арыентацыйныя ўзоры[95]. Калі праз оптыку міфа дзеянне індывіда "ўпісваецца ў 'вышэйшую', пазачасавую перспектыву, то абмежаванасць уласнага жыцця здымаецца", і адзінка, хоць яе зямное існаванне завяршылася, працягвае жыць у рэвалю-

[92] Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 57; Hein-Kircher H. Überlegungen zum Verhältnis von "Erinnerungsorten" und politischen Mythen. S. 19–20.

[93] Пар.: Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 44; Speth R. Nation und Revolution. S. 65. У гэтай сувязі неабгрунтаваным уяўляецца падыход расійскага даследчыка, пры якім легенды ставяцца ў адзін шэраг з міфамі, толькі адрозніваюцца ад іх большай ступенню верагоднасці. Гл.: Карабущенко П. Л. Элитология мифа. Астрахань, 2008. С. 169.

[94] Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 59.

[95] Hoegen J. Der Held von Tannenberg. S. 13.

цыі, нацыі ці этніі[96]. Магчымасць адчуваць далучанасць да вечнай справы надае міфічнай камунікцыі ў палітыцы асаблівую прывабнасць.

З дзвюма першымі звязана трэцяя, *легітымацыйная* функцыя палітычнага міфа, якая выяўляецца звычайна ў выніку мэтанакіраванага выкарыстання мінулага ў палітычных мэтах – як правіла, для гістарычнага апраўдання існага парадку і прысваення палітычнага капіталу[97].

Інструментарнае выкарыстанне гісторыі, маніпуляцыі масавай гістарычнай свядомасцю для дасягнення канкрэтных мэтаў і ўмацавання ўлады – такія практыкі маюць вельмі даўнюю традыцыю. Дзеянні ўладаў, скіраваныя на стварэнне / умацаванне ў грамадстве адпаведнай візіі мінулага, у апошнія дзесяцігоддзі сталі прадметам асобнага накірунку даследаванняў – гістарычнай палітыкі. Тэрмін "гістарычная палітыка" (*Geschichtspolitik*) увялі нямецкія палітолагі для адмежавання сваіх даследаванняў ад метадаў гуманітарных навук, якія займаліся культурай памяці[98]. Яны звярнуліся да пытанняў арганізацыі, фінансавання і кіравання ды спосабаў прыняцця рашэнняў адносна структуры памяці найперш у мадэрных, плюралістычных грамадствах, дзе ідэі і звароты да мінулага могуць быць не прадпісаны зверху, а з'яўляцца самастойнай рэфлексіяй. У краінах жа Усходняй Еўропы гістарычная палітыка разумеецца звычайна як дырэктыўнае выкарыстанне гісторыі / памяці ўладамі, скіраванае на стварэнне пажаданага вобраза мінулага.

Пры таталітарных ці аўтарытарных рэжымах у маніпуляванні гісторыяй праз мэтанакіраванае пашырэнне адпаведнай палітычнай міфалогіі ўдзельнічае і гістарычная навука. Як у свой час трапна адзначыў Фрыдрых Гаек, у такіх дзяржавах "адзінай задачай гуманітарных навук становіцца пацвярджэнне афіцыйных поглядаў", і яны "ператвараюцца ў фабрыкі афіцыйных міфаў"[99]. Скрайнімі прыкладамі такой практыкі ін-

[96] Speth R. Nation und Revolution. S. 129–130; Dörner A. Politischer Mythos und symbolische Politik. S. 53. Пар.: Алпеева Т. М. Социальный миф. С. 108 і наст.

[97] Bizuel Y. Theorien der polityschen Mythen und Rituale. S. 25. Пад палітычнымі мэтамі трэба разумець не толькі адкрытае ажыццяўленне палітычных інтарэсаў або іх прыкрыццё, але і ўмацаванне ідэнтычнасці, стабілізацыю палітычнай супольнасці і да т. п. Гл.: Speth R. Nation und Revolution. S. 115.

[98] Assmann A. Der lange Schatten der Vergangenheit. S. 274.

[99] Хаек Ф. Дорога к рабству // Новый мир. 1991. № 8. С. 198–199.

струменталізацыі гісторыі стала служэнне гісторыкаў расісцкай ідэалогіі ў нацысцкай Нямеччыне і падпарадкаванне гісторыі законам гістарычнага матэрыялізму ў Савецкім Саюзе. Тым не менш, акурат вопыт абодвух таталітарных рэжымаў паказаў, што нават дырэктывы і забароны не могуць забяспечыць трывалага і працяглага функцыявання адзінай канструкцыі мінулага. Сама магчымасць эфектыўна фармаваць калектыўную памяць з аднаго палітычнага цэнтра даўно пастаўлена пад сумненне. Як "успамінанне", так і "забыванне" (выцясненне з памяці) мала паддаюцца кіраванню пастановамі і загадамі, іх немагчыма дыктаваць, паколькі людзі самі выбіраюць з мінулага тое, што ім уяўляецца патрэбным помніць[100].

Цяпер не выклікае сумненняў, што палітыка гісторыі, ці палітыка памяці[101] з'яўляецца важным інструментам дасягнення інтэграванасці грамадства і падтрымкі грамадскай стабільнасці. Пры існаванні мноства канкурэнтных інтэрпрэтацый гісторыі такая палітыка, мэтанакіраваная інструменталізацыя міфаў, дазваляе ўладам інсталяваць калектыўныя тыпы ўяўленняў пра мінулае ў суб'ектыўныя самаазначэнні і ўмацоўваць палітычную супольнасць[102]. І ўтварэнне любой новай дзяржаўнасці або ажыццяўленне рэвалюцыйных ці іншых гвалтоўных пераменаў не можа абысціся без абнаўлення гістарычных міфаў – без звароту да мінулага ў мэтах пераадольвання крызісу законнасці, для аднаўлення стабільнас-

[100] Könnig H. Erinnern und Vergessen. Vom Nutzen und Nachteil für die Politik // Osteuropa. Jg. 58 (2008). Nr. 6. S. 28–29, 40; Вельцер Х. История, память и современность прошлого. С. 62.

[101] У нямецкамоўнай гістарычнай літаратуры тэрміны "гістарычная палітыка" (*Geschichtspolitik*), "палітыка ўспамінанняў" (*Erinnerungspolitik*) і "палітыка мінулага" (*Vergangenheitspolitik*) выкарыстоўваюцца як сінонімы. У літаральным перакладзе яны паступова прыжываюцца і ў усходнееўрапейскіх гістарыяграфіях, хоць лагічнасць і ўдаласць іх канструявання часам выклікае небеспадстаўныя пытанні. Гл.: Stryjek T. "Wojna o pamięć" o wydarzeniach lat trzydziestych-pięćdziesiątych XX w. w Europie Środkowej i Wschodniej w latach 2005–2010 – strategie polityki Litwy, Łotwy, Estonii, Ukrainy i Rosji // KS. T. LV. 2011. Nr. 4. S. 191, спас. 1. Паказальна, што аўтар названага артыкула замест "палітыкі памяці" выкарыстоўвае тэрмін "палітыка адносна памяці".

[102] Пар.: Schöpflin G. The functions of myth and a taxonomy of myths. P. 22–24; Speth R. Nation und Revolution. S. 115–117; Berek M. Kollektives Gedächtnis und die gesellschaftliche Konstruktion der Wirklichkeit. Eine Theorie der Erinnerungskulturen. Wiesbaden, 2009. S. 156–161.

ці і абгрунтавання сваёй справядлівасці. Дзве калектыўныя супольнасці, якія супрацьпастаўляюцца адна адной з пункту гледжання каштоўнасцяў, не могуць мець агульнага мінулага[103], таму стварэнне новага гістарычнага канона абавязковае. Адпаведная гістарычная палітыка, ці палітыка памяці, заключаная ў прымяненні розных, галоўным чынам процілеглых стратэгій ("успамінання" і ўхвалення або "забывання" і асуджэння), адкрывае магчымасці адмежавання ад папярэдняга рэжыму і дэлігітымізацыі яго дзейнасці[104].

Ва ўмовах ліберальнай дэмакратыі тэарэтычна міфы і рытуалы не павінны выконваць легітымацыйнай функцыі або павінны выконваць зусім малазначную ролю, паколькі дэмакратычная ўлада легітымуецца свабоднай воляй грамадзян[105]. І сапраўды, у сучасных дэмакратычных грамадствах "культура памяці" фармуецца натуральна – як пабочны прадукт адкрытых і ўсім даступных дэбатаў пра мінулае. Аднак, як паказвае практыка, і самыя дэмакратычныя дзяржавы ўсё ж імкнуцца дэкрэтамі і пастановамі ўплываць на змест гістарычнай памяці[106], захоўваючы манаполію на афіцыйную версію гісторыі.

Як аповеды пра мінулае калектываў[107] палітычныя міфы звязваюць разарваныя ў мінулым і цяперашнім сэнсы, вызначаюць сацыяльныя інклюзіўнасці і эксклюзіўнасці, г. зн. спрыяюць з'яўленню "мы"-ідэнтычнасці, – яны самі выступаюць сродкам канструявання *ідэнтычнасці*. Такія наратывы ўтрымліваюць і перадаюць інфармацыю пра паходжанне палітычнай супольнасці, яе гістарычны шлях, часы заняпаду і росквіту, ворагаў і саюзнікаў і г. д. – словам, тыя веды, якія вызначаюць самапартрэт грамадства, яго *памяць* і ўяўленне пра *сваіх* і *чужых*. У гэтым плане з палітычнам міфам цесна звязаныя калектыўная памяць і стэрэатып, на якіх трэба спыніцца асобна.

[103] Szpociński A. Kanon historyczny. Pamięć zbiorowa a pamięć indywidualna. Trzy wymiary pamięci zbiorowej // SS. 1983. №4. S. 139.
[104] Gudebus Ch., Eichenberg A., Welzer H. (Hg.) Gedächtnis und Erinnerung. S. 121.
[105] Bizuel Y. Politysche Mythen. S. 14; idem, Theorien der polityschen Mythen und Rituale. S. 27.
[106] Gudehus Ch., Eichenberg A., Welzer H. (Hg.) Gedächtnis und Erinnerung. S. 118.
[107] Як адзначаецца ў даследаваннях, да палітычных міфаў можна залічваць толькі такія гістарычныя аповеды, якія служыць самавызначэнню палітычнай супольнасці, г. зн. тэматызуюць калектыўную ідэнтычнасць (пар.: Speth R. Nation und Revolution. S. 12–13).

### 1.3.3 Міф і памяць

Паняцці "ідэнтычнасць" і "памяць" у апошнія дзесяцігоддзі сталі цэнтральнымі катэгорыямі гуманітарных і сацыяльных навук, прычым, што паказальна, іх часам выкарыстоўваюць амаль як сінонімы гісторыі[108]. Сапраўдны "мемарыяльны бум" ці, па вызначэнні А. Мэгіла, "мемарыяльная манія" перажываецца ў Еўропе і Паўночнай Амерыцы з канца 1980-х гадоў, у чым, па ўсёй верагоднасці, адлюстроўваецца стан агульнай няўпэўненасці сучаснага грамадства (крызіс ідэнтычнасці). Як трапна заўважыў Эцьен Франсуа, "пра тое, што дваццаць гадоў таму назвалі б гісторыяй, мінулым і гістарычнай свядомасцю, цяпер, быццам само сабой зразумелае, гавораць як пра памяць..."[109]. Хоць яшчэ М. Хальбвакс, а потым П'ер Нара і іншыя абгрунтавана паказвалі канструктывісцкую прыроду памяці, частка вядомых сучасных навукоўцаў разглядае гістарыяграфію як форму сацыяльнай памяці (напрыклад, П. Бёрк, П. Хатан, Я. Зерубавель[110] і інш.). Яны зыходзяць з таго, што пазіцыі гісторыка залежаць ад кантэксту і панавальных поглядаў, таму гістарыяграфію можна лічыць афіцыйнай формай памяці. У апошнія дзесяцігоддзі, у выніку постмадэрнісцкай крытыкі акадэмічнай гістарыяграфіі, апісанні мінулага ў катэгорыях памяці атрымалі прызнанне як самастойныя інтэрпрэтацыйныя стратэгіі. Даследаванні калектыўнай памяці называюць новым набліжэннем да "народнай свядомасці"[111], а ў

[108] Нора П. Всемирное торжество памяти // Память о войне 60 лет спустя. Ред. и сост. М. Габович. Москва, 2005. С. 399. У польскай гуманітарыстыцы нядаўна свядома ўведзены тэрмін "памецязнаўства" (*pamięcioznawstwo*), гл.: Kończal K., Wawrzyniak J. Polskie badania pamięcioznawcze: tradycje, koncepcje, (nie)ciągłość // KS. T. LV. 2011. Nr. 4. S. 12.

[109] Цыт. па: Gudebus Ch., Eichenberg A., Welzer H. (Hg.) Gedächtnis und Erinnerung. Ein interdisziplinäres Handbuch. Stuttgart – Weimar, 2010. S. 259.

[110] Гл.: Burke P. Geschichte als soziales Gedächtnis // Assmann A., Harth D. (Hg.) Mnemosyne. Frankfurt a. M., 1991. S. 289–304; Szacka B. "Białe plamy" jako problem socjologiczny // Historia i wyobraźnia. Studia ofiarowane B. Boczce. Warszawa, 1992. S. 201–204; Хаттон П. История как искусство памяти / пер. с англ. В. Ю. Быстрова. С.-Петербург, 2003. С. 23 і наст.; Зерубавель Я. Динамика коллективной памяти // Ab Imperio. 2004. № 3. С. 73–74. З найноўшых прыкладаў варта згадаць таксама пазіцыю Ф. Гарднера, які лічыць, што "памяць заўжды здольная падпарадкавацца крытычным доказным крытэрыям на манер гісторыі, апелюючы да стандартаў надзейнасці тым жа спосабам, як гісторыя апелюе да стандарту праўды". Гл.: Gardner P. Hermeneutics, History and Memory. P. 119–120.

[111] Kansteiner W. Postmoderner Historismus – das kollektive Gedächtnis als neues Paradigma der Kulturwissenschaften // Handbuch der Kulturwis-

спецыяльнай літаратуры тэрміны "гісторыя" і "памяць" сёння могуць фігураваць ледзь не як тоесныя.

Аднак прыхільнікам крытычнай гістарыяграфіі цяжка прыняць такое атаесамленне. Праблема ўзаемаадносінаў памяці і гістарычнай навукі даўно прыцягвала ўвагу даследчыкаў[112]. Іх можна характарызаваць толькі як канфрантацыйныя. Яшчэ Эрнэст Рэнан трапна ўказаў, што ў развіцці гістарычнай навукі тоіцца небяспека для нацыі, якая ўтвараецца на супольнай гістарычнай памяці[113]. Калі памяць (а яна, як давёў М. Хальбвакс, можа быць толькі калектыўнай – у сэнсе сацыяльнай абумоўленасці) схільная затушоўваць любыя змены і фіксаваць толькі падабенства і пераемнасці, то гісторыя, наадварот, фіксуе ўвагу на адрозненнях і разрыве пераемнасці[114]. З аналітычнай гісторыяй, якая высвятляе гістарычную канкрэтыку на падставе крытычнага выкарыстання крыніц, з дапамогай аргументацыі і верыфікацыі розных гіпотэз, памяць непазбежна канфрантуе, але і ў наш час, у эпоху глабалізацыі, менавіта яна ўсё больш займае даміноўныя пазіцыі[115]. Памяць прагматычная – яна "бярэ тое, што ёй карысна, і адкідвае тое, што ёй уяўляецца лішнім ці непрыемным"[116]. Яна больш звязана не з рэальнымі фактамі мінулага, а з сучасным іх перажываннем, якое "трымаецца на інтарэсе, заснаваным не на ведах, а на ідэнтычнасці"[117]. Словам, памяць з яе свядомымі маніпуля-

senschaften. Bd. 2. Stuttgart, 2004. S. 120–122. У якасці альтэрнатывы "калектыўнай памяці" ў гістарыяграфіі часта выкарыстоўваюцца азначэнні "сацыяльная памяць", "нацыянальная памяць" "народная памяць", "публічная памяць", "гістарычная культура" і інш.

[112] Падрабязней пра ўзаемаадносіны памяці і гісторыі гл.: Репина Л. П. Память и историописание // История и память / под ред. Л. Репиной. Москва, 2006. С. 19–46.

[113] Ренан Э. Что такое нация? // Ренан Э. Собрание сочинений: в 12 т. / пер. с фр.; под ред. В. Н. Михайлова. Т. 6. Киев, 1902. С. 92.

[114] Хальбвакс М. Социальные рамки памяти. Пер. с фр. С. Н. Зенкина. Москва, 2007; ён жа. Коллективная и историческая память // Память о войне 60 лет спустя. Ред. и сост. М. Габович. Москва, 2005. С. 41–49.

[115] Nora P. Zwischen Geschichte und Gedächtnis. Berlin, 1980. S. 12 і наст.

[116] Вельцер Х. История, память и современность прошлого. Память как арена политической борьбы // Память о войне 60 лет спустя: Россия, Германия, Европа. Москва, 2005. С. 60. Пар.: Про А. Двенадцать уроков по истории / пер. с фр. Ю. Ткаченко. Москва, 2000. С. 319: памяць "чэрпае сілу ў пачуццях, якія яна абуджае", у той час як гісторыя патрабуе доказаў.

[117] Лавабр М. К. Память и политика: о социологии коллективной памяти // Психоанализ и науки о человеке. Сост. Е. Филлипова, М. Шуаре. Москва, 1996. С. 235. Своеасаблівымі "лінзамі", што прадвызначаюць скажэнне гісторыі ў памяці, даследчыкі называюць традыцыяналізм

цыямі і падсвядомым выцясненнем – гэта актыўнае канструяванне вобраза мінулага для патрэбаў цяперашняга, таму крытычнае стаўленне да памяці даўно разумелася як адна з ключавых пазіцый гістарычнай навукі[118]. Такую пазіцыю і цяпер адстойваюць паслядоўныя прыхільнікі навуковай гістарыяграфіі[119]. Гісторыя як акадэмічная дысцыпліна застаецца ў радыкальнай апазіцыі да памяці, хоць іх і нельга выразна размежаваць.

З канцэптам палітычнага міфа цесна звязаны асобны кантэкст калектыўных уяўленняў аб мінулым, які называюць *культурнай памяццю*. Паняцце культурнай памяці ўведзена ў навуку нямецкім егіптолагам Янам Асманам для азначэння прасторы перадачы сэнсаў (звычайна аформленай у тэксты і звязанай з трывалымі формамі аб'ектывацыі), якая адрозніваецца ад памяці *камунікацыйнай*, што абмежавана ўзроўнем штодзённасці і прыватным жыццём[120]. Са з'яўленнем гэтага канцэпту міфічны аповед аб мінулым прынята ўключаць у культурную памяць. Ян Асман зыходзіць з таго, што "ў культурнай памяці фактычная гісторыя ўзнаўляецца ўспамінамі і праз гэта трансфармуецца ў міф. Міф ёсць гісторыяй абгрунтавальнай, якая расказваецца, каб асвятляць сучаснасць ад яе вытокаў"[121]. Гэтае азначэнне, аднак, не аспрэчвае рэальнасці такой гісторыі. Наадварот, падкрэслівае даследчык, толькі тады яна робіцца рэальнай "у сэнсе расцягненай нарматыўнай і фарматыўнай сілы"[122].

(пашана даўніны), настальгію (успрыманне перамен у негатыўным святле) і прагрэсізм ("аптымістычная вера"). Гл.: Тош Д. Стремление к истине. Как овладеть мастерством историка. Москва, 2000. С. 25–29; Репина Л. Память о прошлом и история // Диалоги со временем. Память о прошлом в контексте истории. Москва, 2008. С. 14–15.

[118] Пар.: Коллингвуд Р. Дж. Идея истории. Автобиография / пер. и комм. Ю. А. Асеева. Москва, 1980. С. 227, 240–241, 280.

[119] Да такіх належаць, у прыватнасці, О. Г. Ёксле, Д. Лавенталь, Д. Тош, А. Мэгіл і інш. Пар.: Lowental D. The Past is a Foreign Country. Cambridge, 1985. P. 210, 214; Тош Д. Стремление к истине. С. 31; Мегилл А. Историческая эпистемология. С. 124, 165.

[120] Assmann J. Das kulturelle Gedächtnis. Schrift, Erinnerung und politische Identität in frühen Hochkulturen. München, 1997. S. 48 і наст. Пар. рускамоўную версію: Ассман Я. Культурная память: Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности. Москва, 2004. С. 20–21.

[121] Assmann J. Das kulturelle Gedächtnis. S. 52. "Абгрунтавальныя (*fundierende*) гісторыі мы называем міфам <…> Мінулае, замацаванае і інтэрыязаванае да стану абгрунтавальнай гісторыі, ёсць міфам незалежна ад таго, фіктыўнае яно ці рэальнае" (тамсама, с. 75–76).

[122] Assmann J. Das kulturelle Gedächtnis. S. 52.

Як адзначалася вышэй, памяць прагматычна абіральная, праз яе оптыку ўсе падзеі бачацца з перспектывы пэўных інтарэсаў. Успамінанне былога не бывае нейтральным: яно або ўхвальнае, або асуджальнае, так што падзеі і асобы ў калектыўнай памяці ператвараюцца ў сімвалы і вартасці, таму невыпадкова да асноўных уласцівасцяў калектыўнай памяці належаць непрадказальнасць і патэнцыйная канфліктнасць[123]. Мінулае ў ёй спрашчаецца і рэдукуецца да міфічных архетыпаў, галоўнымі якасцямі якіх ёсць пераканаўчасць і эфектнасць[124]. Пры фармаванні вобразаў калектыўнай рэчаіснасці мінулага адбываецца адбор самага актуальнага для канкрэтнай сітуацыі: істотнае аддзяляецца ад менш ці зусім неістотнага, а самае непажаданае можа мэтанакіравана "забывацца"[125]. Пры гэтым акты "запамінання" і "забывання" прынцыпова роўнастатусныя і аднолькава значныя для функцыявання памяці. Вядомы нямецкі гісторык Отта Герхард Ёксле справядліва заўважыў, што забыванне, выдаленне з памяці неістотнага ў роўнай ступені як нелегітымнае, так і непазбежнае для арыентацыі: «...з бясконцага шэрагу падзеяў і імёнаў кожная культура, кожная група, кожны індывідуум павінен выбіраць толькі тое, што важнае для іх, "пункты апоры" для сябе. Бо калі помніць пра ўсё, то ўжо нішто не будзе мець значэння. Без забывання немагчымыя ні жыццё, ні культура...»[126].

Цягам апошніх дзесяцігоддзяў прыкметнае месца ў еўрапейскай гістарыяграфіі занялі даследаванні вобразаў мінулага ў масавай калектыўнай свядомасці як "месцаў памяці" (фр. *lieux de mémoire*). Гэты тэрмін для ўсходнееўрапейскай гуманітарыстыкі адносна новы. У літаратуру ён увайшоў пасля выхаду трохтамовай працы ўжо згаданага французскага гісторыка

[123] Szacka B. Konflikty i pamięć zbiorowa // Akulturacja/asymilacja na pograniczach kulturowych Europy Środkowo-Wschodniej w XIX i XX w. T. 1. Stereotypy i pamięć. Red. R. Traba. Warszawa, 2002. S. 229, 231; Васильев А. Г. Современные *memory studies* и трансформация классического наследия // Диалоги со временем. Память о прошлом в контексте истории. Москва, 2008. С. 20–21.

[124] Assmann A. Der lange Schatten der Vergangenheit. Erinnerungskultur und Geschichtspolitik. München, 2006. S. 40.

[125] Пар.: Hölscher L. Geschichte und Vergessen // HZ. Bd. 249 (1989). Hf. 1. S. 8, 10–13; König H. Erinnern und Vergessen. Vom Nutzen und Nachteil für die Politik // Osteuropa. Jg. 58 (2008). Nr. 6. S. 32.

[126] Эксле О. Г. Историческая наука в постоянно меняющемся мире // Диалог со временем. №11. Москва, 2004. С. 100–101.

П. Нары "Les lieux de mémoire"[127], што сфакусавала гісторыю Францыі на тых тапаграфічных і метафарычных месцах, у якіх асабліва актыўна праяўлялася маніфестацыя калектыўнай памяці французаў. Канцэпт "месцаў памяці", тэматыка якога – даследаванне не гістарычных падзей, а спосабаў іх успрымання і актуалізацыі грамадствам (або, па словах самога П. Нары, "гісторыя другога градуса"), па вызначэнні прадугледжвае суб'ектыўнасць усялякага ўспрымання гісторыі (кожны індывід і група можа мець свой вобраз гісторыі, непадобны да іншых) і праблему яго палітычнай інструменталізацыі[128].

У "месцах памяці" як культурных канструктах фактычна актуалізуецца сучасны палітычны міф, невыпадкова ў літаратуры абедзве з'явы часам параўноўваюцца. Як адзначаюць даследчыкі[129], калі "месцы памяці" маюць хутчэй сімвалічны характар, то палітычны міф здольны аказваць на людзей большае ўздзеянне – не ў апошнюю чаргу дзякуючы сваёй наратыўнасці. Міф увасабляе не проста памяць, а памяць "гарачую" – такую, што знаходзіць у звароце да мінулага элементы ўяўленняў пра сябе, пункты апоры для сваіх надзей і мэтаў[130].

Спынімся яшчэ на *калектыўнай ідэнтычнасці* як ключавым элеменце сацыяльнай рэальнасці. Яна ўзнікае з дыялектычнай сувязі індывіда і грамадства, з расказвання гісторый як найбольш важнай тэмпаральнай дыферэнцыяцыі, з усведамлення ўдзелу ў агульнай памяці і валодання супольнымі культур-

[127] Nora P. (Ed.) Les lieux de mémoire. T. 1: La République. T. 2: La Nation. T. 3: Les France. Paris, 1984–1992. Скарочаная рускамоўная версія: Нора П. Франция – память. С.-Петербург, 1999.

[128] Пра канцэпт *lieux de mémoire* і яго патэнцыял гл.: Weber M. Erinnerungsorte in Ostmitteleuropa. Erfahrungen der Vergangenheit und Perspektiven // Erinnerungsorte in Ostmitteleuropa. Erfahrungen der Vergangenheit und Perspektiven. Hg. von M. Weber u.a. München, 2011. S. 11–25. Нягледзячы на папулярнасць *lieux de mémoire* і рэалізацыю шэрагу праектаў нацыянальных "месцаў памяці" ў гістарыяграфіях еўрапейскіх краін, канцэпт быў сур'ёзна крытыкаваны за невыразнасць – як "гумовае панянцце". Пар.: François E. Erinnerungsorte // Von der Arbeit des Historikers. Ein Wörterbuch zu Theorie und Praxis der Geschichtswissenschaft / Hg. von A. Kwaschick und M. Wimmer. Bielefeld, 2010. P. 65–69; Traba R. Miejsca pamięci (*lieux de mémoire*) w bilateralnym kontekście stosunków polsko-niemieckich // idem, Przeszłość w teraźniejszości. Polskie spory o historię na początku XXI w. Poznań, 2009. S. 148 і наст.

[129] Hein-Kircher H. Überlegungen zum Verhältnis von "Erinnerungsorten" und politischen Mythen… S. 11–24; idem, Überlegungen zu einer Typologisierung… S. 409; Assmann A. Der lange Schatten der Vergangenheit. S. 40.

[130] Ассман Я. Культурная память. С. 83.

нымі сімваламі[131]. Яна заўжды прадугледжвае актуалізацыю "асобнасці" як захаванне "таго ж самага", г. зн. тоеснасці нечаму аднаму і адрозненне ад іншага. Кожная група вызначае сябе толькі праз адмежаванне ад іншых. Усведамленне свайго існавання ў мінулым часе і з'яўляецца ключавым элементам утварэння любой ідэнтычнасці[132]. Не без падстаў у спецыяльнай літаратуры калектыўную ідэнтычнасць прапануюць разумець як калектыўную памяць (у сэнсе канцэпцыі М. Хальбвакса)[133].

Пры фармаванні ідэнтычнасці, у працэсе аўтаматычнага адмежавання "сваіх" ад "іншых" ("чужых"), людзі кіруюцца, аднак, не цвярозай канстатацыяй эмпірычных фактаў, а такімі ўстаноўкамі і маніпуляцыямі, пры якіх "іншыя" адштурхоўваюцца і на пэўны час могуць дэманізавацца. Калі "сваёй" групе прыпісваюцца "пазітыўныя" якасці, то "чужыя" надзяляюцца "негатыўнай" ідэнтычнасцю; больш за тое, яны могуць катэгарызавацца як аб'ект легітымнага насілля[134]. Пра натуральнасць такой з'явы нядаўна пісаў Ёрн Рузэн. Нямецкі гісторык указаў, што ў кожным акце актуалізацыі мінулага ў дзеянне ўступае такая дыферэнцыяцыя "свайго" і "іншага", прынцыпам якой з'яўляецца асіметрычнасць: усё, што ўспрымаецца як "сваё" і легітымізуе ўласны светапарадак, забяспечваецца пазітыўнымі ацэнкамі і лічыцца добрым, а "чужое" ацэньваецца адмоўна. Негатыўныя аспекты перажывання мінулага па магчымасці адсоўваюцца або і зусім выдаляюцца з прасторы ўласнага свету. Пры кожным свядомым звароце да мінулага, хоць і ў рознай меры, непазбежна праяўляецца згаданая асіметрычнасць адносін да "свайго" і "іншага", паколькі этнацэнтрызм для людской ідэнтычнасці з'ява натуральная. У ментальнай прасторы мінулага, інтэрпрэтаванага як гісторыя, "сваё" і ўсё "іншае" ("чужое") раздзяляецца і ацэньваец-

[131] Straub J. Identität // Handbuch der Kulturwissenschaften. Hg. von F. Jäger [et al.]. Stuttgart, 2004. S. 295–296; Assmann J. Das kulturelle Gedächtnis. S.130 і наст. Справядлівым будзе згадаць пазіцыю Юргена Габермаса, які выказваў сумненні ў магчымасці калектыўнай ідэнтычнасці ў сучасным грамадстве. Гл.: Habermas J. Zur Rekonstruktion des Historischen Materialismus. Frankfurt a. M., 1995. S. 107–121.

[132] Szacka B. Konflikty i pamięć zbiorowa. S. 228. Па словах брытанскага вучонага Э. Сміта, і "этніі ёсць не чым іншым, як гістарычнымі супольнасцямі, утворанымі на агульнай памяці" (Smith A. The Ethnic Origins of Nations. Oxford, 2002. P. 25).

[133] Reckwitz A. Der Identitätsdiskurs // Kollektive Identitäten und kollektive Innovationen. Ethnologische, soziologische und historische Studien. Hg. von W. Rammert u. a. Leipzig, 2001. S. 26, 30–31.

[134] Straub J. Identität. S. 295–296.

ца працілегла[135]. Хоць маштаб і від гэтых асіметрый могуць моцна адрозніваецца, яны заўсёды будуць несці напругу і схіляць да непрыязнага стаўлення і нават агрэсіі супраць таго, хто выключаны са "сваіх", што робіць гістарычную памяць (у сэнсе *Erinnerung*) па вызначэнні канфліктагеннай. Дзеля стрымлівання або нават пераадолення этнацэнтрычнай асіметрыі ў заходняй гістарыяграфіі выпрабоўваюцца шляхі міжкультурнай камунікацыі[136].

### 1.3.4 Міф і стэрэатып

Асновай утварэння ідэнтычнасці, як ужо адзначалася, з'яўляецца правядзенне ліній атаесамленняў і адрозненняў. Калектыўная ідэнтычнасць па вызначэнні можа фармавацца толькі на адмежаванні ад "іншых", прычым адрозненне па апазіцыі "мы" / "яны" выступае як галоўны элемент усіх яе кодаў[137]. Важна ўлічваць, што ідэнтычнасць ніколі не бывае завершанай, яна ў пастаянным працэсе зменаў і перафарматаванняў, і любое новае калектыўнае самавызначэнне не абыходзіцца без негатыўнага адмежавання. У канструяванні падобных ліній падзелу ключавую ролю выконваюць *стэрэатыпы*.

Стэрэатыпы ўласцівы кожнаму грамадству і звычайна адпавядаюць натуральным патрэбам арыентацыі ў "сваіх" і "чужых", таму ўзнікаюць яны пастаянна і амаль не паддаюцца кантролю. Стэрэатып не бывае нейтральным апісаннем некага ці нечага: гэта заўжды эмацыйная ацэнка, якая служыць апраўданню сваіх пераваг ці знешніх пагроз[138]. Этнічныя аўта- і гетэрастэрэатыпы, якія

[135] Rüsen J. Einleitung: Geschichtsdenken im interkulturellen Diskurs // Rüsen J. (Hg.). Westliches Geschichtsdenken. Eine interkulturelle Debatte. Göttingen, 1999. S. 14–15. Пар.: idem, Future-directed Elements of a European Historical Culture // The Many Faces of Clio: Cross-cultural Approaches to Historiography. Essays in Honor of Georg Iggers / ed. by Q. E. Wang and F. L. Fillafer. New York, Oxford, 2008. P. 166–167.

[136] Адным з удалых прыкладаў такой ініцыятывы і з'яўляецца сам цытаваны зборнік "Westliches Geschichtsdenken. Eine interkulturelle Debatte" (Göttingen 1999).

[137] Пар.: Бергер П., Лукман Т. Социальное конструирование реальности. Москва, 1995. С. 279–281; Straub J. Identität. S. 296–297; Bokszański Z. Stereotypy a kultura. Wrocław, 2001. S. 101–102.

[138] Hahn H. H. Stereotypen in der Geschichte und Geschichte im Stereotyp // Historische Stereotypenforschung. Metodische Überlegungen und empirische Befunde. Hg. von H. H. Hahn. Oldenburg, 1995. S. 194, 198–199; Hahn H. H., Hahn E. Nationale Stereotypen. Plädoyer für eine historische Stereotypenforschung // Stereotyp, Identität und Geschichte.

заўсёды цесна ўзаемазвязаныя, утвараюцца па прынцыпе той жа ацэначнай асіметрыі, пра якую пісаў Ё. Рузэн, і сваё абгрунтаванне яны знаходзяць у гісторыі. Большасць стэрэатыпаў "іншага" – або зусім непрыязныя ці пагардлівыя, або, у лепшым выпадку, высакамерна паблажлівыя. У ацэнцы ўяўных апанентаў пэўнай супольнасці ім звычайна прыпісваюцца тыя якасці, якіх быццам не мае свая група і ад якіх трэба адмежавацца. Згодна з вядомай гіпотэзай, у аснове такой установкі можа ляжаць неўсвядомленае праектаванне ўласных негатываў на іншага[139]. Паняцце "контрідэнтычнасці" (*counter-identity*), уведзенае Орэстам Рэйнамам, таксама прадугледжвае, што кожная чужая група з'яўляецца свайго роду экранам, на які пераносяцца якасці, процілеглыя найлепшым пазітыўным характарыстыкам сваёй "айчыны"[140]. Пры такім падыходзе вобраз "чужога" неабходна разглядаць як дапаўненне да ідэнтычнасці нацыянальнай супольнасці. Як бы там ні было, негатыўная ацэнка чужой супольнасці ўмацоўвае пачуццё прыналежнасці да сваёй групы, перавагі якой становяцца больш відавочнымі.

Разважаючы пра сувязь міфаў і стэрэатыпаў, Т. Бернат адзначыў як іх адрозненні, так і сутнаснае падабенства. Хоць прырода іх утварэння розная: для ўзнікнення міфа больш важны эмацыйны кампанент, тады як для стэрэатыпа – інфармацыя, і хоць стэрэатып не мае семіялагічнага аспекту, характэрнага для міфаў, па сваёй сацыяльнай функцыі гэта феномены вельмі блізкія: абодва служаць захаванню прынятых груп ацэнак і інтэграцыі індывіда ў групу[141].

Яшчэ В. Ліпман трапна ўказаў на тое, што стэрэатыпы даюць людзям адчуванне бяспекі, прыстасоўваюць да рэчаіснасці, падтрымліваюць пачуццё ўласнай годнасці. Сучаснымі даследаваннямі пацвярджаецца, што адна з асноўных сацыяльных функцый стэрэатыпа (ці мыслення стэрэатыпамі) палягае на адмежаванні і ўнутранай інтэграцыі груп, на мабілізацыі "сваіх" супраць "чужых"[142]. "Чужым" заўсёды выступае той, хто "падазраецца ў іншасці, або чыя

Die Funktion von Stereotypen in gesellschaftlichen Diskursen. Hg. von H. H. Hahn. Frankfurt a. M., 2002. S. 35.

[139] Пар.: Burke P. Augenzeugenschaft. Bilder als historische Quellen. Berlin, 2009. S. 140–141.

[140] Ranum O. Counter-Identities of Western European Nations... P. 65–67; Bokszański Z. Stereotypy a kultura. S. 100.

[141] Bernat T. Mit polityczny. S. 327–328, 330. Пар.: Schaff A. Stereotypy a działanie ludzkie. S. 115–116.

[142] Пар.: Schaff A. Stereotypy a działanie ludzkie. Warszawa, 1981. S. 123–125; Hahn H. H., Hahn E. Nationale Stereotypen. Plädoyer für eine historische Stereotypenforschung. S. 42, 47.

іншасць ужо вядомая", пры гэтым "у такой іншасці падазраецца ўсё, што невядомае"[143]. Аднак крытэрыяў вызначэння адносін больш, чым класічная апазіцыя "свае – чужыя". У таксаноміі стэрэатыпаў існуе таксама катэгорыя "не-сваіх", якія пры пэўных абставінах і пад уздзеяннем пэўных механізмаў салідарызуюцца са "сваімі" супраць "чужых", або наадварот, пачынаюць успрымацца як "чужыя".

Вобраз "іншага" ("чужога", "ворага"), сфармаваны на аснове стэрэатыпа, неабавязкова цалкам фальшывы, аднак ён заўжды, як і міф, спрашчае рэчаіснасць: перабольшвае адны ўласцівасці, недаацэньвае іншыя, накладвае адну мадэль на зусім розныя аблічча рэчаіснасці, таму ён наогул не можа ўспрымацца як крыніца нейкай праўдзівай інфармацыі пра пэўную групу[144].

На стэрэатыпных вобразах трымаюцца міфы калектыўнай памяці, нецярпімыя да альтэрнатыўных тлумачэнняў гісторыі. Стэрэатыпны вобраз ворага можа ўваходзіць у склад палітычнага міфа, выражаючы яго асноўную ідэю – міфы звычайна і трымаюцца на актуальных стэрэатыпах[145]. Падобна міфу, стэрэатып устойлівы да ўсялякай крытыкі – гэта адна з яго галоўных уласцівасцяў. Стэрэатыпы бяруцца не з уласнага вопыту, іх перадае сацыяльнае асяроддзе, так што аргументы атрыманага досведу не ставяць стэрэатып пад пытанне, а ўспрынятыя як выключэнне з правіла могуць нават умацоўваць[146]. Тыя стэрэатыпы, якія жывуць не адну эпоху і гатовыя актуалізавацца ў новых сітуацыях, у залежнасці ад абставін і кантэксту, даследчыкі называюць стэрэатыпамі "доўгага трывання"[147]. Яскравы прыклад такога жывучага стэрэатыпа ў палякаў, а праўдападобна і ўсіх славянскіх народаў, – гэта стэрэатып нямецкага *Drang nach Osten*, пра які будзе гаварыцца ніжэй.

[143] Novicka E. Swoi i obcy. Warszawa, 2005. S. 67; Dojnik J. Mity narodowe a myślenie polityczne. S. 52–53.

[144] Burke P. Augenzeugenschaft. Bilder als historische Quellen. Berlin, 2009. S. 139–140; Schmidt J. Funkcje i właściwości stereotypów etnicznych. Refleksje teoretyczne // AUW. Historia LXXIX. №1136. Wrocław, 1991. S. 7–8.

[145] Bernat T. Mit polityczny. S. 328. Паказальна, што азначэнне стэрэатыпа часам нават замяняецца тэрмінам "міф". Пар.: Szarota T. Stereotypy narodowe jako temat badań historycznych w Polsce // DN. R. XXVII (1995). Z. 2. S. 3; Шестов Н. И. Политический миф теперь и прежде. Москва, 2005. С. 27.

[146] Hahn H. H., Hahn E. Nationale Stereotypen. Plädoyer für eine historische Stereotypenforschung. S. 22.

[147] Orłowski H. Stereotypy "długiego trwania" a procesy *nation building* // Akulturacja/asymilacja na pograniczach kulturowych Europy Środkowo-Wschodniej w XIX i XX w. T. 1. Stereotypy i pamięć. Red. R. Traba. Warszawa, 2002. S. 18, 27.

Блізкае да стэрэатыпа паняцце гістарычных вобразаў (*Geschichtsbilder*). Так прынята называць прадукты эмацыйнага перажывання гісторыі, у якім успрыманне непадзельна звязваецца з ацэнкай і падзелам на "сваіх" і "чужых" або "ворагаў". Як і стэрэатып, гістарычны вобраз супрацьстаіць рацыянальнаму разуменню, бо не ведае рэфлексіі, якая б ставіла пад пытанне яго ацэнкі і канстатацыі. Калі ж людзі ўспрымаюць гістарычны вобраз як праўдзівае апісанне, то ён становіцца стэрэатыпам[148].

Непрыязнае стаўленне да таго, хто іншы па мове, звычаях і асабліва рэлігіі, варожасць да суседа, – усё гэта было нармальнай з'явай у традыцыйных грамадствах і наўрад ці стварала вялікія праблемы. Стэрэатыпныя вобразы набылі пагрозлівую сілу з XIX ст., калі адмежаванне ад іншых стала інтэгральным кампанентам праграмы нацыянальнага самавызначэння народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, і калі з яго нарадзілася метафарычная легітымацыя змагання супраць ворагаў сваёй нацыі ("злых")[149]. Асаблівая роля пры гэтым належыць масаваму друку, з дапамогай якога палітыкі змагаюцца за ўплыў на масы, інструментарна выкарыстоўваючы стэрэатыпы. У гэтай сувязі, як падкрэслена нямецкімі даследчыкамі, дэмакратызацыя грамадства парадаксальным чынам вядзе да пашырэння стэрэатыпаў у публічным жыцці[150], што спрыяе міфалагізацыі. Ва ўмовах любой канфрантацыі або пад уздзеяннем пэўнай гістарычнай палітыкі "чужыя" могуць ператварацца ў "ворагаў", а старыя, даўно дэактываваныя вобразы "ворага" здольныя адрадзіцца з новай сілай, і механізмы гэтага працэсу яшчэ недастаткова даследаваныя[151].

Падагульняючы, адзначым, што пад уздзеянне палітычных міфаў падпадаюць не толькі грамадствы ў таталітарных дзяржавах, аб чым у нас пісалася ў спецыяльнай літаратуры[152], але і кож-

[148] Jeismann K.-E. Geschichtsbewußtsein als zentrale Kategorie der Geschichtsdidaktik // Geschichtsbewußtsein und hostorisch-politisches Lernen. Hg. von G. Schneider. Pfaffenweiler, 1988. S. 12–13; Hahn H. H. Stereotypen in der Geschichte und Geschichte im Stereotyp. S. 202–203.

[149] Jeismann K.-E. Was bedeuten Stereotypen für nationale Identität und politisches Handeln? // Nationale Mythen und Symbole in der zweiten Hälfte des 19. Jahrhunderts. Strukturen und Funktionen von Konzepten nationaler Identität. Hg. von J. Link und W. Wülfing. Stuttgart, 1991. S. 88–90.

[150] Hahn H. H., Hahn E. Nationale Stereotypen. Plädoyer für eine historische Stereotypenforschung. S. 52.

[151] Репина Л. П. "Национальный характер" и "образ другого" // Диалог со временем. Т. 39. Москва, 2012. С. 17.

[152] Гл.: Алпеева Т. М. Социальный миф. С. 139–140.

ная палітычная супольнасць наогул. Яны важныя для існавання любой палітычнай супольнасці, але асабліва натуральную патрэбу ў такіх генератарах сэнсаў і апорах ідэнтычнасцяў мае нацыя. Больш за тое, як адзначаецца ў даследаваннях, мацнейшай устойлівасцю перад эканамічнымі, сацыяльнымі ці палітычнымі ўзрушэннямі надзелены менавіта тыя супольнасці, якія валодаюць больш развітым наборам міфаў[153]. Пытанне, наколькі міфы пэўнай групы адпавядаюць яе сапраўднай гісторыі, аказваецца малаважным у параўнанні з іх рэальнай сілай уздзеяння на грамадства. І толькі калі яны перастаюць выконваць свае функцыі (а не з-за вымірання іх носьбітаў), можна чакаць адмірання такіх міфаў[154].

Несумненна, палітычныя міфы неадлучныя ад жыцця чалавека. Як прызнана ў сучасных даследаваннях, задавальняючы натуральныя патрэбы індывіда і грамадства, яны з'яўляюцца зусім натуральнай праявай палітычнага жыцця, і пакуль няма ніякіх падстаў спадзявацца, што грамадства можа ад іх пазбавіцца[155]. Некаторыя міфы можна лічыць у той ці іншай ступені пазітыўнымі, як міф заснавання, ці міф Залатога веку. У той жа час міф "ворага" безумоўна негатыўны і небяспечны[156]. Калі грамадства ўспрымае ўяўленую небяспеку, сканструяваную міфам, як рэальную, то і паводзіць сябе адпаведна прыпісанай яму экстрэмальнай сітуацыі, незалежна ад таго, што ў сапраўднасці ворага не будзе. Мабілізаванае супраць міфічнага ворага грамадства гатовае прымаць за норму незаконныя дзеянні сваёй улады, нават рэпрэсіі супраць апанентаў. Застаецца актуальнай і тая небяспека, перад якой перасцерагаў яшчэ Э. Касірэр[157], – свядомае прадукаванне міфаў, прыдатных да выкарыстання ў мэтах любой прапаганды, у тым ліку для развіцця небяспечных тэндэнцый у грамадскіх настроях, такіх, напрыклад, як нянавісць да "іншых", палітычны экстрэмізм, сепаратызм і да т. п. Наогул, варта не забываць, што міф сам па сабе не пакідае месца для пытанняў і дыялогу. Своеасаблівыя кагнітыўныя абмежаванні, якія накладаюцца на грамадства міфамі і стэрэатыпамі, стрымліваюць разуменне зменаў і блакуюць усялякую рацыянальную дапытлівасць чалавека.

[153] Schöpflin G. The functions of myth and a taxonomy of myths. P. 22.
[154] Assmann A. Der lange Schatten der Vergangenheit. S. 40.
[155] Пар.: Флад К. Политический миф. С. 14.
[156] Пар.: Chlebowczyk J. Procesy narodotwórcze we wschodniej Europie środkowej w dobie kapitalizmu (od schyłku XVIII do początków XX w.). Warszawa – Kraków 1975. S. 198–199.
[157] Cassirer E. The Myth of the State. P. 277–296.

Раздзел 2

# Памяць і забыццё Грунвальда да эпохі нацыяналізмаў

Вялікая бітва Сярэднявечча, якая адбылася 15 ліпеня 1410 г., даўно вывучаецца сотнямі даследчыкаў, спецыяльныя публікацыі якіх налічваюць тысячы пазіцый[1]. І калі аб наступствах і значэнні перамогі саюзнай арміі Ягайлы і Вітаўта, як і наконт шэрагу канкрэтных момантаў бітвы не змаўкаюць спрэчкі, то аднаго ніхто не будзе адмаўляць: разгром арміі Нямецкага ордэна шакаваў сучаснікаў і адгукнуўся рэхам у тагачаснай Еўропе, засведчыўшы з'яўленне новай палітычнай моцы. Падзея адразу трапіла ў фокус ідэалагічнага супрацьборства бакоў, якія варагавалі, і стала ператварацца ў міф яшчэ пры жыцці яе ўдзельнікаў. І не дзіўна, што тыя вобразы, якія яна атрымала ў традыцыях дзяржаў і народаў – удзельнікаў канфлікту, як і адведзеныя ёй ролі, моцна адрозніваліся. Ніжэй паспрабуем спачатку прасачыць, як і для чаго да гэтай бітвы звярталіся ў Польшчы, Прусіі і ВКЛ у эпоху, якая завяршылася падзеламі Рэчы Паспалітай.

## 2.1 Старапольская традыцыя ўшанавання перамогі

Пачаткам прапагандысцкай інтэрпрэтацыі падзеі з боку пераможцаў і стварэння польскага міфа можна лічыць лісты Ягайлы, напісаныя з грунвальдскага поля, а таксама створаную крыху пазней у каралеўскім атачэнні "Хроніку канфлікта" – сціслае апісанне бітвы праз прызму канцэпцыі барацьбы дабра са злом, пры-

[1] Спецыяльныя бібліяграфіі, складзеныя яшчэ перад юбілеем 1990 г. польскімі даследчыкамі (гл.: Baranowski H., Czarciński I. Bibliografia bitwy pod Grunwaldem i jej tradycji. Pod red. M. Biskupa. Toruń, 1990; Mierzwa T. Bibliografia grunwaldzka. Olsztyn, 1990), змясцілі больш за паўтары тысячы пазіцый, а за апошнія дзесяцігоддзі іх колькасць значна вырасла.

значанае для замежнай аўдыторыі[2]. Падзея выклікала вялікую трывогу ў хрысціянскім свеце, і не беспадстаўна: Ордэн, правы якога забяспечваліся імператарскімі і папскімі прывілеямі, быў разгромлены манархам, у чыім падданстве мелася шмат "непаўнавартых" хрысціян (літоўцаў і русінаў) і які да таго ж выкарыстаў дапамогу "няверных" татараў. Адна з ключавых ліній паслягрунвальдскай прапаганды Мальбарка зводзілася да таго, каб даказаць, што польска-літоўскі бок, на якім ляжыць адказнасць за развязванне вайны, дамогся сваёй перамогі пры дапамозе паганцаў і "схізматыкаў", саюз з якімі незаконны, і што з такімі сіламі Ягайла з Вітаўтам пагражаюць не толькі Ордэну, але і выступаюць супраць усяго хрысціянства[3]. У сувязях з нягоднымі саюзнікамі прадстаўнікі Ордэна вінавацілі Ягайлу і на Канстанцкім саборы 1414–1418 г., дзе юрыдычная спрэчка паміж бакамі дасягнула асабліва напружанага этапу[4]. Погляд на "Вялікую вайну", выкладзены з пункту гледжання Мальбарка, моцна кампраметаваў пераможцаў у вачах заходнееўрапейскага хрысціянства, таму польскаму боку важна было энергічна апраўдацца, даказваючы справядлівасць сваёй вайны і абвяргаючы аргументацыю Ордэна.

Не ўдаючыся ў дэталі прапагандысцкага супрацьстаяння і нюансы юрыдычнай палемікі, адзначым толькі, што і перад бітвай, і пасля яе абодва варожыя бакі апелявалі да аргументаў тэалагічнага характару. У ідэалагічнай вайне і пераможцы, і пераможаныя карысталіся падобнымі метадамі і аргументамі – імкнуліся дыскрэдытаваць праціўніка, паказаўшы яго як кепскага хрысціяніна. Да нацыянальных ці этнічных крытэрыяў у той час ніхто не звяртаўся. Гэтаксама як у ідэалогіі, характэрнай для крыжовых войнаў, перамога над Ордэнам падавалася як рэалізацыя Боскай волі стараннямі польскага караля[5].

[2] Пра змест і прапагандысцкую скіраванасць як лістоў Ягайлы, так і "Хронікі канфлікта" гл.: Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg 1410. Quellenkritische Untersuchungen. Bd.1: Einführung und Quellenlage. Berlin, 1982. S. 127–132, 146–149, 159–165.

[3] Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg. S. 181–196. Пар.: Grabski A. F. Polska w opiniach Europy Zachodniej XIV–XV w. Warszawa, 1968. S. 243–244.

[4] Падрабязней пра сутнасць палемікі з Ордэнам на Канстанцкім саборы гл.: Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg. S. 181–196; Kwiatkowski S. Der Deutsche Orden im Streit Polen-Litauen. Eine theologische Kontroverse über Krieg und Frieden auf dem Konzil von Konstanz (1414–1418). Stuttgart, 2000.

[5] Пра ідэалагічны падтэкст і ўплыў аўгустынскай канцэпцыі гісторыі на паслягрунвальдскую палеміку гл.: Ekdahl S. Die Schlacht bei Tan-

Кракаўскі двор прымаў арганізацыйныя захады і для ўнутранай прапаганды вялікай перамогі. Гэтай мэце служыла, у прыватнасці, вывешванне здабытых харугваў у кафедральным храме, а таксама раздорванне нарабаваных у Прусіі кніг і начыння. Дзень перамогі быў уключаны ў каляндар каталіцкіх святаў – спачатку ў Кракаўскай дыяцэзіі, а потым гэта было пашырана і на іншыя рэгіёны каралеўства. Не пазней чым у 1420 г. статуты гнезненскага сінода на чале з арцыбіскупам Мікалаем Тромбам прадугледжвалі, каб ва ўсіх дыяцэзіях сярод іншых святаў каталіцкай царквы адзначалася і 15 ліпеня – "Дзень рассылання Апосталаў" – і як дзень перамогі. Праўда, па-за царквой ужо ў 1430–40-я г., калі сярод жывых не засталося непасрэдных удзельнікаў бітвы, перамога пад Грунвальдам пачала пераходзіць у забыццё. Памяць пра яе натуральным чынам актуалізавалася пад час новай, Трынаццацігадовай, вайны з Ордэнам (1454–1466), у якой, нагадаем, ВКЛ не брала ўдзелу. У самога Яна Длугаша, які на другі год пасля пачатку ўзброенага канфлікту ўзяўся пісаць сваю славутую хроніку, мы можам прачытаць, што ў гады панавання Казіміра Ягайлавіча дзень 15 ліпеня ўрачыста адзначаўся на каралеўскім двары[6]. З нагоды свята са скарбу выдзяляліся адмысловыя сродкі на тканіны і для раздачы бедным, што да 1470 г. задакументавана[7].

Як вядома, Грунвальдскую бітву манументальна ўвекавечыў згаданы Ян Длугаш, які спачатку стварыў пералік харугваў абедзвюх армій з іх выявамі і апісаннем[8], а потым у сваёй хроніцы панарамна апісаў баталію[9]. Пра войны Польскага каралеўства з Ордэнам храніст пісаў "выключна гара-

nenberg 1410. S. 108–127; Kwiatkowski S. Der Deutsche Orden im Streit Polen-Litauen (гл. папярэднюю спасылку). Пар.: Grabski A. Pogrunwaldzkie polemiki // Zeszyty naukowe Uniwersytetu Łódzkiego. Nauki humanistyczno-społeczne. Ser. 1. Z. 45 (1966). S. 45–66.

6 "...дзень перамогі штогод урачыста адзначаецца", – напісаў храніст. Гл.: Długosz J. Roczniki czyli kroniki sławnego Królewstwa Polskiego. Ks. 10–11. Warszawa, 2009. S. 198.

7 Samsonowicz H. Bitwa grunwaldzka w świadomości dawnych pokoleń polaków // Grunwald w świadomości Polaków. Warszawa, Łódz, 1981. S. 41.

8 Długosz J. Banderia Prutenorum. Wyd. K. Górski. Warszawa, 1958; Ekdahl S. Die "Banderia Prutenorum" des Jan Długosz – eine Quelle zur Schlacht bei Tannenberg 1410. Göttingen, 1976.

9 Długosz J. Roczniki czyli kroniki sławnego Królewstwa Polskiego. Ks. 10–11. Warszawa, 2009. S. 122–138.

чым пяром з непрыхаванымі эмоцыямі і выразнай тэндэнцыйнасцю", прычым ён першы пастараўся надаць барацьбе з Ордэнам ужо нацыянальны характар[10]. Яго антынямецкая настроенасць была абумоўлена той акалічнасцю, што ён жыў у час вайны з Нямецкім ордэнам і непасрэдна ўдзельнічаў у ваенным канфлікце ў якасці каралеўскага дыпламата. Як неаднаразова адзначалася даследчыкамі, для сярэднявечнага гісторыяпісання наогул было характэрна не столькі імкненне дакладна апісаць мінулае, колькі перакананне ў тым, што мінулым санкцыянуецца цяперашняе[11]. Ян Длугаш эмацыйна падаў бітву пад Грунвальдам як сутыкненне мужных абаронцаў айчыны, падтрыманых Боскай воляй, з сіламі зла і пыхлівасці, а разгром арміі Ордэна – як трыумф справядлівасці над славалюбствам і агрэсіяй. Крытычна настроены да Ягайлы і Вітаўта, Длугаш імкнуўся падкрэсліць заслугі польскага рыцарства ў славутай перамозе, тады як удзел Вітаўта і яго войска ханістам наогул мінімалізаваўся. У яго апісанні літоўцы з русінамі і татарамі дапускалі ганебныя ўчынкі ў час паходу, а потым не вытрымалі націску і зняславіліся ўцёкамі з поля бою[12]. Галоўны твор Длугаша з яго антынямецкім духам і спецыфічнай інтэрпрэтацыяй бітвы 1410 г. аказаў асаблівы ўплыў на далейшае польскае гісторыяпісанне. Ужо ў XVI ст. у хроніках Мацея Мяхоўскага, Марціна Бельскага і Марціна Кромера войны з Ордэнам і бітва пад Грунвальдам апісваліся згодна з Длугашавай інтэрпрэтацыяй падзей, якая і стала асновай далейшага развіцця гістарыяграфічнай традыцыі Грунвальда ў Польшчы.

Тое, што ў XV і XVI ст. памяць пра бітву жыла, асабліва пры каралеўскім двары, засведчана пісьмовымі крыніцамі. Войны Польшчы з Ордэнам, якія вяліся ў тыя часы, актуалізоўвалі памяць пра вялікую перамогу, і адмысловыя захады ўладаў па яе падтрымцы служылі спосабам абуджэння патрыятызму. Як перасцеражэнне Прусіі перад новай вайной з Польшчай успрымалася яшчэ і "Пруская вайна" Яна Вісліцкага (1516) – эпічны па-

[10] Krzyżaniakowa J. Poglądy Jana Długosza na Zakon Krzyżacki i jego stosunki z Polską // Studia Grunwaldzkie. T. II. Olsztyn, 1992. S. 10, 18, 34. Пар.: Krasuski J. Wyznaczniki biegu historii. Wrocław, 2008. S. 290.

[11] Krzyżaniakowa J. Poglądy polskich kronikarzy średniowiecznych na Niemcy i stosunki polsko-niemieckie // AUW. Nr. 1554. Historia, 114. Wrocław, 1993. S. 17. Пар.: Spandel R. Chronisten als Zeitzeugen. Köln, 1994.

[12] Długosz J. Roczniki … Ks. 10–11. Warszawa, 2009. S. 81, 83–84, 124–125.

негірык у гонар Жыгімонта Старога, у якім Грунвальдская бітва паказана як надчасавае звышчалавечае сутыкненне багоў з гігантамі[13]. Аднак сітуацыя прынцыпова змянілася пасля т. зв. "прускай вайны" 1519–1521 г., якая стала апошнім сутыкненнем з рыцарскай дзяржавай[14], бо прывяла да ліквідацыі Ордэна ў выніку яго секулярызацыі ў 1525 г. Палітычнай пераемнасці паміж Ордэнам і Прусіяй не назіралася, паколькі і Гагенцолерны, і лютэранскія прускія эліты радыкальна адмяжоўваліся ад мінулага ордэнскай дзяржавы. У XVI ст., са зменай знешнепалітычнай сітуацыі, знікла адчуванне небяспекі з боку немцаў. Галоўным клопатам для Польшчы на доўгія часы сталі войны з Маскоўскай дзяржавай, барацьба з казакамі, Швецыяй і асманскай Турцыяй. У новым кантэксце, калі не бачылася той сілы, якая б атаесамлялася з Нямецкім ордэнам, Грунвальд страціў палітычную перспектыву актуалізацыі, як і ўся "крыжацкая" праблема. У XVI і асабліва ў XVII–XVIII ст. большай увагай грамадства цешыліся іншыя гістарычныя падзеі, якія лічыліся больш вартымі памяці. З XVI ст., напрыклад, вядома намнога больш пісьмовых твораў пра паход караля Уладыслава III у 1444 г. і яго гібель пад Варнаю, чым пра Грунвальд[15], а ў XVII ст. пачалі адзначаць і перамогу пад Хацінам над туркамі, якую Вацлаў Патоцкі ўславіў у вялікай патрыятычнай паэме[16], каб перад абліччам грознай Порты паставіць гераізм продкаў у прыклад свайму пакаленню. Узрастанне асманскай пагрозы, калі роля "перадмур'я хрысціянства" адводзілася блізкай да Турцыі шляхецкай Рэчы Паспалітай, актуалізавала агульнаеўрапейскую салідарнасць, у тым ліку з нямецкімі дзяржавамі[17]. Паказальна, што ў 1683 г. вормскі біскуп і пазнейшы вялікі магістр Нямецкага ордэна Людвіг Антон фон Пфаль-Нойбург змагаўся пад

[13] Гл.: Вісліцкі Я. Пруская вайна / уклад., перакл., камент. Ж. Некрашэвіч-Кароткай. Мінск, 2005. С. 139–149.

[14] Пра ўплыў названай вайны на ліквідацыю ордэнскай дзяржавы ў Прусіі гл.: Biskup M. Wojny Polski z Zakonem Krzyżackim 1308–1521. Gdańsk, 1993. S. 326–328.

[15] Bömelburg H.-J. Vergessen neben Erinnern. Die brüchige Erinnerung an die Schlacht bei Tannenberg / Grunwald in der deutschen und polnischen Öffentlichkeit // Polen. Jubiläen und Debatten. Beiträge zur Erinnerungskultur. Hg. von P. O. Loew und Ch. Prunitsch. Wiesbaden, 2012. S. 49.

[16] Гл.: Potocki W. Wojna Chocimska. Warszawa, 1880.

[17] Пар.: Tazbir J. Rzeczpospolita i świat. Studia z dziejów kultury XVII w. Wrocław, 1971. S. 63–78.

Венай супраць турэцкай арміі разам з Янам Сабескім[18]. Што да Грунвальдскай бітвы, то няма такіх звестак, якія б даказвалі факт святкавання яе юбілеяў у 1510 ці 1610 г. Адзінай сферай у Польшчы, дзе 15 ліпеня (Дзень рассылання Апосталаў) хоць часткова адзначаўся і як свята перамогі пад Грунвальдам, заставаўся каляндар каталіцкіх святаў. Аднак сярод царкоўных святаў яшчэ мацней з калектыўнай памяццю палякаў у ранні Новы час быў звязаны, напрыклад, дзень 10 кастрычніка: па рашэнні папы Урбана VIII з 1623 г. уводзілася спецыяльнае свята перамогі над туркамі пад Хацінам, і разам са службай у гонар Божай маці ды польскіх святых у гэты дзень успаміналі пра названую бітву[19]. З іншага боку, наогул сумніўна, каб царкоўнае свята ўжо ў тыя часы магло ўспрымацца як агульнае ў сэнсе "нацыянальнага"[20].

Прыкметны след Грунвальдская бітва пакінула і ў польскай прынагоднай паэзіі. З эпохі войнаў з Ордэнам даследчыкам вядома каля 50 вершаў на лацінскай мове[21], у якіх усхвалялася перамога пад Грунвальдам. Праўда, на старапольскай мове такіх твораў захавалася няшмат. Сярод іх, у прыватнасці, верш "*Krol Wlodzyslaw polszky, Wythold ksandz welgi lyteffsky possekli brodacze*", і два больш вядомыя радкі, якія лічацца фрагментам даўнейшых песняў пра Грунвальд: *Witold idzie po ulicy / Za nim niosą dwie szablicy*[22].

У прыведзеным двухрадкоўі даследчыкі бачылі алюзію на два мячы, перададзеныя Ягайлу і Вітаўту перад пачаткам бітвы. Нагадаем, што два мячы ў польскай грунвальдскай традыцыі сталі ўспрымацца як сімвал перамогі над Ордэнам. Магчыма, цытаваныя радкі з'яўляюцца фрагментам нейкай невядомай песні пра Ягайлу і Вітаўта. Улічваючы, што слова *вуліца* ў XV ст. мела іншы сэнс і азначала, відаць, "браму", двухрадкоўе можна

[18] Пар.: Weitlauff M. Ludwig Anton, Pfalzgraf von Neuburg // Neue Deutsche Biographie. Bd. (1987). S. 408 f. (http://www.deutschebiographie.de/pnd118888536.html)

[19] Tazbir J. Polskie przedmurze chrześcijańskiej Europy. Mity a rzeczywistość historyczna. Warszawa, 1987. S. 54.

[20] Bömelburg H.-J. Vergessen neben Erinnern. S. 50–51.

[21] Zeissberg H. Die polnische Geschichtsschreibung des Mittelalters. Leipzig, 1873. S. 183; Пар.: Ochałówna Cz. Bitwa grunwaldzka w poezii polsko-łacińskiej // MSH. R. III (1960). Z. 1/2. S. 83. Варты ўвагі факт, што на нямецкіх землях ніякіх слядоў гістарычных песняў пра бітву 1410 г. не выяўлена.

[22] Цыт. па: Nowak-Dłużewski J. Okolicznościowa poezja polityczna w Polsce. Średniowiecze. Warszawa, 1963. S. 51–52. Гэты верш вядомы і ў іншых версіях, напр.: *Witold idzie po ulicy / Przy nim niosą dwie szablicy.*

разумець як апісанне таго, што Вітаўт прывёў у абоз герольдаў з мячамі або вёў іх да Ягайлы паміж войскамі ўжо ў абозе[23].

Войны з Нямецкім ордэнам пакінулі свой след і ў старапольскай фразеалогіі. Даўнія польскія выслоўі і песенькі сведчаць пра распаўсюджанасць антынямецкіх настрояў у шырокіх колах насельніцтва. Вядомая прыказка "*Jak świat światem nie będzie Niemiec Polakowi bratem*", згодна з вынікамі даследавання Герарда Лябуды, з'явілася ўжо ў XVI ці можа нават у XV ст.[24] і павінна адлюстроўваць нацыянальны антаганізм. Бытавала яна і пазней, бо прынамсі Вацлаў Патоцкі выкарыстаў гэтыя радкі ў сваіх "Moralich"[25]. У тагачаснай Польшчы сустракаліся і іншыя антынямецкія выслоўі. Так, у неапублікаваным творы, які ў 1610 г. падрыхтаваў да друку познаньскі ваявода Ян Астрагор, была змешчана страфа "*Bito Niemca jako cielce, a Niemkinie iako świnie, a Niemczęta jako psięta*"[26].

Можна спрачацца, ці правамерна лічыць падобныя выказванні праявай нацыянальнага антаганізму. Хутчэй за ўсё антынямецкія матывы былі канкрэтнай праявай той ксенафобіі, якая нарастала ў настроях шляхты з сярэдзіны XVII ст. у выніку войнаў з іншавернымі суседзямі і абвастрэння рэлігійных канфліктаў у самой Рэчы Паспалітай[27]. Немцы (як, зрэшты, і шведы) ідэнтыфікаваліся з іх некаталіцкім веравызнаннем. Не без уплыву прапаганды каталіцкага духавенства за немцамі ў Рэчы Паспалітай замацаваўся негатыўны вобраз "лютраў", ці лютэран, рэлігію якіх часам абразліва называлі і "швабскай верай"[28]. Вера, мова і адзенне немца высмейваліся і ў творах народнай сатыры, аднак храналогію з'яўлення апошніх вызначыць праблематычна.

[23] Ibidem. S. 129.

[24] Labuda G. Geneza przysłowia "Jak świat światem nie będzie Niemiec Polakowi bratem" // idem, Polsko-niemieckie rozmowy o przeszłości. Poznań, 1996. S. 101.

[25] Potocki W. Moralia (1688). Kraków, 1916. S. 18.

[26] Samsonowicz H. O "historii prawdziwej". Mity, legendy i podania jako źródło historyczne. Warszawa, 1997. S. 92.

[27] Пар.: Tazbir J. Stosunek do obcych w dobie baroku // Swojskość i cudzoziemszczyzna w dziejach kultury polskiej / Red. Z. Stefanowska. Warszawa, 1973. S. 80–112.

[28] Maliszewski K. Uwagi o wyznaniowych aspektach zbiorowego wizerunku Niemców w Polsce // Wokół stereotypów Niemców i Polaków / Pod red. W. Wrzesińskiego. Wrocław, 1993. S. 78–79; Kąkolewski I. Niemcy // Pod wspólnym niebem. Narody dawnej Rzeczypospolitej / Pod red. M. Konopczyńskiego i W. Tygielskiego. Warszawa, 2010. S. 94–95.

Верагодна, такія сатырычныя вобразы ўзніклі ўжо пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, у выніку сутыкнення простага насельніцтва з нямецкай адміністрацыяй. З іншага боку, па змесце яны не арыгінальныя: варожасць да суседа была натуральным механізмам сацыяльнай псіхалогіі. Суседзям аўтаматычна прыпісваліся найгоршыя рысы, часта нават свае недахопы[29]. Пачынаючы ад Сярэднявечча ў Еўропе падобныя стэрэатыпы грунтаваліся на т. зв. вандроўных матывах, не звязаных з канкрэтнымі рэаліямі.

Цікава, што ў польскай стэрэатыпізацыі немцаў у XVI–XVIII ст., якая ў апошнія дзесяцігоддзі нямала вывучалася, даследчыкі выявілі канструяванне не аднаго, а некалькіх розных стэрэатыпных вобразаў адначасова[30]. Калі тэрміны "прусак" ці "брандэнбурчык" успрымаліся негатыўна, то вобраз Саксоніі, з якой у гады персанальнай уніі, пры Аўгусце II і Аўгусце III, развіваўся гандаль і культурныя кантакты, быў прынамсі неадназначны. Пры Сасах у каралеўскай оперы ў Варшаве і ў капэлах польскіх магнатаў нямецкім кампазітарам і выканаўцам належала асаблівае месца. Варта згадаць, што і ў рэзідэнцыях Агінскіх у Слоніме ды Радзівілаў у Нясвіжы вялікай папулярнасцю ў другой палове XVIII ст. карысталіся музычныя творы і музыкі нямецкага паходжання[31]. Наогул, бытаванне адмоўных стэрэатыпаў не выключала таго, што сярод магнацка-шляхецкіх элітаў хапала аматараў нямецкай культуры і навукі. Да таго ж у літаратуры XVIII ст. вядомы і такія прыклады, калі Нямеччына апісвалася пазітыўна, без усялякіх слядоў польска-нямецкага антаганізму[32]. У кожным разе ў праявах непрыязнага стаўлення да немцаў у Рэчы Паспалітай дамінавалі рэлігійныя або сацыяльныя, а не нацыянальныя матывы. Якасна іншыя элементы ў польскім вобразе немца, а разам з імі і новая памяць пра Грунвальд пачалі з'яўляцца пасля таго, як польскія землі апынуліся пад уладай Прусіі і Аўстрыі.

[29] Salmonowicz S. Polacy i Niemcy wobec siebie. S. 22, 24.

[30] Schmidt J. Funkcje i właściwości stereotypów etnicznych. Refleksje teoretyczne // AUW. Historia LXXIX. №1136. Wrocław, 1991. S. 10; Bokszański Z. Stereotypy a kultura. Wrocław, 2001. S. 79–80.

[31] Цеханавецкі А. Міхал Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме. Мінск, 1993. С. 142 і наст., 153–154. Пра папулярнасць аўстрыйска-нямецкіх кампазітараў і музыкантаў у тагачасных музычных цэнтрах Беларусі гл.: Дадзіёмава В. Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі. Мінск, 2001. С. 149–150, 190–192; яна ж. Музычная культура Беларусі XVIII ст.: гісторыка-тэарэтычнае даследаванне. Мінск, 2002. С. 237–238, 254.

[32] Salmonowicz S. Polacy i Niemcy wobec siebie. S. 25, 28.

## 2.2 Успрыманне бітвы 1410 г. у Прусіі

Звернемся цяпер да Прусіі як процілеглага боку ваеннага канфлікту, каб у агульных рысах высветліць, якое месца памяць пра бітву займала там. Як ужо гаварылася вышэй, адразу пасля паразы Мальбарк спрабаваў выкарыстаць разгром арміі Ордэна для пацвярджэння правільнасці сваіх перасцярогаў, агучаных яго дыпламатамі на пачатку канфлікта. Ордэнская прапаганда жорстка кляйміла саюз Ягайлы з несапраўднымі хрысціянамі і нявернымі, вінавaціла яго ў праліцці хрысціянскай крыві, учыненых злачынствах у Прусіі і наогул паказвала вайну 1410 г. цалкам несправядлівай з боку непрыяцеля[33]. Характэрныя ўзоры падобных трактовак утрымлівала пасланне Генрыха фон Плаўэна да князёў, графаў і рыцараў Святой Рымскай імперыі, адпраўленае 14 снежня 1410 г. з Торуня. У сваім звароце вялікі магістр пісаў, пераказваючы падзеі вайны, як польскі кароль несправядліва распачаў вайну, злучыўшыся з вялізнай колькасцю "ўсялякіх няверных злых паганцаў, русаў, валахаў, жамойтаў і літоўцаў", як гэтыя сілы прыйшлі ў Прусію "з забойствам, гвалтаваннем дзяўчат і жанчын, пажарамі і рабаваннем, ганьбаваннем цэркваў і святынь" і як яны збіраюцца не толькі выгнаць Ордэн з Прускай зямлі ды Інфлянтаў, але і іншыя хрысціянскія краіны заваяваць[34]. Сваім духам, апеляцыямі да хрысціянскасці і абарончай місіі Ордэна гэты маніфест нагадваў лозунгі святой вайны з паганцамі[35].

Палемізуючы з польскай прапагандай, да бітвы пад Танэнбергам звярталася і ордэнская храністыка, якая старалася паказаць рыцараў у лепшым святле. Старэйшая хроніка вялікіх магістраў імкнулася падаць пераможцаў у вобразе несапраўдных, "злых" хрысціян (*böse Christen*), якія не пабаяліся ваяваць супраць Ордэна разам з "паўахрышчанымі" літоўцамі, схізматыкамі-русінамі і паганымі татарамі[36]. Прайграная бітва для аўтара – гэта не прос-

[33] Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg 1410. S. 196–208.

[34] Jahrbücher Johannes Lindenblatt, oder Chronik Johannes von der Pusilie. Hg. von J. Voigt und F. W. Schubert. Königsberg, 1823. S. 395–399.

[35] Нагадаем: у пралогу статута Нямецкага ордэна гаварылася, што тэўтонскія рыцары бяруць за прыклад тых, хто ваяваў супраць "злых і няверных людзей, якія апанавалі Святую зямлю". Гл.: Prolog der Deutschordens-Statuten // SRP. Bd. 6. München, 1968. S. 30–34.

[36] Гл.: Die ältere Hochmeisterchronik // SRP. Bd. III. S. 612: *Vil unbarmhertcziger hilt Jagel des ordins bruder und andere christen…*

та параза Ордэна, а абраза, якую нанеслі Богу паганцы[37]. Характэрнымі творамі апалагетычнай для Мальбарка прапаганды былі таксама Toруньскія аналы і працяг хронікі Посільге[38]. Аднак пасля секулярызацыі Ордэна (1525) яго традыцыя была занядбана. У XVI ст. хранiстыка пратэстанцкай Прусіі калі і згадвала пра паразу 1410 г., то без усялякага пафасу, а гісторыя Ордэна ў ёй нярэдка ацэньвалася крытычна. Прыкладам таму можа паслужыць хроніка дамініканіна Сымона Грунау[39] ці гісторыя Прусіі Каспара Шутца[40], якія зусім не шкадаваў для Ордэна цёмных фарбаў.

Калі ў нямецкамоўным пісьменстве Святой Рымскай імперыі, як вынікае са спецыяльных даследаванняў, бітва пад Танэнбергам не пакінула значнага следу, то ў вялікіх гарадах Прусіі памяць пра яе крыху падтрымлівалася. У прускім грамадстве XVI–XVIII ст. эпоха рыцарскага ордэна ў цэлым лічылася нядобрым часам, а з канцом яго ўлады звязваліся найлепшыя ўспаміны[41]. Магістраты найбольшых прускіх гарадоў, – такіх, як Гданьск, Торунь і Эльбланг, праводзілі юбілейныя ўрачыстасці з нагоды вызвалення з-пад "тыраніі крыжовых рыцараў" і добраахвотнага далучэння да Польскага каралеўства – арганізацыя падобных мерапрыемстваў задакументавана для 1554, 1654 і 1754 г.[42]. Напрыклад, у Торуні ў 1754 г. на адпаведным свяце ставіліся тэатральныя пастаноўкі і гаварылася пра трохсотгоддзе з таго дня, "у які Прусія пачала пазбаўляцца нязноснай тыраніі Нямецкага ордэна крыжовых паноў" (*Creutz-Herren*). У шматлікіх паста-

[37] Idem. S. 629: *...solde diszen schaden und dys unere, dy gote in dem lande von den heiden irboten wart...*

[38] Пар.: Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg 1410. S. 192–196.

[39] Grunau S. Preussische Chronik. Hg. von M. Perlbach. Bd. 1 (Die preussischen Geschichtsschreiber des XVI. und XVII. Jahrhunderts. Bd. 1). Leipzig, 1876. S. 735–737. Пра антыордэнскую ідэалогію С. Грунау гл.: Zonenberg S. Kronika Szymona Grunaua. Bydgoszcz, 2009. S. 52–55.

[40] Schütz C. Historia rerum Prussicarum. Wahrhafte und eigentliche Beschreibung der Lande Preussen. Zerbst, 1592. Пар.: Kersken N. Aspekte des preußischen Geschichtsdenkens im 16. Jh. // Preußische Landesgeschichte. Festschrift für Bernhart Jähnig zum 60. Geburtstag. Hg. von U. Arnold, M. Glauert u. J. Sarnowsky. Marburg, 2001. S. 442.

[41] Friedrich K. Inne Prusy. Prusy Królewskie i Polska między wolnością a wolnościami (1569–1772). Poznań, 2005. S. 42, 50, 225; Małłek J. Społeczeństwo "nowopruskie" wobec tradycji krzyżackiej // Krajobraz grunwaldzki w dziejach polsko-krzyżackich i polsko-niemieckich na przestrzeni wieków. Wokół mitów i rzeczywistości. Red. J. Gancewskiego. Olsztyn, 2009. S. 188–191.

[42] Bömelburg H.-J. Vergessen neben Erinnern. S. 51–52; Kąkolewski I. Niemcy // Pod wspólnym niebem. Narody dawnej Rzeczypospolitej. S. 92–93.

ноўках і прамовах з гэтай нагоды ў цэнтры ўвагі было вызваленне ад улады Ордэна як пачатак самастойнасці горада, звязанае з 1454 г., аднак неаднаразова гаварылася і пра бітву 1410 г.

Як у гэтай сувязі справядліва падкрэсліў сучасны нямецкі даследчык Г.-Ю. Бёмельбург, менавіта нямецкамоўнае пратэстанцкае насельніцтва вялікіх гарадоў Прусіі і з'яўлялася, побач з польскімі магнацка-шляхецкімі элітамі, той сацыяльнай групай, у якой памяць пра бітву 1410 г. мэтанакіравана падтрымлівалася ў XVI–XVIII ст. Знамянальна, што гэта была традыцыя пазітыўнай памяці нямецкага пратэстанцкага насельніцтва пра разгром каталіцкага Нямецкага ордэна – важны факт, які ў нацыянальных гістарыяграфіях звычайна замоўчваўся[43], асабліва ў Усходняй Еўропе, на што ніжэй яшчэ звернем увагу.

## 2.3 Успаміны пра бітву і яе забыццё на землях ВКЛ

Параўнальна з польскай і прускай хранiстыкай у беларуска-літоўскіх летапісах бітва пад Грунвальдам заняла значна менш месца. Даследчыкамі ўжо выяўлена, што хоць інфармацыю пра паход Ягайлы і Вітаўта ў Прусію ўтрымлівае амаль два дзясяткі ўсходнеславянскіх летапісаў, пераважная большасць іх заснавана на паведамленні аднаго ноўгарадскага летапісца[44], звесткі якога найбольш раннія і дакладныя. Першае на Русі апісанне прускага паходу і разгрому арміі Ордэна з'явілася менавіта ў Ноўгарадзе Вялікім, дзе намеснікам пад час вайны з Ордэнам сядзеў Ягайлаў брат князь Сямён Лынгвень. Можна толькі гадаць, хто быў інфарматарам гэтага апісання, вытрыманага ў цалкам прыязных да Польшчы і Літвы танах. Праўдападобна, з Ноўгарада звесткі пра бітву 1410 г. трапілі ў агульнарускі мітрапалічы звод (т. зв. "Звод Фоцiя")[45], і дзякуючы гэтаму адпаведны запіс увайшоў у вялікую колькасць летапісаў Русі, а праз

[43] Bömelburg H.-J. Vergessen neben Erinnern. S. 52.

[44] Новгородская первая летопись... С. 401–402. Пар.: Radziszewska J. Echa bitwy grunwaldzkiej w ruskich latopisach // MSH. R. III (1960). Z. 1–2. S. 69–70, 76–79. Да пералічаных Ю. Радзішэўскай трэба дадаць яшчэ Нікіфараўскі летапіс.

[45] Бобров А. Новгородские летописи XV в. С.-Петербург, 2000. С. 111–128, 160.

Смаленск – і ў першы беларуска-літоўскі летапісны звод[46]. Асобная кароткая версія паведамлення пра бітву, заснаваная на відавочна іншай крыніцы, захавалася таксама ў Пскоўскім летапісе[47]. Яна значна пазнейшая і яшчэ менш змястоўная, чым ноўгарадская, але таксама добразычлівая да Вітаўта і Ягайлы.

У гэтай сувязі можа здавацца пэўным парадоксам той факт, што на старонках летапісаў, створаных у ВКЛ, яшчэ менш звестак пра славутую бітву, чым у летапісанні Маскоўскай Русі, якая не брала ніякага ўдзелу ў вайне з Ордэнам. Самы ранні "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх", які датуецца, відаць, 20-мі гадамі XV ст., зусім прамаўчаў пра гэтую падзею. Вельмі кароткія паведамленні пра паход і перамогу ў Прусіі ёсць толькі ў двух спісах другой рэдакцыі першага зводу беларуска-літоўскага летапісання – Нікіфараўскім і Супрасльскім[48]. Астатнія летапісы XV ст., нават калі ў іх апавядаецца пра дзеянні Вітаўта, салідарна маўчаць пра т. зв. "Вялікую вайну" і бітву пад Грунвальдам. Што да паведамлення Нікіфараўскага і Супрасльскага спісаў, то яно зусім не арыгінальнае і сваім паходжаннем адназначна звязана з летапісаннем Паўночнай Русі, найверагодней – з IV Ноўгарадскім або I Сафійскім летапісамі[49].

Самае большае і цалкам арыгінальнае апісанне бітвы пад Грунвальдам утрымлівае толькі апошні беларуска-літоўскі звод, вядомы як "Хроніка Быхаўца"[50]. Гэты летапіс быў напісаны, хут-

[46] Ідэнтычнае паведамленне ўтрымліваюць летапісы Ноўгарадскі I і IV, абодва Сафійскія, Ярмолінскі, Ніканаўскі, Львоўскі, Сімяонаўскі, Супрасльскі, Тыпаграфскі, Маскоўскі звод канца XV в., Васкрасенскі і летапіс Аўраамкі, у іншых жа яно значна адрозніваецца.

[47] Псковские летописи. Подгот. текстов и вступ. ст. А. Н. Насонова. [Репр. изд.] (ПСРЛ. Т. 5. Вып. 1). Москва, 2003. С. 33. Пар.: Radziszewska J. Echa bitwy grunwaldzkiej ... S. 77–80.

[48] Гэта вельмі кароткі запіс, у абодвух помніках амаль ідэнтычны і па сэнсе блізкі да ноўгарадскай версіі, які паведамляе пра бітву Ягайлы і Вітаўта "с немцы и с прусы в Прускои земли, межи городы Дубравны и Острада. И убиша мистра и маршалка, и кунтуры побиша, и всю силу их немецькую побиша, и грады немецкыи поимаша...". Гл.: Никифоровская летопись // ПСРЛ. Т. 35. Москва, 1980. С. 32; Супрасльская летопись // ПСРЛ. Т. 35. С. 54.

[49] Чамярыцкі В. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Мінск, 1969. С. 23, 54–55, 70–72; Приселков М. История русского летописания XI–XV вв. С.-Петербург, 1996. С. 298; Лурье Я. Две истории Руси XV в. С.-Петербург, 1994. С. 14.

[50] Хроника Быховца // ПСРЛ. Т. 32. Сост. и ред. Н. Улащик. Москва, 1975. С. 150–151.

чэй за ўсё, у 1520-я ці 1530-я г. у Вільні, па ініцыятыве канцлера ВКЛ, уплывовага магната Альбрэхта Гаштаўта (магчыма – пры рэзідэнцыі віленскага біскупа Паўла Гальшанскага)[51]. Відаць, з воляй Гаштаўтаў звязана і ўключэнне ў помнік адпаведнага апісання славутай вікторыі над Ордэнам. Заключная рэдакцыя хронікі, згодна з М. Улашчыкам, стваралася крыху пазней, пры двары слуцкіх князёў Алелькавічаў[52], але і праваслаўны летапісец, будучы патрыётам ВКЛ, падзяляў ідэалагічныя ўстаноўкі, закладзеныя ў твор пры Гаштаўтах. На арыгінальнасць апісання Грунвальдскай бітвы ў гэтым помніку ўжо неаднаразова звярталася ўвага. Адпаведны фрагмент хронікі спецыяльна даследаваўся шэрагам вучоных[53], так што цяпер можна толькі скарыстацца вынікамі іх назіранняў.

Вобраз Грунвальда ў "Хроніцы Быхаўца" істотна адрозніваецца ад іншых версій усходнеславянскага летапісання, але ў яшчэ большай меры – ад польскіх хронік. Патрыятычная трактоўка разгрома Ордэна пад Грунвальдам цалкам адмаўляла інтэрпрэтацыю бітвы Длугашам і паказвала вырашальную ролю Вітаўта з яго арміяй. Сваім выкладам падзей "Хроніка Быхаўца" блізкая да ранейшай, гуманістычнай версіі апісання бітвы, вядомай дзякуючы трактатам Энэа Сільвіа Пікаламіні, які таксама аддаваў першую ролю менавіта Вітаўту[54]. Прынята лічыць, што адной з крыніц пралітоўскай версіі маглі быць аповеды Ераніма Пражскага, які

[51] Jasas R. Bychovco kronika ir jos kilmė // Lietuvos metraštis. Vilnius, 1971. P. 37–38; Jučas M. Lietuvos metraščiai. Vilnius, 1968. P. 117; Ючас М. Хроника Быховца // Летописи и хроники. 1973 г. Москва, 1974. С. 227; Флоря Б. О "Летописце Быховца" // Источники и историография славянского средневековья. Сборник статей и материалов. Москва, 1967. С. 140–143.

[52] Хроника Быховца. Предисловие, комментарии и перевод Н. Улащика. Москва, 1966. С. 28; Улащик Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. Москва, 1985. С. 73–74; Ochmański J. Nad Kroniką Bychowca // SŹ. T. 7. Poznań, 1962. S 161–160. Пар.: Citko L. "Kronika Bychowca" na tle historii i geografii języka białoruskiego. Białystok, 2006. S. 233, 265.

[53] Radziszewska J. Echa bitwy grunwaldzkiej… S. 73–76; Kuczyński S. M. Informacje tzw. Latopisu Bychowca… S. 203–219; Ekdahl E. Die Schlacht bei Tannenberg 1410. S. 344–351; Gudavičius E. Bychovco kronikos pasakojimas apie Žalgirio mūšį // AHUK. T. I (1993). P. 123–137.

[54] Piccolomini E. S. De viris aetate sua Claris // SRP. Bd. 4. Leipzig, 1870. S. 240. Гэтая традыцыя адпавядае духу згаданай вышэй хронікі Сымона Грунау і некаторых іншых помнікаў гісторыяпісання канца XV – пачатку XVI ст. Падрабязней гл.: Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg 1410. S. 244–250, 256–257, 349.

наведваўся ў Літву пры Вітаўце. Хоць наконт магчымых інфарматараў Пікаламіні існуюць розныя пункты гледжання[55], не выключана, што падобныя ўяўленні пра бітву ў XV ст. маглі адпавядаць і вуснай традыцыі, пашыранай у Літве[56]. Як бы там ні было, патрыятычная версія "Хронікі Быхаўца" выконвала і актуальныя прапагандысцкія функцыі. Праслаўляючы род Гаштаўтаў, яна адлюстроўвала тагачасныя антыпольскія настроі літоўскай і русінскай знаці ВКЛ. Экспанаванне ж таго факта, што палякі не прыйшлі на дапамогу ліцвінам, магло быць і рэакцыяй на праекты больш цеснай уніі, або (што падаецца больш верагодным) служыць апраўданню няўдзелу ВКЛ у вайне Польшчы з Ордэнам у 1454–1466 г.[57]. Паказальна, што ў самай патрыятычнай трактоўцы разгрому Ордэна вікторыя падаецца проста як слаўная падзея, і ніякага лёсаноснага значэння, як у польскай традыцыі, мясцовыя аўтары ёй не прыпісвалі.

Наступныя сведчанні памяці пра бітву ў XVI ст. звязаны з палемікай палітычных элітаў ВКЛ і Польскай Кароны аб умовах і прынцыпах дзяржаўнай уніі. Так, на Варшаўскім сойме 1564 г., калі абмяркоўваліся прынцыпы аб'яднання, польскія і літоўскія магнаты звярнуліся да гісторыі ўзаемаадносін ВКЛ і Кароны, высвятляючы ў тым ліку, хто больш заслужыў славу перамогі пад Грунвальдам[58]. Выказванне віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла Чорнага, што літоўская заслуга ў перамозе над Ордэнам не меншая, выклікала крытычную рэакцыю кракаўскага кашталяна Марціна Збароўскага, які агучыў Длугашаву версію пра ўцёкі арміі Вітаўта[59]. На гэта, у сваю чаргу, абурана рэагаваў віленскі ваявода, які назваў паведамленне пра ўцёкі ў Кромера і іншых польскіх хроніках хлуснёй, бо ў ранейшых, "больш праўдзівых" хроніках нічога падобнага няма. Да бітвы 1410 г. яшчэ неаднара-

55 Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg 1410. S. 245–246.

56 Gudavičius E. Bychovco kronikos pasakojimas apie Žalgirio mūšį. P. 127–129; Nikžentaitis A. Bitwa pod Grunwaldem w ocienie społeczeństwa litewskiego XV–XVI st. // Studia Grunwaldzkie. T. 3. Olsztyn, 1994. S. 9–10; idem. Witold i Jagiełło. Polacy i Litwini we wzajemnym stereotypie. Poznań, 2000. S. 45.

57 Пар.: Kuczyński S. M. Informacje tzw. Latopisu Bychowca. S. 219.

58 Першым на гэтыя прыклады ўказаў А. Нікжантайціс. Гл.: Nikžentaitis A. Bitwa pod Grunwaldem w ocienie społeczeństwa litewskiego XV–XVI st. S. 11–12; idem. Witold i Jagiełło. S. 47.

59 *Ba, Litwy nie dostawa, bo była uciekła.* Гл.: Działyński A. Źródłopisma do dziejów Unii Korony Polskiej i W. Księstwa Litewskiego. Cz. 2/1. Poznań, 1861. S. 302.

зова звярталіся не толькі на згаданым сойме, але і пазней. Гэта адбылося і на вальным сойме 1566 г. у Берасці. Віленскі біскуп Валяр'ян Пратасевіч гаварыў там пра два мячы, прынесеныя адзін для Ягайлы, другі – для Вітаўта, і зацытаваў іншае вядомае двухрадкоўе з таго ж грунвальдскага цыкла:

*Hej, Polanie, z Bogiem na nie / Już nam Litwy nie dostanie...*[60]

Паказальна, што ў абодвух выпадках зварот да тэмы Грунвальда паслужыў актуальнай патрэбе абгрунтавання роўнасці бакоў у планаванай дзяржаўнай уніі[61]. Пасля стварэння Рэчы Паспалітай абедзвюх нацый, калі палітычныя культуры элітаў пачалі збліжацца, а патрэба актуалізацыі памяці пра Грунвальд перастала існаваць, літоўскі бок, відаць, больш не лічыў важным даказваць свае заслугі ў перамозе 1410 г. У кожным разе сучасныя літоўскія даследчыкі, якія і звярнулі ўвагу на прыклады ўспамінання даўняй бітвы на соймах, выказалі меркаванне, што ў XVI–XVIII ст. і ў асяроддзі літоўскіх каталіцкіх элітаў пачала дамінаваць польская версія ўяўленняў пра Грунвальд[62].

Варыянт спалучэння абедзвюх версій знаходзім ужо ў хроніцы Мацея Стрыйкоўскага. Хоць той паходзіў з Польшчы, як гістарыёграф ВКЛ ён услаўляў аднолькава Літву з Руссю, і ў яго хроніцы польская традыцыя бітвы ўраўнаважваецца патрыятычна-ліцвінскай, артыкуляванай у "Хроніцы Быхаўца". Напрыклад, у яго апісанні войска Вітаўта бяжыць з поля бою, як і ў Длугаша, але не ўсё: разам з гераічнымі смаленскімі харугвамі сітуацыю выпраўлялі віленцы і трокцы, а слава перамогі аднолькава прызнаецца заслугай і Польшчы, і Літвы[63]. У гэтых адносінах найбольш выразна з летапісамі XV–XVI ст. кантрастуе толькі "Хроніка Літоўская і Жмойцкая", якая падае бітву з пазіцый, зусім блізкіх да польскай традыцыі. З аднаго боку, яна навязліва сцвярджае ідэю справядлівасці той вайны, якую вялі Польшча і Літва, з іншага – артыкулюе тэзіс Длугаша пра адсталасць Літвы (напрыклад, паведамляе

[60] Nowak-Dłużewski J. Okolicznościowa poezja polityczna... S. 52.

[61] Petrauskas R. Grunwaldu życie pośmiertne od XV do XX w. w historiografii i tradycji litewskeij, białoruskiej i sowieckiej // Wojna, pamięć, tożsamość. O bitwach i mitach bitewnych. Pod red. J. M. Piskorskiego. Warszawa, 2012. S. 148.

[62] Nikžentaitis A. Bitwa pod Grunwaldem w ocienie społeczeństwa litewskiego XV–XVI st. S. 12–13; Petrauskas R. Grunwaldu życie pośmiertne od XV do XX w. S. 148–149.

[63] *Tak tym sławnym zwycięstwem ozdobić Polaki / I Litwę Bóg sam raczył, iż zbili Krzyżacy*. Гл.: Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Zmódzka i wszystkiej Rusi. T. 2. Warszawa, 1846. S. 132–138.

пра злачынствы, якія чынілі ў Прусіі харугвы Вітаўта – "татары з літвою")[64]. Знамянальна, што толькі ў гэтай хроніцы ў шырокі ўжытак уваходзіць польская назва прускіх рыцараў "крыжакі"[65]. Падобныя змены ў вобразе Грунвальда і рыцараў Нямецкага ордэна абумоўлены тым, што "Хроніка Літоўская і Жмойцкая" была створана ў выніку кампіляцыі польскамоўных крыніц, відаць, толькі ў канцы XVII ці нават у першай палове XVIII ст.[66], – ужо пад моцным уплывам польскай традыцыі. У дэталях апісання бітвы 1410 г. яна часам літаральна супадае з хронікай М. Стрыйкоўскага[67], на якую абапіралася, а Стрыйкоўскі, у сваю чаргу, залежаў ад шаблонаў, уведзеных Янам Длугашам.

Нязначнасць інфармацыі або поўную адсутнасць упамінанняў пра разгром Ордэна ў большасці беларуска-літоўскіх летапісаў можна расцэньваць як сведчанне абыякавасці да самой тэмы тых колаў, у якіх яны ствараліся. Калі мець на ўвазе праваслаўныя эліты ВКЛ, то, мяркуючы па літаратуры прадмета, даследчыкам невядомы ніводзін прыклад іхняга звароту да бітвы з якой-небудзь уласнай інтэрпрэтацыяй падзеі. Інакш кажучы, Грунвальд наўрад ці карыстаўся папулярнасцю ў іх асяроддзі. Пра вялікую бітву ў адукаваных колах русінаў не маглі не ведаць, а М. Стрыйкоўскі ўслаўляў яе на старонках сваёй хронікі не без пастаяннай сувязі з праваслаўным асяроддзем. Выходзіць, для іх у тыя часы яна не сімвалізавала нечага асабліва важнага[68]. І гэта не дзіўна,

64 Хроника Литовская и Жмойтская // ПСРЛ. Т. 32. С. 78–79.

65 Пра запазычанасць тэрміна і яго выкарыстанне з неадпаведным значэннем у беларускім пісьменстве гл.: Сагановіч Г. Да праблемы адэкватнасці тэрмінаў у айчыннай гістарыяграфіі: "крыжак" і "крыжаносец" // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі, новай і навейшай гісторыі краін Еўропы і ЗША. Ч. 1. Мінск, 2008. С. 15–18.

66 Улащик Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. С.74–78; ён жа. "Литовская и Жмоитская Кроника" и ее отношение к хроникам Быховца и М. Стрыйковского // Славяне и Русь. Сб. ст. Москва, 1968. С. 362.

67 Хроника Литовская и Жмойтская. С. 78: "Повстали Прусы з войском немецким, хотячи Полщу и Литву до грунту выгладити, а в их землях сами осести". Пар.: Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Zmódzka i wszystkiej Rusi. T. 2. Warszawa, 1846. S. 128, 137 і наст.. Пар.: Улащик Н. "Литовская и Жмоитская Кроника" и ее отношение к хроникам Быховца и М. Стрыйковского. С. 358–359.

68 Пар.: Sahanovič H. Tannenberg und die ostslawische orthodoxe Welt // Tannenberg-Grunwald-Žalgiris 1410: Krieg und Frieden im Späten Mittelalter. Wiesbaden, 2011. S. 309–320. Пра неістотнасць бітвы 1410 г. для старабеларускай традыцыі апошнім часам пісаў і Ю. Мікульскі,

калі ўлічваць, што для праваслаўнага ўсходу ВКЛ тэма барацьбы з татарамі тады была важней, чым з Ордэнам[69].

Як адзначалася вышэй, самая пашыраная на Русі версія апісання Грунвальда выявіла добразычлівую да польска-літоўскага боку тэндэнцыю, але не больш за гэта. Усходнеславянская традыцыя не адлюстравала якую-небудзь заангажаванасць у канфлікт Ягайлы і Вітаўта з Ордэнам. Ключавыя ідэі польскай прапаганды пра міралюбства караля Ягайлы, каварнасць нямецкіх рыцараў і справядлівы характар вайны супраць Ордэна не характэрныя для ўсяго беларуска-літоўскага летапісання. У адрозненне ад польскай мясцовая гістарычная традыцыя не захавала, а найверагодней і не ведала вобраза падступнага і сквапнага на заваёвы "крыжака" як адвечнага ворага[70]. З улікам гэтага больш зразумелай уяўляецца і нязначнасць таго следу, які пакінула ў гісторыяпісанні ВКЛ славутая бітва.

Калі звярнуцца да настрояў шырокіх колаў грамадства, то бытаванне тых антынямецкіх прымавак і вершыкаў, якія выяўлены ў старапольскай літаратуры, тут не зафіксавана. Ніякіх падобных прыкладаў не ведае прынамсі старабеларускае пісьменства. Спецыфічны матыў антынямецкіх настрояў захаваўся толькі ў т. зв. "Прамове Мялешкі", – ананімным сатырычным творы пачатку XVII ст., які традыцыйна прыпісваўся смаленскаму кашталяну Івану Мялешку. Яго аўтар, верагодна, праваслаўны шляхціч з паўднёвых паветаў ВКЛ, усхвалае вялікага князя Жыгімонта Старога за тое, што той "немцаў як сабак не любіў"[71]. Аднак трэба ўлічваць, што ў творы і палякі не лічацца "сваімі" – ім супрацьпастаўляецца гістарычная Літва і Русь.

хоць падыходы аўтара ў многім да недапушчальнасці спрошчаныя, як і катэгарычная выснова аб тым, што бітва наогул "Русі не датычыла". Гл.: Мікульскі Ю. Грунвальдская бітва 1410 г. у старабеларускай традыцыі // Вялікае княства Літоўскае і яго суседзі ў XIV–XV стст.: саперніцтва, супрацоўніцтва, урокі. Мінск, 2011. С. 120.

69 Пар.: Nikžentaitis A. Internationales Gedenken an die Schlacht bei Tannenberg // Tannenberg-Grunwald-Žalgiris 1410: Krieg und Frieden im Späten Mittelalter. Wiesbaden, 2011. S. 323.

70 На факт "поўнага ігнаравання" барацьбы з Ордэнам у беларуска-літоўскім летапісанні неаднаразова ўказваў М. Улашчык. Гл.: Улащик Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. С. 155, 163.

71 Struminsky B. A. Pseudo-Meleško. A Ukrainian Apocryphal Parliamentary Speech of 1615–1618. Cambridge, 1984. P. 116–117; Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII ст. / нав. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мінск, 2003. С. 675.

Праўда, з XVII ст. у ВКЛ, як і ў Кароне, нярэдкасцю былі канфлікты ў войску паміж мясцовымі і замежнымі аддзеламі, г. зн. фармаваннямі "польскага" і "нямецкага" ўзору. Выступы мясцовай шляхты супраць нямецкіх афіцэраў на фоне агульнай непрыязнасці да чужаземцаў добра задакументаваныя[72]. Характэрны ўзор падобнага стаўлення да немцаў утрымлівае і адзін з прыватных лістоў канца XVII ст., напісаных у Горадні: "Немцы праз нашыя звадкі, хатнія разлады, сваркі хочуць нас аслабіць, а аслабіўшы задушыць; у фартэцыях, замках ерэтыцкія гарнізоны ставяць, чужаземнае войска больш чым польскае пашыраецца..."[73]. Аднак канфлікты такога роду наўрад ці могуць расцэньвацца як сведчанне нацыянальнага антаганізму. Немцы, пераважна выхадцы з прыбалтыйскіх правінцый Рэчы Паспалітай, складалі аснову чужаземных фармаванняў арміі ВКЛ, асабліва іх афіцэрскага складу, і знаходзіліся ў лепшым становішчы, чым мясцовыя кадры. Чужаземцам у войску і плацілі болей, паколькі яны больш цаніліся за прафесіяналізм. Да таго ж трэба ўлічваць, што "нямецкай" у ВКЛ звычайна называлі чужаземную пяхоту наогул, незалежна ад этна-нацыянальнага паходжання жаўнераў[74].

Ігнараванне тэмы барацьбы з немцамі ці "крыжакамі", не гаворачы ўжо пра Грунвальд, асабліва характэрна для вуснай беларускай традыцыі, якая наогул вылучаецца нізкім узроўнем гістарычнай свядомасці. Навукоўцамі не выяўлена ніводнага помніка, які б захаваў ясныя адгалоскі такой барацьбы. Яшчэ даследчыкі беларускага фальклору XIX ст. адзначалі, што ў ім няма песняў пра даўнія войны і сваіх герояў, а сустракаюцца толькі цьмяныя згадкі пра каралеву Бону, імператрыцу Кацярыну, шведаў, татараў, французаў[75]. Сучасныя фалькларысты таксама сведчаць, што гістарычныя песні і паданні ўтрымліваюць нейкае далёкае водгулле барацьбы з татарамі ці туркамі, радзей – шведамі, французамі, палякамі (ляхамі), але няма

[72] Rachuba A. Armia Wielkiego Księstwa Litewskiego jako czynnik unifikacji narodowej i kulturowej // PH. T. LXXXVIII (1997). Z. 2. S. 239, 241–243.

[73] Ананімны ліст з Гродна за 12 снежня 1697 г. Biblioteka Narodowa w Warszawie. BN, III, 3097. Salmonowicz S. Polacy i Niemcy wobec siebie. S. 21.

[74] Wisner H. Wojsko litewskie I połowy XVII w. // SMHW. T. XXI. Warszawa, 1978. S. 107.

[75] Пар.: Радзік Р. Вытокі сучаснай беларускасці. Беларусы на фоне нацыятворчых працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе XIX ст. Мінск, 2012. С. 210–212.

зусім ніякіх сведчанняў пра даўнія канфлікты з немцамі[76]. З ваенных падзей як найбольш значныя ў сабраных гістарычных баладах падаюцца татарскія (турэцкія) набегі, і найчасцей у абагульненым вобразе чужаземнага ворага выступаюць менавіта "татары"[77]. Цікава, што і радкі пра князя Вітаўта са старапольскага грунвальдскага цыкла ("Ідзе Вітаўт па вуліцы, за ім нясуць дзве шабліцы") у беларускім варыянце гістарычнай песні, запісанай Вацлавам Ластоўскім (аўтэнтычнасць якой далёка не бясспрэчная), пазбаўлены ўсялякай сувязі з барацьбой супраць Ордэна. "Песня а князю Вітаўце" ўслаўляе яго як барацьбіта з татарамі, а не з "крыжакамі" ці немцамі[78].

Варта адзначыць, што ў народным тэатры беларусаў немца вызначала не столькі вера, колькі незразумелая мова[79]. Наогул, у беларускіх інтэрмедыях школьных і народных тэатраў сярод персанажаў з імёнамі ў форме нацыянальных азначэнняў, якія сустракаюцца зусім не часта, выступалі звычайна "жыд" ці "цыган", але не "немец"[80]. У адным з такіх рэдкіх прыкладаў школьнай інтэрмедыі XVII ст., дзе сярод персанажаў ёсць "германец", апошні фігуруе ў вобразе смешнага іншага (не ведае мовы, мясцовых звычаяў і да т. п.)[81], толькі не ворага. У фальклоры розных рэгіёнаў Беларусі немцы надзяляліся рысамі міфічных іншародцаў, у вобразе якіх увасабляецца ўсё "чужое", але не болей за гэта. Так, у фальклоры Палесся немцы могуць выступаць як раўназначныя туркам ("другі турак"). Азначэнне "немцы" часам фігуруе і як канфесійная прыналежнасць (Лютэр многіх людзей "перавёў у немцы"), "нямецкая вера", да якой каталікі Заходняй

[76] Беларускі эпас / пад рэд. П. Ф. Глебкі і І. В. Гутарава. Мінск, 1959; Салавей Л. Беларускія гістарычныя балады // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. 1972. № 4. С. 123–133; Кабашнікаў К. Гістарычныя песні // Беларускі фальклор: у 2 т. Т. 1. Мінск, 2005. С. 344–345; Гурскі А. Паданні гістарычныя // Беларускі фальклор: у 2 т. Т. 2. Мінск, 2006. С. 268.

[77] Салавей Л. Беларуская народная балада. Мінск, 1978. С. 149–150, 157–158, 183–184.

[78] Ластоўскі В. Выбраныя творы. Мінск, 1997. С. 154. Пар. іншы варыянт той жа песні ў: Барыс С., Чаропка В. Беларускія гістарычныя песні // БГЧ. 2004. № 2. С. 43.

[79] Ненадавец А. Немцы // Беларускі фальклор: у 2 т. Т. 2. Мінск, 2006. С. 248.

[80] Барышев Г. И. Театральная культура Белорусии XVIII в. Минск, 1992. С. 40–54.

[81] Міско С. М. Школьны тэатр Беларусі XVI–XVIII стст. Мінск, 2000. С. 116–120: інтэрмедыя "Татарын спаймаў немца".

Беларусі ставіліся іранічна[82]. Але стэрэатыпнага вобраза немца як ворага беларускі фальклор не ўтрымлівае.

Хоць у некаторых працах айчынных аўтараў да нядаўняга часу паўтараўся стары тэзіс аб тым, быццам беларускі фальклор, адлюстроўваючы барацьбу з іншаземнымі захопнікамі, апавядае і пра войны з крыжаносцамі[83] (пра акалічнасці з'яўлення такіх сцвярджэнняў будзе сказана ніжэй), у доказ ніхто так і не прывёў ніводнага належнага запісу. Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што сам факт адсутнасці ў легендах і гістарычных баладах беларусаў якіх-небудзь матываў барацьбы з Нямецкім ордэнам, тым больш канкрэтных згадак пра Грунвальд, іншым разам прызнаецца і даследчыкамі вуснай народнай творчасці[84], аднак да гістарычнага тлумачэння гэтай асаблівасці фальклорнай памяці беларускага народа справа не даходзіла.

Такім чынам, рэзюмуючы, варта найперш падкрэсліць тое, што пра непарыўную пераемнасць памяці пра Грунвальд / Танэнберг, ці кантынуітэт грунвальдскай традыцыі гаварыць не даводзіцца. У дамадэрны перыяд вікторыя 1410 г. найбольш ушаноўвалася ў Польскім Каралеўстве, але і там яна ў XVII–XVIII ст. забывалася. Што ж да земляў Беларусі ці Літвы, дык у ВКЛ наогул складана выявіць які-небудзь след успамінаў пра перамогу над Ордэнам у названы перыяд. Зразумела, магчымасць выяўлення нейкіх асобных згадак пра Грунвальд далейшымі даследаваннямі не выключаецца, аднак яны наўрад ці зменяць агульную выснову нашых назіранняў. А вось у тагачаснай Прусіі мяшчане вялікіх гарадоў арганізавана падтрымлівалі памяць пра бітву пад Танэнбергам, у чым выразна праяўляўся яе транснацыянальны характар[85]. Прускую практыку ўшаноўвання перамогі польскага караля можна лічыць яркай праявай тыповай уласцівасці гістарычнай памяці ў ранні Новы час, калі звароты да мінулага яшчэ не вызначаліся лініямі нацыянальнага супрацьстаяння.

[82] Белова О. В. Мифологизация образа немца в славянской традиционной духовной культуре // Славяне и немцы. Средние века – раннее Новое время. Сборник тезисов 16-й конференции памяти В. Д. Королюка. Москва, 1997. С. 10–13.

[83] Гл.: Цітавец А. Паданні ўсходніх славян пра барацьбу з захопнікамі // Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян / рэд. К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік. Мінск, 1993. С. 370–392.

[84] Гл.: Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии. Минск, 1993. С. 17.

[85] Bömelburg H.-J. Vergessen neben Erinnern. S. 41, 52.

Раздзел 3

# Сярэднявечная бітва ў германа-славянскім супрацьстаянні

## 3.1 Актуалізацыя памяці пра Тэўтонскі ордэн у Нямеччыне

*...Мы маглі б уявіць сабе, як кароль Фрыдрых праз стагоддзі працягвае руку Плаўэну і Кніпродэ, – як выратавальнік іх нямецкай культурнай працы.*

Гайнрых фон Трайчке[1]
пра І падзел Рэчы Паспалітай

Бітва пад Грунвальдам "усплыла" ў гістарычнай памяці датычных да яе народаў у выніку працэсаў, выкліканых падзеламі Рэчы Паспалітай, і асабліва дзякуючы пачаткам фармавання мадэрных нацый. Да канца XVIII ст. як Тэўтонскі ордэн, так і нямецкая каланізацыя еўрапейскага Усходу, з якой ён пазней атаесамляўся, толькі зрэдку ўспаміналіся ў нямецкай гістарычнай літаратуры. Пры гэтым, як вынікае з грунтоўных даследаванняў Вольфгана Віпэрмана, прысвечаных успрыманню Ордэна ў нямецкай гістарычнай і грамадска-палітычнай думцы[2], тады яны зусім не ўсхваляліся. У эпоху Асветніцтва з характэрнай для яго зарыентаванасцю на рацыянальнае тлумачэнне мінулага і ўвагай да правоў чалавека гісторыкі і пісьменнікі Прусіі

[1] Treitschke H. Das deutsche Ordensland Preußen // Preußische Jahrbücher. Bd. 10 (1862). S. 149.

[2] Wippermann W. Der Ordensstaat als Ideologie. Das Bild des Deutschen Ordens in der deutschen Geschichtsschreibung und Publizistik. Berlin, 1979; idem, Der "deutsche Drang nach Osten". Darmstadt, 1981.

зусім не ўзносілі часы панавання Ордэна, а да дзейнасці рыцараў ставіліся крытычна. Вядомымі нямецкімі гісторыкамі-асветнікамі асуджаліся іх гвалтоўныя метады пашырэння хрысціянства і каланізатарства, а палітыка Ордэна параўноўвалася з жорсткасцю іспанцаў у Паўднёвай Амерыцы (гл. працы Карла Фрыдрыха Паўлі і Аўгуста Коцэбу[3]). Вайну Ордэна з паганцамі ў сваіх "Ідэях да філасофіі гісторыі чалавецтва" востра крытыкаваў і славуты нямецкі філасаф Ёган Готфрыд Гердэр. Стварыўшы вобраз славянскіх народаў як адзінай супольнасці, прыгнечанай ваяўнічымі немцамі, ён прадказваў хуткае абуджэнне славян, калі тыя "скінуць з сябе ланцугі рабства"[4]. Гэтая ідэя Гердэра неўзабаве набыла вялікую папулярнасць сярод элітаў славянскіх народаў, што мела далёкасяжныя наступствы для іх развіцця.

Стаўленне да славян, асабліва да палякаў, стала мяняцца пасля анексіі польскіх тэрыторый Прусіяй і Аўстрыяй у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, а таксама дзякуючы развіццю мадэрных нацыяналізмаў. У спецыяльнай літаратуры добра паказана, што канструяванне этнічных нацый прадугледжвала перш за ўсё адмежаванне ад іншых праз дэманізацыю суседзяў і самавызначэнне праз гісторыю ўласнай дзяржавы і культуры[5]. Ужо нямецкія гісторыкі-рамантыкі канца XVIII ст. (Людвіг Бачко, Ёзэф Айхендорф, Захарыас Вернэр і інш.) у адрозненне ад крытычнай пазіцыі іх папярэднікаў пачалі пазітыўна пераацэньваць гісторыю Тэўтонскага ордэна, выяўляючы пры гэтым антыпольскія тэндэнцыі яе асвятлення[6]. У самой ідэалізацыі Ордэна, аднак, не варта шукаць нейкую нямецкую спецыфіку, бо ў тую эпоху гэта было агульнай тэндэнцыяй, калі мінулае актыўна выкарыстоўвалася для акту-

[3] Kotzebue A. Preußens ältere Geschichte. Bd. 1. Riga, 1808. S. 124 і наст.; У працы пра Свідрыгайлу ён таксама называе Ордэн "вераломным", а рыцараў – "карысталюбівымі", і да т. п. Гл.: Коцебу А. Свидригайло, Великий князь Литовский. С.-Петербург, 1835. С. 35, 55 і наст.

[4] Гердер И. Г. Идеи к философии истории человечества. Перевод и прим. А. В. Михайлова. Москва, 1977. С. 471, 594.

[5] Пар.: Jeismann M. Das Vaterland der Feinde. Studium zum nationalen Feindbegriff und Selbstverständnis in Deutschland und Frankreich 1792–1918. Stuttgart, 1992. S. 11 і наст.; Smith A. Myths and Memories of the Nation. Cambridge, 1999. P. 29–95; Leerssen J. Nation and Ethnicity // Contested Nation: Ethnicity, Class, Religion and Gender in National Histories / Ed. by S. Berger and C. Lorenz. Basingstoke, 2008. P. 75–103.

[6] Wippermann W. "Gen Ostland wollen wir reiten!" Ordensstaat und Ostsiedlung in der historischen Belletristik Deutschlands // Germania Slavica II. Berlin, 1981. S. 200–205.

альных палітычных патрэбаў усімі нацыянальнымі рухамі. Рамантызм ахутваў прыгожай містычнай легендай усё, што лічыў сваім – нацыянальным. І хоць на захадзе Прусіі яшчэ шанавалася вызваленне з-пад тыранічнай улады Ордэна, а ў яе ўсходніх землях крытыкавалася падпарадкаванне прусаў рыцарамі, як паказалі даследаванні В. Віпэрмана, менавіта пасля II і III падзелаў Рэчы Паспалітай стала пашырацца пазітыўная ацэнка "каланізацыі" і "германізацыі" славянскіх тэрыторый[7]. Раней погляд, што немцы культурна пераўзыходзілі палякаў (хоць ён і быў артыкуляваны ў гісторыяпісанні ў другой палове XVIII ст.) і што даўняя каланізацыя ўсходніх зямель была добрай справай, сустракаўся яшчэ зусім рэдка. Затое з пачатку XIX ст. у асяроддзі прускіх гісторыкаў сталі з'яўляцца не толькі пазітыўныя ацэнкі сярэднявечнай каланізацыі, але і выразныя тэзісы аб вышэйшасці немцаў і іх культуртрэгерскай місіі ў адносінах да славян[8].

Адным з першых, хто ўбачыў у сярэднявечным нямецкім руху на ўсходнія землі суцэльны працэс і параўнаў яго з прыходам еўрапейцаў у Паўночную Амерыку, быў Ёган Ф. Райтэмаер са сваёй "Гісторыяй Прускай дзяржавы". "Барацьбу за панаванне" ў славянскіх землях ён лічыў справай легітымнай, а набыццё польскіх тэрыторый звязваў з сярэднявечнымі перасяленнямі на ўсход, якія называў прыкладам для новай каланізацыі[9]. Дзякуючы перамозе над панаваннем Напалеона, барацьба з якім пачыналася ў Прусіі, а таксама вяртанню польскіх земляў, набытых у канцы XVIII ст., традыцыі даўняй ордэнскай дзяржавы актуалізаваліся[10]. Прусію пачыналі ўспрымаць як наступніцу сярэднявечнай ордэнскай дзяржавы. Выпадкова ці не, але той жалезны крыж, які прускі кароль Фрыдрых Вільгельм у 1813 г. увёў у якасці ўзнагароды, сваім выглядам нагадваў чорны крыж на белых плашчах даўніх рыцараў[11]. Нямецкі ордэн паступова рабіўся ўвасабленнем бастыёна, выстаўленага супраць славян. Гісторык Адольф Менцэль у 1818 г. ужо звя-

[7] Wippermann W. Der "deutsche Drang nach Osten". S. 134–135.

[8] Idem, Der Ostsiedlung in der deutschen Historiographie und Publizistik. S. 34–35, 52–55.

[9] Reitemeier J. F. Geschichte der preußischen Staaten vor und nach ihrer Vereinigung in eine Monarchie. Bd. 1–2. Frankfurt a. d. O., 1801–1805; Wippermann W. Der "deutsche Drang nach Osten". S. 27–28, 135.

[10] Арнольд У. Танэнберг / Грунвальд як палітычны сімвал у XIX–XX ст. // БГА. Т. 17 (2010). С. 46.

[11] Troschke T. F. Das Eiserne Kreuz // Jahrbücher für die deutsche Armee und Marine. Bd. 1. Berlin, 1871. S. 1–29. Пар.: Friedrich K. Biała legenda czarnego krzyża // Mówią Wieki. 2002. № 2. S. 12.

заў "германскую місію" з сярэднявечнымі перасяленнямі немцаў на ўсход, прэзентаваўшы іх не толькі як "вяртанне" былых нямецкіх земляў, але і як прыклад для новай усходняй экспансіі[12].

Пазітыўнае ўспрыманне гісторыкамі сярэднявечнага нямецкага руху на ўсходнія землі было абумоўлена як станоўчым стаўленнем навукоўцаў эпохі рамантызму да Сярэднявечча наогул, так і перакананнем большасці тагачасных нямецкіх гісторыкаў у тым, што ў сярэднявечныя часы немцы неслі славянам культуру. Згадаем, што славуты нямецкі філосаф Гегель адносіў славян да народаў без гісторыі, тады як германцаў лічыў больш развітымі, носьбітамі хрысціянскага прынцыпу[13]. Адзін з айцоў нямецкага класічнага гістарызму Леапольд фон Ранке звязваў гісторыю Еўропы з супольнасцю германа-раманскіх народаў[14], без славян, робячы выключэнне толькі для Расіі з часоў Пятра І. З такіх ідэй арганічна вынікала ўяўленне аб нямецкай культуртрэгерскай місіі: маўляў, немцы неслі культуру менш развітым славянам. У тое, што германа-раманскія народы былі вышэй развітыя за славян, у першай палове XIX ст. верылі напэўна ўсе нямецкія гісторыкі. Падобныя погляды падзялялі і Карл Маркс з Фрыдрыхам Энгельсам. У прыватнасці, апошні ў пачатку 1849 г. пісаў, што заваяванні славянскіх земляў немцамі адпавядалі "інтарэсам цывілізацыі" і што германізацыю варта тлумачыць натуральным уплывам больш развітай нацыі на менш развітую[15]. Словам, і Ф. Энгельс лічыў, што немцы ў адносінах да славян выступалі "носьбітамі прагрэсу", прыкладам "гістарычнага развіцця".

Пры рамантычнай ідэалагізацыі вобраза Нямеччыны і ўзвышэнні яе гістарычнай ролі немцы ўспрымалі свой сярэднявечны каланізацыйны рух у пазітыўным святле, залічваючы яго да "вялікіх спраў нямецкага народа". Некаторыя нямецкія навукоўцы (напрыклад, Фрыдрых Ліст у 1842 г.), нібыта кіруючыся інтарэсамі нямецкай нацыі, выступалі з прапановамі вялікага

[12] Wippermann W. Der "deutsche Drang nach Osten". S. 33.

[13] Гегель Г. В. Ф. Лекции по истории философии. Пер. А. Войдена. С.-Петербург, 1993. С. 361, 368–369. Пра выказванні Гегеля наконт славян пар.: Ліндnэр Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. С.-Пецярбург, 2003. С. 119, спас. 252.

[14] Ranke L. Geschichten der romanischen und germanischen Völker von 1494 bis 1535. Hildesheim [etc.], 2010. S. III–IV.

[15] Энгельс Ф. Борьба в Венгрии // Маркс К., Энгельс Ф. Сочинения. Т. 6. Москва, 1957. С. 175–186. Называючы славян "варварамі", Ф. Энгельс рабіў выключэнне для палякаў, якіх цаніў за выступ "супраць рэакцыйнага панславізму".

перасялення немцаў на абшары Паўднёва-Усходняй Еўропы – каб стрымаць уяўную расійскую экспансію[16]. Хоць такія погляды яшчэ былі рэдкімі, яны не засталіся незаўважанымі элітай суседніх славян. Чэшскі гісторык і грамадскі дзеяч Францішак Палацкі ўжо ў 1830-х г. пачаў пісаць гісторыю Чэхіі з перспектывы барацьбы супраць нямецкіх уплываў.

У сярэдзіне XIX ст., калі няспраўджаныя надзеі Вясны Народаў выклікалі значнае ўзрастанне нацыянальнай свядомасці славянскіх народаў і актывізацыю агульнаславянскага руху з апорай на Расію, нямецка-славянскі антаганізм пачаў абвастрацца. Лідары славянскіх нацыянальных рухаў у адказ на кансалідацыю немцаў выступалі з заклікамі абараніць іх народы ад "нямецкага іга", ад уціску, і ў гэтых мэтах дэкларавалі нават гатоўнасць аб'яднацца з Расіяй. У прыватнасці, ідэолаг славацкага нацыянальнага адраджэння Людавіт Штур у сваёй кнізе-маніфесце "Das Slaventhum und die Welt der Zukunft" (1851) абвінаваціў Аўстрыю ў планамернай германізацыі славян, адным з першых выкарыстаўшы тэрмін *Drang nach Osten*[17]. Перад такой пагрозай ён заклікаў да адзінства славянскіх народаў супраць "нямецкага націску на ўсход", і моцную дамбу на шляху немцаў у яго разуменні магла ўтварыць толькі царская Расія[18].

Падобныя заклікі да агульнаславянскага аб'яднання, асабліва пасля правядзення славянскага кангрэса ў Празе (1848), служылі прапагандзе панславісцкіх ідэй. Нямецкая палітычная эліта ўспрымала іх як сігнал небяспекі панславізму і, у сваю чаргу, імкнулася да мабілізацыі свайго грамадства. Ва ўмовах канфрантацыі з нацыянальна-вызваленчымі рухамі славянскіх народаў, з аднаго боку, і перад гегеманістычнымі дамаганнямі царскай Расіі, з другога, нямецкія эліты займалі антыславянскія пазіцыі і шукалі магчымасцяў аб'яднання Нямеччыны. З такой перспектывы ў нямецкім гісторыяпісанні паступова ўмацавалася канцэпцыя адвечнага нямецка-славянскага антаганізму, а вобраз гісторыі славянскіх народаў трансфармаваўся: замест той місіі славян, пра якую пісаў Гердэр, з'явілася вера ў іх ніжэйшасць,

[16] Wippermann W. Der Ostsiedlung in der deutschen Historiographie und Publizistik. S. 62, 63.

[17] Прыналежнасць увядзення тэрміна Л. Штуру вызначыў польскі гісторык Г. Лябуда. Гл.: Labuda G. Słowianie w historiografii niemieckiej XIX w. S. 145.

[18] Гл. перавыданне на рускай мове: Славянство и мир будущего: послание славянам с берегов Дуная Людевита Штура. Изд. 2. С.-Петербург, 1909.

у заканамернасць пашырэння еўрапейскай культуры немцамі, а нямецкі *Drang nach Osten* пачаў усхваляцца[19].

Пад паняццем "*Drang*" у філасофскай мове першай паловы XIX ст. разумелі несвядомую волю, нейкае інстынктыўнае імкненне, натуральны парыў. Яно адпавядала рамантычным уяўленням пра народ як носьбіт гісторыі. У якасці праявы нямецкага *Drang nach Osten* называліся розныя прыклады экспансіі і перасялення немцаў на ўсходнія землі. У сапраўднасці гэта былі нічым не звязаныя гістарычныя феномены з эпох, якія моцна адрозніваліся. Аднак нацыянальная гістарыяграфія другой паловы XIX ст. шукала ў мінулым актуальныя палітычныя аргументы і прыклады вялікіх здзяйсненняў нямецкай нацыі, канструявала вобраз адзінага працэсу нямецкай каланізацыі ўсходу, або руху на ўсход (*Ostkolonisation*, *Ostbewegung*). Напрыклад, гісторык Георг Вайц ужо ў 1860 г. пісаў, што германізацыя славян адпавядала натуральнаму працэсу пашырэння нямецкай культуры і насельніцтва ва ўсходнім накірунку і што нямецкі *Drang nach Osten* быў гістарычнай заканамернасцю, якой, маўляў, апраўдваецца і падпарадкаванне заходніх славян, і падзелы Рэчы Паспалітай[20].

У кантэксце такой нямецка-славянскай канфрантацыі не магла не ўзрасці роля Тэўтонскага ордэна як прыкладу *Drang nach Osten* і сімвала моцнага нямецкага фарпоста супраць экспансіі славян. Ужо прускі гісторык Ёганэс Фойгт, адыходзячы ад характэрных для Асветніцтва сімпатый да мясцовага насельніцтва, у шматтамовай "Гісторыі Прусіі" пазітыўна ацэньваў падпарадкаванне рыцарамі даўняй Прусіі і яўна ідэалізавана асвятляў дзейнасць Ордэна, прыпісваючы яму цывілізатарскія мэты[21]. Аднак далейшы вобраз Ордэна фармавала не грунтоўная навуковая праца каралявецкага гісторыка і архівіста. Для "адкрыцця" і папулярызацыі спадчыны даўняй ордэнскай дзяржавы намнога большае значэнне мела публіцыстычнае эсэ Гайнрыха фон Трайчке "Нямецкая ордэнская зямля Прусія" (1862)[22], а затым гістарычны раман Эрнста Віхерта

[19] Labuda G. Słowianie w historiografii niemieckiej XIX w. S. 157–158.

[20] Waitz G. Preußen und die erste polnische Theilung // HZ. 1860. Bd. 3. S. 1–15.

[21] Voigt J. Geschichte Preußens. Bd. 5. Königsberg, 1832. S. 394–395, 401–402. Пар.: Burleigh M. The Knights, nationalists and the historians // idem, Ethics and extermination. Reflections on Nazi genocide. Cambridge, 1997. P. 13–14. Дэталёвае даследаванне поглядаў Ё. Фойгта гл.: Potworski E. Johannes Voigt i początki nowoczesnej historiografii Grunwaldu // SG. T. 3. Olsztyn, 1994. S. 33–59.

[22] Treitschke H. Das deutsche Ordensland Preußen // Preußische Jahrbücher. Bd. 10 (1862). Hf. 1. S. 95–151.

"Генрых фон Плаўэн" (1881). У названым эсэ сцвярджалася, што каб зразумець сутнасць прускага народа і дзяржавы, неабходна ўвайсці ў тую "бязлітасную расавую барацьбу", якую Нямецкі ордэн вёў з варварскімі ці паўварварскімі народамі прусаў, літоўцаў і палякаў. Заваяванне і анямечванне Прусіі для яго – акт бясспрэчна прагрэсіўны, а Прусія – "магічная" зямля, бо яна "ўгноеная самай высакароднай нямецкай крывёю ў барацьбе за нямецкае імя і самы чысты гатунак чалавецтва". Тэўтонскіх рыцараў і бюргераў ордэнскіх гарадоў Г. Трайчке назваў "разумнымі дзяржаўнымі мужамі з далёкім бачаннем", а вынікі бітвы 1410 г. ахарактарызаваў як "першую вялікую перамогу, атрыманую славянамі над нашым народам", але – з-за здрады рыцарства Кульмскай зямлі[23]. Толькі пасля заняпаду Прусія вярнула, маўляў, парадак у анархію, ратаваўшы свае землі ад славян, рэшта якіх была страчана. Паказальна, што калі берлінскі гісторык пакрытыкаваў рыцараў за жорсткасць, то гэта не спадабалася прыбалтыйскім немцам, якія папракалі аўтара ў тым, што ён дае зброю ў рукі панславістаў[24].

Вядомы сваімі агрэсіўнымі расісцкімі пастулатамі Г. Трайчке звязваў у адну лінію развіцця мінулае Ордэна, гісторыю Прускага каралеўства і падзелы Рэчы Паспалітай, а сярэднявечныя перасяленні немцаў на ўсход выдаваў за ўзор для сучаснікаў. І такі вобраз Тэўтонскага ордэна, а таксама нямецкага "націску на ўсход", з якім цяпер трывала атаесамляўся Ордэн, знаходзіў усё большае прызнанне ў тагачасным нямецкім грамадстве[25].

Абвяшчэнне Германскай імперыі ў пачатку 1871 г. толькі абвастрыла нямецка-польскі антаганізм. Канцлер Бісмарк адкрыта гаварыў пра пераемнасць новай нямецкай дзяржавы з традыцыямі Ордэна, праводзячы паралелі паміж барацьбой рыцараў з палякамі ў Сярэднявеччы і актуальнай палітычнай сітуацыяй[26]. Рэакцыяй на аб'яднанне і ўмацаванне Нямеччыны быў патрыятычны ўздым палякаў, які, у сваю чаргу, выклікаў адваротную рэакцыю немцаў, асабліва ў Прусіі. Рэстаўрацыя ордэнскага замка ў Мальбарку і ўзвядзенне помніка Фрыдрыху II Вялікаму перад Мальбаркам у 1872 г., цокальнымі фігурамі якога

[23] Тамсама. S. 96, 134.
[24] Пар.: Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 52.
[25] Wippermann W. Der Ordensstaat als Ideologie. S. 372–373; idem, Der "deutsche Drang nach Osten"... S. 93–94.
[26] Ekdahl S. Tannenberg / Grunwald – ein politisches Symbol in Deutschland und Polen // Deutscher Orden 1190–1990. Hg. von U. Arnold. Lüneburg, 1997. S. 260.

сталі чатыры вялікія магістры Ордэна, выразна сімвалізавала, што ідэалагізаванае мінулае Прусіі рабілася агульнанямецкай традыцыяй і прыстасоўвалася да актуальных палітычных патрэбаў[27]. Паказальна, што Пангерманскі саюз (*Alldeutscher Verband*), утвораны ў 1890 г., у культываванні нямецкага патрыятызму актыўна апеляваў да "націску на Усход" як да гістарычнага подзвігу немцаў. Напрыклад, ужо праз некалькі гадоў пасля заснавання гэтай шавіністычнай арганізацыі ў яе афіцыйным органе пісалася: "Стары *Drang nach Osten* павінен быць узноўлены"[28].

У атмасферы канфрантацыі з нацыяналізмамі славянскіх народаў з'яўляліся трактаты, у якіх выказвалася ідэя здабыцця земляў ва Усходняй ці Паўднёва-Усходняй Еўропе. Напрыклад, паслядоўнік ідэй Г. Трайчке палітык Эрнст Гасэ пісаў, што нямецкі народ сваёй каланізацыяй паставіць "памежныя слупы" на Усходзе і Паўднёвым Усходзе Еўропы, ды нават выказваўся аб мэтазгоднасці забраць балтыйскія і польскія землі ў Расійскай імперыі[29]. Навукова-папулярная кніга Аляксандра Вэбэра паказвала нямецкія "перасяленні на ўсход" як змену прыліваў і адліваў, што расцягнуліся на тысячагоддзе: спачатку назіраўся "славянскі прыліў" на "германскіх" землях, потым, у Сярэднявеччы, "узнавіўся" рух немцаў ва ўсходнім кірунку, але параза пад Танэнбергам у 1410 г. "паклала знешнюю мяжу нямецкаму націску на ўсход"[30]. Такія нямецкія гісторыкі, як К. Лампрэхт, Э. Серафім і Г. Эрнст, таксама разглядалі сярэднявечны рух немцаў на Усход як праяву тысячагадовага чаргавання "адліваў і прыліваў" народаў, у якім немцы, захопленыя парывам, рухаліся туды, каб выцесніць славян[31].

За выразам *Drang nach Osten*, які ў нямецкіх выданнях выкарыстоўваўся яшчэ не часта (з даследаванняў Г. Мэера і В. Віпэрмана вынікае, што да 1914 г. у дзясяткі разоў радзей, чым у публікацы-

[27] Arnold U. Die Marienburg als politisches Symbol in Deutschland in der ersten Hälfte des 20. Jahrhunderts // Praeterita Posteritati. Studia z historii sztuki i kultury ofiarowane M. Kilarskiemu. Red. M. Mierzwiński. Malbork, 2001. S. 34–35.

[28] Hering R. Konstruierte Nation. Der Alldeutsche Verband 1890 bis 1939. Hamburg, 2003. S. 121.

[29] Wippermann W. Der Ostsiedlung in der deutschen Historiographie und Publizistik. S. 65; Thörner K. "Der ganze Südosten ist unser Hinterland". Deutsche Südosteuropapläne von 1840 bis 1945. Freiburg, 2008. S. 179.

[30] Wäber A. Preußen und Polen. Der Verlauf und Ausgang eines zweitausendjährigen Völkergrenzstreites und deutsch-slavischer Wechselbeziehungen. München, 1907. Цыт. па: Wippermann W. Der "deutsche Drang nach Osten". S. 98–99.

[31] Wippermann W. Der "deutsche Drang nach Osten". S. 138.

ях на славянскіх мовах) і без выразнай канцэпцыі, нямецкія аўтары імкнуліся замацаваць пазітыўны сэнс замест адмоўнага, якім надзялялі "нямецкі націск" славяне. У немцаў ён меў галоўным чынам антыпольскія канатацыі і выконваў абарончую функцыю – не дапусціць "другога Танэнберга"[32]. Праўда, большасць нямецкага насельніцтва кайзераўскай Германіі не хвалявалі ні канфлікты са славянамі, ні агітацыя пангерманістаў. А немцы ў Аўстра-Венгрыі, жывучы побач са славянамі, адчувалі страх перад панславізмам, таму калі і ведалі тэрмін "Дранг нах Остэн", то ўспрымалі яго як зброю з арсенала іх ворагаў. Затое ў свеце ўсё шырэй і на ўсё больш сур'ёзным узроўні слоган "Дранг нах Остэн" атаесамляўся з палітыкай Нямеччыны і немцамі наогул. Своеасаблівай кульмінацыяй гэтага працэсу ў той перыяд стала I сусветная вайна, якая суправаджалася славяна-германскім ідэалагічна-прапагандысцкім супрацьстаяннем і з абодвух бакоў узняла хвалю небывалай нацыяналістычна-патрыятычнай эйфарыі. Невыпадкова ў працах вядомага чэшскага філосафа будучага прэзідэнта Чэхаславакіі Тамаша Масарыка і брытанскага гісторыка Роберта Сэтан-Вэтсана (Seton-Watson), апублікаваных у ваенныя гады, *Drang nach Osten* фігураваў як рэальная гістарычная з'ява. Такі ж погляд пашырыўся таксама сярод элітаў іншых дзяржаў Антанты, у т. л. у Францыі і ЗША[33], не кажучы пра Польшчу і Расію, да якіх асобна звернемся ніжэй.

Сама бітва 1410 г. са зразумелых прычынаў не карысталася вялікай папулярнасцю сярод немцаў. Тым не менш яна не заставалася па-за ўвагай грамадскасці Усходняй Прусіі. На мяжы XIX і XX ст. мясцовая нямецкая прэса, што з піетэтам пісала пра Тэўтонскі ордэн, характарызавала Танэнберг як месца "найбольшай паразы рыцараў Ордэна, але таксама і найбольшай іх славы"[34]. У 1901 г. на полі сечы быў узведзены помнік вялікаму магістру Ульрыху фон Юнгінгену[35]. А ў 1910 г. усходнепруская нямецкая грамадскасць зладзіла сваю ўрачыстасць з нагоды 500-годдзя бітвы пад Танэнбергам, якая ўспрымала-

[32] Ibidem. S. 136–137; idem, Der Ordensstaat als Ideologie. S. 373.

[33] Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 110, 117–119.

[34] Traba R. Grunwald (Tannenberg) w niemieckiej publicystyce prowincji Prusy Wschodnie na przełomie XIX i XX w. // SG. T. II. Olsztyn, 1992. S. 56.

[35] Гэта быў вялікі гранітны блок, надпіс на якім паведамляў: "У барацьбе за нямецкую справу і нямецкае права тут 15 ліпеня 1410 г. геройскаю смерцю палёг вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген". Гл.: Conrad G. Der Gedenkstein für den auf dem Schlachtfelde von Tannenberg gefallenen Hochmeister Ulrich von Jungingen // Oberländische Geschichtsblätter. Hf. 5. Königsberg 1903. S. 100–103.

ся ў кантэксце актуальнага польска-нямецкага супрацьстаяння. Да згаданага помніка былі ўскладзены вянкі, а ў Астродзе адбыўся святочны сход з дакладам пра значэнне бітвы 1410 г. для нямецкасці на Усходзе, а таксама народнае веча, на якім гаварылася пра адвагу ордэнскіх рыцараў ды актуальнасць іх справы[36]. Мінімалізуючы гістарычнае значэнне бітвы, прускія публіцысты і гісторыкі падкрэслівалі жывучасць Ордэна і трываласць нямецкага народа, які здолеў адбудаваць дзяржаву.

Першая сусветная вайна актуалізавала памяць пра мужных сярэднявечных рыцараў, пра Тэўтонскі ордэн, які ў нямецкай гістарычнай і грамадска-палітычнай думцы ўжо з другой паловы XIX ст. лічыўся бастыёнам, выстаўленым супраць "славянскага патопу", а Мальбарк – нацыянальным сімвалам Прусіі. Сведчаннем неабыякавасці немцаў да бітвы 1410 г., якая выклікала амбівалентныя пачуцці, стала перайменаванне перамогі над расійскай арміяй, атрыманай Паўлем фон Гіндэнбургам 26–30 жніўня 1914 г. над Мазурскімі азёрамі (Усходняя Прусія), у "Танэнбергскую бітву"[37]. Праўда, сімвалічная сувязь названых дзвюх бітваў аказалася досыць штучнай. Невыпадкова начальнік штаба нямецкай арміі на ўсходнім фронце Эрых Людэндорф, які прыпісваў сабе ініцыятыву прысваення гістарычнай назвы гэтаму разгрому расійскага войска, у якасці даўніх праціўнікаў, што перамаглі Нямецкі ордэн, называў толькі літоўцаў і палякаў[38]. Даследчыкі небеспадстаўна бачаць у факце гэтага найменавання ідэю рэваншу за паразу ў бітве 1410 г., якую палякі ўжо ўзносілі як свой нацыянальны сімвал. Нямецкае камандаванне імкнулася напоўніць старую назву пазітыўным зместам і прынамсі часткова дасягнула такой мэты: "Танэнберг" як месца памяці атрымаў новую сімвалічную канатацыю[39].

[36] Traba R. Grunwald (Tannenberg) w niemieckiej publicystyce… S. 59.

[37] Падрабязней гл.: Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg 1410. S. 15–16; Hoegen J. Der Held von Tannenberg: Genese und Funktion des Hindenburg-Mythos. Köln, 2007; Арнольд У. Танэнберг / Грунвальд як палітычны сімвал у XIX–XX ст. С. 53–54.

[38] Гл.: Людендорф Э. Мои воспоминания о войне 1914–1918 гг. Минск, 2005. С. 60: «Па маёй прапанове гэтая бітва была названа "бітвай пры Танэнбергу" ў памяць таго боя, у якім Тэўтонскі ордэн быў разбіты саюзнымі літоўскай і польскай арміямі. Няўжо германцы дапусцяць, каб літоўцы і асабліва палякі нас адужалі? Няўжо векавая германская культура павінна загінуць?».

[39] Schenk F. B. Tannenberg / Grunwald // Deutsche Erinnerungsorte. Hg. von F. Etienne und H. Schulze. Bd. I. München, 2001. S. 446.

## 3.2 Нараджэнне польскага культу Грунвальда

*У XIX стагоддзе славяне і германцы ўваходзілі пад лозунгам братэрства народаў, а ў XX – пад лозунгам нястрымнай варожасці.*

Герард Лябуда[40]

Да пачатку XIX ст. памяць пра Грунвальдскую бітву і ў польскім грамадстве займала маргінальнае месца. Яе паступовая актывізацыя была абумоўлена зменай палітычнай сітуацыі – падзеламі Рэчы Паспалітай. Ва ўмовах страчанай дзяржаўнасці польскія эліты імкнуліся апавяданнямі пра гераічныя подзвігі продкаў будзіць патрыятызм і мабілізоўваць суайчыннікаў вакол нацыянальных інтарэсаў. Падобнае абуджэнне памяці пра Грунвальд у Польшчы сучасны нямецкі гісторык Г.-Ю. Бёмельбург лічыць праявай параўнальна тых жа рамантычных тэндэнцый, якія былі характэрны і для тагачаснай Прусіі[41].

Адным з першых да паўзабытай бітвы звярнуўся Юльян Урсын Нямцэвіч у сваіх "гістарычных спевах", апублікаваных у 1816 г. Па словах аўтара, ён пісаў іх па замове Каралеўскага таварыства, каб уславіць найлепшыя "чыны і перамогі польскіх каралёў і ваяўнікоў", патрэбныя як прыклад для моладзі[42]. Асобны спеў "Бітва пад Грунвальдам з крыжакамі" аўтар завяршыў услаўленнем дня перамогі, выказваючы веру, што "нічога не згладзіць памяць пра той дзень"[43]. Адам Міцкевіч, хоць і не звяртаўся да самой бітвы 1410 г., вобраз крыжака вытрымаў у дужа цёмных фарбах. У паэмах "Гражына" і "Конрад Валенрод" паэт прыпісаў рыцарам, мякка кажучы, антырыцарскія

[40] Labuda G. Słowianie w historiografii niemieckiej XIX w. // idem, Polsko-niemieckie rozmowy o przeszłości. Zbiór rozpraw i artykułów. Poznań, 1996. S. 158.

[41] Bömelburg H.-J. Vergessen neben Erinnern. S. 53–55.

[42] Niemcewicz J. U. Śpiewy historyczne. Warszawa, 1816. S. 5–7.

[43] Ibidem. S. 108. Варта дадаць, што некаторыя іншыя бітвы аўтар лічыў важнейшымі за Грунвальдскую. Так, апяваючы бітву 1621 г. пад Хацінам, ён адзначыў, што яшчэ "ніколі Айчына не была ў большай, чым тады, небяспецы" і што ў тым сутыкненні з туркамі вырашалася пытанне "незалежнасці або вечнай няволі".

якасці: "крыжацкі гад" драпежны, бязлітасны забойца, прагны да панавання, схільны ўціскаць слабейшых і да т. п.[44]. Да ўтварэння стэрэатыпа варожага "крыжака" спрычыніўся і Юльюш Славацкі. У яго драме "Міндоўг" (1832) рыцар паўстае ў іпастасі "прагнай пачвары, ніколі не сытай", што прымае аблічча то грэшніка, то святой асобы[45], а ў "Завішы Чорным" (1845) слаўны рыцар як увасабленне польскага нацыянальнага духу ўдзельнічае ў Грунвальдскай бітве – звышчалавечым сутыкнені, у якім дабро трыумфуе над злом.

Аднак польская гістарыяграфія першай паловы XIX ст. яшчэ не аддавала бітве пад Грунвальдам асаблівай увагі, а калі пра яе і пісалася, то ў спакойных танах. Без пафасу і ўслаўленняў, як адзін з этапаў у войнах з Тэўтонскім ордэнам апісаў яе ў сваёй шматтамовай "Гісторыі літоўскага народа" і Тэадор Нарбут[46]. У тыя часы гісторыкі ахвотней і пафасней маглі апавядаць, напрыклад, пра бітву пад Плоўцамі, больш услаўляючы яе[47], чым перамогу над Ордэнам. Гэта тлумачыцца тым, што ў польскім грамадстве тады яшчэ не функцыянавала варожасць да Прусіі. У тагачаснай палітычнай публіцыстыцы акцэнтаваліся і пазітыўныя якасці немцаў. Напрыклад, у 1849 г. адзін з аўтараў газеты "Demokrat Polski", быццам у адказ на спробу паслоў нямецкага парламента ў Франкфурце асудзіць падзелы Рэчы Паспалітай і падтрымаць аднаўленне незалежнай Польшчы, напісаў, што "рэспубліканская Нямеччына – гэта натуральны непрыяцель царскага масквіціна, гэта наш вечны саюзнік супраць яго", і называў пры гэтым немцаў "народам, што спакойна суседнічае з намі", "увасабляе салідарнае братэрства народаў"[48].

Як паказаў Г. Лябуда, нацыянальны антаганізм у славяна-германскія адносіны ўнесла Вясна народаў, пасля якой мір-

[44] Гл.: Mickiewicz A. Grażyna. Warszawa, 1922. S. 6 і наст.; idem, Konrad Walenrod. Warszawa, 1916. S. 34, 63f.

[45] Падрабязна гл.: Krasuski J. Niemcy w twórczości Słowackiego // PZ. 1976. Nr. 3. S. 1–31.

[46] Narbutt T. Dzieje narodu litewskiego. T. VI. Wilno, 1939. S. 236–252.

[47] Kasparek N. O bitwie pod Grunwaldem w pierwszej połowie XIX w. // Krajobraz grunwaldzki w dziejach polsko-krzyżackich i polsko-niemieckich na przestrzeni wieków. Wokół mitów i rzeczywistości. Red. J. Gancewskiego. Olsztyn, 2009. S. 154 і наст.

[48] Цыт. па: Trzeciakowski L. Kształtowanie się obrazu Niemca w polskiej opinii publicznej w okresie rozbiorów // Śląski Kwartalnik Historyczny Sobótka. R. XXXIII (1978). S. 134.

нае суіснаванне славян з немцамі пад адной уладай не ўяўлялася магчымым[49]. Абуджэнне нацыяналізмаў і захапленне гісторыяй, у якой эліты пачалі шукаць вытлумачэнне праблем сучаснасці, а галоўнае – паскораны працэс фармавання нацыянальнай свядомасці насельніцтва Прускага каралеўства і Аўстрыі, – усё гэта стала глебай, што нараджала ўзаемныя крыўды і абвінавачванні. Адных пужала перспектыва германізацыі, а другіх – прывід паславізму. Менавіта славянскія ідэолагі са страху перад нямецкай пагрозай увялі ва ўжытак паняцце "нямецкага націску на ўсход" (*Drang nach Osten*). Прыкладна ў той самы час, калі гэты слоган з'явіўся ў маніфесце славака Л. Штура, у 1849 г. у сваёй берлінскай брашуры яго ўжыў польскі публіцыст віленскага паходжання Юльян Клячко[50]. Апошні пратэставаў супраць "нямецкага націску", маючы на ўвазе планы прускага ўрада і Нямецкага нацыянальнага сходу ў Франкфурце ўключыць большую частку Вялікага Пазнаньскага княства ў нямецкую нацыянальную дзяржаву.

Для разумення хуткага пашырэння і фенаменальнай жывучасці стэрэатыпнай формулы *Drang nach Osten* важна ўлічваць, што яна ад самага свайго з'яўлення функцыянавала адначасова ў дзвюх іпастасях: як негатыўны гетэрастэрэатып (азначэнне нямецкай экспансіі славянамі) і як пазітыўны нямецкі аўтастэрэатып[51]. Калі з пункту гледжання немцаў перасяленні на ўсходнія землі лічыліся натуральным гістарычным працэсам, з якім не звязвалася нічога негатыўнага, то славянскія аўтары ўжо з сярэдзіны XIX ст. бачылі ў ім агрэсію і заклікалі да абароны ад нямецкага "націску". У супрацьстаянні нацыяналізмаў лідары славянскіх нацыянальных рухаў падкрэслівалі прыродны антаганізм з немцамі, развіваючы тэзіс пра іх агрэсіўнасць у дачыненні да спакойных славян, выказаны раней Гердэрам. Пад яго ўплывам апазіцыя да немцаў і Захаду ў цэлым стала адной з цэнтральных ідэй канструявання ўяўленняў

[49] Labuda G. Słowianie w historiografii niemieckiej XIX w. // idem, Polsko-niemieckie rozmowy o przeszłości. Zbiór rozpraw i artykułów. Poznań, 1996. S. 146.

[50] Krasuski J. Wyznaczniki biegu historii. Wrocław, 2008. S. 301. Пар.: Patecka-Frauenfelder A. Stereotyp "Drang nach Osten" w prasie narodowej na przykładzie tygodnika "Myśl Polska" / "Nowa Myśl Polska" (1989–2003). Toruń, 2010. S. 39.

[51] Hahn H. H., Hahn E. Nationale Stereotypen... Oldenborg, 2002. S. 28.

пра славянства[52]. Атрымлівалася, што немцы цягам усёй гісторыі былі імперыялістычнымі, заўжды імкнуліся да заваявання славян, якія, у процілегласць да індывідуалістычных і агрэсіўных немцаў, рэкламаваліся як увасабленне міралюбства, братэрства і падаваліся як ахвяры знешняй агрэсіі. Для доказу агрэсіўнасці немцаў звычайна і прыводзіўся выраз *Drang nach Osten*. Яшчэ малавядомы ў нямецкім грамадстве, гэты тэрмін пачаў уваходзіць у шырокі ўжытак у заходніх і паўднёвых славян і выклікаў адпаведныя асацыяцыі.

У стаўленні да Грунвальдскай бітвы важныя змены заўважаюцца з публікацый львоўскага гісторыка Караля Шайнохі. Ужо ў працы пра часы Ягайлы, напісанай у 1850-я г., ён паказаў вайну з крыжакамі як барацьбу "славяншчыны" з "тэўтанізмам", якія сімвалізавалі, адпаведна, дабро і зло. Тэўтонскі ордэн увасабляў для яго "хвалю старадаўняга націску тэўтанізму", які пагражаў захапіць землі ажно за Дзвіну і Дняпро, так што дзякуючы перамозе 1410 г. "усё прыбалтыйскае славянства свабодна ўздыхнула"[53]. Разважаючы пра тэўтанізм, К. Шайноха згадаў і нямецкі "націск на ўсход", якім немцы тлумачаць сваю палітыку, каторая, маўляў "была і ёсць"[54]. Ад той пары, адзначыў Герард Лябуда[55], тон падобнага антаганізму ў адносінах да немцаў пачаў пастаянна паўтарацца ў польскай гістарыяграфіі. Пісьменнік і гісторык Юзаф Ігнацы Крашэўскі ўжо залічваў немцаў да найбольшых ворагаў польскага народа[56]. Ацэнкі Берліна і Прусіі, пакінутыя ім у 1860-я г., да здзіўлення нядобразычлівыя і тэндэнцыйныя[57]. Пазней пісьменнік аддаў даніну і Грунвальду, напісаўшы ў 1883 г. раман "Крыжакі 1410".

[52] Пар.: Гланц Т. Изобретение Славии. О роли *путешествия* для формирования "славянской идеи" // Inventing Slavia = Изобретение Славии / ed. T. Glanc, H. Meyer, Е. Вельмезова. Prague, 2005. S. 12–13.

[53] Szajnocha K. Jadwiga i Jagiełło, 1374–1413: Opowiadania historyczne. Warszawa, 1974. T. 1–2. S. 343–344, 400; T. 3–4. S. 472.

[54] Szajnocha K. Op. cit. T. 1–2. S. 354.

[55] Labuda G. Historiograficzna analiza tzw. niemieckiego "Naporu na Wschód" // Wschodnia ekspansja niemiec w Europe Środkowej. Poznań, 1963. S. 47.

[56] "Страшнейшага за немца непрыяцеля, нават калі быў прыяцелем, мы не мелі", – пісаў Ю. І. Крашэўскі. Цыт. па: Bartkiewicz K., Banyskiewicz J. Z dziejów myśli o polskich ziemiach zachodnich. Od Długosza do Parczewskiego. Zielona Góra, 1985. S. 77.

[57] Szarota T. Berlin w oczach Polaków – przyczynek do stereotypu Niemca // Mity i stereotypy w dziejach Polski. Red. J. Tazbir. Warszawa, 1991. S. 136–141.

Папярэджанні К. Шайнохі і яго паслядоўнікаў пра нямецкую небяспеку выконвалі тую ж функцыю, што і трывожныя галасы нямецкіх гісторыкаў і публіцыстаў аб пагрозах панславізму. У іх праяўлялася ўспрыманне спецыфічнай палітычнай сітуацыі, якая будзіла страхі і патрабавала пошуку легітымацыі ў мінулым для кожнага з бакоў. Абодва стэрэатыпы ("Дранг нах Остэн" і "панславізм") абумоўлівала ўстаноўка на абарону ад знешняй небяспекі, і ў той жа час яны былі рэакцыяй адзін на аднаго[58].

Пасля аб'яднання Нямеччыны пад эгідай Прусіі (1871) тэма нямецкай пагрозы ўжо не знікала са старонак польскай публіцыстыкі. Да абвастрэння нацыянальнай канфрантацыі і пагаршэння вобраза немцаў у вачах палякаў спрычынілася ўнутраная палітыка Бісмарка, скіраваная на дыскрымінацыю польскай меншасці ў кайзераўскай Германіі. Антыкаталіцкія і антыпольскія дэкрэты (т. зв. *Kulturkampf*, 1872–1878 г.), якімі канцлер імкнуўся зменшыць уплыў каталіцызму на культуру і асвету ў цэлай імперыі, толькі абвастрылі нацыянальны антаганізм. З-за гаспадарчай дыскрымінацыі польскага насельніцтва ў Прусіі ў радыкальную апазіцыю да ўрада станавіліся нават польскія сяляне, і канфлікт рабіўся глыбока ідэалагічным[59]. Для ўспрымання Прусіі палякамі важнае значэнне мела тое, што канцлер Бісмарк, як адзначалася ў папярэднім раздзеле, публічна праводзіў паралелі паміж барацьбой тэўтонскіх рыцараў і палітычнай сітуацыяй яго часу[60]. У вачах польскага насельніцтва імперыя Бісмарка пры такіх аналогіях атаесамлялася з Тэўтонскім ордэнам. Пры гэтым у палякаў фармавалася перакананне, што варожа да іх ставіцца не толькі ўрад, а ўсё нямецкае грамадства.

Калі польскія грамадскія эліты глядзелі на Нямеччыну як на пагрозу – фактычную або патэнцыйную, – то гісторыкі імкнуліся абгрунтоўваць такі погляд фактамі з мінулага. Невыпадкова ў 1873–1878 г. у Польшчы ўпершыню была выдадзена хроніка Длугаша, прасякнутая антынямецкай настро-

[58] Пар.: Wippermann W. Der "deutsche Drang nach Osten". S. 49; Hahn H. H., Hahn E. Nationale Stereotypen. S. 27.

[59] Tkaczynski J. W. Der "Drang nach Osten": Mythos und Realität eines Schlagwortes // ZfG. Jg. 45 (1995). Hf. 1. S. 16.

[60] Ekdahl S. Tannenberg / Grunwald – ein politisches Symbol in Deutschland und Polen // Journal of Baltic Studies. Vol. XXII. Nr. 4. P. 280–281.

енасцю. У гістарычным дыскурсе вызначылася тэндэнцыя канцэнтрацыі ўвагі на канфліктах з немцамі, на дэманстраванні сведчанняў таго, што немцы пастаянна варагавалі з палякамі, што варожасць у іх нацыянальным характары[61]. З сярэдзіны 1880-х г., ва ўмовах далейшага абвастрэння нацыянальнай напругі, стэрэатыпізацыя немцаў пайшла ў выключна адмоўным накірунку[62]. Апісанні Берліна, пакінутыя польскай інтэлігенцыяй у канцы XIX – пачатку XX ст., уражваюць перавагай адмоўных ацэнак і нядобразычлівасцю да гаспадароў[63]. Напрыклад, Войцех Косак, прыдворны мастак імператара Вільгельма II, які ў канцы XIX ст. доўгі час жыў у Берліне, маючы там дастаткова прыяцеляў і адчуваючы іх прыязнасць, з-за ўзмацнення германізацыі парваў з імператарам і пакінуў прускую сталіцу. Як сам прызнаваўся, прычынай яго адмоўнага стаўлення да немцаў стала "тая самая адвечная крыжацкая сістэма прыцяснення палякаў..."[64]. З-за дамінавання Прусіі ў II Райху многія лічылі, што антыпольскія пазіцыі прынялі ўсе немцы імперыі, і баяліся, што польская ідэнтычнасць будзе далей прыгнятацца[65]. Канфлікт, што разгарэўся на польскіх землях пад прускай уладай, самым адмоўным чынам паўплываў на адносіны паміж немцамі і палякамі як нацыямі, і польска-нямецкі антаганізм у выніку з лакальнага перарос у агульны. Не дзіўна, што пры падобным ідэйна-палітычным клімаце польская энцыклапедыя ўпершыню змясціла артыкул пра нямецкі *Drang nach Osten* і прэзентавала яго як "нацiск немцаў на ўсход з мэтай дэнацыяналізацыі польскага народа"[66].

Калі ўзнікае неабходнасць ва ўмацаванні калектыўнай ідэнтычнасці, то эліты звычайна звяртаюцца да прыкладаў

[61] Pasierb B. Niemcy w polskiej myśli politycznej (1870–1970) // Z badań nad dziejami stosunków polsko-niemieckich. Pod red. A. Czubińskiego i R. Wryka. Poznań, 1991. S. 113; Wrzesiński W. Sąsiad. Czy wróg? Ze studiów nad kształtowaniem obrazu Niemca w Polsce w latach 1795–1939. Wrocław, 2007. S. 737–738.

[62] Wajda K. Obraz Niemców w publicystyce polskiej lat 1871–1914 // Wokół stereotypów Niemców i Polaków / Pod red. W. Wrzesińskiego. Wrocław, 1993. S. 139–140.

[63] Szarota T. Berlin w oczach Polaków ... S. 125–184.

[64] Ibidem. S. 157.

[65] Wrzesiński W. Sąsiad. Czy wróg? S. 339, 736.

[66] Polska Encyklopedia Powszechna. Warszawa, 1896. T. 2. S. 333. Пар.: Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 90.

мінулай славы. У палякаў у той сітуацыі веру ў свае сілы і маральную перавагу над праціўнікам пачала ўмацоўваць Грунвальдская бітва. Вялікую цікавасць да падзеі ў насельніцтва ўсёй Польшчы абудзіла манументальная карціна Яна Матэйкі "Бітва пад Грунвальдам", што была выстаўлена ў Кракаве ў 1878 г. і адразу стала славутай[67]. Але больш за ўсіх да пашырэння памяці пра Грунвальд прычыніўся Генрык Сянкевіч з гістарычным раманам "Крыжакі"[68]. Праз падзеі і рэчаіснасць сярэднявечнай эпохі пісьменнік па-мастацку перадаў актуальныя трывогі і палітычныя ідэі свайго часу. У прыватнасці, вытокі падзелаў Рэчы Паспалітай ён звязваў з дзеяннямі Тэўтонскага ордэна, а ў бітве 1410 г. бачыў падзею, якая спыніла германізацыю палякаў. Характэрна, што падставовымі гістарычнымі крыніцамі для працы над "Крыжакамі" паслужыла хроніка Длугаша і цытаваны вышэй твор Шайнохі[69]. Апублікаваны кнігай у 1900 г., раман Г. Сянкевіча надаў канфрантацыі з немцамі эмацыйнае перажыванне і зрабіў бітву пад Грунвальдам тым сімвалам, з якім звязваліся надзеі палякаў на адраджэнне, а заадно і глыбока адмоўнае стаўленне да немцаў-крыжакоў.

Калі ўлічыць, што на творах К. Шайнохі, Ю. Крашэўскага і асабліва на "Крыжаках" Г. Сянкевіча, у якіх тэўтонскія рыцары сталі вобразам агрэсіўных немцаў, выраслі пакаленні палякаў, то можна ўявіць, наколькі шырока і глыбока зафункцыянаваў у свядомасці польскага грамадства вобраз Нямеччыны як увасаблення зла. У польскай публіцыстыцы пачатку XX ст. сцвердзіўся выключна адмоўны вобраз немцаў, асабліва прусакоў. Ім прыпісвалася "бязмежная пыха", "д'ябальская злосць", "крывадушнасць", "хлуслівасць" і шэраг іншых найгоршых якасцяў. Сцвярджалася таксама, што немцам уласціва "прыроджаная подласць" і што да іх нельга даверліва ставіцца, бо яны, маўляў, злом адказваюць на польскае дабро[70]. Польская прэса нацыянальна-дэмакратычнага лагера ў той час пачала падаваць канфрантацыю з немцамі як тыся-

[67] Niewiadomski E. Malarstwo polskie XIX i XX wieku. Warszawa, 1926. S. 136–138.

[68] Пра ідэалогію рамана Г. Сянкевіча і яго значэнне гл.: Bujnicki T. Sienkiewicz i historia. Studia. Warszawa, 1981. S. 24–26, 210–211. Пар.: Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg. S. 17–18, спас. 10.

[69] Kosman M. Na tropach bohaterów "Krzyżaków". Warszawa, 1995. S. 17.

[70] Wrzesiński W. Sąsiad. Czy wróg? S. 293, 295, 348, 353–355.

чагадовую барацьбу двух варожых светаў – германскага і славянскага, і кожны немец ужо ўспрымаўся як "частка нямецкай навалы, што насоўваецца на Усход"[71]. У такім ідэйна-палітычным клімаце палякі захапляліся Грунвальдскай бітвай, якая дзякуючы таленавітаму твору Г. Сянкевіча ўвайшла ў калектыўную свядомасць народа як нацыянальны сімвал перамогі над агрэсіўнымі немцамі.

Культавае значэнне названай бітвы для палякаў засведчыў 1910 год, абвешчаны "годам Грунвальда", калі прайшлі масавыя святкаванні 500-годдзя славутай перамогі[72]. Юбілей стаў добрай аказіяй для далейшай палітызацыі даўняй бітвы. Сучасныя немцы атаесамляліся з "крыжакамі", падкрэслівалася нязменнасць іх агрэсіўнага стаўлення да палякаў пачынаючы ад германскіх плямёнаў, такім чынам пастуляваўся польска-нямецкі канфлікт працягласцю ў тысячагоддзе. З нагоды адкрыцця помніка Ягайлу ў Кракаве разгром рыцараў пад Грунвальдам падаваўся як выратаванне палякаў ад палітычнага і культурнага знішчэння, а таксама выказвалася ідэя, што перамога над Ордэнам была трыумфам абарончай вайны славян супраць "нямецкага *Drang nach Osten*" і што толькі славянскае адзінства гарантуе "сілу і будучыню славянскай расы"[73]. Больш за тое: у супрацьстаянні з германізмам сярэднявечная Польшча, сцвярджаў гісторык Фелікс Канечны, увасабляла сутнасць славянства, а ўвесь заходнееўрапейскі свет быў феадальна-імперыялістычны і варожы ёй, таму Вялікую вайну Польшчы з Ордэнам ён трактаваў як барацьбу "не толькі з крыжаком, але і з усёй Еўропай"[74].

Агульнанацыянальная ўрачыстасць з нагоды юбілею Грунвальда ў Польшчы выклікала раздражненне нямецкіх палітыкаў, а таксама нападкі са старонак нацыяналістычнай і кансерватыўнай прэсы. У некаторых нямецкіх выданнях у гэтай

[71] Wajda K. Polski obraz Niemców i niemiecki obraz Polaków w publicystyce obu krajów w latach 1871–1914 // Polacy i Niemcy. Z badań nad kształtowaniem hetereostereotypów etnicznych. Zbiór studiów pod red. K. Wajdy. Toruń, 1991. S. 68–69; idem, Obraz Niemców w publicystyce polskiej lat 1871–1914. S. 149.

[72] Пра юбілейныя ўрачыстасці 1910 г. у многіх гарадах Польшчы гл.: Knyspel-Kopeć R. Grunwald w świadomości społeczeństwa polskiego w drugiej połowie XIX i w XX w. Toruń, 2014. S. 178–195.

[73] Гл.: Pogrom Krzyzaków pod Grunwaldem. Warszawa, 1910; Wieniec Grunwaldzki z r. 1910. Kraków, 1910.

[74] Koneczny F. Teoria Grunwaldu // Przegląd Powszechny. 1910. S. 7–8.

сувязі адзначалася, што палякі беспадстаўна робяць з угодкаў крывавай сечы нацыянальнае свята, бо паміж арміямі, якія сышліся пад Танэнбергам, не было нацыянальнай супярэчнасці, і ні палякі, ні немцы тады яшчэ не разглядалі канфлікт у нацыянальных катэгорыях[75]. Асабліва крытыкаваліся Грунвальдскія ўрачыстасці ў Кракаве, якім іранічна закідалася масавасць і той жа нацыянальны характар: маўляў, палякі выкарысталі аказію дня сярэднявечнай бітвы "для ўмацавання свайго нацыяналістычнага фанатызму"[76].

Польска-нямецкі антаганізм настолькі абвастрыўся, што напярэдадні I сусветнай вайны нават даўняя непрыязнасць да Расіі ў польскім грамадстве, здавалася, была адціснута ў мінулае небывалым ростам германафобіі. Страх перад Нямеччынай своеасабліва выявіўся ў праграмнай кнізе Рамана Дмоўскага, які абвяшчаў пра канец традыцыі антырасійскіх паўстанняў і звяртаўся да Расіі з прапановай аб'яднацца супраць немцаў. Лідар польскіх эндэкаў заключаў, што Польшча павінна вярнуцца да той задачы, якую выконвала дзяржава Пястаў – даць адпор націску немцаў, зрабіць усё, каб Еўропа не была "кіравана з Берліна"[77]. Той факт, што насельніцтва Польскага каралеўства падтрымала ў 1914 г. расійскую мабілізацыю[78], можа сведчыць, наколькі высокім быў градус антынямецкіх настрояў у польскім грамадстве. Хоць Расія традыцыйна лічылася другім ворагам Польшчы, палякі з сімпатыяй праводзілі расійскую армію на нямецкі фронт[79]. Аднак расійскі ўрад да канца існавання імперыі так і не дазволіў палякам аднавіць незалежнасць, чым толькі пацвердзіў дэмагагічны характар усёй панславісцкай агітацыі.

[75] Braun F. Die Unterwerfung des deutschen Ordenslandes durch die Polen im 15. Jh. Zum 500. Gedenktage der Schlacht bei Tannenberg. Berlin 1910. S. 6.

[76] Traba R. Grunwald (Tannenberg) w niemieckiej publicystyce prowincji Prusy Wschodnie na przełomie XIX i XX w. S. 58–59. Пар.: Schenk F. B. Tannenberg / Grunwald. S. 445–446.

[77] Dmowski R. Niemcy, Rosya i kwestya polska. Lwów, 1908. S. 254–255, 271.

[78] Radziwiłłowicz D. Tradycja grunwaldzka w świadomości politycznej społeczeństwa polskiego w latach 1910–1945. Olsztyn, 2003. S. 71.

[79] Krasuski J. Wyznaczniki biegu historii. S. 322.

## 3.3 Панславісцкая легенда пра нямецкую небяспеку ў Расіі

*...Наш враг – это немец! Борьба между славянами и тевтонами неизбежна.*

Генерал М. Скобелеў[80]

У Расіі антынямецкі дыскурс быў ясна вызначаны ў сярэдзіне XIX ст. публікацыямі славянафілаў Канстанціна Аксакава, Аляксея Хамякова, Юрыя Самарына і іншых творцаў антыеўрапейскай ідэалогіі, а затым атрымаў яшчэ больш радыкальныя фармулёўкі ў панславізме, у які трансфармавалася славянафільства[81]. Панславізм і пангерманізм як процілеглыя ідэалогіі і рухі развіваліся ва ўзаемасувязі і чэрпалі патэнцыял з негатыўных ацэнак адзін аднаго[82]. Вызначальнымі этапамі ў развіцці гэтых антаганістычных палітычных плыняў для Нямеччыны і Аўстрыі сталі рэвалюцыя 1848–49 г., а для Расіі – Крымская вайна 1853–56 г. Названыя падзеі актывізавалі ў Аўстрыі і Прусіі размовы пра панславізм і заклікі да нацыянальнай інтэграцыі немцаў, абумоўленыя страхамі перад "славянскім патопам". Паказальна, што і Ф. Энгельс у 1855 г., на фоне прывіду "візантыйска-рускай імперыі", перасцерагаў перад небяспекай панславізму, які з веры ператварыўся ў "страшную палітычную пагрозу", здольную абаперціся на 800 000 штыкоў[83]. Зрэшты,

[80] Оболенская С. В. Образование Германской империи и русское общество // Метаморфозы Европы. Отв. ред. А. О. Чубарьян. Москва, 1993. С. 176.

[81] Пра выдзяленне рэакцыйнага па сваёй сутнасці панславізму з класічнага славянафільства гл.: Walicki A. Rosyjska filozofia i myśl społeczna od oświecenia do marksizmu. Warszawa, 1973. S. 167–172.

[82] Прынята лічыць, што тэрмін "панславізм" узнік у сувязі з абвастрэннем нацыянальнай канфрантацыі ў Аўстрыйскай імперыі і адлюстроўваў страхі перад патэнцыйнай экспансіяй Расіі, а па аналогіі з ім быў утвораны тэрмін "пангерманізм". Гл.: Волков В. К вопросу о происхождении терминов "пангерманизм" и "панславизм" // Славяно-германские культурные связи. Статьи и сообщения. Москва, 1969. С. 41, 53, 68.

[83] Цыт. па: Behrends J. C. Die "sowjetische Ruś" und ihre Brüder // Osteuropa. Jg. 59 (2009). Hf. 12. S. 95.

падобныя чуткі з’яўляліся не на пустым месцы. Напрыклад, дыпламат і паэт Фёдар Цютчаў, які лічыў асноўнай рысай панславізму менавіта антыгерманізм[84], выступіў з утапічным вобразам вялікай Расіі ўжо ў сваіх першых значных публікацыях “Расія і Германія”, “Расія і рэвалюцыя”, выдадзеных у 1840-я г. у Мюнхене і Парыжы, дзе яны выклікалі трывожны рэзананс. У яго незавершаным творы “Расія і Захад” місія Расіі вызначалася як дасягненне сусветнага панавання, найважнейшым этапам якога паэт называў паглынанне Аўстрыі[85]. Праўда, у самой Расіі фантазіі Ф. Цютчава пра вялікую “праваслаўную імперыю Усходу” не атрымалі значнага розгаласу. Затое там падобныя ідэі ўжо выказвалі яго паплечнікі і аднадумцы, напрыклад Міхаіл Пагодзін, які таксама марыў пра расійска-славянскую імперыю ад Камчаткі да Адрыятыкі.

Апрача агульнай антызаходняй настроенасці, выкліканай паразай у Крымскай вайне і паўстаннем 1863–64 г. у Польшчы, Літве і Беларусі, нарастанню антынямецкіх настрояў у Расіі паспрыяла палеміка па т. зв. остзейскім пытанні, якая ўзнікла ў сувязі з падрыхтоўкай ліберальных рэформаў. Спасылаючыся на гістарычныя заслугі ў справе развіцця культуры, шэраг прадстаўнікоў нямецкай эліты Балтыйскага краю (Ю. Экардт, В. Бок, К. Шырэн і інш.) патрабавалі не касаваць прывілеі для рыцарства і гарадскога бюргерства трох остзейскіх правінцый – Ліфляндыі, Эстляндыі і Курляндыі. З мэтай апраўдаць неабходнасць захавання асобнага характару остзейскіх губерняў прыбалтыйскія лібералы выкарыстоўвалі даўнюю ідэю нямецкага “культуртрэгерства”. Сцвярджэнні, што прыбалтыйскія немцы былі і будуць фарпостам нямецкай, а значыць і заходнееўрапейскай культуры ў Расійскай імперыі, паўтараліся тады ў многіх публіцыстычных выданнях і гістарычных трактатах[86]. Адказам на такія дамаганні прыбалтыйскіх немцаў стала вострая рэакцыя нацыяналістычнай інтэлігенцыі Расіі, якая выявіла-

[84] Паэт пісаў, у прыватнасці, што рускі салдат і ўсе заходнія ці паўднёвыя славяне, нават мадзьяры – “все они солидарны между собой по отношению к немцу”. Гл.: Джонг Х.-С. Идея славянского единства в мировоззрении Ф. И. Тютчева // Славянский вопрос: Вехи истории. Москва, 1997. С. 66.

[85] Пар.: Дьяков В. А. Славянский вопрос в общественной жизни дореволюционной России. Москва, 1993. С. 38–39; Павленко О. Панславизм // Славяноведение. 1998. № 6. С. 50–51, 56.

[86] Зутис Я. Очерки по историографии Латвии. Ч. 1: Прибалтийско-немецкая историография. Рига, 1949. С. 156–159, 166–170, 194 і наст.

ся галоўным чынам у публікацыях газеты "Московские ведомости" пад рэдакцыяй Міхаіла Каткова. На старонках названага выдання остзейскіх немцаў з 1864 г. называлі "сепаратыстамі" і абвяшчалі права Расіі на іх русіфікацыю. Калі ў 1865 г. Ягор фон Сіверс, літаратар з нямецка-балтыйскага рыцарскага роду, у звароце да грамадскасці Еўропы папракаў расійскія газеты за тэндэнцыйнасць, адмаўляючы закіды ў остзейскім сепаратызме, і апеляваў да захавання гістарычнай індывідуальнасці прыбалтыйскіх губерняў, то М. С. Сямёнаў у адказ на старонках газеты М. Каткова запатрабаваў хуткай русіфікацыі названых правінцый і заключыў: "Калі палякі пачынаюць гаварыць аб межах 1772 г., а гэтыя немцы паўтараюць пропаведзь пра іх *Drang nach Osten*, то мы з гневам адварочваемся ад іх. Няма і не будзе ў Расіі месца для такіх палякаў і немцаў"[87]. Такім чынам, у 1860-я г. славутае азначэнне "нямецкага націску" ўжо было ў ходу і ў Прыбалтыцы, і гэтага хапіла, каб "Московские ведомости" дэмагагічна выкарыстоўвалі выраз у мэтах палітычнай барацьбы супраць немцаў.

У абарону "дзяржаўных і народных інтарэсаў Расіі супраць нямецкага і польскага правінцыяналізму"[88] ў 1868 г. энергічна выступіў філосаф-публіцыст Юрый Самарын, які ў адносінах да прыбалтыйскіх немцаў займаў такую ж нецярпімую пазіцыю, што і М. Каткоў. У апублікаваным трактаце "Русское Балтийское поморье" ён апраўдваў афіцыйную палітыку русіфікацыі остзейскіх правінцый, а скаргі балтыйскіх немцаў (палеміка была скіравана супраць Я. Сіверса і В. Бока) называў "бессаромнымі паклёпамі і найглыбейшай нянавісцю да Расіі і праваслаўнай царквы". Тры расійскія губерні Балтыйскага краю, сцвярджаў Ю. Самарын, замест таго, каб аддаляцца ад Расіі, павінны прызнаць сваю прыналежнасць да Расійскай імперыі і назаўсёды звязаць сябе з лёсамі апошняй, а не ўяўляць сябе "перадавым умацаваннем Германіі"[89]. Абураючыся, што палітычная агітацыя газет з Балтыйскага краю і звароты ў Берлін ужо настроілі нямецкую грамадскасць на падтрымку балтыйскіх немцаў, Ю. Самарын перасцерагаў перад імкненнем немцаў "захаваць край для Германіі", каб потым давесці спра-

[87] Московские ведомости. 1865. 25 ноября.
[88] Самарин Ю. Ф. Русское Балтийское поморье в настоящую минуту // ён жа. Сочинения. Т. 8: Окраины России. Москва, 1890. С. 9.
[89] Тамсама. С. 17, 23

ву да аб'яднання з метраполіяй[90]. Надзейны спосаб прымацаваць остзейскія правінцыі да Расіі ён бачыў у іх русіфікацыі, пашырэнні праваслаўя і адмене прывілеяў мясцовага рыцарства ды гарадоў[91].

Яшчэ большую хвалю антынямецкіх настрояў у Расіі выклікала тое, што пужала і заходніх славян – аб'яднанне паўднёванямецкіх земляў з Паўночна-нямецкім саюзам і абвяшчэнне ў 1871 г. Германскай імперыі. Райхсканцлеру Бісмарку, вядомаму германізацыяй палякаў, у расійскай публіцыстыцы прыпісваліся і агрэсіўныя антырасійскія планы. На самай справе антынямецкія публікацыі расійскіх панславістаў не адпавядалі рэальнай сітуацыі. Вядома, што Бісмарк, каб зберагчы прыхільнае стаўленне Расіі да нямецкай імперыі, ішоў на падаўленне ўсіх нацыянальных рухаў на падкантрольных тэрыторыях да канца свайго канцлерства (1890) і трымаўся цвёрдага курсу на стабільныя нямецка-расійскія адносіны. Узаемныя сімпатыі дынастый Гагенцолернаў з Раманавымі і іх супольныя інтарэсы вызначыліся намнога раней, яшчэ ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, калі ўзгодненыя пазіцыі адносна Польшчы сталі той "негатыўнай палітыкай" Расіі і Прусіі, якая заставалася фундаментам іх імперскага панавання ў Усходняй Еўропе да І сусветнай вайны[92]. Ды і наогул, знешняя палітыка самой Расіі ў той час была больш экспансіянісцкай, чым нямецкая. Аднак М. Каткоў і іншыя панславісты, не заглыбляючыся ў справу, ставілі пад пытанне салідарнасць манархій у пытаннях знешняй палітыкі і падкрэслівалі варожасць немцаў да славян. Гэта не магло не раздражняць цара Аляксандра II. Як санкт-пецярбургскія, так і берлінскія ўлады спрабавалі стрымаць панславісцкі шавінізм расійскай журналістыкі. Тым не менш М. Каткоў карыстаўся прыхільнасцю ў атачэнні пераемніка трона Аляксандра III і стаў адным з найбольш уплывовых расійскіх журналістаў. Рэдагаваная ім газета "Московские ведомости" спрычынілася да перараджэння інтэлектуальнага славянафільства ў шырокую плынь вялікадзяржаўнага шавінізму,

[90] Тамсама. С. 44–45, 147, 155.

[91] Пар.: Зутис Я. Очерки по историографии Латвии. С. 14–143, 162.

[92] Падрабязней гл.: Zernack K. "Negative Polenpolitik" und deutsch-russische Beziehungen // Deutsch-russische Beziehungen und ihre welthistorischen Dimensionen vom 18. Jahrhundert bis 1917 / Hg. von L. Thomas und D. Wulf. Berlin, 1992. S. 71–72; idem, Niemcy – Polska: z dziejów trudnego diałogu historiograficznego. Poznań, 2006. S. 382–384.

насычанага ідэямі імперскага панславізму[93]. Сцвярджэнні пра нямецкі "Дранг нах Остэн" у публікацыях аўтараў гэтай плыні паступова рабіліся звычайнай з'явай[94].

Акурат у той час Мікалай Данілеўскі, адзін з галоўных ідэолагаў расійскага панславізму, радыкальна сфармуляваў ідэю аб адвечнай, прыроджанай варожасці славян на чале з Расіяй і германа-раманскага свету. У кнізе "Россия и Европа"[95] ён такім чынам выклаў сусветную гісторыю, скарыстаўшы тэорыю культурна-гістарычных тыпаў, што быццам даказваў тэзіс пра "непрымірымую варожасць Еўропы да Расіі". Прыроджанай, натуральнай рысай нацыянальнага характару (!) германа-раманскіх народаў ён назваў агрэсію. З улікам натуральнага антаганізму вайна "аб'яднанай Еўропы" супраць "аб'яднаных славян" уяўлялася М. Данілеўскаму непазбежнай. Маўляў, калі толькі ў Еўропе ўсталюецца раўнавага, то "*Drang nach Osten* не замедлит от слов перейти к делу"[96].

У артыкуле, які дапаўняў названую кнігу і быў напісаны пад уражаннямі нямецка-французскай вайны 1877–78 г., М. Данілеўскі развіў тэму неабходнасці барацьбы Расіі з немцамі. Ён сцвярджаў, між іншага, што "варожасць германскага племені да славян ёсць гістарычнай неабходнасцю", у той час як варожасць раманскіх народаў – толькі гістарычная прымха[97]. Інтарэсы нямецкага народа аб'яўляліся ім "дыяметральна процілеглымі інтарэсам славян" не толькі з-за гістарычнай барацьбы паміж імі, але і з-за "самога нямецкага характару, антыпатычнага для ўсіх народаў, якія ўваходзяць з немцамі ў блізкія адносіны". У кантэксце славяна-нямецкай непрыміры-

[93] Рускі філосаф-заходнік У. Салаўёў называў асяроддзе М. Каткова прадстаўнікамі "псеўдапатрыятычнага абскурантызму", што пакланяюцца "тым нацыянальным аднабаковасцям і гістарычным анамаліям, якія аддаляюць наш народ ад адукаванага чалавецтва". Гл.: Соловьев В. С. Сочинения: в 2 т. Т. 1. Москва, 1989. С. 474, 477.

[94] Пар.: Оболенская С. В. Образование Германской империи и русское общество // Метаморфозы Европы. Отв. ред. А. О. Чубарьян. Москва, 1993. С. 171–173; Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 54, 66–75.

[95] Данилевский Н. Я. Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германо-романскому. Изд. 4. С.-Петербург, 1889. Твор спачатку публікаваўся ў часопісе "Заря" (1869 г.), а ў 1871 г. выйшаў асобнай кнігай.

[96] Тамсама. С. 462.

[97] Данилевский Н. Россия и франко-германская война // Сб. полит. и эконом. статей Н. Я. Данилевского. Изд. Н. Стахова. С.-Петербург, 1890. С. 23–24.

масці аўтар называў "вялікай гістарычнай задачай" для Расіі "вызваленне і злучэнне ўсіх славянскіх народаў". Больш за тое, М. Данілеўскі гаварыў, што адкрытая вайна з немцамі была б "намнога выгадней" для Расіі і "прынесла б вялікую карысць", паколькі "прымусіла б цясней звязаць нашы інтарэсы з інтарэсамі заходніх і паўднёвых славян..."[98].

Кніга М. Данілеўскага "Россия и Европа" была, вядома ж, не навуковым даследаваннем. У сітуацыі, калі абвастрылася славяна-нямецкае супрацьстаянне ў Аўстрыі і мацнела Нямеччына, гэты панславісцкі твор адлюстроўваў, відаць, пераважна страхі і надзеі аўтара ды яго аднадумцаў[99]. Цытаваны вышэй філосаф-заходнік Уладзімір Салаўёў класіфікаваў кнігу М. Данілеўскага як "пакланенне дзікай народнасці" і назваў сур'ёзныя хібы яго тэорыі. Па-першае, яна пярэчыць гістарычнай рэальнасці, бо не ўзгадняецца з агульнавядомымі фактамі, указаў У. Салаўёў. А па-другое, гэта не арыгінальнае вучэнне, бо асноўныя думкі аб культурна-гістарычных тыпах цалкам запазычаны аўтарам з працы нямецкага гісторыка Генрыха Рукерта[100], толькі што ў таго ўсе яны раўнапраўныя, а ў М. Данілеўскага руска-славянскі тып падаецца самым прагрэсіўным[101]. Нягледзячы на гэта, М. Данілеўскі набыў у Расіі незвычайную папулярнасць, а яго кніга стала адной з "біблій" панславістаў.

Тэорыю аб супрацьлегласці рамана-германскага і грэка-славянскага свету, або Еўропы і Расіі, падтрымліваў шэраг іншых вядомых расійскіх інтэлектуалаў, у прыватнасці заснавальнік рускага славяназнаўства Уладзімір Ламанскі. Яшчэ ў 1864 г. ён пісаў, што немцы ў Аўстрыі "як кліны расшчапляюць славянскае цела", і выказваў спадзеў, што калі-небудзь славянскія плыні зліюцца і "затопяць нямецкія, мадзьярскія і румынскія астравы", а руская мова стане мовай усяго славянства[102]. У сваёй дысертацыі пра вывучэнне славян пецярбургскі прафесар таксама даказваў вышэйшасць славянскай расы і гаварыў аб "карэн-

[98] Тамсама. С. 14, 26, 28.

[99] Пар.: Kohn H. Pan-Slavism. Its History and Ideology. New York, 1960. P. 192.

[100] Rückert H. Lehrbuch der Weltgeschichte in organischer Darstellung. Bd. 1. Leipzig, 1857. На гэты плагіят М. Данілеўскага ўказваў пазней у сваёй крытыцы панславізму і М. Пакроўскі. Гл.: Покровский М. Н. Избр. произв. Кн. 4. Москва, 1967. С. 259.

[101] Соловьев В. С. Сочинения. Т. 1. С. 539, 534; 561–588.

[102] Егоров Б. Ф. О национализме и панславизме славянофилов // Славянофильство и современность. Сб. ст. С.-Петербург, 1994. С. 30–32.

ных адрозненнях рэлігійных, грамадзянскіх і палітычных ідэалаў", якія абумовілі антаганізм паміж славянамі і германцамі. Да немцаў У. Ламанскі ставіўся настолькі негатыўна, што нават турэцкае іга лічыў меншым злом, чым падпарадкаванне немцам: яно, маўляў, кампенсавалася "тым дабром, якое Турцыя дала грэка-славянскаму свету, аберагаючы і абараняючы яго ад рамана-германцаў"[103]. Такія погляды вучоны выказваў яшчэ ў сваім курсе, чытаным у сталічным універсітэце, і цяпер яны ўвайшлі ў кнігу, са старонак якой аўтар пужаў чытачоў небяспекай наступальнай вайны кайзераўскай Германіі і Аўстрыі супраць Расіі. Расійскі панславіст нават распісваў план уяўнай кампаніі, вынікам якой будзе "адцясненне" Расіі ад Еўропы, "узнаўленне Польшчы" і стварэнне залежнай ад Аўстра-Венгрыі дзяржавы паміж Дняпром і Дзвіной. Перад такой пагрозай "государство наше не может не готовиться к отражению и отпору", заключаў У. Ламанскі[104].

Сістэмнай памылкай славянафілаў, вынікам іх "тэалагічнага ўзбуджэння" называў такое супрацьпастаўленне славянскай і заходняй цывілізацый, пастаяннае падкрэсліванне апазіцыі "Расія – Захад" вядомы прадстаўнік расійскіх заходнікаў Аляксандр Пыпін. Дастаткова бачыць унутраныя праблемы Расіі, каб разумець, што славянскае пытанне "не вырашаецца адной дагматыкай ці нянавісцю да немцаў", адзначаў ён[105]. Тым не менш, на хвалі нацыяналістычнай рэакцыі на з'яўленне аб'яднанай Нямеччыны ідэі панславістаў набывалі ўсё шырэйшую папулярнасць у Расійская імперыі, асабліва сярод вайскоўцаў[106]. Часопісы панславісцкай арыентацыі "Заря" і "Беседа" пасля 1871 г. толькі і пісалі што пра нямецкую небяспеку для Расіі. На старонках апошняга ў артыкуле "Всеславянство" сябра Ф. Цютчава паэт і публіцыст Апалон Майкаў палохаў чытачоў наступам "нямеччыны", перадавыя пасты якой у Расіі займаюць

[103] Ламанский В. Об историческом изучении греко-славянского мира в Европе. С.-Петербург, 1871. С. 31, 32. Пар.: Дьяков В. А. Славянский вопрос в общественной жизни дореволюционной России. С. 133.

[104] Ламанский В. И. Три мира Азийско-Европейского материка. Изд. 2. Петроград, 1916. С. 147–151.

[105] Пыпин А. Н. Панславизм в прошлом и настоящем (1878). С.-Петербург, 1913. С. 107, 110.

[106] Напрыклад, расійскі генерал Расціслаў Фадзееў, які раней выказваўся пра варожасць Заходняй Еўропы да рускіх, пасля пруска-французскай вайны галоўным ворагам Расіі лічыў Нямеччыну. Гл.: Kohn H. Pan-Slavism. Its History and Ideology. New York, 1960. P. 184, 185.

нараджэнцы Балтыйскага краю, а на поўдні Расіі пашыраюцца, маўляў, "немецко-жидовские устремления"[107]. Нездаровую антынямецкую настроенасць прыўладных колаў Расіі добра ілюструе скандальная прамова генерала Міхаіла Скобелева, героя расійска-турэцкай вайны 1877–1878 г., які выступіў перад сербскімі студэнтамі Сарбоны ў 1882 г. Адказваючы на папрок у недастатковай падтрымцы паўднёвых славян Расіяй, ён сказаў: "...Мы не гаспадары ў сваім доме. Так! У нас паўсюль чужаземец. <...> І калі вы пажадаеце даведацца ад мяне, хто гэты чужаземец... то я вам назаву яго. Гэта віноўнік *Drang nach Osten*, вы яго ведаеце – гэта немец! Паўтараю і прашу не забываць, наш вораг – гэта немец! Барацьба паміж славянамі і тэўтонамі непазбежная"[108].

Антынямецкія настроі прыкметна пашырыліся ў эпоху Аляксандра III (1881–1894), калі расійскі ўрад у сваёй палітыцы адкрыта павярнуўся да славянскага пытання, скончыўшы асцярожныя "гульні ў панславізм"[109]. Ва ўмовах панавання афіцыйнага нацыянал-патрыятызму ідэі імперскага панславізму сталі асновай фармавання антынямецкіх стэрэатыпаў. Пра якасныя змены грамадска-палітычнага клімату можа сведчыць тое, што размовы пра нямецкі "Дранг нах Остэн" у 1880-я г. са старонак шавіністычных выданняў тыпу газеты М. Каткова перайшлі ў лексіку афіцыйнага дыскурсу[110], а таксама ў салідныя навуковыя выданні. Адной з такіх прац, наскрозь прасякнутай антыгерманізмам, стала даследаванне славянскага свету Аляксандрам Рыціхам – яго атлас "Славянский мир". Прафесійны расійскі вайсковец, які займаўся этнаграфіяй, апісаў адносіны славян з немцамі як няспынную барацьбу, пад час якой першыя былі для немцаў "толькі сабакамі, а не людзьмі, рабамі, а не раўнапраўнымі грамадзянамі", і заклікаў, каб такая гісторыя "руху немцаў на славянскі ўсход стала навукай для будучых і наступных пакаленняў славян"[111].

[107] Майков А. Всеславянство // Беседа. 1871. № 3. С. 219–261.

[108] Цыт. па: Оболенская С. В. Образование Германской империи и русское общество. С. 176.

[109] Оболенская С. В. Образование Германской империи и русское общество. С. 175,181; Павленко О. Панславизм. С. 57–58.

[110] Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 84–85.

[111] Риттих А. Славянский мир. Историко-географическое и этнографическое исследование. Варшава, 1885. С. 174, 188.

Варта яшчэ раз адзначыць узаемарэактыўны характар развіцця панславізму і пангерманізму. У прыватнасці, антынямецкай рыторыкай славян, прынамсі фармальна, тлумачылася заснаванне Пангерманскага саюза ў Нямеччыне (1891), які стаў магутным ідэалагічным цэнтрам і ў сваёй актыўнасці не абмяжоўваўся грамадскай сферай, а ўплываў і на дзяржаўны апарат. Умацаванне ж пангерманістаў актывізавала рэакцыю панславістаў, і такім чынам спіраль славяна-германскай варожасці раскручвалася далей. Як прыклад радыкалізаванай антынямецкай прапаганды можна прывесці дзейнасць Дзмітрыя Вергуна, прадстаўніка пецярбургскага тэлеграфнага агенцтва ў Вене. Спачатку ён публікаваў артыкулы аб нямецкіх прэтэнзіях на славянскія землі ў сваім часопісе "Славянский век" (1900)[112], а пазней на іх аснове выдаў брашуру пра нямецкі *Drang nach Osten*, якая ўтрымлівала ўсемагчымыя статыстычныя дадзеныя пра аслабленне пазіцый славян на карысць немцаў. Перасцерагаючы свет перад наступам сусветнага пангерманізму, аўтар указваў на аб'яднанне славян як адзіны спосаб захаваць "расавую раўнавагу ў чалавецтве". Выданне прызначалася для антынямецкай агітацыі, так што пра спробу навуковага падыходу гаварыць не даводзіцца. У аўтара, напрыклад, сярэднявечная каланізацыя пайшла за сапраўдныя "нямецкія захопы", а пачатая руска-японская вайна стала "эпізодам шматвяковай барацьбы германскага і славянскага свету". У гэтай барацьбе немцы, спасылаючыся на "гістарычнае права", быццам могуць забраць у Расіі Украіну, Беларусь і Польшчу, – пужаў славян змрочнай перспектывай Д. Вяргун[113].

Творы Д. Вергуна вызначылі ідэйнае станаўленне руху неаславістаў, які аформіўся ў 1906 г. і развіваў тэзіс аб узрастанні нямецкай небяспекі для славян Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, галасы аб якой актывізаваліся пасля паразы Расіі ў вайне з Японіяй. Апрача расійскіх членаў (Д. Вяргун, В. Сваткоўскі), у яго ўваходзілі палякі, чэхі, сербы і прадстаўнікі іншых славян Габсбургскай імперыі[114]. Паказальна, што арганізаваны

[112] Дьяков В. А. Славянский вопрос в общественной жизни… С. 150.

[113] Вергун Д. Немецкий "Drang nach Osten" в цифрах и фактах. Вена, 1905. С. 2, 8, 53.

[114] Развіццё агульнаславянскага руху і пашырэнне ідэй усеславянства сярод чэхаў і славянскіх народаў Аўстра-Венгрыі, сярод якіх слоган "Дранг нах Остэн" быў таксама пашыраны, не ўваходзіць у межы нашага разгляду, паколькі не мае непасрэдных адносін да тэмы.

ў 1908 г. у Празе кангрэс неаславістаў[115] дасягнуў кансэнсусу ў пытанні пра галоўнага ворага славян: удзельнікі пагадзіліся, што асноўная небяспека для іх народаў зыходзіць з Берліна[116].

Зразумела, пра небяспеку нямецкага "Дранг нах Остэн" гаварылі і пісалі тыя, хто або быў сам эмацыйна заангажаваны ў канфлікт з немцамі, або выкарыстоўваў гэтую легенду для канкрэтных палітычных інтарэсаў. Заслугоўвае ўвагі той факт, што і навукоўцы, падобна публіцысту Д. Вергуну, пачалі спасылацца на яе для абгрунтавання "гістарычных правоў" і геапалітычных інтарэсаў Расіі. Напрыклад, расійскі гісторык Іван Філевіч, які зацята выступаў супраць украінскага нацыянальнага руху, у сваіх публікацыях пераконваў, што ўкраінскі сепаратызм могуць выкарыстаць знешнія ворагі Расіі, якімі перш за ўсё лічыліся немцы. Нават у брытанскім часопісе "Russian Review", што прадстаўляў кансерватыўныя расійскія інтарэсы, нехта Тэадор Волкаў у развагах пра ўкраінскі рух называў *Drang nach Osten* фактарам, які неабходна ўлічваць: маўляў, у кантэксце такой усходняй палітыкі Нямеччыны аўтаномія Украіны была б для яе вельмі шкоднай[117]. Можна было б прывесці нямала іншых прыкладаў, якія сведчаць, што ў канцы XIX – пачатку XX ст. выкарыстанне стэрэатыпнага азначэння "нямецкага націску" ўзнялося на якасна іншы ўзровень. Са старонак публіцыстыкі і журналістыкі яно перайшло ў мысленне і лексіку знакавых літаратараў, прафесійных пісьменнікаў, палітыкаў і навукоўцаў! Як вобразна адзначыў Г. Мэер, тое, што ў 1865 г. інспіравалася жоўтай журналістыкай у Маскве, напярэдадні вайны стала для многіх пераканаўчым азначэннем палітыкі Берліна і Вены. Перад 1914 г. пазіцыі расійскага панславізму з тыповай для яго ідэяй аб Нямеччыне як галоўнай пагрозе міру ў Еўропе падзялялі многія члены ўрада і галоўных палітычных партый Расіі[118].

[115] Пра названы з'езд гл.: Hadler F. "...nevertheless, a great theatrical exhibition of Slav solidarity". Der Prager Slawen-Kongress von 1908 als Hauptaktion ded Neoslawismus // Approaches to Slavic Unity: Austro-Slavism, Pan-Slavism, Neo-Slavism, and Solidarity Among the Slavs Today / ed. by K. A. Makowski and F. Hadler. Poznań, 2013. P. 131–151.

[116] Пар.: Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 97.

[117] Volkov T. The Ukraine Question // The Russian Review. 1912. V. 1. Nr. 4. P. 117.

[118] Zlatar Z. The Structure and Extent of the Pan-Slav Network in Imperial Russia 1910–1915: A Preliminary Survey // Approaches to Slavic Unity. P. 91–115; пар.: Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 106.

У сваім даследаванні расійскай знешняй палітыкі і гаспадаркі, праведзеным напярэдадні I сусветнай вайны, прафесар Берлінскага ўніверсітэта Ота Хёцш спецыяльна ўказаў на празмерную пашыранасць антынямецкіх настрояў у Расіі. Пры гэтым ён ніяк не мог знайсці рацыянальнага тлумачэння распаўсюджанаму ўяўленню пра *Drang nach Osten* – гэтай ідэі фікс (*idée fixe*) пра Нямеччыну, і ўрэшце спісаў яе на хваравітую ірацыянальнасць славянскага розуму[119].

Вядома, адзначанае вышэй нельга пераносіць на масавую свядомасць насельніцтва. У свядомасці простых людзей царскай Расіі, у адрозненне ад элітаў, даследчыкі не фіксуюць варожага стэрэатыпа немцаў. Немцы для іх былі звычайнымі "чужымі", якія маглі выклікаць дабрадушныя кпіны і г. д., аднак не ўспрымаліся як "вораг"[120]. Нават у гады I сусветнай вайны ў масавай свядомасці расіян стэрэатыпны вобраз немца-ворага не паспеў сфармавацца. "Ну что мне немец, коли он меня ничем не обидел?"; "Что мы, что они – оба без вины"; "Все равно, что немец, что француз"[121] – такія і падобныя да іх выказванні расійскіх франтавікоў пра немцаў сведчаць, што яны не бачылі ў нямецкіх жаўнерах непрымірымага гістарычнага ворага.

Затое гісторыкі і пісьменнікі не могуць не залежаць ад ідэйна-палітычнай настроенасці і чаканняў адукаванага грамадства. З перспектывы раздзьмутага антаганізму любыя факты гістарычных канфліктаў з немцамі маглі стаць прыкладамі справядлівай барацьбы і служыць умацаванню славяна-расійскага патрыятызму. У гэтым сэнсе з'яўленне Грунвальда і ў расійскай гістарыяграфіі ў кантэксце адпору нямецкаму "націску на Усход" не прымусіла сябе доўга чакаць. Заўважым, яшчэ Мікалай Карамзін, хоць асвятляў палітыку Вітаўта, бітву пад Грунвальдам не палічыў нават вартай згадкі. Не існавала такой падзеі як факта рускай гісторыі і для Васіля Ключэўскага. Расійскі гісторык-класік Сяргей Салаўёў у сваёй славутай гісторыі Расіі, адпаведны том якой пісаў у 1850-я г., пра Грунвальдскую бітву выказаўся звышлаканічна і нейтральна. Яна

[119] Hoetzsch O. Rußland. Eine Einfürung auf Grund seiner Geschichte von 1904 bis 1912, Berlin, 1913. Пар.: Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 109.

[120] Оболенская С. Образ немца в русской народной культуре в XVIII–XIX вв. // Одиссей, 1991. Москва, 1991. С. 182.

[121] Федорченко С. Народ на войне. Москва – Ленинград, 1925. С. 80–83 і наст.

згадана ім як падзея "новых войнаў Польшчы і Літвы з Ордэнам", ініцыяваных, да таго ж, самім Вітаўтам[122]. І хоць гісторык назваў яе адной з бітваў, "якія вырашаюць лёсы народаў", ён меў на ўвазе не кантэкст славяна-нямецкага супрацьстаяння. Ствараючы гісторыю рускага народа, С. Салаўёў разумеў яго як арганічную частку Еўропы і быў далёкі ад супрацьпастаўлення славян германа-раманскаму свету.

Зусім іначай сталі тлумачыць адносіны з немцамі гісторыкі славянафільскага лагера. Ужо Іван Бяляеў, блізкі да Ю. Самарына, напісаўшы ў 1860-я г. падручнік па гісторыі для Віленскай навучальнай акругі, называў "заклятым ворагам" Рускай зямлі "лацінства і нямеччыну". І ў барацьбе літоўскіх князёў з Тэўтонскім ордэнам ён бачыў толькі абарону "ад напору лацінства і германізацыі"[123]. Не кранаючы тэмы Грунвальда, гісторык выявіў радыкальна антынямецкае стаўленне і ў нарысе па гісторыі Полацка. Па яго словах, у іпастасі каланістаў і рыцараў у XIII ст. на Дзвіне з'явіліся "нямецкія насільнікі", якія задушылі ў Падзвінні край "рускага духу", і на старонках усёй кнігі немцы ўжо паўстаюць як "непрымірымыя і найзлоснейшыя ворагі" і для літоўцаў, і для рускіх[124].

У эпоху афіцыйнага нацыянал-патрыятызму расійскі гісторык Аляксандр Барбашоў, які займаўся палітыкай Вітаўта, прысвяціў Грунвальдскай бітве асобны артыкул. Аўтар назваў яе сутыкненнем двух светаў, "германа-раманскага захаду са славянскім усходам", а па значэнні для славянства параўнаў з Кулікоўскай[125]. Пры гэтым гісторык стварыў самы змрочны вобраз немцаў, якія ўжо з IX ст. "моцна праяўлялі свой *Drang nach Osten*": іх прага на ўсходнія землі "не ведала межаў", а ў захопленых землях рыцары "не давалі насельніцтву ніякай літасці", "гвалцілі жанчын і дзяўчат", а мужчынскае насельніцтва "пераводзілі ў рабства", і нават Ганза жывілася "славянскімі со-

[122] Соловьев С. М. История России с древнейших времен. Т. 3–4. Москва, 1988. С. 374.

[123] Беляев И. Д. Очерк истории Северо-Западного края России. Вильна, 1867. С. 66, 80.

[124] Беляев И. Д. История Полотска, или Северо-Западной Руси, от древнейших времен до Люблинской унии. Ч. 1. Москва, 1872. С. 22, 245.

[125] Барбашев А. И. Танненбергская битва // ЖМНП. 1887, декабрь. С. 151–152. Гэтая праца ўвайшла затым у яго кнігу пра палітыку Вітаўта, у якой захавалася тая ж ацэнка бітвы. Гл.: Барбашев А. И. Витовт. Последние двадцать лет княжения (1410–1430). С.-Петербург, 1891. С. 34–35, 37.

камі", так што нямецкі гандаль "прыгнятаў славян", адбіраючы ў іх усялякую магчымасць уласнага развіцця. У адказ славяне палалі "моцнай нянавісцю да немцаў" і вялі супраць іх бесперапынную барацьбу[126]. Адзначым паказальны факт: гаворачы аб бесперапыннай вайне славян з немцамі, пачатай быццам яшчэ ў IX ст., А. Барбашоў спасылаецца на вядомы твор К. Шайнохі "Ядзвіга і Ягайла" – адзін з першых прыкладаў абгрунтавання спрадвечнай агрэсіўнасці тэўтонаў у адносінах да славян (гл. папярэдні параграф). Пра залежнасць інтэрпрэтацый А. Барбашова ад польскай гістарычнай публіцыстыкі можна меркаваць і па некаторых іншых запазычаных звестках, а таксама па рытарычных зваротах і агульнай танальнасці публікацыі.

Аднак погляды А. Барбашова падзялялі не ўсе расійскія гісторыкі. Напрыклад, згаданы вышэй Іван Філевіч звязваў Грунвальд яшчэ толькі з гісторыяй Польшчы. Адносячы пачатак сутыкнення нямецкага элемента з польскім да XIII ст., ён падаваў справу так, што славяна-нямецкая барацьба моцна аслабіла Польшчу, і тэўтонцы "ўжо сціскалі Польшчу сваімі жалезнымі ціскамі", так што толькі 1410 год вырataваў палякаў ад пагібелі[127], але гэта не тычылася Расіі. Ды і ў расійскага гісторыка Дзмітрыя Ілавайскага, які сцісла пісаў пра бітву ў разглядзе гісторыі Літоўскай Русі, Грунвальд не атрымаў падобнага эпахальнага значэння, якое яму прыпісваў А. Барбашоў. Вядомы крытык нарманскай тэорыі ў цэлым інтэрпрэтаваў адносіны з немцамі з панславісцкіх пазіцый, падкрэсліўшы пастаянную славяна-нямецкую "племянную варожасць", і стылізаваў сечу 1410 г. менавіта як сутыкненне славян з немцамі. З іншага боку, непасрэдная карысць ад перамогі атрымалася нязначнай, толькі "маральныя наступствы" аказаліся велізарнымі, адзначыў гісторык і таксама параўнаў яе ў гэтых адносінах з Кулікоўскай[128]. І ўсё ж, нават залічыўшы бітву да тых, якія "вырашалі лёсы цэлых дзяржаў", Д. Ілавайскі прызнаў, што Ордэн акрыяў пасля паразы і яшчэ пагражаў ВКЛ, штурхаючы яго на збліжэнне з Польскім каралеўствам.

Застаецца дадаць, што тэндэнцыі ўзвелічэння Грунвальда як важнай вяхі славяна-нямецкага супрацьборства была

[126] Барбашев А. И. Танненбергская битва. С. 154–155, 156.

[127] Филевич И. П. Борьба Польши и Литвы-Руси за Галицко-Владимирское наследие. С.-Петербург, 1890. С. 7–8, 36–37.

[128] Иловайский Д. И. История России. Т. 2: Московско-литовский период, или Собиратели Руси. Изд. 2. Москва, 1896. С. 206, 208–209.

цалкам пазбаўлена ліберальная расійская гістарыяграфія, прадстаўнікі якой вызначаліся больш высокай акадэмічнай культурай і практыкавалі пазітывісцкія метады даследавання. Дастаткова звярнуцца да класічнай працы Мацвея Любаўскага па гісторыі ВКЛ: аўтар лаканічна згадаў бітву ў кантэксце ўмацавання ўлады Вітаўта пад суверэнітэтам польскай кароны і спробаў Ордэна разарваць унію[129]. Толькі пад уплывам І сусветнай вайны, апісваючы мінулае заходніх славян[130], М. Любаўскі стаў падаваць іх гісторыю скрозь прызму барацьбы з немцамі за існаванне, апраўдваючы тым самым міжнародную палітыку Расіі.

У сувязі з набліжэннем 500-годдзя бітвы, нягледзячы на высокі градус германафобіі ў элітах імперыі Раманавых, сама тэма Грунвальда не атрымала ў расійскай гістарычнай літаратуры і публіцыстыцы прыкметна большай увагі, чым у папярэднія дзесяцігоддзі. Абазнаная ў гістарыяграфіі Нямецкага ордэна расійская даследчыца Вера Матузава назвала толькі дзве палітызаваныя брашуры, выдадзеныя ў Расіі з нагоды юбілею перамогі[131]. Да іх можна дадаць яшчэ публікацыю ваеннага гісторыка Платона Гейсмана, таксама напісаную адмыслова на 500-годдзе падзеі. У поўнай адпаведнасці з панславісцкай трактоўкай аўтар назваў Грунвальд эпахальнай вяхой у барацьбе "против вековых врагов и притеснителей славянства", атаесамляючы тэўтонскіх рыцараў з немцамі, а ў перамозе над апошнімі бачыў прыклад "служения высоким общеславянским идеалам". Больш за тое, ужо тады расійскім ваенным прадугледжвалася новая вайна як працяг "решительной славяно-немецкой борьбы"[132].

[129] Любавский М. К. Очерк истории Литовско–Русского государства до Люблинской унии включительно. Москва, 1915. С. 52–53. Гаворачы пра значэнне Грунвальда, гісторык адзначыў, што пасля перамогі ВКЛ "сделалось крупною величиною и во мнении Запада". Калі ўлічыць, што першае выданне кнігі выходзіла ў год грунвальдскага юбілею, адсутнасць антынямецкіх акцэнтаў і сціпласць ацэнкі бітвы яшчэ больш адметная.

[130] Гл.: Любавский М. К. История западных славян. Москва, 1917.

[131] Matusova V. Zur Rezeption des Deutschen Ordens in Rußland // Vergangenheit und Gegenwart der Ritterorden. Die Rezeption der Idee und die Wirklichkeit. Toruń, 2001. S. 138.

[132] Гейсман П. Польско-литовско-русский поход в Восточную Пруссию и сражение при Грюнвальде-Танненберге 15 июля 1410 г. С.-Петербург, 1910. С. 45.

Перад самым пачаткам сусветнай вайны з падобнай рыторыкай выступіў расійскі гісторык Яўген Шумігорскі. Сталічны навуковец паўтарыў словы генерала М. Скобелева пра немцаў як сапраўдных ворагаў, якія быццам даўно "добиваются поглощения славянства германизмом и уничтожения великой славянской державы России". Захоплены агульным антынямецкім пафасам, ён прадказваў, што вайна з немцамі як з "галоўным ворагам" будзе ў Расіі "самая папулярная" за ўвесь час яе існавання[133].

З прыведзеных прыкладаў відаць, наколькі падатлівыя былі гісторыкі да агульнай эйфарыі і ўра-патрыятычнай рыторыкі. На жаль, панславісцкая дэмагогія падобнага кшталту была зусім не бязвіннай, бо надавала ўпэўненасці палітыкам і рабіла ваеннае сутыкненне няўхільным. Вяртаючыся ж да тэмы Грунвальда, адзначым яе маргінальнасць у гістарыяграфіі і публіцыстыцы Расійскай імперыі. Да бітвы 1410 г. звярталіся галоўным чынам гісторыкі-панславісты, якім важна было паказаць прыклады гістарычнасці славяна-нямецкага супрацьстаяння, або тыя аўтары, што пісалі пра мінулае былога ВКЛ, ці Паўночна-Заходняй Расіі, як яны называлі далучаныя да імперыі ў канцы XVIII ст. землі Беларусі, Літвы і Украіны. Іншымі словамі, – прадстаўнікі гістарыяграфічнай плыні т. зв. заходнерусізму, да публікацый якіх звернемся ніжэй асобна.

[133] Шумигорский Е. Из записной книжки историка // Исторический вестник. 1914. № 8. С. 663–664.

Раздзел 4

# Вобразы Грунвальда на беларускіх землях царскай імперыі

Разгляд розных практык "успамінання" пра Грунвальдскую бітву на беларускіх землях Расійскай імперыі пачнем з заходнерусізму як афіцыйнай версіі гісторыі краю. Карыстаючыся ўсемагчымай падтрымкай расійскіх уладаў, ён цалкам дамінаваў у гісторыяпісанні Беларусі да самага распаду імперыі і быў найбольш уплывовым інструментам фармавання гістарычнай свядомасці грамадства[1]. Затым разгледзім альтэрнатыўную заходнерусізму традыцыю віленскай школы і завершым аналізам уяўленняў пра сярэднявечную бітву ў першых тэкстах беларускага нацыянальнага гісторыяпісання.

## 4.1 Антынямецкі дыскурс прадстаўнікоў заходнерусізму

*Никогда, ни раньше, ни позже, общеславянское дело не проявлялось столь блестяще и по началу, и по результатам!*

Д. Даўгяла[2]

Актуалізацыя бітвы пад Грунвальдам у апісаннях мінулага Беларусі спатрэбілася перш за ўсё гістарыяграфічнай плыні, вядо-

[1] Карев Д. В. Западноруссизм и его представители в белорусской историографии пореформенного периода (к проблеме влияния политики на историческую идеологию) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Сер. 1. 2009. № 2. С. 101–102.

[2] Довгялло Д. Битва при Грюнвальде 15 июля 1410 г. // Виленский календарь на 1910 г. Вильна, 1909. С. 23.

май пад азначэннем заходнерусізму. Паколькі ў якасці ідэалагічных прынцыпаў яна пераняла канцэпцыі позняга расійскага славянафільства, а дакладней – панславізму[3], вялікая сярэднявечная бітва магла ідэальна ілюстраваць ключавы панславісцкі стэрэатып супрацьпастаўлення праваслаўнага славянства і рыма-лацінскага свету як Усходу і Захаду ды іх непрымірымай барацьбы, што нібыта характарызавала гісторыю Заходняй Русі[4].

Да той хвалі антыеўрапейскіх настрояў, якая ўздымалася ў Расійскай імперыі пачынаючы з 1860-х г., у мясцовых выданнях па гісторыі Беларусі (Літвы ці Заходняй Расіі) не было ніякага антынямецкага дыскурсу. Немцы ў іх калі і з'яўляліся, то без тэндэнцыі прыпісвання ім адмоўных якасцяў, а канфліктам з імі не надавалася асаблівага значэння. Напрыклад, гісторык-вайсковец Міхаіл Без-Карніловіч у сціслым нарысе пра Полацкае княства абышоўся практычна без упамінання канфліктаў з немцамі на Дзвіне, затое згадаў пра карысці, якія палачане мелі ад гандлю з Рыгай і Ганзейскім саюзам[5]. Не знойдзем мы антынямецкай тэндэнцыйнасці і ў першым аглядзе гісторыі Беларусі, створаным Іосіфам Турчыновічам[6]. Чытаючы яго асвятленне канфрантацыі Полацкага княства з нямецкімі рыцарамі, напісанае па Хроніцы Генрыха Латыша, лёгка заўважыць, што немцы ў ім месцамі выступаюць у нават больш сімпатычнай іпастасі, чым славяне або літоўцы. Так, рыжскі біскуп "свята выконваў умовы дагавору" з Полацкам, у адрозненне ад полацкага князя, воіны якога "бесчалавечна ўмярцвілі" безабаронных нямецкіх рыцараў, а жыхары Полацка ў 1382 г. былі гатовыя "хутчэй здацца немцам, чым князю" Скіргайлу, якім яны пагарджалі[7]. Праўда, у эпізодах пра барацьбу літоўскіх князёў за вялікакняскі пасад і сувязь Андрэя Полацкага з Ордэнам аўтар характарызуе палітыку ордэнскай дзяржавы як дэстабілізацый-

3 Пра ролю славянафільства ў ідэалагічным станаўленні названай плыні гл.: Цьвікевіч А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пач. XX ст. Мінск, 1993. С. 200 і наст.

4 Апрача прынцыпаў паславізму гісторыкамі заходнерусісцкай плыні былі пераняты і асноўныя пастулаты канцэпцыі М. Устралава, які атаесамляў Літву з Заходняй Руссю і абвяшчаў часткай Расіі. Гл.: Устрялов Н. Русская история. Ч. 1–2: Древняя история. С.-Петербург, 1839. Пар.: Ліднэр Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. С.-Пецярбург, 2003. С. 125 і наст.

5 Без-Корнилович М. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии. С.-Петербург, 1855. С. 70–71.

6 Турчинович И. В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. С.-Петербург, 1857 (факсім. выданне – Мінск, 2006).

7 Тамсама. С. 79–80, 108. (цыт. па факсім. выданні).

ную: Мальбарк падтрымліваў "усіх ворагаў парадку і спакою ў суседніх дзяржавах", імкнуўся "трымаць Літву і Польшчу ў непакоі і вечнай вайне", умеў "лавіць рыбу ў мутнай вадзе"[8]. Тым не менш І. Турчыновічу яшчэ зусім чужы той спосаб тлумачэння мінулага, пры якім немцы стануць прыроджанымі ворагамі славян. Паказальна, што пра бітву пад Грунвальдам ён наогул не палічыў істотным паведамляць нешта ў сваім аглядзе.

Зусім іншыя падыходы і ацэнкі немцаў пачынаюць сустракацца ў гістарычных творах Міхаіла Каяловіча, прызнанага заснавальнікам гістарыяграфічнай канцэпцыі заходнерусізму. Гэты адэпт поглядаў Івана Аксакава – ключавой фігуры расійскага панславізму – у сваіх праграмных тэзісах зыходзіў з таго, што Заходняя Русь утварала гістарычнае і культурнае адзінства з усходняй, Маскоўскай Руссю, але яе адарвала і сапсавала Польшча, і галоўнай асаблівасцю гісторыі Заходняй Расіі стала барацьба польскага пачатку з рускім[9]. Фактарам негатыўнага ўплыву Польшчы, у разуменні М. Каяловіча, апрача шляхецтва была ў першую чаргу лацінская вера. У адрозненне ад праваслаўя, якое, маўляў, нікому не навязвалася і спрыяла мірнаму суіснаванню прыхільнікаў рознай веры, лацінскае хрысціянства парушыла міжканфесійны мір у Заходняй Русі. Разам з Польшчай каталіцтва на Русь распаўсюджвалі і немцы, аднак погляды гісторыка на немцаў з часам зазнавалі прыкметную эвалюцыю. Спачатку, у першым варыянце "Лекцый па гісторыі заходняй Расіі", выдадзеным адразу пасля паўстання 1863–64 г., яшчэ не адчуваецца антынямецкай настроенасці аўтара. Зразумела, яго найбольш непакоіла пашырэнне лацінскай веры, якая пасля ўсталявання нямецкіх калоній і Ордэна ў Прыбалтыцы "лягла страшным цяжарам" не толькі на прыбалтыйскія плямёны, але "і на заходнюю Расію". Аднак размова тут вялася пераважна пра шкодны ўплыў немцаў на заходніх славян. Пад пяром М. Каяловіча "немцы і жыды як зусім чужыя народнасці" разбэсцілі славянскую Польшчу, рыцарскі Ордэн

[8] Тамсама. С. 110, 115.

[9] Падрабязна пра асноўныя прынцыпы канцэпцыі М. Каяловіча гл.: Цьвікевіч А. "Западно-руссизм". С. 215– 216 і наст.; Карев Д. В. Белорусская и украинская историография конца XVIII – начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев. Вильнюс, 2007. С. 201–202; Литвинский А. В. Западноруссизм в российской историографии второй половины XIX – начала XX в. Автореф. дисс. … канд. ист. наук. Минск, 2004. С. 10–11, 15–16.

ствараў праблемы для Ягайлы і Польшчы[10], і г. д. Яшчэ даволі спакойная танальнасць характэрная і для апісання бітвы пад Грунвальдам, у якім аўтар адзначае, што на бітву прыйшлі "ўся Польшча і амаль уся Літва", у сечы "паміж іншага адзначыліся рускія смаленскія стралкі" і рыцары пацярпелі "страшнае паражэнне, ад якога ўжо ніколі не змаглі акрыяць", але перамога не была належна выкарыстана[11].

Пазней, у тым жа курсе лекцый, перапрацаваным у адпаведнасці з ідэалагічнымі павевамі эпохі Аляксандра III, антынямецкая танальнасць стала значна больш выразнай. На галоўную бітву ВКЛ з Нямецкім ордэнам М. Каяловіч пачаў глядзець не проста ў кантэксце іх гістарычнага супрацьборства, але ўключыў яе ў канву славяна-германскага супрацьстаяння. Цяпер ён больш катэгарычна сцвярджаў, што заходняе лацінства "создало ужасы рыцарских орденов Ливонского и Прусского"[12]. Для гісторыка панславісцкіх перакананняў польскае каталіцтва сімвалізавала ўвесь Захад, спрадвечна варожы праваслаўнай Расіі, таму ён імкнуўся паказаць, што Заходняя Расія (а М. Каяловіч, нагадаем, атаесамляў яе з ВКЛ да злучэння з Польшчай) вяла барацьбу з "заходнімі ворагамі" – як з палякамі, так і з рыцарскімі ордэнамі[13]. Цяпер сама Прусія ўвасабляла "прускае нямецкае гняздо", – хворы пачатак, які выклікаў "разлажэнне ў славянскім свеце". Такую ж лінію этнічнага падзелу ўтрымлівала цяпер і апісанне бітвы: у 1410 г. ужо не проста Польшча і Літва ваявалі з Ордэнам, а там сутыкнуліся "славянскія і нямецкія сілы", пры гэтым менавіта "рускія палкі" вытрымалі "ўсе нямецкія ўдары" і ўнеслі вырашальны ўклад у перамогу[14]. "Славянскае значэнне" перамогі і заслугу "рускіх" азмрочылі, аднак, палякі, якія пайшлі на дыскрымінацыю праваслаўнай веры, – заключыў М. Каяловіч і назваў Гарадзельскія акты 1413 г. "найвялікшай няўдзячнасцю" для Расіі з боку Польшчы[15].

Скрайнюю неўраўнаважанасць і эмацыйнасць ідэолага заходнерусізму ў стаўленні да лацінскай веры і заходняй цывілізацыі

[10] Коялович М. Лекции по истории западной России. Москва, 1864. С. 133–135, 158.
[11] Тамсама. С. 158–159.
[12] Коялович М. О. Чтения по истории западной России. Изд. 4. С.-Петербург, 1884 (тут і далей цыт. па факс. выд.: Мінск: БелЭн, 2006). С. 11–13.
[13] Тамсама. С. 80, 114, 119.
[14] Тамсама. С. 123–124.
[15] Тамсама. С. 126–127.

адзначалі ўжо яго сучаснікі. Напрыклад, А. Пыпін распазнаваў у публікацыях М. Каяловіча па гісторыі царкоўнай уніі адценне "антыпольскага раздражнення"[16], якое можна лічыць толькі прыватнай праявай той "тэалагічнай узбуджанасці", што, паводле А. Пыпіна, характарызавала панславістаў наогул. Антынямецкія пазіцыі і ваяўнічая антыеўрапейскасць М. Каяловіча перыяду афіцыйнага нацыянал-патрыятызму з яшчэ большай выразнасцю праявілася ў напісанай у тыя ж гады "Истории русского самосознания", дзе аўтар асабліва пагардліва выказваўся пра нямецкіх вучоных, якія ўвялі ў рускую гістарыяграфію прынцып крытыкі крыніц. У прыватнасці, пад яго пяром такія заслужаныя для Расіі гісторыкі, як Готліб Баер, Герхард Мілер і Аўгуст Шлёцэр, што працавалі ў Імператарскай Акадэміі навук, сталі тымі, хто пашыраў у расійскай навуцы "зло нямецкіх поглядаў", а іх працы абвяшчаліся "скрайне шкоднымі"[17]. Па словах Аляксандра Брукнера, які крытычна разабраў названую кнігу, сваім шавінізмам і антынямецкай скіраванасцю яна стварала ўражанне паталагічнай з'явы. У цэлым рэцэнзаваная кніга М. Каяловіча атрымалася не заяўленай навуковай працай па складанай тэме развіцця рускай гістарыяграфіі, а нейкім "шавіністычным уводным артыкулам"[18], – заключыў ён. З расійскіх гісторыкаў хваравітую антынямецкасць пецярбургскага прафесара скрытыкаваў Павел Мілюкоў, які адзначыў, што ў М. Каяловіча ўся гісторыя гістарычнай навукі аказалася раздзеленай на "сваіх" і "чужых", прычым апошнія (немцы-заходнікі) абвінавачаны ў "непрерывном полуторавековом заговоре против русской народности… "[19].

На фоне росту антынямецкіх настрояў і папулярнага ў тагачасных расійскіх элітах славянскага патрыятызму выглядае невыпадковым, што М. Каяловіч спецыяльна звярнуўся і да тэмы Грунвальда. Выступіўшы з дакладам пра бітву ў Славянскім дабрачынным таварыстве, ён прэзентаваў падзею з перспектывы, тыповай для расійскага панславізму: як перамогу над немцамі, што сімвалізавала сілу аб'яднаных славян. Не развіваючы новых

16 Пыпин А. История русской этнографии. Т. 4. Мінск, 2005. С. 30, 202.

17 Коялович М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям. Выд. 4. Мінск, 1997. С. 36–37, 156, 163, 272.

18 Brückner A. [рэц. на]: Коялович М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям (1884) // HZ. Bd. 57 (1887). S. 159, 173.

19 Милюков П. Н. Главные течения русской исторической мысли. Т. 1. С. 3.

ідэй, гісторык параўнаў яе з Kулікоўскай, а галоўны пафас свайго выступу скіраваў супраць прыпісвання славы перамогі палякам. На самай справе, пераконваў М. Каяловіч, адвольна трактуючы падзеі, поспех гарантавала “доблесць” смаленскіх палкоў, якія “ўратавалі славянскую справу”, а таксама талент Вітаўта, але з-за Ягайлы перамога не была выкарыстана і “нямецкае гняздо” засталося не знішчаным[20]. Звязваючы разлад паміж славянамі, што адбыўся пасля Грунвальда, з рэлігійным фактарам, г. зн. увядзеннем каталіцтва ў ВКЛ, М. Каяловіч назваў палякаў “самымі неразумнымі” сярод славян, а Еўропу – той варожай сілай, якая старалася “зрабіць неславянскай” рускую славянскую дзяржаву[21]. Гэтым амаль рытуальным абвінавачваннем палякаў М. Каяловіч ледзь не літаральна паўтараў тэзіс пра непаўнавартасць палякаў як славян, не раз выказаны да яго ідэолагамі расійскага панславізму, у прыватнасці – М. Данілеўскім. Апошні таксама называў Польшчу “шкодным членам славянскай сям’і” за тое, што тая ўносіла “варожы славянскаму свету каталіцкі і шляхецка-арыстакратычны прынцып углыб самой Расіі”[22]. Як вядома, польскія інтэлектуалы і палітыкі ў другой палове XIX ст. не бачылі свайго месца ў аб’яднанні славян на чале з Расіяй[23], чым і абумовілі катэгарычную антыпольскасць расійскіх панславістаў. Што да Грунвальда, то з гэтага часу аспрэчванне ў палякаў славы перамогі над немцамі належала да важных элементаў усіх апісанняў бітвы 1410 г., якія ствараліся ў традыцыі заходнерусізму.

Аднак калі ў антыпольскай зацятасці з М. Каяловічам былі салідарныя і іншыя гісторыкі названай школы, то ў поглядах на нямецкіх рыцараў і ацэнках гістарычнага значэння бітвы пад Грунвальдам падобнага адзінства сярод іх усё ж не назіралася. Многія з тых, каго прынята залічваць да названай гістарыяграфічнай плыні, не надавалі такога вялікага значэння супрацьстаянню з Нямецкім ордэнам і бітве 1410 г., як гэта рабіў М. Каяловіч. Так, Павел Бранцаў у сінтэтычнай працы па гісторыі ВКЛ, прызначанай для масавага чытача Паўночна-Заходняга краю, нямала ўвагі аддаў

[20] Коялович М. Грюнвальдская битва 1410 года. С.-Петербург, 1885. С. 4, 10, 13.
[21] Тамсама. С. 14, 17.
[22] Данилевский Н. Я. Россия и Европа. С. 339.
[23] Падрабязней гл.: Wrzesińska K. Panslawizm w piśmiennictwie Narodowej Demokracji do 1914 r. // Europa – Slavia – Germania w poszukiwaniu tożsamości. Pod red. W. Bursztу, M. Dudziaka, R. Piotrowskiego. Warszawa, 2009. S. 43–62.

барацьбе Вітаўта з нямецкімі рыцарамі і даволі падрабязна апісаў Грунвальдскую бітву[24]. Але, хоць аўтар карыстаўся публікацыямі самога лідара заходнерусізму, у яго аповедзе пра галоўнае сутыкненне з Ордэнам чытач не адчуе антынямецкай настроенасці[25]. Вітаўт сам пачаў вайну, каб вярнуць Жамойць, а пасля 1410 г. Ордэн, хоць аслабеў, працягваў "свае звычайныя набегі на літоўскія ўладанні" да мірнага дагавору 1422 г., і карысці ад бліскучай бітвы пераможцы атрымалі ўсё ж не шмат[26]. Зрэшты, ацэньваючы значэнне бітвы, П. Бранцаў прывёў розныя меркаванні, зацытаваўшы, у прыватнасці, як М. Каяловіча, так і С. Салаўёва з Д. Ілавайскім.

Адносна стрымана, без лішніх спекулятыўных разваг апісаны ваенныя канфлікты з Нямецкім ордэнам і ў калектыўным томе "Белоруссия и Литва", выдадзеным Пампеем Бацюшкавым. Не выключана, што сам П. Бацюшкаў меў пэўныя сімпатыі да немцаў ці адчуваў салідарнасць з нямецкім урадам па т. зв. "негатыўнай палітыцы да польскай справы". На такія здагадкі наводзяць вартыя ўвагі апеляцыі да Бісмарка ў пятым томе "Памятников русской старины в западных губерниях" – выдання П. Бацюшкава, прызначанага даказваць "адвечную рускасць" Беларусі і Літвы. Вось жа ў якасці эпіграфа ён змясціў тут словы нямецкага райхсканцлера – побач з выказваннямі Кацярыны II і мітрапаліта Іосіфа Сямашкі. Гэта была цытата са звароту Бісмарка да польскіх дэпутатаў нямецкага райхстага ў 1871 г., дзе ён сцвярджаў, што тыя прадстаўляюць толькі інтарэсы каталіцкай царквы, а не польскага народа, і бэсціў безнадзейна кепскую польскую ўладу, якая, маўляў, больш ніколі не вернецца на польскія землі, забраныя Прусіяй[27]. Сімвалічная сувязь "русского дела" ў Паўночна-Заходняй Русі з нямецкай палітыкай у Прусіі, дзе праводзілася адкрытая германізацыя польскага насельніцтва, выразна падкрэслена і ў прадмове да названага тома, у якім змешчаны "Очерк истории города Вильны" В. Г. Васільеўскага. На правядзенне такіх пара-

[24] Брянцев П. Д. История Литовского государства с древнейших времен. Вильно, 1889. С. 243–246.

[25] Варта адзначыць, што і перамога Аляксандра Неўскага над рыцарамі, якая стане сімвалам адпору немцам у публікацыях савецкіх гісторыкаў, толькі мімаходзь згадана аўтарам пры асвятленні ўсталявання рыцарскіх ордэнаў у Прыбалтыцы (тамсама, с. 89).

[26] Падобнае апісанне і ацэнку бітвы гл. у скарочанай версіі гісторыі: Брянцев П. Д. Очерк древней Литвы и Западной России. Вильно, 1891. С. 53–54.

[27] Памятники русской старины в западных губерниях империи. Изд. П. Н. Батюшковым. Вып. 5. Вильна, 1872.

леляў адразу зрэагаваў А. Пыпін, які раскрытыкаваў іх як непатрэбныя і недакладныя па сутнасці[28]. Тым не менш і згаданыя алюзіі наконт аднолькавай унутранай палітыкі, і цытата з прамовы Бісмарка не толькі сведчылі пра салідарную пазіцыю дзвюх імперый адносна падпарадкаваных народаў, але і былі выразам яўнай павагі да Нямеччыны.

Нельга сказаць, наколькі паўплывалі і ці паўплывалі наогул пазіцыі рэдактара-выдаўца на асвятленне войнаў з Ордэнам у названай кнізе нарысаў па гісторыі Беларусі і Літвы. Магчыма, яно да апошніх нюансаў належыць толькі аўтару адпаведнага раздзела Мікалаю Пятрову, прафесару Кіеўскай духоўнай акадэміі. Як бы там ні было, у названай кнізе абышлося без развіцця панславісцкай легенды пра адвечны славяна-нямецкі антаганізм ды іх узаемную нянавісць. Пашырэнне каталіцтва “агнём і мячом”, якім займаўся Ордэн, датычыла балцкіх і фінскіх плямёнаў Прыбалтыкі, для Русі ж падобная пагроза магла быць толькі патэнцыйнай. Аднак, згодна з інтэрпрэтацыяй аўтара, упартую барацьбу з нямецкімі рыцарамі “амаль 200 гадоў” вялі Жамойць і Верхняя Літва, якія ў выніку “змаглі не толькі адстаяць права на ўласнае існаванне, але і засланіць сабою Русь і Польшчу і выратаваць іх ад нямецкага іга”[29]. З нарыса вынікае, што і да сутыкнення пад Грунвальдам дайшло з-за імкнення Вітаўта вярнуць аддадзеную Ордэну Жамойць, а не каб ратавацца ад немцаў. Генеральная бітва, у якой выключную ролю выканалі “рускія смаленскія палкі”, прывычна названа “адной з тых, якімі вырашаліся лёсы народаў”, тым не менш аўтар канкрэтна згадаў толькі знішчэнне славы і сілы Ордэна[30], не ўдаючыся ў развагі пра вялікае значэнне перамогі для Беларусі і Літвы.

Даволі ўзважана характарызавалася вайна з Ордэнам і сама Грунвальдская бітва таксама ў выданнях такіх беларускіх гісторыкаў-заходнерусістаў, як Уладзімір Стукаліч і Арсеній Турцэвіч. Першы, напрыклад, адгукнуўшыся на выданне П. Бацюшкава развагамі пра мінулае Беларусі, пісаў пра “згубны ўплыў палякаў”, а Нямецкі ордэн і бітву з ім згадаў толькі ў апісанні палітыкі Вітаўта. На той час агульным месцам зрабілася аспрэчван-

[28] Цытаванне падобнага гледжання Бісмарка на Польшчу А. Пыпін назваў “зусім не карысным” для расійскай місіі. Гл.: Пыпин А. Н. История русской этнографии. Т. 4: Белоруссия и Сибирь. Мінск, 2005. С. 195–197.

[29] Батюшков П. Н. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-западного края. С.-Петербург, 1890. С. 53–54.

[30] Тамсама. С. 105.

не славы Грунвальда ў палякаў, якія ператваралі падзею ў свой нацыянальны міф, чаму аддаў даніну і У. Стукаліч. Перамога 1410 г., якая падарвала моц Ордэна, была забяспечана, па яго-ных словах, войскам Вітаўта і "беларускім смаленскім палком", тады як палякі для яе зрабілі мала[31]. А. Турцэвіч, праўда, называў тэўтонскіх рыцараў "самымі небяспечнымі ворагамі Літвы і славян", аднак гэта было хутчэй рытуальным паўтарэннем пашыранага панславістамі старога тэзіса, бо з разгромам іх арміі ў 1410 г. ён звязаў толькі непапраўны заняпад магутнасці Ордэна[32]. І ў падрыхтаванай ім жа хрэстаматыі для школ Віленскай навучальнай акругі бітва пад Грунвальдам ніяк не вылучалася. Асобную тэму ён прысвяціў "рэйзам крыжаносцаў", дзе барацьба ВКЛ з Ордэнам названа "партызанскай вайной", тады як пра Грунвальд можна сцісла прачытаць толькі ў апісанні палітыкі Вітаўта[33], складзеным на падставе прац Д. Ілавайскага, які таксама ацэньваў падзею без пафасу і перабольшанняў.

З асобным артыкулам пра Грунвальд напярэдадні 500-х угодкаў бітвы з прафесійных гісторыкаў Беларусі выступіў толькі Дзмітрый Даўгяла[34], архівіст і тагачасны член Віленскай археаграфічнай камісіі. Хоць аўтар прывёў салідны спіс выкарыстанай літаратуры, яго праца носіць чыста публіцыстычны характар. Артыкул адлюстраваў настроі і інтарэсы бягучай палітыкі, што і зразумела – тэкст пісаўся для выдання, якое стваралася яшчэ М. Мураўёвым як ключавы орган прапаганды ў Паўночна-Заходнім краі[35], таму публікацыя заслугоўвае асобнай увагі.

Сваім падыходам да апісання падзеі аўтар, які пад час свайго навучання ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі мог яшчэ слухаць праф. М. Каяловіча, надзіва выразна нагадвае погляды ідэйнага айца заходнерусізму. Панславісцкая перспектыва трактовак вызначана ў самым пачатку, калі Д. Даўгяла дэкларуе незвычайна вялікае значэнне гэтай бітвы для славянства: "ніколі, ні раней, ні пазней агульнаславянская справа не праяўлялася так бліску-

[31] Стукалич В. К. Белоруссия и Литва. Очерки из истории городов в Белоруссии. Витебск, 1894. С. 6–9.

[32] Турцевич А. Русская история (в связи с историей Великого Княжества Литовского). Вильна, 1905. С. 42.

[33] Хрестоматия по истории Западной России / сост. А. Турцевич. Вильна, 1892. С. 113, 156–157.

[34] Довгялло Д. И. Битва при Грюнвальде 15 июля 1410 г. // Виленский календарь на 1910 г. Вильна, 1909. С. 23–45.

[35] Миловидов А. И. Русский календарь в Северо-Западном крае, его история и значение. Вильна, 1908. С. 7–9.

ча...". Не дзіўна, што адносіны немцаў да славян і літоўцаў у да-грунвальдскі перыяд паказаны ў самых змрочных фарбах. Аўтар быццам перагукаецца з М. Каяловічам, калі піша, як нямецкія рыцарскія ордэны, што з'явіліся на Дзвіне і Вісле, аб'ядналіся ды "агнём і мячом разносілі зерне лацінства сярод суседніх літоўскіх і славянскіх плямёнаў і разам падпарадкоўвалі іх сабе"[36]. Актуальнасць памяці пра даўнюю бітву ён абгрунтоўвае правядзеннем наўпраставай аналогіі паміж сітуацыяй эпохі Грунвальда і сучаснасцю, прывёўшы цытату з неназванага расійскага публіцыста: маўляў, "германізм наступае" на славянскія народы як у пачатку XV ст., і цяпер "выратаванне славян" зноў у іх прымірэнні і аб'яднанні. Трэба адзначыць, што раней у гісторыкаў-заходнерусістаў не сустракалася такой непасрэдна канкрэтнай актуалізацыі Грунвальда. У гэтым плане рыторыка Д. Даўгялы адлюстроўвае абвастрэнне нямецка-славянскага антаганізму і нагадвае польскія публікацыі, аднак яго палемічны запал скіраваны акурат супраць палякаў. Блізкі юбілей Грунвальда павінен быў "абудзіць пачуцці брацкай народнай роднасці" сярод усходніх і заходніх славян, – піша ён, але ў дзень 15 ліпеня не можа быць "агульнаславянскай святочнай урачыстасці", і гэта – па віне палякаў. Бо яны, маўляў, "усяму свету заявілі, што перамога над немцамі ў 1410 г. была справай польскай сілы..."[37]. Абвяржэнню эгаістычнай пазіцыі палякаў і прысвечана большая частка далейшага выкладу Д. Даўгялы.

Апісаўшы бітву 1410 г. на падставе працы апантанага сярэднявечнай Літвой Т. Нарбута[38] і прызнаўшы ініцыятыву вайны за Вітаўтам, аўтар паставіў у якасці галоўнага пытанне пра "склад пераможцаў па нацыянальнасцях". Па ягоных падліках, "рускіх" пад Грунвальдам было прыкладна столькі, колькі і палякаў, а ў дадатак і пераможны вынік бітвы "перш за ўсё залежаў ад стойкасці смаленскіх палкоў" на чале з князем Юрыем Лынгвеневічам[39]. У выніку, хоць немцы былі разбіты "агульным намаганнем славянскіх плямёнаў і літоўцаў, але геройствам і доблесцю ўсіх пераўзышлі беларускія-смаленскія палкі князя Мсціслаўскага". Таму, рэзюмаваў свой аповед Д. Даўгяла, дзень 500-годдзя Грунвальдскай бітвы "павінен быць найперш святам агульнаславянскім, а затым – заходнерускім", бо Грунвальдская перамога "з'яўляецца агульнай справай

[36] Довгялло Д. И. Битва при Грюнвальде 15 июля 1410 г. С. 25.
[37] Тамсама. С. 23–24.
[38] Тамсама. С. 27–39.
[39] Тамсама. С. 43.

славянскіх народнасцяў", і Вітаўт атрымаў перамогу галоўным чынам дзякуючы "рускай стойкасці і рускай крыві"[40].

Яшчэ ў маладосці зазнаўшы ўплыў У. Ламанскага і М. Каяловіча, Д. Даўгяла вызначаўся рэлігійнай нецярпімасцю і як дзяржаўны чыноўнік артыкуляваў тыповыя для заходнерусізму гістарычныя погляды, затое ў 1920-я г. прыняў ідэю беларускай дзяржаўнасці[41]. На справе ўсе прадстаўнікі заходнерусізму да рэвалюцыі займаліся інструменталізацыяй гісторыі пад мэты русіфікацыі і абгрунтавання ідэі, што Беларусь і Літва (Паўночна-Заходні край) – гэта тая ж Расія. Вышэй на прыкладзе М. Любаўскага адзначалася, наколькі далёкімі ад такой устаноўкі былі гісторыкі ліберальнай плыні расійскай гістарыяграфіі, асабліва тыя яе прадстаўнікі, што былі звязаны паходжаннем з Беларуссю. Яны імкнуліся акцэнтаваць самабытнасць беларускага краю, аднак не мелі такой масавай аўдыторыі, як праўрадавыя гісторыкі, якія карысталіся паслугамі афіцыйных перыядычных выданняў. У гэтых адносінах паспяховым прыкладам супрацьдзеяння праграме адэптаў заходнерусізму можна лічыць дзейнасць групы ліберальнай інтэлігенцыі беларускага паходжання (М. В. Доўнар-Запольскі, У. З. Завітневіч, Я. А. Ляцкі, А. І. Слупскі і інш.), аб'яднанай у 1880-я г. вакол прыватнай рускамоўнай газеты "Минский листок", якая імкнулася пашыраць асвету, у тым ліку гістарычныя веды, і абуджаць свядомасць беларусаў як асобнай нацыянальнасці легальнымі сродкамі. Сярод публікацый гісторыкаў гэтай групы ў сувязі з успрыманнем Нямецкага ордэна ў той перыяд асобнай увагі заслугоўвае праца канцэптуальна-абагульняльнага характару "Белорусское прошлое", якая належала пяру яшчэ малавядомага тады Мітрафана Доўнара-Запольскага. Яна з'явілася ў 1888 г. як серыя артыкулаў у названай газеце, напісаных з нагоды выхаду кнігі А. Пыпіна "Белорусская этнография", а пазней была апублікаваная ў кіеўскім томе прац даследчыка[42]. Разглядаючы даўняе мінулае Беларусі, малады гісторык наогул не палічыў патрэбным акцэнтаваць увагу на ваенных канфліктах, хоць нарыс прысвяціў менавіта "гістарычным адносінам Беларусі да яе суседзяў"[43]. Што

[40] Тамсама. С. 45.

[41] Пра жыццёвы шлях вучонага і эвалюцыю яго перакананняў гл.: Шумейко М. Ф. Архивист и археограф Дмитрий Иванович Довгялло. Минск, 2002.

[42] Довнар-Запольский М. В. Белорусское прошлое // ён жа. Исследования и статьи. Т. 1. Киев, 1909. С. 317–345.

[43] Тамсама. С. 318.

да Нямецкага ордэна, то М. Доўнар-Запольскі толькі прынагодна ўспомніў яго пры асвятленні абставінаў утварэння дзяржавы літоўскіх князёў, – як фактар, што ўплываў на аб'яднанне літоўскіх плямёнаў вакол аднаго палітычнага цэнтра[44]. Ніжэй можна будзе пераканацца, што і ў працах сваёй прафесійнай сталасці гісторык не знаходзіў падстаў адводзіць рыцарскай дзяржаве і яе разгрому ў 1410 г. нейкае асаблівае месца ў мінулым Беларусі.

## 4.2 Тэма барацьбы з Ордэнам у ліцвінскім / краёвым гісторыяпісанні

Поўнай ідэалагічнай процілегласцю панавальнаму заходнерусізму ў прэзентацыях мінулага Беларусі была творчасць віленскай інтэлігенцыі – прадстаўнікоў т. зв. "краёвай", або "ліцвінскай" традыцыі гісторыяпісання (Тэадор Нарбут, Яўстафій Тышкевіч, Ігнат Анацэвіч, Адам Кіркор, Ігнат Ходзька і інш.), аб'яднаных рэгіянальным патрыятызмам. Іх "ліцвінства" вызначалася не этнічнай прыналежнасцю і не мовай, а свядомасцю. Сфармаваныя ў польскім культурным асяродзі, яны адчувалі сябе звязанымі з лёсамі Польшчы, аднак былі патрыётамі гістарычнай Літвы і маглі ідэнтыфікаваць сябе з мясцовымі народамі – літоўцамі ці беларусамі, якіх разумелі лепш, чым этнічных палякаў[45]. У адрозненне ад заходнерусізму, які абсалютызаваў праваслаўе і рускасць, "краёвая" гістарыяграфія не трымалася ў сваіх інтэрпрэтацыях ні канфесійнага, ні этнічнага фактараў. Напрыклад, для Я. Тышкевіча гісторыя ВКЛ, ці гістарычнай Літвы, была гісторыяй дзяржавы, якая ад пачатку развівалася як шматэтнічная, з узаемаўплывамі моў і рэлігій, і ён не ўяўляў магчымым прэзентаваць мінулае ВКЛ у выглядзе развіцця толькі аднаго народа, як ад яго патрабавалі расійскія ўлады[46].

[44] Тамсама. С. 325.

[45] Падрабязней гл.: Бардах Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2010. С. 336–342; Смалянчук А. "Краёвасць" у беларускай і літоўскай гісторыі // БГА. Т. IV (1997). С. 20–27; ён жа. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях: 1864 – люты 1917 г. С.-Пецярбург, 2004. С. 127–128 і наст.; Zasztowt L. Europa Środkowo-Wschodnia a Rosja XIX–XX wieku. Warszawa, 2007. S. 121–145.

[46] Zasztowt L. Europa Środkowo-Wschodnia... S. 125–126. Варта дадаць, што ў той час любыя ідэі аб'яднання гістарычнай Літвы з Польшчай

Не заглыбляючыся ў феномен краёвага гісторыяпісання, звернемся да віленскага асяроддзя таго перыяду, калі ў кантэксце славяна-германскай канфрантацыі набываў актуальнасць дыскурс пра гісторыю барацьбы з немцамі, г. зн. першых дзесяцігоддзяў пасля падаўлення Студзеньскага паўстання. У сваёй публікатарскай дзейнасці кола віленскай інтэлігенцыі ад пачатку было абмежавана дзяржаўнай цэнзурай і раней, а пры генерал-губернатарстве М. Мураўёва настала пара ўзмоцненага цэнзурнага кантролю і паслядоўнай русіфікацыі краю. У дзяржаўныя ўстановы тыпу Віленскай археаграфічнай камісіі, створанай для той жа мэты, падбіраліся супрацоўнікі, аддадзеныя афіцыйнаму заходнерусізму[47]. Вернасць яму на дзяржаўнай службе ў Вільні дэманстравалі і даследчыкі беларускага паходжання, такія, як Сямён Шалковіч, Юльян Крачкоўскі, Арсеній Турцэвіч ці цытаваны вышэй Дзмітрый Даўгяла. Усё, што магло служыць абгрунтаванню польскіх уплываў ці падрываць ідэю аб яго "спрадвечнай рускасці", у друк не прапускалася. Затое гістарычныя публікацыі, у якіх прэзентаваўся негатыўны вобраз немца-"крыжака", не выклікалі прэтэнзій расійскай цэнзуры, асабліва ў эпоху Аляксандра III з яе антынямецкім духам афіцыйнага нацыянал-патрыятызму. Ускосна гэтая акалічнасць спрыяла развіццю дыскурсу пра барацьбу з немцамі.

У такіх умовах уяўленні пра мінулае ў масавай свядомасці каталіцкага насельніцтва беларускіх земляў фармавалі гістарычныя творы мясцовых польскамоўных пісьменнікаў і гісторыкаў-папулярызатараў, захопленых Літвой у гістарычным сэнсе – як шматэтнічнай культурнай супольнасцю. Пасля Адама Міцкевіча гэта былі найперш Тэадор Нарбут, Адам Кіркор, Юзаф Крашэўскі і Уладзіслаў Сыракомля. Гісторыкі апявалі і гераізавалі даўнюю Літву, звязваючы яе залаты век з дзяржаўнай самастойнасцю ў Сярэднявеччы. Для Т. Нарбута адносіны Літвы з рыцарскай дзяржавай у Прусіі ні ў якім разе не былі пастаянным змаганнем, расцягнутым на два стагоддзі. Гісторык апісваў іх як паласу канфліктаў і пагадненняў, чаргаванне замірэнняў і на-

былі чужымі для віленскай "краёвай" інтэлігенцыі, і толькі перад І сусветнай вайной яна пачала ідэнтыфікавацца з канцэпцыямі польскай нацыянал-дэмакратыі (гл.: Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. С. 338 – 341, 345; Zasztowt L. Op. cit. S. 134, 138).

[47] Падрабязней пра склад і мэты названай камісіі гл.: Улащик Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. Москва, 1973. С. 73, 79–81.

падаў з перавагамі то аднаго, то другога боку, адзначаючы і слабасць Ордэна[48]. Досыць падрабязна, але ўзважана апісаная бітва пад Грунвальдам у яго разуменні, як ужо згадвалася вышэй (гл. 3.2), не азначала пераломнай для лёсаў Літвы падзеі. Падобны падыход знаходзім у А. Кіркора, які пры асвятленні гістарычных лёсаў Літвы адвёў барацьбе з Ордэнам яшчэ меншае месца: яна тварыла толькі адзін з аспектаў шматвектарнага палітычнага жыцця дзяржавы, адцяняючы моц даўняй Літвы і славу яе князёў[49]. Бітву пад Грунвальдам ён узнавіў у ліцвінскай інтэрпрэтацыйнай версіі, аддаючы "гонар славутай перамогі" аднаму Вітаўту. Аднак ключавой падставай сутыкнення была Жамойць, вяртанне якой і задаволіла вялікага князя, адзначаў А. Кіркор[50], нідзе ні словам не ўказаўшы на антаганізм этнічнага характару. Паказальна, што апісанне мінулага Літвы і Беларусі ў тыповай для віленскай школы гістарыяграфічнай традыцыі (якую прынята называць ліцвінскай ці "краёвай") выклікала рэзка адмоўны водгук М. Каяловіча, у пераканаштях якога "западно-русская жизнь в общем ее историческом движении идёт по направлению, совершенно противоположном взглядам и тенденциям автора"[51].

Тэме барацьбы з Прускім ордэнам, ці крыжакамі, нямала месца ў сваёй творчасці прысвяцілі У. Сыракомля і асабліва Ю. Крашэўскі. Ужо ў 1854 г. першы апублікаваў вершаваную аповесць "Маргер", прысвечаную гераічнай абароне літоўскага замка Пілены (*Pilėnai*) ад крыжаносцаў. Сюжэт эпапеі звязаны з падзеямі, апісанымі ў сярэднявечных ордэнскіх крыніцах – такіх, як хроніка Віганда Марбургскага, Торуньскія аналы, хроніка Дэтмара[52]. Згодна з першай, у пачатку 1336 г. літоўскі замак Пілены

[48] Narbutt T. Dzieje narodu litewskiego. T. 4: Wilno, 1838. S. 511–561, 563; T. 5. Wilno, 1839. S. 92–144; T. 6. Wilno, 1839. S. 73–307.

[49] Живописная Россия. Т. 3: Литовское и Белорусское Полесье. Рэпр. выд. Мінск, 1993. С. 78–86.

[50] Тамсама. С. 86.

[51] Коялович М. О. Библиографическая заметка по поводу III тома "Живописной Росии" (Литва и Белоруссия – соч. Киркора) // Литовские епархиальные ведомости. 1884. № 9. С. 84.

[52] Wigand von Marburg. Cronica nova Prutenica. Hg. von T. Hirsch // SRP. Bd. 2. Leipzig, 1863. S. 488; Bd. 3. Leipzig, 1866. S. 72. Пар.: Nikžentaitis A. Pilėnų mįslė. Vilnius, 1992. Праўда, як даводзіць крыніцазнаўчая праца сучаснага даследчыка, карціна гераічнай абароны Піленаў належыць не Віганду Марбургскаму, а была створана прускім гісторыкам у XVI ст. Гл.: Baronas D. Pilėnai ir Margiris: faktai ir fikcijos // Istorijos šaltinių tyrimai / sud. D. Antanavičius, D. Baronas. T. 1. Vilnius, 2008. P. 27–65.

сапраўды быў узяты ў аблогу нямецкімі рыцарамі, і пасля таго, як абаронцы страцілі ўсе шансы вытрымаць націск, яны вырашылі спаліць сябе разам з замкам. Хоць У. Сыракомля прызнаваўся, што тэму яму падказала і заахвоціла да пісання Паўліна Вільконска[53], выбар менавіта гэтага сюжэта да пэўнай ступені маглі абумовіць меркаванні цэнзурнага характару – пісьменнік сам наракаў на такія абмежаванні[54]. Апяваць перамогі Літвы тады можна было ў апісаннях барацьбы з заходнім праціўнікам, а не з Маскоўскай дзяржавай. І сапраўды, "Маргер" не выклікаў ніякіх пярэчанняў расійскага цэнзара Паўла Кукальніка.

Амаль праз тры дзесяцігоддзі тую ж гераічную гісторыю Піленаў апісаў старэйшы калега і патрон У. Сыракомлі, пісьменнік і гісторык Юзаф Ігнацы Крашэўскі, на гістарычных працах багатай творчай спадчыны якога вучыўся і "вясковы лірнік". Яго вершаваная аповесць "Кунігас" (1881) завяршаецца акурат самай драматычнай сцэнай – апошнім штурмам Піленаў[55]. Згадаем, што ў Ю. Крашэўскага яшчэ ў 1860-я г. з'віліся рашуча антынямецкія настроі. Ствараючы ў сваіх аповесцях змрочны вобраз бязлітасных крыжакоў, ён супрацьпастаўляў іх ідэалізаванай паганскай Літве. Антыгерманізм Ю. Крашэўскага, аднак, як і ў выпадку з У. Сыракомлем, меў і практычнае прызначэнне – дапамагаў яго гістарычным творам праходзіць расійскую цэнзуру[56].

Цяпер добра вядома, што польскамоўная творчаць Ю. Крашэўскага і У. Сыракомлі была запатрабаванай у нацыянальным адраджэнні і літоўцаў, і беларусаў. Іх тэксты, асабліва творы пра мінулае гістарычнай Літвы, выкарыстоўваліся ў фармаванні нацыянальнай ідэнтычнасці абодвух народаў[57]. "Вясковага

[53] Syrokomla W. Margier. Poemat z dziejów Litwy. Wilno, 1855. S. V. Твор быў напісаны ў Барэйкаўшчыне, у сённяшняй Беларусі.

[54] Гл.: Kiślak E. Poeta pogranicznych prowincji. O Władyslawie Syrokomli // PW. 1991. Z. 1. S. 63, 67.

[55] Kraszewski J. I. Kunigas. Dzieje Litwy i Krzyżaków w początkach XIV w. Warszawa, 1929. Cz. 2. S. 121–127.

[56] Bujnicki T. Litwa między Wielkim Księstwem a kresami. Powieści historyczne Kraszewskiego na tle dziewiętnastowiecznych wyobrażeń o litewskiej przeszłości // Kultura polityczna w Polsce. T. VI. Cz. 1: Litwa w polskiej tradycji i kulturze politycznej. Red. M. Kosman. Poznań, 2006. S. 88.

[57] Пар.: Мальдзіс А. Творчае пабрацімства: беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў XIX ст. Мінск, 1966. С. 52–59, 78–80; Prymak-Lewtak A. Litewsko-białoruskie oblicza J. I. Kraszewskiego. Prolegomena // Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годдзя праф. А. Мальдзіса / пад рэд. С. Запрудскага, А. Фядуты і З. Шыбекі. Мінск, 2007. С. 269–281.

лірніка" ўспрымалі як свайго і літоўскія, і беларускія сяляне, прычым на беларускіх творцаў мела непасрэдны ўплыў і яго польскамоўная спадчына[58]. У літоўскім нацыянальным адраджэнні "Маргер" набыў асаблівую папулярнасць, як і сама тэматыка барацьбы старадаўняй Літвы з Ордэнам наогул. У Коўне з 1918 г. ставілася гістарычная драма, прысвечаная абароне Піленаў, а ў 1942 г. літоўскія жаўнеры ў адным з савецкіх фармаванняў прысягалі Маргеру, што будуць помсціць немцам[59]. І для пачынальнікаў новай беларускай літаратуры У. Сыракомля быў неаспрэчным аўтарытэтам. Аднак антынямецкая эпапея паэта засталася ў ёй, здаецца, без уплываў і паслядоўнікаў. Вядома толькі, што з літаратуры такога кшталту на беларускую мову была перакладзена гістарычная аповесць А. Міцкевіча "Конрад Валенрод". Пераклад, зроблены напярэдадні паўстання Арцёмам Вярыга-Дарэўскім, на жаль, не выйшаў у друку, аднак, па сведчанні А. Кіркора, ён быў "досыць распаўсюджаны ў рукапісах"[60].

Не беручы ў разлік згаданага перакладу, можна канстатаваць, што нечага свайго, арыгінальнага пра войны з Ордэнам па-беларуску ў літаратуры не было сказана да канца XIX ст. Першым гэтую тэму крануў Францішак Багушэвіч у славутай прадмове да свайго зборніка "Дудка беларуская" (1891). Упершыню канцэптуалізуючы Беларусь нацыянальна, паэт напісаў, што яна яшчэ да князя Віценя "разам з Літвой баранілася ад крыжацкіх напасці", але, як лагічна вынікае з цытаванай прадмовы, гэта былі часовыя цяжкасці: потым князь Гедымін "злучыў зусім Беларусію з Літвой у адно сільнае каралеўства і адваяваў шмат зямлі ад крыжакоў і ад другіх суседзяў"[61].

Францішку Багушэвічу належыць і вобраз немца, створаны ім у аднайменным вершы. Яго апісанне мае выразна негатыўныя канатацыі[62], але важна адзначыць, што тут, у адрозненне

[58] Мархель У. Творчасць Уладзіслава Сыракомлі. Мінск, 2005. С. 236, 237; Prymak-Lewtak A. Litewsko-białoruskie oblicza J. I. Kraszewskiego. S. 276 і наст.

[59] Гл.: Nikžentaitis A. Das Bild des Deutschen Ordens in der litauischen Geschichtsschreibung und Publizistik // Vergangenheit und Gegenwart der Ritterorden. Die Rezeption der Idee und die Wirklichkeit. Toruń, 2001. S. 119, 129.

[60] Живописная Россия. Т. 3: Литовское и Белорусское Полесье. С. 327. Пар.: Мальдзіс А. Творчае пабрацімства. С. 84.

[61] Багушэвіч Ф. Творы / уклад. Я. Янушкевіч. Мінск, 1991. С. 17.

[62] Багушэвіч Ф. Цыт. твор. С. 32–33.

ад дыскурсу заходнярусаў, цалкам адсутнічае канфесійнае супрацьпастаўленне: чужынец успрымаецца толькі ў сацыяльным ракурсе. Немец фігуруе разам з яўрэем (жыдам) як чужы; яны падобныя мовай і хваткай ("дзеці адной маткі"), разам запраўляюць у горадзе, дзе абодва пры першай магчымасці будуць эксплуатаваць мясцовага беларускага мужыка ("абдзяруць як ліпку"). Паэт, які, па азначэнні сучаснай літаратурнай крытыкі, "сацыяльны ў кожным сваім радку"[63], і тут застаўся верны свайму ідэйнаму крэда.

## 4.3 Грунвальд і пачаткі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі

Калі беларускі нацыянальны рух на пачатку XX ст. перарос з культурнага ў палітычны і дзякуючы легалізацыі друку стаў фактарам палітычнага жыцця, яго далейшае развіццё не магло адбывацца без арганізацыі нацыянальнай памяці, іншымі словамі – без нацыянальнага гісторыяпісання. Сучасныя параўнальныя даследаванні фармавання маладых еўрапейскіх нацый паказваюць, што прэтэндаваць на статус нацыі супольнасць магла толькі маючы ўласную нацыянальную гісторыю[64]. У беларускім выпадку выданнем, якому выпала роля першага нацыянальнага наратыву, што аддзяляў уласна беларускае мінулае і ад расійскіх, і ад польскіх трактовак, стала "Кароткая гісторыя Беларусі" Вацлава Ластоўскага[65]. Спачатку яна друкавалася на старонках "Нашай Нівы", а потым убачыла свет асобнай кнігай. Хоць пэўная традыцыя разгляду мінулага Беларусі як асобнай краіны існавала і раней, менавіта В. Ластоўскі ў сваім папулярным нарысе ўпершыню разгледзеў яе мінулае скрозь прызму "карысцей і шкод беларускага народа"[66], канцэптуаль-

[63] Казбярук У. Дарога на Парнас // Заняпад і адраджэнне: Беларуская літаратура XIX ст. / уклад. У. Казберука. Мінск, 2001. С. 17.

[64] Грох М. Нацыянальная гісторыя як канструкцыя: чэшскае выключэнне ці еўрапейская норма? // Homo Historicus 2008 / пад рэд. А. Смаленчука. Вільня, 2008. С. 343–344.

[65] Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910. Пар.: Sienkievič V. Łastoŭski the historian and his historical views // JBS. Vol. V (1984). Nr. 3–4. P. 5–6; Лінднэр Р. Гісторыкі і ўлада. С. 79.

[66] Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі (цыт. па факсімільным перавыданні – Мінск, 1993). С. 5.

на выклаўшы ўсю айчынную гісторыю як біяграфію нацыянальнай супольнасці. Нягледзячы на невялікі аб'ём і кампілятыўны характар выдання, кніжачка вядомага ідэолага і актыўнага дзеяча беларускага нацыянальнага руху доўгі час выкарыстоўвалася як навучальны дапаможнік[67] і значна ўплывала на гістарычныя погляды наступных пакаленняў беларусаў (а перавыдадзеная ў суверэннай Беларусі – нават праз стагоддзе пасля свайго выхаду). У гэтым сэнсе яе з поўным правам можна назваць першым беларускім майстар-наратывам[68].

Тэме войнаў з Ордэнам у нарысе гісторыі В. Ластоўскага адведзена, можна сказаць, мізэрнае месца, асабліва калі ўлічыць, што кніга выйшла ў год гучнага юбілею Грунвальда. Пра барацьбу Полацка з крыжаносцамі тут наогул нічога не сказана, затое выразна экспанавана барацьба палачан з Кіевам. Нямецкія рыцары толькі прынагодна згаданы аўтарам як адзін з фактараў палітычнай гісторыі ВКЛ. Знамянальна, што пра бітву пад Грунвальдам В. Ластоўскі ўспомніў адным сказам, характарызуючы панаванне Вітаўта: "Сілу крыжацкую ў бітве пад Грунвальдам Вітаўту ўдалося зусім зламаць"[69], хоць дзейнасці вялікага князя прысвяціў ажно 5 старонак свайго кароткага нарыса. Маргінальнае значэнне гэтай падзеі ў нарысе адпавядала прагматычнай устаноўцы В. Ластоўскага, якому важна было адасобіць Беларусь у мінулым ад польскай і расійскай традыцый, пры гэтым Польшчу ён паказаў у яшчэ больш негатыўнай іпастасі, чым Расію[70]. Падобная перспектыва характарызавала погляды В. Ластоўскага і пазней. Так, у леген-

[67] Пар.: Снапкоўская С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Мінск, 1998. С. 109–111; Багдановіч І., Багдановіч А. Этапы станаўлення нацыянальнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі ў канцы XIX – 60-х гадах XX ст. // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Мінск, 2009. С. 34.

[68] Пад "майстар-наратывам" тут разумеецца звязны і адназначны выклад гісторыі нацыі ці нацыянальнай дзяржавы. Пар.: Jarausch K., Sabrow M. "Meistererzählung" – Zur Karriere eines Begriffs // Jarausch K., Sabrow M. (Hg.) Die historische Meistererzählung. Deutungslinien der deutschen Nationalgeschichte nach 1945. Göttingen, 2002. S. 16.

[69] Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі. С. 27.

[70] Пра вобразы Польшчы і Расіі ў названым творы, а таксама накірункі міфалагізацыі мінулага В. Ластоўскім гл. спецыяльны аналіз польскага сацыёлага Р. Радзіка: Radzik R. Kim są Białorusini? Toruń, 2002. S. 30–40.

дзе "Вітаўт і Ягайла", якая быццам была запісана ім у 1916 г., а ў сапраўднасці больш падобная на аўтарскі твор, апавядаецца толькі пра вайну Вітаўта з Ягайлам за незалежнасць ад Польшчы, без усялякіх алюзій на вялікую вайну з прускімі рыцарамі[71]. У іншых публіцыстычных творах В. Ластоўскага роля Ордэна ў беларускай гісторыі таксама была, можна сказаць, мінімалізаваная.

Між тым юбілей, зладжаны палякамі ў 1910 г., стаў важнай вяхой пашырэння ведаў пра Грунвальд на землях былога ВКЛ. Раней нават у літоўскім пісьменстве гэтая падзея асабліва не абмяркоўвалася, і толькі з нагоды юбілею бітве была прысвечана серыя артыкулаў у літоўскім перыядычным друку. Літоўскія публікацыі прэзентавалі ўжо сваю, арозную ад польскай інтэрпрэтацыю даўняй бітвы, названай па-літоўску *Žalgiris* ("зялёны лес"), што было літаральным перакладам польскага *Grunwald*. Вырашальную ролю ў атрыманні перамогі літоўцы, канешне ж, адназначна аддавалі Вітаўту, а паведамленне Длугаша пра ўцёкі яго войска з поля бою лічылі свядомай хлуснёй. Памяць пра Грунвальд-Жальгірыс ператварылася тады ў актуальную тэму польска-літоўскай гістарычнай палемікі[72].

Вось жа кракаўскае святкаванне Грунвальдскага юбілею выявіла не толькі markрознае разуменне Грунвальда, але і ўсю розніцу ўспрымання немцаў у нацыянальных рухах маладых народаў былой Рэчы Паспалітай. Праўдападобна, яшчэ ў пачатку 1910 г. агульнапольскі камітэт па арганізацыі свята звярнуўся да ўсіх "жыхароў Польшчы і Літвы" з запрашэннем прыехаць на ўрачыстасці пад Вавель[73], г. зн. пачаткова задумваўся ўдзел грамадзян першай Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Такое прадстаўніцтва не толькі сімвалізавала б гістарычнае адзінства яе народаў супраць даўняга ворага, але і прадэманстравала б жыц-

[71] Ластоўскі В. Выбраныя творы. Мінск, 1997. С. 153–154. У апавяданні пра Вітаўта і Ягайлу для беларускіх дзяцей таксама гаворыцца толькі пра цяжкую вайну Вітаўта супраць імкнення Ягайлы далучыць Літву і Беларусь да Польшчы. Гл.: Pieršaja čytanka / złažyŭ W. Łast. Wilnia, 1916. S. 59.

[72] Petrauskas R., Staliūnas D. Die drei Namen der Schlacht. Erinnerungsketten um Tannenberg / Grunwald / Žalgiris // Verflochtene Erinnerungen: Polen und seine Nachbarn im 19. und 20. Jh. Hg. von M. Aust, K. Ruchniewicz und S. Troebst. Köln, 2009. S. 122–123; Petrauskas R. Grunwaldu życie pośmiertne od XV do XX w. S. 151, 195.

[73] Kosman M. Krzyżacy w historii i legendzie wieków. W 600 rocznicę grunwaldzkiej wiktorii. Toruń, 2010. S. 226–227.

цёвасць ягелонскай ідэі. Невыпадкова на цокалі грунвальдскага помніка былі змешчаны выявы гербоў Польшчы, Літвы і Русі (а таксама Чэхіі і Маравіі як тых, што дапамагалі ў бітве). Як пасярэдніца ў справу заангажавалася прадстаўніца краёўцаў Канстанцыя Скірмунт, аўтарка папулярных прац па гісторыі Літвы, якая бачыла ў супольным святкаванні магчымасць "загаіць раны" крыўд і спрэчак паміж палякамі і літоўцамі[74]. У чэрвені 1910 г. з Пінска яна яшчэ старалася пераканаць арганізацыйны камітэт запрасіць у Кракаў літоўцаў, а лідараў літоўскага руху намаўляла ўзяць удзел у свяце. Аднак, хоць 14 чэрвеня камітэт прыняў такое рашэнне, зладзіць супольную ўрачыстасць не атрымалася, і К. Скірмунт неўзабаве канстатавала, што іх лідары "не зразумелі нас"[75].

Няўдачу ініцыятывы супольнага святкавання Грунвальда прадвызначылі актуальныя адносіны маладых нацыянальных рухаў з палякамі. Літоўцы, нацыянальныя лідары якіх крыўдзіліся, што палякі не трактуюць іх як роўных сабе, не паехалі на свята, вырашыўшы накіраваць туды толькі ксяндза Юозаса Тумаса як свайго карэспандэнта. Па дарозе з Кракава ён наведаў Львоў, дзе крытычна расказаў пра ўрачыстасці з літоўскага пункту гледжання[76]. Не прыслалі ў Кракаў сваю дэлегацыю і ўкраінцы[77]. Гэта і лагічна, бо ні першыя, ні другія, у адрозненне ад палякаў, не бачылі ў Нямеччыне ворага. Украінцы з-за канфлікту з палякамі ў Галіцыі ўспрымалі немцаў хутчэй як саюзнікаў супраць Польшчы, чым наадварот. З нагоды святкаванага ў Кракаве юбілею адзін з карэспандэнтаў украінскага друку адзначыў, што ў саміх палякаў "без беларусаў, русінаў, татараў і чэхаў наогул не атрымалася б ніякай перамогі"[78].

[74] Szpoper D. Gente Lithuana, natione Lithuana. Myśl polityczna i działalność Konstancji Skirmunt (1851–1934). Gdańsk, 2009. S. 208.

[75] Ibidem. S. 212–214, 217.

[76] Падрабязней гл.: Mir. Brak szczerości // Kurier Litewski. 1910. Nr. 159. S. 1.

[77] Mick Ch. Kriegserfahrungen und die Konstruktion von Kontinuität. Schlachten und Kriege im ukrainischen und polnischen kollektiven Gedächtnis 1900–1930 // Gründungsmythen – Genealogien – Memorialzeichen. Beiträge zur institutionellen Konstruktion von Kontinuität. Hg. von G. Melville und K.-S. Rehberg. Köln, 2004. S. 121; Petrauskas R. Grunwaldu życie pośmiertne od XV do XX w. S. 151–152.

[78] Цыт. па: Mick Ch. Kriegserfahrungen und die Konstruktion von Kontinuität. S. 121.

Найверагодней, прадстаўнікі яшчэ слабога беларускага нацыянальнага руху і не запрашаліся на кракаўскія ўрачыстасці, або яны, як і літоўцы з украінцамі, зусім праігнаравалі іх. У кожным разе ні намер удзельнічаць, ні тым больш іх прысутнасць на свяце нічым не засведчана – у адрозненне ад панславісцкіх арганізацый Расіі, якія адразу пацвердзілі свой удзел у кракаўскім свяце[79]. Увогуле, даводзіцца прызнаць, што з прычыны недахопу звестак пакуль невядома, як успрымаўся юбілей Грунвальда ў віленскім асяродку беларусаў і ці тэма наогул выклікала якія-небудзь абмеркаванні. Літоўскі прыклад для віленскіх беларусаў калі і меў значэнне, то мінімальнае. Вядома, што толькі адзінкі прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху напярэдадні І сусветнай вайны ведалі літоўскую мову (звычайна дзякуючы сваяцкім сувязям з літоўцамі). А вось уплыў групы віленскіх краёўцаў на беларускіх лідараў, асабліва на кола "Нашай Нівы", можна дапускаць з большай верагоднасцю[80].

Рызыкнем выказаць дапушчэнне, што менавіта ўрачыстасці польскай грамадскасці ў Вільні, дзе святкаванне юбілею 1910 г. наладзіў Фердынанд Рушчыц, як і польска-літоўская палеміка падштурхнулі беларускіх лідараў да таго, каб упершыню публічна экспанаваць Грунвальд як падзею нацыянальнай гісторыі. Адзіная на той час беларуская газета "Наша Ніва" ў ліпеньскім нумары змясціла фрагмент "Хронікі Быхаўца" з апісаннем гістарычнай бітвы, да якога быў дададзены сціплы рэдакцыйны каментар: "Немцы тады насядалі на Польшчу і Літву; гэта і прымусіла іх злучыцца ў адно гасударства. Пасьля Грунвальдзкай бітвы <...> немцы страцілі сваю сілу"[81]. Ідэя пра дэтэрмінаванасць Крэўскай уніі пагрозай з боку Ордэна адпавядала канцэпцыі Грунвальда, пашыранай у польскай гістарыяграфіі, і яшчэ не звязвалася з лёсамі беларускага народа. Пазней жа, цягам усяго юбілейнага года ў беларускім штотыднёвіку больш не было ніякіх іншых

[79] Kosman M. Krzyżacy w historii i legendzie wieków. S. 228. Дакладна вядома пра ўдзел у свяце трох паслоў дзяржаўнай думы. Гл.: Rodziczew T. Obchód Grunwaldzki // Goniec Litewski. 1910. Nr. 97. S. 1–2.

[80] Пра кантакты і прыхільнае стаўленне краёўцаў да беларускага руху гл.: Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. С. 334–336 і наст.

[81] Гл.: Наша Ніва. 1910. № 28. 8 (21) ліпеня. С. 1–2.

згадак пра славутую падзею. Ды і ў наступныя гады газета на сваіх старонках не вярталася да сярэднявечнай бітвы.

Тым не менш, менавіта рэдакцыя "Нашай Нівы" паспрабавала замацаваць падзею ў гістарычнай памяці беларусаў – увяла дату бітвы ў першыя беларускія календары, выдаваныя газетай. Адметна, што каляндар на юбілейны 1910 год яшчэ не меў ніякага гістарычнага раздзела, і толькі наступны, на 1911 год, змяшчаў храналогію знамянальных датаў, паміж якімі была і Грунвальдская бітва[82]. Такая ж табліца датаў без зменаў паўтаралася ў аналагічных календарах, выдаваных рэдакцыяй газеты некалькі наступных гадоў[83]. Цікава, што сярод выбраных падзей, гады якіх уключаны ў храналогію, абсалютна дамінуюць падзеі культурна-рэлігійнага характару. У іх шэрагу Грунвальдская бітва – фактычна адзіная падзея з палітычнай гісторыі, калі не лічыць далучэнні тэрыторый Беларусі да Расіі ці Прусіі. Гэта можна разумець як ускоснае сведчанне пэўнай імправізацыйнасці ўключэння названай даты ў каляндар, рашэнне аб якім прымалася, відаць, досыць хутка, пад уплывам актыўнасці палякаў і літоўцаў. Аднак ініцыяваная "Нашай Нівай" традыцыя перарвалася пасля таго, як календары пачало выдаваць Беларускае Выдавецкае Таварыства ў Вільні. Ужо ў календары на 1914 год, падрыхтаваным названай арганізацыяй, чытач не знайшоў ніякай гістарычнай храналогіі, адпаведна і ніякай згадкі пра бітву пад Грунвальдам[84]. Болей у беларускіх календарах, выдаваных у Вільні пад расійскай уладай, храналагічныя табліцы знамянальных падзей не змяшчаліся.

Адсутнасць зваротаў да славутай бітвы і якой-небудзь падтрымкі варожага вобраза Нямеччыны была характэрна не толькі для асяроддзя "Нашай Нівы", але і для іншых колаў беларускай грамадскасці. Паказальнай уяўляецца пазіцыя газеты нацыянальна-дэмакратычнага накірунку "Biełarus", што выдавалася ў Вільні з 1913 г. для беларусаў-каталікоў. Напрыклад, у нарысе пра мінулае Беларусі, да якога газета звярталася, трэба прызнаць, зусім рэдка, Рыгор Кляновіч

[82] Biełaruski kalendar "Našaje Nivy" na 1911 hod. Vilnia, 1911. S. 5.

[83] Беларускі каляндар "Нашай Нівы" на 1912 г. Вільня, 1912. С. 5.

[84] Гл.: Беларускі каляндар на 1914 г. Вільня, 1913. Не з'явілася ніякіх напамінкаў пра бітву ў пазнейшых беларускіх календарах, якія выдаваліся ў Вільні ў гады вайны і пасля заканчэння. Гл.: Беларускі каляндар на 1925 г. Вільня, 1925.

арыгінальна растлумачыў шляхі пераходу беларускіх земляў пад уладу літоўскіх князёў: даўнія княствы Беларусі з XIII ст. пераходзілі пад іх уладу "ахвотна, бо трэба ведаць, што тагды ўся бадай цяперашняя Расея была пад уладаньнем татараў – дзікага і строгага народу <…>. То ж нашы продкі, каб збавіцца ад татараў, пераходзілі пад Літву, дзе ім было вельмі добра"[85]. Як бачым, Ордэн як другі знешні вораг, роля якога ў працэсе ўтварэння ВКЛ у беларускай гістарыяграфіі пазней набудзе статус аксіёмы, тут яшчэ не згаданы. Па ўсім відаць, аўтару важнейшым уяўлялася адасабленне ад Расіі, тады як акцэнтаванне гістарычнай варожасці немцаў нічым не навязвалася.

У цэлым сярод беларусаў напярэдадні сусветнай вайны марна было б шукаць той германафобіі, якая, як адзначалася вышэй, ахапіла тады польскія і расійскія эліты. Варожы стэрэатып немца, асацыяванага з тэўтонскім рыцарам, паспеў сфармавацца нават у літоўскім нацыянальным руху. Для літоўскага палітыка і гісторыка Пятраса Клімаса, як ён апісаў у сваім дзённіку ўваход нямецкага войска ў Вільню 18 верасня 1915 г., жаўнеры кайзераўскай Германіі былі "амаль такія ж, як пяцьсот гадоў назад, ахутаныя ў шэрыя плашчы, – не хапала толькі крыжа"[86]. Падобныя асацыяцыі, здаецца, ніяк не маглі ўзнікнуць ва ўяўленнях лідараў беларускага нацыянальнага руху. Гэтую розніцу ўскосна пацвярджае адзін з канцэптуальных накідаў беларускай гісторыі, напісаны Антонам Луцкевічам найверагодней незадоўга да вайны. Разглядаючы толькі полацкі перыяд, адказнасць за страту выхаду да Балтыйскага мора па Дзвіне аўтар усклаў на саміх полацкіх князёў[87] і не выявіў патрэбы звязваць нядолі беларускага краю з нямецкім "націскам".

У беларускай публіцыстыцы тых часоў, наколькі можна меркаваць па апублікаваных тэкстах, цалкам адсутнічала антынямецкая ці наогул антызаходняя рыторыка. Паказальнымі ў гэтых адносінах можна лічыць нейтральныя паведамленні пра пачатак сусветнага ваеннага канфлікту і падзеі першых гадоў вайны на старонках "Нашай Нівы". Вось пры-

[85] Klonowicz R. Nowaja pucina // Biełarus. 1914. № 6. S. 2.
[86] Klimas P. Dienoraštis. 1915–1916. Chicago, 1988. P. 26. Цыт. па: Tauber J., Tuchtenhagen R. Vilnius. Köln, 2008. S. 159.
[87] Lietuvos mokslų akademija Vrublevskių biblioteka. F. 21 (VBF) Nr. 331. арк. 11.

клад змрочных прадчуванняў, выказаных карэспандэнтам названай газеты ў ліпені 1914 г.: "З усходу плывуць хвалі аграмаднай расейскай арміі, з захаду – нямецкай, і хто ведае, ці не тут – на нашых палёх – адбудзецца страшная бітва народаў, такая крывавая, якой сьвет даўно ня бачыў"[88]. Далёкім ад ваенна-патрыятычнай рыторыкі рускамоўнай прэсы, выдаванай у Вільні, быў і змест публікацый газеты беларусаў-каталікоў "Biełarus".

Такім чынам, калі гаварыць пра гістарычныя ўяўленні нацыянальна арыентаваных беларускіх элітаў, то для іх, нягледзячы на прапаганду імперскага і польскага гісторыяпісання, бітва пад Грунвальдам і напярэдадні I сусветнай вайны не стала значнай падзеяй мінулага Беларусі. Спроба рэдакцыі "Нашай Нівы" пашырыць веды пра бітву сярод сваіх чытачоў, уключыўшы яе ў каляндар найважнейшых датаў, не выклікала рэзанансу ў грамадскай думцы і не атрымала далейшага развіцця. Памяць пра гэтую падзею, як і пра войны з Нямецкім ордэнам наогул, здаецца, нічым і не магла быць актуалізаваная. Беларускаму руху ў яго палітычнай практыцы на пачатку стагоддзя не была патрэбнай антынямецкая ідэалогія, а пазней яе і не магло быць, паколькі нямецкая акупацыйная ўлада фактычна падтрымала нацыянальнае развіццё беларусаў, дазволіўшы ў 1915 г. афіцыйную працу беларускіх школ і выкарыстанне беларускай мовы[89]. Здаецца, лідары беларускага руху і да гэтага ўсведамлялі, што ў перпектыве для фармавання маладой нацыі, заціснутай паміж Расіяй і Польшчай, выкарыстанне вобраза Грунвальда, які ўжо служыў ідэнтыфікацыйным сімвалам для палякаў і аспрэчваўся ў іх расійскімі панславістамі, наўрад ці прынесла б карысці.

[88] А-н-а. [Луцкевіч А.] Вайна пачалася // НН. 1914. № 29. С. 1.

[89] Падрабязней аб прызнанні немцамі нацыянальнай асобнасці беларусаў, пачаткі беларускага школьніцтва і яго развіццё пад нямецкай акупацыйнай уладай гл.: Turonek J. Białoruś pod okupacją niemiecką. Warszawa, 1989. S. 21–24; Ляхоўскі У. Школьная адукацыя ў Беларусі падчас нямецкай акупацыі (1915–1918 г.). Вільня – Беласток, 2010. С. 75–89, 119–135.

## Раздзел 5

# Выкарыстанне гісторыі ў польска-нямецкім канфлікце XX ст.

### 5.1 Услаўленне тэўтонскіх рыцараў у III Райху

> *...новая імперыя павінна б рушыць шляхам колішніх рыцараў Ордэна...*
>
> Адольф Гітлер[1]

Ваймарская рэспубліка, абвешчаная пасля вайны, пераняла ў спадчыну ўсе тыя даўно распаўсюджаныя ў нямецкім грамадстве ўяўленні, якія служылі апраўданню нямецкага валодання былымі польскімі землямі – перакананне ў перавазе нямецкай нацыі над усходнімі суседзямі, асабліва палякамі, ідэю пра заходне-ўсходні культурны ўхіл (*West-Ost-Gefälle*) і тэорыю нямецкага “культуртрэгерства”[2]. Грамадска-палітычны клімат Ваймарскай рэспублікі шмат у чым быў прадвызначаны жорсткімі ўмовамі Версальскага дагавора 1919 г., пасля падпісання якога ў Нямеччыне нарасталі настроі перагледзець новыя дзяржаўныя межы і не прызнаваць “версальскую сістэму” наогул. Страціўшы значныя тэрыторыі на карысць Польшчы, пераможаная Нямеччына праводзіла антыпольскую палітыку. У такім кантэксце ў 1920-я г. быў утвораны асобны накірунак палітычна заангажаваных даследаванняў Цэнтральна-Усходняй Еўропы з мэтай іх выкарыстання ў інтарэсах нямецкай дзяржавы, які ў навуковай адміністрацыі атрымаў назву *Ostforschung* (“усходнія даследаванні”, або “вывучэнне ўсходу”). Народы названай часткі Еўропы ў такіх дасле-

[1] Hitler A. Mein Kampf. München, 1933. S. 154.
[2] Behrens G. Der Mythos der deutschen Überlegenheit. Frankfurt a. M., 2012. S. 236 і наст.

даваннях разглядаліся з германацэнтрычнай перспектывы – як аб'екты рэгіёна нямецкага дамінавання, а не як раўнапраўныя суб'екты гістарычна-культурнага працэсу. Палітычная заангажаванасць новага даследчыцкага накірунку вынікала са стаўлення да ўмоў Версальскага дагавора. Этнацэнтраваныя "ўсходнія даследаванні", ключавым паняццем якіх стала формула "*Volksboden*" (літаральна "зямля народа", вобласць рассялення этнічна гамагеннага насельніцтва), мусілі гістарычна аргументаваць рэвізіяністычныя дамаганні адносна Польшчы і пацвердзіць "права радзімы" для нямецкіх меншасцяў у Чэхаславакіі, Латвіі і Эстоніі[3]. Пасля далучэння Нямеччыны да Лігі нацый (1926), калі Берлін прыняў на сябе адказнасць за нямецкія меншасці па-за Нямеччынай, "Остфоршунг" узяўся падтрымліваць іх нямецкую ідэнтычнасць[4]. Распрацоўваючы "гісторыю народа" (*Volksgeschichte,* тэрмін, які да 1945 г. быў фактычна другім азначэннем названых даследаванняў), тэматычна і метадалагічна звязаную з праблемамі сучаснасці, новы накірунак адразу стаў на службу антыпольскай палітыцы. Некаторыя навукоўцы бачылі ў выніках сваіх прац не толькі інтэлектуальны аргумент, але і палітычную "зброю" ў барацьбе нямецкага народа супраць несправядлівасцяў Версальскага дагавора. Як напісаў у 1931 г. гісторык Эрых Машке, "няшчасце краіны вымушае" з гістарычных крыніц і аповедаў "выплавіць зброю для барацьбы за існаванне"[5]. Не дзіўна, што ў Польшчы "Остфоршунг" разглядалі як падрыхтоўку да наступнага этапу "Дранг нах Остэн" і не лічылі сапраўднай навукай.

Ва ўмовах нарастання напругі з Польшчай немцы ўзвялі свой Танэнбергскі помнік – манумент у гонар перамогі 1914 г.

[3] Падрабязней пра сутнасць "Остфоршунга" гл.: Mühle E. 'Ostforschung'. Beobachtungen zu Aufstieg und Niedergang eines geschichtswissenschaftlichen Paradigmas // ZfO. Jg. 46 (1997). H. 3. S. 328–330; Hackmann J. Deutsche Ostforschung und Geschichtswissenschaft // Deutsche Ostforschung und polnische Westforschung im Spannungsfeld von Wissenschaft und Politik. Hg. von J. M. Piskorski in Verb. m. J. Hackmann, R. Jaworski. Osnabrück, Poznań, 2002. S. 31–32; Petersen H.-C., Kusber J. Osteuropaforschung zwischen Osteuropäischer Geschichte und Ostforschung // Kulturwissenschaften und Nationalsozialismus. Hg. von J. Elvert, J. Nielsen-Sikora. Stuttgart, 2008. S. 292 і наст.

[4] Паказальна, што ў некаторых працах "Остфоршунга" ўказвалася на групы немцаў, якія знаходзіліся пад славянскім ціскам, і гэты феномен быў ідэнтыфікаваны як славянскі "Дранг нах Вэстэн". Гл.: Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 122.

[5] Цыт. па: Mühle E. 'Ostforschung'. S. 330–331, спас. 51.

Як пісаў у сваіх успамінах Гіндэнбург, ён павінен быў заглушыць балючыя напаміны пра першую бітву пад Танэнбергам. Манументальны васьмікутнік, які быў урачыста адкрыты ў 1927 г., а пазней пры Гітлеры стаў "Маўзалеем імперыі", сімвалізаваў расплату за паразу 1410 г., хоць такая сімвалічнасць усё ж "кульгала": у першай бітве перамога была за палякамі, а ў другой адплачана было расійскай арміі[6].

Такім чынам, фармальна дэмакратычная Ваймарская рэспубліка стала рэальнасцю, у якой набор ідэалагемаў аб перавазе немцаў над славянамі набыў канкрэтнае экспансіяніцкае напаўненне. Яшчэ больш агрэсіўны змест яны атрымалі ў Трэцім Райху, калі з'явілася ўстаноўка на працяг перапыненага пасля Сярэднявечча "націску на Усход", а сталіца Тэўтонскага ордэна Мальбарк стала сімвалам захопніцкай усходняй палітыкі Нямеччыны[7]. З прыходам да ўлады Гітлера надышлі часы найбольшай запатрабаванасці для "Остфоршунга". Многія яго прадстаўнікі ўступілі ў нацыянал-сацыялісцкую партыю і сталі экспертамі ў планах пераўсталявання Усходняй Еўропы[8]. "Остфоршунг" пачаў адкрыта служыць інтарэсам палітыкі і прэзентаваўся як "навука, што змагаецца" (*kämpfende Wissenschaft*). Супрацоўнікі інстытутаў "усходніх даследаванняў" ўдзельнічалі ў ідэалагічна-прапагандысцкай падтрымцы акупацыйнай палітыкі нацыянал-сацыялістаў[9].

Хоць ідэалагічная праграма гітлераўскага кіраўніцтва грунтавалася на агістарычнай расавай тэорыі, яна ўключала і ўсхваленні пэўных перыядаў ды з'яў нямецкай гісторыі, асабліва сярэднявечнага *Ostbewegung* ("руху на Усход") і *Drang nach*

[6] Падрабязней гл.: Ekdahl S. Tannenberg / Grunwald – ein politisches Symbol in Deutschland und Polen. S. 266, 267, 276.

[7] Ekdahl S. Denkmal und Geschichtsideologie im polnisch-preußischen Spannungsfeld // Zum Verständnis der polnischen Frage in Preußen und Deutschland 1772–1871. Hg. von K. Zernack. Berlin, 1987. S. 128–154, 185.

[8] Mühle E. 'Ostforschung'ю S. 331–334; Krzoska M. Ostforschung // Handbuch der völkischen Wissenschaften. Hg. von I. Haar, M. Fahlbusch. München, 2008. S. 458 і наст.

[9] Hackmann J. Deutsche Ostforschung und Geschichtswissenschaft. S. 42, 43; пар.: Mommsen W. J. Von Volkstumskampf zur nationalsozialistischen Vernichtungspolitik in Osteuropa. Zur Rolle der deutschen Historiker unter dem Nationalsozialismus // Deutsche Historiker im Nationalsozialismus. Hg. von W. Schulz und O. G. Oexle. Frankfurt a. M., 2000. S. 183–214.

*Osten*[10]. Нацыянал-сацыялісты актуалізавалі даўнюю тэорыю нямецкага "культуртрэгерства", якая выкарыстоўвалася прапагандай для абгрунтавання ідэі пашырэння "жыццёвай прасторы" (*Lebensraum*). Гэты тэрмін быў уведзены ў палітычны лексікон яшчэ ў пачатку XX ст. нямецкім географам Фрыдрыхам Ратцэлем, аднак толькі пры Гітлеры ён займеў шырокую папулярнасць. Нацыянал-сацыялісты перанеслі на грамадства вучэнне Дарвіна аб барацьбе за выжыванне відаў у прыродзе. У іх названы тэрмін стаў радыкальным канцэптам палітыкі, якая грунтавалася на прымітыўным дарвінізме і пастулявала пастаянную барацьбу народаў за выжыванне, а значыць і за тэрыторыю, неабходную для жыцця. Патрэбу ў "жыццёвай прасторы" менавіта на еўрапейскім Усходзе ідэолагі нацыянал-сацыялізму апраўдвалі быццам рэальнай шматвекавой палітыкай нямецкай экспансіі ва ўсходнім накірунку[11].

Такім чынам, выкарыстаны для апраўдання Гітлеравых планаў агрэсіі супраць усходніх дзяржаў, слоган *Drang nach Osten* набыў новае жыццё. У 1940 г. Вільгельм Градман у выданні пра новаанексаваныя польскія землі напісаў: «Тое, што нашы ворагі называюць "нямецкім Дранг нах Остэн", ёсць не праяўленнем прагі заваяванняў ці нейкай несправядлівай палітыкі сілы... Наадварот, гэта арганічны працэс урастання нямецкага народа ў прастору, прадвызначаную для яго прыродай»[12]. Падобны падыход знаходзім у кнізе пра Усходнюю Еўропу для настаўнікаў гісторыка Густава Зімаляйта. Кіруючыся ўказаннем фюрэра "перавесці погляд на нямецкі Усход", ён злучыў у адзін натуральны працэс вялікага "нямецкага высілку" нічым не звязаныя гістарычныя з'явы і працэсы розных эпох: сярэднявечныя перасяленні, дзяржаву Нямецкага ордэна, прыток нямецкіх каланістаў у Польшчу ў XVI–XVII ст., усходнюю палітыку Брандэнбургіі-Прусіі і нават перасяленні немцаў XVIII–XIX ст. у Расію[13].

У такім кантэксце Тэўтонскі ордэн, які сімвалізаваў нямецкі *Drang nach Osten*, стаў адной з улюбёных фігур нацыянал-сацыя-

[10] Wippermann W. Der "deutsche Drang nach Osten". S. 139.

[11] Tkaczynski J. W. Der "Drang nach Osten". S. 7, 18–19.

[12] Das deutsche Weichselland. Ein Bilderbericht / mit einer Einführung von W. Gradmann. Berlin, 1940. S. 5–6; Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 125.

[13] Simoleit G. Ostdeutschland und Osteuropa. Ein Hilfsbuch zur Behandlung deutscher Ostfragen aus Geschichte und Gegenwart. Berlin, 1937. S. 48–66, 77–80, 81–90, 92–97.

лісцкіх аўтараў і выкарыстоўваўся іх прапагандай. Невыпадкова Вермахт выкарыстаў на самалётах і танках сімволіку Ордэна (чорны крыж на белым фоне). Паказальна, што гісторык Эрнст Герынг ужо ў гады вайны з СССР прысвяціў рыцарам кнігу, у якой, паўтараючы думкі Трайчке, прыпісваў сярэднявечнаму Ордэну мэту стварэння нямецкай імперыі, а разгром рыцараў пад Танэнбергам называў вынікам здрады не толькі кульмскага рыцарства, але і рымскага папы[14]. Сярод нацыянал-сацыялісцкіх лідараў Ордэнам захапляўся адзін Альфрэд Розенберг, які ў 1934 г. арганізаваў сваю ўрачыстую прамову адмыслова ў Мальбарку, дзе паўтараў ідэю пра Ордэн як фарпост супраць Усходу. Ідэолаг нацыстаў сцвярджаў, што ўжо магістр Герман фон Зальца, "першы фюрэр Ордэна", ставіў сабе на мэце "забяспечваць і пашыраць нямецкую жыццёвую прастору (*Lebensraum*)"[15]. Праўда, наступны раз Мальбарк стаў палітычным сімвалам толькі ў 1940 г., калі харугвы Ордэна, страчаныя пры разгроме пад Грунвальдам, з акупаванага Кракава, дзе яны захоўваліся на Вавелі, былі ўрачыста ўвезены ў рэзідэнцыю вялікіх магістраў. Гэтая падзея выклікала шмат увагі ў Прусіі, але ў маштабах усяго Райху не ўзняла ніякага рэха[16]. На прыклад Ордэна спасылаўся і сам Гітлер, праўда, толькі двойчы. У кнізе "Mein Kampf" фюрэр згадаў Ордэн, калі пісаў, што зямлю можна будзе здабыць толькі за кошт Расіі, і новая нямецкая імперыя павінна будзе "падацца шляхам колішніх ордэнскіх рыцараў"[17]. Апошні раз ён прывёў рыцараў у прыклад радыкальнай нямецкай палітыкі на Усходзе ў гады вайны супраць СССР: маўляў, як Ордэн "з бібліяй прынёс і меч", так і нямецкія жаўнеры, пасланыя на Усход, "пры патрэбе павінны б сцвярджаць нашы народныя інтарэсы з выкарыстаннем грубай сілы"[18].

Падагульняючы, варта падкрэсліць, што пры ўладзе нацыянал-сацыялістаў як сам Тэўтонскі ордэн, так і топас Танэнберга

[14] Hering E. Der Deutsche Ritterorden. 2. Auf. Leipzig, 1944. S. 227, 231, 301.

[15] Цыт. па: Burleigh M. The Knights, nationalists and the historians. P. 21. Пар.: Wippermann W. Der Ordensstaat als Ideologie. S. 267.

[16] Arnold U. Die Marienburg als politisches Symbol... S. 38.

[17] "*Wollte man in Europa Grund und Boden, so konnte dies im großen und ganzen nur auf Kosten Rußlands geschehen, dann mußte sich das neue Reich wieder auf der Straße der einstigen Ordensritter in Marsch setzen, mit dem deutschen Schwert, dem deutschen Pflug die Scholle, der Nation aber das tägliche Brot zu geben*". Гл.: Hitler A. Mein Kampf. 29. Aufl. München, 1933. S. 154.

[18] Цыт па: Ekdahl S. Tannenberg / Grunwald – ein politisches Symbol in Deutschland und Polen. S. 272.

ўсё ж не сталі важным месцам іх афіцыйнай гістарычнай памяці[19]. Галоўныя лідары, найперш Гітлер і Гебельс, наогул не імкнуліся пераймаць традыцыю ордэнскіх рыцараў. Больш за тое: як калісьці Напалеон у Нямеччыне (1809), так Гітлер забараніў Нямецкі ордэн у Аўстрыі (1938) і Чэхаславакіі (1939). Пазіцыя ж Розенберга і Гімлера, якія з пашанай ставіліся да Ордэна, была неафіцыйнай. Рэальная гісторыя мала цікавіла кіраўнікоў III Райха, бо іх расавая ідэалогія была па сутнасці агістарычная. Нацыянал-сацыялісцкая ідэя знішчыць на Усходзе "непаўнавартыя" расы і гадаваць там "добрую" германскую не магла знайсці апору на нейкія ўзоры ці прыклады з гісторыі Ордэна і ўсходняй каланізацыі. Афіцыйныя ідэолагі нямецкіх фашыстаў фактычна адмаўлялі само развіццё ў гісторыі, іх светагляд меў у аснове "агістарычна-біялагістычную" арыентацыю[20].

З даследаванняў В. Віпэрмана вынікае, што ў III Райху суіснаваў шэраг ідэалагізаваных вобразаў Ордэна, але не з'явілася новых, уведзеных самімі нацыянал-сацыялістамі сэнсатворных ідэй рыцарскай дзяржавы. Галоўныя кампаненты ідэалогіі Ордэна, якія фунцыянавалі пры нацыянал-сацыялістах, былі ранейшыя, і яны мелі найперш антыпольскі змест: Ордэн сімвалізаваў нямецкі *Drang nach Osten* і культуртрэгерскую місію немцаў у адносінах да ўсходніх суседзяў[21]. Хоць нацысцкія лідары Нямеччыны лічылі, што сваёй усходняй палітыкай яны развіваюць далей той працэс, які быў пачаты яшчэ Генрыхам III і магістрамі Нямецкага ордэна, а потым працягнуты Фрыдрыхам Вялікім і Бісмаркам, ідэя падобнага кантынуітэту не была іх вынаходствам. Яе агучылі нямецкія гісторыкі яшчэ ў XIX ст., а пасля іх той жа тэзіс, але з дыяметральна змененымі ацэнкамі, сталі выкарыстоўваць польскія, расійскія і затым савецкія аўтары. Што да бітвы пад Танэнбергам, то яна ў III Райху са зразумелых прычын не шанавалася, аднак яе помнілі і падавалі як міжбой паміж двума светамі, як сутыкненне дабра і зла, – у стылізацыі, падобнай на польскі вобраз Грунвальда, толькі з процілеглай заменай роляў[22]. Паглядзім цяпер, як актуалізавалася памяць пра сярэднявечную бітву ў мадэрнай Польшчы.

[19] Schenk F. B. Tannenberg / Grunwald. S. 450–451.

[20] Падрабязней гл.: Wippermann W. Der Ordensstaat als Ideologie. S. 275, 285; idem, "Gen Ostland wollen wir reiten!". S. 234–235.

[21] Wippermann W. Der Ordensstaat als Ideologie. S. 283, 383–384.

[22] Ekdahl S. Tannenberg / Grunwald – ein politisches Symbol in Deutschland und Polen. S. 271; idem, The battle of Grunwald / Tannenberg and its political and symbolic interpretations… P. 16–20.

## 5.2 Новая манументалізацыя Грунвальда ў Польшчы

*Воўчая натура нямецкага імперыялізму не змянілася з часоў Ульрыха фон Юнгінгена да часу Конрада Адэнаўэра.*

Уладыслаў Гамулка[23]

Пасля 1918 г. польскія эліты небеспадстаўна глядзелі на Нямеччыну як на дзяржаву пераможаных, таму ў міжваенны перыяд увага да Грунвальдскай бітвы ў Польшчы прыкметна зменшылася. Больш важнае месца ў калектыўнай свядомасці палякаў заняў тады "цуд над Віслай" 1920 г. і польска-савецкая вайна наогул. Аднак у сувязі з адкрытым імкненнем Ваймарскай рэспублікі да перагляду ўмоў Версальскага трактата і педаляваннем праблемы нямецкай меншасці ў II Рэчы Паспалітай пагроза "нямецкага націску" ўспрымалася як актуальная, і Грунвальд па-ранейшаму функцыянаваў як фактар калектыўнай свядомасці. Невыпадкова "Крыжакі" Г. Сянкевіча заставаліся ў праграме абавязковага чытання ў сярэдняй школе (твор знялі са спіса толькі на адзін навучальны год у сувязі з нямецка-польскім збліжэннем, якое вызначалася дагаворам 1934 г., аднак у 1937 г. ён быў вернуты ў абавязковыя праграмы)[24].

Напад Гітлера на Польшчу ў 1939 г. стаў тым момантам, які быццам даказваў праўдзівасць сцвярджэнняў аб захопніцкіх установках усёй нямецкай палітыкі ад Бісмарка да нацыянал-сацыялістаў. У польскай палітычнай думцы гітлерызм успрымаўся як падсумаванне "ўсіх тэндэнцый зла і несправядлівасці", звязаных з немцамі як нацыяй[25]. Лішне казаць, што ў сітуацыі вайны з Нямеччынай значэнне Грунвальдскай бітвы як сімвала не магло не ўзняцца, а гітлераўская агрэсія супраць СССР стварыла дадатковую глебу яе ўзнясення – з'явіліся супольныя антынямецкія інтарэсы. Традыцыйна па-

[23] Gomułka W. 550 rocznica zwycięstwa pod Grunwaldem // idem, O Problemie niemieckim. Artykuły i przemowienia. Warszawa, 1971. S. 200.
[24] Пар.: Kosman M. Na tropach bohaterów "Krzyżaków". S. 175.
[25] Pasierb B. Niemcy w polskiej myśli politycznej. S. 114.

мяць пра Грунвальд у Польшчы падтрымлівалі палітычныя групы нацыянальна-дэмакратычнай арыентацыі, якія ў міжваенны перыяд будавалі сваю ідэалогію на канцэпцыі т. зв. "пясtаўскай ідэі", што прадугледжвала вяртанне на заходнія землі. Польскія ж камуністы былі супраць прэтэнзій на Заходнюю Прусію і Сілезію, і бітва 1410 г. як сімвал адпору немцаў іх не цікавіла. Аднак пасля чэрвеня 1941 г., асабліва пасля выкрыцця катыньскіх злачынстваў, калі савецкае кіраўніцтва разарвала адносіны з эміграцыйным польскім урадам і стала ўтвараць сваю структуру для пераймання ўлады ў пасляваеннай Польшчы, яны амаль дыяметральна змянілі погляды[26]. Услед за нацыянальна-дэмакратычным лагерам польскія палітычныя арганізацыі ў СССР звярнуліся і да антынямецкай гістарычнай сімволікі. Ужо ў лютым 1943 г. яны пачалі рэкламаваць вайну з гітлераўскай Нямеччынай як этап тысячагадовай барацьбы польскага і іншых славянскіх народаў з нямецкай агрэсіяй[27]. У мэтах гэтай прапаганды быў выкарыстаны сімвалічны рэсурс бітвы пад Грунвальдам. Па рашэнні польскага камуністычнага кіраўніцтва Першая дывізія пяхоты імя Тадэвуша Касцюшкі, утвораная ў далёкіх Сяльцах, на берагах ракі Акі, прымала прысягу ў дзень старадаўняй перамогі над Ордэнам – 15 ліпеня 1943 г., абяцаючы падрыхтаваць немцам "новы Грунвальд". Пасля гэтага ў польскім войску на савецкай тэрыторыі быў уведзены ордэн "Крыж Грунвальда", зацверджаны потым у агульнадзяржаўным статусе як узнагарода за гераізм у барацьбе "за свабоду і незалежнасць Польшчы"[28], што яскрава ілюстравала асаблівае месца памяці пра бітву ў вайсковых традыцыях палякаў. Летам 1944 г. Польскі Камітэт Нацыянальнага Вызвалення (з пачатку 1945 г. – часовы ўрад Польшчы) выступіў у Любліне з маніфестам, у якім між іншага гаварылася пра "новы Грунвальд", які немцам рыхтуюць польская і савецкая

[26] Serczyk J. Die Wandlungen des Bildes vom Deutschen Orden als politischer, ideologischer und gesellschaftlicher Faktor im polnischen Identitätsbewußtsein des 19. und 20. Jahrhunderts // Vergangenheit und Gegenwart der Ritterorden. Die Rezeption der Idee und die Wirklichkeit. Toruń, 2001. S. 60–61.

[27] Radziwiłłowicz D. Tradycja grunwaldzka… S. 214–215, 227.

[28] Grunwald: 550 lat chwały. Oprac. J. St. Kopczewski, M. Siuchniński. Warszawa, 1961. S. 329–332; Walichnowski T. Grunwald w świadomości współczesnych pokoleń Polaków // Grunwald w świadomości Polaków. Warszawa, Łódź, 1981. S. 56–57. Узнагарода "Крыж Грунвальда" заставалася актуальнай у Польшчы да 1992 г.

арміі. Згаданы маніфест, змест якога ўзгадняўся са Сталіным, ужо ўтрымліваў ідэю стварэння польска-расійскага фарпоста супраць немцаў, выказаную ў свой час Р. Дмоўскім, лідарам польскіх нацыянал-дэмакратаў, якія традыцыйна стаялі на самых антынямецкіх пазіцыях.

Ваенныя злачынствы нацыстаў рэтраспектыўна дэманізавалі немцаў і іх мінулае ў вачах як палякаў, так і іншых народаў, што перажылі акупацыю. Калі ў XIX ці нават на пачатку XX ст. палякі яшчэ не глядзелі на немцаў як на адназначнага ворага, а бачылі ў іх і нямала добрага, вартага пераймання, то ў выніку вайны адбылася глыбокая трансфармацыя вобраза немцаў, і нават тыя іх рысы, якія раней лічыліся пазітыўнымі, былі павернуты адваротным бокам[29]. Пад уплывам эмацыйнай канцэнтрацыі на перажытым усе немцы атаесамляліся з гітлераўцамі, іх характарызавалі як нацыю "прыроджаных забойцаў"[30]. Самі польскія навукоўцы (напрыклад, Станіслаў Асоўскі) адзначалі, што крайне негатыўны стэрэатып немцаў і пагарда да нямецкай культуры не адрозніваюцца ад расісцкіх падыходаў, ад тых жа біялагічных крытэрыяў, якімі раней кіраваліся нацыянал-сацыялісты ў адносінах да яўрэяў і славянскіх народаў[31]. Тым не менш, афіцыйная прапаганда падтрымлівала пашырэнне менавіта такога стэрэатыпа, і на першы план у масмедыях пасля вайны выносіўся вобраз немца як прытоенага гітлераўца ці як рэваншыста, што пагражае новым дзяржаўным межам Народнай Польшчы.

На сэнсавы змест міфа Грунвальдскай бітвы ў далейшым значна ўплываў фактар "вернутых земляў". Яшчэ пад канец вайны згаданы ПКНВ прыняў планы Крамля, якія прадугледжвалі далучэнне да будучай польскай дзяржавы заходніх земляў па Одэр і лужыцкую Нісу, дзякуючы чаму на захад перасоўвалася і сфера савецкіх уплываў. Польшчу і СССР цяпер аб'яднала ўзаемная зацікаўленасць у падзеле Нямеччыны і ліквідацыі

29 Szarota T. Niemcy i Polacy. Wzajemne postrzeganie i stereotypy. Warszawa, 1996. S. 149, 150; Wrzesiński W. Sąsiad. Czy wróg? S. 734; Berlińska D. Stary i nowy obraz Niemca w Polsce // Polacy i Niemcy na drodze do partnerskiego sąsiedztwa. Próba bilansu dziesięciolecia 1989–1998. Pod red. D. Bingena i K. Malinowskiego. Poznań, 2000. S. 28, 30.

30 Dmitrów E. Obraz Niemców w Polsce w latach 1945–1948 // Wokół stereotypów Polaków i Niemców / pod red. W. Wrzesińskiego. Wrocław, 1991. S. 194, 198–199.

31 Idem. S. 207.

Прусіі, бо толькі такія пераўтварэнні гарантавалі б існаванне адзінай Народнай Польшчы[32]. Дэкларацыяй, прынятай на Патсдамскай канферэнцыі 1945 г. лідарамі антыгітлераўскай кааліцыі, было прадугледжана высяленне немцаў з названых абшараў. Нягледзячы на тое, што на тэрыторыях, якія адышлі да Польшчы, палякі складалі менш за 10% насельніцтва, новыя ўлады абвясцілі іх "вернутымі", а само далучэнне – актам гістарычнай справядлівасці. І менавата вяртанне "сваіх" земляў мусілі абгрунтоўваць публіцысты і гісторыкі[33]. Асаблівая роля ў забеспячэнні аргументамі актуальнай дзяржаўнай палітыкі адводзілася даследчыкам польска-нямецкіх адносін, найперш супрацоўнікам заснаванага адразу пасля вайны Заходняга Інстытута ў Познані.

У публікацыях Заходняга Інстытута з 1945 г. бітва пад Грунвальдам эмацыйна называлася "сутыкненнем двух светаў, славянскага і нямецкага"[34]. Дырэктар названай установы Зыгмунт Вайцяхоўскі праводзіў наўпроставую сувязь паміж гадамі 1410-м і 1945-м, называючы перамогу над ІІІ Райхам "новым Грунвальдам", які на гэты раз трэба было выкарыстаць цалкам: "Мусім трывала адабраць у немцаў польскія землі, стаць бастыёнам у абароне славяншчыны ад немцаў..."[35]. Гісторык З. Вайцяхоўскі яшчэ ў міжваенны перыяд выпрацаваў канцэпцыю т. зв. "польскіх мацярынскіх земляў" з Памор'ем, Вялікапольшчай і Сілезіяй уключна, якія неабходна было забраць у немцаў, і дзеля адзінага фронту супраць Нямеччыны заклікаў да кампрамісу з Расіяй[36]. У першай паваеннай гісторыі польска-нямецкіх адносін[37] ён падаў суседства з немцамі як тысячагоддзе бясконцай барацьбы, напісаўшы, напрыклад, што немцы ўжо ў XIII–XV ст. праводзілі знішчэнне нацыянальнай польскай эліты. Такая радыкальна антынямецкая канцэпцыя гісторыі і была запатрабаванай у пасляваенным польскім грамадстве, асабліва ў эпоху Уладыслава Гамулкі, калі права на трактоўкі

[32] Пар.: Zernack K. Niemcy – Polska: z dziejów trudnego dialogu historiograficznego. Poznań, 2006. S. 170.

[33] Czubiński A. Ewolucja stanowiska publicystyki i historiografii polskiej wobec kwestii tzw. ziem odzyskanych (1939–2002) // idem, Spory o historię, prawdę i o nas. Poznań, 2011. S. 249–253, 255–256.

[34] Wojciechowski Z. Grunwald // PZ. 1945. № 1. S. 1.

[35] Ibidem. S. 6–7.

[36] Czubiński A. Ewolucja stanowiska publicystyki i historiografii. S. 254.

[37] Гл.: Wojciechowski Z. Polska – Niemcy: dziecięć wieków zmahania. Poznań, 1945.

мінулага манапалізавала прасавецкае дзяржаўна-партыйнае кіраўніцтва.

У ідэалогіі пасляваеннай польскай дзяржавы, якая "вярнула" пястаўскія землі, тэорыя двух ворагаў мусіла саступіць месца тэзісу аб адзіным ворагу, што пагражае з Захаду, паколькі Савецкі Саюз стаў галоўным саюзнікам, які гарантаваў Польшчы трываласць заходніх межаў. Прыклад жа Грунвальдскай бітвы дазваляў спалучаць антыгерманізм з прасавецкасцю, таму ёй у прапагандзе ПНР адводзілася асабліва важная роля. Цяпер пастаянна акцэнтавалася, што абедзве перамогі над немцамі (1410 і 1945) былі атрыманы дзякуючы аб'яднанню сілаў славянскіх народаў, таму іх саюз рэкламаваўся як гарантыя ад паўтарэння гістарычных памылак. Ідэя аб братняй сям'і славянскіх народаў[38] і СССР як галоўным саюзніку Польшчы стала адным з цэнтральных тэзісаў дзяржаўнай ідэалогіі.

Канкрэтнай палітычнай мэтай, якой служыла далейшае замацаванне негатыўнага вобраза немцаў у афіцыйнай літаратуры і нагнятанне страху перад небяспекай з Захаду, было паказаць высяленне немцаў з усходніх земляў былога III Райха як акт гістарычнай справядлівасці[39]. А ў дадатак гэта дазваляла затушоўваць т. зв. тэорыю "двух ворагаў" і паляпшаць вобраз Расіі / СССР, г. зн. умацоўваць "дружбу братніх народаў". Падобныя ўстаноўкі, асабліва акцэнтаванне спрадвечнага варварства і варожасці немцаў, увайшлі і ў гістарычную адукацыю. Характэрна, што "Крыжакі" Г. Сянкевіча, у якіх немцы ўвасаблялі само зло, з 1945 па 1960 г. перавыдаваліся каля дваццаці разоў, тады як Савецкі Саюз можна было паказваць толькі ў вобразе надзейнага саюзніка. Дзяржаўныя цэнзары сачылі, у прыватнасці, за тым, каб і ў польскіх падручніках па гісторыі абавязкова гаварылася пра "гераічны ўклад рускіх войск у Грунвальдскую перамогу"[40].

[38] Пар.: Grunwald – symbol sojuszu narodów słowiańskich // Skrzydła Wolności. 1956. Nr. 7. S. 4.

[39] Падрабязней пра палітычную кан'юнктуру такой устаноўкі гл.: Zabura M. "...nie będzie nigdy Niemiec Polakowi bratem"...? S. 283–285.

[40] Gancewska I. Ilustracja i narracja bitwy grunwaldzkiej w nauczaniu szkolnym po II wojnie światowej w Polsce do 1999 r. // Krajobraz grunwaldzki w dziejach polsko-krzyżackich i polsko-niemieckich na przestrzeni wieków. Wokół mitów i rzeczywistości. Red. Jana Gancewskiego. Olsztyn, 2009. S. 112.

Пачатак "халоднай вайны" ў расколатай Еўропе, падзел Нямеччыны і асабліва адмаўленне кіраўніцтва ФРГ прызнаць страту ўсходніх земляў абвастрылі антынямецкую прапаганду. З непрызнаннем новых межаў звязвалася небяспека ўзнаўлення "націску на Усход". Пасля афармлення NATO і ваеннага саюзу сацыялістычнага блока, вядомага як Арганізацыя Варшаўскага дагавора (1955), Грунвальд стаў ідэальным сімвалам для сацыялістычных армій. Злачынствы нацыянал-сацыялістаў выдаваліся за працяг захопніцкай палітыкі Ордэна, у сувязі з чым перамога 1410 г., як і разгром Гітлера, павінны былі астудзіць планы новых агрэсараў. Невыпадкова ў выкрыванні заходненямецкага рэваншызму афіцыйная прапагана шырока выкарыстоўвала плакат з выявай першага федэральнага канцлера Конрада Адэнаўэра ў плашчы "крыжака" (у 1958 г. той прыняў годнасць ганаровага рыцара адноўленага ў ФРГ Нямецкага рыцарскага ордэна)[41]. Варшава была гатовая на любую супрацу з Савецкім Саюзам, каб толькі, як гэта тлумачылася афіцыйна, не дазволіць рэваншыстам рэалізаваць "новы *Drang nach Osten*"[42].

У такім грамадска-палітычным клімаце з'явілася самая грунтоўная на той час акадэмічная праца, прысвечаная "Вялікай вайне" з Ордэнам і Грунвальдскай бітве як яе цэнтральнай падзеі, – манаграфія Стэфана М. Кучыньскага[43]. Чырвонай ніткай аўтар правёў праз яе ідэю аб тым, што названая вайна – гэта ўзор справядлівай вайны і абароны права польскага народа на існаванне. Згадаем, яшчэ К. Шайноха выказаў думку, што "дзякуючы бітве 1410 г. была на некалькі стагоддзяў адтэрмінавана небяспека вялікай тэўтонскай дзяржавы над Балтыкай"[44]. У працы С. М. Кучыньскага гэтая змрочная перспектыва, якую нібыта рыхтавалі немцы для славянскіх народаў, больш развіта і канкрэтызавана. Па яго сцвярджэннях, Тэўтонскі ордэн быў гатовы стварыць такую дзяржаву, якая "распасціралася б ад вострава Ругія да Фінскага заліва", што азначала б "ліквідацыю суседніх славянскіх і балцкіх дзяржаўных утварэнняў". Лёсаноснае значэнне бітвы 1410 г. і заключалася ў тым, што яна

[41] Patecka-Frauenfelder A. Stereotyp "Drang nach Osten"... S. 139.
[42] Пар.: Basiński E. Przeciwko *Drang nach Osten*. Polityka Polski i ZSRR w sprawie niemieckiej w latach 1950–1955. Warszawa, 1986. S. 207.
[43] Kuczyński S. M. Wielka wojna z Zakonem Krzyżackim w latach 1409–1411. Warszawa, 1955.
[44] Szajnocha K. Jadwiga i Jagiełło, 1374–1413. T. 3–4. S. 472.

спыніла на доўгія вякі «нямецкі "націск на ўсход" (*Drang nach Osten*)», які нёс "рэальную пагрозу пагібелі Польшчы і Літвы, а магчыма і Чэхіі, і Пскова, і Вялікага Ноўгарада", – напісаў польскі гісторык[45]. Ніякіх абгрунтаванняў рэальнасці падобных планаў Ордэна ён, як і К. Шайноха, не прывёў.

Кніга С. М. Кучыньскага з усімі яе плюсамі і мінусамі адразу стала класічным даследаваннем. Выклікаўшы палеміку, яна, тым не менш, вытрымала шэраг перавыданняў і дзесяцігоддзямі лічылася своеасаблівым "падручнікам" па Грунвальду, а яе аўтар набыў аўтарытэт вялікага эксперта па славутай бітве не толькі ў Польшчы, але і сярод савецкіх гісторыкаў. Асабліва значны ўплыў галоўныя тэзісы С. М. Кучыньскага аказалі на беларускую гістарыяграфію, да чаго мы яшчэ асобна звернемся ніжэй.

Завяршальным этапам манументалізацыі Грунвальда ў Польшчы і фармавання яго новай сімволікі для выкарыстання ў палітычных мэтах сталі ўрачыстасці з нагоды 550-й гадавіны вялікай бітвы ў 1960 г. Грунвальдскае свята было ўкампанавана ў цыкл урачыстасцяў, прысвечаных Тысячагоддзю польскай дзяржавы, і стала самым маштабным і відовішчным у гісторыі ўгодкаў бітвы. Арганізуючы яго правядзенне, улады кіраваліся тым, каб прадэманстраваць Захаду, што "польскі народ разам з братнімі народамі ўсіх сацыялістычных дзяржаў... утварае сілу, здольную даць рашучы і паспяховы адпор рэваншысцкаму *Drang nach Osten*"[46]. Кульмінацыйным момантам свята стала ўрачыстае адкрыццё велічнага помніка перамозе перад 200 тысячамі палякаў, што сабраліся 17 ліпеня на Грунвальдскім полі[47]. Пад час урачыстасцяў Уладыслаў Гамулка неаднакроць указваў на роднасць ФРГ "з найгоршымі традыцыямі прускага *Drang nach Osten*", называючы лідараў Заходняй Нямеччыны "наступнікамі крыжакоў", якія прышчапляюць

[45] Kuczyński S. M. Wielka wojna z Zakonem Krzyżackim. Wyd. 2. Warszawa, 1960. S. 10, 56, 62 (тут і далей цыт. па 2-м выд.). Гэты тэзіс аўтар паўтараў і развіваў таксама ў сваіх наступных працах. Пар.: Kuczyński S. M. Spór o Grunwald. Rozprawy polemiczne. Warszawa, 1972. S. 174.

[46] Tomkiewicz R. Rocznicy bitwy grunwaldzkiej w Polsce Ludowej. Olsztyn, 2011. S. 57. Падрабязна пра падрыхтоўку і правядзенне ўгодкаў гл. с. 121–132 і 170–183. Пар.: Walichnowski T. Grunwald w świadomości współczesnych pokoleń Polaków // Grunwald w świadomości Polaków. Warszawa, Łódź, 1981. S. 56–57.

[47] Grunwald: 550 lat chwały. S. 376.

свайму насельніцтву "дух шавінізму і няспынна трызняць пра новы крыжовы паход"[48]. Маўляў, шлях ім цяпер закрываюць дзяржавы сацыялістычнага лагера. Неабходнасць саюзу з іншымі славянскімі народамі на чале з СССР поруч з бясспрэчным правам Польшчы на атрыманыя заходнія і паўднёвыя землі належалі да тых ключавых ідэй, якія паўтараліся ў афіцыйных прамовах на ўрачыстасці[49]. У той жа дзень на экраны выйшаў фільм Аляксандра Форда "Крыжакі" – экранізацыя рамана Г. Сянкевіча, у якой нямецка-польскаму канфлікту і самой бітве аддадзена яшчэ больш месца, чым у літаратурным творы[50]. Так у юбілейных урачыстасцях, арганізаваных уладамі Народнай Польшчы ў 1960 г., памяць пра даўнюю бітву атрымала не толькі небывалы маштаб маніфеставання, стаўшы, па словах Р. Трабы, "гіганцкім спектаклем", але і новую канструкцыю сімвалічнасці: паміж 1410 і 1945 г. пралягла лінія наўпроставай сувязі, і сярэднявечнай бітве было прыпісана пасланне сацыялістычна-інтэрнацыяналісцкага зместу[51].

Рэакцыяй на развіццё нямецкага "Остфоршунга", які ў польскай гістарыяграфіі лічылі не навукай, а разнавіднасцю прыкладной палітыкі[52], стала разгортванне адпаведных польскіх даследаванняў захаду (*polska myśl zachodnia*), вывучэння вытокаў "нямецкай праблемы" і нямецкай каланізацыі славянскіх абшараў. Тэзіс пра першапачаткова славянскі характар далучаных да Польшчы тэрыторый падмацоўвала экспанаванне нямецкай каланізацыі як мэтанакіраванай палітыкі захопаў. Менавіта так яна традыцыйна прэзентавалася ў актывізаваных даследаваннях шматвекавога нямецкага "націску на ўсход". Калі некаторыя гісторыкі, як Юзаф Фельдман, звязвалі яго з Прусіяй ды кайзераўскай Германіяй і, даказваючы нязменнасць агрэсіўнай натуры немцаў, генетычна выводзілі адтуль гітлерызм, то іншыя, як Казімеж Піварскі, бачылі

[48] Gomułka W. 550 rocznica zwycięstwa pod Grunwaldem // idem, O Problemie niemieckim. Artykuły i przemowienia. Wyd. 2. Warszawa, 1971. S. 199.

[49] Tomkiewicz R. Rocznicy bitwy grunwaldzkiej... S. 187.

[50] Пар.: Jockheck L. Ein Nationalmythos in 'Eastman Color': Die Schlacht bei Tannenberg 1410 im polnischen Monumentalfilm "Krzyzacy" von Aleksander Ford // ZfO. Jg. 51 (2002). S. 224–225.

[51] Пар.: Traba R. Konstrukcja i proces dekonstrukcji narodowego mitu. S. 521.

[52] Borodziej W. "Ostforschung" aus der Sicht der polnischen Geschichtsschreibung // ZfO. Jg. 46 (1997). H. 3. S. 407.

ў *Drang nach Osten* суцэльны працэс нямецкай экспансіі, пачаты яшчэ крыжакамі[53]. Найбольш грунтоўны аналіз гэтага феномена правёў Г. Лябуда, які імкнуўся вывесці вывучэнне як ідэалогіі, так і самой гістарычнай з'явы "націску на ўсход" на салідны навуковы ўзровень, адмежаваўшыся ад тых спекуляцый, што замацавала за гэтым тэрмінам традыцыя. Пад феноменам *Drang nach Osten* ён прапанаваў разумець "захопніцкую форму нямецкай экспансіі, якая ў феадальны і капіталістычны перыяды ахоплівала розныя скандынаўскія, балцкія, заходнеславянскія, усходнеславянскія і балтыйскія народы"[54]. Нягледзячы на тое, што гісторык аддзяляў ад гэтай экспансіі "мірнае і творчае нямецкае пранікненне", г. зн. каланізацыю нямецкіх сялян і рамеснікаў, якую ацэньваў пазітыўна, рэалізацыю шматвекавога "націску на Усход" у форме захопніцкай і каланіяльнай палітыкі ў дачыненні да славян ён лічыў бясспрэчным фактам.

Палітычны кантэкст заўжды прадвызначаў разуменне мінулага гісторыкамі і спосаб пісання гісторыі. Калі ў 1970 г. дайшло да падпісання дагавора аб нармалізацыі ўзаемаадносін і добрасуседстве паміж ПНР і ФРГ, у якім прызнаваліся дзяржаўныя межы па лініі Одэр – Ніса, то перыяд вострай польска-нямецкай канфрантацыі завяршыўся. Хоць радыкальна сітуацыя тады яшчэ не змянілася, бо камуністычныя ўлады па-ранейшаму пры патрэбе выкарыстоўвалі стэрэатып "нямецкага *Drang nach Osten*", эксплуатуючы Грунвальд як сімвал яго адпору, разрадка напругі дазволіла пачацца працэсу крытыкі самой гэтай практыкі і перагляду гісторыі адносін з суседзямі. З адкрытых польска-нямецкіх кантактаў і дыялогу пачаліся важныя перамены ў палітычнай свядомасці палякаў. І, як адзначыў цытаваны вышэй Р. Траба, чым больш дэмакратызавалася грамадства, чым мацнейшай рабілася грамадзянская супольнасць, – тым менш заставалася патрэбаў у выкарыстанні сярэднявечнай бітвы для ідэалагічнай прапаганды[55].

[53] Feldman J. Problem polsko-niemiecki w dziejach. Katowice, 1946; Piwarski K.Współczesna historiografia zachodnioniemiecka o Drang nach Osten. Kraków, 1961. Пар.: Labuda G. Historiograficzna analiza tzw. niemieckiego "naporu na wschód". S. 52–56.

[54] Labuda G. Historiograficzna analiza tzw. niemieckiego "naporu na wschód". S. 57.

[55] Traba R. Konstrukcja i proces dekonstrukcji narodowego mitu. S. 525.

## 5.3 Шляхі дэміфалагізацыі сярэднявечнай бітвы

*Калі заціхлі найвялікшыя эмоцыі, звязаныя з II сусветнай вайной, гісторыкі і нямецкія, і польскія ўзяліся за спробы разрадзіць заіснавалыя міфы.*

Генрык Самсановіч[56]

Пасля перамогі саюзнікаў над гітлераўскім нацызмам славуты тэрмін "Дранг нах Остэн" увайшоў у яшчэ шырэйшае выкарыстанне, чым раней. Тая акалічнасць, што спачатку пангерманісты, а потым нацысты, якія ўчынілі жудасныя злачынствы супраць чалавецтва, ужывалі яго для азначэння быццам бы фундаментальнай рэальнасці нямецкай гісторыі, апраўдвала прымяненне слогана ў якасці інструмента антынямецкай прапаганды. Гэтая рамантычна-імглістая формула, зусім неўласцівая рацыянальным марксісцкім канструкцыям і непрыдатная для аргументаванай інтэрпрэтацыі гісторыі, перажывала свой чарговы рэнесанс як элемент вобраза нямецкага ворага ў гады халоднай вайны[57]. Яна шырока выкарыстоўвалася ў гістарычным дыскурсе не толькі ў СССР, але і ў дзяржавах усяго сацыялістычнага блока. Польскія гісторыкі, гэтаксама як савецкія, чэшскія ці славацкія, пісалі пра сярэднявечную "ўсходнюю экспансію" немцаў як складовую частку тысячагадовага нямецкага "Дранг нах Остэн", што дасягнуў апагея ў ваеннай агрэсіі Гітлера. Нават такі аўтарытэтны даследчык гісторыі польска-нямецкіх адносін, як Г. Лябуда, неаднаразова гаварыў пра тое, што тэзіс аб шматвяковым "нямецкім націску" трэба ўспрымаць як адпаведнасць гістарычным фактам, а не ставіцца да яго як да ідэалагічнай дэфармацыі гісторыі ці як да міфа.

Сённяшняму даследчыку важна ўлічваць, што тады, калі Еўропа раскалолася на два варожыя лагеры, гістарыяграфіі

[56] Samsonowicz H. Biała i czarna legenda Krzyżaków // Problemy. 1987. № 6. S. 7.

[57] Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 111, 131; Lemberg H. Drang nach Osten – mit i rzeczywistość // Polacy i Niemcy. Historia – kultura – polityka. Red. A. Lawaty i H. Orłowski. Poznań, 2003. S. 38.

ФРГ і сацыялістычнага блока адлюстроўвалі не столькі навуковыя пазіцыі, колькі ідэалагічныя ўстаноўкі і нацыянальна-палітычныя інтарэсы сваіх дзяржаў. Гэта асабліва тычылася славяна-нямецкіх адносін наогул і інтэрпрэтацыі бітвы пад Грунвальдам у прыватнасці. У ФРГ была адроджана спецыяльнасць “Остфоршунга”, якая набыла высокую палітычную актуальнасць, паколькі з’явілася патрэба абараняць права немцаў на забраныя ў іх усходнія землі. У адстойванні гэтых правоў важную ролю мела старая тэорыя сярэднявечнай нямецкай каланізацыі, *Ostbewegung*. Невыпадкова пасляваенны “Остфоршунг” шмат пераняў ад той традыцыі “даследаванняў Усходу”, якая сфармавалася ў эпоху Ваймарскай рэспублікі і пры нацыянал-сацыялістах[58]. Гэтая пераемнасць увасаблялася не толькі многімі ранейшымі кадрамі, але і старымі канцэптуальнымі ўстаноўкамі, спалучанымі цяпер з ваяўнічым антыкамунізмам. Апошняя акалічнасць ускладняла вызваленне ад сіндрома “культуртрэгерства” і ўяўленняў аб перавазе немцаў над славянамі, тым не менш працэс такога вызвалення і абнаўлення даследчыцкага накірунку пачаўся яшчэ ў эпоху халоднай вайны.

Змены да лепшага адбыліся ўжо ў 1960-я г., калі, як вобразна заўважыў амерыканскі даследчык, “гісторыкі сталі больш абачлівыя і менш упэўненыя ў сваёй беспамылковасці”[59]. Характэрна, што першыя імпульсы да абнаўлення былі зададзены ў Заходняй Нямеччыне задоўга да нармалізацыі палітычных яе адносін з Польшчай. Адным з першых з крытычным аналізам традыцыйных падыходаў і канцэпцый нямецкіх “даследаванняў Усходу” выступіў Вальтэр Шлезінгер, які ўжо ў 1957 г. паставіў пад пытанне сам тэзіс пра перавагі еўрапейскага Захаду над Усходам[60], а крыху пазней грунтоўна раскрытыкаваў зыходныя метадалагічныя пазіцыі і палітычную заангажаванасць “Остфоршунга”[61]. Гісторык заклікаў сваіх калег вызваліцца ад міжваеннай практыкі “падтрымкі або нават абгрунтавання сучаснасці гістарычнымі аргументамі”

[58] Mühle E. 'Ostforschung'. S. 336–349; Krzoska M. Ostforschung. S. 462–463.

[59] Urban W. Krzyżacy. Historia działań militarnych. S. 291.

[60] Schlesinger W. Die geschichtliche Stellung der mittelalterlichen Ostbewegung // HZ. Bd. 183 (1957). S. 540.

[61] Маецца на ўвазе рэферат В. Шлезінгера, які быў прачытаны ў Марбургу ў 1963 г., але выступ прызначаўся для т. зв. “унутранага карыстання” даследчыцкай рады Інстытута Гердэра і пабачыў свет толькі ў 1997 г. Гл.: Schlesinger W. Die mittelalterliche deutsche Ostbewegung und die deutsche Ostforschung // ZfO. Jg. 46 (1997). H. 3. S. 427–457; Гл.: Mühle E. 'Ostforschung'. S. 344–346.

і пастараецца рэпрэзентаваць "чыста навуковы, апалітычны пункт гледжання"[62]. У даследаваннях "нямецкай каланізацыі Усходу", што цэнтраваліся на катэгорыях тыпу *Volksboden* і абгрунтоўвалі няроўнасць народаў і нямецкае культуртрэгерства, формула *Volk* пад уплывам расавай ідэалогіі з гістарычнага паняцця ператварылася ў біялагічнае, падкрэсліў ён. У славянскіх жа гістарыяграфіях такім установкам была супрацьпастаўлена тэорыя *Drang nach Osten*, пра які пісалася нават у савецкіх і польскіх падручніках. Між тым сучасная навука дазваляе па-іншаму глядзець на нямецкае рассяленне на ўсходнія землі, прынамсі зусім не так, як яго тлумачылі Рудальф Кёчкэ ці Герман Аўбін, адзначыў В. Шлезінгер. Гісторык указаў на сацыяльна-эканамічную абумоўленасць сярэднявечнага каланізацыйнага руху, а таксама падкрэсліў той факт, што ў гэтым руху бралі ўдзел і славяне, якія зрабіліся паўнапраўнай часткай нямецкага народа[63].

Так старая парадыгма "Остфоршунга" ўжо ў 1960 г. стала аб'ектам адкрытых дыскусій. Крытыкаваліся найперш антыпольскія і антыславянскія ўстаноўкі гэтага накірунку даследаванняў. З таго часу адбываўся павольны працэс трансфармацыі палітызаванага нацыянальна-гістарычнага "Остфоршунга" ў дэпалітызаваныя агульнагістарычныя даследаванні Цэнтральна-Усходняй Еўропы, які завяршыўся пасля падзення Берлінскай сцяны, калі апошнім сімвалічным крокам разрыву з мінулым стала змена назвы часопіса[64].

Менавіта адыход нямецкіх гісторыкаў ад традыцыйных установак "Остфоршунга" абумовіў у 1970-я г. магчымасць іх адкрытага дыялогу з польскімі калегамі, які дазволіў пачаць перагляд схематычных трактовак найбольш спрэчных праблем супольнай гісторыі дзвюх нацый[65]. Але афіцыйнай асновай пачатку нармалізацыі ўзаемаадносін і пераадольвання негатыўнай стэрэатыпізацыі немцаў у свядомасці палякаў паслужыў дагавор 1970 г. паміж ПНР і ФРГ і адмова апошняй ад прэтэнзій на т. зв. "усходнія землі". Вызваленню ад памылак, нацыя-

[62] Schlesinger W. Die mittelalterliche deutsche Ostbewegung… S. 443, 456–457.

[63] Ibidem. S. 537, 453–455.

[64] У 1995 г. часопіс "Zeitschrift für Ostforschung" быў перайменаваны ў "Zeitschrift für Ostmitteleuropa-Forschung". Пар.: Mühle E. 'Ostforschung'. S. 326, 348–349.

[65] Пар.: Borodziej W. "Ostforschung" aus der Sicht der polnischen Geschichtsschreibung. S. 423–426.

налістычных дэфармацый і непатрэбнага пафасу паспрыяла праца камісіі ПНР і ФРГ па школьных падручніках гісторыі і геаграфіі, заснаванай у 1972 г. у адпаведнасці з умовамі згаданага дагавора. З таго часу дзякуючы наладжанаму дыялогу гісторыкі абедзвюх дзяржаў разам працавалі над пераглядам ранейшых ацэнак Нямецкага ордэна, а таксама аднабаковых трактовак нямецкага каланізацыйнага руху на ўсход, што афіцыйна ўсё яшчэ выдаваўся за *Drang nach Osten*.

Пазіцыі абодвух бакоў і ў ацэнках Ордэна, і ў поглядах на каланізацыю ўдалося зблізіць ужо на першай канферэнцыі. Кіруючыся імкненнем да аб'ектыўнасці і стараючыся зразумець візію процілеглага боку, удзельнікі нарадаў прызналі, што сярэднявечныя перасяленні немцаў на ўсход, якія лічыліся ў нямецкай гістарыяграфіі своеасаблівай цывілізацыйнай місіяй, а ў польскай “нямецкім націскам”, на справе былі часткай агульнаеўрапейскага дэмаграфічнага руху і гаспадарчага працэсу[66]. З іншай перспектывы на польска-нямецкіх сустрэчах навукоўцаў сталі разглядацца і некаторыя аспекты гісторыі Нямецкага ордэна. Было канстатавана, у прыватнасці, што не выпадае гаварыць пра Тэўтонскі ордэн як дзяржаву з нямецкім насельніцтвам, бо яна ад пачатку фармавалася як поліэтнічнае ўтварэнне, у якім з канца XIV ст. немцы не пераважалі, а пазней і саступалі па колькасці польскаму насельніцтву[67]. Пад перагляд трапілі і пашыраныя раней тэзісы аб знішчэнні ці поўнай дыскрымінацыі карэннага прускага насельніцтва на тэрыторыі Ордэна. Даследаванні паказалі, што ў прававым становішчы прусаў з усталяваннем новай улады не адбылося істотных зменаў. Прусы засталіся ў структурах улады і былі заангажаваны ў стварэнні новай дзяржавы, у тым ліку ў далейшай каланізацыі. У тыя часы тут, як паўсюль у Еўропе, этнічным асаблівасцям яшчэ не надавалася вялікага значэння, так што моўная асіміляцыя не з'яўлялася неабходнай умовай інтэграцыі грамадства[68].

[66] Topolski J. Problem consensusu i objektywizmu w pracach wspólnej polsko-RFN-owskiej komisji korygującej szkolne podręczniki historii // Polacy i Niemcy. Dziesięć wieków sąsiedztwa. Praca zbiorowa. Red. A. Czubiński. Warszawa, 1987. S. 467–468.

[67] Powierski J. Struktura etniczna społeczeństwa Prus krzyżackich w XIII–XVI w. // Rola Zakonu Krzyżackiego w podręcznikach szkolnych RFN i PRL. Pod red. M. Biskupa. Wrocław, 1976. S. 41–42, 45–46.

[68] Wunder H. Struktura społeczna Zakonu Krzyzackiego i ludności państwa zakonnego w Prusach // Rola Zakonu Krzyżackiego w podręcznikach szkolnych RFN i PRL. S. 18, 23–25.

Асабліва значным укладам у рэвізію поглядаў на *Drang nach Osten* сталі спецыяльныя даследаванні польскага гісторыка Бенедыкта Зентары, прысвечаныя каланізацыйнаму руху немцаў на еўрапейскі Усход у Сярэднявеччы. Крытычны аналіз з'явы дазволіў вучонаму яшчэ ў канцы 1960-х г. указаць на тое, што сам тэрмін *Drang nach Osten*, які выкарыстоўваецца ў гістарыяграфіях сацыялістычных краін для азначэння нямецкай каланізацыі ўсходу, непрыдатны для навукі[69]. Уяўленні гісторыкаў-славянафілаў аб перасяленнях нямецкіх сялян і мяшчан як "скрытай форме агрэсіі" з мэтай палітычнага падпарадкавання краю не мелі нічога агульнага з гістарычнай рэальнасцю, бо каланісты не ставілі перад сабой ніякіх палітычных мэтаў. Як і В. Шлезінгер, польскі гісторык падкрэсліў сацыяльную абумоўленасць феномена сярэднявечных міграцыйных рухаў. Навуковы падыход, падкрэсліў ён, адмаўляе не факт нямецкай экспансіі на славянскія землі, а тое, што яна была часткай нейкай праграмы, запланаванай агрэсіі нямецкага насельніцтва ці яго інстынктыўнага памкнення. Гэтую з'яву трэба разглядаць у катэгорыях знешняй экспансіі дзяржаўных арганізмаў як агульнаеўрапейскі феномен[70]. Нейкага агульнага працэсу як нямецкага "націску на Усход" не існавала. Праявы экспансіі IX–XII, XIII–XV ст. і пазнейшых часоў проста немагчыма звязаць у адзін працэс ужо хоць бы таму, што ўсе яе ўдзельнікі кіраваліся рознымі інтарэсамі. Прыкладам, экспансія нямецкіх князёў XII–XIII ст. на заходнеславянскія землі не мела нічога агульнага з пазнейшай каланізацыйнай актыўнасцю нямецкіх мяшчан ці сялян і пагатоў з культурным ды рэлігійным уплывам, а тэўтонскія рыцары ніколі не адстойвалі інтарэсаў Нямецкай імперыі, і г. д. Рух нямецкіх сялян і рамеснікаў на ўсход адрозніваўся ад іх перасяленняў у іншых накірунках толькі тым, што на ўсходніх землях яны сустракалі слабейшы супраціў. Іх рух у Італію быў таксама масавы, аднак тэрмін *Drang nach Süden* у гэтай сувязі не з'явіўся, – зазначыў Б. Зентара. Як неаднаразова падкрэсліў даследчык, у сапраўднасці нямецкіх перасяленцаў на ўсход вабілі толькі лепшыя сацыяльныя, гаспадарчыя і прававыя ўмовы жыцця, а не якія-небудзь нямецкія нацыянальныя ідэі[71].

[69] Zientara B. Konflikty narodowościowe na pograniczu niemiecko-siowiańskim w XIII– XIV w. i ich zasięg społeczny // PH. T. 59 (1968). Z. 2. S. 198.

[70] Zientara B. Z zagadnień terminologii historycznej // Społeczeństwo, gospodarka, kultura. Studia, ofiarowane M. Małowistowi. Warszawa, 1974. S. 430.

[71] Ibidem. S. 428, 429; пар.: Zientara B. Konflikty narodowościowe na pograniczu niemiecko-siowiańskim w XIII–XIV w. i ich zasięg społecz-

Заслугі Б. Зентары ў вызваленні даследаванняў нямецкай каланізацыі ад нацыяналістычных міфаў, аднабаковых трактовак і скажэнняў высока ацэнены ў сучаснай польскай і нямецкай гістарыяграфіях[72]. З нямецкага боку падобную ролю выканаў Вольфган Віпэрман, які пацвердзіў ключавыя тэзісы Б. Зентары і развіў іх. Нямецкі гісторык крытычна даследаваў як фармаванне ідэалагічных вобразаў Нямецкага ордэна ў розныя палітычныя эпохі, так і развіццё поглядаў на нямецкую каланізацыю, выявіўшы іх залежнасць ад польска-нямецкай канфрантацыі[73]. Ён паказаў, што сама з'ява, якую ў гістарычнай літаратуры называюць сярэднявечным "засяленнем усходу" (*Ostsiedlung*), была "адкрытая" толькі ў XIX ст. Сучаснікам жа заставалася невядомым усведамленне таго, што яны нібыта ўдзельнічаюць у нейкім эпахальным працэсе. Перасяленцы на ўсходнія землі шукалі лепшыя ўмовы для жыцця, і ніякіх нацыянальных нямецкіх інтарэсаў яны перад сабой не маглі ставіць. Канфлікты ж паміж славянамі і немцамі, на якія спасылаліся прыхільнікі канцэпцыі адвечнай польска-нямецкай варожасці, мелі сваёй асновай не этнічныя, а пераважна рэлігійныя і сацыяльныя, найперш гаспадарчыя матывы. Тым не менш у XIX ст. пакаленні гісторыкаў, публіцыстаў і літаратараў пачалі глядзець на сярэднявечную міграцыю на Усход як на "вялікі каланізацыйны чын (*Großtat*) нямецкага народа"[74].

ny // PH. T. 59 (1968). Z. 2. S. 202; idem, Drang nach Osten (Parcie na Wschód) // Mówią wieki. 1984. № 4. S. 2.

[72] Gawlas S. Stan badań nad polską świadomością narodową w średniowieczu // Państwo, naród, stany w świdomości wieków średnich / Red. A. Gieysztor i S. Gawlas. Warszawa, 1990. S. 173; Zernack K. Niemiecki Wschód – polski Zachód. O dziele życia polskiego mediewisty Benedykta Zientary (1928–1983) // idem, Niemcy – Polska: z dziejów trudnego dialogu historiograficznego. Red. H. Olszewski. Poznań, 2006. S. 272–273.

[73] Wippermann W. Der Ordensstaat als Ideologie. Das Bild des Deutschen Ordens in der deutschen Geschichtsschreibung und Publizistik. Berlin, 1979; idem, Der "Deutsche Drang nach Osten". Ideologie und Wirklichkeit eines politischen Schlagwortes. Darmstadt, 1981.

[74] Wippermann W. Der Ostsiedlung in der deutschen Historiographie und Publizistik. Probleme, Methoden und Grundlinien der Entwicklung bis zum Ertsen Weltkrieg // Germania Slavica I. Berlin, 1980. S. 49; idem, "Gen Ostland wollen wir reiten!" Ordensstaat und Ostsiedlung in der historischen Belletristik Deutschlands // Germania Slavica II. Berlin, 1981. S. 187; idem, Der "Deutsche Drang nach Osten". Ideologie und Wirklichkeit eines politischen Schlagwortes. Darmstadt, 1981. S. 15–16.

Сама "нямецкая каланізацыя ўсходу", па словах В. Віпэрмана, – гэта канструкт канца XVIII ст., выдумка нямецкіх гісторыкаў, якую потым запазычылі і гісторыкі польскія, змяніўшы ацэначныя знакі на процілеглыя. У адзін працэс імі быў штучна злучаны шэраг самых розных гістарычных з'яў: франкская экспансія VIII ст., экспансія саксонскай дынастыі X ст., каланізацыя нямецкіх і славянскіх князёў цэнтральна-нямецкіх земляў у XI–XII ст., падпарадкаванне Прусіі рыцарскім ордэнам у XIII ст., засяленне гістарычнай усходняй Нямеччыны і польскіх земляў сялянамі і рамеснікамі ў XIII–XIV ст., – і ўсё гэта называлася адзінай "нямецкай каланізацыяй усходу" (а некаторыя гісторыкі далучалі да яе нават каланізацыйныя працэсы XVIII ст.). Усё гэта міф, бо ў сапраўднасці не было такой каланізацыі як эпахальнага феномена[75]. Наогул, дапускаць пераемнасць пералічаных з'яў і пастуляваць рэальнасць палітыкі *Drang nach Osten* можна толькі пры ўмове прызнання "нацыянальнага характару", падкрэсліў В. Віпэрман[76]. Удакладнім, што паняццем нацыянальнага характару прадугледжваецца, быццам кожная нацыя валодае сваім комплексам індывідуальных рысаў, якія прадвызначаюць паводзіны яе членаў. І калі выкарыстоўваць такое азначэнне, дык трэба на самай справе *a priori* прызнаваць устойлівасць субстанцыянальнай прыроды нацыянальнай супольнасці, яе непадлегласць гістарычным зменам.

Ідэю аб характары народаў выказвалі яшчэ Шарль Мантэск'ё і Жан-Жак Русо, а потым і Ёган Готфрыд Гердэр, які пісаў пра *Volksgeist*, разумеючы пад ім дух народа як нейкую няўлоўную сутнасць, праяўляльную ў індывідуальных нацыянальных рысах – мове, народных звычаях і музыцы. Леапольд фон Ранке таксама пастуляваў, што адносіны паміж нацыямі прадвызначаюцца іх "асобнымі характарамі". З канца XIX ст., калі пад уплывам прыродазнаўчых навук канцэпт нацыянальнага характару быў інтэграваны ў сацыяльны дарвінізм і расавую тэорыю, ён набыў вялікую папулярнасць і рэдка падлягаў крытычнаму аналізу[77]. Шырокую вядомасць набылі, напрыклад, працы Вільгельма Вундта па псіхалогіі народаў, які лічыў мову, даўнія

[75] Wippermann W. "Aufschwung Ost" – Der Mythos "deutsche Ostkolonisation" in Gegenwart und Vergangenheit // Mitteleuropäische Mythen und Wirklichkeit. Wien – Toruń, 1996. S. 94–96, 98–99.
[76] Wippermann W. Der "deutsche Drang nach Osten". S. 133.
[77] Ritter H. National Character // A Global Encyclopedia of Historical Writing. Vol. II. New York – London, 1998. P. 649–650.

міфы і звычаі ўвасабленнем "самога духу народа"[78]. Яго сучаснік Гюстаў Лябон сцвярджаў, што характарам народа прадвызначаецца яго гісторыя і лёсы нацыі наогул[79]. Аднак пасля 1945 г., у выніку выкрыцця злачынстваў нацысцкага расізму і яго поўнай дыскрэдытацыі, канцэпт нацыянальнага характару займеў, можна сказаць, дрэнную рэпутацыю. Затым яго аўтарытэт падарвала і развіццё сацыяльнай гісторыі, якая паказала, што ў межах адной нацыі існуюць групы з адрознымі ўзорамі паводзін. Да праціўнікаў выкарыстання такога паняцця ў даследаваннях як занадта агульнага і непрыдатнага для пазнання даўно належала, напрыклад, польскі сацыёлаг Антаніна Класкоўска. Яна падкрэсліла, між іншага, што польская нацыя не валодае ніводнай рысай, якую не мелі б іншыя нацыі[80]. У свой час і ў савецкай навуцы сацыёлаг Ігар Кон, хоць не адмаўляў рэальнае існаванне такога феномена, як нацыянальны характар, выказаў шэраг важных перасцярог наконт яго вывучэння. Крытыкуючы расплывістасць самога паняцця з пазіцый марксісцкай сацыялогіі, вучоны таксама падкрэсліў гістарычнасць і адноснасць любых этнічных характарыстык: усе рысы нацыянальнага характару вытворныя ад гісторыі і таму мяняюцца разам з ёю, пры гэтым кожная з тыповых рысаў нейкай адной нацыі "ўласцівая не толькі ёй адной, а характарызуе таксама, у большай ці меншай ступені, іншыя народы"[81]. Словам, тэзіс пра статычнасць нацыянальных характараў і тым больш ідэю аб тым, што яны прадвызначаюць лёсы народаў, адхілялі і прадстаўнікі савецкай навукі. Іх асцярожнасць пацвердзілася сучаснай гуманітарнай навукай, для якой апеляцыі да "нацыянальнага характару" сталі анахранізмам. Цалкам крытычную пазіцыю да гэтага паняцця займаюць сёння сацыялагічныя даследаванні. Што ж да такога досыць новага канцэпту, як "нацыянальная ідэнтычнасць", то ён ніяк не можа

[78] Гл.: Вундт В. Проблемы психологии народов / перевод Н. Самсонова. Москва, 1912. С. 26, 32, 35.

[79] Гл.: Лебон Г. Психология народов и масс. С.-Петербург, 1995. С. 51–65.

[80] Kłoskowska A. Charakter narodowy a osobowość we współczesnej problematyce badań społecznych // KS. 1957. Nr. 1. S. 84. Аб праблематычнасці даследавання нацыянальнага характару выказваліся і польскія гісторыкі. Як прыклад гл.: Kieniewicz S. Charakter narodowy. Rzeczywistość czy stereotyp // KMW. 1984. Nr. 1–2. S. 5–11.

[81] Кон И. С. К проблеме национального характера // История и психология. Под ред. Б. Ф. Поршнева и Л. И. Анцыферовой. Москва, 1971. С. 147–148, 154–155.

лічыцца адпаведнікам азначэння “нацыянальны характар”[82]. Працэс самаідэнтыфікацыі, як вядома, ніколі не завяршаецца[83], і ніякая нацыянальная ідэнтычнасць не можа быць устойлівай.

Вяртаючыся да нямецкіх даследаванняў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, адзначым, што ўжо з 1970-х г. гісторыкі ФРГ выразна адрознівалі сярэднявечны “нямецкі рух на ўсход” ад каланізацыйных працэсаў і германізацыі XIX–XX ст. Беспадстаўнасць пераносу дзяржаўна-нацыянальных катэгорый на сярэднявечныя рэаліі і атаесамлення нямецкіх перасяленняў на ўсходнія землі з этнічнай экспансіяй немцаў дэманстравалася і ў даследаваннях іншых вучоных[84]. Абвяржэнні спробаў трактаваць названую з'яву як “нацiск”, абумоўлены нейкай унікальнай якасцю нямецкага характару, з'явіліся таксама ў амерыканскай гістарыяграфіі, прадстаўленай, у прыватнасці, працамі цытаванага вышэй Г. Мэера[85]. Як выявіў названы даследчык, з пачатку 1970-х г. тэрмін *Drang nach Osten* пачаў знікаць са старонак навуковай і даведачнай літаратуры на англійскай мове (хоць “выжыў” у некаторых амерыканскіх энцыклапедыях)[86], што засведчыла здаровы трэнд дэідэалагізацыі навукі.

Распрацоўка гісторыі Нямецкага ордэна, якая выклікала глыбокія эмоцыі і ўскладняла нямецка-польскія адносіны, стараннямі абодвух бакоў яшчэ ў эпоху “жалезнай заслоны” была выведзена на міжнародны ўзровень. З ініцыятывы і пад кіраўніцтвам польскага гісторыка Зянона Новака ў Торуні з 1981 г. пачалі праводзіцца міжнародныя канферэнцыі *Ordines militares – Colloquia torunensia historica,* на якіх заходнія і польскія даследчыкі рэгулярна звярталіся і да гісторыі ордэнскай дзяржавы ў Прусіі, вызваляючы яе абмеркаванне

[82] Kłoskowska A. Tożsamość i identyfikacja narodowa w perspektywie historyznej i psychospołecznej // KS. 1992. Nr. 2. S. 135–136; Пар.: Иханус Ю. Теоретические и методологические проблемы изучения “национального характера” // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання: Матэр. да Міжнар. навук.-практ. канф. Мінск, 1998. С. 24.

[83] Esser H. Soziologie. Spezielle Grundlagen. Bd. 6: Sinn und Kultur. Frankfurt / New York, 2001. S. 348; Бауман З. Индивидуализированное общество / пер. с англ. Москва, 2002. С. 176–192.

[84] Гл. выніковы том серыі навуковых сесій Канстанцкай працоўнай групы, праведзеных у пачатку 1970-х г.: Die deutsche Ostsiedlung des Mittelalters als Problem der europäischen Geschichte. Reichenau-Vorträge 1970–1972. Hg. von W. Schlesinger. Sigmaringen, 1975.

[85] Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 19 і наст.

[86] Ibidem. P. 111, 131.

ад нацыянальнай уразлівасці. З іншага боку, у Вене ў 1985 г. была ўтворана Міжнародная гістарычная камісія для даследаванняў Нямецкага ордэна, якая таксама арганізоўвала канферэнцыі з удзелам гісторыкаў з розных краін, выдаючы іх матэрыялы. Этапнай з'явай няпростага працэсу пераадольвання нацыянальнага эгацэнтрызму можна лічыць з'яўленне сінтэтычных прац па гісторыі Нямецкага ордэна, якія затым у перакладзе выходзілі ў суседзяў: з нямецкага боку гэта была кніга Гартмута Бокмана[87] з характэрнай для яе аб'ектыўнасцю і наватарскім падыходам, а з польскага – сінтэза двух знаўцаў Г. Лябуды і М. Біскупа[88]. У галіне даследаванняў самой бітвы пад Грунвальдам знакавымі ўяўляюцца шматцытаваная манаграфія шведскага гісторыка Свэна Экдаля[89], які прапанаваў вычарпальны крытычны аналіз усіх даступных на той час пісьмовых (і не толькі) крыніц, датычных бітвы, а таксама абагульняльная праца польскага археолага Анджэя Надольскага[90]. Заснаваны Польскай Акадэміяй Навук спецыяльны перыёдык "Studia Grunwaldzkie" быў свядома арыентаваны на міжнароднае вывучэнне грунвальдскай тэматыкі і адмяжоўваўся ад публікацый, абцяжараных любога роду прэзентызмам[91].

Фармаванне новай інтэлектуальнай традыцыі даследаванняў, свабодных ад нацыянальна-палітычнай заангажаванасці, паскорылася з падзеннем Берлінскай сцяны і падпісаннем дамовы аб добрасуседстве і супрацы паміж Рэспублікай Польшча і ФРГ (1991). Адкрытыя кантакты і дыялог навукоўцаў спрыялі таму, каб іх пазіцыі па самых спрэчных праблемах збліжаліся. На нямецка-польскіх форумах навукоўцаў выявілася, што, як засведчыў іх удзельнік Клаўс Мілітцэр, і для нямецкіх, і для польскіх гісторыкаў Нямецкага ордэна ўжо аднолькава непрымальная нацыянальная заангажаванасць і прадузятасць: іх адрозненні ў поглядах выяўляла не залежнасць ад т. зв. нацыянальных крытэрыяў, як гэта было да 1970-х г., а наяўныя факты

[87] Boockmann H. Der Deutsche Orden. Zwölf Kapitel aus seiner Geschichte. München, 1981. Польская версія: Zakon krzyżacki. Dwanaście rozdziałów jego historii. Warszawa, 1998.

[88] Biskup M., Labuda G. Dzieje zakonu krzyżackiego w Prusach. Gdańsk, 1986. Нямецкая версія: Die Geschichte des Deutschen Ordens in Preussen. Wirtschaft – Gesellschaft – Staat – Ideologie. Osnabrück, 2000.

[89] Ekdahl S. Die Schlacht bei Tannenberg 1410. Quellenkritische Untersuchungen. Bd.1: Einführung und Quellenlage. Berlin, 1982.

[90] Nadolski A. Grunwald. Problemy wybrane. Olsztyn, 1990.

[91] Гл.: Studia Grunwaldzkie. T. 1. Olsztyn, 1991. S. 9.

і пераканаўчасць аргументаў[92]. Удалым прыкладам такога навуковага збліжэння і плёну нямецка-польскага дыялогу гісторыкаў можна лічыць супольны том артыкулаў, прысвечаных даследчыцкім накірункам, якія ад свайго з'яўлення супрацьстаялі адзін аднаму – нямецкаму "Остфоршунгу" і польскаму "вывучэнню Захаду"[93]. Названае выданне прадэманстравала, што як нямецкія "даследаванні Усходу", так і польскае "вывучэнне Захаду" пазбавіліся ўласцівых ім раней апалагетычных установак. Стараннямі абодвух бакоў было канчаткова прызнана, што стэрэатып *Drang nach Osten* узнік у адказ на патрэбы ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці і ў эпоху канфрантацый выконваў палітычныя функцыі па абодва бакі мяжы.

Не ўдаючыся ў непатрэбны тут агляд новай гістарыяграфіі, у якасці характэрнага прыкладу сучаснага падыходу да складаных праблем польска-нямецкіх узаемаадносін адзначым працу Яна Піскорскага аб нямецкай каланізацыі Гданьскага Памор'я, даследаванай у шырокім кантэксце, як агульнаеўрапейскі феномен[94]. У ёй гісторык на канкрэтным матэрыяле паказаў, наколькі мала агульнага было паміж гістарычнай рэальнасцю і міфам пра нямецкую каланізацыю, народжаным нацыянальнымі гістарыяграфіямі XIX і XX ст. Закрануўшы найбольш дыскусійнае пытанне наконт ролі, якую нямецкая каланізацыя XII–XIV ст. магла выконваць у працэсе гаспадарчага развіцця земляў на ўсход ад Эльбы, польскі знаўца праблемы прыйшоў да пазітыўнай высновы: у цэлым яна была не тым няшчасцем для славян, пра якое калісь пісалі славянскія гісторыкі, а карыснай з'явай для ўсёй Цэнтральнай Еўропы[95]. Карыснай прынамсі тым, што заахвочвала мясцовае насельніцтва пераймаць больш развітыя

[92] Пар.: Militzer K. Der mittelalterliche Deutsche Orden in heutiger Sicht // Tannenberg Grunwald 2010. Gesammelte Beiträge. Wien, 2010. S. 45–46.

[93] Deutsche Ostforschung und polnische Westforschung im Spannungsfeld von Wissenschaft und Politik. Disziplinen im Vergleich. Hg. von J. M. Piskorski in Verb. m. J. Hackmann, R. Jaworski. Osnabrück, Poznań, 2002.

[94] Piskorski J. M. Kolonizacja wiejska Pomorza Gdańskiego w XIII i w początkach XIV wieku na tle procesów osadniczych w średniowiecznej Europie. Poznań, 2005; idem, The Medieval Colonization of Central Europe as a Problem of World History and Historiography // German History. V. 22 (2004). № 3. P. 323–343.

[95] Piskorski J. M. Kolonizacja wiejska... S. 228–229. Як указваў аўтар, ідэю пра паскарэнне сацыяльнага, гаспадарчага і нацыянальнага развіцця Польшчы дзякуючы нямецкай каланізацыі яшчэ ў міжваенны перыяд выказаў А. Брукнер. Гл.: Brückner A. Polska i Niemcy (1934) // idem, Kultura, piśmiennictwo, folklor. Warszawa, 1974. S. 374.

формы сацыяльнай арганізацыі. Этнічныя ж перамены адбываліся не настолькі хутка, каб іх эфекты можна было ацэньваць адразу. З іншага боку, пытанне этнічнай прыналежнасці падданых і не цікавіла князёў славянска-нямецкага памежжа: іх клапаціла найперш гаспадарчае і ваеннае ўмацаванне сваіх дзяржаў, а не мова ці звычаі насельніцтва.

Сярод характэрных прац новай гістарыяграфіі варта згадаць і даследаванне Марка Цэтвіньскага аб каланізацыі Сілезіі, у якой крытычна прааналізаваны як спробы абгрунтаванняў "адвечна славянскага" (польскага) характару названай зямлі ў польскай гістарыяграфіі, так і прыклады аналагічнага служэння задачам актуальнай палітыкі з боку нямецкіх навукоўцаў[96]. Такія ж узважаныя, пазбаўленыя тэндэнцыйнасці і нацыянальнага эгаізму даследаванні былі прысвечаны Прусіі і дзяржаве Нямецкага ордэна. Між іншага, яны пацвердзілі, што пра фізічнае знішчэнне прусаў не можа быць і размовы. Да пазнейшай асіміляцыі, ці знікнення прусаў як асобнага народа мог спрычыніцца цэлы шэраг фактараў, а найверагодней гэта стала вынікам каланізацыі іх тэрыторыі, якую ажыццяўлялі, аднак, не толькі немцы, але і палякі з літоўцамі[97]. Паказальна, што ў новай польскай медыявістыцы прызнаецца і аўтэнтычнасць прывілею Конрада Мазавецкага, дадзенага Ордэну ў 1230 г. на валоданне Хэлмінскай зямлёй[98], – пытанне, па якім з XIX ст. гісторыкі абедзвюх дзяржаў прынцыпова разыходзіліся! Вынікі падобных напрацовак апошніх дзесяцігоддзяў акумулявала новая калектыўная сінтэза пра ордэнскую дзяржаву ў Прусіі[99].

Больш грунтоўнага абагульняльнага даследавання, вольнага ад нацыянальных эгацэнтрызмаў, дачакалася і Грунвальдская бітва[100]. Ствараючы найлепшае ўражанне ўзроўнем абазнанасці аўтараў і ўзважанасцю іх меркаванняў, выдадзеная да

[96] Cetwiński M. Historia i polityka. Teoria i praktyka mediewistyki na przykładzie badań dziejów Śląska. Kraków, 2008.

[97] Пар.: Białuński G. Stan badań historycznych nad dziejami Prusów do 1945 r. // Pruthenia. T. 1. Olsztyn, 2006. S. 73–74.

[98] Гл.: Jasińki T. Uwagi o autentyczności przywileju kruszwickiego z czerwca 1230 r. // Personae – Colligationes – Facta. Red. J. Bieniak. Toruń, 1991. S. 226–239; Kucharski G. Przywilej kruszwicki Konrada Mazowieckiego dla Zakonu Krzyżackiego z 1230 // ZH. T. 65 (2000). Z. 3/4. S. 7–44.

[99] Państwo zakonu krzyżackiego w Prusach. Władza i społeczeństwo / Red. naukowa: M. Biskup, R. Czaja. Warszawa, 2008.

[100] Jóźwiak S., Kwiatkowski K., Szweda A., Szybkowski S. Wojna Polski i Litwy z zakonem krzyżackim w latach 1409–1411. Malbork, 2010.

600-годдзя падзеі калектыўная праца маладых польскіх гісторыкаў пазбаўляе канфлікт 1409–1411 г. многіх аспектаў, якія раней служылі аргументамі ў канфрантацыях традыцыйных гістарыяграфій Цэнтральна-Усходняй Еўропы.

Такім чынам, гістарыяграфіі па абодва бакі спрэчных калісь межаў па Одэру і Нісе вызваляюцца ад практыкі выкарыстання нацыянальных стэрэатыпаў і выстаўлення гістарычных рахункаў за крыўды суседзям. Зразумела, змены ў навуковай гістарыяграфіі не адлюстроўваюць стану масавай свядомасці. У польскім грамадстве і цяпер ёсць групоўкі, якія па-ранейшаму глядзяць на немцаў як на ворагаў. Для тых, чый асабісты жыццёвы вопыт быў закрануты вайной, негатыўны стэрэатып немца ўжо практычна немагчыма змяніць[101]. Вядома, у калектыўнай свядомасці палякаў Грунвальд застаецца немалаважным фактарам, і традыцыя грунвальдскіх святаў працягваецца. І ўсё ж пасля знікнення савецкай супердзяржавы, калі наступіла эпоха польска-нямецкага прымірэння, дэманізаваны некалі вобраз суседа пачаў зближацца з рэальнасцю[102], не без сувязі з чым і гэты сталы элемент канона польскай гістарычнай памяці губляў сваё значэнне. Як паказалі сацыялагічныя даследаванні, праведзеныя ў 2010 г., Грунвальдская бітва больш не ўваходзіць у набор тых падзей, якія палякі лічаць найважнейшымі ў сваёй гісторыі[103]. Польшча як паўнаварты член аб'яднанай Еўропы не мае патрэбы ў грунвальдскім міфе. Хоць Грунвальд для палякаў па-ранейшаму застаецца важнай падзеяй іх гісторыі, пазбаўлены ідэалагічнага зместу, ён незваротна страціў былую сімволіку і функцыі, якія з XIX ст. выконваў для мацавання польскай ідэнтычнасці.

На ўсход ад польскай мяжы выкарыстанне гістарычнай памяці вызначалася іншымі палітычнымі фактарамі. Тое, як узнікалі і які змест мелі ўспаміны пра бітву 1410 г. у Беларусі, паспрабуем паказаць ніжэй, аднак спачатку разгледзім савецкую традыцыю трактавання гэтай падзеі, у кантэксце якой і сфармаваўся беларускі міф Грунвальда.

[101] Berlińska D. Stary i nowy obraz Niemca w Polsce. S. 33–34, 37.

[102] Пра змены вобраза немца ў Польшчы ў пазітыўны бок гл.: Bartmiński J. Stereotypy mieszkają w języku. Studia etnolingwistyczne. Lublin, 2007. S. 313–314.

[103] Zaborski M. Grunwald a legitymizacja władzy. Miejsca pamięci jako narzędzie instrumentalizacji historii // Wspólne czy osobne? Miejsca pamięci narodów Europy Wschodniej. Red. W. Śleszyński. Białystok, 2011. S. 239–240.

Раздзел 6

# Канструяванне савецкага вобраза Грунвальда

## 6.1 Ад крытыкі "вялікадзяржаўных легенд" да новаімперскай ідэалогіі

*Великороссия построена на костях инородцев.*

Міхаіл Пакроўскі[1]

*Русские цари сделали одно хорошее дело – сколотоли огромное государство до Камчатки.*

Іосіф Сталін[2]

Як вядома, заснавальнікам савецкай гістарычнай навукі яшчэ пры жыцці лічыўся яе ідэолаг і арганізатар Міхаіл Пакроўскі, які першым паспрабаваў апісваць гісторыю Расіі на аснове марксісцкіх метадаў. Імкнучыся паказаць класавы змест гісторыі[3], ён вінаваціў буржуазную гістарыяграфію ў нацыяналізме і вялікадзяржаўнасці, нястомна разбураючы яе "вялікадзяржаўныя легенды".

Пад крытыку М. Пакроўскага трапілі, сярод іншага, тэзіс расійскай гістарыяграфіі пра нацiск заходніх дзяржаў і барацьбу з імі як фактар, што прымушаў маскоўскіх уладароў усталя-

[1] Цыт. па: Редин М. М. Н. Покровский как историк колониальной и внешней политики России // ИМ. 1932. №. 3(25). С. 52.

[2] Цыт. па: Артизов А. Н. В угоду взглядам вождя (Конкурс 1936 г. на учебник по истории СССР) // Кентавр. 1991, октябрь – декабрь. С. 134.

[3] Сціслае апісанне прынцыпу матэрыялістычнага тлумачэння гісторыі дадзена М. Пакроўскім ва ўводзінах да яго "Русской истории в самом сжатом очерке (с древнейших времен до конца XIX ст.)" (Москва, 1923). Пар.: Редин М. М. Н. Покровский как историк колониальной и внешней политики России. С. 37–59.

ваць у Расіі ваенную дыктатуру[4], а таксама даўнія сцвярджэнні пра агрэсіўнасць і рэакцыйнасць немцаў, іх шматвяковы "націск на Усход". Гаворачы пра сітуацыю ў Еўропе напярэдадні I сусветнай вайны, М. Пакроўскі паказваў на фактах, што планы тэрытарыяльных захопаў, якія прыпісваюць Нямеччыне, не адпавядалі яе эканамічным інтарэсам, і што прынамсі з 1913 г. яна не толькі не імкнулася да захопаў, але і стрымлівала ад такой палітыкі Аўстра-Венгрыю. У гэтым кантэксце версію пра вайну як вынік змовы Нямеччыны і Аўстра-Венгрыі ён называў "рытуальнай легендай"[5]. Немцаў уцягнулі ў вайну Англія і Расія, – сцвярджаў гісторык. Расійскі ўрад з 1912 г. рыхтаваў сутыкненне і сам стараўся стварыць сітуацыю, якая дала б яму падставу ўступіць у вайну, пакуль Англія з Расіяй урэшце не справакавалі Нямеччыну на абвяшчэнне вайны[6]. Сур'ёзна вывучаючы знешнюю палітыку і эканамічныя ўзаемаадносіны Расіі і Нямеччыны ў XIX ст., М. Пакроўскі прыйшоў таксама да высновы пра беспадстаўнасць легенды аб "рэакцыйным уплыве" Нямеччыны на Расію, бо на справе, пісаў ён, "руская рэакцыя ёсць цалкам прадукт мясцовых сацыяльна-эканамічных умоў"[7].

У савецкай гістарыяграфіі стары тэзіс пра "націск на Усход" як традыцыйную палітыку немцаў адным з першых агучыў расійскі гісторык-антычнік Уладзіслаў Бузескул. Хоць адзначаную ім перыядычную агрэсіўнасць Нямеччыны гісторык не выводзіў з далёкага Сярэднявечча, а звязваў з развіццём нямецкай ідэалогіі канца XVIII – XIX ст., тым не менш ён перасцерагальна адзначыў, што, маўляў, калі "шырокія і смелыя планы прасоўвання на Усход" немцы выношвалі яшчэ да аб'яднання, то "лёгка ўявіць, чаго можна чакаць у будучым"[8]. Нават у Брэсцкім міры

[4] Покровский М. Н. Историческая наука и борьба классов (Историографические очерки, критические статьи и заметки). Вып. 1. Москва – Ленинград, 1933. С. 136–137.

[5] Покровский М. Н. Внешняя политика. Сб. ст. (1914–1917). Москва, 1918. С. 164.

[6] Расіяй і Англіяй было зроблена ўсё, каб "шырокая публіка ведала адно, што злыя немцы абвясцілі вайну Расіі, што злыя немцы парушылі бельгійскі нейтралітэт і г. д.". Гл.: Покровский М. Н. Империалистская война. Сб. ст. Москва, 1934. С. 408–413.

[7] Покровский М. Н. Внешняя политика. С. 174–175. «По части уменья "делать реакцию"... прусский юнкер, облизываясь, смотрел на своего русского собрата, а не наоборот», – дадаваў гісторык (тамсама, с. 175).

[8] Бузескул В. П. Из истории пангерманизма и стремлений немцев на восток // Из далекого и близкого прошлого. Сб. этюдов из всеобщей

У. Бузескул убачыў “звяно ў доўгім ланцугу фактаў”, якія ўвасабляюць “нямецкі націск на Усход”: маўляў, межы Брэсцкага міру “так нагадваюць межы, аб якіх марыў Франц”, – пісаў ён.

Аднак погляд цытаванага аўтара нельга назваць тыповым для гістарычнай літаратуры тагачаснага СССР, зусім наадварот. Гісторыкі-марксісты неўзабаве крытыкавалі навуковыя пазіцыі У. Бузескула як буржуазныя. Р. Авербух назваў звязванне Брэсцкага міру з нямецкай агрэсіяй на Усход “вельмі распаўсюджанай сярод рускай буржуазіі інсінуацыяй”. Яго асабліва абурала тое, што У. Бузескул знайшоў віноўніка І сусветнай вайны, і гэта “нават не імперыялістычная Германія, гэта германскі вучоны і палітычны пісьменнік з канца XVIII ст., творца германскай ідеалогіі”. Сам артыкул гісторыка пра пангерманізм і “нямецкі ціск на Усход” быў расцэнены як публікацыя, напісаная “ў яўна шавіністычным духу”[9].

Прадстаўнікі школы М. Пакроўскага займаліся класавай барацьбой і рэвалюцыйнымі працэсамі ў гісторыі і, трымаючыся інтэрнацыянальных пазіцый, нямецка-славянскімі адносінамі не цікавіліся. Ідэя славянскага адзінства тады не магла ўсур’ёз успрымацца гісторыкамі-марксістамі. Славяназнаўства асацыявалася ў іх вачах з панславістамі, рэакцыянерамі-манархістамі, г. зн. ідэйнымі ворагамі бальшавікоў. Наогул, само пытанне, якая дзяржава больш вінаватая ў развязванні І сусветнай вайны – Нямеччына, Расія ці Францыя, – для М. Пакроўскага як сапраўднага марксіста не ўяўлялася істотным, бо яно не зыходзіла з сацыялістычных інтарэсаў. Прыпісванне галоўнай віны немцам было б часткай той “рытуальнай легенды” аб адвечнай нямецкай агрэсіі, якую М. Пакроўскі паслядоўна крытыкаваў. Таму ён выступаў супраць трактовак акадэміка Яўгенія Тарле, які працягваў ускладваць адказнасць за пачатак вайны на немцаў[10]. Апошні, характарызуючы нямецкі імперыялізм XIX ст. як нетыповы, у прыватнасці сцвярджаў, што Нямеччына адчувала сябе абдзеленай, выклікала шмат супярэчнасцяў з еўрапейскімі дзяржавамі і сваёй палітыкай

истории в честь пятидесятилетия научной жизни Н. И. Кареева. Петроград, 1923. С. 286–299, цыт. – с. 299.

9 Даклад Р. Авербуха пра гістарычныя погляды У. П. Бузескула гл. у: Буржуазные историки Запада в СССР // ИМ. 1931. № 21. С. 71–76, цыт. – с. 74–75.

10 Як прыклад крытыкі тэзіса аб “нямецкім нападзе” гл.: Покровский М. Н. Историческая наука и борьба классов. Вып. 2. Москва – Ленинград, 1933. С. 317–320 і наст. Пар.: Nolte H.-H. “Drang nach Osten”. S. 69–70.

справакавала вайну[11]. Ускладванне віны на нейкую чужую дзяржаву ці нацыю азначала адыход ад пазіцый інтэрнацыяналізму і замену ўяўленняў пра ўнутранага класавага ворага вобразам ворага знешняга. Падобная падмена пазіцый марксісцкай гістарыяграфіі была немагчымай пры М. Пакроўскім, аднак яна адбылася ў другой палове 1930-х г., калі яго канцэпцыя была абвешчана крамольнай, а падрыхтаваная ім школа гісторыкаў трапіла пад "чыстку" і была зліквідаваная.

Паказальна, што да сярэдзіны 1930-х г. і ў афіцыйным дыскурсе савецкай дзяржавы не было ніякіх антынямецкіх установак. Напрыклад, разважаючы пра гістарычнае развіццё Расіі ў прамове на Усесаюзнай канферэнцыі работнікаў сацыялістычнай прамысловасці ў 1931 г., Сталін пералічыў многіх замежных інтэрвентаў, якія "білі" Расію "за адсталасць", але ні словам не згадаў немцаў[12]. І нават выказванні Сталіна ў 1934 г. пра нарастанне ваеннай пагрозы для СССР адрасаваліся яшчэ не Нямеччыне, а ўсяму "капіталістычнаму акружэнню" як знешняму ворагу. Аднак гучныя дэкларацыі планаў пашырэння "жыццёвай прасторы" (*Lebensraum*) на Усход адразу пасля прыходу да ўлады Гітлера, асабліва яго адкрытыя заявы аб непазбежнасці вайны з СССР[13] выклікалі адваротную рэакцыю савецкага кіраўніцтва, якое распачало ідэалагічна-палітычную прапаганду пра "нямецкую пагрозу".

Як вядома, пачаткам пераходу ад прынцыпаў марксісцкай гістарыяграфіі, выпрацаваных школай М. Пакроўскага, да згортвання дыскусій і дагматызацыі гістарычнай навукі ў СССР стала публікацыя артыкула І. Сталіна "О некоторых вопросах истории большевизма" ў часопісах "Пролетарская Революция" і "Большевик"[14] у канцы 1931 г. Ужо ў 1932 г. часопіс Інстыту-

[11] Пар.: Тарле Е. В. Европа в эпоху империализма. 1871–1919 гг. Москва, 1927. С. 59–116, 256–294. Падобныя погляды былі яшчэ да вайны ўласцівы расійскаму гісторыку У. Перцаву, даследчыку гісторыі Нямеччыны, які ў 1921 г. атрымаў прызначэнне на працу ў БССР. Гл.: Перцев В. Германия и Австрия в XIX веке. Исторический очерк. Москва, 1917. С. 86–93; ён жа. Гогенцоллерны. Личные характеристики и обзоры политической деятельности. Москва, 1918.

[12] Гл.: Рубинштейн Н. Русская историография. Москва, 1941. С. 633.

[13] Пар.: Антисоветское заявление Гитлера // Правда. 1935. 19 марта. С. 5.

[14] Дэманструючы непавагу да гістарычнай навукі, Сталін асудзіў правядзенне гісторыкамі дыскусій па прынцыповых пытаннях і ўказаў на тое, што ўстаноўка важней за факты: "Кто же, кроме безнадежных бюрократов, может полагаться на одни лишь бумажные документы?" Гл.: Сталин И. О некоторых вопросах истории большевиз-

та гісторыі “Историк-марксист” абвясціў ідэалагічную барацьбу супраць “любой фальсіфікацыі і перакручвання тэорыі Маркса – Энгельса – Леніна – Сталіна”[15], і толькі поўнае прызнанне названай тэорыі азначала прынцып неабходнай партыйнасці. Цяпер выказванні чатырох класікаў (прычым – у інтэрпрэтацыях Сталіна) прызнаваліся аксіёмай, якая не падлягала аспрэчванню. Сталін прысвоіў сабе права на манаполію ў гістарычнай навуцы, і яго імя ад гэтага часу рабілася атрыбутам кожнай публікацыі. Гістарычная навука апынулася ў палоне сталінскіх ацэнак, калі “правільнай” абвяшчалі адну лінію – лінію партыі, і задачай гісторыкаў заставалася забяспечыць канкрэтнымі матэрыяламі загадзя зададзеную інтэрпрэтацыйную схему[16].

Калі ў 1934 г. чарговы з’езд партыі прыняў пастановы, у якіх гістарычная навука была названа “непасрэднай зброяй партыі і пралетарыяту ў барацьбе за бяскласавае, сацыялістычнае грамадства”[17], то гэта азначала , што эпоха адноснай талеранцыі ў гістарыяграфіі скончылася. Кіруючыся тэзісам аб абвастрэнні ідэалагічнага супрацьборства з капіталістычным светам, савецкае кіраўніцтва мабілізавала для палітычнай барацьбы і навуку. Аблягчаў жа гэтую мабілізацыю, якая вылілася ў перараджэнне марксісцкай гістарыяграфіі, фактар знешняй пагрозы, якім выступала небяспека нямецкага фашызму, дакладней – тады яшчэ толькі яго антысавецкая прапаганда.

Разам з поўным падпарадкаваннем партыі і дагматызацыяй савецкай гістарычнай навукі ў другой палове 1930-х г. адбывалася – насуперак сутнасным устаноўкам марксізму – яе “нацыяналізацыя”, калі важным ідэалагічным кампанентам гістарычных інтэрпрэтацый станавіўся расійскі нацыяналізм[18]. Ужо

ма // К изучению истории. Москва, 1937. С. 3–17, цыт. – с. 12. Пар.: Литвин А. Л. Без права на мысль. Казань, 1994. С. 10–11, 16.

15 За решительную перестройку исторического фронта // ИМ 1932. № 1–2 (23–24). С. 7.

16 Алаторцева А. И. Советская историческая периодика. 1917 – середина 1930-х годов. Москва, 1989. С. 239–241; яна ж. Советская историческая наука на переломе 20 – 30-х годов // История и сталинизм. Сост. А. Н. Мерцалов. Москва, 1991. С. 282–283. Пар. назіранні нямецкага гісторыка: Nolte H.-H. “Drang nach Osten”. S. 85–86.

17 Историческая наука на уровень великих задач. Итоги XVII съезда ВКП(б) и задачи большевистских историков // ИМ 1934. №2 (36). С. 5.

18 Пар.: Неретина С. С. Смена исторических парадигм в СССР. 20-е – 30-е годы // Наука и власть. Сб. ст. Отв. ред. А. Огурцов. Б. Юдин. Москва, 1990. С. 44; Бордюгов Г., Бухараев В. Национальная истори-

з пастановы Саўнаркома і ЦК ВКП(б) 1934 г. "О преподавании гражданской истории в школах СССР", якой пачыналася рэарганізацыя гістарычнай адукацыі, можна зразумець, што прынцып класавай барацьбы як асновы марксісцкай палітыкі вывучэння гісторыі больш не быў прыярытэтным для гісторыкаў[19]. Паказальна, што Сталін у тым жа годзе ў заўвагах на артыкул Ф. Энгельса "Знешняя палітыка рускага царызму" (апублікаваных толькі ў 1941 г.) пачаў мяняць знешнепалітычны вобраз Расіі: генеральны сакратар ракрытыкаваў погляд на Расію як "сусветнага жандара" і паказаў яе менш вінаватай у развязванні I сусветнай вайны, чым Нямеччына і Англія[20].

Устаноўка на рускі дзяржаўны патрыятызм разыходзілася з матэрыялістычным тлумачэннем гістарычнага працэсу, якога трымаліся гісторыкі-марксісты "першага набору". Таму абвешчаная названай пастановай падрыхтоўка новых падручнікаў па гісторыі і распрацоўка савецкіх стандартаў тлумачэння мінулага суправаджаліся кампаніяй крытыкі пазіцый школы М. Пакроўскага, выкараненнем іншадумства ў гістарыяграфіі. У 1935–36 г. Сталін крытыкаваў чарнавікі падручнікаў па гісторыі СССР ужо з расійскіх вялікадзяржаўніцкіх пазіцый. Пасля заўваг Сталіна "Правда" абвясціла пераадоленне традыцый школы Пакроўскага "ўмовай стварэння марксісцка-ленінскай гісторыі СССР"[21], затым папракала аўтараў перапрацаваных падручнікаў у "лявацкім «інтэрнацыяналізме»", у ігнараванні прагрэсіўнага значэння "збірання рускіх зямель"[22]. Сам Сталін публічна агучыў сваю адданасць расійскай імперскай ідэі ў лістападзе таго ж года на сустрэчы з Кліментам Варашылавым: "Русские цари, – прызнаваўся ён, – сделали одно хорошее дело – сколотоли огромное государство до Камчатки", і бальшавікі,

ческая мысль в условиях советского времени // Национальные истории в советском и постсоветских государствах. Под ред. К. Аймерхамера, Г. Бордюгова. Москва, 1999. С. 27–38.

19 О преподавании гражданской истории в школах СССР// ИМ. 1934. № 3. С. 83–84; Бордюгов Г., Бухараев В. Национальная историческая мысль в условиях советского времени. С. 32–34.

20 И. Сталин о статье Энгельса "Внешняя политика русского царизма" // Большевик. 1941. № 9. С. 1–5. Пар.: Бордюгов Г., Бухараев В. Национальная историческая мысль в условиях советского времени. С. 30–31.

21 Преподавание истории в нашей школе // Правда. 1936. 27 января. С. 1.

22 Быстрянский В. Критические замечания об учебниках по истории СССР // Правда. 1936. 1 февр. С. 2–3.

атрымаўшы яго ў спадчыну, "сплотили и укрепили это государство как единое, неделимое государство. <…> Поэтому каждый, кто пытается разрушить это единство социалистического государства, кто стремится к отделению от него отдельной части или национальности, он враг, заклятый враг государства, народов СССР"[23].

Сапраўды, такі погляд на гісторыю царскай Расіі дыяметральна разыходзіўся з канцэпцыяй М. Пакроўскага, які неаднаразова сцвярджаў, што "Вялікарасія збудавана на касцях іншародцаў"[24]. Заснавальнік савецкай гістарыяграфіі арыентаваў сваю школу на даследаванні эканамічна-гістарычных працэсаў, Сталін жа ініцыяваў рэабілітацыю расійскай дзяржавы і вялікарускага народа як цэнтральных аб'ектаў гістарычнага наратыву і запатрабаваў вяртання пазітыўнага вобраза дарэвалюцыйнага мінулага Расіі. Маючы патрэбу ў такой гісторыі, якая ўмацоўвала б савецкі патрыятызм, крамлёўскае кіраўніцтва развярнула гістарыяграфію да вялікадзяржаўна-патрыятычнай ідэі[25].

## 6.2 Вяртанне тэзіса пра "шматвяковы нямецкі націск"

Устаноўкі новага курсу на асвятленне гісторыі адлюстраваны ў вядомай пастанове журы Дзяржаўнай камісіі па падручніках, зацверджанай Сталіным і апублікаванай 22 жніўня 1937 г.[26]. Вяртаннем да вялікадзяржаўніцкіх пазіцый можна лічыць, напрыклад, тое, што ўключэнне нярускіх народаў СССР пад уладу Расіі ў ёй ацэнена ўжо як перспектыва "найменшага зла". Асвятленню ж адносін з немцамі даваўся кан-

[23] Цыт. па: Артизов А. Н. В угоду взглядам вождя (Конкурс 1936 г. на учебник по истории СССР) // Кентавр. 1991, октябрь – декабрь. С. 134.

[24] Цыт. па: Редин М. М. Н. Покровский как историк колониальной и внешней политики России. С. 52.

[25] Советский патриотизм // Правда. 1935. 19 марта. С. 1. Пар.: Бордюгов Г., Бухараев В. Национальная историческая мысль в условиях советского времени. С. 29, 34; Шенк Ф. Б. Александр Невский в русской культурной памяти: святой, правитель, национальный герой (1263–2000). Москва, 2007. С. 278–279.

[26] Постановление жюри Правительственной комиссии по конкурсу на лучший учебник для 3 и 4 классов средней школы по истории СССР // Правда. 1937. 22 авг. С. 2; К изучению истории. Москва, 1937. С. 32–39.

цэптуальны ўзор на прыкладзе бітвы 1242 г. на Чудскім возеры. У асобным пункце гэтай пастановы журы раскрытыкавала падручнікі за памылковае асвятленне і недаацэнку згаданай падзеі, назваўшы такія памылкі "отрижками антиисторических, немарксистских взглядов", і прапанавала – са спасылкай на вядомыя выказванні К. Маркса з "Храналагічных выпісак" – "правільную ацэнку": перамогу Аляксандра Неўскага належала цяпер ацэньваць як спыненне "руху на Усход германскіх акупантаў... што ажыццяўлялі каланізацыю шляхам пагалоўнага знішчэння і рабавання падпарадкаваных народаў"[27]. Такім чынам, можна ў некаторай ступені скарэктаваць выснову амерыканскага даследчыка Генры Мэера, які са здзіўленнем канстатаваў "амаль поўнае знікненне" выраза "Дранг нах Остэн" з афіцыйнага савецкага дыскурсу ў перыяд паміж 1918 і 1941 г.[28]. Цытаваны дакумент афіцыйна вярнуў яго ў палітычнае жыццё і гістарычную літаратуру задоўга да пачатку вайны. З таго часу канцэпт "Дранг нах Остэн", як і зварот да Марксавай ацэнкі перамогі Аляксандра Неўскага над рыцарамі, зрабіўся агульным месцам савецкай антынямецкай прапаганды.

Трэба адзначыць, што Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс, якія спецыяльна не займаліся ўсходняй экспансіяй немцаў, у цэлым ставіліся да яе хутчэй пазітыўна (прынамсі да вынікаў самога працэсу[29], хоць, як вядома, яны востра асудзілі падзелы Рэчы Паспалітай), чым наадварот. Напрыклад, Ф. Энгельс пісаў пра еўрапейскую пазіцыю Нямеччыны як супрацьвагу "руска-мангольскаму варварству", важную для еўрапейскай цывілізацыі, як пра перашкоду "панславісцкай змове, што пагражае ўсталяваць сваю імперыю на руінах Еўропы"[30]. Адмыслова да гісторыі нямецка-славянскіх адносінаў звяртаўся толькі К. Маркс у згаданых "Храналагічных выпісках", калі рабіў занатоўкі пра канфлікты рыцараў Ордэна з княствамі Русі. Перакладзеныя на рускую мову, "Храналагічныя выпіскі" яшчэ да іх поўнай публікацыі[31] шырока выкарыстоўваліся ў СССР

[27] К изучению истории. С. 39.
[28] Meyer H. C. Drang nach Osten. P. 121.
[29] Пар.: Wippermann W. Der Ostsiedlung in der deutschen Historiographie und Publizistik. S. 60–61.
[30] Цыт. па: Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 41.
[31] Маркс К. Хронологические выписки // Архив Маркса и Энгельса. Под ред. В. Адоратского. Т. V. Москва, 1938. С. 1–352.

у ідэалагічна-прапагандысцкіх інтарэсах[32]. Між іншага, у каментарах да гэтай публікацыі сцвярджалася, быццам крытыка Марксам Прускага ордэна была яго «спачувальным стаўленнем... да барацьбы рускага народа супраць нямецкіх "псоў-рыцараў"»[33], што, аднак, не вынікае з саміх выпісак. Прывядзем адпаведны фрагмент цалкам:

"1242 – Аляксандр Неўскі сустракае нямецкіх рыцараў, ён разбівае іх на лёдзе Чудскага возера, так што прахвосты[34] былі канчаткова адагнаныя ад рускіх межаў.

1250 – літоўскі князь Міндове ці Мендог, які зноў адрокся ад хрысціянскай хваробы, у саюзе з рускімі і курамі разбівае пад Дурбэ войска нямецкіх псоў-рыцараў (*Reitershund*) і падначаленых ім ахрышчаных ліваў ды прусаў, так што знішчае вялікую частку гэтых нягоднікаў (*Canaillen*)"[35].

Як паказаў Г.-Г. Нольтэ, большую частку названай працы К. Маркса ўтвараюць яго даслоўныя выпіскі з даследавання Фрыдрыха Шлёсэра па сусветнай гісторыі[36]. І хоць апошні таксама, у адпаведнасці з духам часу, асуджаў гвалтоўныя метады Нямецкага ордэна, у яго няма ні *Lumpacii*, ні *Reitershund*[37], ні *Canaillen*. Усе гэтыя эпітэты дададзены Марксам, які і так не любіў манахаў-рыцараў, а пасля ўтварэння пруска-нямецкага саюзу (1871) і канца Парыжскай камуны скіраваў яшчэ больш крытыкі супраць Прусіі[38]. Маркс кляйміў сваімі абразлівымі эпітэтамі ("смярдзючыя манахі", "скаты", "святыя псы", "разбойніцкія шайкі нягоднікаў" і інш.) найперш духавенства і манахаў-рыцараў Прускага ордэна як праваднікоў місіі гвал-

[32] Спачатку публікаваліся фрагметы працы. Пар.: Маркс К. "Хронологические выписки" // Исторический журнал. 1937. № 1. С. 58–74.

[33] Адоратский В. О рукописи К. Маркса "Хронологические выписки" // Большевик. 1936. № 24. С. 40–50; ён жа, "Хронологические выписки" Карла Маркса // Правда. 1938. 4 июля. С. 4; Удальцов А. К публикации первой тетради "Хронологических выписок" К. Маркса // ИМ. 1939. №3 (76). С. 142–46.

[34] Так у рускім перакладзе, у арыгінале *die Lumpacii*, бадзягі.

[35] Маркс К. Хронологические выписки // Архив Маркса и Энгельса. Под ред. В. Адоратского. Т. V. Москва, 1938. С. 344.

[36] Schlosser F. C. Weltgeschichte in zusammenhängender Erzählung. Bd. 1. T. 1. Frankfurt a. M., 1839.

[37] Меркаванне, што гэтае азначэнне магло з'явіцца ў савецкай літаратуры ў выніку памылковага прачытання "Ritterbunden" у Марксавым рукапісе, выказанае мной некалькі гадоў назад (Гл.: БГА. Т. 19 (2010). С. 94–95, спас. 19), не знайшло пацвярджэння.

[38] Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 42–43.

тоўнага хрышчэння, параўноўваючы іх дзейнасць са злачынствамі іспанскіх канкістадораў у Мексіцы і Перу[39]. Але цытаваны фрагмент "Храналагічных выпісак" усё ж не даваў рэальных падстаў гаварыць пра спачувальнае стаўленне заснавальніка марксізму да рускага народа.

На нейкі час супрацьстаянне нацыянальнай і інтэрнацыянальнай версій савецкага патрыятызму затрымалася – мяжой канчатковага завяршэння пераходнага перыяду можна лічыць 1941 год. У тыя часы ў гістарычнай літаратуры яшчэ маглі з'яўляцца публікацыі з крытыкай Расіі і з высокай ацэнкай нямецкай навукі і культуры[40]. Аднак перад абліччам фашысцкіх пагрозаў савецкі патрыятызм з вялікарускім нацыяналізмам як яго ідэйным ядром станавіўся даміноўным прынцыпам гісторыяпісання. Да ключавых установак асвятлення гісторыі цяпер належала паслядоўнае акцэнтаванне гераічнай барацьбы з іншаземнымі захопнікамі, да якіх залічваліся немцы, падкрэсліванне ваенных перамог Расіі, пераемнасці ваенных традыцый і высокага маральнага духу рускага салдата[41].

Цытаваны вышэй нумар "Праўды", які апублікаваў пастанову журы аб падручніках па гісторыі, санкцыянаваў планамерную кампанію крытыкі ранейшай канцэпцыі марксісцкай гістарыяграфіі, указваючы на тое, што Сталін, Жданаў і Кіраў ужо "выкрылі шкодную ролю антыгістарычнай школы Пакроўскага"[42]. Крытыкі канцэпцыі М. Пакроўскага, якімі часта былі яго вучні, неаднаразова закідалі яму, паміж іншага, завысокую ацэнку нямецкай культуры, недаацэнку агрэсіўнасці германскага імперыялізму і віны апошняга за развязван-

[39] Маркс К. Хронологические выписки. С. 342–343. Эмацыйныя выказванні К. Маркса пра жорсткае абыходжанне рыцараў з прусамі, якіх яны, маўляў, або забівалі, або "ператваралі ў рабоў", увайдзе ў канон савецкай антынямецкай рыторыкі, што звязвала гітлерызм з сярэднявечным ордэнам.

[40] Напрыклад, вучань М. Пакроўскага Мікалай Ванаг у 1935 г. яшчэ паказваў Расію як рэакцыйную імперыю, пісаў пра яе контррэвалюцыйную ролю ў знешняй палітыцы. Гл.: Ванаг Н. К вопросу о роли царской России на международной арене в конце XVIII и в XIX веке // ИМ 1935. №10 (50). С. 49–67. Каланіяльная палітыка Расіі востра крытыкавалася і ў саюзных рэспубліках. Пар.: Шчарбакоў В. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі. Менск, 1934. С. 17–32.

[41] Пар.: Бордюгов Г., Бухараев В. Национальная историческая мысль в условиях советского времени. С. 37.

[42] Знать историю народов СССР // Правда. 1937. 22 авг. С. 1.

не І сусветнай вайны[43]. Канцэптуальна красамоўнымі можна лічыць абвінавачванні на яго адрас, апублікаваныя газетай "Правда" ў сакавіку 1937 г.[44]. Сярод многіх "грахоў" М. Пакроўскага было не толькі тое, што раздражняла адэптаў велікарускага нацыяналізму, як напрыклад, прызнанне высокаразвітай культуры ў татараў, замоўчванне "ўсяго пазітыўнага, што вялікі рускі народ унёс у скарбніцу культуры ўсяго чалавецтва" і паказ рускіх "нацыяй Абломавых". Цяпер шкодніцкім па сваёй сутнасці аказваўся яго погляд на гістарычныя адносіны Нямеччыны і Расіі. «В течение двух столетий русский народ в лице псковитян и новгородцев вел тяжелую борьбу против немецкого *Drang nach Osten*. В результате этой героической борьбы натиск рыцарей-крестоносцев был сломлен, им не удалось захватить ни одной пяди русской земли, и таким образом русский народ избавился от опасности порабощения немецкими баронами-крепостниками, которые поработили пруссов, латышей и эстонцев. Ни М. Н. Покровский, ни один из его "учеников" не сказал нигде об этой борьбе ни одного слова»[45]. Цяпер яго крытычнае стаўленне да "рытуальнай легенды" расцэньвалася як "гнилая идейка, политически вредная", як адна з формаў "контрреволюционной работы врагов народа", як падтрымка "лживых измышлений германского фашизма"[46]. Зразумела, што адказнасць за развязванне І сусветнай вайны, насуперак ранейшым тэзісам М. Пакроўскага, у новай сітуацыі цалкам ускладвалася на Нямеччыну[47].

Пасля таго як расказ пра Лядовае пабоішча быў уключаны ў афіцыйна ўхвалены падручнік А. Шастакова "Краткий курс истории СССР", хутка з'явілася цэлая серыя публікацый (з канца 1937 па 1938 г. – больш за дзясятак артыкулаў і кніг), якія праслаўлялі перамогу князя Аляксандра Яраславіча над немцамі. Усе яны павінны былі несці адно пасланне як савецкаму народу, так і ў першую чаргу нацыянал-сацыялістычнай Ня-

[43] Пар.: Mazour A. The Writing of History in the Soviet Union. Stanford, 1971. P. 12–17.

[44] Дроздов П. "Историческая школа" Покровского // Правда. 1937. 28 марта. С. 2–3.

[45] Тамсама. С. 3

[46] Руткевич Н. М. Н. Покровский о возникновении мировой войны // ИМ. 1938. № 3(67). С. 13–35, цыт. – с. 35.

[47] Гл.: Нотович Ф. Германский империализм – зачинщик войны 1914–1918 гг. // ИЖ. 1938. № 7. С. 43–55.

меччыне: калі нямецкія войскі нападуць на Расію, то яны будуць знішчаны, як гэта заўжды было ў гісторыі[48].

Варта адзначыць, што часопіс "Историк-марксист", хоць "Правда" ўжо ў 1937 г. апублікавала канцэптуальны ўзор інтэрпрэтацыі барацьбы з немцамі, не адразу прыняў пазіцыю цэнтральнай газеты. Навуковы перыёдык гісторыкаў нейкі час звяртаўся да тэмы ўскосна, праз рэцэнзаванне прац гісторыкаў гітлераўскай Нямеччыны, адзначаючы рэлевантнасць сярэднявечнай экспансіі для іх разумення гісторыі[49]. Як тэма нямецкай экспансіі, так і антынямецкі тон яшчэ не дамінавалі ў гістарычных публікацыях, а пра славянскае адзінства савецкія гісторыкі яшчэ наогул не пісалі. Акцэнты пачалі змяшчацца ў 1938 г., калі савецкае кіраўніцтва распачало прапагандысцкую кампанію падрыхтоўкі магчымай вайны Нямеччыны супраць СССР[50], падключыўшы да яе і кадры прафесійных гісторыкаў.

Прафесійная савецкая медыявістыка ўключылася ў кампанію праз публікацыі Мікалая Грацыянскага, які звязаў палітыку Трэцяга Райха з тысячагадовым нямецкім "націскам на Усход". З жорсткай крытыкай ён абрынуўся не толькі на нацысцкіх лідараў, Гітлера і Розенберга, якія ганарыліся поспехамі сярэднявечнай нямецкай экспансіі і бралі яе за прыклад сваёй палітыкі[51], але і на нямецкага гісторыка Германа Аўбіна[52], закідаючы агулам усёй нямецкай гістарыяграфіі, што тая ўсхваляе разбойныя напады Ордэна і паказвае славянскі свет дзікім варварствам[53]. М. Грацыянскі сцвярджаў, што нямецкі

48 Падрабязна гл: Шенк Ф. Б. Александр Невский в русской культурной памяти. С. 293–294, 301.

49 Гл. разгорнутую крытычную рэцэнзію М. Джэрвіса на зборнік па гісторыі ўзаемаадносін Нямеччыны і Польшчы (Deutschland und Polen. Beiträge zu ihren geschichtlichen Beziehungen. Hg. von A. Brackmann. München – Berlin, 1933) у: ИМ. 1936. №3 (55). С. 138–148.

50 Пар.: Невежин В. А. "Если завтра в поход..." Подготовка к войне и идеологическая пропаганда в 30-х – 40-х г. Москва, 2007. С. 92–94, 107, 132.

51 Грацианский Н. П. Немецкая агрессия в Прибалтике. С. 87–88.

52 Aubin H. Die Ostgrenze des alten deutschen Reiches // HV. Bd. 28 (1933/34). S. 225–272.

53 На справе Г. Аўбін пісаў пра "грэцка-рускі свет" не як пра варварства, а як пра чужую, менш развітую айкумену, і такое спрашчэнне яго пазіцыі можна лічыць свядомым імкненнем Грацыянскага паказаць нямецкіх гісторыкаў неадукаваным і тупым ворагам. На такое перакручванне поглядаў Г. Аўбіна звярнуў увагу Г.-Г. Нольтэ. Гл.: Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 105–106.

"дранг" – гэта "суцэльны разбой у грандыёзным маштабе", часткай якога было заваяванне Прыбалтыкі. Як перамога на Чудскім возеры, так потым Грунвальд паклаў "на доўгі час канец нямецкай агрэсіі ў Прыбалтыцы". Пры гэтым, паводле Грацыянскага, у 1410 г. "амаль палову" арміі саюзнікаў складалі рускія, і менавіта "рускія воіны" (смаленцы) "вырвалі перамогу з рук немцаў"[54]. Савецкі гісторык пісаў, што нямецкія фашысты, якія "рыхтуюць новы *Drang nach Osten*", павінны помніць пра перамогу ноўгарадцаў і Грунвальд, які "спыніў наступ немцаў на ўсход"[55].

З падобных пазіцый сярэднявечныя падзеі ў Прыбалтыцы сталі разглядаць і іншыя гісторыкі. У прыватнасці, так іх падаў дырэктар ленінградскага Інстытута гісторыі партыі Вадзім Быстранскі ў прадмове да навуковага выдання перакладу "Хронікі Генрыха Латыша". Спасылаючыся на нямецкую літаратуру, ён пісаў, што "нацыянал-сацыялісты матывуюць свае агрэсіўныя планы традыцыямі нямецкага ордэна з яго імкненнем на Усход" і рыхтуюць напад на СССР, абгрунтоўваючы свае прэтэнзіі на Прыбалтыку спасылкамі на яе заваяванне немцамі ў XIII ст. Пад пяром В. Быстранскага сярэднявечны ордэнскі храніст Генрых стаў "апалагетам нямецкіх заваёўнікаў", а яго хроніка характарызавалася як выкрыццё "хлуслівасці спасылак фашызму на ўяўную культурную місію нямецкіх псоў-рыцараў" у даўнія часы[56].

Вышэй ужо адзначалася, што ідэолагі нацыянал-сацыялістаў сапраўды спасылаліся на прыклады з гісторыі нямецкай экспансіі на Усход, у тым ліку на дзейнасць Тэўтонскага ордэна. Нагадаем, што на яго ўказаў і сам Гітлер, згадваючы "шлях колішніх ордэнскіх рыцараў" як прыклад для новай нямецкай імперыі (гл. 5.1). Аднак не будзем забывацца, што папулярнасць сярэднявечнай нямецкай каланізацыі Усходу як гістарычнага прыкладу сярод нацысцкіх ідэолагаў і прапагандыстаў, як паказаў В. Віпэрман, не была звязана з выказваннямі Гітлера[57]. Да таго ж у сапраўднасці Гітлер і не збіраўся абапірацца на

[54] Грацианский Н. П. Немецкая агрессия в Прибалтике. С. 105–106.
[55] Тамсама. С. 111.
[56] Быстрянский В. А. Предисловие / Генрих Латвийский. Хроника Ливонии. Введ., пер. и комм. С. А. Аннинского. Москва – Ленинград, 1938. С. XI–XV.
[57] Wippermann W. Der Ostsiedlung in der deutschen Historiographie und Publizistik. S. 45.

традыцыі рыцараў, а распусціў Тэўтонскі ордэн у Аўстрыі і Чэхаславакіі адразу пасля іх падпарадкавання.

У ідэалагічнай падрыхтоўцы да вайны з Нямеччынай і патрэбе мабілізаваць народ Крэмль пайшоў на рэабілітацыю ідэі ўсеславянскага адзінства і аднаўленне славяназнаўства ў СССР. У 1939 г. былі заснаваны сектар славяназнаўства ў Інстытуце гісторыі АН СССР і кафедра гісторыі славян на гістарычным факультэце МДУ на чале з акадэмікам У. Пічэтам. Пра ідэалагічныя падставы працы савецкіх славістаў, іх задачу вывучаць і выкрываць нямецкі "Дранг нах Остэн", асабліва ў гады вайны, пісалі самі кіраўнікі славяназнаўчых устаноў[58]. Характар і змест іх выданняў, некаторыя з якіх будуць разгледжаны ніжэй, таксама сведчаць пра палітычную матывацыю аднаўлення гістарычнага славяназнаўства. Па трактоўках савецкае славяназнаўства, здаецца, у цэлым пераймала ідэйныя ўстаноўкі расійскіх панславістаў. Сам яго кіраўнік У. Пічэта адразу выступіў з абгрунтаваннем неабходнасці даследавання гісторыі славян у сувязі з гісторыяй Расіі[59], а праз некалькі гадоў адстойваў думку, што славянафілы больш прагрэсіўныя за заходнікаў і сцвярджаў тэзіс аб прагрэсіўнай ролі Расіі ў развіцці славянскіх народаў[60].

Для мабілізацыі савецкага народа патрабавалася паказваць прыклады славянскага адзінства ў барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў, як гэта было і ў XIX ст. Адным з прапагандысцкіх узораў усхвалення перамог і 1242, і 1410 г. як прыкладаў баявога адзінства славян, аб'яднаных вакол Расіі, стала брашура ваенных гісторыкаў М. Лапіна і А. Турчынскага[61], якая павінна была даказваць, што народы СССР непераможныя. Свавольна маніпулюючы фактамі, аўтары паказалі сечу 1410 г. як славяна-нямецкае сутыкненне, як "бітву славянскіх народаў з ня-

[58] Досталь М. Как Феникс из пепла… (Отечественное славяноведение в период Второй мировой войны и в первые послевоенные годы). Москва, 2009. С. 11–12, 38.

[59] Шумскі Я. Гісторыя Беларусі ў люстэрку рассакрэчаных дакументаў ЦК УКП(б) / КПСС // БГА. Т. 20 (2013). С. 110.

[60] Стенограмма совещания по вопросам истории СССР в ЦК ВКП(б) в 1944 г. // ВИ. 1996. № 4. С. 64–65.

[61] Лапин Н., Турчинский А. Грюнвальдская битва. Разгром немецких рыцарей 15 июля 1410 года. Москва, 1939. С. 46. Брашура была падпісана да друку ў красавіку 1939 г., задоўга да заключэння дагавору аб ненападзе паміж СССР і Нямеччынай ды раптоўнай змены характару савецка-нямецкіх узаемаадносін.

мецкімі захопнікамі-рыцарамі", якая "завяршыла шматвекавую барацьбу велікарускага, украінскага і беларускага народаў супраць ярагнага нямецкага націску на ўсход", пры гэтым галоўная роля ў перамозе прыпісвалася "рускай пяхоце"[62]. Характэрна, што М. Лапін і А. Турчынскі бадай упершыню не толькі прыраўнялі бітву 1410 г. па значэнні да Лядовага пабоішча, а нават паставілі вышэй: яна "вырашала лёсы народаў Усходняй Еўропы", а разгром рыцараў, маўляў, "паклаў канец нямецкай агрэсіі" наогул[63].

Прыклад больш навуковага, заснаванага на крыніцах, падыходу да тэмы ўвасаблялі працы медыявіста Міхаіла Ціхамірава, які, між іншага, востра раскрытыкаваў апісанне бітвы на Чудскім возеры, створанае ў сцэнары пісьменніка Пятра Паўленкі і рэжысёра Сяргея Эйзенштэйна для будучага фільма "Александр Невский"[64]. Гісторык на канкрэтных фактах паказаў, наколькі фальшывым быў у сцэнары вобраз як самой Русі, так і яе праціўнікаў. У прыватнасці, аўтары прыпісвалі рыцарам Ордэна планы захопаў рускіх зямель ажно да самай Волгі, і да т. п.

У цэлым можна сказаць, што хоць у афіцыйным савецкім дыскурсе з 1937 г. мэтанакіравана выпрацоўваўся вобраз агрэсіўных немцаў (праз імплантацыю стэрэатыпу нямецкага "націску на Усход"), да канца 1930-х гадоў устаноўка на стварэнне варожага вобраза фашысцкай Нямеччыны яшчэ не дамінавала ў гістарычнай літаратуры. Увага гісторыкаў аддавалася амаль выключна сярэднявечнай усходняй экспансіі, рабаўнічым паходам рыцараў, прычым яны не прыпісвалі агрэсіўнасць усяму нямецкаму народу. Ацэньваючы пазіцыі савецкай гістарыяграфіі міжваеннага перыяду, можна пагадзіцца з назіраннем Г.-Г. Нольтэ, што яна перад вайной яшчэ недастаткова тэматызавала Нямеччыну і не распазнавала ў немцах галоўнага ворага СССР[65]. Што да канкрэтных эпізодаў барацьбы з немцамі, то найважнейшымі былі бітвы XIII ст. Калі перамога Аляксан-

[62] Лапин Н., Турчинский А. Грюнвальдская битва. С. 3, 25, 42, 46.
[63] Тамсама. С. 45–46.
[64] Тихомиров М. Н. Издевка над историей (О сценарии "Русь") // ИМ. 1938. № 3 (67). С. 92–96. Грунтоўнасць і стрыманасць ацэнак вылучала і наступныя працы гэтага гісторыка. Гл.: Тихомиров М. Н. Борьба русского народа с немецкими интервентами в XIII–XV вв. Москва, 1941 (першая публікацыя ў часопісе "Знамя", 1939, № 3–4).
[65] Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 107.

дра Неўскага на Чудскім возеры прэзентавалася як галоўны "павучальны гістарычны ўрок" для нямецкіх фашыстаў і на старонках "Праўды", і ў дзясятках артыкульных ды кніжных публікацый[66], то бітва пад Грунвальдам згадвалася рэдка і па значнасці не ішла ў параўнанне з Лядовым пабоішчам. Не лічылі яе яшчэ і прыкладам справядлівай барацьбы: з гісторыі такімі прызнаваліся "вайна 1242 г. супраць уварвання нямецкіх псоў-рыцараў" і затым – вайна 1611–1612 г. супраць "польскіх заваёўнікаў", тады як перамога 1410 г. у кантэксце справядлівых войнаў да нападу Гітлера на Савецкі Саюз ніводнага разу не згадвалася[67].

Іншымі словамі, у СССР канца 1930-х г. бітву пад Грунвальдам толькі пачыналі інструменталізаваць. Яе трактавалі як адзін з этапаў змагання, што на доўгі час паклаў "канец нямецкай агрэсіі ў Прыбалтыцы"[68], але не як падзею першаступеннай значнасці. Красамоўным сведчаннем гэтага можна лічыць наступны факт: яшчэ напярэдадні II сусветнай вайны аўтары і рэдактары Малой Савецкай Энцыклапедыі былі раскрытыкаваны за тое, што забыліся паказаць гераічную барацьбу «з германскімі "псамі-рыцарамі"», не напісаўшы пра бітвы 1240 і 1242 г.[69], а вось "забыццё" непараўнальна большай бітвы 1410 г. ім у правіну не ставілася, хоць у названым выданні пра Грунвальд гаварылася зусім мімаходзь, літаральна некалькі радкоў[70].

66 Казаков А. Ледовое побоище // Правда. 1937. 27 авг. Пра перамогу пад Грунвальдам у галоўным органе партыі да вайны яшчэ не згадвалі.

67 Пар.: Минц И. О войнах справедливых и несправедливых // Правда. 1939. 14 авг. С. 4.

68 Грацианский Н. Немецкая агрессия в Прибалтике в XIII–XV вв. // ИМ. Кн. 6 (70). 1938. С. 87–111.

69 Потапов К. Большие изъяны Малой энциклопедии // Правда. 1939. 7 июля. С. 4.

70 Танненберг // Малая Советская Энциклопедия. Т. 10. Москва, 1940. Стлб. 617. Паказальна, што ў гэтым ананімным артыкуле больш змястоўна апісана бітва 1914 г., тады як пра аднайменную сярэднявечную сечу паведамляецца толькі адным радком – што гэта быў "рашучы адпор прасоўванню рыцарства на ўсход". Ды і ў першым выданні "Большой Советской Энциклопедии" быў толькі дзесяцірадковы ананімны артыкул пра гістарычную бітву. Гл.: БСЭ, т. 19 (1930). Стлб. 687.

## 6.3 Метамарфозы дзяржаўнай прапаганды (1939–1941)

*Мы стояли и стоим за дружбу народов СССР и Германии.*

В. Молатаў (1.09.1939)[71]

*Дружба народов Германии и Советского Союза, скрепленная кровью, имеет все основания быть продолжительной и крепкой.*

Сталін – Гітлеру (25.12.1939)[72]

Тэма барацьбы з немцамі ў жніўні 1939 г. раптам цалкам знікла з афіцыйнага дыскурсу савецкай дзяржавы. Гэта было выклікана падпісаннем у Маскве 23 жніўня 1939 г. дагавора аб ненападзе або "пакта Рыбентропа – Молатава" паміж СССР і Нямеччынай і звязаным з ім згортваннем усёй антынямецкай прапаганды. Старшыня Савета Народных Камісараў В. М. Молатаў у выступленні на пазачарговай IV сесіі Вярхоўнага Савета СССР, якая адзінагалосна ратыфікавала згаданы пакт, 31 жніўня 1939 г. заявіў, у прыватнасці, што дагавор аб ненападзе "кладзе канец варожасці паміж Нямеччынай і СССР, што ў інтарэсах абедзвюх краін. Адрозненні ў светаглядзе і ў палітычных сістэмах не павінны і не могуць быць перашкодай для наладжвання добрых палітычных адносін паміж абедзвюма дзяржавамі"[73]. З даклада В. Молатава вынікала, што "спрошчанай антынямецкай агітацыяй" у Савецкім Саюзе раней захапляліся толькі "некаторыя блізарукія людзі".

Адпаведна з новым палітычным курсам ва ўсіх афіцыйных масмедыях, а таксама ў публікацыях гуманітарных навук вобраз Нямеччыны мусіў падавацца без якога б там ні было негатыву. Усе гістарычныя публікацыі пра нямецкую агрэсію прыпыняліся. Слова "фашыст" знікла са старонак савецкага друку, яго не прапускалі нават у мастацкіх творах, і гітлераўцаў сталі паважліва называць

[71] О ратификации советско-германского договора о ненападении // Правда. 1939. 1 сент. С. 1.
[72] Цыт. па: Невежин В. А. "Если завтра в поход...". С. 149.
[73] Правда. 1939. 1 сент. С. 1.

членамі нацыянал-сацыялістычнай рабочай партыі Нямеччыны[74]. За крытыку фашызму палітычная цэнзура выводзіла з абароту ўжо выдадзеныя кнігі (у т. л. лідара нямецкіх камуністаў Э. Тэльмана) і здымала з друку падрыхтаваныя выданні[75]. Нават славуты фільм "Аляксандр Неўскі", запушчаны ў пракат у канцы 1938 г., знялі з прагляду на экранах – "у сувязі з палітычнай сітуацыяй". Адзін з членаў рады па сцэнарам пад час абмеркавання плана фільмаў на 1940–1941 г. адзначыў, што ўжо "Германію браць нельга", і што цяпер "прынята звальваць усё на Польшчу"[76].

Каб не раздражняць нацыянал-сацыялісцкіх саюзнікаў, у прапагандысцкіх савецкіх выданнях у перыяд дзейнасці пакта не згадвалася і пра славянскую салідарнасць. Мала таго, на старонках часопіса "Большевик", галоўнага тэарэтычнага органа партыі, палітыка СССР была прынцыпова адмежаваная ад панславізму, а савецкія гісторыкі-славісты выступілі з крытыкай рэакцыйнай панславісцкай ідэалогіі[77]. Паказальна, што калі ў пачатку 1939 г. часопіс "Историк-марксист" публікаваў артыкул пра інтэрвенцыю на Украіну з асаблівай увагай да нямецкіх інтэрвентаў, то ў канцы таго ж года ў аналагічным артыкуле пра Украіну і Беларусь нямецкае ўварванне нават не згадвалася[78]. Як падлічана, за ўвесь 1940 г. і першую палову 1941 г. у публікацыях часопіса "Историк-марксист" нямецкая гісторыя закраналася толькі ў некалькіх артыкулах, і пры гэтым ніводнага разу не тэматызавалася нямецкая агрэсія[79]. Больш за тое, цяпер і аб'яднанне Нямеччыны Бісмаркам у 1871 г., якое ў свой час выклікала столькі адмоўных рэакцый у Расіі, ацэньвалася як прагрэсіўны гістарычны акт[80].

[74] Невежин В. А. Советская политика и культурные связи с Германией (1939–1941) // ОИ. 1993. № 1. С. 21.

[75] Невежин В. А. Синдром наступательной войны. Советская пропаганда в предверии "священных боев", 1939–1941. Москва, 1997. С. 55–62; ён жа. "Если завтра в поход...". С. 145–150.

[76] Невежин В. А. Метаморфозы советской пропаганды в 1939–1941 гг. // ВИ. 1944. № 8. С. 168.

[77] Досталь М. Ю. Как Феникс из пепла... С. 50–52.

[78] Гуковский А. Иностранная интервенция на Украине в 1917–1919 гг. // ИМ. 1939. №1. С. 76–100; Пичета В. Основные моменты в исторических судьбах народов западной Украины и западной Белоруссии // ИМ. 1939. № 5-6. С. 67–98.

[79] Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 115–116.

[80] Гл. рэц. С. Шустэрмана на рускамоўнае выданне ўспамінаў Бісмарка ў: ИМ. 1940. №12. С. 117.

Такі рэзкі разварот дзяржаўнай прапаганды не паўсюль быў належна зразуметы і нярэдка выклікаў абурэнні савецкіх грамадзян, у тым ліку іранічныя выказванні на адрас гісторыкаў: маўляў, нядаўна "крычалі пра псоў-рыцараў, пра Лядовае пабоішча, пра Аляксандра Неўскага, а цяпер давядзецца крычаць пра... стагоддзі сяброўства"[81].

У такой раптоўнай пераарыентацыі трактовак адносін з немцамі можна бачыць прыклад таго, наколькі інструментарна разглядаў савецкі ўрад гістарычныя навукі – не больш як сродак ажыццяўлення сваёй палітыкі. З іншага боку, яна пацвярджае і няздольнасць кіраўніцтва СССР распазнаць сапраўдную небяспеку ў гітлераўскай Нямеччыне[82].

Між тым, ідэалагічныя супярэчнасці паміж двума таталітарнымі рэжымамі нарасталі. У закрытых матэрыялах органаў савецкай прапаганды ўжо летам 1940 г. спарадычна праходзілі антынямецкія матывы. Затым, у сувязі са зменай палітычнай сітуацыі, у траўні – чэрвені 1941 г. савецкае кіраўніцтва пачало кампанію па ідэалагічна-прапагандысцкай падрыхтоўцы наступальнай вайны супраць Нямеччыны, аднак яна вялася прыхавана, паколькі Масква заставалася звязанай з Берлінам пактам ад 23 жніўня 1939 г. Таму зрабіць у развароце прапаганды паспелі толькі першыя, пераважна арганізацыйныя крокі[83]. У прыватнасці, Упраўленне прапаганды і агітацыі ЦК УКП(б) ўжо мела ў распараджэнні праекты новага ідэалагічнага зместу прапагандысцкай дзейнасці. Імі прадугледжвалася, між іншага, перавыданне масавым накладам кніг пра перамогу Аляксандра Неўскага ў 1242 г. і пра Грунвальдскую бітву[84]. Аднак выканаць гэтага не паспелі. Вяртанне да маштабнай антынямецкай прапаганды ў СССР адбылося толькі пасля пераходу арміямі Гітлера межаў савецкай дзяржавы.

[81] Невежин В. А. "Если завтра в поход...". С. 144.

[82] Праўда, у сакавіку 1940 г. Сталін інструктаваў генерала І. Пятрова, што, маўляў, хоць дагавор з Гітлерам падпісаны, "фашысцкая Нямеччына была і застаецца нашым лютым ворагам". Цыт. па: Невежин В. А. Синдром наступательной войны. С. 129.

[83] Невежин В. А. Политико-идеологические кампании Кремля (1939–1941) // Международный кризис 1939–1941 гг.: от советско-германских договоров 1939 г. до нападения Германии на СССР. Москва, 2006. С. 313–324; ён жа. Синдром наступательной войны. С. 130–132.

[84] Невежин В. А. Метаморфозы советской пропаганды в 1939–1941 гг. С. 170.

## 6.4 Грунвальд у дыскурсе абарончай вайны

*Грюнвальд – неизбежный эпилог кровавых подвигов средневековых предшественников современных фашистов.*

Ян Зуціс[85]

Напад армій Гітлера на СССР выклікаў імгненную актуалізацыю гісторыі барацьбы славян з немцамі і небывалы размах яе выкарыстання ў савецкай ваеннай прапагандзе. Цяпер папулярныя брашуры для ваенна-палітычных патрэбаў, што выдаваліся масавымі тыражамі[86], пісалі як вайскоўцы, так і прафесійныя навукоўцы, прафесары і акадэмікі. Асноўнай мэтай было натхніць народ гераічнымі прыкладамі, паказаць усім, "як рускія перамагалі немцаў"[87]. Агульным месцам стала асаесамленне фашысцкіх войскаў з рыцарамі сярэднявечных ордэнаў: маўляў, фашысты ідуць "по стопам немецких рыцарей", але яны павінны помніць пра "уроки, которые русские не раз давали рыцарским бандам"[88]. Сярод абраных прыкладаў бясспрэчнае першае месца займала бітва на Чудскім возеры 1242 г.: за ваенныя гады тэме гэтай бітвы і Аляксандру Неўскаму было прысвечана амаль паўтара мільёна экзэмпляраў разнастайных выданняў прапагандысцкага характару[89]. "Лядовае пабоішча" служыла ўзорным пачаткам шэрагу перамог над немцамі, і толькі пасля

[85] Зутис Я. Грюнвальд – конец могущества Тевтонского ордена // ИЖ. 1941. № 9. С. 74.

[86] Напрыклад, агульны тыраж выданняў пра перамогу 1242 г. дасягнуў амаль паўтара мільёна экз. Гл.: Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 119.

[87] Как русский народ бил немецких захватчиков. Москва, 1941; Непобедимый народ. Свердловск, 1941; Берхин И. Когда и как русский народ бил немецких захватчиков. Молотов, 1941.

[88] Данилевский В. Фашизм – заклятый враг науки и культуры. Москва, 1941. С. 24–25.

[89] Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 119, 206. Вычарпальны аналіз інструменталізацыі гэтай бітвы ў СССР у гады вайны з фашысцкай Нямеччынай гл.: Шенк Ф. Б. Александр Невский в русской культурной памяти: святой, правитель, национальный герой (1263–2000). Москва, 2007. С. 395–429.

яго называлася Грунвальдская бітва, якая фігуравала сярод шэрагу іншых, – такіх, як перамогі Івана IV над інфлянцкім Ордэнам, захоп рускімі Берліна ў 1760 г., перамогі часоў І сусветнай вайны і інш.[90]. Але патрыятычныя пачуцці насельніцтва павінны былі абуджацца не толькі ад перамог над немцамі: у якасці прыкладу гераізму рускіх часта прыводзіліся таксама перамога Дзмітрыя Данскога над татарамі ў 1380 г. і гераізм абаронцаў Масквы ў барацьбе супраць палякаў у часы Смуты.

Ідэя пераемнасці паміж гітлераўскай Нямеччынай і Прускім ордэнам, якая яшчэ ў другой палове 1930-х г. стала важным элементам канструявання савецкага патрыятызму, замацоўвалася ў масавай свядомасці мэтанакіравана. Пашыраць яе даручалася непасрэдна гісторыкам. Так, калі на другі год вайны перад імі была пастаўлена задача дапамагаць знішчаць гітлераўскую Нямеччыну сваёй дзейнасцю на гістарычным фронце[91], то гэта азначала не толькі выкарыстоўваць "увесь арсенал гістарычнай навукі", каб "умацаваць у народзе ўпэўненасць у… непазбежнасці гібелі ворага", але і канкрэтна "паказаць пераемнасць гітлерызму з прускім юнкерствам". "Трэба паказаць рэакцыйную ролю Нямеччыны ў XIX–XX ст." – указвалася ў пераліку задач[92]. У галіне гісторыі славянскіх народаў гісторыкам прадпісвалася "паказаць вялізную ролю рускага народа ў барацьбе супраць спробаў Германіі знішчыць славянскія народы, ператварыць іх у гной гісторыі для новых германскіх гаспадароў…[93]. З такой жа мэтай у Інстытуце гісторыі АН СССР рыхтавалася адмысловая праца пад рэдакцыяй чэшскага прафесара Здэнка Неедлы і акадэміка Уладзіміра Пічэты[94].

У гэтай сувязі паказальна, што не толькі генерал-лейтэнант М. Хозін[95] ці папулярызатар В. Данілеўскі, але і вядомыя прафесійныя гісторыкі, такія, у прыватнасці, як медыявіст М. Грацыянскі ці акадэмік Я. Тарле, – усе яны сваімі публікацыямі

[90] Пар.: Державин Н. Вековая борьба славян с немецкими захватчиками. Москва, 1943. С. 11 і далей.

[91] Александров Г. Отечественная война советского народа и задачи отечественной науки // Вестник АН СССР. 1942. Вып. 5-6. С. 33.

[92] Ярославский Е. О ближайших задачах исторической науки в СССР // ИЖ. 1942. № 6. С. 18–20.

[93] Тамсама. С. 21.

[94] Маецца на ўвазе "Вековая борьба западных и южных славян против германской агрессии", якая выйшла ў Маскве толькі ў 1944 г.

[95] Пар.: Хозин М. О хвастливой выдумке зазнавшегося врага // Правда. 1941. 25 июля. С. 5.

сцвярджалі пераемнасць дзеянняў Тэўтонскага ордэна і гітлераўскай Нямеччыны як этапаў адной заваёўніцкай палітыкі, пачатай яшчэ ў VII ст. Сярэднявечным рыцарам прысвойвалася ідэя барацьбы дзеля славы Нямеччыны з мэтай падпарадкавання славян, а іх ваенная дзейнасць апісвалася паводле актуальнага вопыту акупацыйнай палітыкі Вермахта. Напрыклад, называючы гітлераўцаў "нашчадкамі Ордэна", Я. Тарле ў дакладзе на Агульным сходзе АН СССР вясной 1942 г. гаварыў, што нямецкія рыцары ўжо ў XIII ст. вялі "татальную вайну" і ставілі сабе задачай "выкараненне ўсіх рускіх славян, акрамя патрэбнай колькасці ў якасці працоўнага быдла"[96]. Тэзіс аб тым, што палітычныя мэты Гітлера ёсць працягам заваёўніцкіх ідэалаў сярэднявечнага рыцарскага ордэна, заключаў у сабе пастулат як генетычнай пераемнасці сярэднявечнай нямецкай экспансіі з вайной Гітлера, так і непазбежнасць перамогі аб'яднаных славян на чале з рускімі. Пры гэтым барацьба сярэднявечнай Русі з рыцарскім ордэнам, за якімі пракглядаліся СССР і фашысцкая Нямеччына, у дыскурсе абарончай вайны стылізавалася як супрацьстаянне дабра і зла, святла і цемры.

Да першых публікацый навуковага характару, якія ўзвышалі значэнне бітвы 1410 г., належаў артыкул латышскага гісторыка Яна Зуціса. Аўтар сярод іншага сцвярджаў, што перамога пад Грунвальдам не толькі «на некалькі стагоддзяў прыпыніла "націск на Усход" і дала магчымасць Польшчы і Літве адстаяць сваю незалежнасць», але наогул "выратавала народы Прыбалтыкі ад анямечвання – лёсу, які спасціг прусаў"[97]. Падобна Лапіну і Турчынскаму, Я. Зуціс падкрэсліў вырашальны характар падзеі для лёсаў славян і ўсіх народаў Усходняй Еўропы.

Нельга не прызнаць пэўнай самастойнасці поглядаў некаторых прафесійных гісторыкаў, якія пісалі пра Грунвальдскую бітву: іх публікацыі і ў гады вайны магла вылучаць навуковая збалансаванасць пазіцый і стрыманасць ацэнак. Так, калі М. Грацыянскі называў Грунвальд "адной з найвялікшых па-

[96] Тарле Е. В. Тевтонские рыцари и их "наследники" // Вестник АН СССР. Вып. 12 (1942). № 5-6. С. 38–48. Цыт. па выданні: Академик Е. В. Тарле. Сочинения: в 12 т. Т. 12. Москва, 1962. С. 47, 53. Пар.: Шенк Ф. Б. Александр Невский в русской культурной памяти. С. 405.

[97] Зутис Я. Грюнвальд – конец могущества Тевтонского ордена // ИЖ. 1941. № 9. С. 80.

дзей сусветнай гісторыі"[98], якой "на некалькі стагоддзяў быў пакладзены канец нямецкай агрэсіі ў Польшчы і Літве", то ацэнка бітвы славістам У. Пічэтам не можа не ўражваць сціпласцю: для яго гэта быў разгром рыцараў Тэўтонскага ордэна, дзе "выдатная роля належала рускім (смаленскім), беларускім і ўкраінскім палкам", які "падарваў магутнасць немцаў у Прыбалтыцы", і нічога большага[99]. А цытаваны вышэй акадэмік Я. Тарле лічыў, што калі нямецкую экспансію ў 1242 г. спынілі "рускія", то ў 1410 г. гэта зрабілі "палякі", таму бітву пад Грунвальдам ён згадваў побегам і называў яе рашэннем канфлікту "паміж заходнімі славянамі і тэўтонамі"[100]. Ды і сама нямецкая экспансія ў Прыбалтыку і Паўночна-Заходнюю Русь, спыненая князем Аляксандрам Яраславічам, пад пяром М. Ціхамірава трактавалася як рабаўнічы паход па рэсурсы[101], без рытуальных сцвярджэнняў аб смяротнай нямецкай небяспецы для славянскіх народаў.

Задача выхавання савецкага патрыятызму з інтэграванай у яго ідэяй пераемнасці паміж рыцарамі Тэўтонскага ордэна і нацыянал-сацыялістамі стала цэнтральнай і для выдадзеных у 1942 г. рэкамендацый па выкладанні гісторыі – як сусветнай, так і СССР[102]. Ад савецкіх настаўнікаў гісторыі свету

[98] Грацианский Н. Новое наступление немецких захватчиков на славянские государства с XIII по XV в. // Вековая борьба... С. 72, 74. Падобныя ацэнкі гісторык даў таксама ў дапаможніку для настаўнікаў, у якім выкладалася гісторыя "націску на Усход" у Сярэднія вякі. Гл.: Грацианский Н. П. Борьба славян и народов Прибалтики с немецкой агрессией в средние века: Пособие для преподавателей. Москва, 1943. С. 49–63.

[99] Пичета В. И. Русский народ в борьбе с германской агрессией и освободительное движение западных и южных славян // Вековая борьба западных и южных славян против германской агрессии. Под ред. З. Р. Неедлы. Москва, 1944. С. 6–31. Хоць у поглядах на гісторыю нямецкай экспансіі вучоны ў цэлым падзяляў пазіцыі М. Грацыянскага. Як адзначана ў рэцэнзіі У. Пічэты на названую кнігу, М. Грацыянскі паказаў, што "націск на Усход", гэты "план, пра які даўно марылі" нямецкія фашысты, "нязменна суправаджаўся страшэннымі насіллямі над мясцовымі жыхарамі" і быў "суцэльным разбоем у грандыёзным маштабе" (гл.: ИЖ. 1944. № 10-11. С. 137–138).

[100] Тарле Е. В. Тевтонские рыцари и их "наследники". С. 49, 52.

[101] Тихомиров М. Н. Борьба русского народа... С. 3.

[102] Авдиев В., Косминский Е., Ефимов А. Преподавание всеобщей истории в средней школе в дни отечественной войны против германского фашизма // ИЖ. 1942. № 3-4. С. 122–129; Панкратова А. Преподавание истории СССР в средней школе в дни отечественной войны против германского фашизма // ИЖ. 1942. № 5. С. 145–152.

патрабавалася "ўзброіць навучэнцаў разуменнем падзей, якія адбываюцца, раскрыць перад імі звярынае аблічча сучасных варвараў – фашыстаў, выхаваць навучэнцаў на прыкладах гераічнага мінулага свайго і іншых народаў у духу патрыятызму... нянавісці да занявольнікаў і прыгнятальнікаў"[103]. У выкладанні гісторыі Сярэдніх вякоў выкладчык павінен быў "па магчымасці цясней звязаць сваё выкладанне з пытаннямі, якія ставіць перад намі Вялікая айчынная вайна", – "запаліць у вучнях патрыятызм... нянавісць да найбольш жорскіх і каварных насільнікаў, якія топчуць найлепшыя культурныя каштоўнасці чалавецтва...". Ад настаўнікаў гісторыі патрабавалася не толькі абвяргаць фашысцкія "тэорыі" пра расавую перавагу немцаў і непаўнавартасць славян, але таксама паказваць, што нямецкія фашысты "бяруць з мінулага ўсё самае цёмнае, жудаснае, жорсткае", што яны "ідэалізуюць грубую ваяўнічасць сярэднявечных рыцараў, іх бязлітаснасць да пераможаных, іх насіллі...", – сцвярджалася ў рэкамендацыях[104]. Тэма нямецкай агрэсіі на Усход у XII–XV ст. тут вызначалася як "адна з цэнтральных тэм курса". Заданнем настаўнікаў было "паказаць лютыя, крывавыя і ў той жа час подла здрадніцкія метады гэтай агрэсіі і яе ганебны канец у XV ст. і падкрэсліць, што Гітлер звязвае свае планы "націску на Усход" з гэтай найбольш змрочнай і ганебнай старонкай гісторыі Еўропы"[105].

Такая ж устаноўка ўтрымлівалася ў рэкамендацыях па выкладанні гісторыі СССР. Тут больш не было апеляцый да пралетарскіх традыцый, як раней, а толькі да ваенных, да "гераічнага мінулага" савецкіх народаў: настаўнікі павінны былі паказваць навучэнцам, што гераізм і самаадданасць Чырвонай арміі – гэта не выпадковасць, а што яны "выпрацаваны ў выніку працяглай гістарычнай барацьбы"[106]. На занятках першачарговую ўвагу належала аддаваць тэме «барацьбы рускага народа з нямецкімі "псамі-рыцарамі" ў XII–XIII ст. і асабліва такому гераічнаму эпізоду, як Лядовае пабоішча», а таксама "па магчымасці падрабязна спыняцца на Грунвальдскай бітве". У апісанні апошняй прадпісвалася паказваць, "як дзякуючы стойкасці і мужнасці рускіх ратнікаў усяго толькі тры

[103] Авдиев В., Косминский Е., Ефимов А. Преподавание всеобщей истории... С. 122.
[104] Тамсама. С. 124.
[105] Тамсама. С. 126.
[106] Панкратова А. Преподавание истории СССР... С. 145, 149.

смаленскія палкі на флангах не толькі выстаялі перад цяжкай кавалерыяй немцаў, але і, атрымаўшы падмацаванне, перайшлі ў пераможны наступ”[107].

У цытаваных рэкамендацыях перамогі над немцамі прыведзены як прыклады ў шэрагу іншых перамог над рознымі агрэсарамі, і Грунвальд фігуруе ў іх сярод такіх бітваў, як сеча на Куліковым полі, пад Барадзіном і інш. Так што і ў выкладанні гісторыі “векавая нямецкая агрэсія супраць славян” яшчэ не мусіла выконваць першаступеннай і выключнай ролі. Тым не менш тэндэнцыя рэабілітацыі панславізму выразна акрэслілася ўжо ў першыя гады вайны. Цытаваны вышэй В. Данілеўскі пісаў, што толькі калі славяне будуць разам і з’яднаюцца вакол вялікага рускага народа, то “прыйдзе час, каб звесці старыя рахункі паміж славянамі і немцамі”[108]. Пад такім “рахункам” ён разумеў “адвечную барацьбу славян супраць нямецкіх захопнікаў”. Прафесар МДУ С. Бахрушын наўпрост звязваў перамогу славян над Гітлерам, якія ў далёкія часы ўжо «выратавалі Усходнюю Еўропу ад “псоў-рыцараў”», з іх гуртаваннем “пад кіраўніцтвам СССР і яго геніяльнага правадыра Сталіна”[109]. А ў аповедах пра бітву пад Грунвальдам, яшчэ рэдкіх на пачатку вайны, з большай настойлівасцю, чым раней, стала падкрэслівацца вырашальная роля “рускіх” (смаленскіх палкоў) у разгроме “немцаў”[110].

Больш актыўнае прапагандаванне Грунвальда аказалася звязаным з дзейнасцю па арганізацыі новага славянскага руху – ідэалагічнага яднання славян у барацьбе супраць нацысцкай Нямеччыны. Першы Усеславянскі сход адбыўся ў Маскве ў жніўні 1941 г. Арганізаваны па яго рашэнні Усеславянскі камітэт на чале з генерал-лейтэнантам Аляксандрам Гундаравым спачатку вёў спецыяльныя радыёперадачы. Па ініцыятыве другога сходу, скліканага да сямісотай гадавіны бітвы на Чудскім возеры, быў заснаваны часопіс Агульнаславянскага камітэта “Славяне”[111], які выдаваўся ў Маскве з 1942 г. Адной з галоў-

[107] Тамсама. С. 147.
[108] Данилевский В. Древний счет. Свердловск, 1942. С. 11.
[109] Бахрушин С. В. Героическое прошлое славян. Москва, 1941. С. 14–15.
[110] Боголюбов К. Воины Грюнвальда // Непобедимый народ. Свердловск, 1941. С. 10.
[111] Руколь Б. Идея общности славян в материалах Всеславянского комитета в Москве // Славянский вопрос: Вехи истории. Отв. ред. М. Ю. Досталь. Москва, 1997. С. 204–210.

ных тэм названага перыёдыка была, зразумела, "векавая барацьба славянскіх народаў з нямецкай агрэсіяй", прапаганда ваеннай садружнасці славянскіх народаў. У публікацыях пра гісторыю барацьбы з Ордэнам чырвонай ніткай праводзілася думка пра аб'яднанне славян як адзіны спосаб супрацьстаяння нямецкаму "Дранг нах Остэн"[112], што разумеўся як рэальная гістарычная з'ява, пачатак якой губляўся ў Сярэднявеччы, а пік быў дасягнуты ў форме гітлераўскага фашызму. Патрэбную славянскую салідарнасць магла ідэальна сімвалізаваць менавіта Грунвальдская бітва, таму зусім невыпадкова ў адным з першых нумароў "Славян" з'явілася асобная публікацыя пра Грунвальд[113]. Аднак характэрна, што яна была змешчана пасля артыкула пра Лядовае пабоішча, якое займала галоўнае месца ў антынямецкім дыскурсе савецкага патрыятызму. Цяпер у выданнях Агульнаславянскага камітэта, які напачатку прынцыпова адмяжоўваўся ад ідэі панславізму як рэакцыйнай спадчыны расійскага царызму[114], рэгулярна расказвалася пра бітву 1410 г. як прыклад перамогі над захопнікамі, дасягнутай аб'яднанымі сіламі славянскіх народаў.

Лішне казаць, наколькі лёгка маніпулявалі фактамі газетныя і часопісныя публікацыі, паказваючы масаваму чытачу Грунвальдскую бітву як этап адвечнай нямецкай агрэсіі і зводзячы складаныя міжнародныя супярэчнасці канца XIV – пачатку XV ст. да схемы абарончай вайны славян супраць нямецкіх захопнікаў. Напрыклад, у артыкуле "Правды" пісалася, што прускія рыцары, завалодаўшы Новай Маркай, самі, маўляў, "паставілі ўсходніх славян перад моцнай пагрозай", што і "пацягну-

[112] Державин Н. Ледовое побоище // Славяне. 1942. № 1; Перцев В. Фашизм и средневековье // Тамсама. № 2; Селищев А. Извечная борьба славян против немецких варваров // Тамсама. № 4; Державин Н., Константинов Ф. Разгром немецких псов-рыцарей под Грюнвальдом и Танненбергом 15 июля 1410 г. // Тамсама. № 2. С. 38–42.

[113] Державин Н., Константинов Ф. Разгром немецких псов-рыцарей под Грюнвальдом и Танненбергом 15 июля 1410 г. // Славяне. № 2. 1942, июль. С. 38–41.

[114] У звароце Усеславянскага мітынгу да прыгнечаных славянскіх народаў, які адбыўся ў Маскве 10–11 жніўня 1941 г., у прыватнасці, гаварылася: "Мы решительно и твердо отвергаем саму идею панславизма как насквозь реакционного течения, глубоко враждебного задачам равенства народов...". Гл.: Борьба славянских народов против фашизма. Свердловск, 1942. С. 4.

ла за сабой кансалідацыю славянскіх сілаў" і ў выніку адбыўся паход пад Грунвальд[115].

Паказальна, што асобная публікацыя пра Грунвальд на старонках газеты "Правда" з'явілася толькі ў 1943 г., у чарговую гадавіну бітвы[116]. Але гэта быў толькі пераказ інфармацыі аб прымеркаванай на той дзень прысязе польскай пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі, узятай з "Wolnej Polski" (№ 17 і 18), дзе бітва 1410 г. трактавалася як "паваротны пункт гісторыі" Польшчы. Польскія камуністы, якія да нападу Гітлера практычна не тэматызавалі яе, ужо ў 1942 г. звярнуліся да Грунвальда ў часопісе "Nowe Widnokręgi", выдаваным у Маскве. Аўтар артыкула Station Станіслаў Вярблоўскі пісаў, што польскія патрыёты звяртаюцца "да гісторыі пераможнай барацьбы народаў Усходняй Еўропы з германскай навалай, да бітвы на Чудскім возеры, да бітвы пад Плоўцамі, урэшце да паразы крыжакоў на палях Грунвальда, у якой палякі і літоўцы пры дапамозе Русі і Чэхіі, моцныя славянскім адзінствам... ударылі ў самае сэрца нямецкага нападніка". Адпаведна з савецкай устаноўкай на прапаганду салідарнасці славян у заключэнні артыкула падкрэслівалася, што Грунвальд "быў супольнай перамогай палякаў, літоўцаў, украінцаў, беларусаў, рускіх і чэхаў"[117].

І ўсё ж, нягледзячы на асобныя артыкулы і звароты да Грунвальда, у Маскве ўсё яшчэ не разглядалі бітву 1410 г. як падзею першаступеннага значэння. Гэта выразна відаць па тагачасных публікацыях гісторыкаў. Так, трактуючы агрэсію Нямеччыны як характэрную з'яву цэлага тысячагаддзя яе гісторыі, пачатай у X ст., праф. Б. Поршнеў скончыў першы цыкл яе "заваёўніцкіх авантур" той жа перамогай Неўскага ў 1242 г., якая, па яго словах, "смяротна падкасіла" Тэўтонскі ордэн і "перарвала яго рух на Усход"[118]. Пра перамогу пад Грунвальдам гісторык не напісаў ні слова, паколькі, відаць, не лічыў яе для "ўсходняга фронту" істотнай. Падобная пазіцыя праглядалася ў лекцыі праф. М. Карабкова пра гераізм рускага народа для франтавых агіта-

[115] Коробков Н. Исторические корни германской агрессии // Правда. 1942. 25 сентября. С. 4.

[116] Традиции Грюнвальда // Правда. 1943. 15 июля. С. 4.

[117] Цыт. па: Radziwiłłowicz D. Tradycja grunwaldzka w świadomości politycznej społeczeństwa polskiego w latach 1910–1945. Olsztyn, 2003. S. 213.

[118] Поршнев Б. Завоевательные авантюры в истории Германии и гитлеровщина // Большевик. 1943. № 14. С. 37–51.

тараў, дзе яна наогул не згадвалася – пасля перамог Аляксандра Неўскага аўтар перайшоў да адпаведных прыкладаў з гісторыі войнаў супраць татараў, Літвы і Польшчы[119].

Магчыма, менавіта маштабнае прымяненне Грунвальда як сімвала пры стварэнні польскіх ваенных фармаванняў у СССР (прысяга дывізіі імя Касцюшкі ў дзень 15 ліпеня, ордэн "Крыж Грунвальда" як найвышэйшая ўзнагарода ў польскай арміі і інш.) падштурхнула і савецкае кіраўніцтва да яго больш актыўнага выкарыстання. Ужо праз год, у 534-ю гадавіну бітвы, у Маскве адбылося першае ўрачыстае паседжанне, прысвечанае сярэднявечнай перамозе. Праведзена яно было Усеславянскім камітэтам і Саюзам польскіх патрыётаў, пра што падрабязна паінфармавала ТАСС[120]. Лейтматывам усіх выступаў стала гістарычная пераемнасць паміж сярэднявечнай падзеяй і вайной супраць нямецкіх фашыстаў. Старшыня Усеславянскага камітэта Аляксандр Гундараў, напрыклад, сцвярджаў, што пад Грунвальдам "армія славян… разам з літоўцамі нанесла сакрушальнае паражэнне нямецкім ордам, якія спрабавалі захапіць славянскія землі і заняволіць славянскія народы"; польскі акадэмік Вікенці Жымоўскі гаварыў пра віну польскіх і літоўскіх феадалаў у тым, што ў 1410 г. "нямецкі вораг не быў дабіты", а Юстас Палецкіс, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР, правёў наўпроставую сувязь паміж ліпенем 1410 і ліпенем 1944 г. Грунвальд "вучыць не паўтараць памылак мінулага", – адзначыў Ю. Палецкіс[121], што магло разумецца як "трымайцеся Расіі". Праўда, ператвараць у традыцыю першы вопыт ушанавання памяці гэтай перамогі ў Маскве, здаецца, і не было намераў, бо ўжо ў ліпені наступнага года, калі святкавалася 535-я гадавіна Грунвальда, цэнтральная савецкая газета зусім не згадала яе.

У цэлым на завяршальным этапе вайны дзякуючы прапагандзе славянскай салідарнасці Грунвальдскай бітве сталі аддаваць прыкметна больш увагі. Ключавым пасланнем любога аповеду пра Грунвальд стала ідэя, што перамагчы нямецкіх імперыялістаў у адвечнай барацьбе можна толькі пры ўмове

[119] Коробков Н. Героическое прошлое русского народа // Большевик. 1943. №18. С. 59–64.

[120] Годовщина Грюнвальдской битвы // Правда. 1944. 16 июля. С. 3.

[121] Тамсама. У згаданым паведамленні ТАСС не ўпамінаюцца прадстаўнікі БССР, таму невядома, ці яны былі і ці выступалі на ўрачыстасці.

аб'яднання ўсіх славян на чале з Расіяй. У архаічным дыскурсе адвечнага славяна-германскага супрацьстаяння варожы вобраз нямецкага нацыянал-сацыялізму станавіўся антынямецкім увогуле. Нават лозунг "Дранг нах Остэн" прыпісваўся ўжо сярэднявечным "псам-рыцарам" – яго называлі "старадаўнім клічам тэўтонаў і мечаносцаў"[122]. Варта адразу адзначыць, што абразлівае азначэнне "псы-рыцары", якім Маркс назваў крыжаносцаў, зусім некарэктна пераносілася на немцаў наогул, бо ў Маркса яно ніколі не адносілася да нямецкай нацыі: Маркс крытыкаваў місію Ордэна, хрысціянізацыю і асабліва метады яе правядзення (гл. 6.2).

Такім чынам, у перыяд вайны з гітлераўскай Нямеччынай Грунвальдская бітва паўстала ў даўнім панславісцкім вобразе – як рашучы адпор адвечнаму нямецкаму націску на славян. Між тым, тэзіс аб палітычнай агрэсіўнасці як уласцівасці нейкай аднои нацыі не спалучаўся ні з марксісцкім тлумачэннем гісторыі, ні з ідэалізмам. Яго прыняцце магло азначаць толькі капітуляцыю рацыянальнага мыслення перад магутным вобразам ворага. Праўду кажучы, у гады вайны ў СССР такі тэзіс фармуляваўся толькі зрэдку, і не з урадавых колаў[123], тым не менш, падобныя ідэі неаднаразова агучваліся. У прыватнасці, з прыкладна такім тэзісам у Маскве ў канцы вайны выступіў пражскі прафесар Здэнэк Неедлы: "Напор немцаў на ўсход пачаўся на самым світанку іх гісторыі і заўсёды суправаджаўся праявай дзікай нянавісці ў адносінах да славян"[124]. Да нямецкай гісторыі ён падышоў зусім не дыферэнцыявана, паказаўшы адну Нямеччыну як пачынальніка I сусветнай вайны, якую яна развязала дзеля "ажыццяўлення агульнанямецкіх заваёўніцкіх планаў". Як агрэсіўную і рэакцыйную па сутнасці, без адрознення інтарэсаў сацыяльных пластоў, апісваў Прусію і акадэмік Уладзімір Перцаў, са слоў якога войны і захопы сталі "галоўным нервам прускай гісторыі... з часоў драпежных тэўтонскіх рыцараў"[125]. Панславісцкае трактаванне немцаў як адвечных ворагаў характэрна было і для кнігі М. Дзяржавіна, які тлумачыў "шматвекавую захопніцкую барацьбу" нямецкіх заваёўнікаў і іх "нянавісць

[122] Гл.: Штейнберг Е. Истоки немецкого милитаризма и нацизма // Славяне. 1945. № 4. С. 21–24.
[123] Гл.: Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 143.
[124] Неедлы З. "Дранг нах Остэн // Вековая борьба западных и южных славян против германской агрессии. С. 31.
[125] Перцев В. Пруссия до ее завоевания немцами // ИЖ. 1944. № 4. С. 44.

да славян" тым, што "свабодалюбівыя славянскія народы" ўжо з VII ст. стаялі "непераадольнай перашкодай на шляхах драпежніцкай экспансіі нямецкіх заваёўнікаў"[126]. Атрымалася, што ідэя супрацьпастаўлення "свабодалюбівых" і "мірных" славян агрэсіўным немцам, якая брала пачатак з тэзісаў нямецкага філосафа Гердэра і карысталася асаблівай папулярнасцю ў нацыянальным дыскурсе XIX ст., на завяршальным этапе вайны ўвайшла ў прапагандысцкі арсенал вышэйшага савецкага кіраўніцтва. У прыватнасці, падобнай рыторыкі не пазбягаў і сам Сталін[127], плануючы выкарыстаць яе ў знешняй палітыцы СССР.

## 6.5 Спробы панславісцкай стылізацыі

*...Мы, новые славянофилы,*
*являемся коммунистами...*
Іосіф Сталін[128]

Ідэалогію савецкага патрыятызму з ідэяй перавагі велікарускага народа над усімі іншымі народамі СССР[129] як яе цэнтральным кампанентам, выпрацаваную для мабілізацыі насельніцтва на барацьбу з агрэсарам у перыяд вайны, савецкае кіраўніцтва

[126] Державин Н. С. Вековая борьба славян с немецкими захватчиками. Москва, 1943. С. 3–4. Падобная ідэя выказана таксама ў брашуры трох прафесараў "Железом и кровью", аднак у ёй спрадвечная заваёўніцкая дзейнасць звязвалася ўсё ж з нямецкімі кіроўнымі коламі, апрача якіх існаваў нямецкі народ, якому неабходна было дапамагчы вызваліцца ад Гітлера з яго бандай. Гл.: Вайнштейн О., Гуковский М., Полетика Н. Железом и кровью. Казань, 1942. С. 5.

[127] Вясной 1945 г. у прамове з нагоды падпісання дагавора паміж СССР і Польшчай Сталін гаварыў пра "свабодалюбівыя славянскія нацыі", якія аб'ядноўваюцца супраць нямецкага імперыялізму. Гл.: Большевик. 1945. № 7–8. С. 2.

[128] Марьина В. В. Э. Бенеш: последний визит в Москву (март 1945 г.) // Славяноведение. 1996. № 6. С. 86.

[129] У сваім крамлёўскім выступе перад камандзірамі Чырвонай арміі 24 траўня 1945 г. Сталін усхваляў рускі народ як "наиболее выдающуюся нацию изо всех наций, входящих в состав Советского Союза", як нацыю, што валодае "ясным умом, стойким характером и терпением". Гл.: Выступление тов. И. В. Сталина на приёме в Кремле в честь командующих войсками Красной Армии // Большевик. 1945. № 10. С. 1–2.

лічыла актуальнай і пасля перамогі над Гітлерам. Канцэпцыя "дружбы" народаў, так паспяхова выкарыстаная прапагандай ужо ў гады вайны, пасля перамогі стала дырэктыўна абавязковай[130]. Новая гістарыяграфія павінна была актыўней акцэнтаваць "дружбу" ўсіх савецкіх народаў у мінулым і пастуляваць яе гістарычную заканамернасць. Сярод галоўных прынцыпаў гэтай канцэпцыі было патрабаванне паказваць супольную барацьбу рускіх і нярускіх народаў савецкай дзяржавы супраць "чужаземных захопнікаў"[131]. З такой перспектывы Грунвальд станавіўся адным з удалых прыкладаў гераічнай гісторыі шматнацыянальнай дзяржавы[132].

Аднак названая канцэпцыя была не адзіным кампанентам канструяванай Крамлём новай савецкай ідэалогіі. Ідэя "вялікай дружбы" прапагандавалася пераважна ў межах самога СССР, тады як для знешнепалітычнага прызначэння напрыканцы вайны з новай сілай актуалізавалася ідэя агульнаславянскага адзінства. Згадаем, што Сталін рэанімаваў панславісцкі міф яшчэ ў 1941 г., пасля нападу Гітлера. Калі немцы набліжаліся да Масквы, ён дэклараваў, што ў выпадку перамогі верне ўсю Усходнюю Прусію "славянству"[133]. Бліжэй да перамогі крамлёўскае кіраўніцтва пачало актыўней падтрымліваць праграму развіцця "новага славянскага руху" і сур'ёзна разглядаць планы стварэння саюзу славянскіх дзяржаў. "Каб немцам не даць узняцца і распачаць новую вайну, патрэбен саюз славянскіх народаў", – заяўляў Сталін у сакавіку 1945 г. на сустрэчы з прэзідэнтам Чэхаславакіі Эдвардам Бенешам[134]. Пры гэтым ён спра-

[130] "...Наши ученые – историки, этнографы, литераторы – должны своими работами содействовать процветанию дружбы народов, населяющих Советский Союз, правдиво воссоздавать их историю". Гл.: Александров Г. О некоторых задачах общественных наук в современных условиях // Большевик. 1945. № 14. С. 18.

[131] Падрабязней гл.: Tillett L. The Great Friendship. Soviet Historians on the Non-Russian Nationalities. Chapel Hill, 1969. P. 81–82 і наст.

[132] Напрыклад, тэзіс пра "супольную гераічную барацьбу" латышоў з рускімі супраць немцаў у XIII ст. стаў чырвонай ніткай у працы Яна Зуціса. Гл.: Zutis J. Krievu un Baltijas tautu cīņas pret vācu agresiju. Riga, 1948.

[133] Цыт. па: Behrends J. C. Vom Panslavismus zum "Friedenskampf". Außenpolitik, Herrschaftslegitimation und Massenmobilisierung im sowjetischen Nachkriegsimperium // JGO. Bd. 56 (2008). Hf. 1. S. 33.

[134] Марьина В. Славянская идея в годы второй мировой войны (К вопросу о политической функции) // Славянский вопрос: Вехи истории. С. 180.

баваў знайсці адпаведную форму, якая дазваляла б аб'яднаць славянскія народы пад эгідай СССР. Заключаныя савецкім урадам дагаворы аб сяброўстве і супрацоўніцтве з Чэхаславакіяй, Югаславіяй і Польшчай сталі перадумовай ажыццяўлення такіх планаў. У славянскіх дзяржавах у канцы 1944 – пачатку 1945 г. утвараліся "Славянскія камітэты", у задачы якіх уваходзіла пашырэнне ідэі "брацкай садружнасці славянскіх народаў".

Пра важнасць славянскай ідэалогіі для Крамля можна меркаваць па тым, што ў Савецкім Саюзе да справы падключалася акадэмічная навука. Рашэннем савецкага ўрада ў 1946 г. у складзе АН СССР быў утвораны Інстытут славяназнаўства, які ўжо з наступнага года пачаў працу[135]. Атрымаўшы новую арганізацыйную аснову і статус самастойнай навуковай дысцыпліны, савецкае славяназнаўства мусіла распрацаваць русацэнтрычны стандарт гісторыі славянскіх народаў. Ад Інстытута славяназнаўства патрабавалася не толькі навукова абгрунтаваць гістарычную заканамернасць адзінства славян на чале з рускім народам, спалучаючы марксісцкія падыходы з панславісцкімі ідэямі, але і весці антынямецкую прапаганду[136]. У прыватнасці, славяназнаўцы мусілі даказваць справядлівасць атрымання пераможцамі новых тэрыторый, з якіх былі выселены немцы. Пасля разгрому фашысцкай Нямеччыны гісторыя шматвяковай нямецкай экспансіі на Усход, увесь легендарны "Дранг нах Остэн" вельмі добра надаваўся для таго, каб, з аднаго боку, легітымізаваць змены дзяржаўна-палітычных межаў пасля 1945 г., а з другога – падкрэсліць залежнасць лёсаў славянскіх нацый ад моцы Расіі[137]. Іншымі словамі, напрацоўкі гісторыкаў пра сярэднявечныя ўзаемаадносіны славян і немцаў у выніку пасляваенных пераменаў аказаліся востра запатрабаваныя для палітычных мэтаў, каб даказваць несправядлівасць пераможаных немцаў і абараняць правы славянскіх народаў.

Відавочна, у сувязі з курсам на стварэнне "садружнасці славянскіх народаў" капітуляцыя нацыянал-сацыялістычнай Нямеччыны ў 1945 г. афіцыйна прэзентавалася Крамлём як перамога ў тысячагадовай барацьбе славян з немцамі. "Вековая борьба славянских народов за своё существование и свою неза-

[135] Досталь М. Как феникс из пепла... С. 221–222.

[136] Пар.: Урбан П. К. Смена тенденций в советской историографии. Мюнхен, 1959. С. 10–11; Шумскі Я. Гісторыя Беларусі ў люстэрку рассакрэчаных дакументаў.... С. 109–110, 118.

[137] Пар.: Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 21.

висимость окончилась победой над немецкими захватчиками и немецкой тиранией", – сказаў І. Сталін 9 траўня ў звароце да савецкага народа[138]. У падобным сэнсе выказваліся і партыйныя ідэолагі. "В течение тысячелетия германские захватчики пользовались разъединением славянских народов, чтобы бить их порознь, порабощать, истреблять. Теперь этому разъединению положен конец"[139], – так рэзюмавалася значэнне перамогі ў артыкуле галоўнага органа ЦК УКП(б), які ўсе беды шматвекавой гісторыі славян і варожасць паміж імі ставіў цяпер у віну "рэакцыйнай Германіі". Тым больш натуральнай была падобная трактоўка перамогі над Гітлерам у часопісе савецкага Славянскага камітэта "Славяне", які называў яе завяршэннем спрадвечнай барацьбы славянства супраць "ваяўнічага германізму"[140].

Устаноўка на актуалізацыю ідэі пра "брацкую садружнасць славянскіх народаў" уздымала сімвалічны капітал Грунвальдскай бітвы. Такой ключавой ролі ў барацьбе з нямецкімі захопнікамі, якая была прыпісана Лядоваму пабоішчу, Грунвальду па-ранейшаму не адводзілася, тым не менш цэнтральны часопіс партыі назваў перамогу 1410 г. "самым яркім прыкладам з далёкага мінулага, які пацвердзіў, наколькі эфектыўнай была салідарнасць славян" у барацьбе супраць нямецкай экспансіі. Хоць лёсаносную перамогу над Ордэнам атрымалі "аб'яднаныя сілы славян", але "вырашальная роля" ў разгроме ворага належыць рускім смаленскім палкам, – падкрэсліў партыйны ідэолаг. Цяпер савецкая прапаганда, арыентуючыся на словы Сталіна, у подзвігу смаленскіх палкоў пад Грунвальдам убачыла праяву "тых рысаў рускага народа, якія выставілі яго на перадавое месца сярод іншых славянскіх народаў"[141].

Адзін з узораў падобнай інтэрпрэтацыі Грунвальда як сімвала баявой славянскай салідарнасці пры вырашальнай ролі

[138] Сталин И. Обращение к народу // Большевик. 1945. № 9. С. 4.

[139] Кузнецов И. Победа славянских народов в вековой борьбе против немецких захватчиков // Большевик. 1945. № 10. С. 36.

[140] Паводле савецкага медыявіста Аляксандра Удальцова, гэтую тысячагадовую барацьбу славяне пачалі яшчэ "ў першых стагоддзях нашай эры", а завяршыла яе перамога "славянства на чале з вялікім рускім народам". Гл.: Удальцов А. Завершение вековой борьбы славянских народов с немецкими захватчиками // Славяне. 1945. № 5. С. 14–18.

[141] Кузнецов И. Победа славянских народов в вековой борьбе против немецких захватчиков. С. 27–28.

ўсходніх славян (пад якімі разумеўся рускі народ у шырокім сэнсе) належыць лідару савецкага славяназнаўства акадэміку У. Пічэту. Бітва ўпісвалася ім у кантэкст вываленчай барацьбы славянскіх народаў і ацэньвалася як падзея сусветна-гістарычнага значэння. Яна стала "вырашальны фактарам у гісторыі заходняга і ўсходняга славянства. Цяпер Польшчы і Літве не пагражала небяспека страты незалежнасці. Нямецкі рух на ўсход быў спынены славянамі на чале з рускімі, беларусамі, украінцамі і літоўцамі". Але, як указваў акадэмік, "без гераічнага подзвіга рускіх воінаў не было б перамогі над ворагам"[142]. Такі вобраз Грунвальда цалкам карэляваў з панславісцкай ідэяй аб'яднання ўсіх славян на чале з Расіяй. І яго адстойвалі на старонках тагачасных савецкіх выданняў. У крытычнай рэцэнзіі на польскую кнігу пра славянскае супрацоўніцтва, змешчанай у "Славянах", аўтара папракалі ў "недапушчальным скажэнні праўды" за тое, што ён недаацэньваў ролю смаленскіх палкоў у перамозе над Тэўтонскім ордэнам, а галоўнае – называў перамогу "польскай". Праўда заключалася ў тым, што ў 1410 г. "славянскія народы аб'яднанымі сіламі разграмілі нямецкіх псоўрыцараў"[143].

Аднак разгарнуць "новы славянскі рух" Маскве ўсё ж не ўдалося. Лідары славянскіх дзяржаў баяліся саветызацыі іх краін і пашырэння панрусізму, а Крэмль ставіў сабе акурат такую мэту – у абгортцы "славянскай ідэалогіі" пашыраць камунізм. Асабліва выразна гэтая супярэчнасць выявілася пасля Белградскага з'езда славян (1947)[144]. Адкрыццё сапраўдных намераў Сталіна, канфлікт з югаслаўскімі камуністамі на чале з Іосіпам Брозам Ціта і выключэнне Югаславіі з агульнаславянскага руху абумовілі згортванне палітыкі славянскай садружнасці ў канцы 1940-х гадоў[145]. Масква перастала падтрымліваць славянскую ідэю, паколькі тая больш не прыносіла палітычнай карысці. З іншага боку, у выкарыстанні славянскай ідэнтычнасці больш не было вялікай патрэбы, паколькі прысутнасць савецкіх войскаў у вызваленай ад нямецкага фашызму Еўропе дазваляла

[142] Пичета В. Роль русского народа в исторических судьбах славянских народов. Москва, 1946. С. 25–26.

[143] Ростов С. Так нужно ли писать о славянском сотрудничестве? // Славяне. 1947. № 7. С. 51.

[144] Fertacz S. Von Brüdern und Schwestern. Das altslawische Komitee in Moskau 1941–1947 // Osteuropa. Jg. 59 (2009). Hf. 12. S. 145–149.

[145] Досталь М. Как феникс из пепла… С. 60–61, 64–65.

стварыць блок дзяржаў "народнай дэмакратыі". У кожным разе, ідэя славянскай салідарнасці ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе хутка памерла натуральнай смерцю[146]. У савецкай ідэалогіі яна зноў саступіла месца пралетарскаму інтэрнацыяналізму.

Варта падкрэсліць, што, нягледзячы на змену прыярытэтаў, савецкая гістарыяграфія так і не пазбавілася схільнасці да падкрэслівання этнічнага, славянска-нямецкага характару барацьбы з Ордэнам і бітвы 1410 г. Найбольш выразна панславісцкі матыў заўважаўся ў публікацыях ваенных гісторыкаў. Напрыклад, генерал-маёр Я. Разін у сваёй гісторыі ваеннага мастацтва (1957) трактаваў усю Вялікую вайну 1409–1411 г. як "вайну славян з Тэўтонскім ордэнам"[147]. Тым не менш у новым палітычным кантэксце значэнне бітвы пад Грунвальдам як сімвала адзінства славян у барацьбе з захопнікамі губляла ранейшую актуальнасць. Звязаныя з гэтым перамены можна заўважыць на старонках як папулярнай, так і навучальнай літаратуры, дзе падзея стала займаць значна менш месца і асвятляцца ў больш спакойных інтанацыях. Так, універсітэцкі падручнік М. Ціхамірава адводзіў бітве толькі ролю падзеі, з якой пачаўся заняпад Ордэна[148]. Лапідарна і ў цэлым досыць узважана апісвалася як Вялікая вайна, так і сама бітва 1410 г. у акадэмічных "Очерках истории СССР"[149], якія задавалі ўзор афіцыйных інтэрпрэтацый адпаведнага перыяду. Даўшы асабліва высокую ацэнку ролі "смаленскіх рускіх палкоў" ("толькі дзякуючы іх стойкасці" стала магчымай перамога над "нямецкімі войскамі" – так зноў называлі шматэтнічную армію Тэўтонскага ордэна), аўтары ацэньвалі бітву як "найбуйнейшую вяху ў гісторыі барацьбы народаў Усходняй Еўропы за незалежнасць, супраць нямецкай феадальнай агрэсіі"[150].

[146] Fertacz S. Von Brüdern und Schwestern. S. 152; Fišera V. C. Kommunismus und slawische Idee // Osteuropa. Jg. 59 (2009). Hf. 12. S. 137; Досталь М. Идея славянской солидарности и несостоявшийся в Москве в 1948 г. Первый общеславянский съезд славистов // Славянский вопрос: Вехи истории. С. 182–203.

[147] Разин Е. А. История военного искусства. Т. 2. С.-Петербург, 2000. С. 483–489.

[148] Тихомиров М. И., Дмитриев С. С. История СССР. Т. 1. С древнейших времён до 1861 г. Москва, 1948. С. 83.

[149] Очерки истории СССР. Период феодализма. IX–XV вв. В 2 ч. Ч. 2. Под ред. Б. Д. Грекова. Москва, 1953. С. 541–543.

[150] Тамсама. С. 542.

Нягледзячы на стрыманасць у ацэнках Грунвальда, сам вобраз ворага, выпрацаваны антынямецкай прапагандай для Нямеччыны перад нападам Гітлера на СССР і асабліва ў гады вайны, пасля перамогі, застаўся ў цэлым нязменным. Уяўленне пра немцаў як агрэсіўны народ, што вякамі здзяйсняў “Дранг нах Остэн”, было неўзабаве ўключана ў падручнікі для вышэйшай школы[151] і замацавана ў агульным гістарычным каноне савецкага грамадства. Узоры такой шаблоннай інтэрпрэтацыі славяна-нямецкіх адносін пашыраліся не толькі ў саюзных рэспубліках, але і ў дзяржавах усяго сацыялістычнага блока.

## 6.6 Грунвальд на варце сацыялізму

*Все изменилось в германском Drang nach Osten. Все, кроме одного...: сохранилось непрекращающееся стремление эксплуататорских классов Германии к захватам и агрессии.*

Уладзімір Хвастоў[152]

Раздзьмуты за перыяд вайны лозунг пра сувязь усходняй экспансіі немцаў з іх нацыянальным характарам не толькі перашкаджаў больш рэалістычнаму ўспрыманню Нямеччыны ў савецкім гісторыяпісанні, але і спрыяў пашырэнню яе наскрозь варожага вобраза ў шырокіх патрыятычна настроеных колах савецкага грамадства[153]. Пасля перамогі над гітлераўскім Райхам тэзіс пра традыцыйную нямецкую агрэсіўнасць супраць Усходняй Еўропы мог бы ператварацца ў анахранізм, але для гэтага

[151] История средних веков. Т. 1 / под ред. Е. А. Косминского и С. Д. Сказкина. Москва, 1952. С. 6, 168, 417, 419 і далей; История южных и западных славян / ред. С. А. Никитин. Москва, 1957. С. 91, 99–100; История южных и западных славян / ред. колл.: И. М. Белявская и др. Москва, 1969. С. 81–86; История южных и западных славян: Курс лекций / отв. ред. И. Созин. Москва, 1979. С. 115–118.

[152] Хвостов В. М. Германская экспансия на Восток, ее история и идеологические корни // ННИ. 1961. № 3. С. 47.

[153] Пар.: Nolte H.-H. “Drang nach Osten”. S. 177–178.

важнай была дэманстрацыя факта, што ў новай сітуацыі ніякай агрэсіўнасці з боку нямецкай дзяржавы не сыходзіць. На справе, аднак, раскол Нямеччыны па лініі зон савецкай акупацыі і заходніх саюзнікаў і звязаны з ім пачатак халоднай вайны выклікалі ў 1947 г. новую палярызацыю Еўропы. Ідэалагічная прапаганда варожых бакоў выкарыстоўвала ў многім ранейшы інструментарый той жа дыхатамічнай оптыкі двух процілеглых светаў – агрэсіўных імперыялістаў і міралюбівага СССР, толькі ў вобразе зла цяпер замест нямецкіх „псоў-рыцараў“ увасабляўся “імперыялістычны Захад”[154].

Менавіта так у 1947 г. інтэрпрэтаваў новую сітуацыю член ЦК УКП(б) Андрэй Жданаў, сцвярджаючы, што пасля вайны ўтварыліся два процілеглыя лагеры: адзін “імперыялістычны і антыдэмакратычны”, які ўзначальвалі ЗША, а другі – “антыімперыялістычны і дэмакратычны” на чале з СССР. Савецкі Саюз як увасабленне надзей “усяго перадавога чалавецтва”, маўляў, не можа быць зацікаўлены ў вайне і імкнецца да стварэння “адзінай міралюбівай Нямеччыны”, тады як ЗША з Англіяй ідуць, маўляў, на яе раскол, – на “абарону фашысцкіх элементаў”[155]. Партыйная прапаганда паслядоўна праводзіла ідэю аб тым, што заходняя частка Нямеччыны аддзяляецца, каб “закансерваваць і падрыхтаваць людскія кадры нямецкай рэакцыі”, накіраваць яе “супраць міру і бяспекі савецкіх народаў”[156]. Палітыка ЗША па стрымліванні ўплываў СССР у Еўропе і праграма дапамогі Заходняй Нямеччыне (“дактрына Трумэна” і “план Маршала”) былі расцэнены Крамлём як амерыканская экспансія ў форме ваенна-эканамічнай актыўнасці і ідэалагічнай барацьбы[157]. Супраць “агрэсіўнага заходняга блока” быў утвораны лагер сацыялістычных дзяржаў – Польшча, Югаславія, Чэхаславакія, Венгрыя і Балгарыя, з якімі Савецкі Саюз заключыў дамовы. У 1949 г. абвяшчэннем ГДР і ФРГ завяршыўся раскол Нямеччыны. У адказ на “камуністычную пагрозу” заходнія дзяржавы ўтварылі Паўночнаатлантычны альянс (NATO), у які ў 1955 г.

[154] Пар.: Вашик К. Метаморфозы зла: немецко-русские образы врага в плакатной пропаганде 30–50-х годов // Образ врага / сост. Л. Гудков. Москва, 2005. С. 200, 225–226.

[155] Жданов А. О международном положении // Большевик. 1947. № 20. С. 14–17.

[156] Монин Д. О борьбе двух направлений в международной политике // Большевик. 1947. № 24. С. 62–63.

[157] Жданов А. О международном положении. С. 22–24.

уступіла і ФРГ. З апошнім у сваю чаргу было звязана афармленне ваеннага саюзу сацыялістычных дзяржаў на чале з СССР – Варшаўскага пакта. Ва ўмовах халоднай вайны і ўзрастання напругі паміж дзяржавамі Паўночнаатлантычнага альянсу і Варшаўскага дагавора, калі супрацьлеглыя блокі імкнуліся дасягнуць ваеннай перавагі, ФРГ фігуравала ў іпастасі заядлага агрэсара. Такое пазіцыянаванне Заходняй Нямеччыны аблягчалася і яе палітыкай непрызнання новых дзяржаўных межаў. Як вядома, першы федэральны канцлер Конрад Адэнаўэр кіраваўся мэтай уз'яднання Нямеччыны і не ўтойваў гэтага.

Савецкая гістарычная навука ва ўмовах абвастрэння міжнароднай канфрантацыі зноў павінна была служыць палітыцы, выкрываючы гэтым разам ужо "рэваншызм" Захаду[158]. У атмасферы халоднай вайны выкарыстанне стэрэатыпа агрэсіўнай Нямеччыны атрымала другое дыханне. Запатрабаванасць інструментарыя ваенных часоў засведчылі, у прыватнасці, публікацыі Барыса Поршнева, якія могуць разглядацца як праграмныя. Славуты "Дранг нах Остэн" гісторык назваў арганічным элементам жыцця "ўсёй германскай імперыі Гагенцолернаў", а Нямеччыну XV–XIX ст. – галоўным антаганістам Расіі ў еўрапейскай сістэме дзяржаў. Што да Грунвальдскай бітвы, то яна заставалася ў цяні галоўнай перамогі 1242 г. Пасля разгрому нямецкіх рыцараў на Чудскім возеры аўтар адводзіў ёй ролю толькі "звяна ў доўгім ланцугу" ўдараў, якія давялося наносіць па ацалелым Ордэне Расіі з іншымі народамі[159].

Для шматтамовай гісторыі Савецкага Саюза, запланаванай для Інстытута гісторыі АН СССР, узвышэння ролі Грунвальда ці яго новай сімвалізацыі таксама не прадугледжвалася. Адной з цэнтральных задач яе аўтараў было «показать вековую дружбу русского народа с другими народами нашей Родины и прогрессивную историческую роль русского народа в качестве "объеди-

[158] Градус палітызацыі савецкай гістарычнай навукі ў тыя гады можна ўявіць ужо па назвах артыкулаў у цэнтральным часопісе савецкіх гісторыкаў: Черняк Е. Американские католические мракобесы в роли историков // ВИ. 1950. № 3. С. 102–113; Алпатов М. Современная реакционная историография – орудие американских поджигателей войны // ВИ. 1950. № 9. С. 120–139.

[159] Поршнев Б. Ф. Ледовое побоище и всемирная история // Доклады и сообщения исторического факультета МГУ. Вып. V. Москва, 1947. С. 30, 43; ён жа. К вопросу о месте России в системе европейских государств в XV–XVIII в. // Ученые записки Академии обществ. наук. Вып. II. Москва, 1948. С. 5–33.

нителя национальностей"»[160]. Пад такім ракурсам асвятлення гісторыі СССР перамога пад Грунвальдам не набывала асаблівай значнасці. Бадай найбольш прынцыповым для савецкіх вучоных у той сітуацыі было захаванне асновы ранейшага вобраза бітвы, найперш геранчнай ролі рускіх палкоў. Калі галоўная роля польскіх узброеных сілаў больш не аспрэчвалася (відаць, дзеля ўмацавання сацыялістычнага блока), то спроба польскіх гісторыкаў правесці ў падручніках длугашаўскую версію апісання сечы, у якой гаворыцца пра ўцёкі харугваў Вітаўта ("ліцвінаў і русінаў"), выклікала прынцыповае пярэчанне і абвінавачванне іх у "велікадзяржаўным польскім шавінізме"[161].

Да больш актыўнага выкарыстання Грунвальда ў савецкай гістарычнай палітыцы і стварэння яго стандартызаванага вобраза спрычынілася дата – 550-я ўгодкі бітвы, якія ў Польшчы адзначаліся разам з 1000-годдзем польскай дзяржаўнасці, а таксама чарговае абвастрэнне напружанасці паміж сацыялістычным блокам і Захадам. Вышэй ужо гаварылася пра тое, што экспанаванне Грунвальда як сімвала адплаты за нібыта адвечны нямецкі націск на славянскія землі дазваляла ўраду ПНР прадстаўляць гістарычна справядлівым высяленне немцаў з іх былых усходніх тэрыторый. Гэтыя ідэі маніфесталіся пры падрыхтоўцы юбілею і ў дні бяспрыкладнага па маштабах святкавання перамогі 1410 г. у Польшчы з адкрыццём помніка на Грунвальдскім полі, пра што гаварылася ў папярэднім раздзеле. Новы палітычны сэнс Грунвальда цалкам адпавядаў мэтам умацавання толькі што створанага ваеннага блока Варшаўскага дагавора ў супрацьстаянні з Захадам. Грунвальд цяпер сімвалізаваў справядлівасць новых межаў: маўляў, славянскія народы вярнулі сабе землі, якія калісь забрала Нямеччына ў выніку палітыкі "націску на Усход". Тое, што ФРГ не прызнавала змены межаў, давала падставу бачыць у ёй аплот рэваншызму, які рыхтуе новы "Дранг нах Остэн". У тых умовах Грунвальду было наканавана выконваць важную ідэалагічную функцыю – нагадваць дзяржавам NATO, усім рэваншыстам Захаду пра сілу аб'яднаных вакол СССР народаў Усходняй Еўропы.

[160] Основные задачи в изучении истории СССР феодального периода // ВИ. 1949. № 11. С. 6.

[161] Маўляў, польскія аўтары, "яўна фальсіфікуючы гісторыю, не толькі змаўчалі пра гераічныя паводзіны рускіх палкоў… а пішуць пра іх бязладнае адступленне, чаго ў сапраўднасці не было". Гл.: Дайри Н. Ошибочные учебники // ВИ. 1949. № 4. С. 102.

Пад час знаходжання савецкай партыйна-ўрадавай дэлегацыі летам 1959 г. у Польшчы Мікіта Хрушчоў на мітынгу ў Шчэціне звярнуўся да тэмы Грунвальда – як першы і адзіны з генеральных сакратароў КПСС. Савецкі лідар сказаў, што "Грунвальд стаў сімвалам супольнай барацьбы нашых народаў" і ён вучыць, што шлях да перамогі ў адзінстве народаў. "Адзінству сацыялістычнага лагера не страшныя ніякія пагрозы", і пра гэта неабходна нагадваць рэваншыстам з Бона, якія не прызнаюць заходніх межаў Польшчы[162].

Пра 550-годдзе бітвы пад Грунвальдам афіцыйна гаварылася і ў Маскве – упершыню пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. У юбілейны дзень газета "Правда" змясціла артыкул старшыні Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР Юстаса Палецкіса[163], а потым апублікавала паведамленне з урачыстасці, звязанай з адкрыццём помніка Грунвальду на полі бітвы ў ПНР 17 ліпеня 1960 г.[164]. Згодна з названым паведамленнем, палітычны сэнс прамовы першага сакратара ЦК ПОРП Уладыслава Гамулкі, як і прадстаўніка савецкай дэлегацыі, зводзіўся да таго, што Грунвальд – жывы напамінак пра лёс захопнікаў агрэсіўнаму кіраўніцтву ФРГ, якое дэманструе рэваншызм і "сваю роднасць" з прускім "Дранг нах Остэн"; Грунвальд "стаў сімвалам сяброўства народаў, якое закрыла шлях захопнікам", і цяпер, маўляў, польска-нямецкая мяжа па Одэру і Нісе як мяжа сацыялізму будзе непарушнай[165].

Актуальная палітычная сітуацыя выразна артыкулявана і ў згаданым артыкуле Ю. Палецкіса. Звязаўшы дзейнасць Ордэна з нямецкай палітыкай "Дранг нах Остэн", аўтар сцвярджаў, што мэтай даўніх рыцараў было "заняволіць Літву і Польшчу, каб з усёй сілай абрынуцца на Русь", а кіраўніцтва ФРГ "спрабуе ўзнавіць традыцыі крыжаносцаў". Як пацверджанне гэтага ён абыграў вядомы акт сімвалічнага прыняцця канцлера Конрада Адэнаўэра ў ганаровыя рыцары Нямецкага ордэна. У апі-

[162] Правда. 1959. 18 июля. С. 2; Хрущев Н. С. Мир без оружия – мир без войн. Т. 1. Москва, 1960. С. 444–445.

[163] Палецкис Ю. Уроки Грюнвальда. К 550-летию исторической битвы // Правда. 1960. 15 июля. С. 5.

[164] Там, где были разгромлены крестоносцы. Торжества на Грюнвальдском поле // Правда. 1960. 18 июля. С. 4. Ад Савецкага Саюза ва ўрачыстасці брала ўдзел дэлегацыя Вярхоўнага Савета на чале з М. Органавым.

[165] Тамсама. Пар.: Граница по Одеру-Нейссе неприкосновенна // Правда. 1960. 8 июля. С. 5.

санні бітвы літоўскі дзяржаўны дзеяч зусім не згадаў пра Беларусь, затое адзначыў вырашальную ролю смаленскіх палкоў. Палітычны сэнс святкавання юбілею Ю. Палецкіс ясна выказаў сцвярджэннем пра непасрэдную сувязь перамогі 1410 г., якая "на пяць стагоддзяў затрымала прасоўванне германскіх імперыялістаў на ўсход", з перамогай над Гітлерам: юбілей "павінен нагадваць нахабным заходнегерманскім рэваншыстам не толькі пра разгром Тэўтонскага ордэна ў 1410 г., але і пра іншыя паражэнні нямецкіх агрэсараў, асабліва пра грандыёзны Грунвальд 1945 г.", савецкім жа народам, па яго словах, юбілей "нагадвае пра неабходнасць стаяць на варце інтарэсаў міру і сацыялізму"[166].

У юбілейны год гістарычнае значэнне перамогі ў асобным дакладзе ў Інстытуце славяназнаўства АН СССР раскрыў Уладзімір Каралюк, на той час ужо аўтарытэтны славіст і даследчык славяна-нямецкіх адносін. Аўтар спецыяльнага тэксту, апублікаванага пасля дапрацоўкі ў інстытуцкім перыёдыку[167], ужо выкарыстоўваў новыя публікацыі польскіх гісторыкаў-грунвальдазнаўцаў С. Кучыньскага і М. Біскупа, тым не менш большая частка яго тэзісаў укладвалася ў грунвальдскі міф, сканструяваны ў публікацыях ваенных і пасляваенных гадоў. Ствараючы шырокі гістарычны кантэкст бітвы, У. Каралюк сцвярджаў, што "нямецкая феадальная агрэсія, праславуты *Drang nach Osten*", быў не толькі смяротнай небяспекай для заходніх славян, але "з'яўляўся вялікай небяспекай і для часткі ўсходняга славянства" – земляў паўночна-заходняй Русі, Беларусі і нават Украіны, а потым Прусія – "нашчадак Ордэна" – таксама стала галоўным "ворагам славянскіх народаў"; што ў бітве праціўнікі Ордэна, Польшча і ВКЛ, "увасаблялі сабой... грамадскі прагрэс", тады як Ордэн быў "рэакцыйным перажыткам мінулай эпохі"[168]. Саму бітву аўтар ацаніў як важнейшую за перамогу Неўскага і лёсаносную для народаў Усходняй Еўропы: калі Лядовае пабоішча 1242 г. толькі "прыпыніла, але не скрушыла Ордэн", то Грунвальдская перамога яго спыніла[169]. У адпаведнасці з савецкай установкай на ўмацаванне салідарнасці народаў сацыялістычнага лагера У. Каралюк назваў бітву "сімвалам яднання сілаў

[166] Палецкис Ю. Уроки Грюнвальда.
[167] Королюк В. Д. Историческое значение Грюнвальдской битвы // КСИС. Вып. 32. Москва, 1961. С. 72–85.
[168] Тамсама, С. 72, 75, 82, 84.
[169] Тамсама. С. 74–75, 84.

розных (sic! – *Г. С.*) народаў у барацьбе супраць агульнага ворага – агрэсара", памяць пра якую, па словах вучонага, "свята зберагаецца ў нацыянальнай традыцыі славянскіх народаў". Сярод новых тэзісаў можна адзначыць таксама сцверджанне, што бітва спрыяла "культурнаму, эканамічнаму і палітычнаму пад'ёму народаў Усходняй Еўропы, іх нацыянальнаму прагрэсу", і, вядома ж, прывязку грунвальдскай тэмы да праблемы пасляваенных межаў: паміж нямецкім народам і народамі Польшчы, Чэхаславакіі і СССР не павінна быць спрэчак, межы паміж імі павінны стаць межамі міру і сяброўства, як "мяжа па Одэру – Нэйсе"[170], што гучала як літаральнае паўтарэнне аднаго з цэнтральных тэзісаў У. Гамулкі на Грунвальдскім полі.

Тыя ж ідэалагічныя акцэнты былі выразна расстаўлены і ў іншых навуковых публікацыях гісторыкаў, найперш у апублікаваных да юбілею супольных артыкулах генерал-маёра Г. Караева і У. Каралюка, а таксама У. Пашуты і М. Ючаса. У першым аўтары ўпісалі бітву ў агульны кантэкст гісторыі народаў Усходняй, Паўднёва-Усходняй і Цэнтральнай Еўропы, за якімі праглядаліся дзяржавы сацыялістычнага блока. Агульнай рысай гісторыі гэтых народаў у XIV–XV ст. Г. Караеў і У. Каралюк назвалі іншаземную агрэсію з розных бакоў: паўднёвым славянам пагражала Турцыя, "для ўсходніх славян – рускіх, украінцаў і беларусаў – самым небяспечным ворагам былі татара-мангольскія заваёўнікі", а нямецкі *Drang nach Osten* уяўляў смяротную пагрозу "для заходніх, а таксама часткі ўсходніх славян і літоўскага народа". Не шкадуючы эпітэтаў, яны пастараліся паказаць злачынную натуру Тэўтонскага ордэна, якая прадвызначала непазбежнасць бітвы і адплаты. "Па самой сваёй прыродзе Ордэн не мог быць нават адносна спакойным і міралюбівым. Створаная крыжаноснымі разбойнікамі дзяржава магла існаваць толькі пры ўмове… крывавай агрэсіі супраць суседзяў, пры ўмове пастаяннага іх рабавання"[171]. Значэнне перамогі для лёсаў Усходняй Еўропы яны бачылі ў тым, што бітва "спыніла агрэсію германскіх феадалаў супраць польскіх, літоўскіх і рускіх зямель" ды стала выдатным гістарычным прыкладам, сімвалам "яднання сілаў розных народаў" у барацьбе супраць агрэсара, "узорам брацкага саюзу народаў, якія змагаюцца за сваю незалежнасць"[172].

[170] Тамсама. С. 74, 84–85.

[171] Караев Г. Н., Королюк В. Д. К 550-летию Грюнвальдской битвы // ВИ. 1960. № 7. С. 94–95.

[172] Тамсама. С. 92, 100.

Дакладна ў такім сэнсе прэзентаваўся Грунвальд і ў асобнай брашуры Г. Караева, які назваў бітву “сімвалам баявой садружнасці славянскіх і балтыйскіх народаў” у барацьбе супраць агрэсіі тэўтонцаў і перасцярогай рэваншыстам[173].

Выключна змрочны вобраз Тэўтонскага ордэна ў артыкуле У. Пашуты і М. Ючаса нагадвае антынямецкую прапаганду канца 1930-х – 1940-х г. Пра пераемнасць іх публікацыі з атмасферай той эпохі сведчыць само выкарыстанне прац М. Грацыянскага, а таксама блізкая да ваеннай лексіка. Аўтары пастараліся адразу дэманізаваць рыцараў сярэднявечных ордэнаў: як праваднікі “захопніцкай палітыкі нямецкіх феадалаў”, яны заваявалі землі латышоў, эстонцаў і прусаў, у выніку чаго “прускі народ быў асуджаны на выміранне”; рыцары нападалі і знішчалі “Літву і падуладную ёй Беларусь”, толькі палкі Аляксандра Неўскага ў 1242 г. закрылі ім дарогу ўглыб Русі. Але Тэўтонскі ордэн “смактаў сокі з падпарадкаваных народаў”, “тармазіў эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё” народаў, “перашкаджаў іх этнічнай і нацыянальнай кансалідацыі”, наогул – быў “ворагам сапраўднага прагрэсу”. Таму разгром Ордэна пад Грунвальдам стаў “заканамерным вынікам” папярэдняга развіцця міжнародных адносін і “слаўнай вяхой у гісторыі барацьбы славянскіх народаў і народаў Прыбалтыкі за незалежнасць”[174]. Як галоўную заруку перамогі гісторыкі адзначалі “адзінства краін-саюзніц (не славянскіх народаў. – *Г. С.*) у барацьбе супраць агульнага ворага”, а ў завяршэнне гаварылі пра “павучальны гістарычны ўрок тым, хто збіраецца зноў пайсці ў рэваншысцкі паход бясслаўным шляхам крыжаносцаў”[175].

У канструкцыю стандартызаванага вобраза Грунвальда дадаваўся тэзіс пра Ордэн як перашкоду эканамічнаму развіццю і нацыянальнай кансалідацыі народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы, у сувязі з чым разгром Ордэна трактаваўся як важны этап барацьбы гэтых народаў супраць нямецкай экспансіі. Відаць, не без уплыву польскіх даследаванняў[176], у названай ба-

[173] Караев Г. Грюнвальдская битва 1410 г. Москва, 1960.

[174] Пашуто В., Ючас М. 550-летие Грюнвальдской битвы // ВИЖ. 1960. № 7. С. 78–88.

[175] Тамсама. С. 78, 85, 88.

[176] Савецкія гісторыкі ўжо шырока выкарыстоўвалі першае выданне кнігі “Wielka wojna z Zakonem Krzyżackim w latach 1409–1411”, з якой запазычаліся многія палажэнні С. М. Кучынькага.

рацьбе экспанавалася "роля народных масаў"[177]. Новым штрыхом можна лічыць выразнае падкрэсліванне ўдзелу беларускага народа ў вайне з Тэўтонскім ордэнам. Шырэй гэты тэзіс У. Пашута развіў у працы пра ўтварэнне ВКЛ, дзе пісаў, што беларусы нароўні з літоўцамі, "плячом да пляча", больш за стагоддзе змагаліся з нямецкімі захопнікамі на Нёмане[178].

Адзначаны акцэнт на баявую садружнасць народаў быў умацаваны і дапоўнены чарговымі ўстаноўкамі, адрасаванымі гісторыкам пасля XXII з'езда КПСС. Прынятая з'ездам у 1961 г. праграма партыі, якая прызнала факт існавання непрымірымых лагераў, заклікала да ўмацавання адзінства дзяржаў сацыялістычнага блока. У гэтай сувязі адной з галоўных задач у галіне ідэалогіі называлася развіццё "пралетарскага інтэрнацыяналізму і сацыялістычнага патрыятызму". Апошняе было падкрэслена акадэмікам Я. Жукавым як прынцыпова важнае для гісторыкаў: "З утварэннем сусветнай сістэмы сацыялізму патрыятызм грамадзян сацыялістычнага грамадства спалучае адданасць сваёй Радзіме з адданасцю ўсёй садружнасці сацыялістычных краін"[179].

Абвастрэнне напругі паміж варожымі блокамі не ў апошнюю чаргу было выклікана ўзвядзеннем Берлінскай сцяны (1961) і ўмацаваннем савецкага пратэктарату над ГДР. У тым, што ўрад ФРГ афіцыйна адхіліў межы, вызначаныя ў Патсдаме, і адмовіўся заключаць мірны дагавор, бачылі доказ яго рэваншысцкіх імкненняў[180]. Задачы барацьбы з ідэалогіяй заходненямецкага "рэваншызму" і неабходнасць адказваць на актыўную дзейнасць "Остфоршунга" актуалізавалі ў СССР патрэбу спецыяльнага вывучэння нямецка-славянскіх адносін. У гэтай сувязі можна лічыць характэрным акцэнтаванне тэматыкі на Усесаюзнай нарадзе па пытаннях паляпшэння падрыхтоўкі кадраў па гістарычных навуках, якая адбылася ў Маскве ў снежні 1962 г. У сваім закліку да гісторыкаў пісаць на актуальныя тэмы ака-

[177] Пашуто В., Ючас М. 550-летие Грюнвальдской битвы. С. 85, 87.

[178] Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. Москва, 1959. С. 416–417. У гэтай працы ўжо выразна праглядаецца новая схема інтэрпрэтацыі гісторыі СССР з устаноўкай на акцэнтаванне "дружбы" і "брацтва па зброі" народаў шматнацыянальнай савецкай дзяржавы.

[179] Жуков Е. М. XXII съезд КПСС и задачи советских историков // ВИ. 1961. № 12. С. 10.

[180] Хвостов В. М. Германская экспансия на Восток, ее история и идеологические корни // ННИ. 1961. № 3. С. 52–53.

дэмік сакратар ЦК КПСС Барыс Панамароў зноў назваў Лядовае пабоішча і бітву пад Грунвальдам[181]. Партыйны дзеяч наракаў, што савецкія гісторыкі яшчэ не стварылі "зводнай працы аб шматвекавой барацьбе народаў СССР з агрэсарамі", працы, якая б паказвала, "як барацьба народных масаў непазбежна прыводзіла да краху любую агрэсію...". Праўда, для спецыяльнага вывучэння нямецкай агрэсіі існавала ўсяго некалькі арганізацыйных структур. Пры Інстытуце гісторыі АН СССР яшчэ ў 1956 г. аформілася група па даследаваннях гісторыі Нямеччыны на чале з А. С. Ерусалімскім[182], а ў 1961 г. у Інстытуце славяназнаўства быў заснаваны Сектар славяна-нямецкіх адносін, узначалены Уладзімірам Каралюком. Сярод сваіх галоўных заданняў само кіраўніцтва гэтай установы назвала, у прыватнасці, выяўленне "элементаў пераемнасці і адрозненняў у шматвекавой нямецкай агрэсіі на ўсход" і паказ "антыславянскай ідэалогіі" нямецкіх "даследаванняў Усходу" (*Ostforschung*) як "палітычнага інструмента агрэсіі і рэваншызму"[183]. Вынікі працы гэтага сектара павінны былі рэалізавацца ў калектыўных тамах па гісторыі нямецкага *Drang nach Osten*.

Так савецкая навука ўпершыню прыступала да сур'ёзнага вывучэння феномена, які даўно стаў прытчай у языцах. Канцэптуальная характарыстыка нямецкага "націску на Усход" была дадзена У. Каралюком у прадмовах да рускамоўнага выдання тома даследаванняў польскіх калег[184] і да першай калек-

[181] Актуальнасць тэмы вызначаецца "задачами, которые стоят перед нашей партией и мировым революционным движением", – тлумачыў дакладчык. "Столетия прошли со времен таких событий, как Ледовое побоище или Грюнвальдская битва. Но их уроки и сейчас зовут народы к бдительности перед лицом возрождения в Западной Германии агрессивных сил, помогают понять агрессивную сущность германского милитаризма". Гл.: Пономарев Б. Задачи исторической науки и подготовка научно-педагогических кадров в области истории // ВИ. 1963. № 1. С. 22.

[182] Чернов А. Б. Группа по изучению истории Германии при Институте истории Академии наук СССР // Славяно-германские исследования / отв. ред. В. Д. Королюк. Москва, 1963. С. 437–441.

[183] Королюк В. Д., Турок В. М. Об изучении славяно-германских отношений в Институте славяноведения АН СССР // Славяно-германские исследования. Отв. ред. В. Д. Королюк. Москва, 1963. С. 6–9. Пар.: Славяне и немцы. Средние века – раннее Новое время. Сб. тез. 16 конф. памяти В. Д. Королюка. Москва, 1997. С. 5.

[184] Королюк В. Д. Вступительная статья // Германская экспансия в Центральной и Восточной Европе: Сб. ст. по истории так называемого "Дранга нах Остен" / пер. с польского. Москва, 1965. С. 5–21.

тыўнай працы[185], падрыхтаванай супрацоўнікамі ўзначаленай ім установы. Для яго "*Drang nach Osten*" – гэта "несумненны гістарычны факт" шматвекавой экспансіі, якая пачалася ў раннім Сярэднявеччы, выклікала дзве сусветныя вайны і, нягледзячы на разгром гітлераўскай Нямеччыны, не завяршылася, а нясе "змрочны цень на дзень заўтрашні"[186]. Аднак як паслядоўны марксіст У. Каралюк, падобна польскім калегам з перакладзенага тома, не падзяляў спробаў паказваць усходнюю экспансію Нямеччыны як "уласцівасць, іманентна характэрную для нямецкай нацыі", а падкрэсліваў класавы характар і гістарычную абумоўленасць з'явы, выдзяляючы яе розныя этапы[187]. Асаблівасць нямецкага "*Drang nach Osten*" ён бачыў у тым, што праз Прусію гэтая сярэднявечная экспансія стала ідэалогіяй імперыялізму, "дала гістарычнае і ідэалагічнае абгрунтаванне ваяўнічаму пангерманізму"[188]. Апрача ваеннай агрэсіі, нямецкая экспансія развівалася і ў сацыяльна-эканамічнай і дэмаграфічнай формах. Але любыя поспехі немецкай экспансіі, незалежна ад формы, сцвярджаў У. Каралюк, паўсюль заўсёды толькі перашкаджалі "нармальнаму палітычнаму развіццю" і фармаванню народаў і нацый Цэнтральна-Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы[189].

Важным падаецца таксама тое, што У. Каралюк неаднаразова ўказваў на прыкладна аднолькавы ўзровень развіцця палабска-паморскіх славян і немцаў у Сярэднявеччы[190], таму, маўляў, адзінай прычынай нямецкай экспансіі была прага феадалаў да

[185] Королюк В. Д. "Дранг нах Остен" и историческое развитие народов стран Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы в период феодализма // "Дранг нах Остен" и историческое развитие стран Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы. Москва, 1967. С. 3–22.

[186] Королюк В. Д. Вступительная статья. С. 6, 15–17.

[187] Тамсама. С. 15–18; Королюк В. Д. "Drang nach Osten". С. 4. Такія якасці нямецкай экспансіі, як "пераходны характар" і класавая прырода адзначаны і ў наступным зборніку сектара. Гл.: "Дранг нах Остен" и народы Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы, 1871–1918 годы / отв. ред. В. К. Волков. Москва, 1977. С. 5–6.

[188] Королюк В. Д. "Drang nach Osten". С. 7.

[189] Тамсама. С. 12, 14–15, 17, 22.

[190] Тамсама. С. 8. Падобны погляд выказваў М. Грацыянскі (гл.: Грацианский Н. П. Борьба славян и народов Прибалтики с немецкой агрессией в средние века. С. 28–29). Гэта тэзіс, які нават у тыя часы выклікаў пытанні ў некаторых савецкіх гісторыкаў, так і застаўся непацверджаным.

новых земляў ды імкненне гарадоў атрымаць гандлёвыя шляхі. Аднак апошняе, як ужо заўважана ў літаратуры[191], не можа тлумачыць прычын пастуляванай экспансіі, бо падобных матывацый не былі пазбаўлены і славянскія паноўныя колы. У цэлым, хоць савецкі гісторык не апеляваў адкрыта да нацыянальнага характару немцаў, аднак з яго інтэрпрэтацый лагічна вынікала, што нямецкая экспансія залежала ад нацыянальных рысаў – міралюбства славян і агрэсіўнасці немцаў. Так у савецкай гістарыяграфіі зноў ажывалі тэзісы Гердэра, папулярныя сярод рамантыкаў XIX ст.

Сектар славяна-нямецкіх адносін, узначалены У. Каралюком, ад пачатку свайго існавання займаўся таксама барацьбой з "ідэалогіяй нямецкага рэваншызму"[192], як у СССР называлі "Ostforschung". Першы ж том прац сектара змясціў ухвальную рэцэнзію кнігі гісторыкаў з ГДР, якія выкрывалі небяспечную палітычную сутнасць заходненямецкага "Остфоршунга"[193]. Аўтары паказвалі, адзначаў рэцэнзент, што тыя шматлікія даследчыцкія цэнтры "остфоршараў" і кафедры славістыкі, якія з'явіліся ў ФРГ пасля вайны, – гэта "роднае дзіця даваеннага Остфоршунга", што яны маюць мэтай навукова абгрунтоўваць рэваншызм і на справе з'яўляюцца "ідэалагічнай зброяй нямецкага імперыялізму"[194]. Сам У. Каралюк у стылі лексікі халоднай вайны называў Заходнюю Нямеччыну "перадавым бастыёнам сусветнага імперыялізму", які рыхтуе новы "Дранг нах Остэн", а гісторыкаў з "Остфоршунга" – яго ідэалагічнай зброяй[195].

[191] Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 172–173.

[192] У пачатку 1960-х г. "барацьба з ідэалогіяй заходненямецкага рэваншызму" была адным з накірункаў працы Інстытута славяназнаўства. Гл.: Координационное совещание по актуальным проблемам славяноведения // ВИ. 1961. № 6. С. 111.

[193] Григорьянц Т. Ю. Остфоршунг и остфоршеры // Славяно-германские исследования. Отв. ред. В. Д. Королюк. Москва, 1963. С. 410–415. Рэц. на кнігу: Gentzen F., Wolfgramm E. Ostforscher – Ostforschung. Berlin, 1960.

[194] Як адно са сведчанняў "рэакцыйнасці" працы даследчыкаў Усходу ў рэцэнзіі прыведзена цытата з тэксту вядомага дзеяча "остфоршунгу" Герберта Шленгера: "...Задача навукі палягае ў тым, каб у момант прыняцця непазбежных палітычных рашэнняў, як, напрыклад, па ўсходнім пытанні, мелася армія экспертаў, якая магла б з глыбокім веданнем справы кансультаваць адказных асоб" (Гл.: Григорьянц Т. Ю. Остфоршунг и остфоршеры. С. 410).

[195] Королюк В. Д. Вступительная статья. С. 13–15.

За абвінавачваннямі заходненямецкага ўрада ў рэваншызме і агрэсіўных планах стаяла найперш дэманстрацыйнае непрызнанне Бонам новых палітычных межаў Еўропы. Вядома, прыклады афіцыйнага ўжывання азначэнняў тыпу "нямецкія ўсходнія вобласці", "нямецкі Усход" у адносінах да тэрыторыі ГДР і Калінінградскай вобласці, а таксама некаторыя скандальныя заявы заходненямецкіх палітыкаў[196] давалі савецкім гісторыкам падставы пісаць, што, маўляў, Бон "стварае ваенныя блокі імперыялістычных дзяржаў", імкнецца вярнуцца да межаў нямецкага райха 1937 г. і праводзіць тую ж палітыку, якую праводзіў Гітлер, – рыхтуе "новы Дранг нах Остэн", а дапамагаюць яму ў гэтай палітыцы, маўляў, "остфоршары"[197]. Аднак сваёй канфрантацыйнай рыторыкай і навешваннем палітычных ярлыкоў савецкія гісторыкі прыпадабняліся да партыйных ідэолагаў і скажалі рэальны стан спраў.

Як адзначалася вышэй, пасля вайны "Остфоршунг" не быў ні ранейшым, ні аднародным. У адрозненне ад СССР, на Захадзе даследчыкі не былі абавязаны трымацца адной тлумачальнай схемы. Пачынаючы з 1960-х г. нямецкія гісторыкі значна змянілі пазіцыі ў даследаванні нямецкай каланізацыі, пачаўшы прызнаваць і ролю славянскага насельніцтва ў гаспадарчым і культурным асваенні Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Як паказальны прыклад згадаем новыя падыходы В. Шлезінгера і яго крытыку палітычнай заангажаванасці калег па цэху, пра што гаварылася вышэй (гл. 5.3). Яго канцэпцыяй улічвалася, што ў працэсе ўсходняй каланізацыі, які адбываўся натуральна і таму павінен называцца не "экспансіяй", а "рухам", удзельнічалі не толькі немцы, але і прадстаўнікі іншых народаў Еўропы, у т. л. славянскіх.

Аднак савецкая гістарыяграфія прынцыпова не мяняла ацэнак "нямецкай экспансіі", не жадаючы прызнаваць у "руху на Усход" агульныя рысы падобных каланізацыйных з'яў. У прыватнасці, У. Каралюк называў "несостоятельными"

[196] Напрыклад, калі верыць савецкай публікацыі, Вальтэр Хальштайн з МЗС ФРГ заявіў, што мэтай Захаду павінна быць "завяршэнне расколу Нямеччыны і зліццё свабоднай Заходняй Еўропы з вызваленай ад бальшавізму Усходняй Еўропай – да самога Урала" (цыт. па: Восленский М. Реваншистская восточная политика ФРГ и "Остфоршунг". С. 200–201).

[197] Восленский М. С. Реваншистская восточная политика ФРГ… С. 197–199, 203, 206–207.

спробы заходняй гістарыяграфіі змякчаць вастрыню славяна-германскага супрацьстаяння ў Сярэднявеччы[198]. Толькі "Дранг нах Остэн"! У гэтым праяўлялася палітычна-ідэалагічная пазіцыя, а не навуковая[199]. Савецкім навукоўцам трэба было даказваць, што "остфоршары" служаць "рэваншызму" і, незалежна ад новых канцэпцый, "фальсіфікуюць" гісторыю нямецка-славянскія адносін. Таму і погляд В. Шлезінгера быў раскрытыкаваны славяназнаўцам Г. Санчуком за "неадпаведнасць гістарычным фактам". Паказальна, што, абараняючы сцвярджэнне аб заваёўніцкім характары нямецкай экспансіі і занявольванні славян немцамі ў Сярэднявеччы, ён спаслаўся на выданні ўжо вядомых аўтараў, якія распрацоўвалі гэты тэзіс у гады вайны, найперш М. Дзяржавіна і М. Грацыянскага[200].

Здаецца, усіх нямецкіх даследчыкаў, якія займаліся Усходняй Еўропай, агулам залічваць у шэрагі тых, хто разглядаў Усход як "аб'ект экспансіі", маглі толькі партыйныя прапагандысты, а не навукоўцы. Але менавіта такая характарыстыка была дадзена ім ва ўступе да тома калектыўных прац, прысвечаных крытыцы "Остфоршунга"[201]. Падкрэсліўшы, што планы нямецкай каланізацыі Усходу "яшчэ захоўваюць прыцягальную сілу для некаторых палітыкаў", яго рэдкалегія назвала мэтамі гэтага накірунку даследаванняў "пошук гістарычных і іншых аргументаў для апраўдання мінулай, а разам з тым і будучай нямецкай агрэсіі ў гэтай частцы Еўропы".

Акрамя славістаў крытыкай "остфоршараў" займалася і савецкая медыявістыка. Прадметна і ў цэлым справядліва была раскрытыкавана праца Вальтэра Куна[202] аб нямецкай усходняй каланізацыі (найперш яго тэзісы пра ніжэйшае развіццё славян і меншую заселенасць іх тэрыторый) – кніга сапраўды нізкага

[198] Пар.: Королюк В. Д. Вступительная статья. С. 16.

[199] На такую розніцу савецкіх і нямецкіх падыходаў звярнуў увагу В. Саўчук. Гл.: Савчук В. Историографический спор как диалог культур: проблема средневековой немецкой восточной колонизации // Межкультурный диалог в историческом контексте / отв. ред. Л. П. Репина. Москва, 2003. С. 181–184.

[200] Санчук Г. К вопросу об изучении идеологии немецкого "Дранг нах Остен" в раннефеодальный период // "Дранг нах Остен" и историческое развитие… С. 64–66.

[201] Гл.: Критика западногерманского "остфоршунга". Москва, 1966. С. 3.

[202] Штекли А. Э. Рэц. на: Kuhn W. Geschichte der deutschen Ostsiedlung in der Neuzeit. Bd. 1. Köln, 1955 // СВ. В. 15. 1959. С. 136–141.

ўзроўню. Праўда, галоўная выснова рэцэнзента, што кніга не мае ніякай навуковай вартасці з-за яе “рэакцыйнай палітычнай тэндэнцыйнасці”[203], у аднолькавай ступені магла быць пераадрасавана і аналагічным савецкім выданням тых гадоў[204], якія па ступені палітызаванасці значна пераўзыходзілі публікацыі заходніх калег. Напрыклад, будучы вялікі аўтарытэт савецкай гістарыяграфіі Уладзімір Пашута не толькі пісаў пра “генетычную сувязь” паміж сярэднявечнымі нямецкімі хранiстамі, што праслаўлялі “рыцарскі разбой”, і пасляваеннымі нямецкімі гісторыкамі-“остфоршарамі”, але і адкрыта вінаваціў апошніх у падтрымцы рэваншызму Бона і падрыхтоўцы новай вайны[205]. Пазней вынікам працы гісторыка над “Остфоршунгам” стала кніга крытычнага разбору публікацый заходніх аўтараў[206], праўда, сам іх падбор (а гэта працы кансерватыўных гісторыкаў, апублікаваныя пераважна ў эпоху халоднай вайны) сведчыць, што У. Пашута быў зацікаўлены не столькі далейшай навуковай распрацоўкай праблемы, колькі пошукам аб'ектаў лёгкай крытыкі[207].

Больш прадметна тэму нямецкай экспансіі У. Пашута закранаў у сваіх публікацыях па гісторыі Кіеўскай Русі і ВКЛ. У прыватнасці, у даследаванні пра месца Кіеўскай Русі ў Еўропе ён акцэнтаваў даўнасць гандлёвых сувязяў Русі і Нямеччыны, але падзеі X–XIII ст. інтэрпрэтаваў пры гэтым праз прызму славяна-нямецкага супрацьстаяння, у якім Русь аберагала славянскія землі ад іх захопу немцамі. Спыніўшыся на канфліктах з-за гандлёвых цэнтраў Прыбалтыкі, аўтар расцаніў перамогі Аляксандра Неўскага ў 1240 і 1242 г. ажно як “паваротныя пункты еўрапейскай гісторыі”[208]. Падобнай інтэрпрэтацыяй на-

[203] Тамсама. С. 141.

[204] Рэдкім для таго часу прыкладам умеранай палітызацыі можна лічыць грунтоўнае даследаванне Аркадзія Ерусалімскага “Германский империализм: история и современность” (Москва, 1964), у якім ідэалогія нямецкага імерыялізму выводзіцца з XIX ст. і не пастулюецца ніякай пераемнасці з сярэднявечнай ордэнскай дзяржавай.

[205] Пашуто В. Т. Истоки немецкой неофашистской концепции истории России // ВИ. 1962. №10. С. 61–64, 67.

[206] Пашуто В. Т. Реваншисты – псевдоисторики России. Москва, 1971.

[207] Гэта трапна адзначыў нямецкі даследчык. Гл.: Nolte H.-H. “Drang nach Osten”. S. 181.

[208] Пашуто В. Т. Место Древней Руси в истории Европы // Феодальная Россия во всемирно-историческом процессе: Сб. ст., посвящ. Л. В. Черепнину. Москва, 1972. С. 200.

званых бітваў гісторык відавочна імкнуўся ўзвышаць міжнароднае значэнне Русі.

Да Грунвальда У. Пашута звярнуўся толькі ў працы, адмыслова прысвечанай барацьбе Русі з рыцарскімі ордэнамі[209]. Згодна з ужо традыцыйным для савецкай гістарыяграфіі рэпертуарам, гісторык аддаў перамогам Аляксандра Неўскага і падобным падзеям XIII ст. намнога больш увагі, чым бітве пад Грунвальдам. Што да апошняй, апісанай фактычна побегам, то пад яго пяром перамогі ў 1410 г. дасягнулі "ўзброеныя сілы Польшчы і ВКЛ сумесна з рускімі, украінскімі і беларускімі палкамі і саюзнымі чэшскімі дружынамі" (пералік па ўсталяваным ранжыры ўсходнеславянскага старшынства), якія мелі "перавагу ў маральным фактары". Ацэньваючы значэнне бітвы, У. Пашута адзначыў, што яна "паклала пачатак поўнаму заняпаду Тэўтонскага ордэна" і звяршыла "адзін з этапаў" барацьбы супраць інтэрвентаў наогул – "мангольскіх, шведскіх, нямецкіх і іншых захопнікаў". Да гэтага гісторык дадаваў, магчыма, найважнейшы акцэнт: што галоўнай умовай перамогі было "адзінства дзяржаў-саюзніц у барацьбе супраць агульнага ворага"[210].

Звернемся нарэшце да выданняў, якія ў савецкую эпоху змяшчалі найбольш выверанныя і прынятыя партыйным кіраўніцтвам інтэрпрэтацыі падзей ды іх ацэнкі – да шматтамовых гісторый і энцыклапедый. У гэтых адносінах пэўным стандартам савецкага вобраза Грунвальдскай бітвы можна лічыць спосаб яе асвятлення ў 12-тамовай акадэмічнай "Истории СССР", выдаванай у 1960-я г. Зусім сціслы аповед пра бітву пераказвае галоўным чынам ход ваенных дзеянняў, а міжнароднае значэнне перамогі звязвае з аслабленнем Ордэна і яго ўлады ў Прыбалтыцы. Бітва ацэнена як "важны этап барацьбы народаў Русі, Польшчы, Літвы, Украіны, Беларусі і Чэхіі з нямецкай агрэсіяй. Толькі аб'яднанымі намаганнямі можна было дасягнуць перамогі над агульным ворагам"[211]. У тагачасных савецкіх энцыклапедыях

[209] Пашуто В. Т. Борьба народов Руси и Восточной Прибалтики с агрессией немецких, шведских и датских феодалов в XIII–XV вв. // ВИ. 1969. № 6. С.112–129; № 7. С.109–128. Даследчык сцвярджае, сярод іншага, што гэта перамога рускага народа на Куліковым полі ў 1380 г. "дала народам Прыбалтыкі, падуладным Нямецкаму ордэну, прыклад вызваленчай барацьбы". Гл.: ВИ. 1969. № 7. С. 126–127.

[210] Тамсама. С.127–128.

[211] История СССР с древнейших времён до наших дней: в 12 т. Т. 2: Борьба народов нашей страны за независимость в XIII–XVII вв. / отв. ред. М. Н. Тихомиров. Москва, 1966. С. 422–423.

галоўнае значэнне бітвы таксама вызначалася ў тым, што яна "спыніла (ці, як у некаторых версіях, "прыпыніла" – *Г. С.*) агрэсію тэўтонцаў на Усход", пры гэтым апошнія па-ранейшаму атаесамляліся з "немцамі", "нямецкімі войскамі"[212].

Калі на пачатку 70-х г. адбыўся паварот ад халоднай вайны да разрадкі міжнароднай напружанасці, можна было чакаць змены трактовак адносін з Нямеччынай. Сама КПСС на XXIV з'ездзе (1971) прыняла "Праграму міру", паспрыяўшы шырокаму прызнанню прынцыпаў мірнага суіснавання як нормы адносін паміж дзяржавамі з розных лагераў. Праўда, савецкія ідэолагі па-ранейшаму сцвярджалі, што "ва ўмовах суіснавання з дзяржавамі імперыялізму ўзрастала роля ідэалагічнай барацьбы"[213]. Тым не менш дзякуючы разрадцы стаў магчымы дыялог гісторыкаў Польшчы і Чэхаславакіі з іх заходненямецкімі калегамі, што мела далёкасяжныя вынікі. Савецкая ж гістарыяграфія не выкарыстала гэтай магчымасці. Знамянальна, што інтэрпрэтацыйнаму канону 1960-х г. у цэлым засталося сугучным і апісанне бітвы ў спецыяльным артыкуле расійскага гісторыка Барыса Флоры, выдадзеным ужо напрадвесні перабудовы[214], – калі чарговыя ўгодкі Грунвальда супалі з 40-годдзем узяцця Берліна. Некаторымі тэзісамі яно нагадвае добра знаёмы вобраз ворага, створаны яшчэ ў канцы 1930-х г.: аўтар не толькі назваў Ордэн фактарам "пастаяннай агрэсіі", але дадаў пра характэрную для яго "вайну на знішчэнне" і планы захопу не толькі літоўскіх, але таксама беларускіх і ўкраінскіх земляў. На полі пад Грунвальдам армія саюзнікаў пераўзыходзіла нямецкіх рыцараў маральным духам, бо прагла "даць адпор агрэсару". Дзякуючы перамозе "пагроза агрэсіі з боку нямецкіх феадалаў" была "надоўга зліквідавана". Бітва стала "сведчаннем таго, што, калі народы аб'ядноўваюцца, каб агульнымі сіламі даць адпор агрэсару, адстаяць сваю свабоду і незалежнасць, то яны дасягаюць перамогі"[215].

Такім чынам, завершаная савецкая канцэпцыя гісторыі СССР адводзіла Грунвальдскай бітве ролю сімвала гістарыч-

[212] Пар.: Малиновский А. А. Грюнвальдская битва 1410 г. // СИЭ. Т. 4. Москва, 1963. Стлб. 860–862; Киселев В. Н. Грюнвальдская битва 1410 г. // СВЭ. Т. 3. Москва, 1977. С. 66–67.

[213] Кашлев Ю. Б., Максудов Л. Мирное сосуществование и идеологическая борьба. Москва, 1973. С. 8 і наст.

[214] Флоря Б. Н. Грюнвальдская битва // ВИ. 1985. № 7. С. 105–112.

[215] Тамсама. С. 105, 109, 112.

нага яднання ўсходнеславянскіх народаў у барацьбе супраць знешніх захопнікаў. Што да адведзенага ёй месца, то, калі параўноўваць з Лядовым пабоішчам ці бітвай на Куліковым полі, у агульным гістарычным наратыве Грунвальд у пасляваенныя дзесяцігоддзі заставаўся падзеяй далёка не знакавай. Невыпадкова і адзначаны ў 1960 г. юбілей перамогі не знайшоў працягу: у наступныя юбілейныя гады (1965, 1970 і г. д.) пра бітву не пісалі і ніяк яе не адзначалі. Тагачасныя падручнікі па гісторыі СССР для вышэйшай школы адводзілі бітве зусім нязначнае месца і сціпла яе ацэньвалі[216]. Здаралася ж і так, што Грунвальд наогул заставаўся па-за ўвагай, як у падручніку, падрыхтаваным у 1970-я г. калектывам маскоўскіх гісторыкаў на чале з Б. Рыбаковым[217]. Для савецкага гістарычнага канона, сфакусаванага на гісторыі Расіі, бітва пад Грунвальдам і не магла быць падзеяй першаступеннай значнасці.

Сваёй антынямецкай скіраванасцю савецкі вобраз Грунвальдскай бітвы, нягледзячы на ўключанасць новых сэнсаў, семантычна нагадваў даўнейшыя інтэрпрэтацыі эпохі Сталіна. Невыпадкова Г.-Г. Нольтэ, параўнаўшы распрацаваны ў час вайны кананічны вобраз Нямеччыны і савецкія падручнікі пачатку 1970-х г., выявіў паміж імі сутнаснае падабенства. Нагадаем, што за тэзісам пра агрэсіўнасць немцаў як нацыі і ў часы вайны стаялі нямногія аўтары (З. Нееллы, В. Данілеўскі, У. Перцаў, у некаторай ступені – У. Пічэта), а большасць пісала пра агрэсіўную палітыку паноўных колаў Нямеччыны. У пасляваенныя дзесяцігоддзі, хоць агрэсіўнасць як якасць не пераносілася на ўсю нямецкую нацыю, а прыпісвалася яе панавальным класам, нават у падручніках дэманстраваліся тыя ж прыклады перамогі рускага народа над немцамі, а таксама тыя ж схемы інтэрпрэтацыі бітваў на Чудскім возеры і пад Грунвальдам, што пашыраліся ў гады II сусветнай вайны[218]. Паказальна, што перанятымі аказаліся "славянізацыя" пераможцаў

[216] История СССР. Учебник для педагогических институтов / под ред. П. И. Кабанова и В. В. Мавродина. Изд. 2. Ч. 1. Москва, 1966. С. 170: "Перамога пры Грунвальдзе – важная падзея ў гісторыі барацьбы славянскіх народаў за незалежнасць. Сілы нямецкіх феадалаў-захопнікаў былі значна падарваны".

[217] История СССР с древнейших времен до конца XVIII в. Учебник / гл. ред. Б. А. Рыбаков. Москва, 1975. Адносна Грунвальдскай бітвы нічога не змянілася і ў наступным выданні гэтага падручніка (1983).

[218] Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 191–194.

цаў ды акцэнтаванне маральнай перавагі славян над нямецкім ворагам. Вобраз агрэсіўнай Нямеччыны, укаранёны ў савецкай гістарыяграфіі, засланяў усю складанасць і неадназначнасць гістарычных адносін паміж народамі і дзяржавамі. Затое ў межах СССР стэрэатып ФРГ як агрэсіўнага ворага дапамагаў кансалідаваць савецкае грамадства і аблягчаў кіроўным савецкім элітам маніпуляцыі грамадскай свядомасцю. У яго афіцыйнай падтрымцы пасля вайны былі зацікаўлены, відаць, і ўплывовыя ваенныя колы савецкай супердзяржавы.

Як ужо не раз адзначалася ў спецыяльных даследаваннях апошніх дзесяцігоддзяў, савецкая гістарыяграфія сталінскай эпохі выконвала ідэалагічныя задачы: гісторыкам адводзілася роля збіральнікаў гістарычных фактаў для ілюстравання афіцыйных тэзісаў. Але і пасля Сталіна сутнасная функцыя гістарыяграфіі ў СССР не змянілася. Па трапным азначэнні Ю. Афанасьева, савецкая гістарычная навука была "гарманічна ўпісанай у сістэму таталітарнай дзяржавы і прыстасаванай да абслугоўвання яе ідэйна-палітычных патрэбаў"[219].

Гісторыя як пазнанне і асвета магла спрыяць паразуменню паміж дэманізаванай пасля вайны Нямеччынай і Усходняй Еўропай, вяртаючы іх адносіны на грунт адэкватных ведаў пра суседа[220]. Гэта ўрэшце атрымалася ў немцаў і палякаў. Гісторыя ж як апраўданне палітыкі і рацыі сваёй дзяржавы, чым займалася гістарыяграфія СССР, пазбаўляла савецкае грамадства такіх шансаў.

[219] Афанасьев Ю. Феномен советской историографии // Советская историография: Сборник / РГГУ; [Под общ. ред. Ю. Н. Афанасьева]. Москва, 1996. С. 37.

[220] Пар.: Nolte H.-H. "Drang nach Osten". S. 39.

Раздзел 7

# Грунвальд у беларускім гісторыяпісанні да 1939–41 г.

Пачаткі інстытуцыялізаванай гістарычнай навукі Беларусі звязваюцца з утварэннем сваёй дзяржавы – БССР, калі ў 1921–22 г. у Мінску былі заснаваны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і першы навукова-даследчы цэнтр, Інстытут Беларускай Культуры, на аснове якога ў 1929 г. паўстала Беларуская Акадэмія Навук з Інстытутам гісторыі ў яе складзе[1]. У арганізацыі гістарычных даследаванняў і сістэмы гістарычнай адукацыі ў першым беларускім універсітэце, стварэнне якога адбывалася з вялікімі цяжкасцямі, ад пачатку важны ўдзел належаў вучоным, накіраваным у Мінск з Масквы: Уладзіміру Пічэту – першаму рэктару БДУ, Уладзіміру Перцаву і Мікалаю Нікольскаму[2]. У сценах гэтых устаноў цягам 1920-х г. сфармавалася група гісторыкаў, што прытрымліваліся сістэмы блізкіх поглядаў на мінулае Беларусі, – група, якую можна назваць, хоць з доляй умоўнасці, першай нацыянальнай школай[3] беларускай гістарыяграфіі.

1 Советская историография Белоруссии: (материалы к обсуждению) / Е. М. Карпачев и др. Минск, 1957. С. 1–3; Михнюк В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.). Минск, 1985. С. 19–20 і наст. Падрабязней гл.: Шаўчук І. Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады ХХ с.). Брэст, 2007. С. 15–50, 59–80.

2 Пар.: Яноўскі А. Гартаючы архіўныя старонкі (М. М. Нікольскі і У. М. Перцаў на пачатку дзейнасці БДУ) // Вытокі гістарычнай навукі БДУ / пад рэд. А. А. Яноўскага. Мінск, 2005. С. 9–16.

3 Пад школай тут разумеем нефармальны калектыў навукоўцаў, аб'яднаных адной праграмай даследчыцкіх мэтаў і блізкасцю ідэалагічных пазіцый. Пар.: Лойтко Г. Научная школа – теоретические и практические аспекты // Школы в науке / под ред. С. Микулинского и др. Москва, 1977. С. 226–247.

## 7.1 Грунвальд і нацыянальная гістарыяграфія савецкай Беларусі

*Патрэба Польшчы і Літвы атрымаць назад вусці Нёмну і Віслы прывяла да Грунвальдскага бою.*

М. Доўнар-Запольскі[4]

Як адзначалася вышэй, пэўная традыцыя разгляду мінулага Беларусі як асобнай краіны і самабытнага народа з'явілася яшчэ да заснавання афіцыйнай гістарыяграфіі і яе інстытуцыялізацыі. У афіцыйную канцэпцыю беларускай гісторыі, выпрацаваную на пачатку дзяржаўнага існавання Савецкай Беларусі, арганічна ўвайшлі многія інтэрпрэтацыйныя ўстаноўкі "Кароткай гісторыі Беларусі" В. Ластоўскага і расстаўленыя ім ацэначныя акцэнты. Так што невыпадкова пазней крытыкі нацыянальнай канцэпцыі называлі менавіта яго працу "першай нацдэмаўскай гісторыяй"[5].

Сапраўды, першы афіцыйны дапаможнік "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі"[6], выдадзены ў 1919 г. Усеваладам Ігнатоўскім, кваліфікаваным гісторыкам, па агульных устаноўках мала адрозніваўся ад кніжачкі гісторыка-аматара В. Ластоўскага. Гэта заўважаецца і па ацэнках адносін з суседнімі народамі ды іх ролі ў мінулым Беларусі. Так, асвятляючы мінулае Полацкага княства, гісторык падкрэсліў яго "бесперарыўную барацьбу" з Кіевам, тады як усталяванне рыцарскага Ордэна ў вусці Дзвіны ён разумеў як фактар правядзення лацінскай місіі сярод прыбалтыйскіх плямёнаў і ніяк не звязваў з гісторыяй Полаччыны[7]. Затое далей, разглядаючы ВКЛ як дзяржаву "літоўска-беларускую", у якой "абедзве нацыі жылі ў згодзе"[8],

[4] Доўнар-Запольскі М. Соцыяльна-экономічная структура Літоўска-Беларускае дзяржавы ў XVI–XVIII ст. // Гістарычна-Археолёгічны зборнік. Т. 1. Менск, 1927. С. 35.

[5] Шчарбакоў В. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі. Менск, 1934. С. 58.

[6] Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд. Мінск, 1992.

[7] Тамсама. С. 61, 70–72.

[8] Тамсама. С. 73, 81.

У. Ігнатоўскі прысвяціў асобны параграф яго адносінам з нямецкімі ордэнамі[9]. Крыжаносцы тут паказаны "ўпартым ворагам" Літвы і Беларусі, аднак апісанне іх канфліктаў далёкае ад дыскурсу пра "адвечнага ворага": "літоўска-беларускае гаспадарства" не толькі цярпела ад паходаў рыцараў, але ладзіла такія ж паходы на землі немцаў, а часам і "само замешвала іх у свае дамовыя справы".

Дзякуючы асобнаму разгляду адносін ВКЛ з Нямецкім ордэнам у кнізе У. Ігнатоўскага ўпершыню больш-менш разгорнута апісана "бітва пад Танэнбергам ці Грунвальдам". "Літоўцы, беларусы і палякі" разам разграмілі "крыжацкае войска", пры гэтым пералом у бітве быў дасягнуты дзякуючы націску "беларускіх смаленскіх палкоў". Паводле У. Ігнатоўскага, з перамогі 1410 г. "пачынаецца відны пералом у беспарыўным змаганні Літоўска-Беларускага гаспадарства з нямецкімі ордэнамі", неўзабаве пасля якога (1466) Тэўтонскі ордэн зусім спыніў незалежнае існаванне[10]. Праўда, у кароткім аглядзе мінулага краіны, змешчаным у прэзентацыйным урадавым выданні пра Беларусь, гісторык ужо не згадваў гэтай "пераломнай" падзеі, затое ўказаў на значэнне Тэўтонскага ордэна для кансалідацыі літоўскіх і беларускіх земляў у адной дзяржаве: яна "мацней аб'ядноўваецца" для таго, каб супрацьстаяць "арганізаванаму *Drang nach Ost*"[11]. Гэта першы прыклад звароту да стэрэатыпнага азначэння нямецкай пагрозы ў беларускай гістарыяграфіі, яшчэ ідэалагічна не матываваны, а хутчэй выпадковы.

Большай грунтоўнасцю і навуковым узроўнем вызначаліся абагульняльныя працы па беларускай гісторыі Мітрафана Доўнара-Запольскага і Уладзіміра Пічэты – прызнаных аўтарытэтаў і "бацькоў" першай нацыянальнай школы беларускай гістарыяграфіі.

Канцэптуальныя погляды М. Доўнара-Запольскага на вузлавыя пытанні беларускай гісторыі спачатку былі выкладзены ім у разгледжанай вышэй серыі артыкулаў пад назвай "Беларускае мінулае" (гл. 4.1), а потым у публіцыстычнай брашуры "Асновы дзяржаўнасці Беларусі"[12], прызначанай для дыпла-

[9] Тамсама. С. 83–86.

[10] Тамсама. С. 86.

[11] Игнатовский В. Белоруссия: Территория, население, экономика и важнейшие моменты истории. Минск, 1924. С. 27. Цытаваная праца У. Ігнатоўскага яшчэ двойчы перавыдавалася.

[12] Доўнар-Запольскі М. Асновы дзяржаўнасьці Беларусі. Гродна, 1919.

матычных патрэбаў урада БНР. Пазней, на падставе чытаных у Мінску лекцый, даследчык стварыў абагульняльную працу па гісторыі Беларусі[13], якая мелася стаць падручнікам для студэнтаў[14]. У названай брашуры М. Доўнар-Запольскі згадвае немцаў адзіны раз, калі хоча падкрэсліць вышэйшы ўзровень развіцця беларускага насельніцтва ў перыяд утварэння ВКЛ: беларусы вызначаліся высокаразвітой дзяржаўнасцю, мелі сваё пісьменства і літаратуру, "вялі абшырную таргоўлю з немцамі", тады як літоўцы яшчэ нічога гэтага не мелі, піша гісторык[15]. Толькі ў "Гісторыі Беларусі" крыху можна прачытаць пра з'яўленне рыцарскіх ордэнаў, пра якія, праўда, гаворыцца ў кантэксце санкцыянаванай папам місіі пашырэння хрысціянства сярод прыбалтыйскіх народаў. Так, для Полацкага княства немцы ўяўлялі небяспеку, але – нароўні з літоўцамі і Смаленскам. З іншага боку, гісторык адзначыў пазітыўную ролю для Полацка гандлёвых сувязяў з нямецкай калоніяй на Дзвіне[16]. Пра самую бітву 1410 г. М. Доўнар-Запольскі згадаў таксама ў пераліку дасягненняў Вітаўта, палічыўшы дастатковым сказаць, што ў выніку разгрому Ордэна Вітаўтам і Ягайлам "пры Грунвальдзе, або Танэнбергу" той неўзабаве распаўся[17]. Нейкай гістарычнай наканаванасці гэтай падзеі як славяна-германскага сутыкнення ў яго асвятленні не знайсці. Больш за тое, ужо тады беларускі вучоны адзначаў эканамічную зацікаўленасць самой Польшчы і ВКЛ у вайне супраць Ордэна: "Патрэба Польшчы і Літвы атрымаць назад вусці Нёмну і Віслы прывяла да Грунвальдскага бою"[18], – за-

[13] Ён жа. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994.

[14] Як вядома, гэтым планам не выпала збыцца, бо ў пачатку 1926 г. бальшавіцкая цэнзура забараніла друк крамольнага рукапісу. У ЦК КП(б)Б пастанавілі: "Признать, что книгу Довнар-Запольского издавать нельзя как выражающую позицию белорусского национального демократизма и в корне искажающую историю Беларуси". Цыт. па: Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928): Отражение времени в архивных документах. Минск, 2001. С. 159. Пасля гэтай забароны падручнік М. Доўнара-Запольскага ўпершыню ўбачыў свет толькі ў суверэннай Беларусі ў 1994 г.

[15] Доўнар-Запольскі М. Асновы дзяржаўнасьці Беларусі. С. 4.

[16] Доўнар-Запольскі М. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994. С. 40, 47–48.

[17] Тамсама. С. 58.

[18] Доўнар-Запольскі М. Соцыяльна-экономічная структура Літоўска-Беларускае дзяржавы ў XVI–XVIII ст. С. 35.

ключыў ён, ацэньваючы значэнне балтыйскага гандлю для гаспадаркі ВКЛ.

Не больш напісаў тады пра Грунвальд у сваёй абагульняльнай працы па гісторыі Беларусі і Уладзімір Пічэта[19]. Паказальна, што само з'яўленне Ордэна мечаносцаў у вусці Дзвіны і тэўтонцаў у Прусіі ён падаў дастаткова разгорнута, а вось канфлікт Полацкага княства з немцамі толькі згадаў, указаўшы на яго эканамічныя падставы і на страту Полацкам сваіх калоній. Не развіваючы сюжэта барацьбы палачан з немцамі, У. Пічэта завяршыў яго нечаканым тэзісам пра тое, што саюз Полацка са Смаленскам "спыніў націск немцаў, аслабіў іх ваенную сілу і гэтым самым захаваў беларускія землі ад пагражаўшай германізацыі"[20]. Нечакана, бо тэма пагрозаў для Беларусі ці культурных уплываў лацінскага Захаду ў яго кнізе не кранаецца, да таго ж далей аўтар, як і М. Доўнар-Запольскі, адзначае пазітыўнае значэнне гандлю з нямецкай калоніяй на Дзвіне: "Гандаль з немцамі меў вялікае культурнае значэнне, бо нямецкія купцы з'яўляліся праваднікамі заходнееўрапейскае цывілізацыі"[21].

Пераходзячы да наступных эпох, У. Пічэта не забыўся сказаць пра ціск Ордэна як на ВКЛ, так і на Польшчу, а таксама пра барацьбу ВКЛ з немцамі, аднак яна паказана гісторыкам не ў вобразе "адвечнай вайны" са смяротным ворагам, а хутчэй як абмен паходамі, як барацьба з суседам, што вялася "з пераменным поспехам"[22]. Бітва пад Грунвальдам упамінаецца ім амаль як шараговая падзея ў аповедзе пра знешнюю палітыку Вітаўта і, што паказальна, пасля апісання яго ўсходніх паходаў. Вайна з Ордэнам пачалася з-за Жамойці, у якой мела патрэбу сама Літва. У "рашучай бойцы", як называе бітву 1410 г. аўтар, Ордэн быў "разбіты ўшчэнт" і мусіў вярнуць Жамойць ды заплаціць вялізную суму выкупу за палонных[23], – вось усё, што У. Пічэта палічыў тады істотным напісаць пра Грунвальд.

Яшчэ адзін характэрны прыклад трактавання адносін з Нямецкім ордэнам знаходзім у сціслым аглядзе айчыннай гісто-

[19] Пічэта У. Гісторыя Беларусі. Менск, 1924 (2-е выд. – 2005).
[20] Тамсама. С. 82–83 (цыт. па 2-м выданні).
[21] Тамсама. С. 86–87.
[22] Тамсама. С. 110–111, 119.
[23] Тамсама. С. 120–121. Пар.: Пичета В. История белорусского народа. Минск, 2003. С. 27.

рыі, напісаным Васілём Дружчыцам для ўрадавага зборніка "Беларусь"[24]. У гэтай кнізе (а ў падобных выданнях канцэптуальныя пазіцыі аўтараў мусілі быць асабліва выверанымя) В. Дружчыц не аддаваў Нямецкаму ордэну ніякай прыкметнай увагі. Згадаўшы, што рыцары імкнуліся захапіць некаторыя часткі ВКЛ і Польскага Каралеўства, ён не забыўся дадаць, як пры іх падтрымцы Вітаўт вярнуў сабе вялікакняскі пасад, пасля чаго заключыў, што Ордэн "пасля яго разгрому ў 1410 г. пры Грунвальдзе не быў страшным. Затое выявілася спрэчнасць інтарэсаў з Масквой"[25]. Больш пра Ордэн у нарысе нічога не знойдзем, тады як пра неабходнасць для "беларуска-літоўскага гаспадарства" весці барацьбу з Масквою на працягу XVI і XVII ст. гісторык напісаў выразна і не адзін раз.

Сярод нешматлікіх спецыяльных публікацый таго часу, у якіх фігураваў Нямецкі ордэн, вылучаецца даследаванне Міколы Шчакаціхіна па гісторыі мастацтва Беларусі. Гаворачы пра пачаткі фартыфікацыйнай архітэктуры Беларусі, вучоны звязваў з'яўленне каменных замкаў з уплывам ваенных канфрантацый з нямецкімі рыцарамі. Маўляў, Ордэн з XIII ст. беспераnынна наступаў на землі ВКЛ, а для ўтрымання новых тэрыторый узводзіў замкі. "У працэсе змагання і абароны ўзоры крыжацкай фартыфікацыйнай архітэктуры" і маглі быць запазычаны, пісаў М. Шчакаціхін, падкрэсліўшы пры гэтым нямецкі ўплыў на развіццё мастацтва ў Беларусі наогул[26]. Амаль ідэнтычны погляд выказаны і ў навукова-папулярным артыкуле Міколы Каспяровіча пра даўняе беларускае дойлідства. З'яўленне замкаў "нямецкага" тыпу ён таксама тлумачыў праз адносіны ВКЛ з нямецкімі рыцарамі. Апошнія пачалі "каланізацыю" ў вусці Дзвіны і "стараліся пашырыць яе за кошт беларуска-літоўскіх зямель", што і абумовіла войны, – тлумачыў этнограф. Але ВКЛ "мацнела і часта перамагала крыжакоў, а пасля Грунвальдскага разгрому апошніх для Беларусі наступіў больш спакойны і мірны час"[27].

[24] Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху / пад рэд. А. Сташэўскага, З. Жылуновіча і У. Ігнатоўскага. Мінск, 1924.

[25] Дружчыц В. Галоўныя моманты гісторыі беларускага народу // Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. С. 8, 14.

[26] Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Т. 1. Менск, 1928. С. 140–141.

[27] Каспяровіч М. Асноўныя моманты гісторыі беларускага дойлідства // Полымя. 1927. № 5. С. 185–186.

Словам, і ў даследаваннях гісторыі дойлідства аўтары былі вельмі далёкія ад думак пра якое-небудзь лёсаноснае для Беларусі значэнне тых бітваў з Ордэнам.

Поўным дысанансам сярод такіх стрыманых галасоў беларускіх гісторыкаў прагучала ацэнка Грунвальда беларускім мовазнаўцам Язэпам Лёсікам у літаратурна-навуковым весніку Інстытута Беларускай Культуры. Публікуючы пераклады апісанняў бітвы ў Хроніцы Быхаўца і некаторых польскіх храністаў, ён вызначыў важнасць падзеі ў знаёмых панславісцкіх выразах: маўляў, перамога над крыжакамі ў 1410 г. "прыпыніла націск немцаў на славянскія землі" і "гэтым змяніла гістарычную долю ўсяе Еўропы". А паколькі "вайну з немцамі" вялі аб'яднаныя "беларуска-польскія сілы", то бітва, заключаў ён, уяўляе для беларусаў "іх нацыянальна-гістарычную цікавасць"[28]. Мяркуючы па даступнай літаратуры, такая ацэнка Грунвальда яшчэ не мела адпаведнай глебы ў грамадскіх элітах тагачаснай Беларусі.

Разгледжаныя працы належаць беларускім гісторыкам з найбольш гучнымі на той час прозвішчамі, вучоным, якія лічацца галоўнымі аўтарамі першай нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі[29]. Імі была выпрацавана сістэма поглядаў і ацэнак, якую пазней у савецкім палітычным лексіконе назвалі "нацдэмаўскай". Адно з найважнейшых месцаў у гэтай канцэпцыі заняло ВКЛ, праз перспектыву якога Беларусь звязвалася з заходнімі традыцыямі, упісвалася ў кантэкст еўрапейскай гісторыі. Сутнасцю канцэпцыі стала празаходняя гістарычна-цывілізацыйная арыентацыя Беларусі, – тое, што пазней абвясцілі адной з найбольш шкодных установак бальшавіцкія крытыкі "нацдэмаўскай" гістарыяграфіі[30]. У гэтай сувязі не выклікае здзіўлення той факт, што беларускім гісторыкам першай нацыянальнай школы Грунвальд не ўяўляўся нечым большым, чым проста важная, нават калі і вырашальная (для заняпа-

[28] Лёсік Я. Бітва пад Грунвальдам у апісаньні кронікі Быхаўца, Длугоша, Бельскага і інш. // Адраджэньне. Вып. 1. Менск, 1922. С. 148–163.

[29] Пар.: Ліндэр Р. Гісторыкі і ўлада. С. 239–241. Грунтоўны канцэптуальны аналіз падручнікаў па гісторыі гл.: Маркава А. Школьная аснова выхавання нацыянальнай самасвядомасці ў БССР // БГА. Т. 17 (2010). С. 155–189, асабліва с. 168–186.

[30] "Навука" на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі / пад рэд. С. Вольфсона. Менск, 1931. С. 50, 62 і інш.

ду рыцарскай дзяржавы) падзея ў агульным кантэксце войнаў з Ордэнам. Акцэнтаванне барацьбы з апошнім дазваляла гераізаваць мінулае маладой дзяржавы, але яно не прэзентавалася як вайна на знішчэнне. У кожным разе на старонках прац па гісторыі Беларусі, напісаных у 1920-я г., небяспека з боку Нямецкага ордэна ніяк не дараўноўвалася да тых пагроз, што сыходзілі ад Масквы.

Гістарычная канцэпцыя названых беларускіх вучоных арыентавалася на класічны нацыянальны наратыў і мала адпавядала марксісцкаму ўзору гісторыяпісання, які ўкараняўся тады ў Маскве школай М. Пакроўскага. Калі ў канцы 1920-х г. эпоха талеравання апанентаў гісторыкамі-марксістамі завяршылася, для "гістарычнага фронту ў Беларусі" была пастаўлена задача арганізацыі адпору "буржуазна-нацыяналістычным уплывам". І мясцовая партыя бальшавікоў запатрабавала ўзмацніць пільнасць да "ўхілу ў бок мясцовага беларускага шавінізму"[31] ў Менску. З 1930 г., калі пачаліся масавыя рэпрэсіі супраць гуманітарнай інтэлігенцыі, пад агонь палітычнай крытыкі трапілі і найбольш вядомыя гісторыкі Беларусі, – тыя, чые погляды і ўтваралі першую нацыянальную канцэпцыю: В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, М. Доўнар-Запольскі і нават У. Пічэта. Пазбавіўшы пасадаў і званняў, гэтых вучоных шальмавалі ў партыйным друку і большасць асудзілі[32], а іх публікацыі абвясцілі "контррэвалюцыйнымі" і "шкодніцкімі". Пачынаючы з 1930 г. працы "нацдэмаўскай" гістарыяграфіі ў выніку адмысловых "адбораў" Галоўліта выдаляліся з фондаў бібліятэк, а пасля 1937 г. падлягалі канфіскацыі і знішчэнню[33]. Новая гістарыяграфія савецкай Беларусі будзе мець з імі зусім няшмат агульнага.

[31] Югов М. Положение и задачи исторического фронта в Белоруссии // ИМ. 1930. №17. С. 41–50; Пастанова бюро ЦК і прэзідыюму ЦКК КП(б)Б "Аб узмацненьні барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні" // Бальшавік Беларусі. 1931. № 12. С. 67–71.

[32] Карніенка В. Клясавая барацьба на гістарычным фронце. Менск, 1932. С. 9–20; Шчарбакоў В. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі. Менск, 1934. С. 57–78. Пар.: Возвращенные имена: Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий. Минск, 1992. С. 8; Ліндней Р. Беларускія гісторыкі пад Сталіным // БГА. Т. 5 (1998). С. 365–394.

[33] Падрабязней гл.: Лукашук А. 421° паводле Галоўліту // Спадчына. 1996. № 3. С. 71–91; Гужалоўскі А. А. Чырвоны аловак: нарысы па гісторыі цэнзуры ў БССР: у 2 кн. Кн. 1. 1919–1941. Мінск, 2012. С. 260–274.

## 7.2 Погляды гісторыкаў-марксістаў на барацьбу з Ордэнам

*Рускі народ... дапамог брацкаму беларускаму народу адбіць нашэсце рыцараў Тэўтонскага ордэна.*

Аляксей П'янкоў[34]

У разгар рэпрэсій супраць "нацдэмаў" зусім іншая канцэпцыя гісторыі Беларусі ўвасобілася ў новай абагульняльнай працы – нарысе Васіля Шчарбакова[35]. Кніга лічылася першай гісторыяй Беларусі, напісанай на марксісцкай аснове. Усё мінулае краіны аўтар імкнуўся трактаваць выключна з класавых пазіцый, у тым ліку ўтварэнне ВКЛ, у якім бачыў саюз феадалаў "супраць працоўных мас". Тым не менш у яго поглядах на ўзаемадачыненні Беларусі і нямецкіх рыцараў знайшлося шмат агульнага з пазіцыямі крытыкаваных ім "нацдэмаў". Марксіст В. Шчарбакоў, як і яго антыподы, быў далёкі ад малявання з Ордэна "смяротнага ворага" славянскіх народаў, хоць неаднаразова спыняўся на войнах з нямецкімі рыцарамі. Спачатку гісторык пісаў пра іх "наступленне на літоўскія плямёны і Полацкую зямлю" ў сюжэце пра гандаль з Рыгай і нямецкай Ганзай, вельмі важным для рэгіёна. Эліты Полацка і Віцебска ўзбагачаліся дзякуючы гэтаму гандлю да часу, пакуль не перашкодзіў Ордэн, з-за чаго і абвастрыліся адносіны з рыцарамі. Аднак зацікаўленасць абодвух бакоў у далейшым развіцці гандлю была настолькі вялікай, што варожым бакам удавалася залагоджваць канфлікты. "Вось чаму крывавыя схваткі нямецкіх рыцараў з феадаламі Полацкай зямлі, з Полацкам, Віцебскам і Смаленскам спыняліся заключэннем гандлёвых дагавораў рыцараў з гэтымі гарадамі"[36], – тлумачыў гісторык.

Разглядаючы ВКЛ, В. Шчарбакоў вярнуўся да заваёўніцкай палітыкі нямецкіх рыцарскіх ордэнаў як фактару знешняй пагрозы пры разглядзе ўтварэння названай дзяржавы. Аднак

[34] Нарысы па гісторыі Беларусі / АН БССР, Інстытут гісторыі. Ч. 1. Мінск, 1940. С. 51.

[35] Шчарбакоў В. Нарыс гісторыі Беларусі. Ч. 1. Менск, 1934. Гэта была першая частка падрыхтаванага аўтарам "Курса гісторыі Беларусі".

[36] Тамсама. С. 52–53, 73–74.

працэс гэты, у прыватнасці пашырэнне ўлады Міндоўга на беларускія землі, ён тлумачыў галоўным чынам сацыяльным фактарам, інтарэсамі паноўных вярхоў Літвы і Беларусі, тады як фактар знешняй пагрозы адступаў на другое месца, фігураваў сярод "іншых прычын". Хоць пагроза з боку крыжаносцаў таксама пэўным чынам абумовіла зацікаўленасць палачан у літоўскай уладзе, якой яны ў выніку "не супраціўляліся", аўтар не лічыў яе вялікай небяспекай. "Дастаткова было невялікага націску, як яны [полацкія князі і баяры] гатовы былі прызнаваць уладу моцных, знаходзячы ў іх абарону і ў сваёй барацьбе супраць непакорлівых працоўных мас, і супраць знешняга ворага". Да гэтага ж схілялі, сцвярджаў аўтар, інтарэсы развіцця гандлю з нямецкай калоніяй на Дзвіне і Ганзай, – "гандаль, які вёўся феадальнай вярхушкай і купецтвам Полацкай і Віцебскай зямель з рыжскімі купцамі і ганзейскімі гарадамі ў XIII і часткова XIV ст. Пануючыя вярхі гэтых зямель у мэтах барацьбы супроць лівонскіх рыцараў і забяспечання сабе бесперашкоднага гандлёвага шляху па Заходняй Дзвіне былі не супроць таго, каб аб'яднацца з літоўскімі князямі і стварыць адзіную магутную дзяржаву"[37].

Акцэнтам, які асабліва вылучае падыход В. Шчарбакова ў апісанні барацьбы з Ордэнам, стала імкненне паказваць класавую прыроду гэтага сутыкнення, падкрэсліваць "феадальны" і рабаўнічы характар войнаў з абодвух бакоў. Маўляў, і ВКЛ праводзіла паходы "дзеля захопу новых зямель і расшырэння феадальнай эксплуатацыі сялянства". Крыжаносцы пачалі захопліваць землі літоўцаў "і часткова насельніцтва Беларусі", але ў Літве і Беларусі ўжо вырасла сваё буйное землеўладанне, таму атрымалася сутыкненне інтарэсаў, якое абумовіла "цэлую паласу феадальных" войнаў. Выразнае дыстанцыяванне ад нацыянальна-патрыятычных пазіцый у апісанні гэтых войнаў нагадвае падыход М. Пакроўскага: "Ваенныя паходы рабілі не толькі рыцары на Літву і Беларусь, але і наадварот. Літоўска-беларускія войскі не раз уторгаліся ў межы тэрыторыі, занятай рыцарамі, і ў сваю чаргу спусташалі і грабілі яе". Да таго ж, "войнамі з крыжаносцамі не абмяжоўвалася крывавая дзейнасць Літоўска-Беларускай дзяржавы" – яна вяла такія ж войны з Польшчай, татарамі і Маскоўскай дзяржавай[38], чытаем у нарысе.

[37] Тамсама. С. 80–81.
[38] Тамсама. С. 58, 92, 93, 94.

Такім чынам, В. Шчарбакоў разумеў войны з Нямецкім ордэнам як адну з многіх ваенных канфрантацый, на якія была багатай знешняя палітыка ВКЛ, і паказваў яе без ценю драматызму. Гэтая канфрантацыя працягвалася, завяршыў гісторык, да 1410 г., "пакуль нарэшце супольнымі сіламі Літоўска-Беларускай дзяржавы з Польшчай рыцарам не было нанесена жорсткае паражэнне...", у выніку якога Ордэн вярнуў Жамойць, страціў былую сілу і хутка спыніў сваё існаванне[39].

Актуальнай канцэпцыі абагульняльных прац падпарадкоўвалася і выданне гістарычных крыніц, да якога ў сярэдзіне 1930-х г. прыступілі акадэмічныя гісторыкі. Першы ў гісторыі Беларусі том дакументаў і матэрыялаў па даўняй гісторыі краю[40], падрыхтаваны ў Інстытуце гісторыі, прызначаўся галоўным чынам для навучальных мэтаў. Як адзначана ў прадмове, сабраныя дакументы мусілі выкрываць "скажэнні беларускіх гісторыкаў-нацыяналістаў", аднак у прадэманстраваным стаўленні да Грунвальдскай бітвы складальнікі тома не моцна адышлі ад поглядаў некаторых "нацдэмаў". Нягледзячы на наяўнасць асобнага раздзела, прысвечанага войнам, аб'ёмны том не змясціў ніводнага дакумента, у якім апавядалася б пра бітву 1410 г. Адсутнічае сам дысурс пра пагрозу для Беларусі з боку Тэўтонскага ордэна. Матэрыялы зборніка прадставілі тэму рыцарскіх уварванняў як рэлевантную больш для Літвы, чым Беларусі. У раздзеле аб нараджэнні феадалізму змешчаны фрагменты з хронік Генрыха Латыша і Балтазара Русава пра заваяванне нямецкімі рыцарамі Лівоніі, а сярод крыніц пра ўтварэнне ВКЛ – урывак хронікі Германа Вартберга пра барацьбу літоўскіх феадалаў з нямецкімі рыцарамі і нават фрагмент хронікі Яна Длугаша пра іх жа канфрантацыю[41], але не пра "Вялікую вайну".

Як марксісцкі нарыс В. Шчарбакова, так і складзены з яго ўдзелам том гістарычных крыніц неўзабаве аказаліся "контррэвалюцыйнымі". Гэта стала вынікам новых патрабаванняў Сталіна да гісторыкаў і той ідэалагічнай пераарыентацыі ў савецкай гістарычнай навуцы, што адбывалася ў Маскве з сярэдзіны

[39] Тамсама. С. 93–94.

[40] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1 (IX–XVIII ст.) / склад. В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі і Дз. І. Даўгяла. Мінск, 1936.

[41] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1. С. 41–51, 84–91, 68–71.

1930-х г. (гл. 6.1–6.2). З пераходам ад пазіцый пралетарскага інтэрнацыяналізму ў асвятленні гісторыі да вялікадзяржаўнага патрыятызму больш немагчыма было называць захопамі інкарпарацыі новых тэрыторый расійскімі царамі, а Расію – "турмой народаў", на што не скупіўся В. Шчарбакоў. Тая версія марксісцкай гісторыі, якой В. Шчарбакоў навучыўся па працах М. Пакроўскага, аказалася "шкодніцкай", таму яго "Нарыс гісторыі Беларусі" быў зганьбаваны хутка пасля выхаду, а сам аўтар асуджаны[42].

У наступнай акадэмічнай гісторыі Беларусі[43] – апошняй у міжваеннай БССР – трактаванне Нямецкага ордэна ўжо значна змянілася. Ствараў яе калектыў Інстытута гісторыі АН БССР разам з гісторыкамі з БДУ пад агульнай рэдакцыяй У. Пічэты, які ўжо быў рэабілітаваны і зноў атрымаў званне акадэміка АН БССР. У прадмове кніга была названа "першым вопытам напісання гісторыі Беларусі на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі" (папярэдняга аўтара такога ж "вопыту" В. Шчарбакова, які прэтэндаваў на гэтае першынства, ужо расстралялі як контррэвалюцыянера). У тлумачэнні адносін з Нямецкім ордэнам новыя нарысы (адпаведныя раздзелы былі напісаны Аляксеем П'янковым, гісторыкам з БДУ, які некалькімі гадамі раней прыехаў з Расіі) сапраўды адрозніваліся ад ранейшых абагульняльных прац тым, што ў іх ужо выразна адчуваюцца штампы антынямецкай прапаганды – узор асвятлення барацьбы з немцамі, які задала ў 1937 г. газета "Правда". Барацьба з нямецкімі рыцарамі тут упершыню вынесена ў назву асобнага падраздзела[44], у якой апавядаецца, як Полацкая зямля, адбіваючыся ад літоўцаў, "аказалася перад тварам другога ворага – немцаў", на карысць якіх страціла Кукенойс і Герсіку. Яшчэ больш увагі гэтаму ворагу аддадзена пры разглядзе працэсу ўтварэння ВКЛ. Пасля аб'яднання з мечаносцамі Ордэн "павёў новае наступленне на рускія і літоўскія землі", але ў 1242 г. у выніку разгрому немцы "былі канчаткова адкінуты ад рускай граніцы", працытаваў аўтар К. Маркса. Да гэтага А. П'янкоў нават дадаў, што перамога Аляксандра Неўскага "затрымала на некаторы час націск немцаў і на Падзвінне"[45].

[42] Пар.: Ліндэр Р. Гісторыкі і ўлада. С. 182, 211–212.
[43] Нарысы па гісторыі Беларусі / АН БССР, Інстытут гісторыі. Ч. 1. Мінск, 1940.
[44] Тамсама. С. 40–41: "Барацьба з літоўцамі і Лівонскім ордэнам".
[45] Тамсама. С. 43.

Пра "націск немцаў" у раздзеле А. П'янкова гаворыцца настолькі часта, што ён успрымаецца як адзін з вызначальных знешніх фактараў тагачаснай гісторыі краю. У другой палове XIII ст. і Полацкая зямля "шукала абароны ад немцаў у татар і літоўцаў", і Віцебск "шукаў сабе падтрымку супроць немцаў" у смаленскіх князёў, і да т. п. Пры разглядзе падзей XIV ст. аўтар называе немцаў "агульным праціўнікам літоўцаў і насельніцтва Полацкай зямлі", таму, маўляў, палачане падтрымлівалі літоўскіх князёў, і тым удалося "спыніць заваявальніцкі націск нямецкіх рыцараў"[46]. Да Грунвальда аўтар падыходзіць у раздзеле пра "Крэўскую унію і становішча Беларусі пры Вітаўце", трактуючы паход у Прусію як "магчымасць аказаць адпор новым заваявальніцкім спробам з боку Тэўтонскага ордэна", дадзеную уніяй 1401 г. Атрымалася, што неаднаразова разгледжанай вайне з немцамі ў XIII ст., апісанай з рускіх патрыятычных пазіцый, адведзена намнога больш увагі і месца, чым грунвальдскаму эпізоду. Сціслае апісанне бітвы насычана прапагандысцкай рыторыкай пра "вялікі рускі народ" і "дружбу савецкіх народаў". Відаць, маючы на ўвазе смаленскія палкі, аўтар пісаў: "Усю цяжкасць бітвы пры Грунвальдзе вынеслі на сваіх плячах рускія <...> Рускі народ яшчэ не паказаў феадальным захватчыкам сваю несакрушальную магутнасць. Ён дапамог брацкаму беларускаму народу адбіць нашэсце рыцараў Тэўтонскага ордэна. Аднак рэзультат перамогі над немцамі скарысталі польска-літоўскія паны. Яны яшчэ больш узмацнілі націск на беларускія землі".

Антынямецкі дух раздзелаў А. П'янкова сведчыць, што "Нарысы па гісторыі Беларусі" ствараліся да падпісання паміж Масквой і Берлінам пакта Рыбентропа – Молатава, але пасля свайго выхаду ў 1940 г. маглі выклікаць увагу цэнзараў з Масквы. У кантэксце ж нашага даследавання варта адзначыць, што, нягледзячы на патэтыку славянскага патрыятызму ў прэзентацыі войнаў з нямецкімі рыцарамі, выраз "Дранг нах Остэн" у названым нарысе ўсё ж не выкарыстоўваўся. І значэнне перамогі пад Грунвальдам у А. П'янкова яшчэ сціплае: дзякуючы ёй аслабла магутнасць Ордэна ў Прыбалтыцы і ўзрастала міжнароднае значэнне ВКЛ[47].

Напярэдадні II сусветнай вайны тэма вайны з Нямецкім ордэнам знайшла сваё месца і ў праграме курса гісторыі Бе-

[46] Тамсама. С. 44, 46.
[47] Тамсама. С. 51.

ларусі для вышэйшай школы, што была распрацавана ў БДУ. Аднак нельга сказаць, каб яна разглядалася тут як нейкі асабліва важны этап айчыннага мінулага. Прычым у тлумачэнні тэмы аўтары праграмы (той жа А. П'янкоў з Д. Дудковым) аддавалі большую гістарычную вагу "нападам крыжаносцаў на Полацкае княства і літоўскія землі", чым Грунвальдскай бітве. Апошняя проста названа сярод падзей палітычнай гісторыі ВКЛ, – паміж бітвай на Ворскле і прыняццем Гарадзельскага прывілею[48].

Такім чынам, з разгледжанай літаратуры вынікае, што гісторыкі ў міжваеннай БССР яшчэ не прыпісвалі бітве 1410 г. ніякіх лёсаносных значэнняў. Зразумела, трэба ўлічваць тое, што пытанні ваеннай гісторыі ці знешняй палітыкі не былі ў тыя гады для беларускай гістарыяграфіі прыярытэтнымі. Яе галоўныя накірункі даследаванняў звязваліся з вывучэннем сацыяльна-эканамічных праблем, класавай барацьбы і культуры[49]. Аднак і ў тым, што ў абагульняльных нарысах па гісторыі Беларусі бітве пад Грунвальдам не прысвячалася адмысловай увагі, можна бачыць сведчанне, што сама тэма не мела актуальнасці як для нацыянальнай гістарыяграфічнай школы, так і для гісторыкаў-марксістаў 1930-х гадоў.

Пытанне пра тое, ці адбывалася замацаванне антынямецкага дыскурсу ў шырокай грамадскай думцы савецкай Беларусі, нельга высветліць без увагі да публіцыстыкі і мастацкай літаратуры на гістарычныя тэмы. Найбольш паказальным у гэтых адносінах можна лічыць штомесячны грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс "Полымя", які выдаваўся ў Менску з 1922 г., а з 1934 г. з'яўляўся органам Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі. На старонках перыёдыка друкавалася нямала артыкулаў па гісторыі, аднак тэма войнаў з Нямецкім ордэнам не тэматызавалася, а ў 1930-я г. у публіцыстыцы, як і ў афіцыйнай гістарыяграфіі, задамінавала асвятленне мінулага з сацыяльна-класавых пазіцый. Не дзіўна, што і ў літаратурных творах, публікаваных у часопісе, пераважала сацыяльная тэматыка (класавая барацьба, калгаснае будаўніцтва і да т. п.). Затое амаль да пачатку II сусветнай вайны часопіс

[48] Праграма курса гісторыі Беларусі для гістарычных факультэтаў педінстытутаў і ўніверсітэтаў. Мінск, 1940. С. 4–5.

[49] Падрабязней гл.: Михнюк В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.). Минск, 1985. С. 202–217.

змяшчаў пераклады з нямецкай літаратуры ці агляды літаратурнага працэсу ў Нямеччыне, як правіла, з высокай пазітыўнай ацэнкай[50].

Характэрна, што ні Янка Купала, ні Якуб Колас, ні іншыя беларускія творцы нават у сваіх творах пра І сусветную вайну не звярталіся да канструявання вобразаў замежнага ворага[51]. Нямала напісаўшы на гістарычныя тэмы, асабліва ў дарэвалюцыйны перыяд, Купала выкарыстоўваў галоўным чынам сюжэты айчыннага мінулага, не звязанага з ваеннымі канфліктамі (паэма "Бандароўна" створана па матывах вядомай у Беларусі народнай песні, "Магіла льва" – на аснове легенды пра ўзнікненне Магілёва, незавершаная паэма пра полацкую князёўну Рагнеду "Гарыслава" і інш.). Пераклад маладым Купалам двух кароткіх урыўкаў з паэмы "Конрад Валенрод"[52] тлумачыцца уплывам творчасці Міцкевіча, якога беларускі паэт шмат у чым браў за прыклад. І пры савецкай уладзе вялікі творца ў сваім стылі яшчэ выказваў уласнае бачанне нацыянальнай гісторыі – да палітычных рэпрэсій, пасля якіх творчасць паэта звялася да апявання поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва. Паказальна, што ў вершы 1928 г. "Замковая гара", у якім апяваецца князь Гедымін і згадваюцца яго бітвы[53], Купала не даў ніякіх падстаў для іх асацыявання з барацьбой супраць нямецкіх рыцараў.

Наогул, рэдкія для міжваеннага перыяду публікацыі грамадска-палітычнага зместу ў літаратуры савецкай Беларусі маглі выяўляць хутчэй антыпольскія матывы[54], чым антынямецкія. Сімвалічна, што ў сумнавядомым "Пісьме беларускага народу Вялікаму Сталіну", у той частцы, дзе аўтары вобразна апісваюць "што было" – усе мінулыя нягоды, якія давялося перажыць беларускаму народу да ўсталявання савецкай улады, гаворыцца пра "бітвы з панамі", пра вайну са шведамі і французамі Банапарта, але ні словам не згадана якая-небудзь небяспека з боку

[50] Пар.: Барычэўскі Э. Літаратурныя погляды й густ сучаснае Нямеччыны // Полымя. 1925. № 3. С. 110–120.

[51] Пар.: Луцкевіч А. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва / уклад. А. Сідарэвіч. Мінск, 2006. С. 149–152.

[52] Гл.: Купала Я. Поўны збор твораў. Т. 6. Мінск, 1999. С. 190–193.

[53] Купала Я. Замковая гара // Беларускі каляндар на 1928 г. Вільня, 1928. С. 34.

[54] Пар.: Лучанін М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы. Менск, 1926; Заходняя Беларусь пад крывавым бізуном польскіх акупантаў. Менск, 1931; Хведаровіч М. Баявыя песьні // Полымя. 1930. № 7. С. 63–75.

немцаў[55]. У акцэнтаванні апошняй для ўладаў БССР не існавала ніякай рэальнай патрэбы. Затое патрэба пісаць пра “барацьбу з польскімі панамі” ў канцы 1930-х гадоў яшчэ больш актуалізавалася – савецкаму кіраўніцтву было неабходна мець гістарычнае апраўданне вераснёўскага паходу Чырвонай Арміі супраць Польшчы. На запатрабаванне партыі працы патрэбнага зместу актыўна прадукаваў супрацоўнік Інстытута гісторы АН БССР Іосіф Лочмель[56]. Яго антыпольскія тэксты прапагандысцкім стылем і агрэсіўнай рыторыкай нагадвалі тое, што М. Грацыянскі пісаў пра немцаў.

Падагульняючы, можна адназначна сцвярджаць, што ніякага антынямецкага дыскурсу ў гістарыяграфіі і гістарычнай публіцыстыцы міжваеннай БССР не існавала. У адрозненне ад антыпольскага, які з вядомых прычын афіцыйна падтрымліваўся ўладай.

## 7.3 Памяць пра бітву ў гістарычнай думцы Заходняй Беларусі

Нацыянальнае культурна-асветнае жыццё беларускіх земляў, якія па ўмовах Рыжскага міру да 1939 г. уваходзілі ў склад польскай дзяржавы, канцэнтравалася ў Вільні. Трэба ўлічваць, што там не існавала прафесійнага цэху беларускіх гісторыкаў, а Беларускае Навуковае Таварыства, якое аб’яднала навукоўцаў і аматараў навук самага рознага профілю і ўзроўню, было грамадскай інстытуцыяй і засяроджвалася на асвеце. Абагульняльным нарысам гісторыі Беларусі, даступным у агульным карыстанні і навучанні, заставалася кніжачка В. Ластоўскага. Хоць сам аўтар з 1920 да 1927 г. з палітычных прычын жыў у Коўне, ён цесна працаваў з віленскім беларускім колам і карыстаўся там, як да пэўнай пары і ў БССР, аўтарытэтам абазнанага гісторыка. Сведчаннем таго, што В. Ластоўскі працягваў займацца распрацоўкай абагульняльнага курса гісторыі, стаў яго

[55] Пісьмо беларускага народу Вялікаму Сталіну // Полымя. 1936. № 7. С. 4–6.

[56] Напр., гл.: Лочмель И. Борьба белорусского народа против литовского и польского ига // ИЖ. 1938. № 7. С. 24–35; ён жа. Барацьба беларускага народа супроць інтэрвентаў (Да 20-й гадавіны вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў). Мінск, 1940.

рукапіс новай працы, створаны ў Коўне і толькі параўнальна нядаўна апублікаваны[57]. Паказальна, што ў ёй прадэманстравана прыкладна такое ж успрыманне Нямецкага ордэна, якое было характэрным для яго "Кароткай гісторыі Беларусі". Хоць бітве пад Грунвальдам тут прысвечаны асобны артыкульчык, апісана яна надзвычай сцісла, без шырокага кантэксту і гучных ацэнак. Аўтар абмежаваўся працяглым цытаваннем нейтральнага фрагмента беларуска-літоўскага летапісу і звесткамі Яна Длугаша, які "аддае дань пашаны смаленскім беларускім палкам", а завяршыў зноў лаканічна: "Перамога над крыжакамі была поўная. Патужнасць крыжацкая была зломлена"[58].

Значна больш увагі нямецкім рыцарам адведзена ў аповедзе В. Ластоўскага пра Полацкае княства і яго калоніі Кукенойс і Герсіке, якія перайшлі ў рукі мечаносцаў. Трэба адзначыць, аднак, што і тут канфлікты, апісаныя па хроніцы Генрыха Латыша, разгледжаны спакойна і без пафаснай драматызацыі падзей. Наогул, ствараецца ўражанне, што аўтар хацеў не столькі расказаць пра барацьбу з рыцарамі, колькі праз яе паказаць моц улады Полацка на Дзвіне[59]. Так што ў цэлым В. Ластоўскі заставаўся пры ранейшых поглядах на Ордэн.

У Вільні агульныя папулярызатарскія агляды айчыннай гісторыі належалі пяру знанага грамадска-палітычнага дзеяча, каталіцкага святара Адама Станкевіча. Ён быў адным з нямногіх лідараў беларускага руху, хто меў за плячыма вышэйшую адукацыю – скончыў Рыма-каталіцкую духоўную акадэмію ў Петраградзе (1918). Здаецца, ад ксяндза Адама Станкевіча, які з асаблівым піетэтам ставіўся да вялікага князя Вітаўта, можна было б чакаць большай увагі і да бітвы пад Грунвальдам. Аднак ён толькі сцісла згадаў падзею ў рэфераце "Вітаўт Вялікі і Беларусы"[60], прачытаным у 500-годдзе смерці вялікага князя, і затым у "Расказах з гісторыі Беларусі для школы і народу"[61]. Пры гэтым у абедзвюх публікацыях перамога над Ордэнам фі-

[57] Ластоўскі В. Нарысы з беларускай гісторыі / публ. А. Каўкі // Спадчына. 1996. № 4–6.

[58] Ластоўскі В. Нарысы з беларускай гісторыі / публ. А. Каўкі // Спадчына. 1996. № 6. С. 72–73.

[59] У прыватнасці, В. Ластоўскі пісаў, што "немцы... толькі пасля трыццацілетняга ўпорнага змагання, падтрымліванага ўсёй тагачаснай каталіцкай Еўропай, здолелі ўмацавацца ў гэтым краі...". Цыт. твор // Спадчына. 1996. № 4. С. 14.

[60] Тамсама. С. 99.

[61] Станкевіч А. З Богам да Беларусі / Збор твораў. Вільня, 2008. С. 67.

гуруе як адно з дасягненняў палітыкі Вітаўта, што праславіла вялікага князя і пасля якой яму больш "не былі страшныя" нямецкія рыцары. Праўдападобна, вельмі блізкі варыянт інтэрпрэтацыі галоўнай бітвы з рыцарамі прадугледжваўся вялікім нарысам гісторыі Беларусі, які А. Станкевіч пісаў у гады вайны, але не паспеў скончыць[62].

Сярод аўтараў, якія таксама мелі вышэйшую адукацыю, хоць і не па гістарычнай спецыяльнасці, з публікацыямі пра мінулае Беларусі выступалі Вінцэнт Грышкевіч і Мікола Шкялёнак. Першы добра зарэкамендаваў сябе як навуковец на З'ездзе польскіх гісторыкаў у Вільні (1935), дзе выступаў з рэфератам пра ролю беларускіх земляў у польска-літоўскіх уніях[63]. У абранай тэме дакладчык не мог абысці ўвагай і шляхі пераходу абшараў Беларусі пад уладу літоўскіх князёў. Адметна, што роля націску Нямецкага ордэна ў стварэнні ВКЛ, аб вызначальнасці якой будзе гаварыцца ў савецкай гістарыяграфіі, маладому даследчыку не падавалася важнай. Ён падкрэсліў зацікаўленасць беларускага насельніцтва ў пераходзе пад літоўскую ўладу ў сувязі з тым, што тая, сярод іншага, абараняла "ад нападаў татарскіх і іншых"[64]. Выходзіць, нямецкія рыцары калі і выконвалі ролю падобнага фактару, то – у разуменні В. Грышкевіча – не дужа істотную. У гэтай сувязі ўяўляюцца вартымі ўвагі і артыкулы М. Шкялёнка, які таксама пісаў толькі пра небяспеку з боку татараў, калі тлумачыў далучэнне беларускіх земляў да новага дзяржаўнага цэнтра[65]. Праўда, такі погляд быў ім выказаны ў тэкстах, якія першапачаткова друкаваліся ў газеце "Раніца" ў Берліне (1943), так што не згадаць пра небяспеку нямецкіх рыцараў аўтар мог і з палітычных матываў.

Ад погляду названых аўтараў на ўзаемаадносіны з Ордэнам адрознівалася пазіцыя іншага вядомага актывіста нацыянальнага руху Язэпа Найдзюка, які належаў да беларускага каталіцкага асяроддзя. Былы слухач гістарычнага факультэта

[62] Гл. план адпаведнага раздзела ў рукапісе кнігі: Станкевіч А. Гісторыя Беларусі (Сыстэматычны нарыс). Вільня, 1944 / Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 4. Воп. 1. Спр. 125. С. 150.

[63] Hryszkiewicz W. Rola ziem białoruskich w unjach polsko-litewskich // Pamiętnik VI Powszechnego zjazdu historyków Polskich w Wilnie, 17–20 września 1935 r. T. 1: Referaty. Lwów, 1936. S. 181–188.

[64] Ibidem. S. 184.

[65] Шкялёнак М. Беларусь і суседзі. Гістарычныя нарысы. Беласток, 2003. С. 138.

Віленскага ўніверсітэта, ён лічыў ордэнскі фактар важным для рэгіёна. У сваім кароткім нарысе па гісторыі Беларусі, які ўбачыў свет у Вільні ўжо пад савецкім кантролем, Я. Найдзюк пісаў, што збліжэнне палачан з Літвой у пачатку XIII ст. было выклікана менавіта націскам крыжаносцаў, а пазней іх напады прывялі да збліжэння ВКЛ з Польшчай і заключэння персанальнай уніі[66]. У цэлым сказанае адпавядала традыцыйнай на той час трактоўцы генезісу польска-літоўскай уніі. Для нас жа асаблівасць погляду Я. Найдзюка палягае ў тым, што ён, як і В. Грышкевіч, не палічыў патрэбным у сваім нарысе хоць штонебудзь сказаць пра Грунвальд.

Калі звярнуцца да грамадскай думкі Заходняй Беларусі, то лёгка заўважыць, што тут, як і ў БССР, таксама не існавала антынямецкага дыскурсу. Хутчэй наадварот, акупацыйная палітыка польскай дзяржавы абумовіла пранямецкія сімпатыі ў інтэлектуальных колах беларусаў. Напрыклад, беларускі публіцыст і грамадска-палітычны актывіст Уладзімір Самойла, асуджаючы польскую ўладу за ўдушэнне беларускага нацыянальнага жыцця, у 1923 г. заклікаў пераняць заходнія (нямецкія) метады барацьбы са злом, бо толькі так можна перамагчы "тое зло, якое пагражае з... польскага Захаду". Нямеччыну, нямецкі народ, "нямецкі свет" ён прыводзіў у прыклад – як узор "высокае духовае актыўнасці" і таго, як трэба "аднова ствараць нацыю"[67]. У такім кантэксце ўяўляецца натуральным, што ў нацыянальным друку Заходняй Беларусі пра Грунвальд не пісалася, і пра якія-небудзь выпадкі ўшанавання дня бітвы нічога невядома. Беларускае Навуковае Таварыства арганізоўвала ўрачыстасці ў гонар 400-годдзя беларускага кнігадрукавання (1925) і такіх жа ўгодкаў Статута ВКЛ (1929), даволі шырока розныя грамадскія арганізацыі Вільні святкавалі Дзень Беларускай Культуры[68], але немагчыма знайсці сведчанні пра хоць якое-небудзь публічнае адзначэнне беларусамі перамогі пад Грунвальдам. Абыякавымі да тэмы заставаліся літаратары і публіцысты. У прыватнасці, яе не кранаў ні літаратурна-навуковы і грамадскі часопіс "Калосьсе", выдаваны беларусамі

[66] Najdziuk J. Biełaruś učora i siahońnia. Karotki papularny histaryčny narys. Vilnia, 1940. S. 22, 24.

[67] Суліма [Самойла Уладзімір]. "Гэтым параможаш!" (Нарысы крытычнага аптымізму) // Заходняя Беларусь: Зборнік. Кн. 1. Вільня, 1923. С. 18, 52, 66 і наст.

[68] Гл.: Калосьсе. 1937. № 1(10). С. 53–57.

ў Вільні ў 1935–1939 г., ні месячнік "Беларускі летапіс", што выходзіў у 1936–1939 г.

Для характарыстыкі праграмы канструявання нацыянальнай памяці беларускай элітай краю найбольш паказальным корпусам тэкстаў уяўляюцца календары, якія, нагадаем трапнае прызнанне цытаванага вышэй А. Мілавідава, наймацней уплывалі на "пазашкольную асвету народа"[69]. Лідары беларускага руху спрабавалі выкарыстаць і гэты эфектыўны сродак уплыву на свядомасць шырокіх колаў насельніцтва – у міжваенны перыяд у Вільні выйшла больш за два дзясяткі беларускіх календароў. Праўда, да гісторыі звярталіся нямногія, а сярэднявечная бітва была згадана толькі ў трох выданнях. Найбольшы спіс гістарычных датаў, якія заслугоўвалі памяці, змясціў каляндар на 1923 год, дзе не забыты і "гістарычны бой з немцамі пад Грунвальдам, у якім пабеду пераважылі беларусы"[70]. Затое ў выданні на наступны год, якое змясціла агляд мінулага Беларусі ў агульных звестках пра краіну, акцэнтавана важнасць злучэння краю з Польшчай (уніі), сказана пра выданне першай кнігі Скарынам (1517), затым пра вайну з Масквой, з-за якой была падпісана унія 1569 г., і нядолі XVII ст.[71], чым складальнікі і абмежавалі шэраг найбольш вартых памяці падзей.

Наступным гістарычны раздзел і "Кароткі агляд гісторыі Беларусі" са спісам падзей і датай Грунвальдскай перамогі змясціў каляндар на 1929 год, выпушчаны Беларускім выдавецкім таварыствам[72], якое спрабавала працягваць традыцыі "Нашай Нівы". Каляндар на 1932 г. таксама звяртаў сваіх чытачоў да гісторыі: у ім публікавалася "Кароткая беларуская храналёгія", у якой з амаль трох дзясяткаў датаў траціна прысвечана ўсёй гісторыі да XX ст. Але Грунвальдскую бітву тут не знайсці – складальнікі не ўключылі яе ў лік важных датаў беларускай храналогіі[73]. Затое ў календары на наступны год сярод гістарычных датаў быў і Грунвальд, названы бітвай "палякоў і літвіноў з немцамі", перамогу ў якой забяспечыла "беларускае смаленскае войска"[74]. Спарадычныя ўпамінанні пра перамогу сконч-

[69] Миловидов А. И. Русский календарь в Северо-Западном крае. С. 19.

[70] Беларускі календар на 1923 год. Вільня: Друк, [б. г.]. С. 26–27.

[71] Беларускі каляндар на 1924 год. Вільня, 1923. С. 22–23.

[72] Беларускі календар на 1929 год. Вільня, 1928. С. 42–45.

[73] Беларускі календар на 1932 год / выд. Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Саюзу. Вільня, [б. г.]. С. XXXII.

[74] Беларускі календар на 1933 год / выд. Я. Мялецкага. Вільня, [б. г.]. С. 32.

ліся календарамі для сялян Беларускай кнігарні "Пагоня", якія ў 1937–39 г. змяшчалі яе ў спісе памятных дат.

Ад самага пачатку да бітвы паслядоўна не звярталіся ў сваіх календарах дзеячы беларускага каталіцкага кола на чале з ксяндзом Адамам Станкевічам. Гэта адпавядала той кансерватыўнай лініі, якой яны трымаліся, выступаючы супраць вайны і рэвалюцыі, прапагандуючы ідэю аб тым, што сіла народа палягае ў маральным удасканальванні, а не ў ваенных подзвігах. У сувязі з адзначаным характэрнымі падаюцца радкі з верша Вінцука Сталярчонка, апублікаванага ў каталіцкім календары на 1921 год, якія адлюстроўваюць нежаданне ідэнтыфікавацца з дзейнымі бакамі ваенных сутыкненняў:

*Тутка спрад веку войны вяліся*
*Быў тут татарын і швед,*
*Вечна крыві тут рэчкі ліліся*
*І груганом быў абед.*
*Білась тут Польшча часта з Масквою,*
*Білась Літва й Крыжакі.*
*Нашу ж зямельку мелі сваёю*
*Доўгі, ой доўгі вякі*[75].

Наогул, складальнікі беларускіх календароў у Вільні пры зусім нячастых апеляцыях да мінулага Беларусі падбіралі, як і рэдакцыя "Нашай Нівы", галоўным чынам падзеі рэлігійна-культурнага жыцця, а не ваенна-палітычнай гісторыі. Пра тое, што Грунвальд у міжваенны перыяд так і не набыў папулярнасці сярод беларускай інтэлігенцыі і па-за межамі БССР, дадаткова сведчыць прыклад аналагічнага календара латышскіх беларусаў, складзены Сяргеем Сахаравым. Гэты актывіст беларускіх арганізацый у Латвіі меў за плячыма юрыдычны факультэт Дэрпцкага ўніверсітэта і хаця б па-аматарску займаўся гісторыяй і этнаграфіяй, так што належаў да тых, хто тады "канструяваў" нацыянальную гісторыю. Вось жа ў календары на 1937 год, у якім паралельна з царкоўнымі святамі на кожны месяц пададзены "гістарычныя памяткі" са свецкага жыцця, для ліпеня як тры найважнейшыя падзеі складальнік выбраў заключэнне Люблінскай уніі (1569), ліквідацыю царкоўнай

[75] Сталярчонак В. Бедны мой краю // Biełaruski kalendar "Krynica" na 1921 hod. Vilnia, 1920. S. 80.

уніі (1839) і пачатак I сусветнай вайны (1914)[76]. “Забыццё” пра 1410 год, выпадковае ці свядомае, у дадзеным выпадку ўяўляецца асабліва паказальным.

Падагульняючы, можна сказаць, што ў традыцыях беларускага нацыянальнага гісторыяпісання да II сусветнай вайны бітве пад Грунвальдам не адводзілася важнага месца і не прыпісвалася асаблівага значэння. Толькі ў акадэмічнай гістарыяграфіі БССР пад уплывам савецкай прапаганды перад самай вайной Грунвальд пачаў набываць сімвалічную вагу ў артыкуляваным дыскурсе барацьбы з немцамі як гістарычным ворагам Русі, аднак у публіцыстыцы і гістарычнай літаратуры такая тэндэнцыя не адлюстравалася. Яшчэ менш увагі бітве аддавалася ў гістарычнай літаратуры Заходняй Беларусі, хоць менавіта лідары нацыянальнага руху ў Вільні спрабавалі замацаваць 1410 год у гістарычным календары беларусаў. Беларускую грамадскую эліту не натхніў тут ні прыклад палякаў Вільні, якія адзначалі перамогу над Ордэнам як нацыянальнае свята, ні літоўцаў, якія пачалі канструяваць сваю традыцыю Жальгірыса, хоць памяць пра бітву 1410 г. у Літве цягам усяго міжваеннага перыяду заставалася ў цяні культу Вітаўта[77]. Ініцыятыва “Нашай Нівы”, рэдакцыя якой імкнулася зрабіць год бітвы пад Грунвальдам адной з асноўных датаў гістарычнай памяці беларусаў, не атрымала належнай падтрымкі і сама згубілася ў забыцці.

[76] Беларускі календар на 1937 год / склаў С. Сахараў. Daugavpils, [б. г.]. С. 27.

[77] Nikžentaitis A. Witold i Jagiełło. S. 25–26; Petrauskas R. Grunwaldu życie pośmiertne od XV do XX w. S. 154–155.

## Раздзел 8

# Афіцыйная і грамадская памяць пра бітву ў БССР да 1990 г.

*...Мы зразумелі, што той гераізм, якім праславіўся беларускі народ у гады вайны, уваходзіць у глыбокую старажытнасць, у слаўнае мінулае.*

Уладзімір Перцаў[1]

Выкарыстанне гістарычных прыкладаў гераізму для абуджэння патрыятызму, прыцягненне гістарычнай навукі для палітычнай прапаганды – усё гэта выдатна зарэкамендавала сябе ў гады вайны як інструмент мабілізацыі народа для барацьбы з нямецкім фашызмам. Паспяховы вопыт вучыў, што падобным жа чынам гісторыя магла служыць савецкаму кіраўніцтву і пасля вайны – для аднаўлення краіны і сацыялістычнага будаўніцтва. "Вайна прымусіла нас па-новаму глядзець на мінулае беларускага народа, выявіць і ацаніць у ім такія моманты, на якія раней звярталася мала ўвагі. Мы зразумелі, што той гераізм, якім праславіўся беларускі народ у гады вайны, уваходзіць у глыбокую старажытнасць, у слаўнае мінулае..."[2], – так разважаў пра новы падыход для асвятлення мінулага праф. У. Перцаў. Таму не дзіўна, што хоць нямецкі нацыянал-сацыялізм быў пераможаны, у Мінску, як і ў Маскве, пра сярэднявечныя бітвы з нямецкімі рыцарамі па-ранейшаму пісалася ў традыцыях часопіса "Славяне", стылізуючы барацьбу з сярэднявечным Тэўтонскім ордэнам пад вайну з гітлераўскай Нямеччынай.

Практыка пачынаць адлік злачынстваў нямецкіх заваёўнікаў паходамі сярэднявечных рыцараў, разглядаючы іх у кантэксце германа-славянскага супрацьстаяння, была пе-

[1] Цыт. па: Храпко Л. Стварэнне "Гісторыі БССР" як важнае дасягненне гістарычнай навукі // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грам. навук. 1985. № 4. С. 55.

[2] Тамсама.

ранесена ў Мінск з Масквы, дзе пад час Вялікай айчыннай вайны знакавыя беларускія пісьменнікі і грамадска-палітычныя дзеячы перанялі яе, калі ўдзельнічалі ў антыфашысцкай агітацыйнай працы. Паказальным тут можна лічыць прыклад Янкі Купалы. Трэба адразу сказаць, што з Купалавых тэкстаў перыяду эвакуацыі, калі параўноўваць іх з ранейшымі, паўставаў паэт з іншай гістарычнай свядомасцю, які трактаваў мінулае па ўзорах, неўласцівых яго ранейшай творчасці. Праўда, рыторыка яго публікацый пачатку вайны настолькі набліжана да стандартаў афіцыйнай прапаганды Усеславянскага камітэта ў Маскве, што ўзнікае пытанне аб іх прыналежнасці пяру самога Купалы. Агулам у апублікаваных артыкулах і выступленнях другой паловы 1941 г. Купала тройчы згадваў Грунвальдскую бітву[3], заўсёды падаючы яе ў кантэксце агульнаславянскай барацьбы з Гітлерам і тэўтонскімі рыцарамі як яго папярэднікамі ў ранейшыя часы – дакладна па той схеме інтэрпрэтацыі, якая была выпрацавана ў Крамлі для ваеннай прапаганды. Так, гаворачы пра мужны беларускі народ, ён пісаў, як шматпакутная Беларусь "неаднаразова сваімі грудзямі прымала і сваімі кулакамі адбівала напады псоў-рыцараў, напудраных фрыдрыхаўскіх салдатаў і палкоў кайзераўскай Германіі. Мы заўсёды ішлі разам з рускім народам, заўсёды перамагалі разам. Доўгія вякі прайшлі ад бою пад Грунвальдам да нашых дзён, доўгія вякі сумеснай барацьбы і вялікай, спаянай крывёй дружбы"[4]. У іншым месцы сярод усхваленняў савецкага патрыятызму беларускага народа і заклікаў уздымацца на партызанскую барацьбу паэт нагадаў пра Полацк, што яшчэ ў XIII ст. "пачаў барацьбу з нямецкімі рыцарамі", якую завяршыла Лядовае пабоішча, а затым прывёў у прыклад паўстанні Налівайкі і Хмяльніцкага як праявы народнага руху з мэтай "злучэння з Масквой"[5].

Здаецца, любімы беларусамі паэт у тую трагічную часіну ўжо толькі трансляваў нарыхтоўкі, падрыхтаваныя ідэолагамі бальшавіцкай партыі, у тым ліку ідэю аб пераемнасці паміж экспансіяй тэўтонскіх рыцараў і ўварваннем армій Гітле-

[3] Гл. артыкулы "Не будет белорус рабом немецких баронов", "Народная война" і брашуру "Народ-мститель" у: Купала Я. Поўны збор твораў: у 9 т. Т. 8: Артыкулы, нататкі, выступленні. Мінск, 2002. С. 212–216, 223–226, 244–252.

[4] Тамсама. С. 223, 245. Пераклад з рускай мой – *аўт.*

[5] Тамсама. С. 249–250.

ра. Зразумела, такія ідэі пашыраліся ў беларускім асяроддзі не адным Купалам. У ліпеньскія дні 1941 г. рэдагаваная Міхасём Лыньковым газета "За савецкую Беларусь", што выходзіла пабеларуску ў Маскве, апублікавала праграмны прапагандысцкі артыкул, у якім праводзілася ідэя аб выратаванні славян толькі ў супольнай барацьбе супраць адвечнай агрэсіі немцаў і Гітлера. Маўляў, нямецкія рыцары "на працягу многіх вякоў… агнём і мечам знішчалі мірнае славянскае насельніцтва", а цяпер іх нашчадак Гітлер плануе знішчэнне ўсіх славянскіх народаў[6]. Тым больш адметнай у гэтай сувязі выглядае пазіцыя Якуба Коласа, які ў сваіх не менш палымяных антыфашысцкіх публікацыях аналагічнага прызначэння абыходзіўся без выкарыстання гісторыі і апеляцый да агульнаславянскага патрыятызму. У агітацыйных вершах, якія заклікалі да зброі беларусаў у акупаванай краіне, аўтар не выходзіў па-за кантэкст вайны з гітлераўскай Нямеччынай. Зразумела, на адрас ворага сыпалася мноства самых адмоўных эпітэтаў ("Гітлер-кат" прывёў на савецкую краіну "нямецкі чорны зброд", "разбойнік з Берліна", "фашысцкая гідра", "фашыст-шакал" і да т. п.)[7], аднак паэт не шукаў гітлераўскім агрэсарам іх гістарычных папярэднікаў.

Пераемнасць ваенных традыцый з пасляваеннай практыкай адным з першых у літаральным сэнсе ўвасобіў беларускі філосаф і публіцыст Фёдар Канстанцінаў, які працаваў раней рэдактарам часопіса "Славяне" ў Маскве. Яго папулярны артыкул пра ўдзел беларусаў у бітве пад Грунвальдам, апублікаваны летам 1945 г.[8], сканцэнтравана ўзнавіў асноўныя тэзісы панславісцкага антынямецкага дыскурсу і прадставіў Тэўтонскі ордэн як "агрэсіўную сілу, што пагражала беларусам і ўсім славянскім народам". Аўтар паведамляў чытачам пра наступ немцаў на "багатыя славянскія землі" з VII ст., пра Лядовае пабоішча і далейшы наступ ды "крывавыя подзвігі" немцаў на славянскіх і літоўскіх землях ажно да пачатку XV ст., калі "перад тварам агульнай пагрозы славянскія народы аб'ядналіся для адпору ворагу"[9]. Гаворачы пра паход са-

[6] Ізверг Гітлер – злейшы вораг славянскіх народаў // За совецкую Беларусь. 1941. 17 ліпеня. С. 2.

[7] Гл.: Колас Я. Адпомсцім. Москва, 1941. С. 6–9; ён жа. Біце фашысцкага звера // За совецкую Беларусь. 1942. 28 сакавіка. С. 2.

[8] Канстанцінаў Ф. Удзел беларусаў у Грунвальдскай бітве // Полымя. 1945. № 5-6. С. 103–110.

[9] Тамсама. С. 105.

юзнікаў у Прусію і ход Грунвальдскай бітвы, Ф. Канстанцінаў піша амаль выключна пра “славян”, “славянскія войскі”, якім супрацьстаяла “нямецкая армія”. Бітва 1410 г. тут названа “адной з найбольш значных падзей у сусветнай гісторыі”, што адыграла “вялікую ролю ў лёсах славянскіх народаў, у тым ліку і нашага беларускага народа”, бо яна, маўляў, “завяршыла вялікі этап шматвяковай барацьбы рускага, беларускага, польскага і ўкраінскага народаў супраць націску на ўсход нямецкіх захопнікаў”. Пад Грунвальдам “аб'яднаныя славянскія народы... далі рашучы адпор імкненням нямецкіх варвараў захапіць славянскі ўсход”, пасля чаго яны “на працягу больш пяціста гадоў не адважваліся аднаўляць свой праваліўшыйся *Drang nach Osten*”[10].

Нягледзячы на публікацыю Ф. Канстанцінава, што ўвасобіла беларусацэнтрычны варыянт панславісцка-савецкага тлумачэння Грунвальда, пасля вайны ў агульным антынямецкім гістарычным дыскурсе ў БССР бітва пад Грунвальдам фігуравала яшчэ рэдка і, як правіла, – у другаснай, зусім не вызначальнай ролі. Без узвелічэнняў, як адну са старонак барацьбы з захопнікамі яе прынагодна згадвалі і дзяржаўна-партыйныя кіраўнікі, напрыклад, старшыня СНК БССР Панцеляймон Панамарэнка ў сваім выступе на гадавіну вызвалення Беларусі[11]. Адмыслова ж пра падзею ў дзяржаўных масмедыях не пісалася і ў юбілейныя гады. Толькі ў 1960 г., калі ў Польшчы гучна святкавалася 550-годдзе бітвы – юбілей, які адзначалі і ў суседняй Вільні[12], і ў сталічнай Маскве, галоўная газета БССР таксама прысвяціла спецыяльны артыкул Грунвальду[13]. Бітва ў ім была прэзентавана ўжо па ўсіх правілах канону, агульнага для сацыялістычнага лагера, – у тым вобразе, які сфармаваўся далёка не адразу.

[10] Тамсама. С. 103, 110.

[11] Гл.: Першая гадавіна вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (выступ П. К. Панамарэнкі) // Звязда. 1945. 8 жніўня. С. 1.

[12] Савецкая Літва таксама адзначала юбілей бітвы, хоць непараўнальна сціплей, чым сацыялістычная Польшча (гл.: Nikžentaitis A., Mikailienė Ž. Litewski Žalgiris, polski Grunwald: dwa toposy narodowe w kontekście analizy porównawczej // ZH. T. 75 (2010). S. 11).

[13] Щербаков С. А. В единстве народов – путь к победе. К 550-летию разгрома немецких рыцарей под Грюнвальдом // Советская Белоруссия. 1960. 15 июля. С. 3.

## 8.1 Вызначэнне вобраза Грунвальда ў акадэмічнай гісторыі

*Гісторыя спынілася. Не існуе нічога, апрача вечнай цяперашчыны, дзе Партыя заўсёды мае рацыю.*

Дж. Оруэл[14]

Хоць самой бітве пад Грунвальдам адразу пасля вайны, як ужо адзначана, спачатку не прыпісвалася асаблівага значэння, спробаў гераізацыі мінулага Беларусі, пра якую згадваў У. Перцаў, не давялося доўга чакаць. У гэтых адносінах можна лічыць характэрнай кніжачку сакратара ЦК КП(б)Б па прапагандзе Ціхана Гарбунова пра мінулае Беларусі[15], якая на справе ўяўляла з сябе скарочаную стэнаграму лекцыі, прачытанай 18 чэрвеня 1945 г. у мінскім Доме партыйнай асветы. Хоць гісторыя патрактавана ў ёй праз прызму адзінства Беларусі з Расіяй, кніжка не пазбаўлена элементаў беларускага патрыятызму. Шукаючы даўнія прыклады гераізму беларусаў, Ц. Гарбуноў шмат увагі аддаў барацьбе Полацкага княства з мечаносцамі ў XIII ст. Праўда, лексікай і выразамі яго апісанне нагадвала франтавыя рэпартажы пра гераізм братніх народаў СССР у барацьбе з фашысцкімі агрэсарамі. На старонках кнігі ўжо сярэднявечная Беларусь стала арэнай барацьбы са скіраванымі на Усход "нямецкімі захопнікамі", дзе іх стрымлівалі "ваяўнічыя дружыны палачан". Калі ў межы Беларусі "ўварваліся нямецкія захопнікі", то "беларусы Полацкай зямлі, пры падтрымцы Пскоўскага, Ноўгарадскага, Смаленскага княстваў усталі на абарону сваёй радзімы, сваёй культуры". А вось бітва пад Грунвальдам прыведзена ў лекцыі толькі ў якасці прыкладу гераічнага мінулага, які "пацвярджае салідарнасць славян у барацьбе з захопнікамі"[16].

Цытаваны тэкст лекцыі Ц. Гарбунова ўвайшоў у якасці прадмовы ў першую ў пасляваеннай Беларусі абагульняльную працу

[14] Оруэл Дж. Ферма: Аповесць. 1984: Раман / пер. С. Шупы. Мінск, 1992. С. 247.

[15] Горбунов Т. Героическое прошлое белорусского народа. Минск, 1945.

[16] Тамсама. С. 7–10.

па гісторыі краіны – аднатомнік “Гісторыя БССР”. Уключэнне лекцыі сакратара партыі па прапагандзе ў якасці прадмовы да акадэмічнай працы па гісторыі само па сабе красамоўна сведчыць пра тагачаснае становішча гістарычнай навукі ў савецкай Беларусі. Інстытут гісторыі АН БССР быў адноўлены ў 1944 г. і ўжо з наступнага года змог арганізавана пачаць працу[17]. План жа згаданага нарыса гісторыі складаўся яшчэ ў 1943 г. у Маскве і да 1946 г. ён быў ужо напісаны. У адпаведнасці з патрабаваннямі партыі, асаблівую ўвагу аўтары адвялі “паказу брацкіх адносін паміж беларускім і рускім народам”, а таксама акцэнтаванню гераічнага мінулага беларускага народа, барацьбе з чужаземнымі захопнікамі, – адзначалася ў справаздачы дырэкцыі Інстытута гісторыі[18]. Свет паспела ўбачыць, праўда, толькі першая частка гатовай працы[19], у якой разглядалася гісторыя краіны ад старажытнасці па XIII ст.

Вуснамі Ц. Гарбунова ў першай пасляваеннай акадэмічнай гісторыі Беларусі з самага пачатку кнігі гаварылася пра нямецкі “Дранг нах Остэн” як смяротную небяспеку для славян – такую ж, як татарскія набегі і “напор азіяцкай імперыі Асманаў”[20]. Гэта быў першы прыклад пераносу абцяжаранага змрочнымі асацыяцыямі выразу з прапагандысцкага дыскурсу ў працу акадэмічнага статусу. У галоўнай частцы кнігі барацьба Полацкага княства з нямецкай агрэсіяй апісана, праўда, больш стрымана, чым у эмацыйна-публіцыстычнай прадмове Ц. Гарбунова, затое яна была ўпершыню вынесена ў асобны раздзел, раўнаварты раздзелам пра Кіеўскую Русь ці пра княствы XI–XIII ст. на тэрыторыі Беларусі[21]. Праўда, з-за недахопу фактаграфічнага матэрыялу аўтару гэтага тэксту праф. А. Савічу давялося дапаўняць яго асвятленнем “татара-мангольскага нашэсця” і нават пачаткамі фармавання беларускай народнасці. Якое месца і якія ацэнкі магла атрымаць у кнізе бітва пад Грунвальдам, застаецца толькі здагадвацца, паколькі наступныя выпускі аднатомніка, што былі ўжо падрыхтаваныя, не выйшлі з-за но-

17 Работа Інстытута гісторыі АН БССР з канца 1943 г. да 1 студзеня 1947 г. // Весці АН БССР. Аддзяленне грам. навук. Серыя гістарычная. 1947. Вып. 1. С. 106–109.

18 Работа Інстытута гісторыі АН БССР... С. 106–107.

19 История БССР. Вып. 1. Вступ. статья Т. Горбунова. Минск, 1946.

20 Тамсама. С. I–II.

21 Тамсама. “Полацкае княства ў барацьбе з нямецкай агрэсіяй”, с. 103–110.

вых патрабаванняў партыі да гісторыкаў (пачыналася барацьба з касмапалітызмам).

На арганізаваным публічным абмеркаванні першай пасляваеннай “Гісторыі БССР” названы выпуск быў рэзка раскрытыкаваны. Сам П. Панамарэнка ўказаў на “сур'ёзныя метадалагічныя памылкі” яго аўтараў, звязаныя з уплывам ранейшых прац У. Пічэты па гісторыі Беларусі[22], г. зн. “нацдэмаўскай” канцэпцыі. Гэтым крытыка гісторыкаў толькі пачыналася. Пасля таго як у пастанове ЦК УКП(б) за 25 студзеня 1947 г. было ўказана на “адставанне крытыкі памылак ідэалагічнага характару ў працах па гісторыі, літаратуры і мастацтве” ў Беларусі, у канцы таго ж года XV пленум ЦК КП(б)Б разгледзеў пытанні палітычнай і ідэалагічнай працы сярод інтэлігенцыі[23]. Сярод іншага, на пленуме разам з кнігай Н. Каменскай пра ўтварэнне БССР за памылковыя пазіцыі быў востра раскрытыкаваны і першы выпуск “Гісторыі БССР”. У выніку ўсёй крытыкі выявілася неабходнасць рыхтаваць новае абагульняльнае выданне, стварэнне якога стала галоўнай задачай Інстытута гісторыі. Для таго, каб будучыя абагульняльныя працы пісаліся “правільна”, пленум даручыў гэтаму ж інстытуту падрыхтаваць “Тезисы об основных вопросах истории БССР” – праграмны дакумент для гісторыкаў і настаўнікаў[24]. Сімвалічна, што адказнасць за арганізацыю такой працы ў Акадэміі навук перадавалася Упраўленню прапаганды ЦК КП(б)Б.

Зразумела, што і брашура Ц. Гарбунова, і першы выпуск “Истории БССР” трапілі пад крытыку не з-за трактовак нямецкай агрэсіі, якая паўтарала асноўныя ідэі антынямецкага прапагандысцкага дыскурсу канца 1930-х і ваенных гадоў. Уплывы “антынавуковай, ілжывай устаноўкі” былі заўважаны партыйнымі ідэолагамі ў іншым. У тым, напрыклад, што Полацкае княства называлася беларускай дзяржавай, і ў сцвярджэнні, што ў складзе ВКЛ беларускі народ дасягнуў высокага ўзроўню

[22] Абмеркаванне першага выпуску “Гісторыі БССР” // Звязда. 1946. 20 лістапада. С. 1.

[23] Из постановления “О политической и идеологической работе КП(б) Белоруссии среди интеллигенции” // Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 4. 1945–1955. Под ред. Г. Г. Бартошевича. Минск, 1986. С. 196–205.

[24] Из постановления “О политической и идеологической работе КП(б) Белоруссии среди интеллигенции”. С. 204.

эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця[25]. Апошняе было названа "водгукам ілжывай легенды" – тэорыі пра XV–XVI ст. як "залаты век" Беларусі, што пранікла ў прадмову першага выпуску акадэмічнай гісторыі 1946 г. Згодна з прынятай у Маскве тлумачальнай схемай, у тыя стагоддзі "беларускі народ быў гвалтоўна адарваны ад брацкага рускага народа", таму на Беларусі панавалі чужая літоўская, і затым польская дзяржава, а тэорыя "залатога веку" лічылася ўжо не толькі нацыяналістычнай, але і "тыповай праявай нізкапаклонства перад Захадам"[26].

Ідэйна-канцэптуальнай арыентацыі пры стварэнні новай, марксісцка-ленінскай гісторыі Беларусі павінны былі служыць згаданыя вышэй "Тэзісы" – спецыяльнае, ідэалагічна выверанае выданне, падрыхтаванае Інстытутам гісторыі АН БССР разам з Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Галоўнымі мэтамі названых тэзісаў было выкрыццё канцэпцый гісторыкаў "з лагера беларускіх нацыяналістаў", а датычна даўняга мінулага – перш за ўсё абгрунтаванне агульнасці гістарычнага паходжання і гістарычных лёсаў усходнеславянскіх народаў[27]. Пры такой устаноўцы для паказу немцаў як ворагаў у даўнія часы аўтары "Тэзісаў" выкарысталі толькі сюжэт барацьбы Полацкага княства з "псамі-рыцарамі" ў XIII ст. Спатрэбіўся ён для таго, каб даводзіць, што толькі чужаземная агрэсія – "нямецка-шведская" з захаду і "татара-мангольская" з усходу – дазволіла Літве захапіць заходнія землі адзінай Русі[28]. Іншыя прыклады барацьбы з Нямецкім ордэнам, у тым ліку бітва пад Грунвальдам, не заслужылі ніякай увагі аўтараў праграмнага выдання. У гэтым бачылася пэўная логіка, паколькі і ў той канцэпцыі "беларускіх нацыяналістаў", тэзісы якой сталі галоўным аб'ектам іх крытыкі, Грунвальд не выконваў ніякай асаблівай ролі.

Новая версія гісторыі Беларусі, хоць ужо існавалі "Тэзісы", распрацоўвалася марудна, што было абумоўлена зменлівас-

[25] Пар.: Горбунов Т. Героическое прошлое белорусского народа. С. 18–21, 29.

[26] Іоўчук М. Сучасныя задачы савецкай навукі БССР у справе камуністычнага выхавання народа // Бальшэвік Беларусі. 1947. № 7. С. 23; ён жа. Узняць работу з інтэлігенцыяй на ўзровень сучасных задач КП(б) Беларусі // Бальшэвік Беларусі. 1948. № 1. С. 27–29.

[27] Тезисы об основных вопросах истории БССР. Ч. 1. Минск, 1948. С. 3–4.

[28] Тамсама. С. 12–13.

цю тагачаснай ідэалагічна-палітычнай сітуацыі ў СССР. У сувязі з тым, што ЦК УКП(б) у 1946–1948 гадах прымаў адну за другой пастановы па ідэалагічных пытаннях[29], пачаўшы кампанію барацьбы з касмапалітызмам, у Мінску мясцовае партыйнае кіраўніцтва таксама патрабавала ад інтэлігенцыі "рашучай барацьбы супроць нізкапаклонства і рабалепства перад заграніцай"[30], заклікаючы да выкрывання тых, у каго "прытупілялася пачуццё савецкага патрыятызму". Пэўнае ўяўленне пра тое, як на вобраз Нямеччыны магла паўплываць сумнавядомая барацьба з праявамі касмапалітызму, дае прыклад цэнзуравання рукапісу манаграфіі У. Перцава "Гісторыя Прусіі", што так і не ўбачыла свет. З працы гісторыка, вядомага антынямецкай настроенасцю, у 1951 г. цэнзары выкраслілі сказ пра тое, што рыцары Тэўтонскага ордэна "не ўнеслі здаровых пачаткаў сваёй цывілізацыі" ў захопленыя імі землі Прыбалтыкі, і зроблена гэта было на той падставе, што пра нейкія там "здаровыя пачаткі" нямецкай культуры наогул больш нельга было разважаць[31].

У такой атмасферы кожны том макета новага нарыса па гісторыі БССР, падрыхтаванага ўжо 1949 г., абмяркоўваўся ў Маскве, у Інстытуце гісторыі АН СССР, пасля чаго тэкст сур'ёзна перапрацоўваўся, у тым ліку структурна[32]. Прынцыповае значэнне пры гэтым мелі ўказанні калег з Масквы[33]. У выніку толькі трэці варыянт працы ў канцы 1952 г. атрымаў у асноўным станоўчую ацэнку. На яго абмеркаванні сярод пазітыўных момантаў адзначалася, што аўтары добра паказалі, "як расла і мацнела векавая дружба" паміж рускім, украінскім і беларускім народамі, але рэкамендавалася яшчэ больш увагі аддаць барацьбе народных мас "супраць сваіх і іншаземных прыгнятальнікаў". Пад апошнімі

[29] Маюцца на ўвазе пастановы «О журналах "Звезда" и "Ленинград"», "О репертуаре драматических театров и мерах по их улучшению", «Об опере "Великая дружба"» і інш. Гл.: КПСС о культуре, просвещении и науке: сб. документов. Москва, 1963. С. 218–222.

[30] Іоўчук М. Сучасныя задачы совецкай навукі БССР… С. 21.

[31] Гужалоўскі А. Галоўліт БССР і палітычны кантроль у 1943–1991 гг. // БГА. Т. 19 (2012). С. 170.

[32] Козлов А. Научно-исследовательская работа Института истории Академии наук Белорусской ССР // ВИ. 1950. № 8. С. 157–159; Шатилло В. В Институте истории Академии наук Белорусской ССР // ВИ. 1954. № 6. С. 167–168; Пар.: Храпко Л. Стварэнне "Гісторыі БССР" як важнае дасягненне гістарычнай навукі. С. 57–58.

[33] Пар.: Шумскі Я. Гісторыя Беларусі ў люстэрку рассакрэчаных дакументаў… С. 118–122 і наст.

меліся на ўвазе найперш прыгнятальнікі літоўскія і польскія. Верагодна, беларускія аўтары спачатку збольшага аднолькава трактавалі ўсіх іншаземных захопнікаў, бо такую пазіцыю раскрытыкаваў госць з Масквы гісторык У. Пашута, які настойваў на акцэнтаванні менавіта нямецкай небяспекі: "У томе не дадзена яснага і поўнага асвятлення нямецкай агрэсіі, не паказана, з якой сілай яна дзейнічала ў Беларусі". Ён рэкамендаваў таксама не разглядаць Літву "як ворага, побач з нямецкімі крыжаносцамі", паколькі ўсё ж пераход беларускіх земляў пад уладу Літвы ў XIII ст. быў "меншым злом, чым заваяванне іх нямецкімі крыжаносцамі або манголамі"[34]. Гэтая думка і была прынятай.

У канчатковым выглядзе першы том пасляваеннай акадэмічнай гісторыі Беларусі быў апублікаваны толькі ў 1954 г. пасля рашэння Бюро ЦК КПБ аб яго выданні. Параўнальна з забракаваным нарысам 1946 г. ён прысвяціў даўняй "барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў" значна менш увагі, затое названая тэма ўвайшла ў загаловак адпаведнага раздзела. Размова ў ім вялася зноў галоўным чынам пра вядомыя падзеі XIII ст. Абарона ад чужаземных агрэсараў паказана ў стылі "баявога адзінства" ўсходніх славян. Перамогі Аляксандра Неўскага не толькі сарвалі планы Захаду "на падпарадкаванне рускага народа", але і "перашкодзілі нямецкім рыцарам захапіць Полацк, Віцебск і іншыя гарады заходніх зямель Русі"[35]. Вядомыя гандлёвыя дагаворы з Ордэнам цяпер падаваліся як вымушаная саступка перад сілай нямецкай агрэсіі, якая аблягчала захоп Літвой заходніх земляў Русі. Праўда, Грунвальд атрымаў у томе сціплае месца – параўнальна з эпізодамі барацьбы ў XIII ст. Аўтар раздзела А. П'янкоў павярхоўна апісаў бітву ў ранейшым стылі, як сутыкненне славян з немцамі. Разгромлены Ордэн пачаў "хіліцца да заняпаду", што паспрыяла і эканамічнаму развіццю Польшчы і ВКЛ, а галоўнае – была спынена "далейшая агрэсія нямецкіх феадалаў на славянскія і літоўскія землі", і гэта – "дзякуючы гераізму і стойкасці рускіх палкоў"[36].

Як адзначалася вышэй, стандарт савецкага патрыятызму эпохі Сталіна (з усхваленнем рускага народа і ўзнясеннем яго

[34] ЦНА НАН Беларусі. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 458. Арк. 112–113; Спр. 464. Арк. 4–5. Пар.: Абмеркаванне асноўных пытанняў гісторыі Беларусі // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. 1953. № 1. С. 176–177.

[35] История Белорусской ССР: в 2 т. Т. 1 / под ред. В. Перцева, К. Шабуни и Л. Абецедарского. Минск, 1954. С. 53–55.

[36] Тамсама. С. 80–81.

гераічных традыцый) пасля смерці правадыра пераставаў адпавядаць актуальнай міжнароднай сітуацыі і паступова карэктаваўся ў бок сацыялістычнага інтэрнацыяналізму. У інтэрпрэтацыях Грунвальдскай бітвы ў БССР названы прынцып спачатку выразна ўвасобіўся ў згаданым вышэй артыкуле Сцяпана Шчарбакова да юбілею бітвы: перамога 1410 г., якую выйгралі "аб'яднаныя славянскія і літоўскія войскі", "прыпыніла экспансію нямецкіх псоў-рыцараў у славянскія і літоўскія землі" і стала прыкладам развіцця "цеснай брацкай дружбы народаў савецкай краіны" з польскім народам, што святкаваў тысячагоддзе сваёй дзяржаўнасці[37]. Але ў афіцыйную версію гісторыі Беларусі падобныя карэктывы ў бок сацыялістычнага патрыятызму ўносіліся з затрымкай.

Неабходнасць неадкладна і цалкам перапрацаваць абодва тамы акадэмічнай гісторыі БССР паўстала ў сувязі з рашэннямі XX з'езда КПСС, на якім быў асуджаны культ асобы Сталіна[38]. Праўда, новае выданне двухтомніка пасля пэўнай дапрацоўкі, з улікам заўваг, убачыла свет толькі ў 1961 г. Тэму нямецкай экспансіі ў ім раскрываў новы аўтар, археолаг з БДУ Эдуард Загарульскі, тым не менш прыкметнай змены галоўных акцэнтаў у яе асвятленні не адбылося. Барацьба Полацка з крыжаносцамі паказана вайной народаў-братоў[39] – як і ў папярэднім выданні. Апісанне і ацэнка бітвы пад Грунвальдам таксама засталіся ранейшымі, за выняткам адной навацыі. У перапрацаваны нарыс дадаўся актуальны на той час тэзіс: перамога 1410 г. паказала, што "Літва і Польшча могуць весці паспяховую барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў толькі пры апоры на ваенныя сілы беларускіх, рускіх і ўкраінскіх зямель"[40]. Гэта быў "інтэрнацыянальны", або кампрамісны варыянт ацэнкі ўдзелу ў гістарычным разгроме агрэсараў, які мог задавальняць палякаў ды літоўцаў, хоць не адмаўляў і вырашальнай ролі ўсходніх славян. Прыпісванне перамогі аднаму рускаму народу канчаткова стала анахранізмам. З іншага боку, паказальна тое, што ў абедзвюх версіях першай акадэмічнай гісторыі Беларусі бітву пад Грунвальдам зацямняе барацьба з нямецкімі рыцарамі ў XIII ст. Апошняя падавалася больш важным фактарам гісто-

[37] Щербаков С. А. В единстве народов – путь к победе. С. 3.

[38] Пар.: Храпко Л. Стварэнне "Гісторыі БССР"... С. 59.

[39] История Белорусской ССР: в 2 т. Т. 1 / ред. колл.: Л. Абецедарский, В. Перцев, К. Шабуня. Минск, 1961. С. 64–65.

[40] Тамсама. С. 70.

рыі Беларусі, бо нямецкая агрэсія, маўляў, аблегчыла літоўцам захоп заходніх княстваў Русі, што надоўга раздзяліла братнія народы. Так на практыцы ўвасаблялася ўстаноўка, прапісаная ў цытаваных вышэй "Тэзісах" 1948 г.

Адзначаная стрыманасць зваротаў да Грунвальда і яго ацэнак у гістарыяграфіі савецкай Беларусі адпавядала абмежаванай інструменталізацыі ролі Нямецкага ордэна ў цэлым: нават у часы халоднай вайны яна зводзілася галоўным чынам да тлумачэння абставін захопу земляў Беларусі літоўцамі. Пра важнасць апошняй устаноўкі сведчыць адзін з тагачасных узораў афіцыёзнай інтэрпрэтацыі гісторыі ў БССР – сумнавядомая брашура Лаўрэнція Абэцэдарскага "У святле гістарычных фактаў", прызначаная для выкрывання "фальсіфікатараў гісторыі Беларусі" – гісторыкаў-нацыяналістаў, якія апынуліся на Захадзе. Нягледзячы на тое, што пасля выхаду "Тэзісаў" мінула два дзесяцігоддзі, згаданая брашура быццам пісалася толькі для фактаграфічнага ілюстравання простых схем, выкладзеных у праграмным выданні. Так, апісваючы ўтварэнне ВКЛ, галоўны гісторык БССР дакладна паўтарыў, што літоўскім князям "удалося падначаліць" сваёй уладзе заходнія землі Русі, «аслабленыя цяжкай барацьбой супраць мангола-татарскіх заваёўнікаў і нямецкіх "псоў-рыцараў"»[41]. Як вынікае з трактовак Л. Абэцэдарскага, у наступныя стагоддзі галоўнай небяспекай з Захаду для Беларусі была "каталіцкая агрэсія", увасобленая найперш Польшчай, а не нямецкі "націск на Усход", таму разгром Нямецкага ордэна заставаўся па-за яго ўвагай.

Найбольш грунтоўная савецкая гісторыя Беларусі – пяцітомавая "Гісторыя Беларускай ССР", падрыхтаваць якую Інстытуту гісторыі было даручана пастановай ЦК КПБ у 1968 г., выходзіла ўжо ў эпоху новай палітыкі, вядомай як разрадка міжнароднай напругі. Аднак яе першы том, прысвечаны мінуламу Беларусі да эпохі капіталізму, ствараўся яшчэ ў атмасферы халоднай вайны і перадаў яе дух. Тэма барацьбы супраць іншаземных захопнікаў у ім раскрыта адным аўтарам – гісторыкам Сцяпанам Шчарбаковым. Найбольш увагі даследчык аддаў нямецкай і татарскай агрэсіі ў XIII–XIV ст., якой прысвечаны асобны параграф[42], тады як бітве пад Грунвальдам адведзена два

[41] Абэцэдарскі Л. У святле неабвержных фактаў. Мінск, 1969. С. 19.
[42] Гл.: "Барацьба супраць нямецкіх феадалаў і татара-мангольскага нашэсця" // Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т. 1 / гал. рэд. К. І. Шабуня. Мінск, 1972. С. 116–122.

абзацы ў падраздзеле пра палітычнае жыццё краіны[43]. Канфлікты Полацка з Рыгай і Ордэнам у XIII ст., якія, згодна з гістарычнымі крыніцамі, чаргаваліся з перыядамі мірных адносін і кааперацыі зацікаўленых у гандлі абодвух бакоў, пададзены тут як суцэльная барацьба, што пастаянна ўзрастала. Згодна з інтэрпрэтацыяй аўтара, многія падзеі гісторыі Полацка і Віцебска падпарадкоўваліся менавіта патрэбе абароны ад нямецкіх агрэсараў, пакуль іх спробы "закабаліць рускія землі" не праваліліся ў выніку перамогі Аляксандра Неўскага. Паходы рыцараў на землі Панямоння, як і ў іншыя рэгіёны ВКЛ, трактаваны проста як спробы захапіць іх, без упамінання пра місію хрышчэння літоўскіх паганцаў, якой афіцыйна кіраваўся Ордэн. Затое выразна падкрэслена належнае братэрства савецкіх народаў: літоўскі народ таксама адыграў "важную ролю ў барацьбе супраць нямецкай агрэсіі", і ў цэлым нямецкія рыцары былі спынены "ў выніку ўпартай барацьбы рускага, літоўскага і іншых прыбалтыйскіх народаў"[44].

Варта адзначыць, што ў акадэмічнай гісторыі ўзору 1972 г. панарама барацьбы з агрэсіяй Тэўтонскага ордэна, узбагачаная фактурай, у цэлым вытрымана ў больш стрыманай танальнасці, чым у ранейшых публікацыях С. Шчарбакова. Яшчэ большая ўзважанасць характэрна для фрагмента пра Грунвальдскую бітву. Пры апісанні ўдзельнікаў бітвы і значэння перамогі аўтар з падкрэсленай увагай паставіўся да ўсіх народаў, што мелі дачыненне да разгрому Ордэна, і спакойна вызначыў яе важнасць. Перамога "прыпыніла агрэсію нямецкіх феадалаў", паспрыяла эканамічнаму развіццю "Польшчы, Літвы і беларускіх зямель" ды, што адзначалася ўпершыню, садзейнічала "згуртаванню беларускіх земляў і фармаванню беларускай народнасці"[45]. Падобна ацэньвалася гістарычнае значэнне бітвы таксама ў кароткай версіі гісторыі Беларусі, напісанай на аснове пяцітомніка і прызначанай для масавага чытача[46].

Афіцыйна прынятыя інтэрпрэтацыйныя схемы гісторыі развівалі энцыклапедычныя выданні, арыентаваныя на шырокую аўдыторыю. У гэтым сэнсе яны не маглі вызначацца наватарствам. Таму не дзіўна, што і ў першай беларускай энцы-

[43] Тамсама. С. 166.
[44] Тамсама. С. 118–119.
[45] Тамсама. С. 166.
[46] История Белорусской ССР / ред. колл. И. Игнатенко, Н. Каменская, И. Кравченко. Минск, 1977. С. 52.

клапедыі вобраз Грунвальда, створаны С. Шчарбаковым, не адрозніваўся ад той версіі, якая ўвайшла ў акадэмічную гісторыю: перамога "спыніла агрэсію Тэўтонскага ордэна на ўсход", абумовіўшы яго заняпад, а ў выніку "садзейнічала эканамічнаму развіццю Польшчы, Літвы і Беларусі"[47].

Такому збольшага ўзважанаму апісанню бітвы пад Грунвальдам у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі выразны кантраст склаў асобны артыкул пра "Дранг нах Остэн"[48]. Яго аўтар абапіраўся, здаецца, галоўным чынам на аднайменны артыкул У. Пашуты[49], які ўвасабляў ці не самую ідэалагізаваную ў савецкай гістарыяграфіі версію тлумачэння "націску на Усход", насычаную панславісцкімі ідэямі. Таму і тут, па прыкладзе названага гісторыка, "Дранг нах Остэн" паказаны як рэальная палітыка агрэсіі і ў адзіны працэс звязаны розныя з'явы гісторыі ад XII да XX ст.: "захопніцкая палітыка нямецкіх феадалаў, пазней нямецкай ваенна-каланізатарскай дзяржавы Прусіі, юнкерска-буржуазнай і імперыялістычнай Германіі ў дачыненні да краін Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы". Знамянальна пры гэтым, што, услед за расійскімі савецкімі гісторыкамі, А. Зубар падаў Грунвальд як адзін з этапаў стрымлівання напору Тэўтонскага ордэна, нічым не важнейшы за разгром рыцараў дружынамі Аляксанда Неўскага. Хутчэй наадварот, паколькі бітва 1410 г. тут звязвалася яшчэ не столькі з мінулым Беларусі, колькі з гісторыяй Польшчы[50]. Сама ж канцэпцыя "Дранг нах Остэн", як падкрэсліў аўтар, не толькі была "накіраваная на ідэалагічнае абгрунтаванне і апраўданне захопніцкай палітыкі" немцаў у гады абедзвюх сусветных войнаў, але па-ранейшаму заставалася небяспечнай для савецкай краіны. Маўляў, хоць фашысцкая Нямеччына і была разгромлена, ва ўмовах мірнага суіснавання СССР і Захаду "Дранг нах Остэн" зноў "адраджаецца… рэваншысцкімі і мілітарысцкімі коламі ў ФРГ", – насцярожвала чытачоў аўтарытэтнае даведачнае выданне.

[47] Шчарбакоў С. Грунвальдская бітва 1410 г. // БелСЭ. Т. 4. Мінск, 1971. С. 43–44. Скарочаны варыянт гэтага ж артыкула С. Шчарбакова змешчаны ў пяцітамовай энцыклапедыі. Гл.: Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя. Т. 1. Мінск, 1978. С. 227–228.

[48] Зубар А. Дз. "Дранг нах Остэн" // БелСЭ. Т. 4. Мінск, 1971. С. 270–271.

[49] Пашуто В. Т. "Дранг нах Остен" // Советская историческая энциклопедия. Т. 5. Москва, 1964. Стб. 322–325.

[50] Зубар А. Дз. "Дранг нах Остэн". С. 271.

## 8.2 Навуковыя даследаванні агрэсіі нямецкіх рыцараў

У галіне навуковых даследаванняў, якія па вызначэнні павінны менш залежаць ад ідэалогіі, БССР не магла пахваліцца значнымі працамі, прысвечанымі названай тэме. Адразу заўважым, што тут не паўстала асобных манаграфій ні пра Тэўтонскі ордэн, ні пра Грунвальдскую бітву, якую ўжо сур'ёзна вывучалі гісторыкі суседняй Літвы[51]. Фактычна першым навукоўцам з гучным імем, які займаўся Прусіяй яшчэ да вайны, быў У. Перцаў – прафесар БДУ і адначасова член акадэмічнай карпарацыі вучоных Беларусі. Як адзначалася вышэй, ужо ў сваіх ранніх публікацыях адказнасць за І сусветную вайну ён ускладваў на Нямеччыну[52]. Тое, што яго артыкулы з ваенных часоў перапаўняў пафас смяротнай барацьбы рускіх з немцамі, вызначалася агульным эмацыйным станам непасрэднага перажывання вайны. Але і пазней у публікацыях У. Перцава, прысвечаных Ордэну і ўсходняй агрэсіі рыцараў[53], адчуваўся той жа ваенны дух. Пасля вяртання ў Мінск гісторык працягваў даследаваць Прусію. Сярод першых прац адноўленага Інстытута гісторыі АН БССР планавалася завяршэнне яго кнігі "Прусія да яе заваявання немцамі"[54], якая так і не выйшла. У папулярным артыкуле аб утварэнні Тэўтонскага ордэна аўтар называў ордэнскую дзяржаву "арганізацыяй разбойнікаў і гвалтаўнікоў" і трактаваў яго раннюю гісторыю надзвычай палітызавана (дастаткова звярнуць увагу на эпітэты "разбойніцкая кучка", "звярыны тэўтанізм", "крывавае прусачаства" і да т. п.)[55]. Адмовіўшы

[51] Як прыклад гл.: Jučas M. Žalgirio mūšis. Vilnius, 1960; Lietuvių karas su kryžiočiais / red. J. Jurginis. Vilnius, 1964.

[52] Пар.: Перцев В. Германия и Австрия в XIX веке. Исторический очерк. Москва, 1917. С. 86–93.

[53] Перцаў В. Утварэнне Тэўтонскага ордэна // Полымя. 1945. № 2–3. С. 137–154; ён жа. Барацьба палачан і ноўгарадцаў супраць нямецкіх агрэсараў у XIII ст. // Бальшэвік Беларусі. 1945. № 7. С. 55–62.

[54] Каменская Н. В. Праблемы гісторыі, археалогіі і этнаграфіі Беларусі ў новай сталінскай пяцігодцы // Весці АН БССР. Аддзяленне грам. навук. Серыя гістарычная. 1947. Вып. 1. С. 7.

[55] Механічнае ўключэнне ідэалагічных тэзісаў у тэкст, вытрыманы ў стылі пазітывісцкага даследавання, адзначалася і іншымі гісторыкамі. Гл.: Еўтухоў І. У. М. Перцаў – заснавальнік медыявістыкі ў БДУ // Вытокі гістарычнай навукі БДУ. С. 31.

тэўтонскім рыцарам у наяўнасці хоць нейкіх чалавечых годнасцяў, У. Перцаў генетычна звязаў з Ордэнам «сістэму "прусачаства"», у аснове якой, на думку гісторыка, ляжала "разбойніцкая палітыка захопаў чужых земляў": маўляў, Ордэн "мог перадаць у спадчыну свае насільніцкія прыёмы захопаў" Прускаму каралеўству і наступным нямецкім дзяржавам[56]. Больш за тое, спрадвечную "прагу да чужых земляў" гісторык палічыў магчымым прыпісаць не толькі Ордэну, але і "германскім народам" наогул[57], што нагадвала погляды расістаў. Апісваючы сутыкненне палачан і ноўгарадцаў з мечаносцамі, У. Перцаў стварыў вобраз драматычнага ваеннага процістаяння Полацкага княства напору нямецкіх захопнікаў. Гісторык пісаў, што "пасля паяўлення нямецкіх рыцараў на лівонскай зямлі паміж імі і рускімі князямі, валодаўшымі Полацкай зямлёй, пачаліся бесперапынныя сутычкі, часта пераходзіўшыя ў крывавыя бітвы", "асабліва энергічна абаранялі свае землі" князі Вячка і Усевалад, Полацк так і "не здаўся немцам"[58], і да т. п.

І ў наступныя дзесяцігоддзі Тэўтонскі ордэн і Прусія належалі да галоўных накірункаў навуковай працы У. Перцава[59], прызнанага першым аўтарытэтам у беларускай медыявістыцы. Аднак незалежна ад таго, колькі часу прайшло пасля вайны, яго погляды нязменна характарызавала тая ж антынямецкая перадузятасць, што была ўласцівай ужо раннім публікацыям вучонага і паглыбілася ў гады барацьбы з гітлераўцамі[60].

Пасля вайны пра нямецкую агрэсію пачаў пісаць і Майсей (Міхаіл) Грынблат, супрацоўнік акадэмічнага Інстытута гісторыі, які ў сектары этнаграфіі і фальклору заняўся тэмай адлю-

[56] Перцаў В. Утварэнне Тэўтонскага ордэна. С. 153, 154. Пар.: Фёдараў І. Тэўтонскі ордэн і прусы // Беларусь. 1946. № 5–6. С. 85–87.

[57] Перцаў В. Барацьба палачан і ноўгарадцаў супраць нямецкіх агрэсараў у XIII ст. С. 55.

[58] Тамсама. С. 57, 58.

[59] ЦНА НАН Беларусі. Ф. 3. Асабісты фонд акадэміка У. Перцава. Воп. 1. № 4. Гл. таксама: Перцаў У. Барацьба старажытнай Прусіі з нацiскам Германіі і Польшчы ў X–XIII вяках // Вучоныя запіскі БДУ. 1948. Сер. гіст. Вып. 6. С. 78–102; ён жа. Захват и заселение Бранденбургской марки немцами // Ученые записки БГУ. 1950. Сер. ист. Вып. 10. С. 183–209. Апрача названых публікацый убачыла свет яшчэ некалькі артыкулаў вучонага, прысвечаных старажытнай Прусіі.

[60] Так, напрыклад, гісторык імкнуўся паказаць большую рэакцыйнасць нямецкага абсалютызму параўнальна з англійскім і французскім і ўласцівую яму захопніцкую палітыку. Гл.: Перцев В. Германия в XVIII в. Минск, 1953. С. 22–23, 27–29, 33.

стравання барацьбы з іншаземнымі захопнікамі ў беларускім фальклоры. Яго першыя публікацыі таксама напоўнены эмацыйнай антынямецкасцю. Між тым, у якасці беларускіх "слядоў" змагання са "спрадвечным ворагам славян – нямецкімі заваявальнікамі" М. Грынблат назваў толькі курганы на Гарадзеншчыне, званыя ў народзе "крыжацкімі могілкамі"[61], якія ў сапраўднасці не могуць служыць такім сведчаннем. Паколькі аўтар наогул не знайшоў ніякіх матэрыялаў, датычных барацьбы з рыцарамі, то ён быў вымушаны апавядаць пра розных чужаземных захопнікаў – татарскіх, польскіх, шведскіх, французскіх, толькі не пра нямецкіх.

Наступная праца М. Грынблата прысвячалася наогул толькі немцам: даследчык апублікаваў гістарычна-фальклярыстычны нарыс пра апісанне "немцаў-захопнікаў" у фальклоры славянскіх народаў[62]. Нягледзячы на тое, што гады суровай вайны даўно завяршыліся перамогай, публікацыя аказалася наскрозь прасякнутай агрэсіўнай ваеннай рыторыкай і панславісцкім духам[63]. Да ўсяго, у ёй давалася характарыстыка немцам наогул, бо не было ніякага размежавання паміж "захопнікамі" і нямецкім народам. Аўтар сабраў фальклор ваенных гадоў і сцвярджаў, што ў ім гістарычны "вобраз немца-захопніка" і "вобраз фашыста – грабежніка і забойцы – зліты ў адно". З падабраных ім дражнілак, выслоўяў, прыказак, казак і іншых фальклорных помнікаў розных эпох, пераважна расійскіх ды польскіх, створаны вобраз сапраўдных нелюдзяў. Напэўна такой і была мэта публікацыі, бо М. Грынблат скончыў заключэннем, што для славян "слова *немец* зрабілася брыдкім словам і сінонімам злой сілы"[64]. Пры гэтым ён палічыў магчымым сцвярджаць, што сканструяваны ім фальклорны вобраз немцаў "праўдзівы"[65].

Падобная антынямецкая настроенасць навукоўцаў мела эмацыйную прыроду, абумоўленую нядаўна перажытай вайной з нацысцкай Нямеччынай, што лёгка зразумець. З часам погляды

[61] Грынблат М. Адлюстраванне ў фальклоры барацьбы нашага народа з іншаземнымі захопнікамі // Беларусь. 1946. № 5-6. С. 45.

[62] Грынблат М. Славянскія народы аб немцах-захопніках // Весці АН БССР. Аддзяленне грам. навук. 1947. № 1. С. 82–96.

[63] Аўтар акадэмічнага артыкула пісаў у прапагандысцкім стылі ваенных часоў: "Асобая нянавісць да разбойніцкай Германіі здаўна гарыць у сэрцах славянскіх народаў", і гэта "свяшчэнная нянавісць" да "спрадвечнага ворага" і г. д.

[64] Грынблат М. Славянскія народы аб немцах-захопніках. С. 95.

[65] Тамсама. С. 83.

даследчыкаў натуральным чынам мусілі станавіцца больш рацыянальнымі, інтэлектуальна кантраляванымі. Праўда, у навуковым дыскурсе, калі не лічыць разгледжаныя вышэй акадэмічныя нарысы, тэма барацьбы з Нямецкім ордэнам знікла больш чым на дзесяцігоддзе. У гэтай сувязі асабліва сімптаматычным выглядае факт таго, што і 550-я гадавіна славутай бітвы была цалкам праігнараваная афіцыйнай навукай Мінска. Публікацыі гісторыкаў у навуковай перыёдыцы за 1960 г. прысвячаліся самым розным тэмам[66], але не Грунвальдскай бітве, якая адзначалася ў суседзяў.

Адна з першых спробаў больш узважанага навуковага асвятлення ваеннай канфрантацыі з Нямецкім ордэнам была звязана з выданнем гістарычнага нарыса "Полацк", падрыхтаванага калектывам супрацоўнікаў Інстытута гісторыі да 1100-годдзя горада[67]. Найдаўнейшае мінулае Полацка даследаваў Георгій Штыхаў, які нямала месца прысвяціў "гераічнай барацьбе" палачан з нямецкімі крыжаносцамі. Трактаванне гэтай барацьбы ў нарысе ўжо цалкам адпавядала новаму тэзісу аб "пралетарскім інтэрнацыяналізме і сацыялістычным патрыятызме": Полацк вёў яе разам з лівамі і латышамі, палачане "абаранялі свае землі і дапамагалі суседнім народам і плямёнам" абараняцца ад Ордэна мечаносцаў – "разбойніцкай ваенна-феадальнай дзяржавы". Перад чытачом паўставала перспектыва смяротнай небяспекі: нямецкія заваёўнікі разглядалі Прыбалтыку як плацдарм для "націску на ўсход", узвялі крэпасці на мяжы Полацкай зямлі і "бесперапынна імкнуліся пашырыць свае ўладанні за кошт усходніх зямель"[68]. З'явілася і персаніфікацыя гераізму – удзельнік бітвы на Няве Якаў Палачанін, пахвалены Аляксандрам Неўскім за адвагу[69].

Удзел Полацка ў абароне ад заходніх заваёўнікаў цяпер, аднак, ужо не абмяжоўваўся эпізодамі першай паловы XIII ст., а пераходзіў у наступную эпоху, якую разглядаў Сцяпан Шчарбакоў, аўтар юбілейнай газетнай публікацыі пра Грунвальд. Раней гісторык спецыялізаваўся на вывучэнні морадоў Беларусі XVII ст., так

[66] Напрыклад, у акадэмічных "Весцях" за 1960 г. было апублікавана ажно 4 артыкулы пра сялянскі ды рабочы рух, разглядалася і тэма вайны, але не Вялікай, а Паўночнай! Гл.: Парфёнаў І. Удзел беларускага народа ў Паўночнай вайне // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. 1960. № 1.
[67] Полоцк. Исторический очерк / под ред. И. С. Кравченко и Н. В. Каменской. Минск, 1962.
[68] Тамсама. С. 15.
[69] Тамсама. С. 16.

што тэма абароны ад крыжаносцаў была для яго новай і, напэўна, патрабавала часу для засваення. Але ў той жа час яна была яму вельмі блізкай эмацыйна, бо гісторык удзельнічаў у вайне з фашысцкай Нямеччынай, што не магло не адбіцца на ўспрыманні немцаў. У яго параграфе пра падзеі XIII – пачатку XV ст. "жорсткая барацьба з нямецкай феадальнай агрэсіяй" пададзена настолькі важным фактарам жыцця гаражан, што вынесена ў яго назву[70]. Адносіны Полацка з Рыгай канца XIII ст., што былі і застаюцца таямнічымі для гісторыкаў з-за адсутнасці крыніц, аўтар звязаў у адно з памежнымі канфліктамі палачан з Інфлянцкім ордэнам XIV ст., атрымаўшы суцэльны працэс вайны "славян і літоўцаў" супраць захопнікаў-крыжаносцаў, якая дасягнула кульмінацыі ў XV ст. Паказальным уяўляецца акцэнтаванне "баявой садружнасці беларускага, рускага, літоўскага і польскага народаў", якое адпавядала ідэалагічным установкам. Пералічаныя народы "адзіным фронтам" выступілі супраць крыжаносцаў і пад Грунвальдам, дзе яны, разграміўшы Ордэн, "надоўга прыпынілі экспансію нямецкіх псоў-рыцараў у славянскія землі"[71].

Сцяпану Шчарбакову належыць і першы ў Беларусі асобны навуковы артыкул, прысвечаны тэме барацьбы беларускага народа супраць агрэсіі нямецкіх ордэнаў[72]. Публікацыя ўбачыла свет толькі ў сярэдзіне 1960-х г., калі палітычны клімат вызначаўся халоднай вайной. У той грамадска-палітычнай сітуацыі ад гісторыка патрабавалася, як вядома, не столькі аб'ектыўнае даследаванне, колькі пошук матэрыялаў для гатовых тлумачальных схем – акурат такое ўражанне стварае артыкул С. Шчарбакова. Развіваючы тэзісы, выказаныя ў нарысе пра "Полацк", ён фактычна перанёс уяўленне пра "баявое адзінства" народаў у апошняй вайне на адносіны сярэднявечных часоў. У артыкуле пафасна гаворыцца пра стагоддзі "барацьбы беларускага народа супраць германскай агрэсіі, якую ён вёў у баявым адзінстве і брацкай садружнасці з рускім і прыбалтыйскімі народамі". Адкрыта прызнана і прызначэнне гэтага тэзіса: маўляў, беларускія гісторыкі-нацыяналісты "проціпастаўляюць беларускі народ рускаму", пішуць пра "непрымірымую варожасць" паміж імі, тады

[70] Тамсама. С. 22–30.
[71] Тамсама. С. 29–30.
[72] Шчарбакоў С. А. Барацьба беларускага народа супраць нямецкай агрэсіі ў XIII–XV ст. // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. 1966. № 1. С. 60–69. Артыкул У. Перцава ў "Бальшавіку Беларусі" (1945) быў усё ж не зусім навуковым і прысвячаўся толькі падзеям першай паловы XIII ст.

як у сапраўднасці гэтыя брацкія народы разам вялі барацьбу супраць нямецкіх агрэсараў[73].

Паставіўшы на мэце паказаць "адзінства і садружнасць свабодалюбівых народаў", С. Шчарбакоў мусіў не толькі звязваць разнастайныя прыклады ваенных канфліктаў з рыцарамі розных эпох у адзін працэс, але і пайсці на скажэнні ды замоўчванні вядомых фактаў. Перамога Аляксандра Неўскага на Чудскім возеры цяпер стала ў яго трыумфам салідарнасці – яна, маўляў, "была падрыхтавана ўпартай барацьбой палачан, ноўгарадцаў, пскавічоў і прыбалтыйскіх народаў..."[74]. Немцы-крыжаносцы паўстаюць на старонках артыкула "настойлівымі і хітрымі ворагамі", якія нападалі і на Беларускае Падзвінне, і на Панямонне, таму Полацкай і Гродзенскай землям пагражала "небяспека быць заняволенымі", або ўмешваліся ва ўнутрыпалітычную барацьбу ў ВКЛ. Гісторык ні разу не згадаў выпадкаў, калі рыцараў запрашалі і выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах самі ўдзельнікі гэтай барацьбы. Вось толькі адзін паказальны прыклад. Ацаніўшы абарону Полаччыны князем Андрэем Полацкім у 1370-я г. як паспяховую, аўтар змаўчаў пра тое, што той жа князь у 1385 г. сам перадаў Полацкае княства магістру Інфлянцкага ордэна ў сюзерэннае валоданне, стаўшы яго васалам. З улікам гэтага факта прыход на Полаччыну інфлянцкіх рыцараў, якіх паклікаў на дапамогу князь Андрэй у канфлікце з Ягайлам у 1386 г., нельга было б расцэньваць як звычайную агрэсію немцаў[75]. Цяжка паверыць, што гэтыя акалічнасці засталіся невядомыя С. Шчарбакову, паколькі яны асвятляліся не толькі ў ранейшых выданнях крыніц[76], але і ў зборніку дакументаў, падрыхтаваным тым жа Інстытутам гісторыі[77]. І прыкладаў падобнага абыходжання з фактамі ў артыкуле нямала. Найверагодней, аўтару проста давялося падаць такое асвятленне падзей, якое адпавядала палітычным устаноўкам таго часу.

Нас цікавіць, аднак, не столькі навуковасць апісання падзей, колькі надзяленне іх сімвалічнай вартасцю. Дык вось Грунвальдская бітва, хоць яна фігуруе як развязка "вышэйшага напружання" барацьбы з нямецкай агрэсіяй, у цэлым заняла ў С. Шчарба-

[73] Шчарбакоў С. А. Барацьба беларускага народа... С. 61.
[74] Тамсама. С. 65.
[75] Тамсама. С. 67–68.
[76] Skarbiec dyplomatów papiezkich, cesarskich, królewskich, książęcych / zebr. I. Daniłowicz. T.1. Wilno, 1860. № 509. С. 256–257; № 523. С. 260–261.
[77] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII в. Минск, 1959. № 28. С. 93.

кова ў тры разы менш месца, чым апісанне барацьбы палачан з мечаносцамі. Аўтару відавочна важней было артыкуляваць яе гістарычнае значэнне, якое прэзентавалася ім з новымі тэзісамі. Пра тое, як перамога "спыніла агрэсію нямецкіх феадалаў супраць польскіх, літоўскіх, беларускіх і рускіх зямель" і што яна "садзейнічала кансалідацыі сіл славянскіх народаў", ужо шматразова пісалася. Гісторык жа падкрэсліў, што выйграная бітва спрыяла эканамічнаму развіццю польскіх, літоўскіх і беларускіх зямель, паскарала працэс іх кансалідацыі і нават "садзейнічала працэсу фарміравання беларускай народнасці", бо барацьба з нямецкай феадальнай агрэсіяй, маўляў, была "народна-вызваленчай"[78].

Прыкладна праз дзесяцігоддзе тэма ваеннай канфрантацыі з Нямецкім ордэнам аказалася ў фокусе ўвагі піянерскай на той час працы археолага Міхаіла Ткачова пра абарончае дойлідства заходніх зямель Беларусі. Характарызуючы эпоху з'яўлення мураваных умацаванняў і асабліва разглядаючы замкі-кастэлі, ён неаднакроць звяртаўся да сюжэтаў абароны ад нямецкіх рыцараў. За інтэрпрэтацыямі аўтара выразна адчуваецца ўплыў класічнай на той час працы У. Пашуты пра ўтварэнне ВКЛ[79], некаторыя тэзісы якой (у прыватнасці, пра ўдзел беларусаў у барацьбе нароўні, "плячо ў плячо", з народамі Прыбалтыкі, як і пра ўклад гэтай барацьбы ў міжнародны нацыянальна-вызваленчы рух)[80] лёгка пазнаюцца ў кнізе беларускага археолага. Адзначаючы і паспяховыя дзеянні ВКЛ супраць рыцарскай дзяржавы, М. Ткачоў таксама пісаў, што нямецкія рыцары "не пакідалі надзей захапіць землі Літвы і Беларусі", а Ордэн пры гэтым "пагражаў фізічным знішчэннем цэлым народам"[81]. Гісторык, праўда, не ўдакладняў, ці пагроза такога знішчэння навісала і над беларускім народам, інакш гэта быў бы першы прыклад увядзення ў навуковы дыскурс тэзіса аб смяротнай небяспецы для Беларусі з боку крыжаносцаў, публіцыстычна выказаны ў 1945 г. Ф. Канстанцінавым на хвалі антынямецкай эмацыйнай узбуджанасці. У тагачасных замежных даследаваннях ужо паказвалася, што Нямецкі ордэн у пачатку XV ст. больш не мог уяўляць для ВКЛ той небяспекі, якая зыходзіла ад яго да Крэўскага пагаднення 1385 г., але для савецкай

[78] Тамсама. С. 69.
[79] Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. Москва, 1959. С. 398–426.
[80] Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII – XVIII ст. Мінск, 1978. С. 14–15.
[81] Тамсама. С. 26–27.

навукі яны быццам не існавалі. Не выпадкова і ў кнізе М. Ткачова канфрантацыя ВКЛ і Ордэна пададзена пераважна як працэс сталай экспансіі крыжаносцаў, як іх няспынныя набегі на беларускія і літоўскія землі, што проста вымагалі рэваншу. Таму ВКЛ і Польшча з канца XIV ст. рыхтаваліся да разгрому Тэўтонскага ордэна і ў 1410 г. перамаглі яго аб'яднанымі сіламі. Затое значэнне перамогі аўтарам вызначана ўзважана і спакойна: яна "прыпыніла агрэсію нямецкіх феадалаў супраць насельніцтва зямель" ВКЛ і паспрыяла іх эканамічнаму развіццю[82].

У цэлым апісанне беларускімі гісторыкамі агрэсіі Тэўтонскага ордэна наогул і бітвы пад Грунвальдам у прыватнасці трымалася асноўных тэзісаў савецкай інтэрпрэтацыйнай схемы, прыведзенай у адпаведнасць з ідэяй "сацыялістычнага інтэрнацыяналізму", і да канца 1980-х гадоў не зведала істотных зменаў. Згадаем, што ў агульнасаюзнай канцэпцыі Грунвальдская бітва сімвалізавала гістарычнае адзінства ўсходнеславянскіх народаў у барацьбе супраць знешніх захопнікаў. І менавіта так яна была прадстаўлена ў агульным выданні акадэмічных гісторыкаў УССР і БССР: "Супольная барацьба народаў супраць захопнікаў знайшла праяву ў бітве пад Грунвальдам 1410 г. <...> Войска Тэўтонскага ордэна было разгромлена, а нямецкая феадальная экспансія на Усход – спынена"[83].

Пра пэўную кананізаванасць вобраза бітвы пад Грунвальдам сведчыць, у прыватнасці, тое, што ў перапрацаванай версіі акадэмічнага нарыса "Полацк", які выходзіў праз чвэрць стагоддзя (!) пасля яго першага выдання, апісанне бітвы, дадзенае С. Шчарбаковым у 1962 г., не змянілася ні на ёту[84]. Экспануючы агрэсію нямецкіх рыцараў, гістарыяграфія БССР развівала галоўным чынам эпізод барацьбы Полацка з крыжаносцамі, уведзены ў майстар-наратыў яшчэ ў 1940 г. У параўнанні з ім бітва пад Грунвальдам заставалася другараднай падзеяй. Невыпадкова барацьбе з мечаносцамі, па аналогіі з Лядовым пабоішчам, прысвячаліся асобныя навуковыя артыкулы, тады як Грунвальд не трапіў у загалоўкі спецыяльных публікацый беларускіх гісторыкаў да самага канца савецкай эпохі.

[82] Тамсама. С. 40–41.

[83] Исторические корни дружбы и единения украинского и белорусского народов / отв. ред. Ю. Кондуфор. Киев, 1978. С. 36.

[84] Гл.: Полоцк. Исторический очерк / АН БССР; редкол.: П. Петриков (отв. ред.). Минск, 1987. С. 31–32. Пар.: Полоцк. Исторический очерк. Минск, 1962. С. 29–30.

## 8.3 Тэма крыжаносцаў у гістарычнай адукацыі і асвеце

Больш чым тры дзесяцігоддзі пасля вайны гістарычныя факультэты Беларусі не мелі сваіх падручнікаў і выкарыстоўвалі ў дыдактычных мэтах акадэмічныя нарысы. Першы навучальны дапаможнік па гісторыі Беларусі для студэнтаў вышэйшай школы ў БССР, напісаны выкладчыкамі гістарычных факультэтаў БДУ і Мінскага педінстытута, з'явіўся толькі ў 1981 г.[85]. Яго канцэптуальныя пазіцыі, у тым ліку прапорцыі і акцэнты асвятлення тэмы нямецкай экспансіі, прадвызначаліся, вядома ж, шматтамовай акадэмічнай гісторыяй. Барацьбе палачан з мечаносцамі ў дапаможніку таксама прысвечаны асобны параграф і яна апісана значна паўней, чым Грунвальдская бітва, пададзеная як фрагмент знешняй палітыкі[86]. Перамога над Ордэнам паказана як поспех салідарнай барацьбы супраць агульнага ворага, пры гэтым у манеры, традыцыйнай для ваеннай публіцыстыкі, адзначалася маральная перавага саюзнікаў, паколькі яны "змагаліся за сваю радзіму". У ацэнцы гістарычнага значэння перамогі гаварылася не толькі аб "прыпыненні экспансіі ў славянскія землі", што на той час было агульнапрынятым. Аўтар раздзела Мікалай Гнеўка ўказаў на небяспеку занявольвання нямецкімі захопнікамі не толькі Польшчы і ВКЛ, але і Беларусі, ад якой краіну выратаваў Грунвальд[87]. На тыя часы акцэнтаванне падобнай лёсаноснасці бітвы 1410 г. было яшчэ выключна рэдкім для беларускай гістарыяграфіі. Прыкметнай навацыяй яна стала і ў кантэксце дакументальных матэрыялаў, падабраных для вывучэння гісторыі на гістарычных факультэтах рэспублікі. Выдадзеная крыху раней хрэстаматыя для вышэйшай школы ўтрымлівала тэксты, якія ілюстравалі толькі барацьбу князёў Заходняй Русі з літоўцамі і ўсталяванне ўлады літоўскіх феадалаў, а фрагмент хронікі Длугаша спатрэбіўся толькі для азнаямлення з заключэннем Крэўскай уніі як пачаткам інтэрвенцыі каталіцызму[88].

[85] История БССР. Учеб. пособие для вузов / под ред. В. В. Чепко, А. П. Игнатенко. Ч. 1. Минск, 1981.

[86] Тамсама. С. 58–60, 91–92.

[87] Тамсама. С. 92.

[88] Гл.: Хрестоматия по истории Белоруссии: с древнейших времен до 1917 г.: учеб. пособие для ист. фак. вузов республики / сост. А. П. Игнатенко, В. Н. Сидорцов. Минск, 1977. С. 21–24.

У школьным навучанні гісторыі, нягледзячы на распрацоўку акадэмічнага дыскурсу пра Грунвальд, гэтая тэма з'явілася на два дзесяцігоддзі пазней. Да 1960 г. школьных падручнікаў па айчыннай гісторыі ў БССР наогул не існавала, хоць праца над стварэннем такога выдання, у якім сцісла выкладалася б гісторыя Беларусі "ў цеснай сувязі з агульнай гісторыяй народаў СССР", вялася з канца 1940-х гадоў[89]. Першы дапаможнік для сярэдняй школы "Гісторыя БССР" быў напісаны калектывам аўтараў на чале з Лаўрэнціем Абэцэдарскім на канцэптуальнай аснове аднайменнага акадэмічнага двухтомніка. Барацьбе супраць чужаземных захопнікаў у XIII ст. у ім адводзіўся асобны параграф, дзе найбольш расказвалася пра змаганне жыхароў заходніх земляў Русі з нямецкімі рыцарамі і перамогі над імі[90]. Функцыянальнае прызначэнне прыкладаў "гераічнай барацьбы" было тое ж, якое прапісалі "Тэзісы" 1948 г.: маўляў, напады чужаземных захопнікаў аслабілі Русь, і гэта выкарысталі літоўскія князі, каб падпарадкаваць сабе яе заходнія землі. Гэтым і абмяжоўваўся аповед пра агрэсію крыжаносцаў. Цяпер гэта можа выклікаць здзіўленне, але ў першай версіі дапаможніка па гісторыі для сярэдніх школ сапраўды адсутнічала хоць якая-небудзь згадка пра Грунвальдскую бітву. Нічога не паведамлялася пра яе і вучням васьмігадовых школ, для якіх з 1961 г. выдаваўся скарочаны варыянт названага вышэй падручніка[91], што амаль пазбаўляў даўнюю гісторыю краіны канкрэтных імёнаў і падзей, зводзячы яе асвятленне да патрэбных інтэрпрэтацыйных схем.

Гэтаксама ў першай хрэстаматыі па гісторыі Беларусі, змест якой, зразумела, мусіў адпавядаць канцэпцыі падручніка, па тэме нападаў нямецкіх рыцараў змешчаны толькі фрагмент хронікі Германа Вартберга пра паходы Ордэна на Полацк у першай палове XIV ст.[92]. Факт, які заслугоўвае асаблівай увагі. Бо, як адзначалася вышэй, міфалагізаваная падзея ўжо была ўклю-

[89] ЦНА НАН Беларусі. Ф. 3. Воп. 1. № 118; Мацэпура М. Е. Асноўныя задачы Акадэміі навук БССР у 1949–1950 гг. // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. 1949. № 1. С. 21; Козлов А. Научно-исследовательская работа Института истории Академии наук Белорусской ССР // ВИ. 1950. № 8. С. 157–158.

[90] История БССР: Учеб. пособие для учащихся средней школы / Л. С. Абецедарский, М. П. Баранова, Н. Г. Павлова. Минск, 1960. С. 27–30.

[91] Гісторыя БССР: вуч. дап. для вучняў VII–VIII класаў васьмігадовай школы / М. П. Баранава, Н. Г. Паўлава. Мінск, 1961.

[92] Хрестоматия по истории БССР. Ч. 1 / сост. Е. М. Зуев и З. Ю. Копысский. Минск, 1961. С. 11.

чана ў праграму курса гісторыі Беларусі для вышэйшай школы яшчэ перад пачаткам вайны, а потым і ў 1949 г. І толькі праз дзесяцігодзе, у 9-м выданні школьнага дапаможніка "Гісторыі БССР" да параграфа пра ВКЛ як "дзяржаву літоўскіх феадалаў" быў дададзены адзіны абзац: "Утварэнне Вялікага княства Літоўскага садзейнічала паспяховай барацьбе славян і літоўцаў супраць агрэсіі нямецкіх рыцараў. У 1410 г. пад Грунвальдам нямецкія рыцары былі разгромлены..."[93]. Тым не менш у дапаможных выданнях для навучання гісторыі Беларусі бітва пад Грунвальдам па-ранейшаму не лічылася абавязковай[94].

Падобная маргіналізацыя Грунвальдскай бітвы ў гістарычнай адукацыі ў БССР падаецца не выпадковай. Калі ў канцы 1950-х гадоў, пасля стварэння двухтамовага нарыса, беларускія гісторыкі пачалі выдаваць шматтамовы зборнік дакументаў і матэрыялаў, разлічаны і на выкарыстанне для мэтаў адукацыі, то тэмы Грунвальда ў ім... не аказалася! Парадаксальна, але ў том, прысвечаны гісторыі даўняй Беларусі[95], яго складальнікі не ўключылі ніводнага дакумента пра Грунвальд! Згадаем, што не было такіх крыніц і ў першым зборніку дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі, выдадзеным у 1936 г. Рэдактары новага выдання праілюстравалі тэму "агрэсіі нямецкіх феадалаў" тэкстамі пра падзеі XIII–XIV ст., уключыўшы ў том і фрагменты хронікі Яна Длугаша, аднак не пра Вялікую вайну. Сюжэт пра Грунвальд адсутнічае і ў наступным (апошнім) савецкім зборніку дакументаў па гісторыі Беларусі[96], але там ён і не чакаўся, паколькі мэтай выдання было паказаць "барацьбу народных масаў супраць сацыяльнага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту". А вось факт абмінання бітвы 1410 г. у зборніку "Беларусь у эпоху феадалізму", які тэматызаваў палітычныя адносіны з заходнімі суседзямі, цяжка лічыць выпадковасцю, не звязанай з пэўнай канцэптуальнай пазіцыяй яго складальнікаў.

Хоць пасля 1970 г. адзіны падручнік па гісторыі БССР з перавыдання ў перавыданне сцісла паведамляў чытачам пра сечу 1410 г., у сярэдняй школьнай адукацыі, у адрозненне ад універ-

[93] История БССР: Учеб. пособие для учащихся средних школ / Л. С. Абецедарский, М. П. Баранова, Н. Г. Павлова. Минск, 1970. С. 30.

[94] Пар.: Гнеўка М. Р. Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах. Дакастрычніцкі перыяд. Мінск, 1979. С. 24–30.

[95] Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов: в 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII в. Минск, 1959. № 18, 26, 27, 35.

[96] Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии: конец XIV в. – 1648 г.: сборник документов и материалов. Т. 1. Минск, 1988.

сітэцкай, Грунвальду не прыпісвалася вялікага значэння. Пра перамогу гаварылася як пра факт разгрому нямецкіх рыцараў славянамі і літоўцамі[97], не звязваючы з ім змены лёсу народаў. А ў пачатковых класах пра бітву і не згадвалі. Вучняў там не знаёмілі нават з агрэсіяй нямецкіх ордэнаў у XIII ст., хоць пра “мангола-татарскую навалу” ім расказвалі досыць падрабязна[98].

Сітуацыя прыкметна змянілася ў разгар перабудовы, калі ў шырокіх колах грамадства ўзрастала незадаволенасць афіцыйнай версіяй гісторыі. Калі перагляд старых інтэрпрэтацыйных схем стаў непазбежны, улады санкцыянавалі выпуск абноўленага школьнага падручніка па гісторыі БССР[99]. І хоць асвятленне барацьбы супраць чужаземных захопнікаў у XIII ст. у ім не змянілася (як галоўныя ворагі Русі тут зноў фігуруюць крыжаносцы, наступленне якіх у глыб Русі спыніў Полацк як “передавая апора на шляху нямецкай агрэсіі”, і зноў “знясіленыя барацьбой” з Ордэнам заходнія землі Русі сталі лёгкай здабычай літоўскіх князёў[100]), але Грунвальд атрымаў значна больш увагі. Замест ранейшага абзаца ў выкладанне палітычнай гісторыі быў уведзены асобны “ліхтарык” “Разгром Тэўтонскага Ордэна пад Грунвальдам”[101]. Праўда, гэта не азначала глярыфікацыі падзеі. Кароткае, досыць узважанае апісанне бітвы не без традыцыйнага ўслаўлення стойкасці смаленскіх палкоў завяршалася канстатацыяй канчатковага заняпаду Ордэна і сакраментальнай фразай “Нямецкая агрэсія была спынена”.

Як можна рэзюмаваць, з падзеі, што ў міжваенны перыяд займала досыць маргінальнае месца ў гісторыяпісанні савецкай Беларусі, пасля 1945 г. бітва пад Грунвальдам пастунова ператварылася ў агульнае месца гераічнага мінулага беларускага народа і яго барацьбы з іншаземнымі захопнікамі спачатку ў акадэмічнай гістарыяграфіі БССР, а пазней і ў гістарычнай адукацыі. У 1970-я г. яна прэзентавалася ў досыць стандартызаваным вобразе, асноўныя ідэі якога зводзіліся да наступнага:

- Тэўтонскі ордэн быў фарпостам шматвекавой нямецкай агрэсіі на Усход, супраць славян і літоўцаў;

[97] Пар.: Гісторыя БССР: Вуч. дап. для вучняў сярэдняй школы / Л. С. Абэцэдарскі, М. П. Баранава, Н. Г. Паўлава. Мінск, 1974. С. 30.

[98] Вольскі В. Старонкі нашай гісторыі. Кніга для чытання па гісторыі Беларусі ў пачатковай школе. Мінск, 1966. С. 24–27.

[99] Гісторыя БССР: Падручнік для 8–9 класаў сярэдняй школы / М. П. Баранава, Э. М. Загарульскі, Н. Г. Паўлава. Мінск, 1989.

[100] Тамсама. С. 42.

[101] Тамсама. С. 56–57.

- Пад Грунвальдам нямецкіх рыцараў разграмілі аб'яднаныя сілы Польшчы і ВКЛ, у якія акрамя палякаў і літоўцаў уваходзілі беларускія, украінскія і рускія харугвы;
- Перамога спыніла (або перапыніла[102]) агрэсію нямецкіх феадалаў на Усход, а таксама садзейнічала эканамічнаму развіццю зямель Беларусі і (што адзначалася радзей) фармаванню беларускай народнасці.

Яшчэ зусім зрэдку дадаваліся галасы гісторыкаў, якія прыпісвалі Грунвальду ролю выратавання Беларусі ад занявольвання нямецкімі захопнікамі, і яны яшчэ не вызначалі агульных поглядаў. Перамогу часам прадстаўлялі як адзін з этапаў спынення палітыкі "Дранг нах Остэн", якая быццам ажыццяўлялася з XII ст., пакуль у 1945 г. канчаткова не пацярпела крах[103]. Але ў цэлым, нягледзячы на адчувальны ўплыў антынямецкай прапаганды ваеннага ўзору, пераемнасць паміж экспансіяй Тэўтонскага ордэна і нападам Гітлера ў навуковай і навучальнай літаратуры не пастулявалася. Гаворачы пра значэнне перамогі пад Грунвальдам, як у акадэмічных нарысах і падручніках, так і ў энцыклапедычных выданнях БССР на першае месца з 1970-х г. і да канца савецкай эпохі выносілася спыненне агрэсіі нямецкіх рыцараў (ці "феадалаў") на Усход, што адпавядала агульнасавецкаму вобразу Грунвальдскай бітвы[104], аформленаму ў 1960-я г. Падабенства з русацэнтрычнай канцэпцыяй гісторыі выяўлялася і ў тым, што бітва пад Грунвальдам яшчэ заставалася ў цяні гераічнай барацьбы Полацка з крыжаносцамі ў XIII ст. Сімптаматычнай можна лічыць адсутнасць тэкстаў пра Грунвальд у зборніках дакументаў і хрэстаматыях па гісторыі Беларусі для школьнай адукацыі.

Нягледзячы на тое, што ў гісторыяпісанні і гістарычнай адукацыі славутая бітва атрымала намнога большае месца, чым раней, у свядомасці большасці грамадзян БССР яна яшчэ не функцыявала. Да шырокіх колаў грамадства вобразы Грунвальда магла данесці толькі мастацкая літаратура і гістарычная публіцыстыка.

[102] Часта гаварылася аб "прыпыненні" нямецкай агрэсіі, паколькі тэзіс пра яе "спыненне" ўваходзіў у супярэчнасць са сцвярджэннямі пра шматвяковы "Дранг нах Остэн".

[103] Пар. цытаваны вышэй артыкул А. Зубар "Дранг нах Остэн".

[104] Згадаем, што і ў адпаведных артыкулах галіновых савецкіх энцыклапедый найбольшым значэннем перамогі прызнавалася "спыненне агрэсіі" на Усход, хоць Ордэн наўпрост не атаесамляўся з немцамі наогул. Пар.: Малиновский А. Грюнвальдская битва 1410 г. // СИЭ. Т. 4. Москва, 1963. Стлб. 860–861; Киселев В. Грюнвальдская битва 1410 г. // СВЭ. Т. 3. Москва, 1977. С. 66–67.

## 8.4 Услаўленне перамогі ў публіцыстыцы і белетрыстыцы

*Секліся аддана*
*З ворагам славяне...*
Янка Сіпакоў[105]

Калі ў міжваенны перыяд у творах беларускіх пісьменнікаў можна было сустрэць у асноўным антыпольскія матывы, то пасля перажытай акупацыі і ваенных пакутаў месца галоўных ворагаў у іх натуральным чынам занялі немцы (нацыянал-сацыялісты, фашысты ў аналізаваных тэкстах звычайна атаесамляюцца з немцамі наогул). Матыў нянавісці да акупантаў, да гітлераўскай Нямеччыны – досыць частая з’ява ў ваеннай паэзіі і прозе беларускіх аўтараў, пагатоў калі яны ваявалі на франтах ці ў складзе партызанскіх фармаванняў. Аднак артыкуляванне ідэі аб генетычнай пераемнасці паміж нямецка-фашысцкімі захопнікамі і сярэднявечным Ордэнам ды выкарыстанне сімвалічнага вобраза Грунвальда сустракаецца ў іх вельмі рэдка. Адным з нямногіх паэтаў, які ў такім сэнсе звяртаўся да гісторыі, быў Пятрусь Броўка. У паэме “Беларусь”, створанай у 1943 г., ён пісаў:

*Дзяды нашы білі драпежнікаў прускіх,*
*Не даўшы надзець на сябе кайданы –*
*Пад Грунвальдам білі, на возеры Чудскім,*
*Там разам з украінскім братам і рускім*
*Сваю Беларусь баранілі яны*[106].

Ідэя ўсходнеславянскага братэрства, асабліва ўпамінанне перамогі Аляксандра Неўскага, – усё гэта можа ўказваць на засвоенасць паэтам таго вобраза “псоў-рыцараў”, які мэтанакіравана пашыраўся антынямецкай прапагандай тых часоў (гл. 6.4). У паэме сустракаюцца і прыклады дэманізацыі немцаў. Нянавісць да акупантаў перапаўняла паэта, калі ён пісаў:

[105] Сіпакоў Я. Славянскія балады. Мінск, 1988. С. 154.
[106] Броўка П. Выбраныя творы. Мінск, 1945. С. 137.

*Зямля Беларусі! Не знала ты горшых,*
*Як немцаў-бандытаў, чужынцаў-звяроў...*
<...>
*Дык будзьце пракляты на вечныя векі,*
*Нямеччыны лютай забойцы-сыны...*[107].

Раней ужо адзначалася, што да II сусветнай вайны беларускія паэты практычна не звярталіся да тэмы крыжаносцаў як ворагаў. Цяпер жа і тэўтонскія рыцары – уяўленыя палітычныя папярэднікі гітлераўцаў – ужо ўключаліся ў шэраг чужаземных захопнікаў, якія квапіліся на Беларусь:

*Тут шаблі крышылі французы, тэўтоны, і шведы і ляхі*[108].

Уплыў прапаганды аб гітлераўцах як прадаўжальніках тысячагадовага нямецкага "Дранг нах Остэн" своеасабліва выявіўся ў вершы Паўлюка Пранузы "Фрыдрых II". Прайшоўшы ў баях усю вайну, паэт вобразна апісаў, што павінен адчуваць кароль Фрыдрых Вялікі, якога лічылі сваім героем пакаленні немцаў, у тым ліку нацыянал-сацыялісты: на п'едэстале помніка ў цэнтры Берліна стваральніку моцнай Прускай дзяржавы павінна быць сорамна ад таго, што палкі Чырвонай Арміі

*У яго патомкаў безсумленных*
*Аружжа выхапілі з рук...*[109].

Аднак яшчэ раз адзначым, такіх прыкладаў у беларускай літаратуры той эпохі зусім мала. І ў публіцыстыцы страшэнны вобраз Тэўтонскага ордэна, створаны І. Фёдаравым па свежых перажываннях вайны, тых драпежных нямецкіх рыцараў, якія знішчылі народ прусаў[110], больш не выкарыстоўваўся. Савецкая літаратура Беларусі да сюжэтаў даўняй ваеннай гісторыі звярталася наогул зрэдку, найчасцей жа распрацоўвала тэму партызанскай барацьбы або змагання супраць сацыяльнага пры-

[107] Тамсама. С. 140, 147.
[108] Броўка П. Выбраныя творы. С. 146.
[109] Пранузa П. Фрыдрых II // Полымя. 1946. № 1. С. 76.
[110] Фёдараў І. Тэўтонскі ордэн і прусы // Беларусь. 1946. № 5–6. С. 87: "Большасць насельніцтва была знішчана, а рэшта зрабілася ўжо сапраўды вечнымі рабамі".

гнёту[111]. Падобная сітуацыя была ў іншых сферах мастацкай культуры. Напрыклад, у оперным мастацтве БССР гераічна-патрыятычная тэматыка хоць і краналася, але творы прысвячаліся гераізму савецкай эпохі, найчасцей – Вялікай Айчыннай вайне[112].

Атаесамленне немцаў з тэўтонскімі рыцарамі сярод пасляваенных пакаленняў беларусаў і стаўленне да іх як да ворагаў не магло не пашырацца пад уплывам славутага рамана Генрыка Сянкевіча "Крыжакі". Да масавага чытача ў БССР гэты твор даходзіў галоўным чынам праз шматразовыя рускамоўныя выданні пачынаючы з 1950 г., а ў 1983 г. на рускай мове яго выпусцілі і ў Мінску. У суправаджальных тэкстах да выданняў тых дзесяцігоддзяў нязменна падкрэслівалася, што Г. Сянкевіч адлюстраваў у творы "гістарычную праўду" і што ён "з выключнай сілай і праўдзівасцю" паказаў прадстаўнікоў Тэўтонскага ордэна, для якіх "адзіным запаветам была жорсткасць". Паказальна, што ў прадмове да выдання сталінскай эпохі (1950) І. Горскі яшчэ папракаў польскага пісьменніка ў недаацэнцы "ролі іншых славянскіх войскаў"[113], затое пазней каментатары ўжо павінны былі ўлічваць новую палітыку партыі і прыпісваць пісьменніку-пазітывісту погляды інтэрнацыяналіста! Маўляў, праслаўляючы гераізм палякаў, Г. Сянкевіч "з вялікай павагай піша пра мужнасць рускіх, украінцаў, беларусаў, чэхаў і прадстаўнікоў іншых народаў..." – сцвярджаў ва ўступе В. Абалевіч[114]. Водгук ваенных настрояў чытаўся і ў прадмове вядомага славіста Іллі Міллера да маскоўскага выдання 1960 г. Расійскі вучоны таксама напісаў, што ў рамане пісьменнікам створаны "гістарычна праўдзівы" вобраз польскай дзяржавы XIV–XV ст. – тых часоў, калі ў свядомасці польскага народа "барацьба не на жыццё, а на смерць з Тэўтонскім ордэнам становіцца непазбежнай і справядлівай". Са слоў расійскага славіста, тэўтонскія рыцары ўвасаблялі далёкіх продкаў арміі Гітлера, якая праз шэсцьсот гадоў тварыла на польскай зямлі яшчэ боль-

[111] Пар.: Беларуская балада / склад. Я. Саламевіч. Мінск, 1978.

[112] Пар.: Кулешова Г. Героико-патриотическая тема в белорусской опере // Коммунист Белоруссии. 1965. № 1. С. 62–65.

[113] Сенкевич Г. Крестоносцы / пер. с польск., послесл. И. Горского. Москва, 1950. С. 752–753.

[114] Сенкевич Г. Крестоносцы / пер. с польск. Э. Вагодской; вступ. статья В. Оболевича. Москва, 1959. С. 18–19.

шыя злачынствы[115]. Так у грамадскай свядомасці надалей сцвярджалася ідэя пераемнасці паміж Ордэнам і нямецкім фашызмам. І нягледзячы на тое, што міжнародная сітуацыя ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе з пачатку 1970-х г. мянялася, перавыданні рамана "Крестоносцы" суправаджаліся практычна той жа прадмовай аўтарытэтнага маскоўскага навукоўцы, вытрыманай у стылі халоднай вайны[116].

У беларускай літаратуры творцам высокамастацкай гістарычнай прозы, параўнальным з Сянкевічам, стаў Уладзімір Караткевіч. Характэрна, што да сюжэтаў барацьбы з нямецкімі рыцарамі ён звяртаўся пераважна на раннім этапе творчасці. Спачатку яго натхніла гісторыя абароны Піленаў. Па яе матывах ужо ў 1950 г. была напісана гістарычная мініяцюра (апублікаваная толькі нядаўна[117]), якая вобразна ўзнаўляе гераічную барацьбу абаронцаў славутай цвердзі ў кантэксце Белай Русі. Да прыкладу Піленаў і вобраза зламысных крыжакоў паэт яшчэ неаднакроць звяртаўся ў вершах 1950-х г., напамінаючы і пра знішчаную імі мову ды культуру прусаў[118]. Тады ж была напісана і гераічная драма "Млын на Сініх Вірах" пра жыццё беларускага мястэчка пад нямецкай акупацыяй, у якой пісьменнік ці не ўпершыню пасля вайны актуалізаваў бітву пад Грунвальдам, увёўшы яе ў кантэкст супраціўлення фашыстам. Яна фігуруе тут у размове мясцовага жыхара з гітлераўцам, а таксама ставіцца ў адзін шэраг з абаронай Піленаў і бітвай супраць татараў пад Крутагор'ем як прыклад гераіз-

[115] Сенкевич Г. Крестоносцы / пер. Е. Егоровой; предисл. И. Миллера. Москва, 1960. С. 11–12: "Кляймуючы варварства тэўтонскіх рыцараў, Сянкевіч не мог і ўяўляць, што праз чатыры дзесяцігоддзі пасля з'яўлення яго рамана нашчадкі разбойніцкага ордэна... у сваёй нянавісці да польскага народа пераўзыдуць тое, што тварылі на польскай зямлі крыжаносцы шэсць стагоддзяў назад".

[116] Пар.: Сенкевич Г. Крестоносцы. Москва, 1985. С. 5–6, 10.

[117] Гл.: Караткевіч У. Збор твораў: у 25 т. Т. 3. Мінск, 2014. С. 50–60, "Письмо из развалин Пиллен". Шчыра дзякую Анатолю Вераб'ю, кансультацыі якога дапамаглі арыентавацца ў апублікаванай спадчыне таленавітага беларускага творцы.

[118] Напрыклад, "Ода Радзіме" (1955), "Балада пра сто гарэхаў-свістуноў" (1957), "Балада пра Вячка, князя людзей простых" (1957), "Паэма пра явар і каліну" (1986). Гл.: Караткевіч У. Збор твораў: у 25 т. Т. 1. Мінск, 2012. С. 247–248, 330–334; Т. 3. Мінск, 2014. С. 50–60.

му і нязломнасці Айчыны, пад якой аўтар са сваімі героямі разумеў тады савецкую краіну[119].

У пару сваёй сталай творчасці У. Караткевіч амаль не кранаў тэму барацьбы з Ордэнам. Толькі ў нарысе "Зямля пад белымі крыламі" (1977) пісьменнік зноў успамінае Грунвальд, апісваючы мінулае Гродна. Тут ён падае бітву як "расплату" за паходы крыжаносцаў, што пагражалі беларускаму народу лёсам прусаў[120]. Адораны творца, якога за абуджэнне цікавасці да нацыянальнай гісторыі параўнаюць з Вальтэрам Скотам, успрыняў Грунвальд і тэўтонскіх рыцараў у тым вобразе, які быў сканструяваны Вялікай Айчыннай вайной. Ідэалагічнаму клімату 1950-х г. яшчэ цалкам адпавядала і яго панславісцкая наладаванасць. "Грунвальд знішчыў агульнага ворага славян", – зазначыў у тым жа нарысе У. Караткевіч[121]. Але, заўважым, хоць беларускі майстар гістарычнай прозы называў Г. Сянкевіча сваім любімым пісьменнікам, сам ён не прысвяціў вялікай бітве ніводнага асобнага твора.

У наступнае дзесяцігоддзе ў БССР не назіралася ніякіх прыкмет большай увагі ці росту цікавасці да старадаўняй падзеі. Паказальна, што іх не было і ў гады непрацяглай "адлігі", калі ў Мінску паспела выйсці нямала публікацый, у якіх аспрэчвалася афіцыйная версія асвятлення гісторыі Беларусі эпохі ВКЛ. Наватарскія на той час артыкулы, што рэгулярна з'яўляліся на старонках часопіса "Полымя" ў 1964–66 г., тэматызавалі звычайна пытанні даўняй беларускай культуры, мовы і літаратуры, зрэдку – палітычнай гісторыі, але пра Грунвальд у іх тады яшчэ нічога не пісалі.

Без спецыяльнага даследавання можна толькі гадаць, чым была выклікана новая цікавасць беларускіх пісьменнікаў да сярэднявечнай бітвы – уплывам Сянкевіча ці каго іншага? Нам уяўляецца, што пэўную ролю выканалі і прыклады суседняй Літвы, дзе толькі пасля 1960 г. пачаў афармляцца літоўскі міф Грунвальда: тэма грунвальдскай бітвы ўвайшла ў афіцыйнае гісторыяпісанне, а назва "Жальгірыс" стала папулярызавацца ў творах літоўскай літаратуры, у культуры

[119] Караткевіч У. Збор твораў: у 8 т. Т. 8, кн.1: П'есы, нарыс. Мінск, 1990. С. 353, 377.

[120] Тамсама. С. 478–479.

[121] Тамсама. С. 503.

і спорце[122]. У кожным разе толькі з 1970-х г. беларускія творцы мастацкага слова пачалі адзін за другім звяртацца да тэмы Грунвальда. І адным з першых бітву ўславіў Янка Сіпакоў, які прысвяціў Грунвальду адну са сваіх славянскіх балад[123]. Паэт паказаў сечу акурат у стылі польскага пісьменніка-раманіста, – як выступ прыгнечаных славян супраць фанабэрыстых немцаў-крыжакоў, праўда, не суадносячы яе з лёсамі Беларусі. У яго мастацкім уяўленні у той вырашальнай бітве

*Секліся аддана*
*З ворагам славяне.*

Калі ж славяне разбілі ворага, то выявілі, што

*А ў вазах схавана*
*Ланцугі звінелі:*
*Іх "дарыць" славянам*
*Крыжакі хацелі.*

Верагодна, натхнёны гэтым вершам, сваю патрыятычную баладу пра бітву пад Грунвальдам праз нейкі час напісаў і Леанід Дайнека (яго твор прысвечаны Янку Сіпакову)[124]. Паэт вобразна перадаў думкі-мроі беларуса, які браў удзел у бітве, але загінуў ад цяжкага мяча тэўтонскага рыцара і ляжыць, паміраючы, на полі сечы:

*Я на полі Грунвальдскім стаяў*
*Пяты з краю ў харугві Мсціслаўскай.*
*З мечам, з дзідай, з бацькоўскаю славай*
*Я на полі Грунвальдскім стаяў.*

[122] Petrauskas R., Staliūnas D. Die drei Namen der Schlacht. S. 128f.; Nikžentaitis A., Mikailienė Ž. Litewski Žalgiris, polski Grunwald. S. 13.

[123] Сіпакоў Я. Грунвальд. Балада ўсіх славян. XV стагоддзе // ён жа. Веча славянскіх балад. Мінск, 1973. С. 120–122. Янка Сіпакоў перажыў у вайну асабістую трагедыю: гітлераўцы закатавалі яго бацькоў. Магчыма, гэта таксама паўплывала на зварот да тэмы.

[124] Дайнека Л. Грунвальдская балада // ён жа. Мая вясна саракавая: вершы. Мінск, 1979. С. 70–71.

У вялікай бітве шмат палегла, але герой балады ўсцешыны тым, што

*Мы зламалі хрыбетнік тэўтонам.*

Аўтар успрымаў сечу як падзею, ад якой залежала жыццё ці смерць беларусаў, і недвухсэнсоўна падкрэсліў выратавальнае значэнне перамогі, здабытай дзякуючы многім ахвярам:

*На крывавым Грунвальдскім полі*
*Памірае змагар-беларус.*
*Вы, наступнікі, будзеце жыць!*

Падобныя прысвячэнні Грунвальду ў БССР эпохі застою заставаліся ўсё ж вялікай рэдкасцю. Толькі з сярэдзіны 1980-х гадоў, фактычна ў гады перабудовы, калі на фоне незадаволенасці афіцыйнымі версіямі гісторыі ўзрастала цікавасць да мінулага сярод шырокіх масаў, прага да перагляду старых схем, "адкрыцця" новай гісторыі і запаўнення "белых плям" вывела Грунвальд на адно з цэнтральных месцаў у гістарычнай свядомасці беларусаў. Праўда спачатку, і гэта варта адзначыць, калі акадэмічныя гісторыкі былі вымушаны пайсці на адкрытыя дыскусіі з грамадскасцю па найбольш спрэчных тэмах, у рэпертуары тагачасных "круглых сталоў" не знайшлося ні тэмы даўняй нямецкай экспансіі наогул, ні канкрэтна бітвы пад Грунвальдам: важнейшымі ў тых умовах аказаліся, па савецкай завядзёнцы, рэвалюцыя, стварэнне БССР, акупацыя і асабліва актуалізаванае тады пытанне беларускай сімволікі[125].

Для абуджэння гістарычнай свядомасці наогул і асабліва папулярызацыі Грунвальда яшчэ напярэдадні перабудовы больш за ўсіх зрабіў пісьменнік Канстанцін Тарасаў. Славутай бітве была прысвечана першая ж яго кніга

[125] У цэнтры дыскусій 1988–1989 г. апынуліся найперш такія тэмы, як паходжанне беларусаў і першыя дзяржавы на землях Беларусі, шляхі ўтварэння ВКЛ і яго характар, нацыянальная сімволіка і нацыянальна-вызваленчы рух, БНР і БССР, Вялікая Айчынная вайна і беларускія нацыяналісты пад акупацыяй. Пар.: На скрыжаванні думак: Вучоныя аб "белых плямах" гісторыі Беларусі / склад. Я. І. Бараноўскі. Мінск, 1990.

"Дзень рассеяння" [126]. Характэрна, што ў рэцэнзіі на выданне Мікола Ермаловіч, вядомы ў Беларусі гісторык-самавук, які вызначаўся нонканфармісцкімі поглядамі, таксама актуалізаваў знаёмыя, але напаўзабытыя ідэі: ён лічыў Грунвальд пераломнай падзеяй "двухвекавой барацьбы славянскіх народаў з нямецкай агрэсіяй", з тэўтонцамі, якія прыносілі падпарадкаваным народам толькі "поўнае знішчэнне і анямечванне"[127]. Наступная кніга К. Тарасава "Памяць пра легенды"[128] стала бестселерам сярэдзіны – другой паловы 1980-х г. Пішучы на дакументальна-гістарычнай аснове, пісьменнік па-майстэрску перадаваў атмасферу мінулага, умеў распальваць цікаўнасць і весці чытача за сабою. У названую кнігу ўвайшло і эсэ "Пагоркі Грунвальда"[129], у якім рэалістычна рэканструявалася перадгісторыя сутыкнення і сама бітва, а таксама давалася яе гістарычная ацэнка. (Прыкладна ў той самы час над тэмай працаваў мастак Гаўрыла Вашчанка, які ў 1984 г. стварыў манументальную карціну "Грунвальдская бітва".)

Трэба прызнаць, што пісьменнік К. Тарасаў аказаўся дапытлівым і асцярожным даследчыкам, які дзеля свайго твора перачытаў нямала крыніц і спецыяльных навуковых даследаванняў. У пачатку эсэ ён назваў шэраг гісторыкаў, з працамі якіх азнаёміўся, прызнаючы гіпатэтычны характар многіх іх версій, і з усіх спецыялістаў да найбольш глыбокіх даследчыкаў Грунвальда залічыў Стэфана М. Кучыньскага з яго ўжо вядомай кнігай пра "Вялікую вайну"[130]. Улічыўшы гэта, лягчэй зразумець, чаму супрацьстаянне ВКЛ і Тэўтонскага ордэна ў беларускага пісьменніка паказана намнога больш драматычным і вызначальным, чым пра гэта раней пісалася ў навуковых і навучальных выданнях. Нагадаем, што грун-

[126] Тарасов К. День рассеяния. Минск, 1980. Пад назвай "Погоня на Грюнвальд" аповесць выйшла ў часопісе "Нёман" (1980, № 4 і 5).

[127] Ермаловіч М. На гістарычным пераломе // ЛіМ. 1980. 17 кастр. С. 6.

[128] Гл. першае выданне кнігі на рускай мове: Тарасов К. Память о легендах: Белорусской старины голоса и лица. Минск, 1984.

[129] Тамсама. С. 35–54, "Холмы Грюнвальда". У выданні на беларускай мове: Тарасаў К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны. Мінск, 1990. С. 77–96: "Пагоркі Грунвальда".

[130] Тарасов К. Память о легендах. С. 37; ён жа. Погоня на Грюнвальд. Минск, 1991. С. 280, 286.

тоўная праца польскага гісторыка С. М. Кучыньскага[131], на той час найбольш аўтарытэтная з вядомых і даступных у Мінску, стваралася ў канцы 1950-х гадоў, і яе аўтар кіраваўся тэзісам аб адвечнай польска-нямецкай варожасці (гл. раздзел V.2).

У адрозненне ад некаторых гісторыкаў К. Тарасаў аргументаваў свой тэзіс аб смяротнай пагрозе для Беларусі з боку рыцараў, з якой ён выводзіў непазбежнасць генеральнай бітвы. Мэтай Ордэна з'яўлялася "поўная асіміляцыя народаў захопленых тэрыторый", – напісаў К. Тарасаў, таму беларусаў і літоўцаў чакала такая ж доля, як славянскія плямёны бодрычаў і люцічаў ці прусаў, ад якіх засталося толькі імя[132]. Нагадаем, што лёс прусаў быў далёка не такі трагічны. У кожным разе вынікі сучасных даследаванняў абвяргаюць стэрэатыпнае ўяўленне аб іх поўным знішчэнні, якое пашыралася славянафільскім гістарыяпісаннем з XIX ст.

Канстанцін Тарасаў прызнаваў, што для Ордэна важнай была найперш Жамойць, але, на яго думку, захопніцкія планы тэўтонцаў гэтым не абмяжоўваліся. І далей пісьменнік спасылаўся на дамову Нямецкага ордэна з венгерскім каралём Жыгімонтам Люксембургскім з 1392 г., якая прадугледжвала сумесную вайну з мэтай падзелу тэрыторый Польскага каралеўства і ВКЛ, пры якім Ордэну перайшла б не толькі Літва і Беларусь, але нават Пскоў і Ноўгарад Вялікі. Таму разгром ордэнскай дзяржавы быў, маўляў, "неадкладнай задачай", "жыццёва неабходнай патрэбай літоўцаў, беларусаў і палякаў" [133].

Як ужо адзначалася вышэй, менавіта С. М. Кучыньскі пісаў пра планы Ордэна заваяваць і ўсходнеславянскія землі, але польскі гісторык так і не даказаў гэтага, бо не мог знайсці патрэбных дакументальных сведчанняў. Нешта падобнае атрымалася з названай дамовай 1392 г. аб планаваных падзелах[134]. Яна сапраўды існавала, праўда, яе аўтарам быў Жыгі-

[131] Kuczyński S. M. Wielka wojna z Zakonem Krzyżackim w latach 1409–1411. Wyd. 2. Warszawa, 1960.

[132] Тарасов К. Память о легендах. С. 35.

[133] Тарасов К. Память о легендах. С. 36–37; ён жа. Погоня на Грюнвальд. С. 279.

[134] Польскі гісторык таксама пісаў пра план падзелу Польшчы, распрацаваны Жыгімонтам Люксембургскім у 1392 г. Гл.: Kuczyński S. M. Wielka wojna... S. 10, спас. 1.

монт Люксембургскі, а ў якасці контрагентаў праект уключаў не толькі венгерскага караля і вялікага магістра Ордэна. Праўда, маючы ў распараджэнні толькі пасярэднія крыніцы, даследчыкі даўно ўзгоднена гавораць аб планаваным падзеле толькі земляў Польшчы. Аднак галоўнае ў тым, што сам праект адразу ж праваліўся з-за пазіцыі вялікага магістра, і вось з якой прычыны: той пабойваўся канфлікту з Польшчай і не давяраў венгерскаму каралю[135]. Так што для земляў тагачаснай Беларусі згаданая дамова ў кожным разе не магла ўяўляць ніякай небяспекі.

Пішучы пра "жыццёвую патрэбу" разгрому Ордэна, беларускі пісьменнік знаходзіўся пад моцным уплывам поглядаў С. М. Кучыньскага, паверыўшы яго навуковаму аўтарытэту. У гэтым сэнсе толькі недаўменне могуць выклікаць сцвярджэнні І. Марзалюка, быццам К. Тарасаў у сваім эсэ пра Грунвальд "поўнасцю паўтарыў ацэнкі М. Каяловіча, А. Барбашова і Д. Даўгялы"[136]. Большай недарэчнасці, чым зводзіць яго ўспрыманне падзеі да ўзораў інструменталізацыі бітвы ў панславісцкім дыскурсе царскай Расіі, цяжка прыдумаць.

Асноўным матывам напісанага К. Тарасавым пра Грунвальд было ўсё ж вяртанне памяці, а не антынямецкая салідарнасць славянскіх народаў. Агульнаславянскай ідэі ён наогул спецыяльна не акцэнтаваў, а ствараў беларускі патрыятычны вобраз Грунвальда. Па прызнанні аўтара, беручыся рэканструяваць падзеі на Грунвальдскім полі, ён кіраваўся «не ўміленнем перад "слаўным мінулым", а пачуццём удзячнасці тым невядомым ваярам Беларусі і Літвы, чые ахвяраваныя жыцці і сёння, праз шэсць вякоў служаць захаванню народа»[137]. Гістарычнае значэнне перамогі пісьменнік вызначыў лаканічна і вобразна: пасля Грунвальда пяць стагоддзяў, "да 1914 г. на землі Беларусі і Літвы не ступала нага ўзброенага немца". Больш за тое, напрыканцы эсэ ён сімвалічна звязаў гады 1410, 1914 і 1941[138], недвухсэнсоўна паставіўшы

[135] Пар.: Nowak Z. H. Polityka północna Zygmunta Luksemburgskiego do roku 1411. Toruń, 1964. S. 51–58; Baczkowski K. Projekty rozbiorów państw suwerennych w późnym średniowieczu i u początku doby nowożytnej. Kraków, 2001. S. 8–9.

[136] Гл.: Бумблаускас А., Марзалюк І., Черкас Б. Грюнвальдска битва – битва народів. Київ, 2010. С. 137.

[137] Тарасаў К. Памяць пра легенды. С. 286.

[138] Тарасов К. Память о легендах. С. 35, 54.

тэўтонскіх рыцараў у адзін шэраг з нямецкімі акупантамі XX ст. Так неспадзявана ўспрыманне сярэднявечных рыцараў у вобразе папярэднікаў кайзераўскіх жаўнераў і нацыянал-сацыялістаў, сканструяванае для мабілізацыі сілаў у барацьбе супраць Гітлера, вярталася пакаленням беларусаў, якія не перажылі вайны.

Няма сумненняў, эсэ К. Тарасава "Пагоркі Грунвальда" і яго раман "Пагоня на Грунвальд", дзякуючы таленту пісьменніка і незвычайнаму росту цікавасці да гісторыі ў эпоху перабудовы, значна папулярызавалі тэму Грунвальда ў шырокіх колах грамадства[139], а многія дзякуючы ім упершыню даведаліся пра такую падзею. Невыпадкова з другой паловы 1980-х гадоў сярэднявечная бітва пачала займаць усё большае месца ў гістарычнай свядомасці беларусаў як вялікая падзея іх гісторыі, як перамога, якой варта ганарыцца. Паказальна, што менавіта К. Тарасаву прысвяціў сваю песню пра гэтую бітву беларускі бард Сяржук Сокалаў-Воюш, песню, якая адразу стала папулярнай сярод моладзі.

*Няхай яны крычаць, што з імі Бог,*
*А з намі – Беларуская Зямля! –*

услаўляў малады паэт гераізм беларускіх воінаў у патрыятычным вобразе Грунвальда[140].

Як пісьменнік К. Тарасаў трапіў у "дзясятку". Як гісторык – у многім памыляўся, але ён і не быў прафесійна абавязаны дакладна трымацца фактаў. Атрымалася ж, што не толькі аматары мінулага адкрылі для сябе Грунвальд праз творы К. Тарасава. Погляды многіх гісторыкаў на бітву і яе значэнне для Беларусі таксама фармаваліся пад уплывам таго вобраза Грунвальдскай бітвы, які стварыў таленавіты пісьменнік (гл. наступны раздзел).

Другім мастацкім творам, які паўплываў на пашырэнне негатыўнага ўспрымання Нямецкага ордэна ў шырокай беларускай аўдыторыі і атаесамлення крыжаносцаў з папярэднікамі фашыстаў, можна лічыць раман Леаніда Дайнекі "Меч князя Вячкі". Як адзначалася вышэй, названы пісьменнік быў адзін

[139] Агульны наклад беларускіх выданняў К. Тарасава пра Грунвальд склаў 313 тыс.

[140] Сокалаў С. Песня пра Грунвальд // Маладосць. 1987. № 3. С. 65.

з нямногіх творцаў, які звярнуўся да тэмы Грунвальда ў вершы. Свой гістарычны раман Л. Дайнека прысвяціў ранейшым часам – барацьбе Полацкага княства з рыцарамі-мечаносцамі. Калі адважыцца на аналогіі, то гэты твор стаў свайго роду беларускімі "Крыжакамі". Апублікаваны ў 1985 г. у часопісе "Маладосць", ён затым пяць разоў выходзіў у свет у кніжным варыянце (у 1987, 1990, 1993, 2000 і 2006 г.). Анатацыя да кнігі, быццам перадавіца "Славян" у гады вайны, абвяшчала чытачам, што тэма рамана "вельмі актуальная", а "твор прасякнуты ідэяй аб неабходнасці яднання славянскіх народаў, а таксама іх бліжэйшых суседзяў – літоўцаў, латышоў, эстонцаў, для таго, каб процістаяць ворагам"[141].

Яшчэ выразней паралель з ваеннымі часамі праведзена Міколам Ермаловічам у станоўчай рэцэнзіі на часопісную публікацыю рамана. Адзін з найбольш папулярных на той час беларускіх гісторыкаў адзначыў актуальнасць тэмы і назваў "вельмі дарэчным" тое, што раман Л. Дайнекі пра змаганне з нямецкімі рыцарамі выйшаў менавіта ў "юбілейную гадавіну Вялікай Перамогі над гітлераўскай Германіяй і ў 575-ю гадавіну перамогі пад Грунвальдам". Бо, патлумачыў далей М. Ермаловіч, у апублікаваным творы "чытач знойдзе вытокі таго гераізму, якія з асаблівай сілай выявіў беларускі народ у гады Вялікай Айчыннай вайны супроць фашысцкіх заваёўнікаў, што вялі свой крывавы радавод ад нямецкіх крыжакоў"[142].

На жаль, застаецца адкрытым пытанне, якім шляхам у М. Ермаловіча сфармаваліся падобныя ўяўленні пра сярэднявечныя карані "крывавага радаводу" нацыянал-сацыялістаў. Не выключана, што ён пераняў іх (ці прызнаў іх праўдзівасць) праз Купалу, якога высока цаніў і ўспрымаў як нацыянальнага прарока. У кожным разе ў познесавецкія часы, характарызуючы гістарычныя погляды паэта, М. Ермаловіч не проста цытаваў Купалавы выказванні пра Полацк і Грунвальд, апублікаваныя ў 1941 г. (гл. пачатак раздзела), а бачыў у іх сведчанне таго, што быццам народны паэт "правільна вызначыў рухаючыя сілы, якія прывялі братнія народы да перамогі ў Грунвальдскай бітве 1410 г.", ды яшчэ і напамінаў усім, што "традыцыі бараць-

[141] Дайнека Л. Меч князя Вячкі: Раман. Мінск, 1987.

[142] Ермаловіч М. Пераадольваючы цяжкасці [рэц. на раман Л. Дайнекі "Меч князя Вячкі"] // ЛіМ. 1985. 7 чэрв. С. 7.

бы з нямецкімі заваёўнікамі жылі на працягу ўсёй гісторыі беларускага народа..."[143].

Вяртаючыся да рамана Л. Дайнекі, варта дадаць, што праз нейкі час для масавага чытача была выдадзена і яго рускамоўная версія, прадмовай да якой стаў цытаваны вышэй тэкст рэцэнзіі М. Ермаловіча. Так выданне з 150-тысячным накладам (!) праз гістарычныя вобразы, рэалістычна створаныя пісьменнікам, абуджала ў чытача негатыўнае стаўленне, калі не нянавісць да нямецкіх рыцараў-захопнікаў, а ў дадатак вуснамі аўтарытэтнага гісторыка, які ў гады перабудовы займеў народную папулярнасць, быццам адкрывала таямніцу генетычнай сувязі паміж крыжаносцамі і нацыстамі Гітлера[144]. Іншымі словамі, адбывалася рэактывацыя міфа, народжанага антынямецкай прапагандай часоў апошняй вайны.

[143] Конан У., Ермаловіч М. Гістарычныя погляды Янкі Купалы // Янка Купала: Энцыкл. даведнік. Мінск, 1986. С. 156–157.

[144] Ермолович М. Возвращение истории // Дайнека Л. Меч князя Вячки; Тропой Чародея. Минск, 1990. С. 7. Агульны наклад пяці кніжных выданняў рамана "Меч князя Вячкі" склаў 225 тыс. асобнікаў!

Раздзел 9

# Міф выратавальнай бітвы ў суверэннай Беларусі

## 9.1 Першыя святкаванні Грунвальда і спробы ўвядзення традыцыі

*Грунвальд – сярод найгалоўнейшых падзей нашай гісторыі.*
Уладзімір Арлоў[1]

Галоснасць і абумоўлены ёю пачатак дыскусій пра мінулае радыкальна змянілі месца Грунвальда ў гістарычнай памяці Беларусі. Адмаўленне ад савецкіх сімвалічных каштоўнасцяў і ўмацаванне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці не магло адбывацца ў кантэксце ранейшай, афіцыйнай гісторыі[2]. Патрабавалася мадыфікацыя вобразаў мінулага і новая ацэнка ролі беларусаў у гісторыі. У канцы 1980-х г. пра бітву пад Грунвальдам як слаўную падзею ведалі ўжо дастаткова шырокія колы грамадскасці, і яна добра пасавала для аслаблення русацэнтрычнай савецкай ідэнтычнасці з аднachасовым самасцвярджэннем Беларусі і запаўнення таго эмацыйнага вакууму, які адчуваўся пасля развітання з савецкасцю. Так што пры агульным уздыме цікавасці да гісторыі круглая каляндарная дата 580-х угодкаў бітвы натуральным чынам стала падставай своеасаблівага выбуху памяці ("успамінання") пра Грунвальд як гераічную падзею свайго мінулага.

Бясспрэчна, 1990 год можна лічыць этапным у гісторыі ўспрымання Грунвальдскай бітвы беларускім грамадствам, бо

[1] Арлоў У. Таямніцы полацкай гісторыі. Мінск, 1994. С. 150.
[2] Пра немагчымасць існавання дзвюх розных калектыўных ідэнтычнасцяў з агульным "гістарычным канонам" гл.: Szpociński A. Kanon historyczny. Pamięć zbiorowa a pamięć indywidualna // Studia Socjologiczne. 1983. № 4. S. 134–135, 139.

тады яна фактычна ўпершыню была ўпісаная ў каляндар гістарычных датаў краіны. Акурат з гэтым годам звязаны шэраг сімвалічных падзей, галоўнай з якіх было тое, што ў сталіцы Беларусі, ва ўмовах адноснай дэмакратызацыі, грамадскасць краіны ўпершыню публічна адзначыла дзень бітвы – яе 580-ю гадавіну.

15 ліпеня 1990 г. у Мінску першы раз адбыліся ўрачыстасці ў гонар Грунвальда. У Кальварыйскім касцёле біскуп Тадэвуш Кандрусевіч адслужыў ранішнюю імшу на беларускай мове, а дзённую правёў у Чырвоным касцёле ксёндз Ян Матусевіч. У Купалаўскім парку адбыўся святочны мітынг, арганізаваны Камісіяй па культуры Вярхоўнага Савета БССР, грамадска-палітычным рухам БНФ "Адраджэнне" і Саюзам мастакоў Беларусі. Прамоўцамі бітва пад Грунвальдам трактавалася як сімвал адстойвання незалежнасці Беларусі. Грамадскасць прыняла зварот да гарадскіх уладаў з прапановай узвесці ў Мінску да 600-годдзя бітвы помнік Грунвальдскай бітве і назваць Грунвальдскай адну з плошчаў ці вуліц сталіцы. Дэпутатамі Вярхоўнага Савета ад фракцыі БНФ быў складзены праект т. зв. "грунвальдскай праграмы", які прадугледжваў штогадовае правядзенне грунвальдскіх урачыстасцяў, навуковых "Грунвальдскіх чытанняў", заснаванне беларускага ордэна Грунвальда, прысваенне імя Грунвальда вуліцам, школам і ўстановам[3].

У той самы час беларуская дэлегацыя, узначаленая вядомым археолагам Міхасём Ткачовым, хоць і неафіцыйная, узяла ўдзел у міжнародных урачыстасцях на Грунвальдскім полі ў Польшчы, што было таксама ўпершыню. Арганізатарамі і спонсарамі паездкі сталі БНФ "Адраджэнне" і ЦК ЛКСМБ. У складзе дэлегацыі былі і дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР Анатоль Лябедзька і Васіль Шачак.

Так у Беларусі закладвалася традыцыя публічнага святкавання перамогі пад Грунвальдам. Вялікая гістарычная падзея ў тую гадавіну быццам вярталася з забыцця. Угодкам гістарычнай бітвы ў 1990 г. была прысвечана цэлая хваля папулярных публікацый у друку[4]. З таго часу беларускія мастакі, паэты

[3] Ядвіга К. Грунвальд – 580 // ЛіМ. 1990. 20 ліпеня. С. 3.

[4] Як прыклад гл.: Тарасаў К. Дзень выратавання // Настаўніцкая газета. 1990. 7 ліпеня. С. 4; Ткачоў М. Беларусь у войнах XI–XVII ст. // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1990. № 7. С. 65–67; Урбановіч У. Наш край і вялікая вайна з крыжакамі // тамсама. С. 69–72; Носевич В. История не терпит пустоты // Парус. 1990. № 8. С. 49, 55;

і празаікі сталі ўслаўляць яе ў сваіх творах[5]. Хоць манументальную карціну бітве яшчэ ў 1985 г. прысвяціў Гаўрыла Вашчанка, публічна маніфеставаць увагу да падзеі на сваіх выставах пачалі мастакі суполкі "Пагоня" пад кіраўніцтвам Аляксея Марачкіна. Сімвалічна, што паэт Рыгор Барадулін дэдыкаваў А. Марачкіну свой верш "Грунвальд", у якім чытаюцца матывы паганска-крывіцкага супраціву крыжакам[6].

Не засталіся абыякавымі да падзеі і беларускія акадэмічныя гісторыкі, якія прысвяцілі юбілею адмысловыя навуковыя чытанні. Так, ужо напрыканцы 1990 г. аддзел гісторыі Беларусі эпохі феадалізму Інстытута гісторыі АН БССР правёў навуковыя чытанні "Народы Усходняй Еўропы ў барацьбе за дзяржаўную незалежнасць. З нагоды 580-годдзя Грунвальдскай бітвы". У часопісе "Спадчына", які надрукаваў фрагменты выступаў некаторых удзельнікаў, віталі гэта, адзначыўшы, што гістарычная навука "паварочваецца абліччам да патрэбаў грамадства"[7].

У 1990 г. "Грунвальдам" была названа газета грамадска-палітычнага руху Беларускі народны фронт "Адраджэнне"[8]. У тым жа годзе бацькоўскі камітэт беларускамоўных класаў г. Мінска стварыў у Дзяржынскім раёне дзіцячы летнік "Грунвальд", у якім прадугледжвалася спалучаць адпачынак дзяцей з іх нацыянальна-патрыятычным выхаваннем[9].

Усё гэта ўспрымалася як вяртанне памяці пра Грунвальд і як "аднаўленне гістарычнай справядлівасці"[10]. Аднак традыцыяй першае святкаванне ўгодкаў Грунвальдскай бітвы ўсё ж не стала. Калі на наступны 1991 год патрыятычная грамадскасць зноў збіралася на набажэнства ў касцёле Св. Роха і зладзіла ўрачысты мітынг у Купалаўскім парку[11], то ў 1993 г. пра чарговыя ўгод-

Летапісная аповесць пра Грунвальдскую бітву. Пераклад і прадмова В. Чамярыцкага // Спадчына. 1990. № 2. С. 30–31.

[5] Падрабязней гл.: Гарбачэўская В. Грунвальдская бітва на старонках мастацкіх твораў // Бібліятэка прапануе. 2010. № 10. С. 25–27.

[6] Барадулін Р. Грунвальд // ён жа. Збор твораў. Т. 2. Вершы. Мінск, 1998. С. 258–259.

[7] Цяжкі шлях да незалежнасці (з гістарычных чытанняў, прысвечаных угодкам Грунвальдскай бітвы) // Спадчына. 1991. № 2. С. 7.

[8] Гл.: Грунвальд. Навіны беларускага Адраджэньня. 1990. № 1–2 (выйшлі толькі два нумары).

[9] Лозка А. "Грунвальд" // БелЭн: у 18 т. Т. 5. Мінск, 1997. С. 463.

[10] Ядвіга К. Грунвальд – 580. С. 3.

[11] Акаловіч Л. Грунвальд, 581-я гадавіна // ЛіМ. 1991. 19 ліпеня. С. 3.

кі Грунвальда ўжо нават не згадвалася[12]. Названы вышэй праект "грунвальдскай" праграмы і прапановы ўдзельнікаў мітынгу 1990 г. так і засталіся пажаданнем. Толькі ў Горадні з'явілася Грунвальдская вуліца ды памятны знак, пастаўлены ў 1990 г. каля Каложы, аднак праз колькі гадоў і ён быў разбураны невядомымі[13].

Пасля абрання прэзідэнтам Беларусі А. Лукашэнкі спробы ператварэння публічнага святкавання Грунвальда ў традыцыю, ініцыяваныя апазіцыяй, сутыкнуліся з супрацьдзеннем афіцыйных уладаў. Дзяржаўныя газеты абыходзілі гадавіну бітвы маўчаннем. Ужо ў 1995 г. грамадскі аргкамітэт па святкаванні 585-й гадавіны Грунвальда, які падрыхтаваў праграму і правёў мастацка-адукацыйнае мерапрыемства ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, не змог ажыццявіць усё запланаванае. Сталічныя ўлады не дазволілі публічна адзначаць угодкі славутай бітвы на праспекце Машэрава. Сабранай на свята патрыятычна настроенай грамадскасці давялося абмежавацца рыцарскім турнірам і выступамі бардаў на беразе Свіслачы[14].

Дэманстрацыйная абыякавасць новых уладаў Беларусі да любой формы ўшанавання Грунвальдскай бітвы і нават стрымліванне грамадскіх ініцыятыў асабліва выразна праявіліся ў 2000 г., калі пра 590-я ўгодкі Грунвальда нагадалі толькі апазіцыйныя газеты[15]. Такое стаўленне дзяржавы да гістарычнай падзеі справядліва выклікала папрокі ў імкненні пазбавіць народ памяці пра тых прашчураў, што аддалі жыццё за вялікую перамогу. Кастусь Тарасаў пісаў пра гэта як пра ганебную недарэчнасць, бо ўлады ўшаноўваюць помнікамі тых, хто забіваў

[12] Шостка В. Грунвальд сьвяткавалі без нас // Свабода. 1993. № 8. С. 7. Між іншага, парламенцкая газета ў "грунвальдскія" дні ў адным з артыкулаў усё ж звярталася да гісторыі, але да дня ўзяцця Бастыліі і вайны 1812 г., а не да бітвы 1410 г. Гл.: Шимов Я. "Судьба Беларуси связана с судьбой Европы" // Народная газета. 1993. 16 ліпеня. С. 3.

[13] Астраўцоў С. Тэўтонскае пытанне застаецца надзённым // Свабода. 1995. № 29. С. 4.

[14] Гл.: Ахрымук М. Менскія ўлады супраць беларускай гісторыі? // Свабода. 1995. № 28. С. 2; І. З. "Пагоня на Грунвальд" // ЛіМ. 1995. 21 ліпеня. С. 2; Вецер А. Памяці герояў Грунвальда // Народная газета. 1995. 18 ліпеня. С. 3.

[15] Матусевіч К. Грунвальд: выклік – і адказ // Свабода. 2000. 14 ліпеня. С. 3; Чаропка В. Грунвальдская бітва // Народная воля. 2000. 14 ліпеня. С. 3..

людзей – Калініна і Дзяржынскага, і пры гэтым сціраюць памяць пра палеглых пад Грунвальдам. Між тым, “не было б Грунвальда – не было б у нас ні ўрада, ні першага прэзідэнта”, – заключаў пісьменнік[16]. За такім стаўленнем уладаў да Грунвальда праглядалася іх боязь гістарычнага сімвала “Пагоні”, забароненай перад тым у выніку праведзенага рэферэндуму: пад сцягамі з выявай “Пагоні” выступала большасць харугваў ВКЛ, якія бралі ўдзел у бітве 1410 г., – нагадваў К. Тарасаў. Пісьменніку, які больш за ўсіх іншых зрабіў для вяртання памяці пра Грунвальд, у 590-я ўгодкі бітвы заставалася толькі выказваць надзею на тое, што “прыйдзе час, калі адпаведным ганаровым чынам будзе ўшанавана і памяць продкаў, і вернецца на сваё заслужанае месца Пагоня”[17].

Нягледзячы на тое, што пачатыя ў 1990 г. святкаванні Грунвальда не ператварыліся ў традыцыю, якая б адлюстроўвала прынятую ў беларускім грамадстве сістэму ідэй і сімвалічных каштоўнасцяў, дзякуючы тым урачыстасцям бітва стала займаць большае месца ў гісторыяпісанні. Пра вялікую перамогу 1410 г. нарэшце пачалі пісаць і беларускія навукоўцы, якія, натхнёныя нацыянальным адраджэннем, спрабавалі пераглядаць многія з ранейшых афіцыйных трактовак айчыннай гісторыі.

Сярод гісторыкаў да тэмы Грунвальда аднымі з першых звярнуліся Міхась Ткачоў і Анатоль Грыцкевіч[18]. Супрацьпастаўленне “мы-групы” моцнаму ворагу належыць да важных кампанентаў канструявання нацыянальнай ідэнтычнасці, таму не выклікае здзіўлення, што ў новых інтэрпрэтацыях мінулага Беларусі гісторыкі імкнуліся падкрэсліць заслугі свайго народа ў барацьбе з Тэўтонскім ордэнам. Пра сярэднявечныя войны гаварылася эмацыйна, з выкарыстаннем простых ацэнак і чорна-белых колераў, уласцівых рамантычнай традыцыі як такой. Пры гэтым ужо ў першых навуковых публікацыях пра Грунвальд была перанятая традыцыя трактавання немцаў як “адвечных ворагаў славянства”, якая выдавала бітву пад Грунвальдам за фатальнае наступства шматвяковай нямецкай агрэсіі. Продкі беларусаў “сваімі грудзьмі засланілі ня-

[16] Тарасаў К. Грунвальд: беларуская памяць // Навіны. 1999. 14 ліпеня. С. 4.

[17] Матусевіч К. Грунвальд: выклік – і адказ. С. 3.

[18] Гл.: Грыцкевіч А. Знешняя палітыка Вітаўта (Заходні накірунак) // Наш Радавод. Кн. 2. Гродна, 1990. С. 172–175.

мецкім рыцарам дарогу на ўсход", – крыжакам, якія з'яўляліся "вялікай трагедяй" і былі спынены толькі ў 1410 г., – казаў у 1990 г. М. Ткачоў[19]. У яшчэ больш змрочнай перспектыве адносіны ВКЛ з Ордэнам паказваў А. Грыцкевіч. "Тэўтонскі ордэн планаваў стварэнне вялікай нямецкай дзяржавы на ўзбярэжжы Балтыйскага мора з уключэннем у яго склад Паўночнай Польшчы, Літвы і большай часткі Беларусі, Пскова і Ноўгарада Вялікага", – сцвярджаў гісторык у навуковым выступе, акцэнтуючы існаванне пастаяннай пагрозы "заняволення літоўскага і беларускага народаў, магчымага іх знішчэння або анямечвання (як прусаў)"[20]. І толькі дзякуючы разгрому Ордэна ў 1410 г., падкрэсліў ён, "пагроза заваявання Беларусі нямецкімі крыжакамі, вынішчэння і анямечвання беларускага народа была ліквідавана"[21].

Гістарычная публіцыстыка і літаратурна-мастацкія выданні маглі дазволіць сабе яшчэ больш дэманізаваныя вобразы ворага. У гэтай сувязі, напэўна, найбольш драматызавана пра "смяротную небяспеку" для Беларусі з боку дзяржавы тэўтонскіх рыцараў гаварылася на старонках публіцыстычнай брашуры этнографа Станіслава Цярохіна "Славутыя адвагай на вайне", прысвечанай 580-годдзю гістарычнай бітвы і выпушчанай у бібліятэцы тыднёвіка "Голас Радзімы".

Як і А. Грыцкевіч, С. Цярохін таксама апісаў планы Ордэна стварыць "Вялікую Тэўтонію", якая нібыта ўключыла б "паўночную Польшчу, Літву, Беларусь, Пскоўшчыну і ўладанні Вялікага Ноўгарада". У выпадку ажыццяўлення гэтых планаў "усходнія славяне, падобна люцічам і бодрычам, прусам і борцям... назаўжды зніклі б з гістарычнай арэны", бо тэўтонцы праводзілі "мэтанакіраваны татальны генацыд"[22].

[19] Ткачоў М. Беларусь у войнах XI–XVII ст. // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1990. № 7. С. 66–67; ён жа. "За няпоўныя сто гадоў – сто сорак крыжацкіх паходаў" // Цяжкі шлях да незалежнасці // Спадчына. 1991. № 2. С. 10.

[20] Грыцкевіч А. Знешняя палітыка Вітаўта. С. 172. Гэтаксама падаецца нямецкая пагроза для беларусаў і літоўцаў у пазнейшым, больш грунтоўным артыкуле даследчыка, у якім перамога пад Грунвальдам зноў ацэньваецца як выратаванне "ад вынішчэння і анямечвання беларускага народа" (Гл.: Грыцкевіч А. Барацьба Вялікага княства Літоўскага і Рускага... С. 39, 49).

[21] Грыцкевіч А. Знешняя палітыка Вітаўта. С. 173.

[22] Цярохін С. Славутыя адвагай на вайне. Да 580-годдзя Грунвальдскай бітвы (1410–1990). Мінск, 1991. С. 13, 16, 17.

Падабенства іх поглядаў на планы Ордэна невыпадковае. Абодва аўтары стваралі свае тэксты пад моцным уплывам неаднаразова прыпаміненага вышэй польскага гісторыка С. М. Кучыньскага[23], пра што сведчыць параўнанне іх тэкстаў. Менавіта апошні ў сваёй манументальнай працы ва ўмовах халоднай вайны з Захадам вызначаў нямецкі *Drang nach Osten* як праграму "стварэння дзяржаў каланіяльнага характару, заснаваных на ўціску і эксплуатацыі славянскага і балцкага элемента, рэальную пагрозу пагібелі Польшчы і Літвы, а магчыма і Чэхіі, і Пскова, і Вялікага Ноўгарада". Гэта ён падкрэсліваў, што калі б ВКЛ засталося адно, без Польшчы, то паўночна-заходнія землі Беларусі ды Чорная Русь "напэўна... падзялілі б лёс прусаў", але такая пагроза "на доўгія вякі спынена пад Грунвальдам"[24].

Запазычанне А. Грыцкевічам і С. Цярохіным з кнігі С. М. Кучыньскага галоўнага тэзіса пра смяротную небяспеку Ордэна для славянскіх дзяржаў і Беларусі ў прыватнасці відаць з параўнання адпаведных абзацаў з іх публікацый у прыведзенай ніжэй табліцы. Чарговы раз падкрэслім, што існаванне падобных планаў Ордэна немагчыма давесці. Указваючы на гэта, Г. Родэ ў свой час папракаў С. М. Кучыньскага ў няведанні (ці ігнараванні) характару ордэнскага панавання ў Інфлянтах і называў прыпісаныя Ордэну планы эклектычным зборам гіпатэтычных намераў розных эпох, які і прысніцца не мог вялікаму магістру[25].

Пры бліжэйшым знаёмстве з публікацыяй С. Цярохіна лёгка заўважыць, што і некаторыя іншыя тэзісы, якія драматызуюць тэму супрацьстаяння з Ордэнам, проста літаральна перанесены аўтарам на гісторыю Беларусі з кнігі С. М. Кучыньскага, – з працы, зноў нагадаем, напісанай у разгар халоднай вайны[26]. У прыватнасці, з названай кнігі, якую С. Цярохін, падобна іншым беларускім аўтарам, залічыў да найлепшых на той час

[23] Kuczyński S. M. Wielka wojna z Zakonem krzyżackim w latach 1409–1411. Warszawa, 1960.

[24] Ibidem. S. 10 (спас. 1), 62.

[25] Rhode G. Polemiken um die Schlacht von Tannenberg 1410 // ZfO. Jg. 22 (1973). Hf. 3. S. 484.

[26] На залежнасць беларускіх поглядаў на Ордэн ад польскай традыцыі і асабліва пазіцый названага гісторыка мне даводзілася ўказваць раней. Гл.: Sahanowicz H. Polska tradycja historiograficzna w białoruskiej wizji Zakonu Krzyżackiego // Kultura polityczna w Polsce. T. VI. Cz. 1. Litwa w polskiej tradycji i kulturze politycznej. Poznań, 2006. S. 22–23.

прац пра Грунвальд[27], узята і сцвярджэнне, быццам перад Вялікай вайной 1409–1411 г. "увесь народ быў прасякнуты нянавісцю да крыжакоў"[28]. Такога, як паказалі сучасныя даследаванні, не было і ў Польшчы, а ў рэаліях тагачаснай Беларусі для шырокага панавання падобных настрояў наогул не існавала ніякіх падстаў.

| **Kuczyński S. M. Wielka wojna z Zakonem krzyżackim S. 10, 62.** | **Грыцкевіч А. Знешняя палітыка Вітаўта. С. 172.** | **Цярохін С. Славутыя адвагай на вайне. С. 16.** |
|---|---|---|
| Мэтай *Drang nach Osten* было "стварэнне дзяржаў каланіяльнага характару, заснаваных на ўціску і эксплуатацыі славянскага і балцкага элемента, рэальная пагроза пагібелі Польшчы і Літвы, а магчыма і Чэхіі, і Пскова, і Вялікага Ноўгарада".<br><br>Ордэн планаваў "стварэнне тэрытарыяльна цэльнай ордэнска-нямецкай дзяржавы над Балтыкай, якая распасціралася б ад вострава Руген да Фінскага заліва. Гэта адначасова азначала б ліквідацыю суседніх славянскіх і балцкіх дзяржаўных арганізмаў". | "Тэўтонскі ордэн планаваў стварэнне вялікай нямецкай дзяржавы на ўзбярэжжы Балтыйскага мора з уключэннем у яго склад Паўночнай Польшчы, Літвы і большай часткі Беларусі, Пскова і Ноўгарада Вялікага". | "Існаваў рэальны план будаўніцтва Вялікай Тэўтоніі ў межах ад вострава Ругена да Фінскай затокі з уключэннем у яе паўночнай Польшчы, Літвы, Беларусі, Пскоўшчыны і ўладанняў Вялікага Ноўгарада". |

Аўтару брашуры не адмовіш у катэгарычнасці патрыятычных трактовак. Ён адзін з першых, хто смела прыпісваў беларусам галоўную заслугу ў спыненні агрэсіі крыжаносцаў. Трэба прызнаць, што маргінальнае месца Грунвальда ў савецкім гісторыяпісанні і традыцыйнае ігнараванне ўдзелу беларусаў у бітве, калі суседзі – палякі, літоўцы і нават рускія – прыпісвалі грунвальдскі трыумф сабе, правакавалі на падобны рэвізіянізм. Аднак у брашуры логіка пераацэнкі заслугаў за-

[27] Аўтар назваў С. М. Кучыньскага "адным з лепшых сучасных даследчыкаў і знаўцаў гісторыі Вялікай вайны". Гл.: Цярохін С. Цыт. твор. С. 39.

[28] Тамсама. С. 33.

надта простая і звязаная з памылковым разуменнем ужыванага канцэпту *Drang nach Osten*. У часы ўзнікнення гэтага выразу і пазней пад "усходам", на які кіраваўся нямецкі "націск", разумеліся землі, закранутыя нямецкай каланізацыяй, г. зн. галоўным чынам тыя абшары, якія цяпер у межах Польшчы. Не ўлічваючы гэтага, С. Цярохін успрыняў "усход" як усходнеславянскія землі, якія для тэўтонскіх рыцараў пачыналіся з Беларусі. Дадаўшы да гэтага ўяўленне пра колькасную перавагу беларусаў сярод насельніцтва ВКЛ, можна зразумець, чаму аўтар вырашыў, што "асноўны цяжар супраціўлення крыжаносцам лёг на плечы беларускага народа". А тое, што такі "гістарычны подзвіг беларусаў дагэтуль не толькі не асветлены і не ацэнены належным чынам, але наогул замоўчваецца"[29], успрымалася як вялікая несправядлівасць і будзіла эмацыйныя перажыванні.

У прадстаўленні Грунвальдскай бітвы С. Цярохіным поруч з беларускім патрыятызмам суседнічаюць панславісцкія матывы савецкага антынямецкага дыскурсу. Перамога ў цэлым прэзентавана ім галоўным чынам як "перамога славян". Тэўтонскі ордэн, які быў разбіты дзякуючы "баявой садружнасці" славян і прыбалтыйскіх народаў, планаваў "мячом і агнём" заснаваць Вялікую Тэўтонію нібыта "на землях славянскіх народаў". Больш за тое, аўтар сімвалічна звязвае перамогу 1410 г. з Лядовым пабоішчам, працытаваўшы "прарочыя словы", якія быццам сказаў Аляксандр Неўскі: "Хто прыйдзе да нас з мячом, той ад мяча і загіне"[30] (на справе, як вядома, словы гэтыя належалі не названаму князю, а стваральнікам любімага Сталіным фільма).

Магутным сродкам папулярызацыі вобразаў і ідэй, сфармуляваных у публіцыстычнай брашуры "Славутыя адвагай на вайне", стала найбольш масавае на той час перыядычнае выданне Беларусі – "Народная газета", якая ў ліпені 1992 г. перадрукавала поўны тэкст брашуры[31]. Так на самую шырокую аўдыторыю быў растыражаваны твор, патрыятычны па сваім характары, аднак насычаны архаічнымі ідэалагемамі з савецка-панславісцкага прапагандысцкага арсенала. І адной з далёка не бясшкод-

[29] Тамсама. С. 14–15, 16.
[30] Тамсама. С. 76.
[31] Гл. "Народную газету" за 15 і 17 ліпеня 1992. Газета ў той час была органам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і друкавалася накладам больш за паўмільёна асобнікаў!

ных ідэй гэтай сумесі, што пастулявалася публікацыяй, стала падкрэсліванне гістарычнай сувязі паміж Тэўтонскім ордэнам і сусветнымі войнамі XX ст. з трагічным вопытам нямецкай акупацыі Беларусі[32].

Трэба адзначыць, што сфармуляваны ў свой час К. Тарасавым тэзіс пра выратавальнасць бітвы для беларусаў і метафарычную "нагу ўзброенага немца", якая пасля Грунвальда не ступала на землі Беларусі да 1914 г., у 1990-я г. стаў агульным месцам гістарычнай ацэнкі легендарнай перамогі. Карыстаючыся ім, ёмка давалі зразумець веліч грунвальдскай перамогі нават вядомыя навукоўцы-гісторыкі, – такія, як А. Грыцкевіч і М. Ткачоў[33], не гаворачы пра папулярызатараў і пісьменнікаў. У гэтым вобразна выявілася ўплывовасць знакавага твора К. Тарасава.

Паказальна, што другі вядомы майстар гістарычнага жанру Уладзімір Арлоў у сваёй літаратурна-мастацкай кнізе пра гісторыю Полацка не стаў сам апісваць бітву 1410 г., а параіў чытачам звярнуцца да аповесці К. Тарасава "Пагоня на Грунвальд" ці яго ж кнігі "Памяць пра легенды": маўляў, там і можна знайсці "самую грунтоўную рэканструкцыю падзей". Пісьменнік пацвердзіў давер да рэкамендаванага твора ўласным прыкладам, паўтарыўшы ацэнку бітвы, дадзеную раней К. Тарасавым: "Разгром Тэўтонскага ордэна ўратаваў беларусаў і летувісаў ад фізічнага вынішчэння, як гэта здарылася, напрыклад, са славянскімі плямёнамі бодрычаў і люцічаў...". А пасля бітвы "ордэн настолькі аслаб, што да першай сусветнай вайны нага ўзброенага немца на беларускія землі не ступала"[34]. У блізкім ці літаральна такім гучанні тэзіс пра выратаванне беларусаў ад страшнага лёсу прусаў паўтараўся і ў шэрагу публіцыстычных артыкулаў абодвух названых пісьменнікаў, прысвечаных Грунвальду[35].

[32] Адзін з галоўных вынікаў бітвы – што "500 гадоў не ступаў тэўтонскі бот на беларускую зямлю". Гл.: Цярохін С. Славутыя адвагай на вайне. С. 77.

[33] Ткачоў М. Беларусь у войнах XI–XVII ст. // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1990. № 7. С. 67.

[34] Арлоў У. Таямніцы полацкай гісторыі. Мінск, 1994. С. 148–50.

[35] Гл.: Арлоў У. Грунвальд 1410 // Беларусь. 1995. № 7. С. 19; Тарасаў К. Грунвальд: беларуская памяць // Навіны. 1999. 14 ліпеня. С. 4. Такі ж самы погляд стаў прапагандавацца і ў гістарычнай публіцыстыцы іншых аўтараў. Пар.: Асіноўскі С. Сумленна прынялі свой лёс... // Беларуская мінуўшчына. 1995. № 3. С. 2.

Падобным чынам ацэньвалася перамога ў гістарычных творах Вітаўта Чаропкі, якія таксама хутка знайшлі дарогу да масавага чытача. Бітва "спыніла шмавяковы наступ нямецкіх феадалаў на славянскія і балцкія землі", яна "выратавала Польшчу, Літву, Жамойць, Аўкштайцію, Русь"[36]. Ідэю пра Грунвальд як "выратаванне ад нямецкай агрэсіі" польскіх, літоўскіх, беларускіх і рускіх земляў аўтар паслядоўна адстойваў і ў публіцыстычных артыкулах, публікаваных у перыёдыцы[37].

Быццам на падмацаванне таго вобраза Грунвальда, які сцвярджаўся ў беларускім патрыятычным дыскурсе пра мінулае, у сталіцы суверэннай Беларусі зноў былі выдадзены "Крыжакі" Г. Сянкевіча – гэтым разам па-беларуску. Як і ў ранейшыя дзесяцігоддзі, раман рэкламаваўся з акцэнтам на ідэі славяна-нямецкага супрацьстаяння, той самай шматвяковай "барацьбы народаў Усходняй Еўропы супраць агульнага ворага – Тэўтонскага ордэна"[38]. Як адзначыў у прадмове перакладчык Міхась Кенька, для беларускага чытача гэты раман цікавы тым, што "ў ім адлюстраваны эпізоды з гісторыі сумеснай барацьбы славянскіх народаў, у тым ліку і беларускага, супраць агульнага ворага, супраць чужаземнай экспансіі..."[39].

Рэзюмуючы, можна сказаць, што літаратурна-публіцыстычны вобраз Грунвальда, сфармаваны ў Беларусі ў 1990-я г., хоць гіпербалізацыяй гістарычнага значэння падзеі і яе патрыятычнымі трактоўкамі адрозніваўся ад савецкага, па сутнасці трымаўся на ідэалагемах папярэдняй палітычнай эпохі. Бітва ўпісвалася ў адвечную славяна-нямецкую барацьбу і сімвалізавала выратаванне Беларусі ад знішчэння немцамі, абарону яе незалежнасці. Артыкулявалася нават ідэя кантынуітэту паміж крыжаносцамі і кайзераўскімі або гітлераўскімі акупантамі. Да выбару і сцвярджэння такой перспектывы інтэрпрэтацыі Грунвальдскай бітвы найбольш спрычыніліся пісьменнікі, мастакі, а таксама гісторыкі, якія ў сітуацыі нацыянальнага абуджэння не маглі не быць патрыётамі. Не дзіўна, што з такой яўна архаічнай перспектывы на славутую перамогу глядзелі і палітыкі нацыянальна-дэмакратыч-

[36] Чаропка В. Імя ў летапісе. Мінск, 1994. С. 383.

[37] Чаропка В. Грунвальдская бітва // Народная воля. 2000. 14 ліпеня. С. 3.

[38] Сянкевіч Г. Крыжакі: для стар. школьнага ўзросту / пер. і камент. М. П. Кенькі. Мінск, 1997.

[39] Кенька М. Генрык Сянкевіч і яго раман "Крыжакі" // Тамсама. С. 14.

най арыентацыі, да лагера якіх належалі і гісторыкі, якія пачалі першымі пісаць пра Грунвальд. Сам лідар БНФ Зянон Пазняк у віншавальным слове ўдзельнікам вайны з нагоды вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў не толькі недвухсэнсоўна звязаў суверэнную Рэспубліку Беларусь і бітву пад Грунвальдам, але і абазначыў лінію сувязі паміж нацыянал-сацыялістамі і нямецкімі рыцарамі, пераможанымі пад Грунвальдам[40].

Ёсць пэўная іронія ў тым, што калі ў Мінску пачалі пісаць пра Грунвальд у стылі прапагандысцкіх штампаў эпохі халоднай вайны, палітычная сітуацыя ў Еўропе непазнавальна змянілася, і гістарычная навука суседніх дзяржаў спісвала ў архіў многія тэзісы манументальнай кнігі С. М. Кучыньскага. Здавалася, што пасля падзення Берлінскай сцяны больш не будзе ніякай патрэбы ў аднабаковай праекцыі агрэсіўнасці і ў дэманізацыі Тэўтонскага ордэна як нібыта папярэдніка гітлераўскіх захопнікаў. Бо пасля распаду Савецкага Саюза з'явіўся доступ да замежнай літаратуры, стала магчымай адкрытая і спакойная дыскусія аб вострых пытаннях мінулага як дома, так і ў міжнародных аўдыторыях.

Размова пакуль вялася пераважна пра гістарычную публіцыстыку і грамадскую традыцыю інтэрпрэтацыі Грунвальда. Папулярызатары гісторыі, мастакі і пісьменнікі[41], якія прыпісвалі бітве пад Грунвальдам такое выключнае значэнне ў мінулым Беларусі, і не павінны займацца дыскусіямі ды высвятляць, наколькі іх вобраз падзеі можа адпавядаць рэальнай гісторыі. Звернемся цяпер да карпарацыі гісторыкаў – да публікацый тых, каму гэта ўсё ж належыць рабіць з прафесійнага абавязку.

[40] Тагачасны дэпутат З. С. Пазняк падкрэсліў, што нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг, прыняты Рэспублікай Беларусь у якасці дзяржаўнага, "немцы не любілі з часоў Грунвальда". Гл.: Пазняк З. "Мужчына павінен змагацца за Бацькаўшчыну..." // Народная газета. 1994. 1 ліпеня. С. 1.

[41] Выглядае, што паказанае вышэй разуменне Грунвальда як найважнейшай для беларусаў падзеі, якая мяняла іх лёсы, сапраўды пачала падзяляць большасць беларускіх пісьменнікаў. Напрыклад, Кастусь Цвірка ў літаратурызаванай версіі гісторыі таксама пісаў, што ў выніку Грунвальдскай перамогі "крыжакі, якія больш за два стагоддзі вялі бесперапынную вайну з беларусамі... нарэшце былі пастаўлены на калені" і "шматвяковая крыжацкая экспансія" спынілася. Гл.: Цвірка К. Гісторыя Беларусі паводле паданняў і легендаў. Мінск, 2006. С. 288.

## 9.2 Грунвальд у нацыянальнай канцэпцыі гісторыі

Пасля абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь беларускія гісторыкі ўпершыню атрымалі магчымасць пісаць пра мінулае без узгаднення з Масквой. Мінску неабходна было распрацаваць сваю нацыянальна-дзяржаўную канцэпцыю гісторыі, якая павінна была стаць альтэрнатывай русацэнтрычнаму майстар-наратыву савецкай эпохі. Маладая гістарыяграфія стаяла перад задачай перафарматавання ўсяго гістарычнага канона, пры гэтым само кіраўніцтва гістарычнай навукі прызнавала неабходнасць распрацоўваць гісторыю з нацыянальных пазіцый як патрэбу дзяржаўных інтарэсаў[42].

У метадалагічнай літаратуры апошнім часам усё часцей звяртаецца ўвага на тое, што нацыянальная гістарыяграфія па сваёй прыродзе этнічна эгацэнтрычная[43]. Яшчэ раз адзначым, што ўсе нацыянальныя гісторыі звычайна пішуцца як аўтабіяграфіі сваіх нацый ці этнасаў, надзеленых чалавечымі якасцямі, тады як іншыя дзейныя асобы гістарычнага наратыву функцыянуюць у стэрэатыпным вобразе суседа, саюзніка, ворага і да т. п. "Іншыя" ў нацыянальнай гісторыі наўрад ці могуць атрымаць сталыя пазітыўныя характарыстыкі. Хутчэй наадварот, паколькі пры стварэнні наратыву нацыянальнай гісторыі як жыцця калектыўнага індывіда адной з канстантаў з'яўляецца зварот да пагроз яго існаванню, якія зыходзяць ад знешніх ворагаў.

Беларускае гісторыяпісанне ў гэтым сэнсе не адрознівалася ад ранейшых практык нацыянальных гістарыяграфій іншых еўрапейскіх краін. Гіпербалізацыя пагрозы для Беларусі з боку Нямецкага ордэна і гістарычнага значэння Грунвальдскай бітвы ў цэлым адпавядала патрэбе ўмацавання нацыянальнай ідэнтычнасці праз гераізацыю мінулага і магла запаўняць той

[42] Касцюк М. П. Нацыянальная канцэпцыя гісторыі: асноўныя падыходы // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы): Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Ч. 1. Мінск, 1994. С. 3 і наст.

[43] Пар.: Björk R. Conceptions of National History. P. 5–14; Gall L. Confronting Clio: Myth-Makers and Other Historians. London, 1992. P. 12; Wrzosek W. Historiograficzny status historii narodowej // Богатокультурне історичне середовіще Львова в XIX і XX ст. Т. IV. Львів – Жешув, 2006. С. 15–16.

своеасаблівы эмацыйны вакуум, што існаваў у грамадскай свядомасці. Адзначым, што праект нацыянальнай канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў школах толькі ўносіў тэму "барацьбы супраць знешніх ворагаў" у шэраг найважнейшых у гісторыі Беларусі[44], не вылучаючы асаблівай ролі нейкага аднаго з такіх ворагаў. У каментарах Міхася Біча, аднаго з галоўных стваральнікаў канцэпцыі, таксама толькі падкрэслівалася роля двух знешніх фактараў у пераважна мірным характары ўтварэння ВКЛ: "няспынныя набегі крыжакоў з захаду і пагроза татарамангольскага нашэсця з усходу і поўдня вымушалі... беларускія і літоўскія землі-княствы да аб'яднання..."[45]. Тэзіс па сутнасці не быў новым, аднак новай аказалася грамадска-палітычная сітуацыя, якая дала яму новыя значэнні.

Гіпербалізацыя небяспекі з боку Нямецкага ордэна, апрача эфекту гераізацыі айчыннага мінулага, у нацыянальнай гістарыяграфіі магла выконваць дадатковую функцыю. Даўняя ідэя пра ўплыў знешніх захопнікаў на ўтварэнне ВКЛ актуалізавалася і набыла новую мадыфікацыю. Калі ў савецкай канцэпцыі барацьба з крыжаносцамі функцыянавала ў ролі абставінаў, якія аблягчалі літоўцам захоп земляў Беларусі, то цяпер "смяротная пагроза" з боку крыжаносцаў функцыянавала як той фактар, што паспрыяў аб'яднанню беларускіх і літоўскіх земляў у адной дзяржаве[46]. Нагадаем, што знешняя небяспека як адна з прычын утварэння ВКЛ пераважна мірным шляхам і раней прызнавалася многімі гісторыкамі. Аднак М. Любаўскі, напрыклад, у сваёй класічнай працы па ВКЛ гаварыў пра ролю нападаў не адных толькі крыжаносцаў, а пра націск з розных бакоў[47]. У новай жа трактоўцы менавіта агрэсія магутнага Ордэна стала вызначальным фактарам гісторыі як Літвы, так і Беларусі. Цяпер аб'яднанне літоўцаў і ўсходніх славян у адну дзяржаву тлумачылася звычайна "націскам крыжакоў" і "пагрозай вынішчэння"[48].

[44] Біч М [і інш.]. Канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў сярэдніх школах Беларусі // Настаўніцкая газета. 1991. 30 лістапада. С. 2.

[45] Біч М. Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь // БГЧ. 1993. № 1. С. 19.

[46] Лойка Л., Лойка Т. Сучасны погляд на гісторыю Беларусі // Крыжовы шлях: Дапаможнік для вывуч. гісторыі Беларусі. Мінск, 1993. С. 11.

[47] Любавский М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. Москва, 1915. С. 18–35.

[48] Пар. адзін з першых універсітэцкіх дапаможнікаў: Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік / пад рэд. А. І. Ігнаценкі, Я. Ю. Несцяровіча. Мінск, 1994. С. 24–25.

І нават Крэўскае пагадненне аб уніі (1385) смела падавалася як вымушаны крок, абумоўлены агрэсіяй Ордэна: маўляў, яно заключалася, каб стрымаць "рух крыжаносцаў на ўсход (дранг нах остэн)"[49]. Думка пра абумоўленасць уніі агрэсіяй Тэўтонскага ордэна не новая, аднак яна і раней заставалася толькі гіпотэзай, а ў святле сучасных даследаванняў тэмы можа хутчэй адвяргацца, чым пацвярджацца.

Зразумела, канцэптуальныя падыходы да гісторыі Беларусі, прапанаваныя ў праграмах, не адлюстроўвалі ўсёй навізны яе рэальнага асвятлення пры выкладанні курсаў. Так, у праграме курса гісторыі Беларусі, распрацаванай на гістарычным факультэце БДУ, прапаноўваліся ўсё ж блізкія да традыцыйных акцэнты асвятлення тэм, звязаных з агрэсіяй Нямецкага ордэна: барацьбе Полацка супраць рыцараў адводзілася больш увагі, чым Грунвальду. Праўда, цяпер асобна акцэнтавалася пытанне "ролі насельніцтва беларускіх зямель у спыненні нямецкай агрэсіі на Русь у XIII ст."[50], што ўздымала гістарычнае значэнне Беларусі, хоць генетычна яно было звязана з савецкай ідэалогіяй гісторыі.

Перад тым як убачылі свет першыя нарысы і дапаможнікі, напісаныя гісторыкамі суверэннай Беларусі, у Мінску была перавыдадзена "класічная спадчына" нацыянальнай гістарыяграфіі – кнігі па гісторыі Беларусі В. Ластоўскага, У. Ігнатоўскага, М. Доўнара-Запольскага і Я. Найдзюка, выдаленыя з бібліятэчных фондаў у савецкія часы як творы "беларускіх буржуазных нацыяналістаў". Інтэрпрэтацыя адносін з нямецкімі рыцарамі і тэмы Грунвальда ў трох першых была разгледжана ў папярэднім раздзеле. Там мы канстатавалі, што для гісторыкаў першай нацыянальнай школы Грунвальд ніколі не ўяўляўся падзеяй лёсаноснага значэння. Асаблівай увагі ў сувязі з гэтым заслугоўвае нарыс Язэпа Найдзюка[51], гісторыка з Заходняй Беларусі, праца якога выдавалася ў акупаваным Мінску і не магла адлюстроўваць установак савецкай ідэалагічнай прапаганды.

Вышэй ужо адзначалася, што ў віленскім выданні па гісторыі Беларусі Я. Найдзюк толькі побегам крануў напады крыжаносцаў, не згадаўшы бітвы пад Грунвальдам. У сваім па-

[49] Лойка Л., Лойка Т. Сучасны погляд на гісторыю Беларусі. С. 16–17.

[50] Праграма курса "Гісторыя Беларусі" / А. Ігнаценка, В. Цяплова, Я. Несцяровіч, У. Сосна. Мінск, 1996. С. 4–5.

[51] Найдзюк Я. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. Мінск, 1944.

шыраным нарысе, які спачатку ўбачыў свет у Мінску ў 1944 г., аўтар разгледзеў барацьбу Полацка з крыжаносцамі, але мімаходзь, тады як больш увагі звярнуў на гандаль палачан з Рыгай, размяжоўваючы пры гэтым немцаў і крыжаносцаў[52]. Тэма Грунвальда ў гэтым нарысе была зусім апушчана, што тлумачыцца акупацыйнай цэнзурай. Затое ў апошняй версіі нарыса, перавыдадзенага ў суверэннай Беларусі, Грунвальду прысвечана цэлая старонка – нібыта адноўлены фрагмент пра сярэднявечную бітву з Нямецкім ордэнам, зняты акупацыйнай цэнзурай[53]. Аднак дастаткова ўважлівага прачытання, каб убачыць, што сваім ідэалагічным напаўненнем "адноўленае" апісанне вайны з нямецкімі рыцарамі рэзка адрозніваецца ад духу кніг Я. Найдзюка, выдадзеных пры жыцці аўтара[54]. Адно з галоўных адрозненняў – выкарыстанне новых канцэптаў. "Тэўтонскі ордэн <...> працягваў сістэматычную нямецкую экспансію на ўсход (*Drang nach Osten*)", – пачынаецца аповед пра Грунвальд[55]. Гэты выраз Я. Найдзюк мог яшчэ і не ведаць. Як удалося высветліць, у варыянт працы Я. Найдзюка, перавыдадзенай у Мінску, фрагмент пра бітву пад Грунвальдам быў устаўлены беларускім эміграцыйным дзеячам Іванам Касяком у ЗША, які ў 1980-я г. выкарыстаў тэкст гісторыка як аснову для напісання свайго нарыса[56]. Такім чынам, цытаваны вобраз Грунвальда створаны ў асяроддзі паваеннай беларускай эміграцыі і не адлюстроўвае традыцый дасавецкай беларускай гістарыяграфіі. У ім эклектычна наклаліся розныя ўзоры разумення падзеі. Бітва прэзентавана аўтарам як адказ на нямецкую экспансію і апісана з беларускага патрыятычнага пункту гледжання, што і можна было чакаць, затое яе ацэнка цвярозасцю нагадвае погляды гісторыкаў марксісцкай школы: Тэўтонскі ордэн "не здолеў акрыяць пасля такога разгро-

[52] Тамсама. С. 27–28, 33–34.

[53] Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. Мінск, 1993. С. 40–41. У пасляслоўі А. Грыцкевіча ўказана, што адноўлены менавіта знятыя "звесткі пра перамогу пад Грунвальдам" (с. 402).

[54] Гэта ж можна сказаць і пра яго пасмяротны дапаможнік па гісторыі Беларусі, падрыхтаваны па рукапісах і выдадзены нядаўна Аленай Глагоўскай. Гл.: Najdziuk J. Paznavajma historyju biełaruskaha narodu. Biełastok, 2010.

[55] Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня. С. 40.

[56] Kasiak I. Byelorussia: Historical Outline. London, 1989. P. 30–31. Шчыра дзякую Змітру Саньку за дапамогу ў высвятленні гэтага пытання.

му і пачаў слабець", а доступ да балтыйскіх гандлёвых партоў прынёс Польшчы і ВКЛ прыбытак[57].

Зразумела, нацыянальная гістарыяграфія не магла пераймаць трактоўкі мінулага папярэднікамі ў нязменнай версіі, нават калі гэта былі такія аўтарытэты, як М. Доўнар-Запольскі. Узоры інтэрпрэтацый задаваліся новым грамадска-палітычным кантэкстам, агульнымі настроямі, якія і вызначалі актуалізацыю тых ці іншых гістарычных падзей.

Агульнае крытычнае стаўленне да савецкай традыцыі "замоўчвання" важных сюжэтаў беларускай гісторыі яшчэ ў гады перабудовы праявілася і ў адносінах да Грунвальда. Дух "аднаўлення справядлівасці" застаўся актуальным для пачатку 1990-х г. Некаторыя гісторыкі па-ранейшаму лічылі істотным крытычна выказвацца наконт замоўчвання ў афіцыйнай літаратуры значэння бітвы і вялікай ролі беларусаў. Маўляў, палякі і літоўцы сцвярджаюць, што перамогу забяспечылі іх войскі, і толькі ў беларускіх падручніках па гісторыі пра гэта нічога не пішацца, хоць у сапраўднасці "гэтай перамогай наш народ можа ганарыцца не менш, чым палякі або літоўцы", бо там ваявала і беларускае войска, – небеспадстаўна пісалі гісторыкі[58].

Як адзначалася вышэй, большая ўвага да тэмы Грунвальда і своеасаблівая "аўтарызацыя" яго вынікаў у імя кансалідацыі нацыі адпавядала гераізацыі ўласнага мінулага як натуральнай патрэбе любой нацыянальнай гістарыяграфіі. З іншага боку, можна было б чакаць, што дэмакратызацыя грамадства і жаданне дыстанцыявацца ад савецкіх нормаў і каштоўнасцяў павінна спрыяць вызваленню ад ідэалагем савецкай гістарыяграфіі, асабліва сталінскай эпохі. Вось жа на практыцы атрымалася, што з абноўленымі трактоўкамі Грунвальда ў гісторыяпісанне суверэннай Беларусі вярталася тая самая, па словах М. Пакроўскага, "рытуальная легенда" аб адвечнай агрэсіўнасці немцаў да славян, ідэалагічная сутнасць якой на той час ужо была ясна паказана еўрапейскай гістарыяграфіяй. Верагодна, каб выклікаць у чытачоў глыбейшае ўражанне і больш зацікавіць гісторыяй, пісьменнікі і публіцысты без усялякай аргументацыі пісалі, што "галоўнай мэтай германскай палітыкі" з сярэднявечных часоў было падпарадкаванне і асіміляцыя славян, і што калі б не Грунвальд, то бе-

[57] Тамсама. С. 41.

[58] Лойка Л., Лойка Т. Сучасны погляд на гісторыю Беларусі. С. 17; Асіноўскі С. Сумленна прынялі свой лёс... // Беларуская мінуўшчына. 1995. № 3. С. 4–6.

ларусаў з літоўцамі чакала б тая ж “горкая доля”, як і прусаў[59]. Услед за публіцыстамі падобныя сцвярджэнні агучвалі і прадстаўнікі нацыянальнай гістарыяграфіі, што надавала архаічным ідэям панславістаў XIX ст. навуковы статус і звязвала беларускі вобраз Грунвальда з ідэалогіяй канцэпту “Дранг нах Остэн”.

Ёсць падставы сцвярджаць, што на пашырэнне ўяўленняў пра Нямецкі ордэн і яго палітыку адносна Беларусі ў гістарыяграфіі 1990-х г. паўплывалі не столькі перавыдадзеныя працы класікаў айчыннай гістарыяграфіі і не спецыяльныя навуковыя даследаванні, колькі аналізаваныя вышэй творы публіцыстаў, найперш К. Тарасава і С. Цярохіна. Невыпадкова тэзіс апошняга пра тое, што Ордэн праводзіў палітыку “Дранг нах Остэн”, мэтай якой было “стварэнне Вялікай Тэўтоніі” з землямі Польшчы, Беларусі, Літвы, Пскоўшчыны і ўладанняў Вялікага Ноўгарада, выказаны спачатку ў публіцыстычнай брашуры, неўзабаве знайшоў месца на старонках “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі”[60].

Падобны ўплыў на ўяўленні гісторыкаў пра палітыку Нямецкага ордэна займелі таксама працы Міколы Ермаловіча, народнаму аўтарытэту якога ў канцы 1980-х мог пазайздросціць любы акадэмічны гісторык. Вышэй ужо адзначалася характэрная для яго гістарычных поглядаў схільнасць генетычна звязваць нямецкі фашызм з сярэднявечнымі крыжаносцамі. Так і ў папулярнай кнізе “Старажытная Беларусь” адносіны Полацка з Рыгай і Ордэнам мечаносцаў у першай палове XIII ст., якія ім упершыню разглядаліся падрабязна, былі паказаны як суцэльная “крыжацкая агрэсія супраць Полацка”[61]. Нават ва ўзаемавыгадных гандлёвых дамовах М. Ермаловіч бачыў экспансію і пастаянны націск Ордэна[62]. Сцвярджэнні папулярнага гісторыка аб “выключнай небяспецы крыжацкай агрэсіі” для беларускай зямлі і “гераічным супраціўленні” Полацка[63], скіраваныя

[59] Асіноўскі С. Сумленна прынялі свой лёс… // Беларуская Мінуўшчына. 1995. № 3. С. 2. Пашыраная версія таго ж артыкула ў: Архівы і справаводства. 2005. № 3. С. 113–125. Аўтар прызнае, што яго погляды на бітву сфармаваны на падставе ўжо аналізаваных намі публікацый С. Цярохіна.

[60] Цярохін С. Грунвальдская бітва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. Мінск, 1996. С. 158

[61] Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і навагародскі перыяды. Мінск, 1990. С. 264–288.

[62] Тамсама. С. 281.

[63] Тамсама. С. 286–287.

да масавага чытача са старонак выдатна напісанай кнігі, моцна нагадвалі састарэлы панславісцкі тэзіс пра немцаў як "адвечных смяротных ворагаў". Цяпер цяжка выявіць, на падставе якіх наратываў сфармаваліся такія погляды М. Ермаловіча[64]. Затое няма сумнення ў залежнасці многіх беларускіх гісторыкаў ад яго тэкстаў. Уплыў пазіцый М. Ермаловіча нярэдка выразна пазнаецца па такіх самых ацэнках палітыкі Тэўтонскага ордэна, пра што будзе сказана ніжэй.

Цікава, што бітву пад Грунвальдам, у адрозненне ад барацьбы Полацкага княства з рыцарамі, М. Ермаловіч апісваў сцісла і ўзважана, без рытуальных сцвярджэнняў пра "смяротную небяспеку"[65]. Замест гэтага гісторык паказаў, што Вітаўт, які то варагаваў з крыжаносцамі, то заключаў з імі саюзы, уступае ў канфлікт з Ордэнам для таго, каб вярнуць сабе Жамойць[66]. Адзначыўшы вялікае гістарычнае значэнне перамогі "як магутнага ўдару па крыжацкай агрэсіі", М. Ермаловіч выказаўся і пра неадназначнасць той сітуацыі, у якую ў выніку разгрому Ордэна трапляла ВКЛ: аслабленне Ордэна пасля бітвы "было найперш на карысць Польшчы, паколькі менавіта ён быў асабліва небяспечны для яе"[67], – адзначаў гісторык. Такое разуменне падзеі і яе наступстваў усё ж кантраставала з пашыраным публіцыстыкай вобразам Грунвальда як лёсаноснай бітвы. Падобна, што шырокая грамадскасць больш чакала апошняга.

Паўторым, што ўстаноўка на гераізацыю свайго мінулага, характэрная найперш для гістарычнай публіцыстыкі, у цэлым адпавядала патрэбам нацыянальнага гісторыяпісання. І калі ў дапаможніках па гісторыі Беларусі, створаных на аснове новай канцэпцыі, бітве пад Грунвальдам стала адводзіцца непараўнальна больш месца, чым у ранейшым курсе – як падзеі эпахальнай, вартай асобнай увагі, то ў гэтым не было нічога анамальнага. Нездаровай тэндэнцыяй стала аднабаковасць і спрашчэнне інтэрпрэтацый вялікай бітвы ў публікацыях 1990-х г. Калі ў даваенных выданнях па айчыннай гісторыі было нармальным пісаць не толькі пра паходы рыцараў на Літву і Беларусь, але і наад-

[64] Праўдападобна, у сваім тлумачэнні гісторыі Полацка М. Ермаловіч залежаў ад панславісцкіх поглядаў расійскага гісторыка Івана Бяляева, працы якога актыўна выкарыстоўваў.

[65] Ермаловіч М. Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае. Мінск, 2000. С. 248–254.

[66] Тамсама. С. 249.

[67] Тамсама. С. 251, 253.

варот, што "літоўска-беларускія войскі не раз урываліся ў межы тэрыторыі, занятай рыцарамі... спусташалі і грабілі яе"[68], то цяпер у навучальнай літаратуры суверэннай Беларусі ўсё гранічна спрасцілася і стала падавацца ў чорна-белых фарбах. Самае нечаканае, што трактаванне Грунвальдскай бітвы ў новай гістарычнай літаратуры парадаксальным чынам набліжалася да савецкіх канонаў сталінскай эпохі і аддавала духам панславізму[69].

У бітве 1410 г. сышліся "Еўропа крыжацкая" з "Еўропай славянскай", прычым першая была агрэсіўнай, тады як другая "бараніла сваю годнасць і незалежнасць"[70], – сцвярджалася ў адной з публікацый навукова-папулярнага часопіса, аўтар якой стылізаваў бітву пад эпічнае сутыкненне зла з дабром. Цяпер гэта можа выклікаць здзіўленне, але прыкладна ў такім жа святле барацьба насельніцтва Беларусі з нямецкімі рыцарамі была паказана і на старонках "Нарысаў гісторыі Беларусі" – першай абагульняльнай працы па гісторыі краіны, напісанай пасля распаду СССР акадэмічнымі гісторыкамі на аснове новай канцэпцыі. Патрыятычная ўстаноўка наклалася ў іх на старыя савецкія стэрэатыпы аб ворагах, у выніку атрымалася ўзнаўленне духу публікацый Грацыянскага. «Палачане першымі з уходніх славян уступілі ў адкрытую барацьбу супроць агрэсіі нямецкіх крыжакоў, адбіваючы іх "націск на ўсход"», – расцаніў канфлікты князя Уладзіміра з рыжскім біскупам Альбертам патрыярх вывучэння полацкіх старажытнасцяў Г. Штыхаў[71]. Яшчэ выразней архаічныя тэзісы панславістаў і штампы прапагандысцкіх выданняў часоў вайны пазнаюцца ў тлумачэнні прычын і наступстваў Грунвальдскай бітвы. Тэўтонскі ордэн уяўляў самую страшную небяспеку для славян і балтаў, бо пагражаў "не толькі фізічным знішчэннем народаў, але і знішчэннем духоўным, анямечваннем...", таму, маўляў, "барацьба з тэўтонцамі стала барацьбой за выжыванне славянства". У гэтай шматвекавой барацьбе беларускі народ гераічна выконваў вялікую гістарычную місію – "закрываў сабою ад крыжацкай навалы іншыя ўсходнеславянскія землі". І ў 1410 г., калі надышоў вырашаль-

[68] Шчарбакоў В. Нарыс гісторыі Беларусі. Ч. 1. Мінск, 1934. С. 93.

[69] На ўзнаўленне панславісцкай рыторыкі ў беларускім гісторыяпісанні ўказвалася даўно. Гл.: Сагановіч Г. Грунвальд у беларускай гістарыяграфіі // БГА. Т. 9 (2003). С. 166–168.

[70] Асіноўскі С. Сумленна прынялі свой лёс... С. 4.

[71] Нарыс гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч 1. Гал. рэд. М. Касцюк. Мінск, 1994. С. 97.

ны момант, то гэты народ "увесь як адзін падняўся на смяротную рашучую бітву са сваім адвечным ворагам", – працягваўся драматычны аповед. Урэшце фіналам "больш чым двухсотгадовага супрацьстаяння... славянства і крыжацкіх заваёўнікаў" стала вядомая перамога, дзякуючы якой "землі ўсходніх славян пяць стагоддзяў не ведалі германскай агрэсіі"[72].

Аналагічнае асвятленне барацьбы з дэманізаваным Тэўтонскім ордэнам як "барацьбы за выжыванне славянства" і Грунвальдам як іх выратаваннем ад знішчэння ці анямечвання ўвайшло і ў дапаможнік для вайскоўцаў Узброеных сілаў дзяржавы[73], падрыхтаваны Інстытутам гісторыі АН Беларусі па дамове з Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь.

Узоры тлумачэння барацьбы з "крыжацкай навалай", зададзеныя акадэмічнымі нарысамі, перайшлі і на старонкі школьных дапаможнікаў, у якіх варожаму суседу беларусаў Тэўтонскаму ордэну і Грунвальдскай бітве як галоўнай падзеі цяпер аддавалася асаблівая ўвага. Падобная ўстаноўка ў поўнай меры ўвасобілася нават у падручніку для вучняў пачатковых класаў, дзе "Спыненне крыжацкіх паходаў на беларускія землі" разглядалася ў асобна выдзеленай тэме. Яе аўтар У. Пляшэвіч адразу звязаў з мечаносцамі і крыжаносцамі жудасныя злачынствы: нямецкія рыцары рабілі набегі на Беларусь і "прымушалі мясцовае насельніцтва пераходзіць у каталіцтва. Тых, хто супраціўляўся, крыжакі знішчалі, захоплівалі іх землі і маёмасць", а само прыняцце каталіцтва "азначала падначаленне Ордэну". Паходы крыжакоў прадаўжаліся "амаль дзвесце гадоў", – тлумачыў ён, таму "зруйнаванне Ордэна стала задачай Вялікага княства Літоўскага"[74]. Адпаведна пасля слаўнай перамогі 1410 г. тэўтонцы ўжо не маглі весці наступальныя дзеянні супраць суседзяў з ранейшай сілай, такім чынам "важкі ўклад беларусаў і літоўцаў у перамогу над крыжакамі забяспечыў самастойнасць ВКЛ як дзяржавы" і яе далейшае развіццё[75], – завяршаў аўтар аповеду.

У курс гісторыі для базавай школы такія погляды на Ордэн і вырашальную бітву з ім увайшлі не адразу. У першым школьным дапаможніку па гісторыі адпаведнага перыяду, хоць Грун-

[72] Тамсама. С. 118–120.

[73] Гісторыя Беларусі: Кароткі нарыс (у 5 ч.). Ч. 2. Мінск, 1993. С. 6–9.

[74] Беларусь – мая Радзіма: Вучэб. дапам. для вучняў 4 кл. / У. К. Пляшэвіч, А. П. Жытко, В. Л. Белая. Мінск, 1993. С. 68.

[75] Тамсама. С. 73.

вальдская бітва і атрымала больш увагі, чым у эпоху БССР, яна ацэньвалася яшчэ па савецкіх інтэрпрэтацыйных стандартах. Перамога падарвала моц Ордэна, прыпыніла яго агрэсію і паспрыяла эканамічнаму развіццю ВКЛ і Польшчы[76], – вось усё, у чым бачылася яе важнасць. Стары падыход пазнаваўся і ў тым, што калі барацьбе са знешнімі захопнікамі ў XIII ст. папранейшаму прысвячаўся асобны параграф, то Грунвальд разглядаўся ў выкладзе знешняй палітыкі ВКЛ, г. зн. тэма Грунвальда па сваёй важнасці саступала аповеду пра змаганне Полацка з "націскам крыжакоў у XIII ст."[77]. Такая ж устаноўка пазнаецца ў некаторых універсітэцкіх дапаможніках першай паловы 1990-х г., дзе "барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем татар" усё яшчэ захоўвала прыярытэт перад Грунвальдам[78].

Выразныя змены адбыліся ў наступнай версіі падручнікаў. У іх для Грунвальдскай бітвы, як і для барацьбы Полацка з крыжакамі, трывала выдзяляўся асобны параграф з разгорнутым апісаннем баталіі[79]. Пры гэтым у абноўленай інтэрпрэтацыі Грунвальд разглядаўся як завяршэнне той вайны, якую "пачало з крыжакамі", на думку Г. Штыхава, насельніцтва беларускіх земляў яшчэ ў 1203 г. Нямецкія купцы, місіянеры і рыцары, што з'явіліся ў вусці Дзвіны, ад самага пачатку мелі на мэце "прасоўванне на Усход", у іх ужо нават і спецыяльнае выслоўе было – "націск на Усход"[80], – паведамлялася беларускім школьнікам. Гэты "ўпарты рух у славянскія землі" часова перапынілі толькі перамогі князя Аляксандра Неўскага, – паўтараў Г. Штыхаў свае даўнія тэзісы. Аднак гісторык развіваў тэму нямецкай экспансіі як "смяротнай небяспекі" для Полацкай зямлі і Беларускага Панямоння, і важнай навацыяй неўзабаве стала артыкуляванне наўпроставай сувязі паміж першым канфліктам полацкага князя Уладзіміра з нямецкай калоніяй на Дзвіне і бітвай пад Грунвальдам. Так, ужо ў дапаможніку для старшакласнікаў ён пісаў пра "экспансію нямецкіх крыжакоў, якая

[76] Гісторыя Беларусі. Старажытныя часы і сярэднявечча: Вучэбнае выданне / Г. В. Штыхаў, У. К. Пляшэвіч. Мінск, 1993. С. 217.

[77] Тамсама. С. 165–171.

[78] Як прыклад гл.: Дапаможнік па гісторыі Беларусі для паступаючых у ВНУ / пад рэд. А. Г. Каханоўскага і інш. Мінск, 1995. С. 35–40, 56.

[79] Штыхаў Г., Ракуць В. Гісторыя Беларусі ў сярэднія вякі. Падручнік для 6 кл. сярэдн. школы / пад рэд. П. Петрыкава. Мінск, 1996. С. 130–137.

[80] Тамсама. С. 93–94.

працягвалася больш за два стагоддзі", і ўказаў храналагічныя рамкі – "1203–1410 г."[81]. Словам, выходзіла, што перамога пад Грунвальдам паклала канец адзінаму працэсу экспансіі, пачатаму ў вусці Дзвіны яшчэ біскупам Альбертам.

Адпаведна з такім падыходам тэме барацьбы з нямецкімі рыцарамі належнае месца цяпер адводзілася і ў хрэстаматыі для вывучэння гісторыі ў школе[82], – непараўнальна большае, чым раней. Трансляванае праз дапаможнікі ўяўленне пра Тэўтонскі ордэн як смяротную пагрозу для Беларусі заняло трывалае месца ў выкладанні айчыннай гісторыі школьнікам. Менавіта такім чынам характарызавалі Ордэн і ў спецыяльных артыкулах на старонках БГЧ, прызначанага для настаўнікаў. Напрыклад, паводле публікацыі В. Чаропкі Тэўтонскі ордэн увесь час нападаў і "выношваў планы заваявання Польшчы, Літвы, Ноўгарада і Пскова", а Вітаўт з Ягайлам толькі сумленна абараняліся, каб выратаваць свае народы[83]. Таму натуральна, што настаўнікі гісторыі, перакананыя творамі пісьменнікаў, падручнікамі і аўтарамі публікацый у БГЧ, пісалі ў сваіх распрацоўках, што бітвай 1410 г. "закончылася 200-гадовая крыжацкая агрэсія" і перамога мела самы станоўчы ўплыў на далейшае развіццё Беларусі[84]. Тое, што рыцары пагражалі "знішчэннем славянскіх і балцкіх гарадоў і вёсак" і што "барацьба супраць крыжакоў была барацьбой за выжыванне славянскіх і балцкіх народаў", стала агульным месцам і ў тлумачэннях тэмы настаўнікамі[85]. Нават калі дапускалася думка пра альтэрнатыву, то спробы знайсці мірны шлях вырашэння канфлікту з Ордэнам звязваліся з імёнамі Вітаўта і Ягайлы, а віна за вайну ўскладвалася адназначна на непрымірымых нямецкіх рыцараў[86].

[81] Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст.: вучэб. дапаможнік для 10 кл. / пад рэд. М. Сташкевіча. Мінск, 2003. С. 42. Пар. с. 79.

[82] Сведкі беларускай мінуўшчыны: зб. дакум. і матэрыялаў па гісторыі Беларусі VI–XV стст. / С. К. Ганцова, В. А. Чамярыцкі, Г. В. Штыхаў. Мінск, 1996; Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў Сярэднія вякі (VI–XV стст.). Дапам. для вучняў і настаўнікаў / пад рэд. Г. В. Штыхава. Мінск, 1998. С. 61–74, 158–160.

[83] Чаропка В. Удзел войск ВКЛ у Грунвальдскай бітве // БГЧ. 2000. № 2. С. 14–15, 21.

[84] Вашчанка В. Грунвальдская бітва і яе гістарычнае значэнне // БГЧ. 2004. № 1. С. 52.

[85] Баброўнік Н. Грунвальдская бітва // БГЧ. 2000. № 1. С. 72.

[86] Тамсама. С. 73–74.

Універсітэцкія дапаможнікі 1990-х г. пры асвятленні тэмы Грунвальда збольшага паўтаралі тыя ж тэзісы, якія ўтрымлівалі акадэмічныя нарысы і падручнікі для школ. Нават калі непасрэдная сувязь паміж канфліктамі полацкага князя Уладзіміра з рыжскім біскупам Альбертам і Грунвальдскай бітвай не сцвярджалася, то логіка тлумачэння падводзіла да яе. Бо ўжо з пачатку XIII ст. Беларусь апынулася паміж "татарскай і крыжацкай наваламі". І калі ад качэўнікаў небяспека была меншай, то "крыжацкая армада" пагражала славянскім і балцкім народам "духоўным і фізічным вынішчэннем", і толькі дзякуючы перамозе 1410 г. яны "пяць стагоддзяў не ведалі германскай агрэсіі"[87].

У некаторых дапаможніках згаданая генетычная сувязь барацьбы Полацка супраць мечаносцаў з Грунвальдскай бітвай прапісвалася з усёй адназначнасцю, як у Г. Штыхава. Гэта асабліва характэрна для адпаведных раздзелаў курса лекцый выкладчыкаў Гродзенскага ўніверсітэта[88]. Цалкам даверыўшыся аўтарытэту М. Ермаловіча, іх аўтар Святлана Марозава перанесла ў дапаможнік і яго радыкальныя ацэнкі Нямецкага ордэна. У разгорнутым апісанні змаганне Полацка з рыцарамі пададзена студэнтам як барацьба супраць нямецкага *Drang nach Osten* і ў дадатак патлумачана, што ваенная агрэсія Ордэна "суправаджалася гандлёва-эканамічнай экспансіяй". Тут ясна пастулюецца і сувязь паміж Грунвальдам, з аднаго боку, і перамогай над гітлераўскім Райхам, з другога: "Грунвальд пачынаўся ў 1203 г. пад Рыгай, дзе дружыны беларускіх і балцкіх князёў упершыню ўступілі ў сечу з крыжакамі", – паўтарыла С. Марозава думку беларускіх публіцыстаў, і дадала, што частка "агрэсіўнай ордэнскай дзяржавы" са сталіцай Кёнігсбергам праіснавала да 1945 г.[89](!?) (Насамрэч, як вядома, Нямецкі ордэн у Прусіі яшчэ ў 1525 г. стаў свецкім герцагствам, на аснове якога пазней утварылася Прускае каралеўства.) Згодна з логікай цытаванага дапаможніка, калі Ордэн быў суб'ектам пастаяннай агрэсіі, то знішчэнне такога суседа было "жыццёвай неабходнасцю", якая і рэалізавалася на грунвальдскім полі. У ацэнцы

[87] Гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік / пад рэд. А. І. Ігнаценкі, Я. Ю. Несцяровіча. Мінск, 1994. С. 26; Гісторыя Беларусі. Дапаможнік для паступаючых у ВНУ / пад рэд. Ю. Казакова, А. Каханоўскага, П. Лойкі і інш. Мінск, 1998. С. 51–53, 81.

[88] Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый / І. П. Крэнь [і інш.]. Мінск, 2000. С. 145–162, 233–240.

[89] Тамсама. С. 152, 159–160.

самой бітвы С. Марозава ўзнавіла тэзіс С. Асіноўскага, сцвярджаючы, што гэта было сутыкненне "Еўропы крыжацкай і Еўропы славянскай"[90]. Сэнс азначэння "Еўропа крыжацкая" без дадатковых тлумачэнняў цяжка зразумець, аднак, мяркуючы па этнічным характары другой фігуры апазіцыі, можна дапускаць, што мелася на ўвазе Еўропа "нямецкая". Як бы там ні было, нельга не дзівіцца, што агістарычнае па сутнасці супрацьпастаўленне "Еўропы крыжацкай / нямецкай" і "Еўропы славянскай" знайшло сабе месца не толькі ў папулярных публікацыях, але і на старонках сучасных універсітэцкіх дапаможнікаў па айчыннай гісторыі[91].

У іпастасі той сілы, што пачала нямецкую экспансію супраць Полацка ў XIII ст. і працягвала яе да Грунвальда, ордэнская дзяржава паказана і ў дапаможніку па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі[92]. Аўтар узяў за аснову тэзісы М. Ермаловіча і С. Марозавай, таму не дзіўна, што і ён напісаў пра стагоддзі барацьбы славянскіх і балцкіх народаў супраць нямецкай экспансіі, якая дасягнула апагея ў пачатку XV ст., калі "знішчэнне агрэсіўнага суседа" і спыненне агрэсіі "стала жыццёвай неабходнасцю"[93].

Такім чынам, у нацыянальным гісторыяпісанні 1990-х гадоў – як у акадэмічных нарысах, так і ў дапаможніках для сярэдняй і вышэйшай школы – генеральнае сутыкненне з Тэўтонскім ордэнам падавалася як лагічны адказ на выклік чужаземных захопнікаў. Маўляў, небяспека з боку Ордэна ўвесь час узрастала, таму бітва была неабходнасцю для самавыратавання ВКЛ і Польшчы. Варта падкрэсліць, што ідэя выратавальнасці Грунвальдскай бітвы для беларусаў у эмацыйнай натхнёнасці тых гадоў авалодала галовамі і акадэмічных гісторыкаў, а не толькі папулярызатараў і пісьменнікаў. Невыпадкова аб тым, што крыжаносцы "пагражалі некаторым славянскім народам іх поўным падпарадкаваннем, задумвалі ператварыць Польшчу і ВКЛ

[90] Тамсама. С. 234, 239–240.

[91] Трывожная тэндэнцыя з'яўлення падобных тэзісаў у беларускіх падручніках намі адзначалася і раней. Гл.: Сагановіч Г. Грунвальд у падручніках: спакушэнне патрыятычным міфам // Славянский мир и славянские культуры в Европе и мире: место и значимость в развитии цивилизаций и культур: в 2 ч. Ч. 1. Витебск, 2002. С. 220–222.

[92] Снапкоўскі У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: Вучэб. дапаможнік: у 2 ч. Ч. 1. Мінск, 2003. С. 43, 48–49.

[93] Тамсама. С. 96–100.

у каланіяльныя вобласці нямецкай дзяржавы", пісалі тады і найбольш крытычныя даследчыкі[94]. Незнаёмасць з заходняй літаратурай прадмета і некрытычнае перайманне падыходаў старой гістарыяграфіі абумовілі далейшае ўмацаванне стэрэатыпа Ордэна як фактара "выключнай небяспекі" для Беларусі.

У цэлым трактаванне Грунвальдскай бітвы як "фіналу страшнага, больш чым двухсотгадовага супрацьстаяння" славян і "крыжацкіх заваёўнікаў" зрабілася агульным месцам у навучальнай літаратуры, напісанай з пазіцый нацыянальнай канцэпцыі[95]. Можна сказаць, што падобны вобраз Грунвальда стаў стандартным не толькі для дыдактыкі, але і для большасці выданняў нацыянальнай гістарыяграфіі наогул. Дакладна ў такім варыянце бітва прэзентавана, напрыклад, і ў папулярным нарысе пра гісторыю беларусаў, адрасаваным суайчыннікам замежжа. Чытачам спачатку гаворыцца пра "двухсотгадовую крыжацкую экспансію" на Беларусь, якую ўдалося вытрымаць толькі дзякуючы стварэнню ВКЛ. Затым тлумачыцца, што гэты варожы "наступ на нашу Бацькаўшчыну" быў спынены славутай перамогай пад Грунвальдам", якая мела ўжо знаёмы вынік: "Пяць стагоддзяў пасля Грунвальда нага ўзброенага немца не ступала на беларускія землі"[96].

Зразумела, папулярная публікацыя мала да чаго абавязвае. Але ў 1990-я г. ад эмацыйных перабольшанняў цяжка было ўстрымацца і многім прафесійным даследчыкам, так што патрыятычны пафас і ўзнёслыя ўсхваленні Грунвальда прыпадобнілі да твораў гістарычнага папулярызатарства як школьны дапаможнік, так і акадэмічнае выданне. З гісторыкаў нацыянальнай арыентацыі выразным дысанансам да айчынных публікацый пра Грунвальд у 1990-я г. стала сціслая згадка славутай бітвы і яе ўзважаная ацэнка беларускім эміграцыйным гісторыкам Янкам Запруднікам. Адным з наступстваў перамогі ён назваў умацаванне польска-літоўскай уніі (Гарадзельскі акт 1413 г.) і манапалізацыю вышэйшых дзяржаўных пасадаў у ВКЛ ка-

[94] История Беларуси: вопросы и ответы / сост. Г. Голенченко, В. Осмоловский. Минск, 1993. С. 17.

[95] Тэзіс пра двухвяковую агрэсію Ордэна стаў настолькі аксіяматычным, што доўг яму ў свой час, папулярызуючы беларускую гісторыю, сплаціў і аўтар гэтых радкоў. Гл.: Арлоў У., Сагановіч Г. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (862–1918). Вільня, 1999. С. 77.

[96] Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы = The history of the belarusian nation and state / М. Біч і інш. Мінск, 2001. С. 19 (выд. 2005 г. – с. 34–35).

талікамі. Гэта мусіла "запэўніць Рым, што разгром нямецкіх крыжакоў пад Грунвальдам не азначаў страты каталіцкай царквой пазіцый у гэтым рэгіёне"[97].

Дзеля справядлівасці неабходна адзначыць, што ў навуковым дыскурсе ўсё ж гучалі і галасы "іншадумцаў". Прыкладам, Людміла Міхайлоўская не толькі крытычна ўказвала на традыцыю расійскай і савецкай гістарыяграфіі тлумачыць адносіны немцаў і славян скрозь прызму "адвечнай варожасці". Даследчыца адзначала, што Нямецкі ордэн, які выдаваўся за фактар пастаяннай агрэсіі, аб'ектыўна "з'яўляўся своеасаблівым гарантам незалежнасці ВКЛ"[98]. Да параўнальна ўзважаных трактовак тэмы можна залічыць і навукова-папулярныя кнігі Аляксандра Краўцэвіча пра Нямецкі ордэн і Грунвальд[99]. Хоць гісторык пастараўся стварыць агіднае аблічча крыжакоў, у яго тэкстах усё ж няма гаворкі пра "смяротную небяспеку" і няспынны "націск на Усход". Грунвальд пададзены адным з дасягненняў палітыкі Вітаўта. Вялікі князь, які то біўся, то мірыўся з крыжакамі, сам прыняў рашэнне заняцца Ордэнам і пачаў рыхтаваць вайну. Здабытая перамога "назаўжды пакончыла з крыжацкай агрэсіяй супраць Літвы і Польшчы", – падсумаваў аўтар, дадаўшы, што ў гэтым "найвялікшае значэнне Грунвальда для нашага народа"[100]. Тут, праўда, не кожнаму чытачу можа быць ясна, чаму бітва мае такое значэнне для "нашага народа", калі яна спыніла агрэсію супраць Літвы і Польшчы.

І ўсё ж узважаныя трактоўкі Грунвальда ці тым больш альтэрнатыўныя погляды на адносіны з Ордэнам заставаліся рэдкасцю[101] і не ўплывалі на ўяўленні пра апісаныя падзеі на ўзроўні масавай свядомасці. Для шырокай грамадскасці і публіцыстыка, і навуковая літаратура па-ранейшаму звязвала Грунвальд са змрочным выразам "Дранг нах Остэн". Скандальным прыкладам некрытычнага, бяздумнага ўзнаўлення інтэрпрэтацыйных узораў эпохі халоднай вайны можна лічыць

[97] Запруднік Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. Мінск, 1996. С. 33, 35.

[98] Міхайлоўская Л. Тэўтонскі ордэн у еўрапейскіх палітычных адносінах канца XIV – першай трэці XV ст. // БГЧ. 1993. № 3. С. 77, 81.

[99] Краўцэвіч А. Тэўтонскі ордэн: Ад Ерусаліма да Грунвальда. Мінск, 1993; ён жа. Вялікі князь Вітаўт: Нарыс. Мінск, 1998. С. 33–42.

[100] Краўцэвіч А. Вялікі князь Вітаўт. С. 42.

[101] Як спробу альтэрнатыўнай трактоўкі адносін паміж Рыгай і Полацкам гл.: Сагановіч Г. Полацк і нямецкая калонія на Дзвіне (паводле хронікі Генрыха) // БГА. Т. 5 (1998). Сш. 1(8). С. 3–25.

артыкул гісторыкаў БДУ пра нямецкую палітыку "Дранг нах Остэн"[102], прымеркаваны да 60-годдзя перамогі над гітлераўскім фашызмам. Аўтары сцвярджалі, што гэтая "канцэпцыя знешняй палітыкі немцаў" была выпрацавана яшчэ ў раннім Сярэднявеччы, і ў якасці этапаў яе ажыццяўлення на тэрыторыі Беларусі звязвалі паходы крыжаносцаў з агрэсіяй Гітлера і Вялікай Айчыннай вайной. На антынавуковасць падобных падыходаў і сумную тэндэнцыю вяртання гэтага ідэалагічнага архаізма ў беларускую гістарыяграфію ў свой час звярталася ўвага аўтарам гэтых радкоў[103]. На жаль, публікацыі апошняга дзесяцігоддзя паказвалі, што падобныя погляды могуць не проста пашырацца, але і далей набываць акадэмічны статус.

## 9.3 Месца бітвы ў афіцыйным гісторыяпісанні з сярэдзіны 1990-х г.

Далёка не ўсе гісторыкі Беларусі падзялялі ідэі, выкладзеныя ў нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі. Частка іх, асабліва перакананыя камуністы, па-ранейшаму адстойвала прывычныя вобразы мінулага, дарагія для таго насельніцтва Беларусі, што мела прасавецкую і прарасійскую ідэнтычнасць. Погляды такіх гісторыкаў сталі набываць статус афіцыйных пасля ўсталявання ў краіне прэзідэнцкай улады Аляксандра Лукашэнкі, згортвання працэсаў дэмакратызацыі і асабліва пасля абвяшчэння прэзідэнтам курсу на рэінтэграцыю з Расіяй. З 1995 г. дзяржаўныя ўлады ўзяліся прыводзіць гістарычную адукацыю і навуку ў адпаведнасць з прэзідэнцкай палітыкай. На практыцы гэта азначала адмаўленне ад нацыянальных падыходаў і, як правіла, вяртанне да савецкіх і прарасійскіх версій мінулага. Навучальная літаратура па гісторыі, створаная на аснове нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі, правяралася спецыяльнай Дзяржаўнай камісіяй пры Кабінеце міністраў, якая ад гэтага часу адказвала за змест новых дапаможнікаў па гісторыі. Склад названай камісіі сам па сабе гаварыў, якім можа быць дух афіцыйнай навучальнай літа-

[102] Хухлындзіна Л., Васількоў У. "Drang nach Osten" у кантэксце беларускай і сусветнай гісторыі // Веснік БДУ. Сер. 3. 2005. № 2. С. 3–8.

[103] Сагановіч Г. "Дранг нах Остэн" у сучаснай беларускай гістарыяграфіі // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі / Матэрыялы Рэспуб. навукова-практыч. канф.: у 3 ч. Ч. 1. Мінск, 2003. С. 24–27.

ратуры: гэта былі пераважна асобы, адданыя савецкім ідэалам, сярод якіх жорсткім крытыкам нацыянальнай канцэпцыі стаў член-карэспандэнт НАН Беларусі Пётр Петрыкаў. Прынцыпова супраць нацыянальных падыходаў у гістарыяграфіі актыўна выступала і грамадскае аб'яднанне "Гістарычныя веды", члены якога абвясцілі сябе "абаронцамі савецкай дзяржаўнасці і савецкай улады" і, хоць былі пераважна пенсіянерамі, карысталіся асаблівым аўтарытэтам у дзяржаўных вярхах[104]. Так у другой палове 1990-х г. пад кантролем дзяржаўнай камісіі па падручніках у навучальнай літаратуры па гісторыі пачалі сцвярджацца афіцыйныя, нібыта дзяржаўныя погляды на мінулае, у тым ліку на Грунвальд і яго месца ў памяці беларусаў.

Калі нацыянальная канцэпцыя гісторыі ў той ці іншай ступені ўпісвала Беларусь у еўрапейскі кантэкст, звязвала яе з заходнім цывілізацыйным арэалам, то афіцыйная разглядала Беларусь як інтэгральную частку Расіі, ці Расіі – СССР. Пры такой канстэляцыі бітва пад Грунвальдам непазбежна адцяснялася на маргінальнае месца. Побач з перамогамі, ключавымі для савецкага канона, такімі, як Лядовае пабоішча ці бітва на Куліковым полі, перамога 1410 г. магла прэтэндаваць сама больш на ролю адной з важный падзей, але ніяк не вызначальных, якой яна стала ў нацыянальнай канцэпцыі гісторыі. Згадаем, што савецкі патрыятычны вобраз Грунвальда сімвалізаваў "дружбу" або "яднанне супраць агульнага ворага", але ніяк не "выратаванне" ад смяротнай небяспекі чужаземных захопнікаў. У дадатак, празмернае акцэнтаванне значэння Грунвальдскай бітвы, характэрнае для нацыянальна арыентаванага гісторыяпісання, пры ўладзе А. Лукашэнкі магло асацыявацца з палітычнай апазіцыяй – як праз сімвал Пагоні, так і з-за публічных кампаній па ўшанаванні ўгодкаў перамогі над Тэўтонскім ордэнам, ладжаных палітычнымі апанентамі прэзідэнта. Зрэшты, аўтараў і прыхільнікаў нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі ў прэзідэнцкім часопісе адкрыта называлі "навуковай абслугай" апазіцыі[105]. Так ці інакш, афіцыйныя трактоўкі мінулага Беларусі адводзілі бітве пад Грунваль-

[104] Падрабязней гл.: Лінднэр Р. Падручнікі гісторыі ў Беларусі // Гісторыя штодзённасці і правы чалавека: Матэрыялы міжнар. канф. / уклад. П. Садоўскі і М. Тэлюс. Мінск, 2000. С. 54–58; Sahanowicz H. Losy białoruskiej historiografii: od sowietyzacji do zachodniorusizmu nowego typu // Studia Białorutenistyczne. T. 3. Lublin, 2009. S. 133–136.

[105] Новік Я. Пісаць і выкладаць праўдзівую гісторыю, а не ствараць новыя міфы // БД. 2000. № 10. С. 158, 162.

дам непараўнальна менш увагі і значэнні прыпісвалі ёй іншыя, чым гэта рабілі гісторыкі нацыянальнай арыентацыі.

Нагадаем, што тэма барацьбы з Нямецкім ордэнам не была важнай паводле канцэпцыі "Тэзісаў" 1948 г., якія вызначылі галоўныя прынцыпы савецкага трактавання гісторыі Беларусі. Вось і пасля распаду СССР адэпты савецкага ладу не бачылі патрэбы прысвячаць ёй шмат увагі. Змагароў за "аднаўленне гістарычнай праўды" хваляваў імідж савецкай улады, вобраз Расіі, абарона ідэі ўсходнеславянскага адзінства і да т. п. Таму публікацыі гісторыкаў – "нацыянал-экстрэмалаў" крытыкаваліся імі за "русафобскія" і "антысавецкія" погляды ў трактоўках адносін з Расіяй і гісторыі савецкай эпохі[106], а тэма ўзаемадачыненняў з Ордэнам заставалася па-за ўвагай. Невыпадкова П. Петрыкаў, які нястомна адстойваў савецкія стандарты інтэрпрэтацый, крытыкаваў калег па цэху за "антырускую накіраванасць і прыніжэнне ролі савецкага перыяду" і ніколі не кранаў тэмы Грунвальда ці крыжаносцаў[107]. Гэта была тыповая пазіцыя гістарычнай ідэалогіі пасля прыходу А. Лукашэнкі, пры якім у афіцыйных медыях у якасці галоўнай падзеі нацыянальнай памяці беларусаў падавалася Вялікая Айчынная вайна, а яе кананізацыя суправаджалася дыстанцыяваннем ад больш ранняй гісторыі – несавецкай і нерасійскай[108]. Паказальны прыклад свядомага ігнаравання эпохі ВКЛ ад першых нумароў дэманстраваў інфармацыйны бюлетэнь Адміністрацыі прэзідэнта: змяшчаючы на кожны месяц каляндар памятных гістарычных датаў, рэдакцыя перыёдыка паслядоўна ўхілялася ад упамінання сярэднявечных бітваў, а 15 ліпеня як дзень перамогі пад Грунвальдам не падала ніводнага разу[109]. Сам А. Лукашэнка, эксплуатуючы тэму перамогі над нямецкім фашызмам ад пачатку свайго прэзідэнцтва, ніяк не звязваў з ёй паходы крыжаносцаў ці Грунвальд. Мяр-

[106] Пар.: Залескі А. Наконт "нацыянальнай канцэпцыі" // Веды. 1999. 24 верасня. С. 4.

[107] Гл.: Петриков П. Т. Очерки новейшей историографии Беларуси. Минск, 2007.

[108] Падрабязней гл.: Марплз Д. Р. Гісторыя, памяць і Другая сусветная вайна // Arche. 2013. № 2. С. 105–119; Ралёнак А. Канструяванне гістарычнай памяці ў дыскурсе ідэалогіі беларускай дзяржавы // Arche. 2013. № 2. С. 333–350.

[109] Калі складальнікі не знаходзілі для 15 ліпеня важнай, на іх погляд, падзеі з XX ці XIX ст., то зусім не падавалі ў календары гэтага дня. Гл.: Информационный бюллетень Администрации Президента Республики Беларусь. 1997. № 6; 2004. № 6.

куючы па публікацыях, у публічных выступах ён згадваў бітву толькі два разы: спачатку ў святочнай прамове да 3 ліпеня, калі сказаў, што беларуская дзяржаўнасць "бярэ свае вытокі ад старажытнай Полацкай зямлі, Вялікага Княства Літоўскага, герояў Грунвальдскай бітвы"[110], і затым у лекцыі, прачытанай студэнтам БДУ, калі прывёў Грунвальд у прыклад "адзінства і ўзаемадзеяння" славянскіх народаў[111].

Розніца ў трактаванні Грунвальдскай бітвы і яе значэння прадстаўнікамі дзвюх плыняў беларускага гісторыяпісання 90-х г. паўстае з усёй выразнасцю, калі параўноўваць яе вобраз у "Очерках военной истории Беларуси", створаных членамі згаданага клуба "Гістарычныя веды", з апісаннем бітвы ў цытаваных намі вышэй нарысах для вайскоўцаў, падрыхтаваных Інстытутам гісторыі АН Беларусі. Аўтары альтэрнатыўнага дапаможніка, якія абвясцілі, што стаяць "на пазіцыях матэрыялістычнага разумення гісторыі" і "класавага аналізу гістарычных падзей", змясцілі Грунвальдскую бітву ў раздзел пра "ўдзел ВКЛ у вызваленчых войнах славянскіх народаў" і назвалі яе "яркім прыкладам яднання сілаў супраць агульнага ворага"[112]. І гістарычнае значэнне перамогі ў іх зведзена да таго, што пісалася ў кожнай савецкай энцыклапедыі: бітва "надоўга прыпыніла экспансію нямецкіх феадалаў у славянскія землі". Для аўтараў бясспрэчна важней перамогі Аляксандра Неўскага, таму ім аддадзена намнога больш месца[113]. Для тых, чые погляды на мінулае фармаваліся па падручніках Л. Абэцэдарскага, асноўная небяспека для Беларусі бачылася не ў крыжаносцах, а, як і іхнаму настаўніку, у "польска-каталіцкай агрэсіі, масавай паланізацыі і дэнацыяналізацыі беларусаў"[114].

Калі не ўлічваць публікацыі "абаронцаў гістарычнай праўды", якімі абвясцілі сябе члены клуба "Гістарычныя веды", то першым сур'ёзным выданнем, напісаным у духу адмаўлення нацыянальнай канцэпцыі, стаў універсітэцкі дапаможнік "Гісторыя Беларусі" пад рэдакцыяй Я. Новіка і Г. Марцуля[115]. Невыпадкова самі

[110] Прамова прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі на ўрачыстым сходзе, прысвечаным Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, 2 ліпеня 2002 г. // Информационный бюллетень Администрации Президента Республики Беларусь. 2002. № 7. С. 19.

[111] Лукашенко А. Исторический выбор Беларуси. Минск, 2003. С. 40.

[112] Очерки военной истории Беларуси. Ч. 1. Минск, 1995. С. 3, 40–41.

[113] Тамсама. С. 25–28.

[114] Тамсама. С. 46.

[115] Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў па люты 1917 г.: вучэб. дапаможнік / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. Мінск, 1998.

стваральнікі пазіцыянавалі яго ў якасці ідэалагічнай антытэзы акадэмічным нарысам[116]. У традыцыях дапаможнікаў эпохі БССР аўтары прысвяцілі тут асобны параграф барацьбе супраць чужаземных захопнікаў у XIII ст., разглядаючы "крыжакоў і манголататараў" разам[117]. Тэма трактуецца так, як і ў савецкім майстар-наратыве: маўляў, раздробленасць і міжусобіцы на Русі аблягчалі нямецкім рыцарам ажыццяўляць сваю агрэсію, урэшце нямецкі націск падштурхнуў Полацк на саюз з Ноўгарадам, і тады Аляксандр Неўскі разграміў ворагаў, "спыніўшы крыжацкую агрэсію". Як бачым, у адрозненне ад акадэмічных нарысаў ці ранейшых універсітэцкіх дапаможнікаў, аўтары новай, афіцыйнай гісторыі вярнуліся да савецкіх стандартаў. Далей, у поўнай згодзе з названымі стандартамі, і Грунвальдская бітва аказалася знятай з п'едэстала: яна згадана толькі некалькімі сказамі ў аглядзе знешняй палітыкі ВКЛ. Указаўшы на міжнародны склад арміі саюзнікаў і асаблівую ролю смаленскіх харугваў, аўтары дапаможніка спрасцілі і значэнне перамогі: усё, што яна прынесла, гэта спыніла нямецкую агрэсію, вывеўшы з палітычнай барацьбы "даўняга ворага ВКЛ і Польшчы"[118].

Гэтаксама трактавана бітва пад Грунвальдам і ў іншых версіях дапаможнікаў па гісторыі Беларусі пад рэдакцыях Я. Новіка. У больш новых яна пададзена ў шырэйшым кантэксце і, што характэрна, з прымірэнчым заключэннем: "пад Грунвальдам перамагла дружба, воінскае братэрства ўсходніх і заходніх славян, а таксама іншых народаў, якія ўдзельнічалі ў бітве"[119]. Адданы прынцыпам савецкага майстар-наратыву, Я. Новік пры магчымасці і ў постсавецкай Беларусі канструяваў гісторыю ў духу прывычнага "пралетарскага інтэрнацыяналізму".

Яшчэ далей адціснутай на бок бітва пад Грунвальдам аказалася ў т. зв. "новай канцэпцыі" гісторыі Беларусі, якую распрацаваў у Магілёўскім універсітэце Якаў Трашчанок[120]. Як адэпт ідэалагічнай спадчыны М. Каяловіча, ён стварыў своеасаблівы

[116] Скурко А. Паклёп як метад гістарычнай навукі // Навіны. 1998. 21 кастр.

[117] Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў па люты 1917 г. С. 57–60, 115.

[118] Тамсама. С. 115.

[119] Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2008 г.: вучэб. дапаможнік / пад рэд. Я. К. Новіка. Мінск, 2009. С. 85–86.

[120] Сутнасць гэтай канцэпцыі выкладзена ў брашуры: Трещенок Я. К вопросу об общей концепции исторического образования в Республике Беларусь. Могилев, 2002.

сімбіёз заходнерусізму і савецкіх установак асвятлення гісторыі, у якім ролю "пралетарскага інтэрнацыяналізму" прыпісаў праваслаўю. Але ў цэлым гісторыя знешняй палітыкі трактавалася Я. Трашчанком у асноўным па схемах прывычнай для яго савецкай гістарыяграфіі. Небяспеку з боку Нямецкага ордэна ён прызнаваў тым фактарам, які разам з мангольскім нашэсцем прадвызначыў далейшыя лёсы раздробленых княстваў Русі, не больш. Зрэшты, гэтым поглядам магілёўскі аўтар абавязаны вядомаму савецкаму даследчыку У. Пашуту, з прац якога і запазычыў усю канцэпцыю ўтварэння ВКЛ. Вуснамі У. Пашуты, цалкам прыняўшы яго інтэрпрэтацыю, Я. Трашчанок тлумачыў, што націск крыжаносцаў схіляў сацыяльныя вярхі заходніх зямель Русі "на змову з літоўскімі феадаламі", у выніку чаго ўтварылася ВКЛ[121]. Аднак пагроза крыжаносцаў для народаў Усходняй Еўропы "не ішла ў ніякае параўнанне" з той небяспекай, якая зыходзіла ад татараў, – адзначаў Я. Трашчанок, бо Ордэн не валодаў такімі сіламі і сродкамі, каб пагражаць існаванню Польшчы, Літвы ці Русі[122]. У апошнім магілёўскі гісторык меў рацыю, аднак, мяркуючы па выкарыстанай ім літаратуры, погляд гэты мае хутчэй ідэалагічныя, чым навуковыя карані. Верагодна, тут своеасабліва праявілася вернасць аднаму з цэнтральных пастулатаў савецкай гістарыяграфіі 1960-х г. аб прагрэсіўнасці Рускай дзяржавы і яе дабратворным уплыве на суседнія народы. Ордэн мог быць смяротным ворагам толькі для народаў Прыбалтыкі, а супрацьстаянне з Расіяй ён не вытрымаў. У такім кантэксце Нямецкі ордэн усплывае ў Я. Трашчанка толькі ў тэме польска-літоўскай уніі. Нават не згадваючы пра барацьбу Полацка з нямецкімі рыцарамі, магілёўскі аўтар у традыцыях савецкіх падручнікаў згадаў Грунвальдскую бітву ў адным шэрагу з перамогай Аляксандра Неўскага на Чудскім возеры – як два разгромы Ордэна, якіх аказалася дастаткова для спынення апошняга[123].

[121] Трещенок Я. И. История Беларуси. Ч. 1: Досоветский период / учеб. пособие. Могилев, 2003. С. 41, 46. (2-е выд. – с. 66–67, 74–75); Трещенок Я., Воробьев А., Волженков В. История Беларуси с древнейших времен до октября 1917 г.: учеб. пособие для 10 кл. Минск, 2008. С. 58–59. Пар.: Новосельцев А. П., Пашуто В. Т., Черепнин Л. В. Пути развития феодализма (Закавказье, Средняя Азия, Русь, Прибалтика). Москва, 1972. С. 295–297.

[122] Трещенок Я. И. История Беларуси. Ч. 1. Могилев, 2003. С. 46.

[123] Тамсама. С. 47; Трещенок Я., Воробьев А., Волженков В. История Беларуси с древнейших времен… С. 75.

З улікам установак згаданай канцэпцыі Я. Трашчанка была ўкладзена і новая хрэстаматыя для вывучэння гісторыі Беларусі ў вышэйшай і сярэдняй школе[124]. Гэтае выданне таксама паказальна адмаўляе нацыянальную канцэпцыю ў падыходах да многіх тэм, у тым ліку да Грунвальда. Ніводная крыніца, якая хоць бы ўскосна кранала тэму Грунвальда, у новую хрэстаматыю не ўключана! Растлумачыць гэта можна проста. Складальнікі і тут усяго толькі ўзнавілі савецкі стандарт – выбралі для сваёй хрэстаматыі дакументы са зборніка гістарычных дакументаў, складзенага паводле канцэпцыі ўзору 1959 г., у якім, як адзначалася вышэй, таксама не было ніякіх крыніц, датычных Грунвальдскай бітвы[125].

Прывядзем ацэнку Грунвальда ў дапаможніках яшчэ некаторых аўтараў – гісторыкаў, якія трымалі дыстанцыю ад нацыянальнай канцэпцыі. Напрыклад, Эдуарда Загарульскага, які ў гэтых адносінах застаўся максімальна блізкім да савецкага стандарту: сцісла згадваючы Грунвальдскую бітву, ён звязваў з ёй толькі "спыненне нямецкай агрэсіі"[126]. Гродзенскія гісторыкі Іван Коўкель і Эдмунд Ярмусік таксама падалі ацэнку бітвы ў змякчаным варыянце савецкай версіі: у выніку перамогі "была падарвана ваенная магутнасць Тэўтонскага ордэна, пакладзены канец агрэсіі нямецкіх феадалаў супраць беларускіх, польскіх, літоўскіх, рускіх і прыбалтыйскіх земляў. Гэта адкрыла спрыяльныя перспектывы для іх развіцця"[127].

Аднак у выніку суіснавання ідэалагічна розных падыходаў у афіцыйнай навучальнай літаратуры па гісторыі з'явіліся і такія апісанні Грунвальдскай бітвы, якія спалучалі розныя, часам супярэчлівыя інтэрпрэтацыйныя схемы. У гэтых адносінах асаблівай увагі заслугоўвае прыклад абыходжання з Тэўтонскім ордэнам у дапаможніку магілёўскага гісторыка Пятра Дзмітрачкова. Спецыяльна разгледзеўшы адносіны ВКЛ з рыцарскімі ордэнамі ў сціслым нарысе, ён у цэлым прытрымліваўся ўзважа-

[124] Хрестоматия по истории Беларуси. Ч. 1: С древнейших времен до 1917 г. / сост Я. И. Трещенок и др. Минск, 2008.

[125] Гл.: Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. Минск, 1959.

[126] Загорульский Э. М. История Беларуси в кратком изложении. Минск, 2002. С. 36.

[127] История Беларуси: с древнейших времен до нашего времени / И. И. Ковкель, Э. С. Ярмусик. Минск, 1998. С. 23. Дадзеная ацэнка пераносілася з перавыдання ў перавыданне нарыса без усялякіх зменаў ці дапаўненняў.

ных характарыстык і ацэнак. Аўтар належыць да зусім нямногіх даследчыкаў, якія адзначылі, што гэтыя адносіны "нельга зводзіць толькі да ваенных канфліктаў". І бітву пад Грунвальдам П. Дзмітрачкоў ацаніў без усялякага пафасу, проста як "пераломны момант у адносінах ВКЛ з крыжакамі"[128]. Аднак аўтар не змог не трапіць пад уплыў установак, што задамінавалі ў айчыннай літаратуры, таму яго асвятленне адносін з Ордэнам адлюстравала эклектычнасць падыходаў і непаслядоўнасць. Грунтуючыся на ўжо аналізаваных намі публікацыях М. Ермаловіча, В. Чаропкі, С. Асіноўскага і інш., аўтар запазычыў з іх і стэрэатыпны вобраз Ордэна як "смяротнага ворага" беларусаў. Ён таксама прыгадаў дамову 1392 г. і напісаў пра планы Ордэна ліквідаваць ВКЛ, паўтарыўшы нават, што ўжо ў XIV ст. вырашалася пытанне, ці будуць існаваць літоўцы і беларусы, "ці іх знішчаць або анямечаць, як гэта адбылося з прусамі"[129]. Як бачым, пашыраныя публіцыстыкай метафарычныя фігуры прыдаваліся для аргументацыі і на старонках афіцыйных універсітэцкіх дапаможнікаў.

Яшчэ больш цікавы ідэалагічны сімбіёз можна назіраць у асвятленні барацьбы з Тэўтонскім ордэнам на старонках нарыса Пятра Чыгрынава. У яго асвятленні барацьбы з крыжаносцамі ідэалагемы заходнерусізму эклектычна скамбінаваны з патэтыкай беларускага патрыятызму. Нягледзячы на тое, што і сюжэту канфрантацыі Полацка з мечаносцамі, і Вялікай вайне XV ст. адведзена даволі сціплае месца ў адпаведных тэмах, вастрынёй і катэгарычнасцю характарыстык ворага аўтар стварыў уражанне аб вялікім гістарычным значэнні гэтай барацьбы. Рыцары-мечаносцы паказаны сілай, якая ад пачатку мэтанакіравана наступала на праваслаўе: яны "знішчалі праваслаўнае насельніцтва і яго храмы з большай жорсткасцю, чым язычнікаў з іх культавымі збудаваннямі"; крыжаносцы былі "выключна небяспечныя" для Полацка, адносна якога яны ажыццяўлялі не толькі ваенную агрэсію, але "і гандлёва-эканамічную экспансію"[130]. Не дзіўна, што Грунвальд прэзентаваны аўтарам у стылі патрыятычна-публіцыстычнага дыскурсу – як

[128] Дзмітрачкоў П. Ф. Беларусь у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Другая палова XIII – першая палова XVII ст.: вучэб. дапам. Магілеў, 2003. С. 183–187.

[129] Тамсама. С. 184.

[130] Чигринов П. Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие для вузов. Минск, 2000. С. 30–32.

выратаванне ад "смяротнай небяспекі", якая, маўляў, навісала не толькі над беларусамі, але і над Ноўгарадам, Псковам, і над народамі Прыбалтыкі ды палякамі[131]. Відаць, для большага ўражання аб небяспецы ад тэўтонскіх рыцараў П. Чыгрынаў піша пра ўжо ўпамінаную дамову 1392 г. аб падзеле ВКЛ і Польшчы, быццам падпісаную Ордэнам з венгерскім каралём. Пераняўшы гэтыя ідэі з эсэ К. Тарасава, аўтар падкарэктаваў тэзіс аб значэнні перамогі ў накірунку міфа славянскай еднасці, што вяртаў сваю папулярнасць пасля распаду СССР: бітва 1410 г. не проста спыніла "двухвекавую агрэсію нямецкіх рыцараў на ўсходзе", а змяніла суадносіны сілаў "на карысць славянскіх краін цэнтральнай і ўсходняй Еўропы"[132]. З іншага боку, поруч з панславісцкімі акцэнтамі выснову пра вынікі Грунвальда для Беларусі ён падводзіў з пазіцый беларускага патрыёта: "калі на бітву ішлі палачане, навагрудцы, смаляне, дык вяртаўся адтуль ужо ў пэўнай ступені беларускі народ"[133], – завяршаў П. Чыгрынаў.

Больш збалансаванай афіцыйная трактоўка барацьбы супраць Тэўтонскага ордэна рабілася тады, калі аўтарамі і рэдактарамі аднаго выдання аказваліся прадстаўнікі розных ідэалагічных падыходаў. Шляхам такога спалучэння новы вобраз Грунвальда атрымаўся ў дапаможніку для вучняў пачатковай школы, аўтарам якога быў Сяргей Тарасаў, а рэдактарам Пётр Петрыкаў. Параўнальна з разгорнутым апісаннем небяспекі Тэўтонскага ордэна, якое давалася ў першых уводных курсах па гісторыі (узору 1993 г.), у новых выданнях нямецкім рыцарам адведзена значна менш месца, а негатыўная характарыстыка ворага выразна прыглушана. Размова пра іх вядзецца ў тэме "У абарону сваёй зямлі", дзе разглядаецца барацьба з чужаземнымі захопнікамі ў XIII ст., калі на Беларусь "напалі рыцары-крыжакі і пачаліся набегі татар"[134] – так, як гэта падавалася ў БССР. Аднак у далейшым размова вядзецца галоўным чынам пра нямецкіх рыцараў, пагрозай якіх тлумачыцца

[131] Дакладна так аўтар падаваў бітву і ў наступных версіях свайго дапаможніка. Гл.: Чигринов П. История Беларуси с древности до наших дней: учеб. пособие. Минск, 2004. С. 125, 127.

[132] Чигринов П. Г. Очерки истории Беларуси. С. 91.

[133] Тамсама. С. 92.

[134] Мая Радзіма – Беларусь: вучэб. дапаможнік для 3 кл. / пад рэд. П. Ц. Петрыкава. Мінск, 2001. С. 50–53. Названы параграф пададзены без зменаў і ў чарговым выданні: Мая Радзіма – Беларусь: падручнік для 4 кл. / С. В. Тарасаў і інш.; пад рэд. П. Ц. Петрыкава. Мінск, 2007. С. 60–63.

і ўтварэнне ВКЛ як аб'яднанне літоўскіх і беларускіх зямель. І адзінай канкрэтнай гістарычнай датай цэлага параграфа з'яўляецца 15 ліпеня 1410 г. – дзень "бітвы з захопнікамі", калі нямецкія рыцары былі разбіты "дзякуючы мужнасці беларусаў, рускіх, літоўцаў, палякаў і татар". Не акцэнтуючы ўвагі на шматвекавой агрэсіі, дапаможнік апелюе толькі да павагі перад "мужнымі воінамі, якія перамаглі сваіх ворагаў". Грунвальд тут прэзентуецца як агульны сімвал перамогі над чужаземнымі захопнікамі, як сімвал абаронцаў сваёй краіны.

Дзякуючы ратацыі аўтараў і рэдактараў у апошняе дзесяцігоддзе прыкметна змянілася асвятленне тэмы Грунвальда і ў некаторых дапаможніках для базавай школы. Напрыклад, у інтэрпрэтацыі Васіля Ракуця, хоць тэзіс аб тэрытарыяльных захопах як "сапраўднай мэце" крыжаносцаў і аб непазбежнасці барацьбы Полацка з імі захаваўся, сюжэт самой барацьбы пазбаўлены як ранейшага антынямецкага радыкалізму, так і сцвярджэння аб сімвалічнай сувязі паміж канфрантацыяй палачан з мечаносцамі і Вялікай вайной XV ст.[135]. Падобным чынам і ў асвятленні тэмы Грунвальда зніклі навязлівыя сцвярджэнні пра "націск на Усход", "смяротную небяспеку" і выратавальнае значэнне бітвы 1410 г. для Беларусі[136]. Нягледзячы на тое, што разгляду барацьбы з Нямецкім ордэнам у канцы XIII – пачатку XV ст. аддадзена яшчэ болей месца, чым у ранейшых дапаможніках, сама тэма стала выкладацца больш узважана і ў асноўным адпаведна пазіцыям навуковых даследаванняў.

Заўважанае дазваляе заключыць, што ў шэрагу выпадкаў афіцыйная прэзентацыя Грунвальда эвалюцыянавала ў патрыятычны бок, набліжаючыся да трактовак нацыянальнай гістарыяграфіі. Аднак падобныя прыклады збліжэння не варта разглядаць як пачатак уніфікацыі пазіцый і выпрацоўкі нейкага аднаго вобраза бітвы. У гістарычнай літаратуры Беларусі па-ранейшаму выдзяляліся два асноўныя падыходы да ацэнкі Грунвальдскай бітвы і яе месца ў айчыннай гісторыі: афіцыйны, падобны да савецкага, і альтэрнатыўны яму нацыянальна-патрыятычны, з уласцівай яму гіпербалізацыяй значэння перамогі і прыпісваннем беларусам важнай ролі ў яе дасягненні. Што іх сапраўды прыпадабняла, дык гэта архаічнасць зыходных пазіцый, саста-

[135] История Беларуси с древнейших времен до сер. XIII в.: учеб. пособие для 6 кл. / под ред. Г. Штыхова, Ю. Бохана. Минск, 2009. С. 97–101.

[136] История Беларуси: вторая половина XIII в. – первая половина XVI в.: учеб. пособие для 7 кл. / под ред. Ю. Бохана. Минск, 2009. С. 26–30, 61–67.

рэласць інтэрпрэтацыйных шаблонаў і негатоўнасць ставіць пад сумненне галоўныя складовыя палітычнага міфа. Апошняе добра ілюструе артыкул "Дранг нах Остэн", змешчаны ў новай Беларускай Энцыклапедыі[137]. Як само яго з'яўленне, так і змест можна лічыць паказальным прыкладам некрытычнага пераносу састарэлых трактовак у выданні постсавецкай Беларусі. Дастаткова параўнаць згаданы артыкул з аднайменнай публікацыяй А. Зубара, каб пераканацца, што са старой савецкай трактоўкі, якая адлюстравала клімат халоднай вайны, у новую энцыклапедыю цалкам перанесены галоўныя тэзісы пра шматвекавую нямецкую агрэсію на Усход (гл. табліцу параўнання азначэнняў). Добра, што рэдактары здагадаліся зняць хоць пасаж пра актуальнасць тэмы, бо ў савецкім артыкуле гаварылася аб небяспецы адраджэння палітыкі "Дранг нах Остэн" у ФРГ "рэваншысцкімі і мілітарысцкімі коламі".

**"Дранг нах Остэн" у беларускіх энцыклапедыях**

| **Зубар А. "Дранг нах Остэн" //** БелСЭ. Т. 4 (1971). С. 270. | **"Дранг нах Остэн" //** БелЭн. Т. 6 (1998). С. 199. |
|---|---|
| "захопніцкая палітыка нямецкіх феадалаў, пазней нямецкай ваенна-каланізатарскай дзяржавы Прусіі, юнкерска-буржуазнай і імперыялістычнай Германіі ў дачыненні да краін Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы; таксама рэакцыйны лозунг і гістарычна-палітычная канцэпцыя, накіраваная на ідэалагічнае абгрунтаванне і апраўданне захопніцкай палітыкі" | "экспансіяністская палітыка Германіі ў дачыненні да краін Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў IX–XX ст., а таксама лозунг і гістарычна-палітычная канцэпцыя, накіраваная на ідэалагічнае абгрунтаванне і апраўданне гэтай палітыкі". <...> [нямецкі] "рух на Усход спынены ў выніку Лядовага пабоішча 1242 г. і Грунвальдскай бітвы 1410 г." |

Такім чынам, адсутнасць патрыятычнай патэтыкі ў афіцыйным дыскурсе пра Тэўтонскі ордэн і Грунвальд не азначала, што ён вызначаецца большай навуковасцю[138], чым трактоўкі бітвы ў нацыянальным гісторыяпісанні. Бо наўрад ці можна чакаць навуковасці ад гісторыкаў, калі яны кіруюцца патрабаваннем вярнуць састарэлыя ўзоры разумення мінулага ў сённяшні дзень.

[137] "Дранг нах Остэн" // БелЭн: у 18 т. Т. 6. Мінск, 1998. С. 199.

[138] Пра "навуковую аб'ектыўнасць" сваіх выданняў часта гаварылі аўтары афіцыйных падручнікаў. Гл.: Петрыкаў П. Туман "русафобіі" ахутаў Беларускую Энцыклапедыю. С. 113; Новік Я. Пісаць і выкладаць праўдзівую гісторыю, а не ствараць новыя міфы // БД. 2000. № 10. С. 164.

## 9.4 600-гадовы юбілей Грунвальда як патрыятычны кансэнсус

*Нашими предками западное рыцарство однозначно воспринималось как абсолютное зло и смертельная угроза.*

Вадзім Гігін[139]

*Грунвальдская бітва паказала, што беларускі народ ужо ў тыя часы змагаўся за сваю незалежнасць, сваю дзяржаву.*

Глеб Лабадзенка[140]

З аддаленнем савецкай эпохі і з'яўленнем новых пакаленняў у гістарычнай свядомасці грамадства адбываліся павольныя змены. У курсах гісторыі, нават заснаваных на афіцыйнай канцэпцыі, Грунвальд усё ж атрымліваў больш увагі, чым у савецкіх падручніках. І хоць 590-годдзе бітвы ў Беларусі прамінула амаль непрыкметна, міф Грунвальда пачынаў функцыянаваць у гістарычных уяўленнях шырокіх колаў грамадства. Аб тым, што бітва ўспрымалася як эпахальная падзея айчыннай гісторыі прынамсі ў асяроддзі беларускай моладзі, можа сведчыць, на мой погляд, наступны цікавы факт. Калі ў ЕГУ яшчэ да яго выгнання з Беларусі правялі вопыт стварэння дапаможніка па гісторыі Беларусі самімі студэнтамі і выкладчыкамі, то ў падрыхтаванай у выніку кнізе Грунвальд апынуўся на паказальна сімвалічным месцы. Бітве пад Грунвальдам тут быў аддадзены адзін з шасці параграфаў раздзела, прысвечанага ўсёй познесярэднявечнай гісторыі Беларусі – яна зафігуравала побач з такімі эпохавызначальнымі падзеямі, як утварэнне ВКЛ, Крэўская і Люблінская уніі[141]!

[139] Белорусская военная газета. 2010. 16 июля. С. 5.
[140] Звязда. 2010. 15 ліпеня. С. 2.
[141] Belarus – unbekannte Mitte Europas: Ein Handbuch über Belarus zur Geschichte, Politik, Wirtschaft, Gesellschaft mit Reiseteil / Hg. von T. Knubben, E. Kreck, I. Werner. Minsk, 2004. S. 17–18.

У той жа час, пасля рамантычнага захаплення гераічнай гісторыяй у апошняе дзесяцігоддзе размовы пра Грунвальд сталі набываць іншы, больш прагматычны сэнс. У эпоху "войнаў памяці" і ў Беларусі адкрыта загаварылі пра інструментальную функцыю гісторыі, пра ролю гераізацыі мінулага для ўмацавання нацыі. У гэтай сувязі асобнай увагі заслугоўвае гутарка пра Грунвальд як міф, праведзеная на Радыё Свабода ў 2009 г. Вячаславам Ракіцкім з гісторыкам Алегам Трусавым[142]. Характэрна, што бітва і тут была адразу ўпісана ў легенду пра "Дранг нах Остэн", мэтай якога было "стварэнне Вялікай Тэўтоніі" (аўтар даверыўся ўжо знаёмай нам публікацыі С. Цярохіна). Але насуперак гэтаму вынік бітвы ў А. Трусава вызначаўся без усялякай прывязкі да ранейшых тэзісаў пра "выратаванне славян": "Пасля бітвы пад Грунвальдам ВКЛ стала адной з самых вялікіх дзяржаваў Еўропы, як кажуць, ад мора да мора. І беларусы здолелі жыць даволі мірна і добра аж да канца XV стагоддзя", – сказаў гісторык пра яе значэнне. А ў заключэнне красамоўна выказаўся наконт карысці манументальнага вобраза слаўнай бітвы для нацыі: "Цяпер вельмі важна, каб людзі ганарыліся сваёй гісторыяй, каб беларусы ведалі, што яны могуць абараніць сваю незалежнасць, калі будзе ў гэтым патрэба. І што менавіта нашы далёкія продкі паказалі такія прыклады мужнасці, што ў кожным горадзе трэба ставіць помнікі нашым змагарам"[143].

Невядома, ці падобнымі матывамі кіраваліся прадстаўнікі афіцыйных уладаў краіны. Можа, з патрыятычных пачуццяў, а магчыма з чыста прагматычных інтарэсаў, але і яны напярэдадні 600-годдзя бітвы змянілі стаўленне да публічнага святкавання перамогі. Звычайна дзяржаўных чыноўнікаў Беларусі менш за ўсё турбаваў пошук гістарычных каранёў для легітымацыі сваёй улады, аднак на гэты раз святкаванне гістарычнай даты было выкарыстана. Любы публічны форум актуалізацыі далёкай гісторыі стварае магчымасці канструявання ці ўмацавання калектыўных ідэнтычнасцяў[144], а вялікі юбілей даваў асабліва добрую нагоду для прапаган-

[142] Жыццё і сьмерць мітаў. Грунвальдзкая бітва – перамога, якая зрабіла ВКЛ дзяржавай "ад мора да мора" // http://www.svaboda.org/content/transcript/25457668.html [прагл. 30 X 2009]

[143] Тамсама.

[144] Пра ролю гістарычных угодкаў як інструмента гістарычнай палітыкі гл.: Wolff-Powęska A. Rocznice historyczne jako medium polityki pamięci // Na obrzeżach polityki. Cz. 7. Poznań, 2009. S. 33–45.

ды і маніпуляцыі грамадскай думкай. Пагатоў традыцыйны вобраз Грунвальда з яго цэнтральным тэзісам славяна-германскага супрацьстаяння адпавядаў палітыцы афіцыйнага Мінска, які з 1990-х г., хоць і невыразна, артыкулюе славянафільскую ідэалогію. У кожным разе, калі раней, пачынаючы з 1990 г., угодкі славутай бітвы адзначаліся толькі дзякуючы энтузіязму патрыятычна настроенай інтэлігенцыі[145], то святкаванне 600-годдзя Грунвальда ўпершыню ў Беларусі было зладжана з удзелам дзяржавы.

Цэнтральным месцам беларускіх грунвальдскіх урачыстасцяў у ліпені 2010 г. стаў фэст у Наваградку, дзе апрача міністра культуры Паўла Латушкі і ўладаў Гродзенскай вобласці ў мерапрыемствах удзельнічалі дыпламаты суседніх краін – літоўскі пасол Эдмінас Багдонас і паверанiы польскага дыппрадстаўніцтва Вітальд Юраш. Да ўрачыстасцяў актыўна далучыліся гісторыкі. Спачатку ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі адбыўся круглы стол аб стане даследаванняў Грунвальдскай бітвы, затым падобныя канферэнцыі з удзелам даследчыкаў гісторыі прайшлі ў Навагрудку і ў Гродне. Нацыянальны банк Беларусі выпусціў адмысловыя манеты, прысвечаныя ўгодкам бітвы, а Міністэрства інфармацыі і сувязі – спецыяльную паштовую марку “600-годдзе перамогі пад Грунвальдам”. Нацыянальны гістарычны музей, са свайго боку, адкрыў адмысловую выставу, прысвечаную юбілею Грунвальда. Урэшце, па беларускім тэлебачанні быў паказаны пяцісерыйны фільм пра разгром Тэўтонскага ордэна, дзякуючы якому аб славе даўняй перамогі маглі даведацца нават дамаседы.

Хоць афіцыйныя ўлады Беларусі, як адзначалася, упершыню прыязна паставіліся да грамадскіх ініцыятыў па святкаванні ўгодкаў Грунвальда, сваю праграму для юбілею падрыхтаваў і грамадскі аргкамітэт на чале з мастаком Міколам Купавам, які не разлічваў на дапамогу дзяржаўных структур[146]. Грамад-

[145] Як вышэй адзначалася, традыцыйная абыякавасць уладаў да гэтай падзеі суправаджалася захадамі па стрымліванні грамадскіх ініцыятыў святкавання дня бітвы пад Грунвальдам, што давала падставы папракаць іх у імкненні “сцерці дату з народнай памяці”. Гл.: Матусевіч К. Грунвальд: вынік – адказ // Свабода. 2000. 14 ліпеня. С. 3.

[146] У Міколы Купавы былі падставы наракаць, што сама дзяржава і дзяржаўныя СМІ абмінаюць тэму юбілею Грунвальда. Гл.: Абакунчык Г. 600 гадоў пасьля Грунвальду // http://www.svaboda.org/content/article/2074908.html [уваход 10.11.2013]

ская праграма таксама ўключала і навуковую канферэнцыю, і фэст сярэднявечнай культуры, і выставу мастакоў творчай суполкі "Пагоня", а галоўнае – удзел беларускіх харугваў у інсцэніроўцы бітвы на Грунвальдскім полі. Дзякуючы грамадскаму аргкамітэту вялікая дэлегацыя з Беларусі, што брала ўдзел у галоўных урачыстасцях у Польшчы, мела 30 рэканструяваных харугваў, пад якімі калісь у сечу мелі ўступіць фармаванні Вітаўта.

Апрача мастакоў чынны ўдзел у публічным святкаванні юбілею брала Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны на чале з А. Трусавым. У прыватнасці, ініцыятыўныя групы ТБМ збіралі подпісы за наданне вуліцам імя Грунвальдскіх і ўсталяванне памятных знакаў да 600-годдзя перамогі[147]. Звароты грамадзян прынеслі плён прынамсі ў Лідзе, дзе ўлады назвалі Грунвальдскай адну з вуліц горада.

Серыя "грунвальдскіх" мерапрыемстваў, праведзеных у гарадах Беларусі ў ліпені 2010 г.[148], стала добрай нагодай, каб пра далёкую падзею даведаліся сапраўды шырокія колы насельніцтва краіны. З нагоды 600-й гадавіны бітвы ў Беларусі выйшла і даволі значная колькасць публікацый пра Грунвальд – не толькі газетных, але і часопісных[149], і кніжных. Нельга не прызнаць, што тэма Грунвальда на гэты раз, праз сто гадоў пасля яе ўключэння ў нацыянальны гістарычны наратыў, стала фактам свядомасці сапраўды шырокіх масаў насельніцтва. Перадачы і публікацыі масмедыяў, культурныя мерапрыемствы і навуковыя канферэнцыі сталі своеасаблівым форумам, на якім адбывалася публічная актуалізацыя далёкай гісторыі. У гэтай сувязі важна прыгледзецца, які змест мелі грунвальдскія пасланні юбілейнага года.

У навуковым дыскурсе, хоць юбілей не выклікаў выбуху даследчыцкай цікавасці, з'явілася серыя спецыяльных прац гісторыкаў. У большасці такіх публікацый, прысвечаных асобным аспектам грунвальдскай праблематыкі, аўтары абыходзіліся без спекулятыўных разваг. Аднак сама атмасфера юбілею, відаць, і навукоўцаў схіляла да ўслаўлення перамогі, што заўважна

[147] Гл.: НС. 2010. № 18. С. 1. Пра Грунвальдскую вуліцу ў Лідзе гл.: НВ. 2010. 6–8 ліпеня. С. 7.

[148] Беларусь пад знакам Грунвальда // НС. № 28. С. 1; Да 600-годдзя Грунвальдскай перамогі // НС. 2010. №. 28. С. 3.

[149] Грунвальду быў прысвечаны асобны нумар Arche (2010, № 10) і блок артыкулаў у БГА (2010, т. 17).

па матэрыялах згаданага “круглага стала” акадэмічных гісторыкаў[150]. Найбольш пафасна Грунвальд характарызаваў акадэмік НАН Беларусі Міхаіл Касцюк. Мяркуючы па апублікаваным тэксце выступу, гісторык перакананы ў тым, што перамога ўсходніх славян пад Грунвальдам не толькі “спыніла нямецкую агрэсію на ўсход” на болей як паўтысячу гадоў, але і выклікала “карэнныя геапалітычныя змены” ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, таму яе значэнне “немагчыма перабольшыць”. У дадатак М. Касцюк своеасабліва актуалізаваў даўнюю перамогу: на яго думку, “абагульнены воблік Грунвальда” не толькі дапамагаў у барацьбе з нацысцкай Нямеччынай, але нібыта і сёння станоўча ўплывае на грамадзян Беларусі. Бо перамога пад Грунвальдам і ў наш час, маўляў, “адыгрывае сваю пазітыўную ролю ў гістарычным працэсе захавання і ўмацавання беларускім і іншымі суседнімі народамі сваіх пазіцый”[151]. Якім чынам? – гэтага аўтар не патлумачыў ні словам.

Новай з’явай у навуковым дыскурсе пра Грунвальд можна назваць тэматызацыю бітвы ў гістарычнай памяці, чым вызначылася адпаведная канферэнцыя ў Гродне. Публікацыі дакладаў Ю. Мікульскага[152] пра ўспрыманне Грунвальда старабеларускімі элітамі і А. Літвінскага[153] пра месца даўняй перамогі ў гістарычнай свядомасці сучаснай Беларусі ўяўляюцца вартымі ўвагі спробамі паказаць залежнасць вобразаў бітвы і прыпісваных ёй сэнсаў ад канкрэтных эпох і перспектыў. У большасці ж навуковых выданняў, звязаных з юбілеем Грунвальда, бітва ў цэлым трактавалася ў рэчышчы традыцыйных схем, без спробаў выйсці за стэрэатыпныя ўяўленні. У прыватнасці, і ў манаграфіі Ю. Бохана “Ваяры Грунвальд-

[150] З апублікаваных матэрыялаў яго ўдзельнікаў дастаткова крытычнымі да ранейшай традыцыі аказаліся толькі даклады Ю. Бохана, А. Шаланды і Г. Галенчанкі, якія паставіў пад сумненне шырокапрынятае меркаванне аб бітве 1410 г. як аднаразовым разгроме Ордэна. Гл.: Грунвальдская бітва 1410 г.: вынікі і перспектывы даследавання // Полымя. 2010. № 6. С. 160. Гл. таксама: Нёман. 2010. № 6. С. 178–189.

[151] Тамсама. С. 154–155.

[152] Мікульскі Ю. М. Грунвальдская бітва 1410 г. у старабеларускай традыцыі // Вялікае княства Літоўскае і яго суседзі ў XIV–XV стст.: саперніцтва, супрацоўніцтва, урокі. Мінск, 2011. С. 92–120.

[153] Літвінскі А. У. Месца Грунвальдскай бітвы ў гістарычнай свядомасці беларусаў // Вялікае княства Літоўскае і яго суседзі ў XIV–XV стст. С. 151–156.

скай бітвы"[154] тэма разгледжана ў кантэксце "двухсотгадовай барацьбы насельніцтва беларускіх зямель з крыжацкай агрэсіяй". У гэтым шэрагу асобнай увагі магла б заслугоўваць выдадзеная напярэдадні юбілею кніга Р. Гагуа пра польскую "Хроніку канфлікта" як адну з галоўных крыніц для даследавання бітвы[155]. Аўтар, паміж іншага, выступіў з дэманстрацыйным адмаўленнем шэрагу стэрэатыпных палажэнняў, якія ўсё яшчэ пашыраны ў беларускай гістарыяграфіі Грунвальда. Аднак названая кніга была напісана з настолькі грубым парушэннем нормаў прафесійнай этыкі, у тым ліку з прысваеннем вынікаў чужых даследаванняў, што яе не выпадае разглядаць як самастойную навуковую працу[156]. Што ж да спосабу прэзентацыі падзеі, то і Р. Гагуа ў цэлым застаўся ў традыцыі яе манументалізацыі.

Папулярызатарскія выданні з нагоды юбілею, за якімі стаялі гісторыкі-аматары, увабралі ўвесь набор знаёмых стэрэатыпаў, прапусціўшы іх толькі праз оптыку беларускага патрыятызму. Найбольш паказальнай у гэтым плане можна лічыць кнігу Анатоля Тараса "Грюнвальд, 15 июля 1410 г.", створаную шляхам кампіляцыі прац розных эпох, пераважна даўно састарэлых навукова, таму на ёй спынімся асобна.

Ужо на пачатку аповеду пра Вялікую вайну 1409–1411 г. аўтар пераконвае, што яе трэба разглядаць у кантэксце ўсё той жа "ваенна-палітычнай стратэгіі ордэна *Drang nach Osten*", мэтай якой нібыта было стварэнне ўсё той жа "Вялікай Тэўтоніі – ад вострава Руген у Балтыйскім моры да Фінскага заліва. З уключэннем у склад ордэнскіх зямель цяперашняй Польшчы, Летувы, Беларусі, Пскоўшчыны і ўладанняў Вялікага Ноўгарада <...> Жамойць, Літву і Польшчу ў перспектыве чакаў той жа лёс, які спасціг прусаў – калі не знішчэнне, то аня-

[154] Бохан Ю. М. Ваяры Грунвальдскай бітвы. Мінск, 2010. Усё ж і гэтае выданне пісалася пад юбілей, г. зн. як аказіянальнае. У кожным разе няма падстаў гаварыць пра якія-небудзь новыя навуковыя канцэпцыі, якія, па словах аўтара, нібыта прадстаўлены ў кнізе (гл.: "Дзякуючы Грунвальду нас пачалі паважаць" // НН. 2010. 14 ліпеня. С. 11).

[155] Гагуа Р. Б. Грюнвальд в источниках: "Хроника конфликта Владислава, короля Польши, с крестоносцами в год Христов 1410". Пинск, 2009.

[156] Падрабязней гл.: Сагановіч Г. Калі змаўкаюць папярэднікі: Пра псеўданавуковае даследаванне Грунвальдскай бітвы // БГА. Т. 16 (2009). С. 561–580.

мечванне". Усю гэтую фантазію, абставіны нараджэння якой мы высвятлялі вышэй (гл. 8.4), А. Тарас прыпісвае Вітаўту з Ягайлам, якія, па ягоных словах, "выдатна разумелі гэта"[157]. Далей ён без долі сумненняў называе галоўнай мэтай крыжовых паходаў і ўсялякага "навяртання ў сапраўдную веру" не што іншае, як "захоп зямель з ператварэннем мясцовых сялян у прыгонных". З улікам падобнай аўтарскай эрудыцыі не павінна здзіўляць, што Тэўтонскі ордэн, паводле А. Тараса, меў галоўнай задачай "занявольванне і анямечванне". Праўда, ён анямечваў не адных толькі славян[158], – паспрабаваў своеасабліва мадэрнізаваць архаічны тэзіс аўтар. Аднак і сказанага, здаецца, ужо дастаткова, каб адукаваны чытач мог страціць усялякую цікавасць да далейшага знаёмства з кнігай.

Удакладняючы агульную пазіцыю А. Тараса, варта адзначыць, што ён усё ж паставіў пад сумненне найшырэй распаўсюджанае ўяўленне аб тым, нібыта сутыкненне мела славяна-германскі характар і агрэсія Ордэна скіроўвалася супраць славян. Ён прызнаў, што "галоўным прадметам спрэчкі ў той вайне з'яўляліся не нейкія там славянскія землі, а Жамойць". Тым не менш у завяршэнні аўтар паўтарыў прапагандысцкую формулу з панславісцкімі каранямі: «Гэтая бітва паклала канец тэўтонскай палітыцы "націску на ўсход"» (да кайзераўскай акупацыі земляў Беларусі вясной 1915 г.)[159].

Высвятленню, каму належыць слава перамогі 1410 г., – пытання, якое больш за сто гадоў выклікала спрэчкі нацыянальных гісторыкаў і папулярызатараў, шмат увагі прысвяціў як А. Тарас, так і аўтар наступнай публіцыстычнай кнігі Валеры Навасельскі[160]. Апошні вызначыў для сябе гэтае заданне як "самае галоўнае". Аўтар кнігі прапанаваў сваё патрыятычнае апісанне бітвы, аспрэчыўшы, як і А. Тарас, традыцыйную польскую версію, асабліва тэзіс аб уцёках ліцвінаў і "выключна польскім укладзе" ў дасягненне перамогі[161]. Ужо ў пачатку

[157] Тарас А. Е. Грюнвальд, 15 июля 1410 г. Минск, 2010. С. 40.

[158] Тамсама. С. 148.

[159] Тамсама. С. 144, 149.

[160] Новосельский В. В. Великая война 1409–1411 годов. Грюнвальдская битва. Минск, 2010.

[161] У кантэксце патрыятычных выданняў юбілейнага года пэўным кур'ёзам выглядае публікацыя "Грунвальдскай бітвы" Яна Длугаша часопісам "Маладосць" у перакладзе на беларускую мову, але без каментароў прафесійных гісторыкаў (гл.: Маладосць. 2010. № 1–7).

кнігі ён узяўся сцвярджаць, што сілы ВКЛ “дзейнічалі на роўных з палякамі”, і гэта яны ўнеслі “вырашальны ўклад у разгром Ордэна”[162]. Нам важней, аднак, як аўтар зразумеў гістарычнае значэнне бітвы. На жаль, і тут усё тыя ж архаічныя клішэ. Каб падкрэсліць маштабную “беспрэцэдэнтнасць” сутыкнення (бітва “па сваіх маштабах не ведала сабе роўных ва ўсёй вядомай гісторыі Сярэднявечча”), В. Навасельскі адразу назваў яе супрацьстаяннем “каласальных мас германцаў і славян, злёгку разбаўленых балтамі (літоўцамі) і цюркамі (татарамі)”[163]. Паводле аўтара, які таксама ўзнавіў дух публікацый халоднай вайны, “упарты націск германскіх феадалаў на Усход” не проста працягваўся два стагоддзі, а ўзрастаў, і “на пачатак XV ст. не толькі не аслаб, але нават узмацніўся”. Таму Грунвальд, натуральным чынам, стаў кульмінацыяй усёй вайны, пераломам у “шматвекавым супрацьстаянні славян і балтаў нямецкаму руху на ўсход”[164].

У папулярызатарскай кнізе Аляксандра Вялько і Міхаіла Марціновіча “Грунвальдская бітва” даўнія падзеі таксама асвятляюцца з беларускіх патрыятычных пазіцый, што не перашкодзіла аўтарам прэзентаваць бітву і як вырашальнае славяна-германскае сутыкненне. Ужо прадмова У. Грозава, у якой сцвярджаецца, што Тэўтонскі ордэн пагражаў “гвалтоўнай асіміляцыяй і знішчэннем славянскіх народаў”, а перамога над ім “дала народам больш за 500 гадоў перадышкі ад германскага нашэсця на Усход”, нагадвае стыль ваеннай прапаганды. Асобныя пасажы У. Грозава выклікаюць асацыяцыю з выказваннем Сталіна пра найлепшыя якасці рускага народа. У славутай бітве, піша ён, “праявіліся найлепшыя рысы, уласцівыя славянам: калектывізм, згуртаванасць, адзінадушнасць перад абліччам небяспекі”; ды і сам разгром Тэўтонскага ордэна – гэта “перамога сілы духу славян, аб’яднаных шматвекавымі хрысціянскімі традыцыямі”[165]. Галоўныя ж тэзісы саміх аўтараў кнігі перагукаюцца з прапагандысцкімі ідэямі Грунвальдскага юбілею 1960 г., калі даўняя перамога над Тэўтонскім ордэнам рэкламавалася як “сімвал яднання народаў у ба-

[162] Новосельский В. В. Великая война 1409–1411 годов. С. 9.
[163] Тамсама. С. 7.
[164] Тамсама. С. 20.
[165] Велько А., Мартинович М. Грюнвальдская битва. Минск, 2010. С. 3. Варта ўказаць, што кнігу выпусціла Беларуская Праваслаўная Царква.

рацьбе супраць агульнага ворага" (гл. публікацыі У. Каралюка і інш.). На іх думку, Грунвальдская бітва паказала, "што супольная барацьба супраць агульнага ворага – зарука перамогі", бо менавіта аб'яднаныя сілы народаў перамаглі "магутны Ордэн, які пагражаў суседнім народам на працягу двух стагоддзяў". А князя Вітаўта, дзякуючы Грунвальду, маўляў, "помнілі як правіцеля, які выратаваў ад нямецкай агрэсіі" не толькі Вялікае Княства, але і "ўсю Усходнюю Еўропу"[166].

Найбольш экспрэсіўнай рыторыкі і спекуляцый палітычнага характару, звязаных з тэмай Грунвальда, з'явілася, як і можна было чакаць, у юбілейных публікацыях на старонках перыядычных выданняў. У гэтай сувязі асобнай увагі заслугоўвае размова пра вялікую бітву з галоўным рэдактарам часопіса "Беларуская думка" Вадзімам Гігіным, апублікаваная ў газеце Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь[167]. Кіраўнік прэзідэнцкага перыёдыка, вядомы адстойваннем пазіцый "заходнерусізму", узяўся сцвярджаць ідэю пра "надзвычайную пагрозу" Тэўтонскага ордэна для славян, у чым пераўзышоў М. Каяловіча, не кажучы пра Я. Трашчанка (апошні, як адзначалася ў папярэднім раздзеле, указваў на нязначнасць пагрозы крыжаносцаў у параўнанні з нашэсцем качэўнікаў). В. Гігін наўпрост параўнаў небяспеку рыцараў для Заходняй Русі з мангольскім нашэсцем на Русь Усходнюю. Па рыторыцы, якой апісана экспансія крыжаносцаў, ствараецца ўражанне, што размова вядзецца пра вайну Гітлера, а не паходы сярэднявечнага рыцарства: "гэта быў татальны знішчальны націск", "бясконцы крывавы паход", "поўнамаштабная нямецкая агрэсія на Усход". Рулявы цэнтральнага ідэалагічнага перыёдыка не пашкадаваў эпітэтаў, каб сцвердзіць ідэю аб спрадвечнай варожасці паміж Беларуссю і Захадам. Маўляў, Грунвальд закончыў "эпоху бясконцай, крывавай і жорсткай барацьбы" не толькі з тэўтонцамі, але шырэй – "з заходнееўрапейскім рыцарствам", якое, паводле В. Гігіна, у Беларусі "ўспрымалася як абсалютнае зло і смяротная пагроза". І далей, як вопытны майстар маніпуляцый, для большай пераканаўчасці сказанага аўтар сімвалічна прыраўняў даспехі сярэднявечных рыцараў да формы гітлераўскіх СС-фармаванняў[168].

[166] Тамсама. С. 78.
[167] Победа под Грюнвальдом: слава и рубеж нашей истории // Белорусская военная газета. 2010. 16 июля. С. 4–5.
[168] Тамсама. С. 5.

У падобным духу ці не ўпершыню пасля 1960 г. пра Грунвальд напісала “Советская Белоруссия”[169]. Гістарычныя адносіны немцаў са славянамі і тут абмаляваны ў духу Генрыка Сянкевіча: маўляў, да 1410 г. тэўтонцы не давалі жыцця “няшчасным славянскім землям”. Як і В. Гігін, аўтар Аркадзь Мядзведзеў скарыстаўся сумнеўным прыёмам, параўнаўшы рыцараў-крыжаносцаў з сучаснай ваенна-палітычнай арганізацыяй NATO.

У стылі адвечнага змагання славян з Захадам прэзентавалі юбілей вялікай перамогі і ў газеце камуністаў Беларусі. Аднак, што нечакана, з беларусацэнтрычнай перспектывы, якую для камуністаў можна лічыць рэдкай з’явай. Ацэньваючы значэнне перамогі, палкоўнік запасу Сяргей Гамолка напісаў, што Грунвальд забяспечыў не толькі “перал ом у гісторыі развіцця славянскіх дзяржаў”, адвёўшы ад іх нямецкую пагрозу. Аўтар пераканаты, што перамога шмат значыла для інтэграцыі ўдзельных княстваў у адну дзяржаву, “для яднання беларускай нацыі”: маўляў, туды ішлі жыхары розных зямель, а з бітвы “вярталіся адзіным народам”. Больш за тое, менавіта Грунвальд абумовіў “наяўнасць… беларускай дзяржаўнасці”[170], – заключыў ён.

Як вырашальную бітву, “дзякуючы якой славяне засталіся славянамі”, і без якой невядома, “ці былі б на гэтай зямлі беларусы, палякі, літоўцы”, – так паднесла чытачам Грунвальд “Народная газета”[171]. Зусім блізкім да такіх поглядаў аказаўся і вобраз Грунвальда, прэзентаваны ўрадавай “Звяздой”, у якой Глеб Лабадзенка таксама характарызаваў перамогу як “спыненне пагрозы знішчэння дзяржавы, падпарадкавання нашых продкаў ордэну і анямечвання”[172]. Аўтар глядзеў на выратавальную бітву, вядома ж, з беларускай нацыянальнай перспектывы, не артыкулюючы агульнаславянскага патрыятызму, што так паслядоўна дэкларараваўся аўтарамі, заклапочанымі сцвярджэннем ідэі агульнарускага адзінства. З падобнай патрыятычнай візіі прэзентаваны Грунвальд і ў “Настаўніцкай газеце” – як прыклад славяна-балцкага братэрства ў барацьбе са смяротным

[169] Медведев А. Грюнвальдская битва: 600 лет спустя // СБ. 2010. 15 июля. С. 6.

[170] Гамолко С. 15 июля 2010 – 600 лет Грюнвальду // Коммунист Беларуси. 2010. 17 июля. С. 6; 24 июля. С. 6–7.

[171] Рэха Грунвальда // НГ. 2010. 15 ліпеня. С. 1.

[172] Лабадзенка Г. Грунвальд – напамін, што мы нацыя рыцараў і асілкаў // Звязда. 2010. 15 ліпеня. С. 2.

ворагам[173]. Не заставалася ўбаку і газета творчай інтэлігенцыі: тыднёвік паведамляў пра грунвальдскія ўрачыстасці ў Мінску і Наваградку, пра кнігі Ю. Бохана і Р. Гагуа, а таксама надрукаваў дзве новыя паэмы, прысвечаныя перамозе, якая "перапыніла трыумфальнае шэсце рыцараў-крыжакоў на ўсход"[174].

Адным словам, што праз дзяржаўныя газеты да грамадства даносіўся збольшага аднастайны комплекс ідэй пра сутнасць і гістарычнае значэнне Грунвальда, які на здзіўленне паслядоўна ўзнаўляў савецкія прэзентацыі бітвы па ўзорах эпохі Вялікай Айчыннай вайны. Аднак у незалежных медыях, якіх, праўда, у краіне амаль не засталося, падобнага адзінагалосся не атрымалася. Вядома, Анатоль Грыцкевіч у сваіх публіцыстычных публікацыях пра бітву ў 2009 і 2010 г. паўтарыў ранейшыя тэзісы: пра перамогу як "спыненне нямецкай агрэсіі на ўсход", пра выратаванне беларусаў ад вынішчэння ці "асіміляцыі нямецкімі заваёўнікамі" як прусаў і пра "пяцьсот гадоў", цягам якіх нямецкія жаўнеры не прыходзілі на тэрыторыю Беларусі[175]. Затое амаль нічога з гэтага не засталося ў папулярызатарскай публікацыі Алеся Пілецкага ў "Нашай Ніве"[176], які апісаў Грунвальд без якой бы там ні было сакралізацыі. Замест прывычных сцвярджэнняў пра непазбежнасць выратавальнага сутыкнення малады аўтар адзначыў, у прыватнасці, што вайну справакаваў Вітаўт і што перад пачаткам ваенных дзеянняў заставаліся альтэрнатыўныя варыянты ходу гісторыі. Адмовіўшы важнасць этнічнага падзелу, – ключавы аргумент прыхільнікаў традыцыйнага трактавання бітвы як абароны ад немцаў, А. Пілецкі пазбавіў Грунвальд і прыпісанага яму лёсавырашальнага значэння. Аўтар назваў бітву проста "такой буйной падзеяй еўрапейскай гісторыі, што яе грукат дакаціўся да нашага часу...". Праўда, прыклады падобнага адступлення ад стэрэатыпаў у публічным дыскурсе так і засталіся адзінкавымі[177].

[173] Вашчанка А. Юбілей славутай перамогі, або Другой такой буйной бітвы гісторыя сярэдневякоўя не ведала // Настаўніцкая газета. 2010. 10 ліпеня. С. 8–9.

[174] ЛіМ. 2010. 9 ліпеня. С. 14, 16; 16 ліпеня. С. 8; Кніжны свет. 2010. 16 ліпеня. С. 8.

[175] Грыцкевіч А. Грунвальд, наша слава... // НВ. 2010. 13–15 ліпеня. С. 6; пар.: ён жа. Грунвальдская бітва 1410 г. – ліквідацыя пагрозы незалежнасці ВКЛ // НС. 2009. № 24. С. 4; № 25. С. 4.

[176] Пілецкі А. Правакацыя Вітаўта // НН. 2010. 14 ліпеня. С. 12.

[177] Крыху раней са спробай дэміфалагізацыі бітвы ў медыях выступаў і аўтар гэтых радкоў. Гл.: Сагановіч Г. Пра славу і бляклaсць Грунвальду // НН. 2008. 17 ліпеня. С. 12.

Калі сумаваць назіранні, то атрымліваецца, што ў пасланні афіцыйнага Мінска Грунвальд прэзентаваўся пераважна як сімвал адвечнага змагання славян з немцамі ці нават з Заходняй Еўропай. Словам, сярэднявечная бітва пры яе публічнай актуалізацыі паўстала ў святле славянскага трыумфу над нямецкім "Дранг нах Остэн", што быў канчаткова спынены вялікай перамогай над гітлераўскай Нямеччынай! "Дзякуючы Грунвальду славяне засталіся славянамі, захавалі сваю веру, мову, нацыянальную прыналежнасць і самасвядомасць", – напісаў нехта да ўгодкаў у "Народнай газеце"[178]. У гэтым афіцыйны канцэпт Грунвальда сваім галоўным зместам супаў з тым патрыятычным вобразам вялікай бітвы, які з 1980-х г. пашыралі беларускія пісьменнікі, публіцысты і гісторыкі нацыянальнай арыентацыі, што падавалі Грунвальд як выратаванне беларусаў ад анямечвання. Стары панславісцкі тэзіс быў своеасабліва канкрэтызаваны А. Тарасам, які на прэзентацыі сваёй кнігі перад грамадскасцю звёў яго да застрашальнага вобраза: "не было б Грунвальда – мы б зараз з вамі размаўлялі на добрай нямецкай мове"[179].

Іншая вартасць здабытай перамогі над Тэўтонскім ордэнам экспанавалася толькі ў рэдкіх выпадках, да таго ж у неафіцыйным дыскурсе. Напрыклад, у разуменні А. Трусава бітва пад Грунвальдам "сведчыць пра слаўнае мінулае беларусаў як вялікай еўрапейскай нацыі". На яго думку, толькі пасля Грунвальда "Беларусь стала неад'емнай часткай еўрапейскай цывілізацыі"[180]. Падобны падыход пазнаецца ў развагах Ю. Бохана, са слоў якога Грунвальд найбольш важны тым, што пасля бітвы ВКЛ стала "не аб'ектам тэўтонскай экспансіі, а суб'ектам еўрапейскай палітыкі" і што перамога дазволіла Беларусі "прасекчы акно ў Еўропу – на 300 гадоў раней за Расію"[181].

Падагульняючы, можна канстатаваць, што пераацэнка далёкай бітвы ў адпаведнасці з новым часам, канструяванне нейкай сваёй сімволікі Грунвальда ў Беларусі не атрымалася. Сапраўды, калі не браць у разлік тэзіса пра перамогу як пацверджанне "еўрапейскасці" Беларусі, то ідэйны змест і рыторыка

[178] Рэха Грунвальда // Народная газета. 2010. 15 ліпеня. С. 1.
[179] "Грунвальд" ад Анатоля Тараса // НС. 2010. № 23. С. 3.
[180] Беларусь пад знакам Грунвальда // НС. 2010. № 28. С. 1.
[181] "Дзякуючы Грунвальду нас пачалі паважаць" // НН. 2010. 14 ліпеня. С. 11; Да 600-годдзя Грунвальдскай перамогі // НС. 2010. №. 28. С. 3.

большасці грунвальдскіх публікацый 2010 г. выразна нагадвала расійскія і польскія выданні стагадовай даўнасці, а таксама савецкія прапагандысцкія трактоўкі 1940-х і 1960-х г. Пераважна адтуль яны і былі запазычаны. Такім шляхам святкаванне 600-х угодкаў гістарычнай перамогі актуалізавала ідэалагемы мінулага, прычым у сваіх галоўных ацэнках значэння бітвы і яе месца ў мінулым Беларусі афіцыйная гістарычная палітыка гэтым разам супала з неафіцыйнай. У кантэксце ўсіх папярэдніх угодкаў Грунвальда, калі патрыятычныя ініцыятывы нацыянальнай інтэлігнцыі стрымліваліся афіцыйнай уладай, нішто не прадказвала такога адзінагалосся ў ацэнках гістарычнай падзеі. Гэтым жа разам манументальны вобраз Грунвальда аб'яднаў усіх: адэптаў заходнерусізму з нацыянальна заангажаванымі гісторыкамі, камуністаў з дзеячамі праваслаўнай царквы. Можна сказаць, ён аказаўся месцам з'яднання патрыятызмаў нацыянальнага з дзяржаўным, які афіцыйныя ўлады імкнуліся ні ў якім разе не ідэнтыфікаваць з традыцыямі беларускага нацыянальнага руху. На жаль, тое, чым юбілейны вобраз Грунвальда зблізіў праеўрапейскую нацыянальную інтэлігенцыю і прарасійскія ўлады Беларусі як даўніх апанентаў, аказалася не спроба паглядзець на бітву як на месца памяці і прымірэння, як на пасланне гісторыі народам вучыцца жыць без нянавісці, у духу сучаснай Еўропы, а зноў актуалізаваны стэрэатып адвечнага ворага славян у дыскурсе абарончай вайны з Захадам. З гэтай нагоды згадваюцца вядомыя словы Э. Рэнана пра нацыю як супольнасць, з'яднаную "памылковым поглядам на мінулае і нянавісцю да суседзяў".

Што да ўгодкаў Грунвальда, то ўдзел афіцыйных уладаў у юбілейных мерапрыемствах 2010 г. зусім не азначаў, што дзень 15 ліпеня ўвайшоў у афіцыйны гістарычны каляндар Беларусі. Разважаючы на гэтую тэму ў канцы юбілейнага года на старонках часопіса Адміністрацыі прэзідэнта "Беларуская думка" – вядучага медыятара афіцыйнай ідэалогіі, гісторык Алег Ліцкевіч выказаў думку, што пасля першых афіцыйных святкаванняў "значэнне бітвы ў дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь будзе няўхільна ўзрастаць"[182]. Аднак такому прадказанню пярэчыў сам жа прэзідэнцкі часопіс, які пасля юбілею застаўся абыякавы да грунвальдскай тэмы. Пры адсутнасці артыкуляванай гістарычнай палітыкі беларускай дзяржавы пытанне аб

[182] Лицкевич О. Формула Грюнвальда // БД. 2010. № 12. С. 76.

каляндарным статусе дня Грунвальдскай перамогі засталося адкрытым. І ўжо праз некалькі гадоў пасля юбілею бітвы патрыятычна настроены ананімны аўтар са шкадаваннем канстатаваў, што чарговыя ўгодкі Грунвальда ў Беларусі зноў прайшлі незаўважна. Пры гэтым ён палічыў патрэбным традыцыйна нагадаць чытачам, што даўняя перамога "спыніла нямецкую экспансію на прыбалтыйскія і ўсходнеславянскія землі"[183].

Як выглядае, пасля ўрачыстасцяў юбілейнага года дзяржаўныя масмедыі Беларусі зноў дружна "забыліся" пра дзень Грунвальдскай бітвы. Хуткі адыход Грунвальда ў забыццё пасля гучных угодкаў уяўляецца зусім не выпадковым. На падтрымку памяці пра Грунвальд у Беларусі няма грамадскага запатрабавання.

[183] Забыты Грунвальд // НВ. 2014. 18 ліпеня. С. 1.

# Падсумаванне

*Сучасныя людзі павінны самі несці адказнасць за свае "прымітыўныя" захапленні і шаленствы, не прыпісваючы іх даўнім часам ці далёкаму народу.*

Іван Стрэнскі[1]

Перыпетыі "пасмяротнага жыцця" Грунвальдскай бітвы пераконваюць, што яна можа лічыцца адным з найбольш яркіх прыкладаў таго, як з перакручанай і сфальшаванай гісторыі ствараюцца палітычныя міфы на задавальненне надзённых патрэбаў нацый і рэжымаў. І як яны потым, здэмаскаваныя і паўзабытыя, рэактывуюцца і набываюць папулярнасць у новых эпохах для зусім іншых патрэбаў.

У кантэксце камемарацыйнай практыкі дамадэрнай эпохі памяць пра вялікую бітву 1410 г. не ўяўляла з сябе нечага выключнага. Яна то падтрымлівалася, то гублялася, у залежнасці ад актуальнай сітуацыі. Нават у польскіх элітах успаміны пра перамогу над Ордэнам перарываліся, страціўшы сваю актуальнасць, не гаворачы пра ВКЛ, дзе яна толькі спарадычна згадвалася як аргумент у спрэчцы з палякамі. Затое гараджане Прусіі ўшаноўвалі вызваленне свайго краю ад Тэўтонскага ордэна. Транснацыянальны характар памяці пра Грунвальд быў натуральны для тых часоў, калі войны Ордэна з ВКЛ і Польскім каралеўствам, як і нямецкая каланізацыя ўсходніх земляў, яшчэ не мелі ніякай нацыянальнай падаплёкі. Скрозь прызму нацыянальных інтарэсаў сярэднявечная бітва пачала ўспрымацца толькі ў XIX ст., калі пасля анексіі польскіх тэрыторый Прусіяй і Аўстрыяй узнік польска-нямецкі антаганізм, і асабліва пасля "Вясны Народаў", якая зрабіла немагчымым далейшае мірнае суіснаванне славян і немцаў у Прусіі і Аўстрыі.

Узнікненне польскага міфа Грунвальда было ў многім абумоўлена абарончай рэакцыяй на палітыку германізацыі, якую

[1] Strenski I. Four Theories of Myth. P. 41.

прускія ўлады праводзілі на анексаваных польскіх землях. Ва ўмовах прыцяснення немцамі палякі сталі бачыць у перамозе 1410 г. сімвал былой моцы Польшчы, якая спыніла нямецкі націск на ўсход – *Drang nach Osten*. З іншага боку, канфлікты з палякамі і нацыянальнае абуджэнне славянскіх народаў Аўстра-Венгрыі з заклікамі да агульнаславянскага аб'яднання на чале з Расіяй успрымаліся немцамі як небяспека панславізму і выклікалі процілеглую рэакцыю, якая канструявала нямецкую мадэль *Drang nach Osten* з пазітыўнымі ацэнкамі. Нямецкая нацыяналістычная гістарыяграфія "адкрыла" тэўтонскіх рыцараў як барацьбітоў за інтарэсы нямецкага народа – папярэднікаў палітыкі прускага караля Фрыдрыха Вялікага і канцлера Бісмарка.

Стэрэатып нямецкага "націску на ўсход" уяўляецца ключавым для разумення генезісу міфа Грунвальдскай бітвы ў нацыянальных гістарыяграфіях Усходняй Еўропы, у т. л. беларускай. Зародкі гэтага міфа афарміліся ў апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. адначасова як у польскай, так і ў нямецкай гістарычнай думцы, а пад іх уплывам падобнае ўспрыманне даўняй бітвы пашыралася і панславісцкай публіцыстыкай Расіі. У калектыўную памяць палякаў Грунвальд увайшоў як сімвал польскай перамогі над крыжакамі / немцамі і, як паказаў 500-гадовы юбілей, ужо на пачатку XX ст. стаў агульнанацыянальным міфам. Немцы ж, у якіх польскі культ Грунвальда выклікаў раздражненне, гераізавалі рыцараў Ордэна або імкнуліся заглушыць балючыя ўспаміны пра 1410 г. новым Танэнбергам, штучна звязаўшы з гістарычнай назвай перамогу над расійскай арміяй у 1914 г. Хоць у дзвюх версіях міфа адной бітвы – славянскага Грунвальда і нямецкага Танэнберга – даўняй падзеі прыпісваліся процілеглыя ацэнкі, іх аб'ядноўвала тое, што абедзве сыходзілі з агістарычнага прызнання генетычнай пераемнасці паміж Тэўтонскім ордэнам, Прускім каралеўствам і кайзераўскай Германіяй.

Актуалізацыя памяці пра Грунвальд у Расіі была звязана таксама з умацаваннем Нямеччыны і абвастрэннем нацыянальных канфліктаў у Аўстра-Венгрыі. Палітыка імперскага панславізму, да якой перайшоў расійскі ўрад, спрыяла пашырэнню германафобскіх настрояў і ўспрымання ваеннага сутыкнення Расіі з Нямеччынай як непазбежнасці. У царскай імперыі да памяці Грунвальда звярталіся, акрамя польскіх элітаў, галоўным чынам гісторыкі панславісцкай арыентацыі, асабліва прадстаўнікі школы заходнерусізму, якія аспрэчвалі ў Польшчы ролю пераможцаў над немцамі. А вось у колах маладога нацыянальнага руху беларусаў даўняя бітва не выклікала прыкметнай увагі. Дата пера-

могі над Ордэнам трапіла ў нацыянальны гістарычны наратыў толькі ў 1910 г., калі рэдакцыя "Нашай Нівы" і звязаны з ёй асяродак спрабавалі замацаваць яе ў нацыянальным календары, аднак іх ініцыятыва не перарасла ў традыцыю.

Пасля ўтварэння БССР першая школа нацыянальнай гістарыяграфіі таксама не бачыла ў Грунвальдскай бітве значнай падзеі і вельмі стрымана ацэньвала ролю войнаў з Нямецкім ордэнам у беларускай гісторыі ў цэлым. Разглядаючы мінулае скрозь прызму "эксклюзіўнай" ідэнтычнасці, якая выключала Беларусь з расійскага "мы-згуртавання", яна больш акцэнтавала агрэсіўнасць расійскай дзяржавы, чым заходніх суседзяў. Толькі перад самай вайной з Гітлерам, пераймаючы савецкія ўзоры антынямецкай прапаганды, марксісцкая гістарыяграфія БССР пачала прэзентаваць бітву 1410 г. як значную вяху барацьбы з крыжаносцамі, аднак больш важным этапам гэтай барацьбы падавалася супраціўленне Полацка нямецкім рыцарам у XIII ст.

Гіпербалізацыю гістарычнага значэння сярэднявечнай бітвы выклікала II сусветная вайна. Не без значэння было тое, што ідэолагі Трэцяга Райха рэкламавалі сваю ўсходнюю палітыку як працяг справы, пачатай яшчэ магістрамі Ордэна. У прапагандзе нацыянал-сацыялістаў выкарыстоўвалася сімволіка тэўтонскіх рыцараў як прыклад паспяховага *Drang nach Osten*, паўтараліся ранейшыя ідэі нацыяналістычнай гістарыяграфіі аб культурнай перавазе немцаў над славянамі і г. д., хоць у цэлым Ордэн не атрымаў важнага месца ў гістарычнай ідэалогіі нацыянал-сацыялістаў. Затое ў масавай свядомасці палякаў змрочны вобраз Сянкевічавых крыжакоў пераносіўся на ўсю нямецкую нацыю як натуральнага ворага Польшчы. У сваю чаргу савецкая прапаганда для ўзбуджэння патрыятызму і мабілізацыі народных масаў на вайну з гітлераўцамі ўзнавіла ідэалагемы панславізму пра адвечную варожасць агрэсіўных германцаў. Хоць цэнтральнае месца ў савецкім дыскурсе абарончай вайны нязменна займаў міф Лядовага пабоішча 1242 г., Грунвальд таксама выкарыстоўваўся – ён сімвалізаваў моц славянскага адзінства ў барацьбе з немцамі як шматвекавым ворагам славянскіх народаў.

Нягледзячы на разгром гітлераўскай Нямеччыны, легенда пра "Дранг нах Остэн" засталася важным інструментам савецкай ідэалогіі і пасля вайны. Спасылаючыся на злачынствы нацысцкага рэжыму, лідары якога апелявалі да Тэўтонскага ордэна, афіцыйная прапаганда падтрымлівала стэрэатып немцаў як адвечных ворагаў славян і працягвала эксплуатаваць вобраз Грунвальда, праводзячы лінію наўпроставай сувязі паміж перамо-

гамі 1410 і 1945 г. Устаноўка, згодна з якой сцвярджэнне пра нямецкі "націск на ўсход" па-ранейшаму выдавалася за рэальнасць тысячагадовай гісторыі, а ФРГ дэманізавалася як фарпост рэваншыстаў, што пагражаюць чарговай агрэсіяй, у пасляваенныя дзесяцігоддзі служыла доказванню гістарычнай справядлівасці новых межаў ПНР і ўмацаванню сацыялістычнага блока на чале з СССР. Для манументалізацыі абноўленага вобраза Грунвальда як базавага міфа для гістарычнай ідэалогіі сацыялістычнай Польшчы былі выкарыстаны 550-я ўгодкі бітвы. Перамога 1410 г. сімвалізавала цяпер сілу адзінства народаў сацыялістычных дзяржаў перад рэваншызмам Захаду і бясспрэчнае права Польшчы на новыя землі, атрыманыя ад Нямеччыны. Падобны сэнс Грунвальдскай бітвы ў перыяд халоднай вайны з Захадам мусілі абгрунтоўваць гісторыкі ў СССР і дзяржавах народнай дэмакратыі.

Працэс дэактуалізацыі адзначанай сімвалічнасці грунвальдскага міфа пачаўся ў 1970-я г. дзякуючы наладжванню польска-нямецкага дыялогу і прызнанню новых дзяржаўных межаў. Ён завяршыўся поўнай нармалізацыяй адносін пасля падзення Берлінскай сцяны і знікнення сацыялістычнага блока. Вызваліўшыся ад нацыянальных эгацэнтрызмаў, гістарыяграфіі Рэспублікі Польшча і ФРГ зблізіліся ў трактоўках самых спрэчных праблем супольнай гісторыі, у тым ліку Грунвальдскай бітвы. Грунвальд як сімвал адпору агрэсіўным немцам і вяртання сваіх земляў, што з'яўляўся ключавым складнікам польскай ідэнтычнасці, у новых рэаліях страціў палітычныя функцыі і былое значэнне.

Комплекс ідэй і перакананняў, ідэнтыфікаваных намі як беларускі міф Грунвальдскай бітвы, – з'ява досыць позняя, вытокі якой звязваюцца з дыскурсам антынямецкай прапаганды ўзору Вялікай Айчыннай вайны. Хоць адразу пасля 1945 г. эмацыйная рыторыка асобных публікацый пра тэўтонцаў / немцаў як адвечных ворагаў беларускага і ўсіх славянскіх народаў не выклікала грамадскага рэзанансу ў БССР, зададзеныя вайной узоры асацыяцый не зніклі бясследна. Гістарыяграфія пасляваеннай Беларусі падпарадкоўвалася русацэнтрычнай савецкай канцэпцыі, у якой Грунвальд і пасля 1960 г. не стаў падзеяй першаступеннай значнасці, затое інтэрпрэтаваўся па шаблонах ваеннай эпохі: бітва па-ранейшаму лічылася сімвалам адзінства (ўсходне)славянскіх народаў у шматвяковай барацьбе супраць нямецкіх агрэсараў, нашчадкі якіх заселі ў Боне. Афіцыйная падтрымка вобраза ФРГ як увасаблення гістарычнага зла служыла інтарэсам падзелу свету на "імперыялістычны Захад" і лагер "сацыялістычнай дэмакратыі", дапамагаючы ўма-

цаваць савецкі кантроль над Усходняй Еўропай. Калі афіцыйны Мінск пры ўзгадненні з Масквой распрацоўваў акадэмічную гісторыю БССР як аснову дазволеных інтэрпрэтацый, то перамога 1410 г. разглядалася ў ёй таксама як сімвал адзінства ўсходнеславянскіх народаў у барацьбе супраць чужаземных захопнікаў. Пры гэтым, па аналогіі з агульнасавецкай канцэпцыяй, дзе цэнтральнай падзеяй было Лядовае пабоішча, Грунвальд заставаўся ў цяні той барацьбы, якую вяло супраць крыжаносцаў Полацкае княства. Узвышэнне гераічнага змагання з нямецкімі рыцарамі ў XIII ст. мусіла тлумачыць абставіны, пры якіх заходнія землі Русі адышлі пад літоўскае панаванне. Грунвальдскай бітве не прадугледжвалася раўназначная функцыя, таму ў афіцыйнай гісторыі БССР яна займала маргінальнае месца, а ў гістарычнай адукацыі да 1970-х г. наогул не фігуравала.

Сітуацыя пачала мяняцца ў апошнія дзесяцігоддзі існавання БССР, калі пра Грунвальд узяліся пісаць пісьменнікі і публіцысты, – верагодна, не без уздзеяння прыкладаў савецкай Літвы, дзе юбілей 1960 г. даў пачатак фармаванню афіцыйнага міфа Жальгірыса, а таксама дзякуючы уплывам з сацыялістычнай Польшчы. Пакінутая савецкімі гісторыкамі без належнай увагі бітва еўрапейскага маштабу, у якой бралі ўдзел продкі беларусаў, выдатна пасавала патрэбам вяртання “замоўчанай” нацыянальнай гісторыі, запаўнення “белых плям” і новым трактоўкам мінулага, шлях якім адкрыла перабудова. Экспанаванне Грунвальда як падзеі беларускай гісторыі дазваляла аддаляцца ад савецкага гістарычнага канона і задавальняць недахоп гераічнага мінулага, неабходнага для абуджэння нацыянальнай самасвядомасці. Таму не дзіўна, што ў атмасферы нацыянальнага адраджэння другой паловы 80-х – пачатку 90-х г. бітва пад Грунвальдам успрымалася як эпічнае сутыкненне дабра са злом, і аповед пра яе зафункцыянаваў як палітычны міф.

Аднак гістарычная публіцыстыка, якой і належыць найбольшая заслуга ў папулярызацыі даўняй падзеі, пераняла прапагандысцкія штампы часоў халоднай вайны: пісьменнікі пашырылі ўяўленне пра Грунвальд як тую лёсавызначальную перамогу, што ўратавала беларускі народ ад заваявання Ордэнам і анямечвання, у тым ліку ідэю аб генетычнай пераемнасці паміж тэўтонскімі рыцарамі, кайзераўскай Нямеччынай і нацыянал-сацыялістамі. Яркія вобразы драматычнай барацьбы з моцным ворагам, створаныя пісьменнікамі, паўплывалі на акадэмічных гісторыкаў, а імі былі перанесены ў гістарычную адукацыю. Так у нацыянальнай гістарыяграфіі і адукацыі су-

верэннай Беларусі адбылася рэцэпцыя міфа, асноўныя стэрэатыпы якога служылі антынямецкай прапагандзе ў гады вайны і ўмацаванню саюза дзяржаў Варшаўскага дагавора.

Адзначаная залежнасць беларускай гістарыяграфіі ад публіцыстыкі і грамадскіх настрояў сама па сабе не з'яўляецца нечым асаблівым. Яна ў цэлым адпавядае еўрапейскай практыцы: гісторыкі са сваімі даследаваннямі і ўнясеннем карэктываў, як правіла, прыходзяць пазней, калі ўжо нарадзіліся адпаведныя версіі і сфармавалася канва інтэрпрэтацый, таму гістарыяграфія звычайна прывязваецца да ўжо наяўных сцэнароў, нават калі аспрэчвае іх[2]. Асаблівасць жа беларускага выпадку ў тым, што, па-першае, фармаванне грунвальдскага міфа ў Беларусі адбывалася галоўным чынам тады, калі адышлі ў мінулае яго "хросныя бацькі" – польска-нямецкі антаганізм і раскол Еўропы на два варожыя блокі, калі адпала патрэба ў падтрымцы ўяўленняў пра адвечную славяна-германскую варожасць. І, па-другое, што нягледзячы на гэта, гістарыяграфія прыняла пашыраныя гістарычнай публіцыстыкай анахранічныя клішэ тлумачэння сэнсаў Грунвальда, не ўносячы карэктываў.

Манументальны вобраз гераічнай перамогі з топасам смяротнай пагрозы для Беларусі з боку нямецкіх рыцараў і вялікай (ці нават вырашальнай) ролі беларусаў у перамозе, пашыраны нацыянальнай гістарыяграфіяй, не адпавядаў савецкім і прарасійскім трактоўкам мінулага, вяртанне да якіх ажыццявіў рэжым Аляксандра Лукашэнкі. Яго афіцыйная гістарыяграфія, у згодзе з традыцыямі БССР, зноў падавала бітву маргінальнай падзеяй айчыннай гісторыі. Два погляды на Грунвальд, адлюстроўваючы ідэалагічна розныя падыходы, суіснавалі і на практыцы з часам увасабляліся ў кампрамісныя версіі патрыятычнай прэзентацыі бітвы. Адметна, што сімвалічнасць грунвальдскага міфа, узнесеную нацыянальным гісторыяпісаннем, не выкарыстоўваў А. Лукашэнка. Здаецца, антытэза проціпастаўлення славян Захаду добра пасавала б іміджу цяперашняга прэзідэнта Беларусі як прыхільніка славянскага яднання[3], не гаворачы пра адзначаную савецкую практыку звязваць вікторыю 1410 г. з перамогай 1945 г. Аднак само ўзвышэнне Грунвальда было развіццём калектыўнай памяці "знізу" і магло атаесамляцца з ідэямі прыніжанай апазі-

2 Пар.: Gall L. Confronting Clio. P. 17.

3 У 2005 г. А. Лукашэнка асабіста вітаў удзельнікаў IX Усеславянскага з'езда ў Мінску.

цыі. Наогул, прэзідэнцкаму рэжыму аказаліся непатрэбныя апеляцыі да глыбейшай гісторыі. Як паказала практыка двух апошніх дзесяцігоддзяў, для легітымацыі ўлады, абыякавай да гісторыі як такой, дастаткова міфа Вялікай Айчыннай вайны і атаесамлення незалежнасці краіны з вызваленнем Мінска ад гітлераўцаў.

Да публічнай актуалізацыі памяці пра бітву ў масавым маштабе дайшло ў сувязі з юбілеем 2010 г., які ў Беларусі ўпершыню святкаваўся афіцыйна, з удзелам дзяржавы. З нагоды 600-годдзя Грунвальда выйшла мноства навуковых і папулярных публікацый, а ўрачыстасці набылі небывалы раней маштаб і розгалас, дзякуючы чаму Грунвальд стаў фактам свядомасці шырокіх колаў насельніцтва – праз сто гадоў пасля ўключэння ў нацыянальны наратыў. Гістарычная падзея знайшла ўвасабленне ў новых мастацкіх выявах, у інсцэнізацыі рыцарскіх боек і на тэлеэкране, набыла аб'ектывацыю ў марках, манетах і мікратапаніміцы – здаецца, атрымала ўсё, што патрабуецца для функцыянавання палітычнага міфа. І ўсё ж праз заўважную імітацыйнасць і пераймальнасць адчувалася штучнасць яго паходжання. Невыпадкова міфічнаму ўспрыманню падзеі не хапала эмацыйнага вымярэння: у Беларусі так і не з'явілася ні значных драматычных твораў, ні асобных празаічных раманаў, напісаных на сюжэт Грунвальдскай бітвы[4].

Што да зместу грунвальдскіх пасланняў, то нават навуковыя выданні падавалі падзею ў кантэксце барацьбы з "Дранг нах Остэн", не гаворачы пра публікацыі папулярызатарскага характару, якія проста ўзнаўлялі архаічныя легенды пра перамогу як выратаванне Беларусі ад заваявання нямецкімі рыцарамі, падноўленыя рыторыкай беларускага патрыятызму. Ідэолагі ж афіцыйнага Мінска прэзентавалі вялікую бітву як сімвал славянскага трыумфу ў барацьбе з немцамі і Захадам.

Беларускае святкаванне 600-годдзя бітвы выявіла вартую ўвагі акалічнасць: калі раней выдзяляліся афіцыйны і неафіцыйны вобразы Грунвальда, то апошні юбілей упершыню прадэманстраваў кансэнсус поглядаў розных палітычных груп-

[4] У рамане Вольгі Іпатавай да падзеяў на Грунвальдскім полі даходзіць толькі ў эпілогу, а грунвальдская трагедыя Алеся Петрашкевіча не знайшла сабе дарогі на тэатральную сцэну і засталася фактычна не заўважанай. Гл.: Іпатава В. Знак Вялікага Магістра: раман. Мінск, 2009. С. 280–192; Петрашкевіч А. Крыжовы шлях на Грунвальд. Гістарычная трагедыя // ён жа. Здрапежаная зямля. Гістарычныя п'есы. Мінск, 2003. С. 9–60.

вак на важнасць падзеі. Ён нагадваў конкурс на патрыятычную трактоўку Грунвальда. Поўнае яднанне камуністаў і нацыяналістаў у ацэнках даўняй бітвы можна было назіраць у Польшчы ў гады II сусветнай вайны ці пазней, у эпоху ПНР. Нешта падобнае паўтарылася ў 2010 г. у Беларусі, калі прарасійскія ўлады і праеўрапейскую нацыянальную інтэлігенцыю як палітычных апанентаў зблізіла не спроба паглядзець на 15 ліпеня як на дзень памяці і прымірэння ці як на пасланне гісторыі народам вучыцца жыць без нянавісці, адпаведна духу сучаснай Еўропы, а чарговае ўзнаўленне стэрэатыпаў адвечнага ворага славян у дыскурсе абарончай вайны з Захадам.

Успрыманне падзей мінулага і наданне ім значэнняў не можа заставацца нязменным. Як вядома, гісторыя ўспрымаецца толькі скрозь прызму ідэнтычнасці, якая і вызначае "апорныя пункты" мінулага, суадносячы іх з разуменнем цяперашняга і перспектывай будучыні, на што ўказвалася і ў папярэдніх раздзелах гэтай працы. Сярод гісторыкаў спробы прывязваць сённяшнія ацэнкі падзей да іх успрымання пэўнымі коламі ў мінулым могуць лічыцца кур'ёзам[5]. Яшчэ большай недарэчнасцю выглядае сёння падтрымка афіцыйным Мінскам старога міфа Грунвальда. Нельга не шкадаваць, што мадэль гістарычнай ідэнтыфікацыі ў цяперашняй Беларусі будуецца ўсё яшчэ на супрацьпастаўленні сябе Еўропе і культывацыі ўзораў панславісцкай дэмагогіі. Падтрымка ўяўленняў пра "лёсаноснае значэнне" сярэднявечнай бітвы, замацаваных у масавай свядомасці ў эпоху халоднай вайны, выглядае цяпер абсурднай. Лішне казаць, што міф Грунвальда з яго старой сімвалічнасцю зусім не бязвінны. У пэўным сэнсе ён замацоўвае залежнасць Беларусі ад Расіі, адрыў ад якой у такім кантэксце можа ўспрымацца як перспектыва небяспечная[6]. Грамадства, якому цвердзяць, што еўрапейскія суседзі ў мінулым былі смяротымі ворагамі, наўрад ці зможа адкрывацца і наладжваць з імі стабільныя сяброўскія адносіны. І любая прапаганда тэзіса аб варожасці Захаду да Беларусі працуе на ўзнікненне перакананняў аб фактычным існаванні такой апазіцыі.

[5] З падобным падыходам выступіў Ю. Мікульскі, які звязае "месца Грунвальда ў сучаснай нацыянальнай ідэі Беларусі" з тым, якое значэнне той меў "у старабеларускай традыцыі". Гл.: Мікульскі Ю. М. Грунвальдская бітва 1410 г. у старабеларускай традыцыі. С. 92.

[6] Нагадаем, што стэрэатып варожых сеседзяў абумовіў адмоўнае стаўленне "абласнікоў" да ідэі самастойнасці Беларусі на Усебеларускім з'ездзе ў 1917 г. Гл.: Рудовіч С. Час выбару. Мінск, 2001. С. 186.

Беларускае святкаванне юбілею Грунвальда з анахранічнымі ўзорамі ідэалагічнай інструменталізацыі гісторыі павучальна параўнаць з аналагічнымі мерапрыемствамі ў суседняй Польшчы, дзе прапагандысцкае выкарыстанне памяці пра бітву даўно саступіла месца камерцыйнаму падыходу і відовішчна-забаўляльным аспектам свята[7]. Адкрываючы цэнтральныя ўрачыстасці на грунвальдскім полі ў 2010 г., прэзідэнт Польшчы Браніслаў Камароўскі назваў перамогу 1410 г. напамінкам таго, "як шмат можна дасягнуць разам у пошуку таго, што людзей аб'ядноўвае, а не раздзяляе"[8]. Падобны сэнс мела і прамова прэзідэнта Літвы Далі Грыбаўскайце. У цэлым можна сказаць, што польскае свята характарызавалі настроі прымірэння і паразумення[9]. Да міжнароднай аўдыторыі з высокімі прадстаўнікамі многіх дзяржаў[10] (на жаль, без афіцыйнай дэлегацыі Беларусі) на Грунвальдскім полі са сваёй аптымістычнай прамовай змог звярнуцца вялікі магістр Нямецкага ордэна Бруна Плятэр, запрошаны на юбілей польскім прэзідэнтам, што само па сабе сімвалізавала дэпалітызацыю гістарычнага дня бітвы. Вялікі магістр адзначыў, між іншага, што міф Танэнберга-Грунвальда, узаемна культываваны ў XIX–XX ст. нямецкім і польскім бакамі, больш не належыць сучаснасці, – ён застаўся ў мінулым, і цяпер Танэнберг-Грунвальд можа служыць "пазітыўнай распрацоўцы супольнай будучыні, пераадоленню супярэчнасцяў, волі да прымірэння, паразумення паміж народамі"[11].

[7] Traba R. Historia – przestrzeń dialogu. Warszawa, 2006. S. 222–224. Гэта не азначае, што ў Польшчы больш няма апалагетаў традыцыйнага трактавання Грунвальдскай бітвы. Ёсць і сярод гісторыкаў тыя, хто лічыць гэтую бітву адной з найважнейшых у гісторыі Еўропы і засмучаны пераглядам яе значэння ў еўрапейскай гістарыяграфіі. Гл.: Jak kto widzi Grunwald. Rozmowa z prof. Adamem Suchońskim // Gazeta Wyborcza. 2010. Nr. 164. 16 lipca. S. 2.

[8] Zaborski M. Grunwald a legetymizacja władzy. S. 253. Пар.: Kurs T. Grunwald jak 600 lat temu // Gazeta Wyborcza. 2010. Nr. 164. 16 lipca. S. 6.

[9] Невядома, на якой падставе калега па цэху сцвярджаў, быццам святкаванне юбілею бітвы ў Польшчы "не стала фактарам, які аб'ядноўвае краіны і народы", намякаючы на актуальнасць даўняга антаганізму паміж Польшчай і Нямеччынай. Гл.: Лицкевич О. Формула Грюнвальда // БД. 2010. № 12. С. 77.

[10] Апрача прэзідэнтаў Польшчы і Літвы, а таксама старшыні Еўрапарламента, у святце бралі ўдзел дэлегацыі Малдовы, Румыніі і Латвіі.

[11] Тэкст прамовы вялікага магістра гл.: Ansprache des Hochmeisters Bruno Platter bei der Gedenkfeier zum 600. Jahrestag der Schlacht von Tannenberg // Tannenberg Grunwald 2010. Gesammelte Beiträge / Miscellanea Ordinis Teutonici 1. Wien, 2010. S. 63–65.

Сапраўды, гэта ідэя агульнай Еўропы прадвызначае новы сэнс Грунвальда. Прыкладам найбольш паказальных перамена ў ва ўзаемным успрыманні былых антаганістаў можна лічыць не толькі прызнанне цывілізацыйных і культурных заслуг Ордэна для Прусіі сучаснымі польскімі гісторыкамі. Зусім па-іншаму да ўсё яшчэ дэманізаванага ў нас Ордэна цяпер пачала ставіцца і польская грамадскасць: згодна з апытаннем у Торуні ў 2008 г. большасць насельніцтва горада падтрымала ідэю помніка ордэнскаму магістру як заснавальніку горада[12].

Сярод юбілейных публікацый беларускіх гісторыкаў, у якіх зусім рэдка можна было сустрэць развагі пра магчымасць рэвізіі манументалізаванага вобраза Грунвальда, асобнай увагі заслугоўвае цытаваны артыкул А. Ліцкевіча. Выказваючы спадзяванне, што значэнне бітвы цяпер павінна ўзрастаць у дзяржаўнай ідэалогіі Беларусі, калега скептычна адазваўся пра яе традыцыйную прэзентацыю як славяна-германскага сутыкнення, але заклікаў распрацаваць сваю "беларусацэнтрычную канцэпцыю" сярэднявечнай бітвы[13]. Калі да падобнага заклікае сучасны гісторык, які да таго ж афішуе сваю палітычную і канфесійную заангажаванасць, то гэта не можа не засмучаць. Бо справа гістарычнай навукі, якая служыць пазнанню, – гэта не стварэнне якіх бы там ні было эгацэнтрычных канцэпцый, а разбурэнне, дэмаскаванне падобных міфаў. Менавіта дэканструкцыя аднабаковых гістарычных тлумачэнняў, тых бачанняў, якія дэфармуюць мінулае ў імя палітычных інтарэсаў, як падкрэсліў Георг Ігерс, і з'яўляецца "прынцыповай задачай адказнага гісторыка"[14].

Вядома, першая ўмова разбурэння старых міфаў – гэта дэідэалагізацыя даследаванняў, свабода гістарыяграфіі ад палітычных установак і цэнзуры. Несвабодная гістарыяграфія па вызначэнні няздольная на міфакрытыку, пра што ў свой час час пранікліва пісаў Ф. Гаек, які называў гуманітарныя навукі пры таталітарных рэжымах "фабрыкамі афіцыйных міфаў"[15]. Гэта мы можам назіраць цяпер ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму,

[12] Гл.: Mallek J. Społeczeństwo "nowopruskie"... S. 185.
[13] Лицкевич О. Формула Грюнвальда. С. 76, 78, 81.
[14] Iggers G. Użycia i nadużycia historii: o odpowiedzialności historyka w przeszłości i obecnie // Pamięć, etyka i historia. Anglo-amerykańska teoria historiografii lat dziewięćdziesiątych. Pod red. E. Domańskiej. Poznań, 2002. S. 115. Пар.: Эксле О. Г. Историческая наука в постоянно меняющемся мире // Диалог со временем. № 11. Москва, 2004. С. 100–101.
[15] Хаек Ф. Дорога к рабству // Новый мир. 1991. № 8. С. 198–199.

калі афіцыйная гістарыяграфія займаецца фармаваннем вобразаў мінулага, патрэбных дзяржаўным уладам[16]. Аднак не ўсё вызначаюць умовы, бо пры любых абставінах у даследчыка застаюцца магчымасці кіравацца прафесійнай этыкай. Менавіта маральныя прынцыпы, як падкрэсліў і Поль Рыкёр[17], з'яўляюцца тым галоўным, што можа падштурхоўваць гісторыка да імператыву аб'ектыўнасці і прафесійнай сумленнасці. Калі ж навуковая гістарыяграфія адступаецца ад сваёй падставовай задачы прадукаваць максімальна абгрунтаваныя веды і крытыкаваць міфы, то гэта азначае, перафразаваўшы Р. Шарцье, што яна свядома "пакідае поле бітвы фальсіфікацыям і фальсіфікатарам"[18], або свядомым і несвядомым міфалагізатарам.

Зразумела, развагі пра шкоднасць ці пажаданасць міфаў у многім застаюцца рыторыкай. У першым раздзеле з адсылкай да спецыяльных даследаванняў ужо гаварылася, што жыццё міфаў не паддаецца рэгуляванню праз валявыя акты людзей, і ніякія асветніцкія высілкі не змогуць адмяніць запатрабаванні на міф у публічным жыцці[19]. Тым не менш гісторыкі могуць і павінны ўказваць як мага большай колькасці людзей на прысутнасць канкрэтных міфаў у нашым успрыманні мінулага, на іх прыроду і функцыі, каб змяншаць уладу агістарычных хімер хоць бы над тымі, хто чытае. Адной з такіх хімер ёсць апісаны вышэй міф Грунвальда. І калі чытач, адолеўшы кнігу да канца, засумняецца ў тым, што сярэднявечныя рыцары ажыццяўлялі "Дранг нах Остэн" або што Грунвальдская бітва вызначала лёсы беларускага ці іншых народаў, ратуючы ад заваявання і анямечвання, яе аўтар будзе лічыць сваю працу не марнай.

[16] Гл. скандальны прыклад такой практыкі: Польша – Беларусь (1921–1953): сб. документов и материалов / сост.: А. Н. Вабищевич [и др.]. Минск, 2012. Рэц.: Матэрскі В. Да стандартаў савецкай эпохі? // БГА. Т. 20 (2013). С. 189–201.

[17] Рикёр П. Время и рассказ / пер. с фр. Т. В. Славко. Москва – С.-Петербург, 2000; Пар.: Markus R. History, Fiction and Identity in the Works of Hayden White and Paul Ricoeur. P. 28.

[18] Chartier R. Zeit der Zweifel. S. 94.

[19] Гл. цытаваныя працы Л. Калакоўскага і М. Эліядэ. Пар.: Schamschula W. Mythos, Mythologie und Nationalismus im Schrifttum // Formen des nationalen Bewußtseins im Lichte zeitgenössischer Nathionalismustheorien. Hg. von E. Schmidt-Hartmann. München, 1994. S. 75; Burszta W. J. Różnorodność i tożsamość. Antropologia jako kulturowa refleksyjność. Poznań, 2004. S. 120–121.

# Літаратура

## Прынятыя скарачэнні

| | |
|---|---|
| БГА | Беларускі Гістарычны Агляд |
| БГЧ | Беларускі гістарычны часопіс |
| БД | Беларуская думка |
| БелЭн | Беларуская Энцыклапедыя |
| БелСЭ | Беларуская Савецкая Энцыклапедыя |
| БМ | Беларуская мінуўшчына |
| ВИ | Вопросы истории |
| ВИЖ | Военно-исторический журнал |
| ВФ | Вопросы философии |
| ЖМНП | Журнал Министерства народного просвещения |
| ИЖ | Исторический журнал |
| ИМ | Историк-марксист |
| КСИС | Краткие сообщения Института славяноведения |
| ЛіМ | Літаратура і мастацтва |
| НВ | Народная воля |
| НГ | Народная газета |
| НЛО | Новое литературное обозрение |
| НН | Наша Ніва |
| ННИ | Новая и новейшая история |
| НС | Наша слова |
| ПСРЛ | Полное собрание русских летописей |
| СБ | Советская Белоруссия |
| СВ | Средние века |
| СВЭ | Советская военная энциклопедия |
| СИЭ | Советская историческая энциклопедия |
| ЦНА | Цэнтральны навуковы архіў |

| | |
|---|---|
| AHUK | Acta Historica Universitatis Klaipedensis |
| AUW | Acta Universitatis Wratislaviensis |
| AHR | American Historical Review |
| DN | Dzieje Najnowsze |
| HT | History and Theory |
| HZ | Historische Zeitschrift |
| JBS | The Journal of Byelorussian Studies |
| JGO | Jarbücher für Geschichte Osteuropas |
| JMH | The Journal of Modern History |
| KMW | Komunikaty Mazursko-Warmińskie |
| KS | Kultura i Społeczeństwo |
| MSH | Małopolskie Studia Historiczne |
| PH | Przegląd Historyczny |

| | |
|---|---|
| PHum | Przegląd Humanistyczny |
| PW | Przegląd Wschodni |
| PZ | Przegląd Zachodni |
| SG | Studia Grunwaldzkie |
| SMHW | Studia i Materiały do Historii Wojskowości |
| SRP | Scriptores Rerum Prussicarum |
| SS | Studia Socjologiczne |
| SŹ | Studia Źródłoznawcze |
| ZfG | Zeitschrift für Geschichtswissenschaft |
| ZfO | Zeitschrift für Ostmitteleuropa-Forschung |
| ZH | Zapiski Historyczne |

# Крыніцы

## 1 Рукапісы

Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 76.

Ф. 4. Воп. 1. Спр. 125 (Станкевіч А. Гісторыя Беларусі (Сыстэматычны нарыс). Вільня, 1944. 155 с.).

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 125, 183, 458, 464.

Biblioteka Narodowa w Warszawie. Rps. BN III, № 3097. Kopiariusz pism politycznych i satyrycznych oraz gazet pisanych od czasów biezkrólewia po Janie III do detronizacji Augusta (1696–1705).

Lietuvos mokslų akademija Vrublevskių biblioteka. F. 21 (VBF) Nr. 331.

## 2 Газетныя артыкулы

Адоратский В. "Хронологические выписки" Карла Маркса // Правда. 1938. 4 июля. С. 4.

Біч, Міхась [і інш.] Канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі // Настаўніцкая газета. 1991. 30 лістапада. С. 2.

Вашчанка, Аляксандр. Юбілей славутай перамогі, або Другой такой буйной бітвы гісторыя сярэдневякоўя не ведала // Настаўніцкая газета. 2010. 10 ліпеня. С. 8–9.

Вецер, Алесь. Памяці герояў Грунвальда // НГ. 1995. 18 ліпеня. С. 3.

Годовщина Грюнвальдской битвы // Правда. 1944. 16 июля. С. 3.

Гомолко, Сергей. 15 июля 2010 – 600 лет Грюнвальду // Коммунист Беларуси. 2010. 17 июля. С. 6; 24 июля. С. 6–7.

Грыцкевіч, Анатоль. Грунвальдская бітва 1410 г. – ліквідацыя пагрозы незалежнасці ВКЛ (Да 600-годдзя пачатку Вялікай

вайны з Тэўтонскім ордэнам) // НС. 2009. № 24. С. 4; № 25. С. 4.

Грыцкевіч, Анатоль. Грунвальд, наша слава… // НВ. 2010. 13–15 ліпеня. С. 6.

Да 600-годдзя Грунвальдскай перамогі // НС. 2010. №. 28. С. 3.

Ермаловіч, Мікола. На гістарычным пераломе [рэц. на аповесць К. Тарасава "День рассеяния"] // ЛіМ. 1980. 17 кастр. С. 6.

Ермаловіч, Мікола. Пераадольваючы цяжкасці [рэц. на раман Л. Дайнекі "Меч князя Вячкі"] // ЛіМ. 1985. 7 чэрвеня. С. 6–7.

Ізверг Гітлер – злейшы вораг славянскіх народаў // За совецкую Беларусь. 1941. 17 ліпеня. С. 2.

Колас, Якуб. Біце фашысцкага звера // За совецкую Беларусь. 1942. 28 сакавіка. С. 2.

Коробков Н. Исторические корни германской агрессии // Правда. 1942. 25 сентября. С. 4.

Лабадзенка, Глеб. Грунвальд – напамін, што мы нацыя рыцараў і асілкаў // Звязда. 2010. 15 ліпеня. С. 2.

Матусевіч, Канстанцін. Грунвальд: выклік – і адказ // Свабода. 2000. 14 ліпеня. С. 3.

Медведев, Аркадий. Грюнвальдская битва: 600 лет спустя // СБ. 2010. 15 июля. С. 6.

Палецкис, Юстас. Уроки Грюнвальда. К 550-летию исторической битвы // Правда. 1960. 15 июля. С. 5.

Пілецкі, Алесь. Правакацыя Вітаўта // НН. 2010. 14 ліпеня. С. 12.

Победа под Грюнвальдом: слава и рубеж нашей истории [беседа с В. Гигиным] // Белорусская военная газета. 2010. 16 июля. С. 4–5.

Сагановіч, Генадзь. Пра славу і бляклaсць Грунвальду // НН. 2008. 17 ліпеня. С. 12.

Свістуновіч, Сымон. Наш Грунвальд // Звязда. 2010. 15 ліпеня. С. 2.

Там, где были разгромлены крестоносцы. Торжества на Грюнвальдском поле // Правда. 1960. 18 июля. С. 4.

Тарасаў, Кастусь. Дзень выратавання // Настаўніцкая газета. 1990. 7 ліпеня. С. 4.

Тарасаў, Кастусь. Грунвальд: беларуская памяць // Навіны. 1999. 14 ліпеня. С. 4.

Традиции Грюнвальда // Правда. 1943. 15 июля. С. 4.

Чаропка, Вітаўт. Грунвальдская бітва // НВ. 2000. 14 ліпеня. С. 3.

Шостка, Вінцук. Грунвальд сьвяткавалі без нас // Свабода. 1993. № 8. С. 7.

Щербаков, Степан. В единстве народов – путь к победе. К 550-летию разгрома немецких рыцарей под Грюнвальдом // СБ. 1960. 15 июля. С. 3.

Ядвіга К. Грунвальд-580 // ЛіМ. 1990. 20 ліпеня. С. 3.

Klonowicz, Ryhor. Nowaja pucina // Biełarus. 1914. № 6. S. 1–2.

## 3 Кніжныя і часопісныя публікацыі

Абэцэдарскі, Лаўрэнцій С. У святле неабвержных фактаў. Мінск, 1969. 110 с.

Абмеркаванне асноўных пытанняў гісторыі Беларусі // Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. 1953. № 1. С. 176–181.

Авдиев В., Косминский Е., Ефимов А. Преподавание всеобщей истории в средней школе в дни отечественной войны против германского фашизма // ИЖ. 1942. № 3–4. С. 122–129.

Александров, Г. О некоторых задачах общественных наук в современных условиях // Большевик. 1945. № 14. С. 12–29.

Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII ст. / нав. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мінск: Беларуская навука, 2003. 1015 с.

Арлоў, Уладзімір. Таямніцы полацкай гісторыі. Мінск: Беларусь, 1994. 463 с.

Арлоў, Уладзімір. Грунвальд 1410 // Беларусь. 1995. № 7. С. 19.

Арлоў, Уладзімір / Сагановіч, Генадзь. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі (862–1918): Падзеі. Даты. Ілюстрацыі. Вільня: Наша Будучыня, 1999. 223 с.

Асіноўскі, Святаслаў. Сумленна прынялі свой лёс… // БМ. 1995. № 3. С. 2–6.

Баброўнік, Наталля. Грунвальдская бітва // БГЧ. 2000. № 1. С. 70 – 79.

Багушэвіч, Францішак. Творы / уклад., прадм. Я. Янушкевіча; камент. У. Содаля, Я. Янушкевіча. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. 309 с.

Баранова, Мария П. / Павлова, Нина Г. О преподавании истории Белоруссии в курсе истории СССР в VIII–X классах // Некоторые вопросы изучения истории в средней школе: сборник докладов / под ред. М. П. Барановой, Н. Г. Павловой. Минск: Учпедиз БССР, 1961. С. 3–45.

Барбашев, Александр И. Танненбергская битва // ЖМНП. 1887, декабрь. С. 151–193.

Батюшков, Помпей Н. (изд.) Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. С.-Петербург, 1890. XIV, 376, 183 с.

Беларускі календар на 1923 год. Выд. Беларускага Грамадзкага Сабраньня ў Вільні. Вільня: Друк, [б. г.]. 40 с.

Беларускі каляндар на 1924 год. Вільня: друкарня Н. Я. Левіна, 1923. 72 с.

Беларускі календар на 1929 год. Вільня: Беларус. выд. т-ва: Беларус. друк. ім. Ф. Скарыны, [1929?]. 220 с.

Беларускі календар на 1932 год / выд. Беларускага Рэлігійна-Грамадзкага Саюзу. Вільня, [б. г.]. 64 с.

Беларускі календар на 1933 год / выд. Я. Мялецкага. Вільня, [б. г.]. 100 с.

Беларускі календар на 1937 год / склаў Сяргей Сахараў. Daugavpils, [б. г.]. 64 с.

Беларускі настольны каляндар на 1928 год / злажыў А. Матусэвіч. Менск: выд. Усебеларускай сялянскай газэты "Беларуская вёска", [1927]. 80 с.

Беларускі эпас / пад рэд. П. Ф. Глебкі і І. В. Гутарава. Мінск: АН БССР, 1959. 318 с.

Беларускія песні і гімны / уклад. С. Барыс. Мінск, 2012. 379 с.

Беларусь – мая Радзіма: вучэб. дапам. для вучняў 4 кл. / У. К. Пляшэвіч, А. П. Жытко, В. Л. Белая. Мінск: Народная асвета, 1993. 191 с.

Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху / пад рэд. А. Сташэўскага, З. Жылуновіча і У. Ігнатоўскага. Мінск: Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР, 1924. 322 с.

Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов: в 3 т. Т. 1: С древнейших времен до середины XVII в. Мінск: АН БССР, 1959. 516 с.

Беляев, Иван Д. Очерк истории Северо-Западного края России. Вильна, 1867. 121 с.

Беляев, Иван Д. История Полотска, или Северо-Западной Руси, от древнейших времен до Люблинской унии. Ч. 1. Москва, 1872. 456 с.

Біч, Міхась. Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь // БГЧ. 1993. № 1. С. 15–24.

Бобрик, Н. П. Грюнвальдская битва // Краткие сообщения Института славяноведения. Вып. 31 (Москва, 1961). С. 133–137.

Борьба славянских народов против фашизма. Свердловск: Госполитиздат, 1942. 68 с.

Бохан, Юрый М. Ваяры Грунвальдскай бітвы. Мінск: Беларусь, 2010. 218 с.

Брянцев, Павел Д. История Литовского государства с древнейших времен. Вильно, 1889. XII, 659 с.

